МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт

БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ЛІТАРАТУРА, КУЛЬТУРА І СВЕТ: ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ

Зборнік навуковых артыкулаў
па выніках III Міжнароднай навуковай канферэнцыі,
прысвечанай памяці Пятра Васючэнкі

Мінск, 19 лістапада 2020 г.

Мінск
МДЛУ
2021

УДК [811.161.3+821.161.3](082)
ББК 81.411.3я 43+83.3(4Беи)я 43
Б43

Р э к а м е н д а в а н ы Рэдакцыйным саветам Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Пратакол № 2 (60) ад 08.06.2021 г.

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я: М. М. Воінава-Страха (*адказны рэдактар*), Н. Ю. Паўлоўская, І. А. Бурдзялёва, В. У. Барысенка, Л. С. Кныш

Р э ц э н з е н т ы: кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В. А. Палятаева* (МДЛУ); кандыдат філалагічных навук, дацэнт *М. В. Трус* (Издат. дом «Звязда»)

Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэ-
Б 43 зентацыі: зб. навук. артыкулаў па выніках III Міжнар. навук. канф., прысвеч. памяці Пятра Васючэнкі, Мінск, 19 лістап. 2020 г. / рэдкал.: М. М. Воінава-Страха (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2021. – 320 с.

ISBN 978-985-28-0093-8

Зборнік артыкулаў складзены па матэрыялах III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай памяці Пятра Васючэнкі (МДЛУ, 19 лістапада 2020 г.). У кнізе разглядаюцца актуальныя праблемы сучаснага мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогіі і перакладазнаўства. Мэта выдання – узбагаціць навуковыя веды пра культурныя здабыткі Беларусі, садзейнічаць іх папулярызацыі ў свеце.

Для шырокага кола беларускіх і замежных навукоўцаў, спецыялістаў у галіне кампаратывістыкі, выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін і студэнтаў.

УДК [811.161.3+821.161.3](082)
ББК 81.411.3я 43+83.3(4Беи)я 43

ISBN 978-985-28-0093-8

© УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», 2021

УДК 821.161.3“19”

А. І. Бельскі (Мінск)

ПЯТРО ВАСЮЧЭНКА ЯК ДАСЛЕДЧЫК БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

Талент Пятра Васючэнкі рознабаковы і шматгранны: літаратуразнавец, крытык, празаік, эсэіст, драматург, дзіцячы пісьменнік, педагог. Ён запомніўся як цікавы суразмоўнік, глыбокі аналітык, эрудыт, бліскучы інтэлектуал. А яшчэ Пятро Васільевіч быў вялікі працаўнік-руплівец, нястомны шукальнік новага і адметнага, нацыянальны інтэлігент, па-сапраўднаму адданы беларушчыне, і разам з тым гэта быў досыць сціплы чалавек. Пятро Васючэнка – выбітная творчая асоба, яго навуковая і літаратурна-мастацкая спадчына вымагае цэласнага вывучэння і асобнага грунтоўнага даследавання. Кожны аспект творчасці Пятра Васючэнкі, безумоўна, заслугоўвае належнай даследчыцкай увагі і асэнсавання.

Нават пры сціслым аглядзе навуковых набыткаў, літаратурна-крытычнага плёну П. Васючэнкі надзвычай прыкметна вылучаецца яго творчы наробак у даследаванні беларускай нацыянальнай драматургіі. Пасля таго як малады на той час аўтар дэбютаваў у друку як рэцэнзент-крытык на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» (1979, 25 мая) і выступіў з артыкуламі пра беларускую прозу на тэму вайны, ён пераключыў сваю ўвагу на сучасную драматургічную творчасць. Вынікам яго навукова-творчых зацікаўленняў стала кніга «Драматургія і час» (1991).

Гэта манаграфія створана і выдадзена ў той час, калі П. Васючэнка працаваў у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі. Ён, выпускнік аспірантуры гэтага навуковага інстытута, прадстаўляў акадэмічную літаратуразнаўчую школу, яе новае маладое пакаленне. Прэзентаваў годна, прафесійна, досыць яскрава: было відавочна, што аўтар манаграфіі – удумлівы і дастаткова кампетэнтны даследчык беларускай драматургіі. Ён дэманстраваў арыгінальнасць меркаванняў, назіранняў і ацэнак. Безумоўна, паглыбленае вывучэнне тэхналогіі і паэтыкі п’ес спрыяла назапашванню ўласнага творчага досведу Васючэнкі-драматурга, які ў хуткім часе выступіў як аўтар твораў для сцэны і тэатра, а потым выдаў зборнік п’ес «Маленькі збраяносец» (1999). «Драматургія і час» – не зусім тыповае акадэмічнае даследаванне з яго строгасцю навуковага выкладу, стылістычнай аднароднасцю і нейтральнасцю. Існуюць акадэмічны канон, акадэмічны стыль, з арыентацыяй на іх і ствараўся маладым даследчыкам літаратуразнаўчы тэкст. Манаграфія кампазіцыйна вытрыманая, апрача ўводзінаў і заключэння, яе структуру складаюць тры раздзелы: «Драма: ад жыццёвай праблемы – да жыцця п’есы», «Камедыя: абнаўленне праблематыкі і мастацкага арсеналу», «Гістарычная драма: у пошуку героя і нацыянальнага характару». Ужо самі назвы-фармулёўкі яскрава сведчаць пра аўтарскі наратыў і стыль, гэта па сутнасці тэзы з актуалізацыяй даследчай стратэгіі і адпаведнай праекцыяй на праблемна-кантэкстуальны разгляд літаратурнага матэрыялу. Мяркуючы па загалоўках, нельга не адчуць прафесійную журналісцкую вывучку П. Васючэнкі. Дарэчы, факультэт журналістыкі БДУ ён скончыў у 1981 годзе. Трымаючыся акадэмічнага дыскурсу, П. Васючэнка, на наш погляд, меў на ўвазе літаратуразнаўчыя ўзоры тэкстаў такіх выдатных даследчыкаў, як Алесь Адамовіч, Віктар Каваленка, Іван Навуменка і інш. Бо літаратурная навука, апрача іншага, гэта жывы працэс спасціжэння свету мастацкай

творчасці. П. Васючэнка менш за ўсё імкнуўся да «сухіх» акадэмічных разваг, ён дэманстраваў эўрыстычна-дыялагічны, праблемна-пошукавы характар даследчыцкай думкі. Яго кніга – разважлівая, інтэлектуальна насычаная гутарка-размова з чытачамі пра сучасную беларускую драматургію, яе набыткі, навацыі і пошукі, а таксама творчыя няўдачы, крызісныя моманты. Гэта гутарка, можна сказаць, эксклюзіўная, бо дасведчаны спецыяліст-прафесіянал у галіне драматургіі – рэдкі, па-свойму ўнікальны. Пачынаецца аўтарскі аповед з пытання, звернутага да рэцыпіентаў навукова-літаратуразнаўчага тэксту «Што такое сучасная п'еса?» [3, с. 3]. Здавалася б, пытанне не такое і складанае, адказ на яго, як кажуць, ляжыць на паверхні. Зрэшты, П. Васючэнка адразу прапануе ўласную трактоўку: «П'еса, актуальная сваёй праблематыкай і зместам, палемічна завостраная, напоўненая балючымі пытаннямі, трывогамі і надзеямі свайго часу, – такі адразу напрошваецца адказ, хаця ён і не вычарпальны» [3, с. 3]. Безумоўна, даследчык удакладняе, угрунтоўвае гэта паняцце, прапаноўвае «гіпотэзу аб ускладненасці мастацкага часу ў п'есе, якая ўсё часцей спалучае ў сваім дзеянні некалькі часавых пластоў» [3, с. 4]. Аналіз драматургічнага працэсу ўяўляе сабой аўтарскую аналітыку, уключае элементы крытыкі, палемікі. Так, акрэсліваючы тэндэнцыі развіцця жанру камедыі, П. Васючэнка робіць трапныя назіранні і высновы: «Смех не толькі ўдзельнічае ў мысленні вобразамі, ён прыцягваецца да асэнсавання канкрэтных жыццёвых праблем. У нашай камедыяграфіі трывала замацавалася жанравая разнавіднасць, якую можна вызначыць як камедыя-даследаванне, камедыя-эксперымент… Зразумела, каб гэта форма камедыі не ператварылася ў свайго роду стэрэатып, важна пашыраць не толькі кола праблем, што натхнялі б творцаў на роздум, але і сам камедыйны арсенал. Смех па-ранейшаму патрабуе якаснага абнаўлення» [3, с. 102]. П. Васючэнка разгледзеў самыя апошнія ў творчым даробку драматургаў і новыя на той час п'есы К. Крапівы, А. Макаёнка, У. Караткевіча, А. Петрашкевіча, А. Дзялендзіка, М. Матукоўскага, І. Чыгрынава, А. Дударава і інш., прытым эстэтычныя пошукі беларускіх аўтараў, іх драматургічныя творы асэнсоўваюцца даследчыкам у гісторыка-параўнальным літаратурным кантэксце. Заўважаецца тое, наколькі арганічна і глыбока ён быў падключаны да класічнага мастацкага вопыту, наколькі чуйна рэагаваў на новыя тэндэнцыі, творчыя памкненні і з усёй страснасцю прагнуў сярод новых аўтараў «знайсці Драматурга», пабачыць, як нараджаецца і ўзвышаецца сваёй творчасцю «Асоба Драматурга» [3, с. 143].

Наступнай значнай і, можна сказаць, этапнай працай у беларускім літаратуразнаўстве канца XX ст. стала кніга-даследаванне П. Васючэнкі «Драматургічная спадчына Янкі Купалы» (1994). Яна мае падзагаловак, які красамоўна падкрэслівае абраны дыскурс: «Вопыт сучаснага прачытання». Сапраўды, аўтар прапанаваў сучаснае, а лепш сказаць, новае арыгінальнае прачытанне творчасці Купалы-драматурга. Ён пачынае свае развагі з актуалізацыі важных пытанняў метадалагічнага і гісторыка-літаратурнага характару: «Як сёння вывучаць Купалу? Як пазбавіцца ад догмаў, скажэнняў, якімі аблытана ранейшая гісторыя літаратуры, у тым ліку і купалазнаўства?» [2, с. 3]. П. Васючэнка адразу асвятляе шэраг прынцыпова важных момантаў у разуменні асобы Янкі Купалы, яго светапогляду, фармулюе або тэзісна пазначае плённыя падыходы да асэнсавання драматургічнай спадчыны нацыянальнага класіка. Раздзелы манаграфіі «Містэрыя ("Адвечная песня")», «Трагедыя ("Сон на кургане")», «Камедыя ("Паўлінка", "Прымакі")», «Драма ("Раскіданае гняздо")», «Трагікамедыя

(“Тутэйшыя”)», хоць у першую чаргу маркіруюць жанравую прыналежнасць тэкставых структур, насамрэч з’яўляюцца грунтоўным асэнсаваннем паэтыкі, мастацка-эстэтычнай спецыфікі драматычных твораў паводле іх ідэйнай і змястоўна-падтэкставай напоўненасці. Інакш кажучы, аўтар манаграфіі выйшаў на глыбіню ў спасціжэнні загадкавых таямніц, складанага, часам супярэчлівага, мастацкага свету Янкі Купалы, зрабіў зрэзы вобразна-сімвалічнага мыслення творцы, раскрыў яго філасофска-аксіялагічныя пошукі. Кніга П. Васючэнкі стала сапраўдным адкрыццём Янкі Купалы ў кантэксце сімвалізму з пазіцый эстэтыкі і філасофіі гэтага метаду, абранага паэтам і драматургам пры мастацкім мадэляванні свету. Дарэчы, на сувязі творчасці беларускіх пісьменнікаў пачатку ХХ ст. з еўрапейскім сімвалізмам звярталі ўвагу і некаторыя іншыя даследчыкі, да прыкладу, Л. Тарасюк, аднак менавіта П. Васючэнка найбольш грунтоўна і ўсебакова разгледзеў сімвалісцкую паэтыку Янкі Купалы, пры гэтым расчытаў глыбінныя, часам алегарычныя і зашыфраваныя аўтарскія сэнсы, вобразы-сімвалы, вылучыў створаныя мастаком мадэлі чалавечага быцця-існавання, выявіў нацыянальна адметнае і ўніверсальнае ў семантыцы драматургічных тэкстаў. П. Васючэнка цалкам правамерна праводзіць паралелі з польскім і рускім сімвалізмам, стварае параўнальна-супастаўляльны кантэкст, які ў манаграфіі рэпрэзентаваны найперш імёнамі С. Пшыбышэўскага, С. Выспянскага, Л. Андрэева, прыкметна пашыраецца за кошт сусветна вядомых драматургаў і пісьменнікаў: Сафокл, У. Шэкспір, Г. Ібсэн, А. Міцкевіч і інш. Разгорнуты ў тыпалагічным плане пералік імёнаў аўтар даследавання падае ў раздзеле «Гармонія разладу (Замест заключэння)» [2, с. 170]. Галоўнае, у выніку выяўленых літаратурных аналогій і паралеляў, сыходжанняў і адрозненняў П. Васючэнка раскрыў спецыфіку купалаўскага, шырэй – беларускага – інварыянту сімвалізму.

Несумненная каштоўнасць арыгінальных думак, інтэрпрэтацый, суб’ектыўных назіранняў і высноў, прэзентаваных на старонках манаграфіі. Так, аналізуючы Купалаву «Паўлінку», П. Васючэнка прапанаваў адметную трактоўку галоўнай гераіні п’есы: «Маладая Беларусь – шматзначны вобраз. Маладосць Паўлінкі атаясамліваецца не толькі з маладым насельніцтвам Беларусі, але і з новымі, адраджэнскімі ідэямі, што запанавалі ў пэўным асяродку. Няўрымслівасць, самавітасць і самастойнасць Паўлінкі – паралеллю марам пра незалежнасць, годнасць, якія маглі б прывесці Маладую Беларусь да “пачэснага пасаду між народамі”» [2, с. 107]. Пасля аналізу ідэйнага зместу, паэтыкі Купалавай камедыі П. Васючэнка робіць выснову: «“Паўлінка” сведчыць: харство й канцэптуальнасць купалаўскіх твораў значнай часткаю сваёй грунтаваліся якраз на тым “унутраным разладзе”, які палохаў, бянтэжыў самога паэта. Разлад, унутраная канфліктнасць, “адкрытасць”, уласцівая лепшым творам Купалы, – складаныя паэтыкі Купалы, ягонай паэтычнай і драматургічнай “мовы”» [2, с. 117]. П. Васючэнка раскрыў аб’ёмнасць і шматмернасць мастацкага свету Купалы-драматурга, паказаў складанасць аўтарскага мастацкага хранатопу, уваскаблення ірацыянальнага, міфалагічнага, трансцэндэнтнага, вобразна-сімвалічнага вопыту ў філасофскім спазнанні сусвету і чалавека як часткі касмічнага цэлага. Ён адзначае: «Хранатоп Купалавага свету цураецца простых ліній, плоскасцяў; гэта мікракосм, пабудаваны ў сугуччы з найноўшымі ўяўленнямі пра прастору і час, дзе ўсё адноснае й рухомае, дзе няма раз і назаўжды прынятай высновы, дзе пануе супярэчлівая і заўжды нечаканая мастакоўская думка, дзе развіццё вобразаў, іх эвалюцыя рухаецца па складанай лініі – парабале» [2, с. 169]. Паводле П. Васючэнкі, Янка Купала востра бачыў трагічны разлад,

дысгармонію свету, засцерагаў грамадства і чалавецтва ад духоўнай катастрофы. Ідучы за Купалам-мысляром, яго філасофска-мастацкай думкай, даследчык зазначае: «Купалаўскі вобраз-сімвал хаты мае ў гэтым кантэксце яшчэ адно дадатковае значэнне: цёплыя сцены хаты (гістарычнага дому) надзейна ахоўваюць мову, культуру, духоўнае быццё нацыі ад наступу сусветнага ліха. Апошняе пагражае не толькі беларусам, але й кожнаму народу ў свеце» [2, с. 172]. Як можна пераканацца з манаграфіі П. Васючэнкі, Янка Купала – мастак глыбіннага нацыянальна-мастацкага светабачання і светаразумення, які звяртаўся да народна-паэтычнай вобразнай сімволікі, міфалагізму, касмагоніі, філосаф, думка якога набывала агульначалавечае вымярэнне, знаходзілася ў гуманістычнай, хрысціянскай у сваёй аснове, парадыгме.

У кнігах П. Васючэнкі «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» (2004; 2-е выд. – 2016), «Ад тэксту да хранатопа» (2009), апрача іншага, таксама разглядаюцца купалаўскія драматычныя творы. Даследчык аналізуе праявы сімвалісцкага мыслення паэта і драматурга, выяўляе сутнасць яго ідэйна-духоўных і эстэтычных пошукаў.

Кніга «Сучасная беларуская драматургія» (2000) П. Васючэнкі выдадзена як дапаможнік для настаўнікаў, прытым вялікім на той час накладам – 9370 асобнікаў. Яна хутка разышлася і стала шырока запатрабаванай у навучальных установах. Рукапіс гэтай кнігі рэцэнзаваўся ў Навукова-метадычным цэнтры вучэбнай кнігі і сродкаў навучання, і мне давялося рыхтаваць экспертнае заключэнне (дарэчы, Пятро Васільевіч быў удзячны за падтрымку і парады, што адлюстравалася пазней у яго надпісе-аўтографе). Кніга гэта была надзвычай патрэбнай і чаканай настаўнікамі, студэнтамі, якія не мелі такога каштоўнага, кампактна выкладзенага літаратурна-крытычнага матэрыялу для вывучэння сучаснай беларускай драматургіі. П. Васючэнка, разглядаючы мастацкія дасягненні і набыткі ў рэчышчы традыцыйнай паэтыкі і эстэтыкі, выйшаў за межы школьнай праграмы, запыніўся на самых новых з’явах, тэндэнцыях драматургічнага і тэатральнага працэсу. У той жа час старэйшыя даследчыкі, як правіла, выказваліся досыць стрымана і без жадання падтрымліваць пошукі маладых. Нестандартнае, а то і парадаксальнае пры гаворцы пра найноўшую беларускую драматургію да П. Васючэнкі (праўда, тут яшчэ трэба назваць І. Шаблоўскую. Е. Лявонаву) калі і не абміналася, то не знаходзіла адпаведнага тлумачэння, асэнсавання. У гэтай сувязі ў дапаможніку вылучаецца раздзел «Эксперыментальная драматургія», дзе аўтар падрабязна запыніўся на творчасці драматургаў «новай хвалі», прааналізаваў адмысловыя тэкставыя структуры А. Асташонка, М. Арахоўскага, І. Сідарука, Г. Багданавай. Знайшлося месца і для разгляду нетыповай камедыйнай п’есы вядомага майстра драматургіі А. Дзялендзіка. Эксперыментальныя пошукі гэтых і некаторых іншых аўтараў у беларускай драматургіі канца XX ст. былі звязаны з эстэтычным досведам еўрапейскага «тэатра абсурду». П. Васючэнка добра ўсведамляў, што літаратурны эксперымент – заўсёды рызыка, але без пошуку новага маўлення, новых форм, абнаўлення творчых прыёмаў і стылістыкі не можа быць дынамікі, развіцця сучаснай п’есы. Ён, відавочна палемізуючы з уяўнымі апанентамі, зазначаў: «Можна рабіць шматлікія крытычныя заўвагі, але не трэба забывацца і пра тое, што творчая смеласць і рызыка самі па сабе з’яўляюцца неад’емнай часткай эстэтыкі» [5, с. 145]. Няхай сабе і не прыжылася драма абсурду на беларускай сцэне, але творчыя эксперыменты з формай, трансфармацыяй прыёмаў заходнееўрапейскай драмы на пэўным этапе былі свежымі павевамі новага, знаходзілі

водгук і розгалас, пашыралі рэпертуарныя рамкі, кампазіцыйна-выяўленчыя магчымасці і абсягі сцэнічнага мастацтва. Няма і не будзе эстэтычнага прагрэсу, крэатыўнага прарыву, сапраўднага «выбуху» цікавасці да тэатральнай пастаноўкі, сучаснай п'есы без яркага драматургічнага дзеяння, творчай смеласці пры ўвасабленні ўласнай задумы, жадання эксперыментаваць і здзіўляць публіку. П'еса ці сцэнічная пастаноўка твора мусіць стаць мастацкай з'явай, падзеяй. П. Васючэнка ўвесь час скіроўваў да пошуку і сінтэзу ў драматургічнай творчасці, і сам як пісьменнік шукаў найбольш адэкватныя формы, прыёмы, штосьці новае, а таму і ствараў па-сучаснаму цікавае і займальнае (напісаў арыгінальныя п'есы, адмысловыя казкі для дзяцей, фэнтэзі, раман-бурлеск). Ён меў рацыю: «Новае жыццё п'есы магчыма ва ўмовах спалучэння эксперыменту і традыцыі. Талент і майстэрства драматурга – якасці, без якіх такі сінтэз не можа адбыцца» [5, с. 157].

Свой вопыт знаўцы, даследчыка нацыянальнай драматургіі П. Васючэнка ўвасобіў і ў шэрагу іншых навучальных і навукова-папулярных выданняў, створаных у суаўтарстве: «Беларуская літаратура і свет» (2006), «Беларуская літаратура» (2009), «Словы ў часе» (2014). У названым дапаможніку для вучняў 11 класа «Беларуская літаратура» яму належыць раздзел «Аляксей Дудараў», а таксама ён зрабіў агляд беларускай драматургіі на сучасным этапе. Што цікава, аўтар не задавальняецца канстатацыяй здабыткаў і поспехаў на ніве драматургіі, а завастрае ўвагу на праблемах і актуальных задачах, якія яму былі добра вядомы і па ўласнай творчай дзейнасці: «Існуюць праблемы, ад вырашэння якіх істотна залежыць развіццё беларускай п'есы: складанне рэпертуару тэатраў, адносіны паміж драматургіяй і рэжысурай, публікацыя п'ес, рэцэнзаванне твораў, мова п'ес і спектакляў… Першы погляд на тэатральную афішу сталіцы сведчыць: нацыянальная драматургія пакуль не заняла ў ёй належнага месца» [1, с. 226]. П. Васючэнка не быў ціхім сузіральнікам ці фіксатарам фактаў, а, наадварот, ён паўстае ў іпастасі надзвычай кампетэнтнага эксперта-аналітыка, неабыякавага даследчыка і актыўнага ўдзельніка бягучага драматургічнага працэсу.

У творчым актыве П. Васючэнкі, літаратуразнаўца і крытыка, блізу 200 публікацый, шматлікія яго артыкулы прысвечаны гісторыі і сучаснаму стану беларускай драматургіі, канкрэтным творчым асобам. Выступаючы перыядычна ў друку, ён звяртаў увагу і надоўга запамінаўся выказанымі думкамі-развагамі. Сярод публікацый вылучым артыкулы «Загадкавыя "Тутэйшыя"» (1989), «Ад Буслая да Вітаўта» (1995), «Камедыя з сакрэтам» (2010), «Таямніца неўміручасці Крапівы» (2011) і інш. У артыкуле «Перакульваючы стэрэатыпы» (2010) пра А. Дударава ён пісаў: «Здавалася, у абліччы Аляксея Дударава маем драматурга-псіхолага, стваральніка востраасацыяльнай драмы. Але надыходзіць момант – і гэты стэрэатып перакульваецца. Бо новы Дудараў шукае новых герояў не на "зломе" сучаснага быцця, а ў галерэях гісторыі. І гістарычныя партрэты, намаляваныя драматургам, не супадаюць з іх вядомымі па гістарычных і літаратурных крыніцах арыгіналамі… Вядома, галоўнае ў гістарычных драмах Дударава – не эксперыменты з рэаліямі мінуўшчыны. А тое, што старыя беларускія летапісы і хронікі ажываюць на сцэне. Уладзімір Караткевіч калісьці белетрызаваў і рамантызаваў беларускую летапісную мінуўшчыну. Цяпер яна тэатралізуецца» [4, с. 1]. Меркаванне даследчыка цікавае з пункту гледжання інтэрпрэтацыі феномена Дударава-драматурга, ацэнкі яго як крэатыўнага майстра п'есы, які шукае новыя тэмы і вобразы, па-

мастацку ўзнаўляе і мадэрнізуе гісторыю. П. Васючэнка цудоўна разумеў спецыфіку драматургічнага мастацтва, сутнасць творчай працы мастака, уключанага думкай у тэатральную прастору (цытуем яго прадмову да зборніка «Сучасная беларуская драматургія: традыцыя і наватарства»): «Драматург стварае мрою, ілюзію, але гэта ілюзія такая жывая, выразная і пераканаўчая, што можа падацца больш рэальнай, чым само жыццё» [6, с. 3].

Пятро Васючэнка, даследчык і крытык, захапляе сваім аўтарскім бачаннем літаратурных з'яў і тэндэнцый. Бачанне гэта арыгінальнае, аб'ёмнае, кантэкстуальнае, а галоўнае, праніклівае і глыбокае. У тых выпадках, калі П. Васючэнка меў справу з высокамастацкім драматургічным матэрыялам, яго сучасным прачытаннем, трактоўкай, ён як даследчык выходзіў на філасофска-аналітычны ўзровень мыслення, дэманстраваў навуковымі штудыямі і тэкстамі інтэлектуальнае літаратуразнаўства. Сваёй думкай ён у аднолькавай ступені арганічна інтэграваўся як у айчынны, так і ў сусветны літаратурны кантэкст. П. Васючэнка паўстае як нацыянальны інтэлігент-думаннік, які ствараў беларускую інтэлектуальную прастору.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская літаратура: дапам. для вучняў 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі [і інш.]; пад рэд. А. І. Бельскага, М. А. Тычыны. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 248 с.
2. *Васючэнка, П.* Драматургічная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучаснага прачытання / П. Васючэнка; АН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 173 с.
3. *Васючэнка, П. В.* Драматургія і час / П. В. Васючэнка; АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 143 с.
4. *Васючэнка, П.* Перакульваючы стэрэатыпы / П. Васючэнка // Літ. і мастацтва. – 2010. – 11 чэрв. – С. 1.
5. *Васючэнка, П.* Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў / П. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 158 с.
6. Сучасная беларуская драматургія: традыцыі і наватарства / уклад. і прадм. П. Васючэнкі. – Мінск : Сэр-Віт, 2003. – 639 с.

УДК 378.147: [811.162.1: 811.161.3]

Р. Калета (Варшава, Польшча)

АБ ПАТРЭБЕ ПОЛЬСКА-БЕЛАРУСКІХ ПАРАЎНАЛЬНЫХ ГЛОТАДЫДАКТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Польская і беларуская мовы – гэта блізкароднасныя славянскія мовы. Яны геаграфічна суседнічаюць адна з другой і ўтвараюць бесперапынны кантынуум. Гістарычныя сувязі Польшчы і Беларусі прычыніліся да таго, што сучасная беларуская мова больш зразумелая для паляка, чым расійская, якая таксама належыць да групы ўсходнеславянскіх моў, таму што ў беларускай мове вельмі мала царкоўнаславянскіх моўных элементаў у параўнанні з літаратурнай расійскай мовай. Паводле лексікі беларуская мова найбольш блізкая да ўкраінскай, расійскай і (на трэцім месцы) польскай, а польская – да чэшскай, славацкай і (на трэцім месцы) беларускай [11].

У польскай і беларускай мовах шмат падобных слоў, у якіх нават пазіцыя націску супадае, напр. *pi**e**rwszy – п**е**ршы, r**a**dość – р**а**дасць, w**e**łna – в**о**ўна, ziel**o**ny – зял**ё**ны, s**i**ła – с**і**ла, p**ó**łnoc – п**о**ўнач, chł**o**piec – хл**о**пец* [2]. Польская мова можа часта (хаця не заўсёды) дапамагаць паляку, напрыклад, калі ён піша тэкст і не ведае беларускага слова, можна паспрабаваць напісаць кірыліцай польскае слова, якое можа таксама быць у беларускай мове, напр. *дом*, *конь, мама* і г.д. Гэта называецца станоўчы перанос (трансфер). З англійскай мовай (і іншымі

неславянскімі) мовамі падобны эксперымент можа такім чынам не атрымацца. Лягчэй і хутчэй паляку вывучыць роднасную славянскую мову, чым мову, якая належыць да іншых груп моў.

У сваю чаргу, беларуская мова сапраўды дапамагае ў авалоданні польскай да пэўнай ступені. Калі беларус чытае польскі тэкст на пачатковым узроўні, ён можа даволі шмат зразумець. Але ў гэтым ёсць таксама пэўная небяспека – падае матывацыя вывучыць польскую мову на дасканалым узроўні [4]. Вельмі часта, асабліва сярод маладых людзей, папулярнай з'яўляецца думка, што калі разумееш паляка, то ўжо ведаеш польскую мову. Ведаеш, але пасіўна. А мэта вывучэння кожнай мовы – актыўнае валоданне ёю. Ёсць шмат беларусаў, якім здаецца, што яны гавораць па-польску [6]. Яны перакананыя, што кожны паляк павінен зразумець сказ кшталту **Ja czytał książku*. Так, большасць палякаў зразумее гэты сказ, асабліва калі хтосьці з іх вывучаў раней якую-небудзь славянскую мову. Але трэба разумець, што такі ўзровень "валодання" моваю недастатковы. Згаданы сказ па-польску павінен гучаць *Czytałem książkę*. У польскай мове ў дзеяслове прошлага часу канчатак *-em* азначае першую асобу мужчынскага роду (для жаночага роду – канчатак *-am*), і таму адпадае неабходнасць ужываць займеньнік *ja* ў гэтым і аналагічных сказах. У назоўніках жаночага роду на *-a* ў вінавальным склоне выступае канчатак *-ę* [4]. Гэта адно з першых правіл, якое павінен засвоіць навучэнец.

Беларуская мова (таксама расійская) вельмі падобная да польскай, але не заўсёды падобныя па гучанні канструкцыі азначаюць тое самае ў абедзвюх мовах. Напрыклад, ужыванне дзеясловаў *wiedzieć* і *znać* у польскай мове крыху адрозніваецца, чым ужыванне беларускіх ці расійскіх эквівалентаў. Дзеясловы падобныя, але не ва ўсіх кантэкстах, і калі гэтага не ведаць, то яны могуць стаць крыніцай памылак. Параўн. наступныя прыклады:

Польскі сказ	Беларускі эквівалент
Wiem, że jutro się zobaczymy.	Я **ведаю**, што заўтра ўбачымся.
Ona nie **wie**, czy pojedzie z nami na wycieczkę.	Яна не **ведае**, ці паедзе з намі на экскурсію.
Znam go. (*~~Wiem~~ go).	Я **ведаю** яго.
Znam tę piosenkę. (*~~Wiem~~ tę piosenkę)	Я **ведаю** гэту песню.

Падрабязны аналіз цяжкасцяў польскай мовы можна знайсці ў кнізе "Польска-беларуская глотадыдактычная ляпсалогія" [9] і артыкуле "Цяжкасці польскае мовы: памылкі беларусаў, якія вывучаюць польскую мову" [4]. Вывады прынамсі два: па-перашае, варта заўважыць пазітыўны аспект моўных памылак і выкарыстоўваць іх у дыдактычных мэтах, а па-другое, вывучаць польскую і беларускую мовы – варта! Беларусы звычайна вельмі добра і хутка вывучаюць польскую мову, а палякі беларускую мову.

Беларуская мова ў Польшчы таксама выкладаецца і вывучаецца. Перш за ўсё, беларускую мову вывучаюць прадстаўнікі беларускай нацыянальнай меншасці на Падляшшы ў пачатковых школах, гімназіях, агульнаадукацыйных ліцэях – у Гайнаўцы, Бельску Падляскім і Беластоку. Дзейнічае дзіцячы садок з польскай і беларускай мовай навучання ў Беластоку і беларускамоўныя групы ў дзіцячым садку ў Гайнаўцы. Беларускую мову папулярызуе таксама Аб'яднанне ў карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА. Варта нагадаць, што беларуская мова была ўведзена ў якасці дапаможнай

у зносінах паміж чыноўнікамі магістрата і насельніцтвам як у вусным, так і ў пісьмовым варыянце на тэрыторыях некаторых падляскіх гмін. Але і ў Варшаве арганізуюцца беларускамоўныя дашкольныя і школьныя групы.

Выкладанне беларускай мовы, гісторыі і культуры таксама ажыццяўляецца ў польскіх вышэйшых навучальных установах. У Варшаве беларуская мова выкладаецца з 1956 года на кафедры беларусістыкі (у 2021 г. кафедра адзначае 65-годдзе) і з 2002 года на кафедры міжкультурных даследаванняў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы факультэта прыкладной лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта. Беларусазнаўчыя адзінкі працуюць таксама ў Беластоцкім універсітэце і Універсітэце імя Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне, а спецыялісты з Беларусі выкладалі і выкладаюць ва ўніверсітэтах у Кракаве, Ольштыне і Аполі. Таксама студэнты-семінарысты Варшаўскай духоўнай семінарыі вывучаюць беларускую мову, каб рыхтавацца да святарскай паслугі, значыць, каб размаўляць з людзьмі і быць бліжэй да Бога. Беларускую мову будучыя багасловы вывучаюць цягам двух першых курсаў па дзве гадзіны штотыдзень. Заняткі заўсёды распачынаюцца малітваю па-беларуску. Курсы беларускай мовы для палякаў прапанаваў таксама Культурны Цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

На кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта беларускую мову як замежную вывучалі не толькі палякі, але таксама літовец, расіянін і нават іспанка. Прычым беларускую мову вывучаюць як студэнты, так і 1) перакладчыкі-русісты, якія хочуць пачаць перакладаць таксама з беларускай мовы, 2) польскія дыпламаты, якія рыхтуюцца да працы ў Беларусі, 3) асобы, якія цікавяцца Беларуссю, хочуць падарожнічаць па Беларусі або маюць сяброў з Беларусі, 4) асобы, якія знаходзяцца ў змяшаных шлюбах, 5) асобы, якія хочуць ведаць рэдкую мову і такім чынам паказаць сябе на рынку працы, 6) асобы, якія хочуць здаць экзамен (арганізаваны ў Варшаўскім універсітэце) і атрымаць сертыфікат беларускай мовы як замежнай.

Польская мова можа як дапамагаць, так і перашкаджаць паляку авалодаць беларускай. Ва ўсіх мовах існуе перадусім лексічная з'ява, якая называецца "фальшывыя сябры перакладчыка" (або "міжмоўныя амонімы", "фальшывыя лексічныя паралелі"). Маюцца тут на ўвазе беларускія словы, што на першы погляд падобныя да польскіх і таму могуць асацыявацца з польскімі значэннямі. А польскія і беларускія значэнні якраз тут не супадаюць. Такая міжмоўная аманімія – гэта праблема не толькі перакладчыкаў, але таксама – а можа перш за ўсё – людзей, якія ведаюць, вывучаюць ці выкарыстоўваюць як беларускую, так і польскую мову (напр., лінгвісты, выкладчыкі, студэнты, а таксама журналісты, бізнесоўцы, турысты і г.д.).

Калі параўнаем польскую і беларускую мовы, то такіх слоў знойдзем вельмі шмат, напр. беларус. *лекцыя* – польск. *lekcja* (*урок*), беларус. *лоб* – польск. *łeb* (*галава*), беларус. *станоўчы* – польск. *stanowczy* (*рашучы*), беларус. *пенсія* – польск. *pensja* (*зарплата*) [7]. Найбольш памылковыя прыклады датычаць слоў, якія ў польскай мове асацыююцца з сексуальнай сферай, напр. *суткі* гэта папольску *саскі*, а *рухацца* гэта вульгарнае слова, якое абазначае *займацца сексам*, так што беларускі сказ *Нам трэба рухацца* можа ў паляка выклікаць дзіўныя эмоцыі. Фальшывыя эквіваленты сустракаюцца на розных узроўнях мовы, напр. граматычным: беларус. *слова* – польск. *słowa* (*словы* – множны лік) або фанетычным, калі маем падобныя словы, у якіх пазіцыя націску адрозніваецца: польск. *wi**o**sna* – беларус. *вясн**а***, польск. *z**i**ma* – беларус. *зім**а***, польск. *l**e**cieć* –

беларус. *ляц**е**ць*, польск. ***a**nioł* – беларус. *анё**л***, польск. *rz**e**ka* – беларус. *рак**а*** [10]. Калі паляк свядома або не пераносіць канструкцыі з польскай мовы, якіх няма ў беларускай, гэта называецца негатыўным пераносам (трансферам). Такіх прыкладаў даволі шмат, яны былі сабраныя ў кнізе-слоўніку беларуска-польскіх фальшывых сяброў перакладчыка [7].

Параўнанне абедзвюх моў на лексічным узроўні дазваляе заўважыць вельмі шмат цікавых з'яў. Напрыклад, у беларускай мове існуюць запазычаныя з польскай словы, якія ў польскай зніклі і лічацца ўжо архаізмамі, напр., *экскурсія* (польск. *ekskursja*), *віншаваць* (польск. *winszować*), *снедаць* (польск. *śniadać*), *аўтамабіль* (польск. *automobil*), *цытата* (польск. *cytata*), *канікулы* (польск. *kanikuła*), *вячэра* (польск. *wieczerza*), *марка* (польск. *marka*) [3]. Калі беларусы выкарыстоўваюць такія словы ў сваёй польскай мове, то гэта можна лічыць стылістычнай памылкай, якая дае камічны эфект, бо сёння палякі так не гавораць.

У беларускай мове ёсць таксама паланізмы, якія раней лічыліся нейтральнымі, а сёння ўжо характарызуюцца як стылістычна афарбаваныя, напр., *пляц* (сёння *плошча*), *амбасадар* (сёння *пасол*), *беларусін* (сёння *беларус*), *гарбата* (сёння *чай*) [5]. Аднак не заўсёды лексема падобная да польскай мусіць быць адразу архаізмам, напр., *кругавід* (гэта архаізм) – сёння *гарызонт* (польск. *horyzont*). Можам таксама знайсці лексемы, якія ў абедзвюх мовах з'яўляюцца архаізмамі, напр., *каліта* (сёння *кашалёк*), *дыярыуш* (сёння *дзённік*), *дысцыпліна* (сёння *рамень, бізун*), *амбарас* (сёння *турботы*). Гэтыя з'явы вынікаюць з гісторыі развіцця блізкароднасных беларускай і польскай моў, моўных уплываў, а таксама запазычанняў. Цікава, што адрозненні ў стылістыцы беларускай і польскай моў могуць быць крыніцай не толькі гістарычнай і этымалагічнай інфармацыі, але таксама дапамогай пры сінхранічным вывучэнні і даследаванні беларускай і польскай моў.

Беларусам можа быць цікава, якія памылкі часцей за ўсё робяць палякі, якія вывучаць беларускую мову, што ім цяжэй за ўсё даецца. Падрабязны аналіз такіх памылак можна знайсці ў кнізе «Памылкалогія ў беларусістычнай глотадыдактыцы» [8], якую можна замовіць на старонцы кафедры беларусістыкі (http://kb.uw.edu.pl/category/ksiazki-wydane-przez-katedre/).

У двух словах, на пачатковым этапе ўжо вывучэнне алфавіта выклікае праблемы, вельмі часта здараюцца апіскі або няправільнае вымаўленне, таму што ў польскім і беларускім альфавітах ёсць літары, якія толькі пішуцца падобным чынам, але вымаўляюцца па-рознаму. На занятках па беларускай мове былі сітуацыі, калі студэнты чыталі назву краіны *Злучаныя Штаты Амерыкі* як *Злучаныя *Шматы Амерыкі*, бо беларускае *т* (тэ) прачытлі як польскае *т* (мэ), а польскае слова *szmata* – гэта *ануча* (звычайна для мыцця падлогі). Падобных памылак даволі шмат таксама на пісьме.

Шматлікія памылкі абумоўлены рознай фанетычнай прыродай націску ў польскай і беларускай мовах. У беларускай мове націск свабодны і рухомы, можа мяняць месца ў парадыгме, напр. *ру**ка – ру**кі*, *кас**іць – ко**сім.* У польскай мове націск фіксаваны і прыпадае звычайна на перадапошні склад у слове, прычым ён не мяняе месца ў парадыгме, напр. ***ręka – ręce, kosić – kosimy*** [4]. Палякі прызвычаіліся да гэтага і стараюцца фіксаваць і беларускі націск на тым жа месцы, напр., **Бел**а**русь* (замест *Белару**сь***), **к**і**но* (замест *кін**о***); **м**е**тро* (замест *метр**о***), ****а**ле* (замест *ал**е***) і г.д. Здараюцца таксама памылкі, што ўзнікаюць пад уплывам іншай славянскй мовы, якую палякі таксама вывучаюць, напр., **нельг**а*** (замест *н**е**льга*) пад уплывам расійскага *нельз**я***. Такая расійска-

беларуская інтэрферэнцыя сустракаецца і на іншых узроўнях мовы, што вельмі нагадвае беларускую трасянку. Палякі, якія раней вывучалі расійскую мову, выкарыстоўваюць шмат лексічных і граматычных русізмаў у беларускай мове – ім трэба паступова вучыцца адрозніваць расійскую ад беларускай, а гэта не так лёгка на пачатковым этапе.

Польска-беларуская інтэрферэнцыя таксама датычыць усіх узроўняў мовы. Найбольш складана вывучыць граматычныя канструкцыі, якіх не існуе ў падобнай форме ў польскай мове. Маюцца тут на ўвазе, сярод іншага, прыналежныя прыметнікі, напр., *маміна сукенка* (паляк скажа **сукенка мамы*), *Міколаў ноўтбук* (паляк скажа **ноўтбук Мікалая*), узаемны займеннік *адзін аднаго, адна адной*, напр., *Хлопцы павіталіся адзін з адным* (паляк скажа **з сабой*), залежны стан, напр., *Дом будуецца рабочымі*, *Горад заснаваны князем Барысам* (паляк скажа **праз князя Барыса*), кіраванне дзеясловаў, напр., *карыстацца слоўнікам* (паляк скажа **са слоўніка*), *пытацца ў каго* (паляк скажа **пытацца каго*), *вучыцца беларускай мове* (паляк скажа **беларускай мовы*), *Яна віншуе цябе* (паляк скажа **табе*), *Я слухаю музыку* (паляк скажа **музыкі*), або вінавальны склон адушаўлёных назоўнікаў, напр., *Я бачу жанчын, людзей, катоў, сабак* (паляк скажа **жанчыны, *людзі, *каты, *сабакі*) [8]. Дарэчы, польская канструкцыя, дзе вінавальны склон мае аднолькавыя канчаткі з назоўным склонам, ужывалася калісьці і ў беларускай мове. Яшчэ Якуб Колас пісаў *Разоў пяць губляў авечкі* [1].

Вельмі часта палякі і беларусы робяць падобныя памылкі, напр., беларусы кажуць *uczyli się *nowym słowam* (замест *nowych słów*), а палякі: *Я вучуся *новых слоў* (замест *новым словам*). Беларусы кажуць: *słuchać *muzykę*, (замест *muzyki*), а палякі *Я слухаю музыкі* (замест *музыку*). Беларусы кажуць *Zakochałam się w *język polski* (замест *w języku polskim*), а палякі *Я закахаўся ў *прыгожай дзяўчыне* (замест *прыгожую дзяўчыну*). Беларусы кажуць *Byłem bardzo *tym zadowolony* (замест *z tego*), а палякі *задаволены *з сябе* (замест *сабой*/*сабою*). Беларусы кажуць**dwadzieścia piąty* (замест *dwudziesty piąty*), а палякі **дваццаты першы* (замест *дваццаць першы*), беларусы кажуць *Jadę *na metro* (замест *metrem*), а палякі *Я еду *метрэм* (замест *на метро*) [8].

Польская і беларуская мовы належаць да адной сям'і славянскіх моў, адтуль паміж імі столькі падабенстваў, хаця і не менш адрозненняў. Працэсы інтэрферэнцыі паміж згаданымі мовамі лёгка назіраюцца, таму што яны моцныя і паўсюдныя і таму варта выдаваць параўнальныя працы, якія аналізавалі б сапраўдныя і фальшывыя польска-беларускія моўныя паралелі, а таксама слоўнікі і глотадыдактычную граматыку беларускай і польскай моў, якая дапамагала б зразумець гэтыя працэсы і лепш вывучыць як беларускую, так і польскую мову. Мэтазгодна, каб гэта быў сумесны польска-беларускі праект, у якім удзельнічалі б даследчыкі з абедзвюх краін.

ЛІТАРАТУРА

1. *Важнік, С.* Праблема апісання сінтаксічных архаізмаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове: змены ў семантычнай структуры транзітыўных сказаў / С. Важнік // Лінгвістичні студії: зб. наук. праць / укл. : А. Загнітко (наук. ред.) [та ін.]. – Донецьк : ДонНУ, 2008. – Вип. 16. – С. 100–103.

2. *Кавалёва, В. В.* Камунікацыйныя бар'еры ў вывучэнні фанетыкі беларускай мовы польскамоўнымі навучэнцамі / В. В. Кавалёва // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. – 2007. – Вып. 6. – С. 62–67.

3. *Калета, Р.* Лексічны аналіз паланізмаў-архаізмаў у беларускай мове (на матэрыяле беларускага Слоўніка архаізмаў і гістарызмаў) / Р. Калета // Беларуска-польскія культурна-моўныя ўзаемадачыненні: ад гісторыі да сучаснасці : зб. навук. арт. / навук. рэд. В. М. Курцова, Н. А. Снігірова, M. Jankowiak, M. Ostrówka. – Мінск : Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа; Беларус. навука. – 2016. – С. 123–128.

4. *Калета, Р.* Цяжкасці польскае мовы: памылкі беларусаў, якія вывучаюць польскую мову / Р. Калета // Arche. Пачатак. – 2010. – № 4. – С. 358–400.
5. Слоўнік архаізмаў і гістарызмаў: па творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі / рэд. С. М. Струкава. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 654 с.
6. *Guszczewa, O.* Туру błędów leksykalnych w pracach białoruskich studentów / O. Guszczewa // Актуальныя праблемы паланістыкі: зб. навук. арт. / рэд. С. Важнік, А. Кожынава. – Мінск, 2006. – С. 103–110.
7. *Kaleta, R.* Białorusko-polska homonimia międzyjęzykowa / R. Kaleta. – Warszawa : Slawistyczny Ośrodek Wydaw (SOW) Inst. Slawistyki Polskiej Akademii Nauk, 2014. – 172 s.
8. *Kaleta, R.* Błędologia w glottodydaktyce białorutenistycznej / R. Kaleta. – Warszawa : Katedra Białorutenistyki WLS UW, 2018. – 368 s.
9. *Kaleta, R.* Polsko-białoruska lapsologia glottodydaktyczna / R. Kaleta. – Warszawa : Katedra Białorutenistyki WLS UW, 2015. – 178 s.
10. *Kaleta, R.* Złudne odpowiedniki białorusko-polskie / R. Kaleta // Studia z Filologii Polskiej i Słowiańskiej. – 2013. – № 48. – S. 123–141.
11. *Walczak, B.* Stosunki pokrewieństwa języków słowiańskich w ujęciu Witolda Mańczaka / B. Walczak // Współzależność języków słowiańskich. Aspekt lingwistyczny i glottodydaktyczny / Wydaw. Uniw. Gdańskiego; red. J. Bartoszewska i M. Grabska. – Gdańsk, 1998. – S. 98–109.

УДК 821.161.3.09.(092) Васючэнка П. «19/20»

Г. М. Кісліцына (Мінск)

ЖАНР РАМАНАЎ-КАЗАК ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ У ТВОРЧАСЦІ ПЯТРА ВАСЮЧЭНКІ

Адным з самых цікавых момантаў у гісторыі беларускай літаратуры, несумненна, з'яўляецца час станаўлення Новай літаратурнай сітуацыі, які практычна супадае з часам існавання таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя". Адным з актыўных сяброў гэтага творчага аб'яднання быў літаратуразнаўца, крытык, драматург і казачнік Пятро Васючэнка, які адказваў у "Тутэйшых" за дзіцячую літаратуру.

Таварыства маладых літаратараў не проста з'явілася на хвалі нацыянальнага адраджэння, яно стала яго «дэміургам» – адсюль і пэўная «раскіданасць» у інтарэсах яго чальцоў, якія спрабавалі сябе, здаецца, ва ўсіх магчымых жанрах літаратуры. Як кожны ўдзельнік Адраджэння васьмідзясятых, Васючэнка выкарыстоўваў кожную магчымасць, любы жанравы рэсурс, каб данесці да чытача маральныя і эстэтычныя каштоўнасці новага часу.

Васючэнка пачынаў як празаік (кнігі апавяданняў «Белы мурашнік», 1993; «Прыгоды аднаго губашлёпа», 1998), але сёння не заангажаванаму чытачу ён больш вядомы як казачнік і аўтар драматургічных твораў для дзяцей (зборнік «Маленькі збраяносец», 2000). У 2003 годзе Тэатрам юнага гледача была пастаўлена яго п'еса «Рыцар Сонца», якая сталася першым нацыянальным беларускім мюзіклам. Вялікую папулярнасць у дзяцей і іх бацькоў мела казка "Каляровая затока" і вершаваны бестыярый "Піраміда Ліннея" (2008). Аднак найбольшую вядомасць усё ж прынеслі Васючэнку кнігі "Прыгоды паноў Кубліцкага і Заблоцкага" (1997) і "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" (2003). На іх вырасла не адно пакаленне чытачоў. Калі ў 2018 годзе з'явіўся раман-казка "Дзівоснае лета Кубліцкага ды Заблоцкага", то адразу было зразумела, што кніга адрасавана тым чытачам першых кніг, якія ўжо выраслі і займелі сваіх дзяцей, але засталіся вернымі ў сваёй любові да дзіўных паноў, у якіх многім даследчыкам бачацца два рэальных прататыпа, а менавіта сам аўтар і яго калега, літаратуразнаўца і драматург Сяргей Кавалёў.

Варта адзначыць, што за гэты час гісторыя пра Кубліцкага ды Заблоцкага відазмянілася. І не толькі таму, што яна стала паўнавартасным раманам, з перадмовай, паслямовай, шаснаццаццю праявамі, слоўнікам і мноствам устаўных

прытчаў. Змянілася агульная танальнасць – казка стала больш філасафічнай, містычнай і месцамі вусцішнай. Калі першыя два творы з гэтага цыкла абапіраліся на традыцыю вуснай народнай творчасці і батлейку, то ў рамане шмат ад літаратурнай казкі і, у першую чаргу, ад кэралаўскай “Алісы”. І нават вершаваная ўстаўка з “Дзівоснага лета” – гэта не толькі згадка пра васючэнкаўскую “Піраміду Ліннея”, але і напамін пра абсурдысцкія вершыкі, якія мы сустракалі ў Льюіса Кэрала.

Напрыклад, у Васючэнкі ў рамане свой, а не кэралаўскі Трытон – абсалютна новы персанаж другога плану, з асобна выдзеленым абсурдысцкім вершам і аквапаркам замест акварыюма: “... Дасягнуўшы да трох тон, // Закупіў трытон бетон, // Узваліў бетон на карк, // І паставіў аквапарк” [1, с. 36].

Але самае заўважнае ў новай кнізе пра паноў – змяніліся галоўныя героі. Для тых, хто не знаёмы з персанажамі папярэдніх кніг, аўтар напісаў “Перадмову”, у якой нагадвае, што Кубліцкі ды Заблоцкі «праелі, прапілі, прагулялі ўсю сваю гаспадарку, пасля сеялі рэпу, наседжвалі яйка з-пад Куры-Шчабятуры, змагаліся з Цмокам паганым, хадзілі на вайну з каралём Гарбузом, стралялі са стрэльбы па прусаках ды мелі іншыя прыемныя забаўлянкі, праз якія заўжды траплялі ў розныя непрыемныя гісторыі ды гуза сабе на лоб зараблялі» [1, с. 2].

Легендарная служанка паноў дзеўка Дрыпа, якую чытачы першых кніг любілі за лёгкі нораў не менш галоўных герояў, не толькі выйшла замуж за акцёра вандроўнага тэатра, але і нарадзіла сыночка Максіміліяна, прыгледзець за якім і трэба будзе панам, пакуль бацькі будуць на гастролях. Здавалася б, усё павінна быць даволі прадказальна, накшталт «Вакацыяў у Прастаквашына», толькі з беларускім каларытам, але не.

Раман не пра летнія вакацыі. І не пра дапытлівага хлопчыка Макса, які, па словах аўтара, любіць “усё жывое, што поўзае, плавае, бегае, лётае, рыецца, толькі гэта не танкі, не самаходы, не самалёты, не падводныя чоўны і не экскаватары” [1, с. 29]. Першыя главы кнігі “Дзівоснае лета” прысвечаны яго прыезду, больш за тое, нават меню першага абеду абмяркоўваецца ў падрабязнасцях. Так што чаканне таго, што менавіта Максіміліян-малодшы стане ў цэнтры апавядання, з’яўляецца цалкам натуральным. Але дзіўным чынам апавяданне вырульвае (не без дапамогі чароўнага Зорнага ровара) да галоўных герояў – Кубліцкага ды Заблоцкага, якія, як ужо адзначалася, “паразумнелі”, задумаліся пра сэнс жыцця, сталі спрачацца пра форму Зямлі і бачыць дзіўныя сны-прадказанні. І нават адправіліся ў падарожжа, бо якая казка без падарожжаў, выпрабаванняў, пачвараў і дзіўных выратаванняў?

І як у любой казцы, трапляюцца ім насустрач дзіўныя стварэнні і персанажы. “Спадар Жаўтуха”, страшны на выгляд карэспандэнт газеты “Гепатыт”. “Піліп з Канапель”, які раздае парады. “Пані Пясяцкая”, у краіне якой няма часу. І іх паводзіны, і іх манеры, і знешні выгляд – усё гэта зноў прымушае ўспомніць цалкам дарослую і эстэтычна-выверануюю “Алісу ў Краіне цудаў” з яе шарадамі і загадкамі, разлічанымі на дарослых. Аднак і алюзіі на дарослыя показкі (“Кампанія не надта велька, але бардзо пажондна” з вуснаў маленькага Дрыпяняткі), і прыпеўкі (пра тое, што “прыплыло з Кукуева”) у рамане Васючэнкі таксама, відавочна, разлічаныя не на дзіцячую аўдыторыю.

Самыя смешныя гісторыі ў кнізе звязаныя з цалкам недзіцячымі тэмамі. Напрыклад, гэта эпізоды з дзяўчатамі ва ўзросце – Акуляй, Цыпорай і Тэкляй,

якія гатовыя на ўсё ў пошуках жаніхоў. “Рэпная тэорыя”, якую нібыта піша пан Кубліцкі, прыдуманая і ўведзеная аўтарам у раман відавочна ў разліку не на малых, а на дарослых, прычым дарослых са спецыфічным пачуццём гумару. Ім яна сапраўды здасца калі не смешнай, то пацешнай, так як уяўляе сабой пародыю на навукападобныя тэксты, якіх сёння шмат у розных сферах жыцця. Класічнае «прасцей паранай рэпы» ў такіх тэкстах ператвараецца ў псеўданавуковую лухту, накшталт «Вырошчванне рэпы ўяўляе сабой працэс, адзначаны рыгіднасцю, у выніку якога манада ўпадае ў стан канстантнай фрустрацыі і паводле неабходнасці займае іманентную пазіцыю ў дачыненні да экзістэнцыйнага выбару, і разам з тым вольныя пекла ўсякага геданізму» [1, с. 21].

Дарэчы, нічога дзіўнага ў такім парадыйным пасажы няма, бо, як мы ведаем, аўтар – вядомы вучоны-літаратуразнаўца. Прыведзеная вышэй цытата ў нейкім сэнсе іронія над самім сабой і сваёй прафесіяй. У канцы кнігі “Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага” ёсць невялікі слоўнічак, дзе перакладаюцца беларускія словы, якія выйшлі з ужытку (накшталт *дыярыюша* або *атраманта*, або словы, якія імітуюць вымаўленне на трасянцы (накшталт *Мерыкі* і *ціатра*).

Гэты слоўнік можна было б пашырыць для карысці дзяцей і дарослых. Таму што не кожны дарослы, нават вельмі-вельмі разумны, адкажа на пытанне, што такое “цабстрык”. Або што такое “гамэрня”. Ці хто такі “бабздыр”. І што гэта значыць – “шныпарыць”? Больш за тое, калі гэты дарослы, напрыклад, не гараджанін, не батанік і не філолаг, то ён цалкам можа і не ведаць, што за расліны хаваюцца за элементарнымі беларускімі назвамі. І тут таксама бачыцца паралель з кэралаўскай “Алісай”, якая, як вядома, мела яшчэ і адукацыйнае значэнне.

Цалкам у духу Кэрала Васючэнка выпускае на старонкі рамана-казкі антрапамарфічных істотаў з пацешнымі назвамі. Напрыклад: “Жук-і-Жаба, Алень-Цюлень,Чарапаха-Конь, Заяц-Воўк, Кураня-Сараканожка, Раскаскарпіен, Цмок дзевяцігаловы, Пчала-Мядзведзь”. Па-кэралаўску нечакана глядзяцца і слэнгавыя слоўцы, якія незвычайнымі анахранізмамі здаюцца сярод сакавітых, каларытных слоў беларускай мовы, што яшчэ раз даказвае, што Васючэнка быў бліскучы стыліст і вялікі аматар злучаць незлучальнае.

Як вядома, птушка Дадо, якую Аліса сустракае на беразе побач з Морам слёз, з’яўляецца адлюстраваннем самога Кэрала. Калі пісьменнік заікаўся, ён прамаўляў сваё імя як “до-до-Доджсон”. Кэралаўскае арляня Эд адзначае, што Дадо кажа “не па-чалавечы”: яго прамова перагружаная навуковымі тэрмінамі. Гэтак жа і ў “Рэпнай тэорыі” пана Кубліцкага мы бачым парадыйную перагружанасць тэрмінамі, хоць і заканчваецца гэты псеўданавуковы трактат простай і разам з тым глыбокай думкай: “Галоўнае што? Галоўнае, каб чалавек быў на сваім месцы. Там, дзе яму лепей” [1, с. 21]. Неверагодна, але аўтар ужо ўкладаў яе ў вусны другога свайго героя, Геракла, у якім таксама вельмі многа рысаў, у якіх пазнаецца сам аўтар Пятро Васючэнка.

Гаворка ідзе пра “Дванаццацць подзвігаў Геракла” – раман-бурлеск, які выйшаў у 2013 годзе. Што цікава, аўтар так і вызначае жанр свайго твора ў прадмове, калі тлумачыць свой выбар наступным чынам: “У XXI стагоддзі мне захацелася напісаць кнігу пра тыя часы, калі чалавек быў дзіцём, і чалавецтва палягала ў стане дзяцінства, і гэтым дзіцячым садком кіравалі выхавацелі – усемагутныя і ўсёведныя алімпійскія багі” [2, с. 3].

Сапраўды, няма лепшых выхавацеляў за алімпійскіх багоў! Нездарма ж менавіта антычная літаратура стала тым падмуркам, на якім вырасла класічная

адукацыя. Створаная Васючэнкам “новая версія прыгодаў Геракла”, з аднаго боку, мае на мэце адукоўваць і настаўляць, з другога – іранічна, весела і дынамічна распавядаць пра “авантуры, метамарфозы і паядынкі”.

Аднак мэта – мэтай, але істотнай з’яўляецца не задума, а рэалізацыя. Нягледзячы на знаёмы з дзяцінства сюжэт, аўтар здолеў утрымаць увагу да апошняга, хоць, здавалася б, наданне свежасці класіцы – задача абсалютна непад’ёмная. Чаму гэта ўдалося?

- Ну, перш за ўсё, таму што пісьменнік яўна асацыюе сябе з галоўным героем. У створаным Васючэнкам вобразе сапраўды добра пазнаецца ён сам, “тынэйджар паводле сваёй імпульсіўнай, наіўнай, запытальнай натуры, але ўжо дарослы чалавек сваім целам” [2, с. 5]. Гэтае вызначэнне – дарослае цела, душой падлетак – вандруе з адной часткі ў другую і, відавочна, вельмі важнае для пісьменніка. Падобна Гераклу ён спрабуе адказаць сабе на пытанне: што кіруе светам? (Гэтае ж пытанне пазней будзе задаваць і пан Кубліцкі ў “Незвычайным леце”).

Васючэнкаўскі Геракл штораз знаходзіць новы адказ. Іншым разам яму здаецца, што сэнсу ў жыцця няма, і тады яго Геракл сцвярджае, што ўсё, што робіцца, – не болей за “капрызы багоў”. Другім разам ён лічыць, што ва ўсім вінаватыя капрызы жанчын. Але бываюць і рэдкія моманты зацішша ці перамогі, і тады аўтар і герой згаджаюцца ў тым, што светам кіруюць любоў, міласэрнасць і літасць.

Цікава, што Васючэнка змог не проста думаць, як Герой (у дадзеным выпадку ёсць усе падставы пісаць гэтае слова з вялікай літары), але ён здолеў бачыць, як Герой. Апісанні боек і баёў у кнізе абсалютна фантастычныя, ясныя ў падрабязнасцях, дэталях і фізіялагічных адчуваннях. Ён апісвае рэчы і з’явы, у якіх у прынцыпе не можа быць пацверджання чалавечым вопытам. Уявіць сабе бойку з нямейскім львом ці лярнейскай гідрай у дэталях, не прапускаючы моманты ад пачатку да перамогі, – гэта не прасцей, чым паглядзець на Зямлю з космасу, як рабіў тое пан Кубліцкі ў кампаніі са сваім Зорным роварам.

Праўдападабенства ў рамане “Дванаццацць подзвігаў Геракла” ствараецца не толькі вялікай колькасцю дэталяў кшталту рознакаляровага вока гідры ці дзюбы мёртвага жалезнага птаха. Адчуванне сапраўднасці дае здольнасць апісваць падзеі з розных ракурсаў адначасова. Васючэнка дэманструе ўменне думаць, як гідра, думаць, як антычны бог, думаць, як сведка падзей. Дарэчы, гэта несумненная ўдача кнігі – вобразы сведкаў падзей. Гэта не толькі вядомы па міфах сваяк Геракла Іялай, адказны за “навуковую частку” подзвігаў, але і два казапасы і фінікійскі гандляр, якія ўвасабляюць у кнізе беларускі менталітэт.

Менавіта з імі звязаны самыя смешныя і разам з тым самыя трагічныя моманты аповеду пра прыгоды Геракла. Абсалютна беспрынцыпныя казапасы і гандляр перасоўваюцца па свеце, кіруючыся толькі тым, каб патрапіць, дзе трава зялянейшая ды грошай паболей. Нягледзячы на знаёмства з Героем і ўсведамленне яго моцы, адвагі і высакароднасці, яны ў любы момант здатныя прадаць яго з трыбухамі, каб адвесці ад сябе ўвагу.

Так, у эпізодзе з паляваннем на кірэнейскую лань казапасы, нягледзячы на тое, што ўжо не аднойчы былі абавязаныя Гераклу жыццём, без ценю сумневу “здаюць” яго Артэмідзе: *Злітуйся, багіня*! *Гэта ўсё чужаземец*! *Крадзе чужых казлоў, паганіць святыні, блюзнерыць*! [2, с. 35]. Пры гэтым кожнага разу пад выглядам змагання за святыні, ідэалы і традыцыі яны ўхітраюцца праводзіць

свае прыземленыя, утылітарныя зацікаўленасці, вельмі далёкія ад памкненняў схільнага да рэфлексій Геракла. І хоць часам яны дапамагаюць герою то блінцом, то дойкай шалёных кароў, давяраць ім – як і купляцца на словы гнуснага цара Эўрысфея, не варта. Ані ўдзячнасці, ані захаплення, ані падтрымкі, затое колькі хочаш крыўдаў, подласцяў, змоў – ну чым не сучасная Беларусь?

Гэты момант "пазнавання" беларускіх рэалій на тле Старажытнай Грэцыі – яшчэ адна грань трагікамічнага ў творы Васючэнкі, якая падказвае, што твор адрасаваны ў першую чаргу дарослым.

Вось на галоўнай плошчы Феміскіры збіраюцца старшыні – "пажылыя амазонкі, даволі агрэсіўныя бабулі". Як заўважае аўтар, "асобныя з іх зусім здзяцінелі, але іх шанавалі за сталы век і былыя подзьвігі", але "так ужо было заведзена ў краіне амазонак: да голасу бабулек прыслухоўваліся" [2, с. 110].

А вось іпадром у Абдэры, дзе гледачы, на заклік мясцовага цара, з гатоўнасцю скандуюць: "Фракія для фракійцаў! Фракія для фракійцаў!"

Кожны ўдзельнік такога нікчэмнага форуму лічыць сябе не проста правым, але і найсправядлівейшым суддзём, які дзейнічае не на загад і па волі цара, бога ці проста маніпулятара-падбухторшчыка, а выключна па сваім уласным выбары! Разам з тым паралелі з сучаснасцю ў Васючэнкі абсалютна не лабавыя, ён умудраецца заставацца цалкам у межах стылістыкі міфа.

Так, звяртаючыся да Героя, жрэц Апалона кажа: *Барацьба працягваецца, Геракл. Тыфон ды Яхідна, адроддзі Геі, па-ранейшаму спараджаюць пачвараў, а насельнікі нябёсаў бесклапотна смактуюць нектар ды амброзію на Алімпе. Ахвярамі пачвараў становяцца людзі, іх занадта мала, каб супрацьстаяць пачва-рам. А гэтых столькі напладзілася апошнім часам! Агнядышачы Тыфон. Тытаны. І гэтая агідная Яхідна са сваімі мяшанцамі… Але, Геракл, поўзаюць у свеце і больш вучцішныя стварэнні. Гэта і ёсць тыя самыя "чарвякі земляныя", з якімі, ты, Геракл, будзеш дужацца* [2, с. 16–17].

Гэтыя "чарвякі земляныя", як і "ружовы туман", і многія іншыя коды пазнейшага часу, – даніна постмадэрнавай гульні, але, насамрэч, гульня гэта ў Васючэнкі выглядае не самамэтай, а толькі лёгкай стылістычнай аздобай для ўзмацненя камізму.

Пры ўсёй лёгкасці чытання (раман на дзіва дынамічны!) цяжка не заўважыць рацыяналізм творчага метаду пісьменніка. Калі ў тэксце з'явіўся адметны вобраз – чытач можа быць упэўнены, што ён, як тое ружжо на сцяне, абавязкова стрэліць. Так, на пачатку кнігі ёсць дзіўная метафара, якой пісьменнік апісваў Парнас. "…вяршыня яго заўсёды хавалася ў белым, бы казінае малако, покрыве аблокаў" [2, с. 8]. Метафара здавалася празмерна ўдакладненай, бо ў рэшце рэшт якая сучасніку справа да адценняў малака? Аднак аўтар здолеў пабудаваць на колеры малака цэлы сюжэт.

Такія ланцужкі яднаюць усю кнігу "Дванаццаць подзвігаў Геракла", якая, пры ўсёй сваёй бурлескнасці, з'яўляецца вельмі цэльнай, збалансаванай і мае вельмі акрэслены мэсідж да чытачоў усіх узростаў. Напэўна, яго можна акрэсліць так: "Не важна, які ты. Галоўнае, каб ты быў на сваім месцы". Гэты дэвіз Пятро Васючэнка цалкам рэалізаваў у сваім асабістым і творчым жыцці.

ЛІТАРАТУРА

1. *Васючэнка, П.* Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага / П. Васючэнка ; іл. К. Баранавай. – Мінск : Кнігазбор, 2018. – 104 с.
2. *Васючэнка, П.* Дванаццаць подзвігаў Геракла / П. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2013. – 152 с.

УДК 821.161.3

Н. Б. Лысова (Мінск)

СІМВАЛІЗМ ЯК МЕТАД ЛІТАРАТУРНАГА І КРЫТЫЧНАГА ДОСВЕДУ Ў СПАДЧЫНЕ П. ВАСЮЧЭНКІ

Асноўнай тэмай даследчыка П. Васючэнкі, пачынаючы з дысертацыйнага даследавання міфалагізму і сімвалізму ў творчасці Віктара Казько, быў сімвалізм як метад беларускай літаратуры. У 1980-я гады, калі пачынае навуковую дзейнасць Пятро Васючэнка, цікавасць да нерэалістычнах стыляў яшчэ не так займала айчынную літаратуразнаўчую думку. Але праз дзесяць гадоў яна ўзрастае з нагоды рэабілітацыі, так бы мовіць, негенеральных, абвешчаных калісьці другаснымі літаратурных плыняў. З'яўляюцца артыкулы і кнігі, дзе творчасць нацыянальных літаратараў XX стагоддзя вызначаецца не толькі ў межах рэалізму. Айчыннае літаратуразнаўства ў 1990–2000-я гг. гаворыць аб сімвалізму, мадэрнізму, дэкадэнстве ці містычнасці беларускай літаратуры. З'яўляюцца вызначэнні «Новы Шамякін», «Новы Быкаў», «Новы Купала» ды інш. Новы погляд быў абазначаны ўдумлівым аналізам папярэдняга літаратурнага працэсу, развітаннем з догмамі сацыяльнай крытыкі, выпрацоўваннем новых ідэй у кантэксце іншай культурнай сітуацыі. Актыўна разглядаюцца праблемы міфа і сімвала. Пры гэтым праявы зацверджання сімвалізму маюць у айчынным літаратуразнаўстве апірышча як у язычніцкім светаўспрыманні, так і ў адраджэнскім рэлігійным светапоглядзе.

Так, падобны падыход стаў сёння распаўсюджаным у беларускім літаратуразнаўстве. Вядомы беларускі даследчык Я. Гарадніцкі сцвярджае ў кнізе «Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць» (2014), што тэндэнцыя разглядаць нерэалістычныя напрамкі ў беларускай літаратуры перыяду нашаніўскага Адраджэння з'яўляецца заканамернай, бо «яна сведчыць пра імкненне суадносіць развіццё беларускай літаратуры з сусветным мастацкім працэсам» [1, с. 75]. А М. Тычына, аўтар манаграфіі «Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння», выдадзенай у 2012 г., канстатуе ўжо, што нацыянальны стыль мае сінкрэтычны характар, які быў закладзены класікамі беларускай літаратуры напачатку стагоддзя: «У творчасці нашых класікаў у найвышэйшай ступені нагадвала пра сябе такая ўнікальная беларуская з'ява як сінкрэтызм, інакш кажучы, натуральнае спалучэнне яшчэ нядаўна неспалучальнага: фальклярызму і эстэтызму, рамантызму і рэалізму, імпрэсіянізму і сімвалізму» [2, с. 233].

Але першым, хто пачаў вынаходзіць менавіта сімвалісцкую паэтыку твораў нашых класікаў, быў Пятро Васючэнка. Ён сістэматызавана распрацоўваў тэму сімвалізму ў беларускай літаратуры на працягу амаль сарака гадоў, за якія выйшлі дзясяткі артыкулаў. На шляху свайго даследавання аўтар пісаў падагульняючыя выніковы кнігі, у большай ступені прысвечаныя генеральнай гіпотэзе аб эстэтычнай паўнавартасці сімвалізму ў беларускай літаратуры: «Драматургічная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучаснага прачытання» (1994), «Славянскі сімвалізм: нацыянальна-адметнае і агульнае» (1998), «Сучасная беларуская драматургія» (2000), «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» (2004, другое выданне – 2016), «Адлюстраванні першатвора» (2004), «Ад тэксту да хранатопа» (2009).

Ад кнігі да кнігі назапашваўся не толькі літаратурна-крытычны матэрыял, але і аналіз кантэксту нараджэння і існавання літаратурных тэкстаў: пашыралася

бачанне суадносінаў развіцця беларускай літаратуры з сусветным мастацкім, сацыяльна-культурным і духоўна-светапоглядным працэсамі. Даследчыка Васючэнку прыцягвалі і сярэднявечныя тэксты, і семіятычныя даследаванні, і тэорыя рэлігіі, і культуралагічныя сімвалісцкія канцэпцыі, і тэксты французскага літаратурнага сімвалізму, і творы-маніфесты рускіх сімвалістаў. Аналіз беларускай літаратуры ў шырокім кантэксце гісторыі культуры дазваляў аўтару прасачыць магчымасці сімвала ў пазнанні быцця, у набліжэнні да таямніцы рэальнасці.

Пятром Васючэнкам быў зроблены тыпалагічны параўнальны аналіз беларускага і сусветнага сімвалізму пачатку XX ст. Да традыцыйных чатырох еўрапейскіх сімвалісцкіх уплывовых накірункаў (французскага, паўночнага, польскага і рускага) даследчык дадае і славацкі. Аўтар знайшоў агульнае і адрознае, напрыклад, у мастацкай вобразнасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, М. Багдановіча і славацкіх пісьменнікаў І. Краскі, У. Роя, Я. Есенскага. Нацыянальныя сацыяльна-гістарычныя ўмовы спрыялі нараджэнню ў сусветнай літаратуры сімвалісцкай паэтыкі ў адпаведных алегорыях, метафарах, вобразах, якія, на думку Васючэнкі, дазвалялі «замяняць сабой нацыянальную філасофію, што пачынала толькі фармавацца ў кожнай з краін» [1, с. 119]. Літаратараў розных краін аб'ядноўвалі такія вобразы-сімвалы, як «доля», «шлях», «дом», «ноч». Іх творчасці ўласцівы антрапалагізацыя прыроды, матывы вяртання, адзіноты, журбы і безнадзейнасці. На розных геапалітычных прасторах адначасова ствараліся тоесныя сімвалісцкія мастацкія сістэмы: «…мадэлі пасіянарнага, "вітальнага" сімвалізму, стылю "рэактыўнага", здатнага на сінтэз і ўзаемадзеянне з праявамі імпрэсіянізму, новарамантызму, рэалізму» [1, с. 121].

Літаратуразнаўца распрацаваў тэарэтычны падыход да вызначэння сімвалізму. Так, у манаграфіі «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» (2016), у першым раздзеле з адпаведнай назваю «Прарыў у неабазнанае. Еўрапейскі літаратурны сімвалізм: генезіс, эвалюцыя, мадэлі» Васючэнка выкладае свае гісторыка-тэарэтычныя палажэнні асноўнага стылістычнага метаду [3]. Для сімвалізму як першатваральнай энергіі мастацтва даследчык у першай рэдакцыі манаграфіі выкарыстоўваў прынцып нумерацыі – СІ, СІІ (для вызначэння сімвалізму як сродку выразнасці і як літаратурнага напрамку суадносна). Ён арыентаваўся на гістарычную тыпалогію (СІ, СІІ, СІІІ) рускага сімвалізму, прынятую А. Ханзен-Левё ў кнізе «Русскі сімвалізм. Сістэма паэтычных матываў. Ранні сімвалізм» (1999). У апошняй версіі манаграфіі Васючэнка адмовіўся ад папярэдняй нумерацыі, таму што яго даследаванне «грунтуецца на якасна адрозных гістарычных праявах сусветнага мастацкага сімвалізму: сімвалізм як мысленне і сімвалізм як літаратурная плынь» [1, с. 18].

Уяўленне пра сімвалізм як мэтапазнавальны накірунак мастацтва, як мастацкая прэзентацыя пошуку трансцэндэнтальнага дазволіла аўтару рабіць высновы аб пароцтве пісьменнікаў-сімвалістаў, творчасць якіх не абмяжоўваецца гістарычнымі, часовымі, межамі. Так, «ускладненая сімволіка і метафорыка, наяўнасць гратэску і абсурдысцкага смеху» [1, с. 131] у п'есе «Тутэйшыя» Янкі Купалы вакол тэмы мовы і нацыі-сям'і, на думку даследчыка, дазваляюць аўтару размаўляць аб сённяшніх праблемах глабалізацыі, культурнай «яміны, у якую трапляе чалавек, заражаны вірусам "тутэйшасці"» [1, с. 131].

Нам падаецца, тут аўтар выйшаў да высноў сімвалізму як базіснага метаду культурнай дзейнасці чалавека. Абвешчанае Э. Касірэрам яшчэ напачатку XX стагоддзя разуменне культуры як сімвалісцкай дзейнасці, як метаду сацыякультурнага прыстасавання чалавека да прыроды, у шэрагу з навукаю, міфам,

моваю і д.п., атрымала працяг у філасофіі (герменеўтыка Г. Гадамера, філасофія культуры І. Хёйзінгі), у псіхалогіі (архетыпы К. Юнга, філасофія мовы Л. Вітгенштэйна), у сацыялогіі (інтэракцыянізм Дж. Мід, Г. Блумера, И. Боффмана) і г.д. Сімвалісцкі падыход да аналізу літаратурнай дзейнасці таксама пачынаўся напачатку мінулага стагоддзя, у кантэксце культурнай, мадэрнісцкай, рэвалюцыі поглядаў мастакоў слова. Але потым культурны застой, ці сацыяльная робатызацыя чалавека, паступова замянілі сімвалісцкі падыход на сацыльна дэтэрмінаваны, псіхалагічна ці біяграфічна абгрунтаваны аналіз.

У цэнтры даследаванняў П. Васючэнкі былі постаці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Геній Купалы здолеў пераадолець эпоху ХХ стагоддзя: «Купалаўская эстэтыка, гэтаксама, як і купалаўская сімволіка, уяўляюцца адкрытымі сістэмамі, дзе можна адшукаць нечаканыя выхады да іншых сістэм, школ, кірункаў, у тым ліку мадэрнізму, нават “тэатра абсурду”, постмадэрнізму, экзістэнцыяналізму» [4, с. 56]. А коласаўская пантэістычная эстэтыка, што «навеяна як загадкавай беларускай прыродай, з якой шукаў гармоніі аўтар, так і чытаннем нямецкіх ды скандынаўскіх аўтараў (Ф. Ніцшэ, К. Гамсун)» [4, с. 144], спалучае дарослае з дзіцячым, рацыянальнае з містычным, нараджае «вобраз-сімвал зямной кнігі, таямнічага тэксту, выснаванага прыродай» [4, с. 144].

У кнігах і артыкулах П. Васючэнкі былі распачаты наватарскія інтэрпрэтацыі твораў Я. Купалы, перш за ўсё тых, што прынята называць сімвалісцкімі. Даследчык акцэнтаваў увагу чытачоў на творчым ваганні Я. Купалы «паміж простым ужываннем …сімволікі … і праявай сімвалізму як стылю» [1, с. 68], якое і ўтварае розніцу паміж рамантычнымі і сімвалісцкімі творамі Купалы, паміж выбарам фальклорна-міфалагічнага сімвала або літаратурнага сімвалізму з яго пошукам трансцэндэнцыі, дзе сімвал ужо выступае ў якасці «галоўнай прылады гэтага пошуку», прапануючы «шматзначнасць, цьмянасць, зменлівасць настрою, магію слова, прынцып музычнасці і г.д.» [1, с. 69]. Аўтар вылучаў творы Я. Купалы, у якіх прадстаўлены «сімвалізм у яго асноватворных рысах, генезісе і эвалюцыі …, нарэшце, у форме канкрэтнага літаратурнага ўплыву»: лірыка часоў «Гусляра» і «Шляхам жыцця», некаторыя творы ў зборніках «Жалейка», «Спадчына» і «Безназоўнае», паэмы «На Куццю», «На Дзяды», «Безназоўнае», драматычныя паэмы «Адвечная песня», «Сон на кургане», «На папасе», п’есы «Раскіданае гняздо», часткова «Паўлінка», «Тутэйшыя», пераклад на беларускую мову сімвалісцкай паэмы польскага пісьменніка Ежы Жулаўскага «Эрас і Псыха».

Аналізуючы ўплыў на творчасць беларускага класіка рускага літаратурнага сімвалізму, П. Васючэнка зазначаў яго сацыяльна-асветніцкі характар: «Вопыт рускіх літаратараў-сімвалістаў шмат у чым стымуляваў унутраную гатоўнасць песняра да жыццятворчасці, у выніку якой Я. Купала з яго паплечнікамі стварыў матрыцу нацыянальнага Адраджэння і будучай Беларусі» [1, с. 94]. У адрозненне ад папярэдніх даследчыкаў Васючэнка зноў падкрэсліваў інтэлектуальны складнік літаратурнага пошуку песняра, арыентацыі яго да сімвалісцкага перыяду сусветнай літаратуры. Нацыянальна-культурнае асяроддзе вакол выдання «Нашай Нівы» было дасведчаным «у найноўшых літаратурных праявах, сачылі за літаратурным працэсам, а Вільня, Санкт-Пецярбург, дзе засяроджваліся прадстаўнікі беларускай творчай інтэлегенцыі, не былі культурнай правінцыяй Еўропы, а наадварот, актыўна рэагавалі на найноўшыя яго праявы» [1, с. 54].

Напрыклад, васючэнкаўскае супастаўленне п’ес Л. Андрэева і Я. Купалы заканчваецца высновай: «Лёс Я. Купалы не ёсць лёсам Мужыка. Мадэль жыцця

Я. Купалы – ікарыйская, гэта гісторыя ўзлёту, адрыву ад зямной будзённасці, спыненага палёту, падзення. Яна таксама прадказана ў лірыцы і драматургіі песняра. Але Янка Купала прадказваў і іншае: лёс беларускага нацыянальнага Адраджэння, грамадска-палітычнай мэтай якога была дзяржаўная незалежнасць. Пракручасты шлях да яе ў сімвалічнай форме перададзены ў купалаўскіх творах» [1, с. 101].

Трэцяя глава манаграфіі П. Васючэнкі «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» (2016) пачынаецца супастаўленнем вобразна-сімвалічных сістэм Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама аналізам твораў Коласа. Аўтар адзначае прынцыповую розніцу вектараў сімвалізацыі двух пісьменнікаў: нябеснага і зямнога, трансцэндэнтальнага і містэрыяльнага, мілетскага і евангельскага адпаведна ў творах Купалы і Коласа.

Васючэнка імкнуўся зрабіць відавочнай творчую лабараторыю Якуба Коласа: ад пошуку ідэі гармоніі прыроды і жыцця чалавека ў старажытнай і сучаснай паэту кніжнай мудрасці да стварэння вобраза-сімвала «зямной кнігі, таямнічага тэксту, выснаванага прыродай» [1, с. 144] у паэме «Новая зямля» і ў кнізе «Казкі жыцця». Пры гэтым даследчык адзначаў спецыфічна сімвалісцкія прыёмы выкладання ідэі твора (раздваенне свядомасці, «люстэрка»), засяроджваў увагу на схаваным, невытлумачальным сэнсе паэмы («здрада зямлі»), на матывах вяртання да Жанчыны і ўзаемапалявання чалавека і звера, расчытваў вобразы крыжа і шляху ў творчасці песняра.

Гучаць па-новаму вызначэнні літаратуразнаўцаў і другіх беларускіх пісьменнікаў. Так, Максім Гарэцкі абазначаны як інтэлектуал, «зачараваны патаемным». Пісьменнік-рэаліст разглядаецца ў набліжэнні да трансцэндэнтальных пытанняў, што адмыслова залічваецца да сімвалісцкай пісьменніцкай працы. Спрэчна? Канешне. Але крытык меў рацыю, бо творы Гарэцкага – прыклад разважання аб сусветных, нацыянальных, асабістых праблемах існавання чалавека, якім характэрны «некатэгарычнасць і дыялагізм у развагах,… рэфлексійнасць і дапытлівасць, пераўтваральны пачатак, зачараванасць патаемным» [4, с. 144]. Сімвалісцкі характар мае і філасофская лірыка Алеся Гаруна. Васючэнка заўважае, што ў творчасці паэта «мастацкая канцэпцыя чалавечага існавання здабываецца праз іншасказ, праз шэраг вобразаў-сімвалаў, прадугледжвае сферу неабазнанага, трансцэндэнтальнага, адкуль бяруць вытокі анталагічнай з’явы» [4, с. 146]. Даследчык сцвярджае, што ў беларускай літаратуры менавіта сімвалізм (у параўнанні ў іншымі мадэрнавымі плынямі) набыў «найбольшае развіццё» [4, с. 42], з яго імкненнем да інтуітыўнага пазнання, да набыцця новых ідэалагем у кантэксце «гібелі багоў». Такім чынам, сімвалізм ёсць рэакцыя ці афармленне новай рэальнасці. Такія сутнасныя якасці літаратурнага сімвала, як яго плюралістычнасць, крэатыўнасць, «ідэалагічная дынаміка, незавершанасць, футуралагічная неакрэсленасць, варыятыўнасць, авантурнасць» [4, с. 32], надаюць яму моцы менавіта ў пераходныя перыяды, калі складаецца і развіваецца беларуская класічная літаратурная традыцыя.

У аналізе Васючэнкі таксама ёсць дэшыфроўка падвойных сэнсаў сімвала – калі першы сэнс азначае канкрэтныя рэчы, паняцці, то другі носіць містычны характар. Гэта спроба пісьменнікаў зазірнуць у іншасвет, у недасяжнае. Для беларускай літаратуры вобразам-сімвалам такой містыфікацыі можа стаць Лесунова люстэрка Максіма Багдановіча з цыкла «У зачараваным царстве», якое так падрабязна і філасафічна аналізаваў Пятро Васючэнка. Багдановічава

«краіна-самнабула» [4, с. 135] ці не карнавалізацыя сакральных тэкстаў, што адбываецца на падставе гульні са Словам, ці Першатворам, бо, як пісаў Васючэнка, «Святло ад Першатвору прайшло праз чорны калодзеж міфалогіі, адбілася ў шматлікіх люстэрках літаратурнага часу – міфалагемах» [5, с. 4].

Не аднойчы звяртаўся Пятро Васючэнка да аповесці «Лабірынты» Вацлава Ластоўскага. Для даследчыка гэта тэма была звязана з яго малой радзімай, Полаччынай. Творчасці славутага навукоўца прысвечана глава «Першаадкрывальнік з роду Ластаў» у кнізе «Ад тэксту да хранатопа» (2009). Тут аўтар звярнуў увагу на гістарычна-культурны сэнс вобраза «лабірынтаў», на спробу скласці нацыянальную міфалогію накшталт старадаўніх літаратурных традыцый і сучаснага пісьменніку літаратурнага праекта Р. Р. Толкіена.

Літаратуразнаўца канстатаваў справядлівасць крытычных спробаў вызначэння постмадэрнісцкіх канцэптаў у аповесці Ластоўскага. Далей жа ў манаграфіі «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» ён праводзіў думку аб тыповым падабенстве вобразаў-сімвалаў В. Ластоўскага з вобразнай сістэмай і інтэлектуальных дэтэктываў У. Эка і літаратурных містыфікацый Х. Л. Борхеса. Зрабіць такія высновы дазволіла даследчыку прынцыповая пазіцыя вызначэння сімвалісцка-вобразнага метаду пісьменства як пазнавальнага працэсу, які скіраваны на пошук «неабазнанага». Назва падраздзела пра творчасць В. Ластоўскага ў манаграфіі 2016 г. так і гучыць – «Захоплены лабірынтамі: трансцэндэнтальны пошук Вацлава Ластоўскага».

Крытык Пятро Васючэнка прапанаваў і сваю методыку сімвалісцкага, або звышабагуленага аналізу, у арбіту якога ўключаны культурны вопыт чалавецтва і які мае вобразны характар, што адчыняе ці прадугледжвае распачаць размову аб канцэптах свету. Пятрогліфы, крытычны жанр, выдуманы Васючэнкам, прадугледжваюць дэкадыроўку, расшыфроўку твора, дыскусію вакол сэнсаў, закладзеных у мастацкім слове. Крытык такім падыходам зноў упісваў беларускую літаратуру ў сусветны мастацкі працэс. Адны і тыя ж сімвалы-вобразы, матывы-міфалагемы яднаюць мастакоў розных часоў і розных краін: «Шэкспіраўскі Гамлет і купалаўскі Машэка трапілі ў аднолькавую сітуацыю … Унутраная сіла абвяргаецца ўласным жа бяссіллем. Лягчэй прыкінуцца вар’ятам, як гэта робіць Гамлет, або крывавым людажэрам, як Машэка, чым адважыцца на ўчынак ці зрабіць справу» [6, с. 33].

Пятро Васючэнка быў упэўнены, што пісьменнікі пішуць сваё жыццё на паперы, валодаюць сваім лёсам у мастацкім дыярушы. Пра гэта ён распавядаў студэнтам на лекцыі пра В. Ластоўскага і ў радыёвыступах з аналізам вершаў Лермантава. І гэтае веданне не дапамагло яму асабіста пазбегнуць лёсу заўчаснага зыходу з Зямлі на Нябёсы. У апошнім сваім творы ён прыдумаў ровар з залацістым гузікам на шчытку: «Варта яго націснуць – і ровар перанясе цябе ў зорную прастору, падорыць азарэнне. Таму і завецца “Зорны Ровар”» [7, с. 15]. Але жорсткі рок валодаў рукой пісьменніка. І Ён напісаў свой далейшы лёс. Ён напісаў пра тое, як яго літаратурны герой паляціць у неба. Як гэта заўжды здараецца, смеючыся над пані Смерцю, майстра справакаваў свой зыход. Ён пайшоў з жыцця, не пераадолеў жорстка запланавай чалавечай хады па зямлі – ад нараджэння да небыцця. Яго герой кінуўся да ровара з мэтай знайсці сэнс жыцця і здолеў адчуць, што сэнс гэты застаўся там – унізе, на зямлі, у выбрыках жыцця і прыроды. Герою давялося вярнуцца, а стваральніку літаратурнага аповеда – не.

ЛІТАРАТУРА

1. *Гарадніцкі, Я. А.* Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць / Я. А. Гарадніцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 401 с.
2. *Тычына, М. А.* Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння / М. А. Тычына. – Мінск : Беларус. навука, 2012 .– 495 с.
3. *Васючэнка, П. В.* Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм / П. В. Васючэнка; навук. рэд. В. П. Жураўлёў. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : МДЛУ, 2016. – 200 с.
4. *Васючэнка, П.* Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм. – Мінск : МДЛУ, 2004 – 155 с.
5. *Васючэнка, П.* Адлюстраванні Першатвора. Літаратура ў філалагемах і пятрогліфах. – Мінск : Логвінаў, 2004.
6. *Васючэнка, П.* Драматург як дэміург: да пытання пра крэатыўную місію аўтараў / П. Васючэнка. // Время. Искусство. Критика: сб. науч. тр. / под ред. Л. П. Саенковой. – Мінск : БГУ, 2010. – Вып. 2 – 200 с. – (СМИ и худож. культура).
7. *Васючэнка, П.* Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага / П. Васючэнка. – Мінск : Кнігазбор, 2018. – 104 с.

УДК 821.161.3.09(045)

Н. Ю. Паўлоўская (Мінск)

ВЫПРАБАВАННЕ ЖЫЦЦЯ НА ЛІТАРАТУРНАСЦЬ

Пятро Васільевіч Васючэнка… Літаратуразнаўца. Філосаф. Пісьменнік. Журналіст. Дарадца. Лепшы загадчык кафедры …. Высакародны, інтэлігентны, тактоўны, спагадлівы і адначасова патрабавальны, які за многія гады працы ні на каго не павысіў голас, нікога не абразіў. Да кожнага ён меў уласны падыход, што давала выкладчыкам магчымасць фарміравацца ў высакаякасных спецыялістаў. У чалавеку ён бачыў лепшыя рысы і развіваў іх, не звяртаючы ўвагі на дробязі.

Бездакорнае адчуванне беларускага слова і віртуознае валоданне ім дазволіла Пятру Васільевічу ўвасобіць свае выпакутаваныя, адточаныя філасофскія, літаратурныя, эстэтычныя думкі ў таленавітыя мастацкія творы, навуковыя даследаванні, у бліскучыя афарыстычныя разважанні[1]. Уся літаратурная і навуковая спадчына П. В. Васючэнкі прысвечана адказу на пытанне, хто ёсць беларус, яго менталітэт, месца і роля сярод іншых, філасофія, характар, гэта значыць, у чым сэнс уласнага жыцця і дзейнасці чалавека.

Духоўна-псіхалагічнае ядро асобы беларуса, беларускага этнасу, яго стратэгічная культурная і сацыяльная праграма змяшчае, з пункту погляду П. Васючэнкі, як станоўчыя, так і адмоўныя рысы. З аднаго боку, беларускі характар падобны на расліну, «чуйную да святла і цяпла, пакорлівую і пластычную да часу», але «здольную прабіваць і бетон, і асфальт». З другога боку, знаходзячыся стагоддзямі пад гнётам прыніжэння, беларусы спазналі і агрэсію, «прагу разбурэння», «крывавай помсты», «здраду», і «цярплівасць (падабаецца, не падабаецца – цярпі) як прадукт разувасаблення». Беларусы хаваюцца «ў цень ад саміх сябе».

Адна з адмоўных рыс беларускага характару – «тутэйшасць як сіндром нацыянальнага імунадэфіцыту»: «іншыя нацыі крадуць чужых класікаў, а беларусы імкнуцца задарма аддаць сваё чужым»; «беларусы ўпарта сцвярджаюць сваю адсутнасць». «У нас дзіўная гістарычная звычка – рабіць сябе меншымі ад большых. Нават калі той *большы* – меншы. Так, старшым братам мы назвалі народ Масковіі, маладзейшы за нас». У гэтых словах боль за Радзіму, прыкрасць, і горыч… І адначасова разуменне падобнага стану спраў як сумы гіста-

[1] Прыводзяцца цытаты з кніг П. Васючэнкі «Адлюстраванні першатвора: літаратура ў філалагемах і пятрогліфах», «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі: казачныя аповесці», «Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага», «Піраміда Ліннея».

рычных матывацый, «учынкаў ды іх наступстваў». Нягледзячы ні на што, П. Васючэнка раіць беларусам глядзець «знізу ў неба…. Тады мы пабачым лесьвіцу ў неба, што прымроілася аднаму біблейскаму прароку. Але лесьвіцу трэба ладзіць самім», – праройкі абвяшчае аўтар.

Беларусь у роздумах П. В. Васючэнкі – «самотная нявеста», але «рана або позна мёртвае адмірае, Беларусь скідвае зношанае цела, спальвае яго на ахвярні, як птушка Фенікс. Беларускі Фенікс паўстане ў абноўленым, маладым, святочным целе. Дай Божа, каб гэтае цела апранула здаровы, неўміручы Беларускі Дух». У «брудзе і ашклёпках, непагадзі жыцця» аўтар бачыць «святло Першатварэння, як мы не сумняваемся ў прысутнасці сонца, засланага касмакаватымі хмарамі».

Беларускі характар, піша П. В. Васючэнка, нясе ў сабе супраціў: «расліна ёсць сімвал ціхмянага беларускага супраціву. «Унутраны супраціў: я не хачу, каб так было. Я гэтага не прымаю. Я пратэстую». І праўдзівасць гэтых слоў паказала само жыццё, сучаснае пакаленне беларусаў – смелых, адкрытых, стойкіх, крэатыўных, самаахвярных. Узаемадапамога, арганізаванасць, выхаванасць, падтрымка – вось, што робіць з нас адзіны народ, тое, чым мы можам ганарыцца. Гэта і ёсць выпрабаванне жыцця на літаратурнасць, калі «жыццё счытваецца з матрыцаў літаратуры», якое прадказаў таленавіты літаратар і навуковец П. Васючэнка: беларусы «асуджаныя … будаваць сябе паводле Багдановіча, паводле Караткевіча, паводле Абдзіраловіча альбо паводле іншых схемаў, … якія ад пачатку зашыфраваныя былі ў Першатворы».

Дзякуючы гэтым лепшым якасцям «заняпад беларушчыны і безнадзейнасць беларускага», на думку аўтара, адкладваюцца. Асіміляцыя ж беларусаў іншымі этнасамі немагчыма «ні за 18, ні за 18 тысяч гадоў», таму што тып мыслення беларуса, яго аснова – «філасофія намеру і волі».

Талент, далікатнасць, дасціпнасць, іронія, неабходныя для кожнага, хто працуе са словам, – уласцівасці Пятра Васільевіча як празаіка, драматурга, паэта, аўтара мастацкіх твораў для дзяцей і дарослых. Усе яго аповесці, казкі, пятрогліфы, філалагемы прасякнуты аўрай беларускай душы, найбагацейшай культурай, што дазваляе чытачу ўбачыць разнастайныя, шматзначныя рысы і адценні беларускага характару.

Нездарма мастацкія творы П. Васючэнкі ў якасці ўзорных тэкстаў вывучаюцца не толькі літаратуразнаўцамі, але і лінгвістамі. Так, шэраг маіх артыкулаў прысвечаны ўвасабленню лінгвістычнай катэгорыі мадальнасці (адносіны зместу выказвання да рэчаіснасці з пункту погляду моўцы) у казках пра паноў Кубліцкага і Заблоцкага. Цудоўны, бездакорны паводле формы і зместу фактычны матэрыял прыцягвае ўвагу і маладых навукоўцаў. Аспірантка МДЛУ А.С. Бахановіч, даследуючы праблему ўвасаблення іроніі ў мастацкім дыскурсе на беларускай і англійскай мовах, знайшла дасканалыя прыклады для аналізу менавіта ў творах П. В. Васючэнкі.

Ото ж былі паны! Колькі яны пазараблялі гузоў на свае галовы – усё праз фанабэрыю, прагавітасць, недарэчныя дзівацтвы! І шкода часам іх, ды смех разбірае: ну ж і шалапуты! – чытаем у кнігах, адрасаваных дзецям малодшага ўзросту. Але гэтыя тэксты, як эталон сучаснай нацыянальнай аўтарскай казкі, дзе знаходзім сапраўдны беларускі гумар, сатыру, іронію, гратэск, сарказм, цудоўныя гіпербалы, шмат глыбінных сэнсаў, выклікаюць у першую чаргу інтарэс дарослых, паколькі тут зноў ставяцца пытанні, звязаныя з жыццём, духоўным светам, культурай, паводзінамі беларусаў. Разнастайныя сэнсавыя

пласты ствараюць найбагацейшую мадальную паліфанію казак, якая эксплікуе адносіны герояў да рэчаіснасці, разнастайных падзей, а галоўнае, аўтара да сваіх персанажаў, да жыцця, сфарміраваныя на аснове ўласнага духоўнага вопыту, культурна-гістарычных здабыткаў беларускага народа.

Паны, з аднаго боку, жыццялюбівыя, дапытлівыя, мэтанакіраваныя, рашучыя, рамантычныя, эмацыянальныя, з другога – эгаістычныя, не прывучаныя да працы, лянівыя, ганарыстыя, расхлябаныя, інфантыльныя і інш. Аднак за іх скамарошнымі, фантасмагарычнымі паводзінамі праглядаецца глыбокі інтэрмадальны план, што эксплікуе станоўчыя і адмоўныя кагнітыўныя стэрэатыпы беларусаў.

У казках пра паноў, якія *праелі, прапілі, прагулялі сваю гаспадарку*, а пасля *сеялі рэпу, наседжвалі яйка з-пад Куры-Шчабятуры, гулялі ў газарднyя гульні…, змагаліся з Цмокам паганым, хадзілі на вайну з каралём Гарбузом, стралялі са стрэльбы па прусаках ды мелі іншыя прыемныя забаўлянкі*, ёсць, акрамя іх і шматлікіх іншых герояў, яшчэ адзін тыпаж у некалькіх іпастасях – гэта рэальны чалавек (сам пісьменнік) і адначасова суб'ект апавядання – удзельнік казачных падзей. Падобная форма з двухсуб'ектным аўтарам стварае «эфект аб'ёмнасці» [1, с. 65] пры апісанні персанажаў і гісторый пра іх, якія аўтар ацэньвае, наконт якіх ён разважае, абураецца ці захапляецца імі. Казачнік-апавядальнік, безумоўна, любіць усіх сваіх герояў, ва ўсякім разе яны ўсе яму цікавыя, паколькі, знаходзячы максімальна яркую і пераканаўчую форму ўвасаблення, праз іх ён маніфестуе свой светапогляд, маральныя прынцыпы, устаноўкі. Неадназначны, шматгранны вобраз аўтара фарміруе глыбінныя сэнсы твора, якія не ляжаць на паверхні, а больш узгадваюцца, чым чытаюцца ў моўных знаках.

Аўтарская думка казак будуецца шматлікімі мадальнымі адзінкамі з семантыкай меркавання. Гэта дзеясловы *думаць, меркаваць, памятаць*, мадальныя словы *можа, вядома, магчыма*, канструкцыі з інверсіяй: *былі часы, як казаў паэт, так казаў фальклор, а праўда тое ці не, мы не ведаем, казала людская пагалоска, народная пагалоска кажа, але ці так гэта*?

Меркаванне ў беларускай мове – гэта «1. Думка, погляд. 2. Разлік, дапушчэнне. *Меркаваць* – 1. Гаварыць, разважаць, абмяркоўваючы што-н., думаць. 2. Рабіць якія-н. вывады, дапушчэнні, здагадкі. 3. Мець намер, план. 4. Ацэньваць якім-н. чынам, рабіць заключэнне. 5. Прымяраць, прыкідваць» [2, т. 3, с. 138]. Меркаванне датычыцца сферы разумовых працэсаў і адначасова ўключаецца ў акт моўнай камунікацыі, забяспечваючы ўзаемасувязь моўнай і пазамоўнай рэчаіснасці, аўтара і чытача. Выкарыстанне мадальных адзінак у казачным дыскурсе пашырае семантыку меркавання значэннямі 'асцярожнасць', 'разважлівасць', 'ненавязванне суразмоўцу сваіх думак', 'павага да чужога пункту погляду' і адначасова 'дыстанцыйнасць' ад яго. Пералічаныя значэнні фарміруюць пазіцыі недасказанасці, сумнення, разліку на будучыню, што яшчэ больш зацікаўлівае і накіроўвае чытача працягнуць знаёмства з творам і яго героямі.

На аснове аўтарскага ідыястылю (яго ідэй, цэннасных адносін, карціны свету) будуецца новы магчымы свет, дзе моўныя паводзіны апавядальніка эксплікуюць адну з базавых рыс беларускага нацыянальнага характару – памяркоўнасць як талерантнасць, разважлівасць, непрыманне спрэчак і канфліктаў, тактоўнасць, асцярожнасць. Рэалізацыя мадальнасці меркавання дэманструе пераадоленне межаў хранатопа казачнага свету і абумоўлівае канцэптуалізацыю (стварэнне новых канцэптаў) суб'ектыўных ацэнак, якая фарміруе этнакультурны тып аўтара, беларускага менталітэту.

Для Пятра Васільевіча кожны чалавек і нават любая жывая істота прадстаўлялі найвялікшую каштоўнасць. На яго думку, у «сумоўі чалавека і братоў ягоных меншых павінен дзейнічаць маральны імператыў: не растапчы». Хто з беларускіх пісьменнікаў з такім інтарэсам і клопатам, дасціпна і іранічна сказаў пра мух, мышэй, жабак, вужакаў, чарапах, соў і нават вошаў, блох, мікробаў і іншых кузурак і чарвячкоў, паставіўшы іх у адзін рад з homo sapiens? І гэта зусім не абраза, а асэнсаванне значнасці ўсяго жывога на Зямлі: *Дзеля чаго існуе муха? Яна пяюха, хіхатуха. Яна лятае над лугамі, А ходзіць да гары нагамі. Адно вось толькі мае гора, Калі наесца мухамораў.* Праз некалькі старонак цудоўнай кніжачкі вершаў «Піраміда Ліннея» сустракаем: *Навошта створаны студэнты? Каб іх тыранілі дацэнты, Каб іх скубалі дактары, Каб засыхалі да пары*.

Павага да асобы чалавека, любой істоты, адухоўленасць думкі аўтара, цёплы гумар і ў той жа час яго іранічнае ці саркастычнае стаўленне да непрымальнага абуджае жаданне чытача разважаць, аналізаваць, удасканальваць, а часам змяняць свае погляды і, галоўнае – раўняцца на бліскуча адукаванага літаратуразнаўцу, празаіка, навукоўца, журналіста, выкладчыка П. В. Васючэнку.

Ён і зараз са сваімі блізкімі, сябрамі і аднадумцамі. Разам з намі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Валгина, Н. С.* Теория текста / Н. С. Валгина. – М. : Логос, 2003. – 173 с.
2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск : БелЭн., 1977–1984.

УДК 821.161.3–4.09.(045)

М. С. Рагачэўская (Мінск)

«АД ТЭКСТУ ДА ХРАНАТОПА»: НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СВЯДОМАСЦЬ У ЭСЭІСТЫЦЫ П. В. ВАСЮЧЭНКІ

“Перадусім беларус рэальны сёння творца гісторыі…”

Частка ўступная, ушанавальная

Пятро Васільевіч Васючэнка – наш знакаміты калега, пісьменнік, драматург, эсэіст…. Ён быў і вучоным, і чалавекам творчай прафесіі, і бацькам, мужам, дзядулем, сябрам – і ў пэўным сэнсе адміністратарам, менеджарам… Але перш за ўсё – гэта быў Чалавек з самай вялікай і прыгожа накрэсленай літары: спачувальны, добры, міралюбівы і дружалюбны, спагадлівы, чэсны і справядлівы, чуллівы і сціплы, гатовы ўсім прыйсці на дапамогу, не трымаючы крыўды ні на кога.

Гэты артыкул павінен быць навуковым, даследчыцкім. Ён такім і з’яўляецца, за выключэннем гэтай уступнай часткі, што прысвечана выказванню пасмяротных слоў падзякі, павагі і пашаны да гэтага адметнага чалавека. Калі мы разам адзначалі 60-годдзе Пятра Васільевіча ў літаратурным музеі ім. М. Багдановіча ў Траецкім прадмесці, мы ўсе заўважылі, што Пятро Васільевіч гучаў неяк самотна, ды і настрой нават той часткі казкі пра паноў Кубліцкага ды Заблоцкага быў занадта філасофска-элегічны і, як аказалася, пароцкі.

Пятро Васільевіч Васючэнка менавіта гэта і пакінуў нам: сваю філасофію, свае пароцтвы. Кажуць, Бог найперш забірае лепшых з нас… Чаму? Адзін з адказаў на гэтае адвечнае пытанне знаходзім у Святым Пісанні, у розных яго кнігах. Узгадваецца біблейскі сціх: «бо Гасподзь, Бог твой, Які сярод цябе, ёсць Бог руплівец» (Другі закон 6:15). Як бачым, у перакладзе на беларускую мову Бог называецца руплівым. Аднак у рускамоўнай версіі – «ревнивый»; у англа-

моўных версіях Старога Запавету – «jealous». Так, гэта слова набывае ў перакладзе іншае адценне. Напрыклад, можна ўзгадаць пратэстоўны верш Эмілі Дзікінсан, амерыканскай паэткі-рамантыка:

God is indeed a jealous God –
He cannot bear to see
That we had rather not with Him
But with each other play [6].

Бог, сапраўды, раўнівы Бог –
Нясцерпна ўсведамляць,
Яму, што нам паміж сабой
Мілей, чым на нябёсах…

Беларуская версія – не «раўнівы», а «руплівы», вельмі трапна датычыцца нашага Пятра Васільевіча… Таму што Бог, мабыць, паклапаціўся аб ім, лепшым з нас, даўшы і нам зразумець, што за скарбы нам пакінуты, што, можа, каштоўнасць нацыянальна-культурнай спадчыны толькі тады мы і пачынаем усведамляць, калі сыходзяць лепшыя скарбнікі…

Частка асноўная, навукова-даследчая

Кніга Пятра Васільевіча Васючэнкі «Ад тэксту да хранатопа» (2009) часмусьці мала ўзгадваецца ў біяграфічных звестках, дзе аўтары-даследчыкі [5] аддаюць перавагу такім гучным творам, як зборнікі прозы «Белы мурашнік» (1993), «Прыгоды аднаго губашлёпа» (1999), кнігі казак «Прыгоды паноў Кубліцкага і Заблоцкага» (1997) і «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» (2003), зборнік п’ес «Маленькі збраяносец» (1999), літаратуразнаўчыя манаграфіі «Драматургія і час» (1991), «Драматургічная спадчына Янкі Купалы» (1994), «Пошукі страчанага дзяцінства” (1995), «Сучасная беларуская драматургія» (2000), «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» (2004), зборнік літаратурна-крытычных прац «Адлюстраванні першатвора» (2004), даведнік «Вялікія пісьменнікі XX стагоддзя» (2002), «Каляровая затока» (2008), зборнік вершаў (бестыярый) «Піраміда Ліннея» (2008). «Ад тэксту да хранатопа» – гэта арыгінальны зборнік артыкулаў, эсэ і пятрогліфаў – унікальнай афарыстычнай празаічнай формы, што сцісла і трапна перадае максімы думкі, філасофскія ідэі і канцэнтраваныя згусткі пачуццяў. Згодна аўтару, «сутнасць пятрогліфаў – іх фрагментарнасць і арганізаванасць. Пятрогліфы можна параўнаць з металічным пілаваннем, якое шыхтуецца ў магутным полі інтэлекту» [1, с. 151].

Па-першае, мяне скарыў ужо асабісты прысвячальны надпіс і аўтограф Пятра Васільевіча на маім экзэмпляры кнігі, што сведчыў пра тую неверагодную аўру пісьменніка-філосафа з прадбачніцкай свядомасцю і дзіцячай душой: “Вельмішаважанай Марыне Станіславаўне з пажаданнем дабрабыту і шчасця ў прасторы Вашага жыцця, з вераю ў моц літаратуры».

Па-другое, выклікае гуманітарна-філалагічную зацікаўленасць асабліва трэцяя частка гэтай кнігі, якая мае загаловак «Выніковыя эсэ» (дзве першыя – гэта літаратурна-крытычныя артыкулы, азагалоўленыя «Трансцэндэнтальныя класікі» і «Анатомія аднаго шэдэўра»). Я засяроджуся менавіта на названай апошняй частцы, каб дапамагчы нам зноў зразумець і пашырыць свае веды аб самой канцэпцыі нацыянальнай свядомасці. Гэтая частка кнігі складаецца ў сваю чаргу таксама з трох раздзелаў: «Беларус вачыма беларуса», «Пятрогліфы» і тытульнага эсэ «Ад тэксту да хранатопа».

Спынімся на «дыялогах» пра беларуса – менавіта дыялогах, таму што па мастацкай форме гэтыя культурніцка-філасофскія разважанні пададзены на манер платонаўскіх дыялогаў, якія ў параўнанні з іншымі наратыўнымі стратэгіямі вызначаюцца даволі запэўніваючай «формай аповеду» як адказу на пытанне, але якая страціла сваю сакратаўскую дыялектычнасць, як лічыць даследчык Д. Ю. Дарафееў [3]. У раздзеле «Беларус вачыма беларуса» аўтар вязде дыялогі-аповеды з «мілай маскоўскай знаёмай». І гэтыя дыялогі – платонаўскія па сваёй прыродзе, таму што не маюць мэтай паказаць роўнасную барацьбу розных кропак бачання, а накіраваныя на давядзенне пазіцыі аўтара праз адказы на пытанні маскоўскай суразмоўцы. Гэтаму ёсць апраўданне: суразмоўца не мае адказу на свае пытанні – яна хоча пачуць іх ад аўтара, аднак, парадаксальна, як піша П. Васючэнка, «Найболей, па-мойму, яна любіць ставіць пытанні і не слухаць адказы на іх» [1, с. 122].

Тэматыка ўсяго першага раздзела трэцяй часткі прысвечана нацыянальнай свядомасці, асэнсаванню і ідэнтыфікацыі беларуса як прадстаўніка нацыі і нацыі як асаблівай этнічнай адзінкі ў глабальным кантэксце. П. Васючэнка ў гэтай частцы спасылаецца і на выкарыстанне раней надрукаванага ў суаўтарстве з І. А. Бурдзялёвай артыкула «Укрыжаваная Беларусь» [2]. Таму аналіз тэксту будзе ў пэўнай ступені адносіцца і да суаўтаркі названага артыкула. Першай значнай і цікавай думкай наконт асэнсавання сябе як асобнай нацыі з’яўляецца погляд на траістую іпастась беларуса: міфалагізаванага (надзеленага праз міф такімі якасцямі, як «звышцярплівасць, звышталеранцыя, забітасць, затурканасць, прыгнечанасць, мужыцкасць, бясконцая адданасць большаму брату» [1, с. 123]); беларуса гістарычнага, «які жыў за часамі паўстанняў, войнаў і лакальных боек, сыходзіў у падполле, вылазіў з сутарэння, біўся з ворагам твар у твар, паміраў, адраджаўся, цярпеў, ненавідзеў, дараваў, словам, адыгрываў сваю непаўторную ролю ў гістарычнай драме» [1, с. 123]; і беларуса рэальнага, які «пажыў за Саветамі», «пасмакаваў незалежнасці», «звыкся ўжо з тым, што жыве ў незалежнай дзяржаве» [1, с. 123].

Разглядаючы розныя міфы наконт антрапалагічных вымярэнняў беларуса, аўтар заяўляе, што «Беларусь – краіна волатаў і снайпераў» [1, с. 125], узгадваючы найперш спартыўныя дасягненні ў біятлоне і шпурлянні ядра, молата, дыска…

Так, кожны невялічкі дыялогавы аповед асвятляе той ці іншы бок нацыянальнай самасвядомасці – і гэта заўсёды разгорнуты адказ на пытанне «маскоўскай знаёмай», аздоблены спасылкамі на мноства твораў беларускай літаратуры (Я. Купала, В. Ластоўскі, М. Багдановіч, А. Міцкевіч, П. Броўка, В. Быкаў, У. Караткевіч, І. Мележ, М. Гарэцкі і інш.), ды і не толькі беларускай: узгадваюцца Ф. Дастаеўскі, М. Някрасаў, М. Дабралюбаў ды інш.). Практычна на ўсе пытанні, што задае аўтару яго суразмоўца, знаходзяцца адказы ў знакамітых творах. Так, напрыклад, неперадавальны, неперакладальны сэнс паняцця «тутэйшыя» тлумачаць героі аднаіменнай п’есы Я. Купалы, а каштоўнасць асабістай хаты як нейкага аксіялагічнага складальніка – багушэвіцкі Мацей Бурачок. Далей у «Пятрогліфах» аўтар разважае: «Калі абломаўшчына – нацыянальная хвароба расейцаў, дык тутэйшасць – нашаю хваробай. Яны сваімі балячкамі ганарацца, а чаму б і нам не?» [1, с. 153].

Непаўторнныя, іранічна-гумарыстычныя метафары – гэта адметная рыса не толькі Васючэнкі-пісьменніка, але і Васючэнкі-эсэіста. «Беларусы – хобіты еўрапейскага лесу, – піша ён, – што хаваюцца ў цень ад саміх сябе» [1, с. 125]. Так ён вызначае асаблівую рысу нацыянальнай свядомасці – някідкасць, пакрыёмнасць,

нежаданне неяк вылучацца з асяроддзя і паміж іншых народаў. «Беларус – дзіця плённага шлюбу зямлі і вады» [1, с. 140], – піша аўтар, калі разважае пра архетыпічны вобраз балота, дрыгвы, багны. Гэты вобраз становіцца неад'емнай часткай псіхалогіі. Таму «рызыкоўна выпрабоўваць вонкава спакойную, непрадказальную стыхію» [1, с. 141]. Прадаўжэннем гэтага вобраза з'яўляецця яшчэ адна яскравая разгорнутая метафара падземнага возера, альбо вады, што адышла ад балота ўглыб зямных недраў. «Так і з беларускім духам, – мудра сцвярджае Васючэнка-філосаф. – Яго засыпаюць жвірам, заганяюць у падземныя лабірынты, і ніхто не ведае, дзе ён паўстане далей. Ён неўміручы. Ён гэтая блукаючая вада» [1, с. 140].

Адным з найцікавейшых назіранняў над нацыянальнай псіхалогіяй беларуса ў кнізе П. Васючэнкі з'яўляюцца, на мой погляд, інтуітыўна зробленыя высновы адносна гумару і самаіроніі. Так, напрыклад, псіхатэрапеўты час ад часу робяць пераканаўчыя высновы пра тое, што адсутнасць пачуцця гумару, няздатнасць да самаіроніі з'яўляюцца сімптомамі хворай псіхікі і парушэнняў асобы. «Чувство юмора традиционно считается атрибутом здоровья и психологического благополучия, – піша прафесійны медыцынскі часопіс. – При психических заболеваниях способность шутить и воспринимать юмор страдает» [4]. У гэтай сувязі ў раздзеле «Беларус сярод іншых» узгадваюцца розныя формы самаіроніі, і адна з іх асабліва адметная. Гэта пацвельванне – «мяккая, гуманная, ачышчальная тэрапія смехам» [1, с. 143]. Гэта здаровы і бяспечны спосаб існавання самасвядомасці сярод міфаў і неадэкватнага ўспрыняцця іншаземцамі (тое, што традыцыйна прыпісваюць беларусам, гэта «правінцыялізм, вясковасць, ксенафобія, звышцярплівасць, звышпамяркоўнасць, здрадлівасць» [1, с. 144]), сярод перыядычнага генацыду, знішчэння нацыі – Расійскай імперыяй, затым – сталінізмам, фашысцкімі захопнікамі… І тут П. Васючэнка зноў звяртаецца да сваіх бездакорных метафар, даючы азначэнне самаіроніі: «гэта памахванне, ківанне, гульня бізуном. Удару няма. Шкадуючы іншых, няўжо беларус будзе сцябаць самога сябе?» [1, с. 143]. Васючэнкаўскія метафары часам выразна алюзіўныя: «Лекар ва ўяўленні беларуса – гэта тутэйшы Харон, які перапраўляе людзей у апраметную і ніколі – адтуль» [1, с. 146]. Так вызначае адносіны да лекавання П. Васючэнка, таму што нават дыскурс бальніцы, шпіталя сведчыць аб неўтаймаванасці імкнення беларуса да нейкай дзейнасці. Так, у бальніцы людзі не «ляжаць», а «ноўдаюцца, поўзаюць, цягаюцца, мадзеюць, чаўрэюць…» [1, с. 146].

Так паступова і запаволена эсэ П. Васючэнкі ствараюць вельмі ясны і адчувальны вобраз такога абстрактнага паняцця, як нацыянальная свядомасць: з дапамогай платонаўскага дыялогу, метафар і алюзій, іроніі і архетыпаў. Прычым вобраз самасвядомасці беларуса як зацёртага дзесьці паміж міфалагізаваным, гістарычным і рэальным, тутэйшага волата і снайпера ў мужчынскім абліччы і гарэзлівай, незалежнай і зменлівай прыгажуні – у жаночым, вобраз чалавека, які не ўяўляе сябе без сваёй хаты і сваёй ежы (бульбы) на стале, добрага суседа і ідэальнага працаўніка з цьмянымі «здрадніцкімі» схільнасцямі, але толькі ў адносінах да тых, «пад кім» ён схіляе спіну, самаіранічны, самадастатковы, веруючы ў зёлкі, малітву, гарэлку або гумар – вось гэты вобраз-характар паўстае не зацвярдзелым і не застыўшым у часе. Гэты вобраз аказваецца дынамічным. П. Васючэнка піша, што беларус ясна асэнсоўвае і новыя варункі XXI стагоддзя, прыжыцца ў якіх «рэальнаму беларусу дапамагаюць такія яго прыроджаныя якасці, як цягавітасць, прагматызм, жывучасць, эўрыстычнасць мыслення, пакрыёмнасць існавання» [1, с. 148].

Частка заключная, аптымістычная

Мастацкая і эсэістычная спадчына П. В. Васючэнкі будзе, безумоўна, яшчэ вывучацца і даследавацца. Яна знойдзе яшчэ чытачоў на розных мовах, як знайшла іх ужо ў перакладах на англійскую, балгарскую, нямецкую, польскую, рускую, славацкую і чэшскую мовы.

Здаецца, што філасофская разважлівасць П. Васючэнкі паслужыць таксама далейшаму развіццю нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай ідэі. «Часам думаю, што ўсе хваробы пайшлі ад гэтай звычкі – існаваць угнуўшыся ды шоргаючы. Не абмінулі гэтае хваробы многія народы, у тым ліку і мы, грэшныя. Праходзіць час, і людзі выпростваюцца, бо кожнай хваробе пакладзены канец. Беларусы ж паводле ментальнасці настроеныя на неўміручасць, бо яны, як кажа філосаф Валянцін Акудовіч, абраныя вечнасцю» [1, с. 147].

ЛІТАРАТУРА

1. *Васючэнка, П. В.* Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.
2. *Васючэнка, П. В.* Укрыжаваная Беларусь / П. В. Васючэнка, І. А. Бурдзялёва // Камунікат [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/download.php?item=2051-11.html& pubref=2051. – Дата доступу: 10.01.2021.
3. *Дорофеев, Д. Ю.* Диалектические диалоги Платона и философия диалога и бытия в XX веке / Д. Ю. Дорофеев // Cyberleninka [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/ article/n/dialekticheskie-dialogi-platona-i-filosofiya-dialoga-i-bytiya-v-hh-veke. – Дата доступа: 10.01.2021.
4. *Иванова, Е. М.* Психопатология и чувство юмора / Е. М. Иванова, С. Н. Ениколопов // Трудный пациент. Журнал для врачей [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://t-pacient.ru/ articles/6443/. – Дата доступа: 10.01.2021.
5. Камунікат [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://kamunikat.org/Vasiuczenka_ Piatro.html. – Дата доступу: 10.01.2021.
6. *Dickinson, E.* God is indeed a jealous God / E. Dickinson // Famous Poets and Poems [Electronic Resource]. – Mode of Access: http://famouspoetsandpoems.com/poets/emily_dickinson/poems/6213. – Date of Access: 10.01.2021.

УДК 811.161.3

Т. М. Аліферчык (Мінск)

КАНЦЭПТЫ БЕЛАРУСКАЙ АНАМАСТЫЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ І ІХ УЗАЕМАДЗЕЯННЕ[1]

У сучаснай сусветнай і ўсходнеславянскай лінгвістыцы актыўна развіваецца новы кірунак тэрміналагічных даследаванняў – у кантэксце антрапалагічнай парадыгмы гуманітарыстыкі. Апошнія дзесяцігоддзі шырока рэалізаваны лінгвакагнітыўны падыход у тэрміназнаўстве [1; 2; 3; 4]. Відавочна, лінгвакагнітыўны падыход, у адрозненне ад традыцыйнага, ускладняе і паглыбляе разуменне тэрміна. Калі пры ўласна лінгвістычным кантэксце прадмет даследавання – менавіта лінгвістычныя характарыстыкі тэрміна, яго сінтагматычныя і парадыгматычныя сувязі, то кагнітыўнае тэрміназнаўства даследуе суаднясенне канцэптуальных і моўных структур у прафесійнай сферы, асаблівасці канцэптуалізацыі прафесійна значных аб'ектаў. Пад уплывам кагнітыўнай лінгвістыкі мэты тэрміназнаўчых даследаванняў змясціліся з вывучэння спецыфічных якасцяў тэрміна на яго ўнутраную прыроду, абумоўленую сувяззю з прафесійнай камунікацыяй, прафесійным пазнаннем і прафесійнай дзейнасцю, на праблему прадстаўлення ведаў у тэрміне [6, с. 196–197]. Такім чынам, тэрміналогія ў кагнітыўным кантэксце разглядаецца як вынік кагнітыўнай дзейнасці спецыяліста, што заключаецца ў канцэптуалізацыі і вербалізацыі прафесійных ведаў.

Сучасныя даследаванні тэрміналогіі адлюстроўваюць ідэю аб канцэптуальнай структуры тэрміна, паколькі мадэляванне канцэптаў будуецца на аналізе семантыкі моўных сродкаў, якія фарміруюць гэты канцэпт [8]. "*Навуковы канцэпт* можна вызначыць як максімальна кагнітыўна сканцэнтраванае ўтварэнне, як генеральную сукупнасць розных тэрміналагічных інфармацыйных сістэм, якія ўяўляюць стратыфікацыйнае дзяленне навуковай сферы ведаў, якія рэалізуюць у працэсе навуковай камунікацыі шэраг асноўных функцый, такіх, як кагнітыўна-гнасеалагічная, камунікатыўна-прагматычная, дэрывацыйна-метамоўная і інш." [5].


Даследаванне анамастычнай тэрміналогіі ў кагнітыўным аспекце вызначаецца асаблівай складанасцю, паколькі сама сфера прафесійных ведаў – анамастыка – адрозніваецца своеасаблівай спецыфікай. У кантэксце традыцыйна лінгвістычнага падыходу аб'ектам даследавання анамастыкі з'яўляюцца ўсе групы ўласных імёнаў і назваў – онімы, а таксама іх семантыка, фарміраванне, функцыянаванне і інш. У кантэксце лінгвакагнітыўнага падыходу да аналізу анамастычнага матэрыялу аб'ектам можна лічыць кагнітыўныя механізмы/кагніцыі, якія сталі падставай фарміравання, станаўлення і развіцця онімаў. Такім чынам, кагнітыўная анамастыка – навуковы напрамак, які даследуе спосабы ўвасаблення, захоўвання і перадачы інфармацыі/ведаў ва ўласных імёнах [7, с. 42]. Як адзначае В. В. Рабустава, "кагнітыўная анамастыка ставіць перад сабой наступныя задачы: выявіць і вывучыць мадэлі пабудовы онімаў, спецыфіку замацавання ў іх інфармацыі, яе канкрэтызацыю, асаблівасці ўвасаблення інфармацыі (значэння) ва ўласным імені, перавагу выкарыстання анамастычнай лексікі перад іншымі формамі актуалізацыі інфармацыі (значэнняў)" [Там жа].

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах праекта БРФФД Г19М-122 "Беларуская анамастычная тэрміналогія: структурны і лінгвакагнітыўны аспекты".

Аднак мэтазгодна падкрэсліць, што *анамастычны канцэпт* адрозніваецца ад *канцэпту анамастычнай тэрміналогіі*. Калі анамастычны канцэпт – гэта сукупнасць ведаў аб аб'екце, якія ўвасоблены ў яго імені, то канцэпт анамастычнай тэрміналогіі – сукупнасць прафесійных анамастычных ведаў аб шэрагу падобных аб'ектаў, напр., канцэпт анамастычнай тэрміналогіі "чалавек" можа ўключаць не столькі сукупнасць ведаў аб чалавеку, якія адлюстраваны ў яго імені/мянушцы/прозвішчы, а ў большай ступені сукупнасць прафесійных ведаў у цэлым аб імёнах/мянушках/прозвішчах, у тым ліку асаблівасці матывацыі антрапонімаў, антрапанімічныя мадэлі, спецыфічныя антрапафарманты, этымалогію антрапонімаў, сферы функцыянавання антрапонімаў і г.д. Канцэпт анамастычнай тэрміналогіі "месца" ёсць сукупнасць прафесійных ведаў аб уласных назвах асобнага раду ландшафтных аб'ектаў, матывацыі назваў, асновах як рэсурсу тапанамінацыі, тапонімаўтваральных фармантах, сферах і асаблівасцях функцыянавання і іншых аспектах.

Такім чынам, канцэпты анамастычнай тэрміналогіі акумулююць інфармацыю аб пазнанні іншага ўзроўню – узроўню прафесійных ведаў адпаведнай вобласці.

Асноўнымі (базавымі) канцэптамі анамастычнай тэрміналогіі як адлюстравання анамастычных ведаў, на нашу думку, з'яўляюцца наступныя: "імя/уласная назва", "чалавек", "месца", "вынікі антрапалагічнага ўздзеяння". Узаемадзеянне адзначаных канцэптаў анамастычнай тэрміналогіі можна ўявіць у адпаведнай схеме:



На прапанаванай схеме невыпадкова адзначана ўзаемадзеянне выдзеленых канцэптаў. Анамастычная сфера, як неаднаразова адзначана рознымі даследчыкамі, – даволі спецыфічная вобласць. У анамастычных адзінках адлюстраваны вопыт пазнання чалавекам навакольнага асяроддзя і сябе ў ім, а таксама вопыт уплыву на навакольнае асяроддзе. Адпаведна, адзначаны вопыт увасоблены ва ўласных назвах, так ці інакш стасуемых з кагнітыўнымі паводзінамі. Такім чынам, канцэпты "чалавек", "месца", "вынікі антрапалагічнага ўздзеяння" характэрны ў цэлым для анамастычнай сферы і для вобласці анамастычнай тэрміналогіі як сістэмы адлюстравання прафесійных ведаў. Пры гэтым адзначаныя канцэпты ўзаемадзейнічаюць не толькі паміж сабой, але і з канцэптам "імя/уласная назва" як аднаго з асноўных, паколькі рэалізацыя першых трох канцэптаў магчыма толькі праз канцэпт "імя/уласная назва", што і з'яўляецца спецыфікай анамастычных ведаў у цэлым. На нашу думку, канцэпт "імя/уласная назва" так ці інакш ёсць адлюстраванне існуючых тэорый семантыкі імя ўласнага.

Намі прапанавана наступная структура навуковага канцэпту на падставе аналізу канцэптаў анамастычнай тэрміналогіі:

Канцэпт → (катэгорыя) → паняцце → тэрмін.

Канцэпты анамастычнай тэрміналогіі рэалізаваны праз катэгорыі, якія, у сваю чаргу, эксплікаваны ў адпаведных паняццях, якія маюць адпаведны(я) тэрмін(ы).

Канцэпты “чалавек”, “месца” і “вынікі антрапалагічнага ўздзеяння” адлюстраваны ў катэгорыях анамастычнай тэрміналогіі, якія на ўзроўні мовы/тэрміналогіі падзелены на асобныя групы і падгрупы паняццяў і адпаведных тэрмінаў: антрапаніміка, тапаніміка, эрганіміка/хрэматаніміка.

Канцэпт “месца” рэалізуецца праз некалькі катэгорый, напр., *элемент натуральнага ландшафту* і *заселенае месца*. Для кожнай катэгорыі існуе сістэма паняццяў, якія вербалізаваны праз адпаведныя тэрміны. Катэгорыя *элемент натуральнага ландшафту* эксплікавана праз паняцці, напр., *гара, лес, водны аб’ект* (*возера* і *рака*), *балота* і інш., якія вербалізаваны праз тэрміны *аронім, дрымонім, гідронім* (*лімнонім* і *патамонім* адпаведна), *гелонім*. Для катэгорыі “*заселенае месца*” адным з паняццяў з’яўляецца *пасяленне* (для якога адпавядае тэрмін *айконім*), якое ў сваю чаргу дзеліцца на залежныя паняцці *гарадское* (*астыёнім*) і *сельскае* (*камонім*) *пасяленне*.

Яскравым прыкладам узаемадзеяння канцэптаў “месца” і “вынікі антрапалагічнага ўздзеяння” можа быць катэгорыя *элемент ландшафту як вынік дзейнасці чалавека*, прадстаўленая, напр., праз паняцце *элемент ландшафту, апрацаваны, але не заселены* (якое вербалізавана праз тэрміны *мікратапонім/анайконім*). Да гэтай ж катэгорыі адносяцца і ўсе элементы інфраструктуры паміж населенымі пунктамі і іншымі аб’ектамі – *гадонімы*. Відавочна, вербалізацыяй катэгорыі *штучны элемент ландшафту як вынік дзейнасці чалавека* можна лічыць паняцце *прадпрыемствы па-за межамі населеных пунктаў* з адпаведным тэрмінам *эргатапонім*.

Неабходна адзначыць, што ў некаторых выпадках канцэпт можа быць рэалізаваны праз сістэму паняццяў і далей тэрмінаў, мінуючы сістэму катэгорый. Ілюстрацыяй у гэтым выпадку можа быць канцэпт “чалавек”.

Канцэпт “чалавек” эксплікаваны праз паняцці *афіцыйнае* і *неафіцыйнае імя*. Паняцце *афіцыйнае імя* фактычна разумеецца як *іменная формула* – у сучасны перыяд гэта імя, імя па бацьку і прозвішча. Неабходна ўдакладніць, што такі від іменнай формулы характэрны для сучаснага этапу антрапанімікі, які істотна адрозніваецца ад іншых папярэдніх традыцый фарміравання іменнай формулы/іменавання чалавека. Паняцце *неафіцыйнае імя* эксплікавана праз паняцці іншага ўроўню, напр., *імя-характарыстыка* (з адпаведным тэрмінам *мянушка*) і *свядома выбранае несапраўднае імя* (з адпаведным тэрмінам *псеўданім* (і *інтэрнет-онім* (*нік, нікнейм* і інш.) як адзін з відаў псеўданіма). Паняцце *імя-характарыстыка* дзеліцца на групы – па бацьку (з адпаведным тэрмінам *патронім*), па маці (*матронім*), жанчыны па мужу (*андронім*) і іншыя групы мянушак рознай матывацыі (напр., паводле фізічных якасцяў, разумовых якасцяў, умоўна законным/незаконным паходжаннем і іншых аспектаў).

Узаемадзеянне канцэптаў “месца” і “чалавек” рэалізавана, напр., на ўзроўні паняцця *прозвішча/мянушка паводле месца пражывання альбо нараджэння*, што вербалізавана ў тэрміне *адтапанімічнае прозвішча/мянушка* (напр., *Пінчук*, *Дастаеўскі* і інш.).

Канцэпт “вынікі антрапалагічнага ўздзеяння” можа быць рэалізаваны праз наступныя катэгорыі: *вытворчая/эканамічная дзейнасць*, *матэрыяльная культура* і *нематэрыяльная культура*.

Катэгорыя *вытворчая/эканамічная дзейнасць* адлюстравана ў паняццях *аб’яднанні людзей* (напр., прадпрыемствы, прафесійныя калектывы, што вербаа-

лізавана ў тэрміне *эргонімы*), *інфраструктура* (з адпаведным тэрмінам *драмонімы*), *прадукты дзейнасці* (для якога адпавядае тэрмін *прагматонім*) і інш. Відавочна, да гэтай жа катэгорыі адносіцца і паняцце *маркетынгавая*.

Катэгорыя *матэрыяльная культура* (для якой адпавядае тэрмін *хрэматонім*) уключае розныя паняцці, напр., найменні аб'ектаў культуры (*артыёнімы* 'найменне мастацкіх твораў рознага жанру, у тым ліку карцін, статуй, фільмаў і інш.'), *парэйонім* 'уласная назва канкрэтнага траспартнага сродку') і інш.

Катэгорыя *нематэрыяльная культура* (з адпаведным тэрмінам *ідэонім*) адлюстравана ў паняццях *літаратурная творчасць* (літаратурная анамастыка), *рэлігія*, *міфалогія* і інш. – усё тое, што ўмоўна не адлюстравана ў прадметнай вобласці.

Відавочна, у артыкуле рэалізацыя вызначаных канцэптаў і іх узаемадзеянне абазначана схематычна.

Неабходна адзначыць, што спецыфіка канцэптуалізацыі анамастычных тэрмінаў звязана ў першую чаргу са спецыфікай анамастычных ведаў у цэлым, якая заключаецца ў адлюстраванні ў імені лінгвістычных і экстралінгвістычных ведаў аб чалавеку або прасторавым аб'екце.

Можна меркаваць, што канцэптуалізацыя аспектаў антрапалагічнага ўздзеяння на арганізацыю прасторавых адносінаў з'яўляецца пазнейшай у адносінах да канцэптуалізацыі ведаў пра чалавека і прастору праз імя.

У другую чаргу, спецыфіка канцэптуалізацыі анамастычных тэрмінаў звязана з менавіта прафесійным узроўнем анамастычных ведаў, які адрозніваецца высокай ступенню арганізаванасці і структураванасці і які пазбаўлены наіўна-паўсядзённага разумення. Акрамя гэтага неабходна адзначыць амаль поўную адсутнасць эмацыйнага кампанента ў складзе канцэптаў анамастычнай тэрміналогіі (у адрозненне ад анамастычных канцэптаў у цэлым), што вынікае з неабходнасці адлюстравання ў тэрмінах менавіта прафесійнага ўзроўню ведаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Голованова, Е. И.* Введение в когнитивное терминоведение / Е. И. Голованова. – М. : Флинта : Наука, 2011. – 224 с.
2. *Грунина, Л. П.* Когнитивный аспект исследования терминов / Л. П. Грунина, А. Г. Широколобова // Филологические науки. Вопросы теории и практики. – 2010. – № 1 (5): в 2 ч. – Ч. I. – С. 97–99.
3. *Іващенко, В. Л.* Когнітивне термінознавство: перспективи розвитку / В. Л. Іващенко // Термінологічний вісник. – 2011. – Вип. 1. – С. 47–54.
4. *Кізіль, М. А.* Когнітивне термінознавство: витоки, завдання й перспективи розвитку / М. А. Кізіль // Науковий вісник Міжнар. гуманіт. ун-ту. Сер.: Філологія. – 2015. – № 16. – С. 182–185.
5. *Макаренко, Е. Д.* Концепт как знак языка науки / Е. Д. Макаренко // Филологические науки. Вопросы теории и практики. – 2015. – № 3 (45): в 3 ч. – Ч. I. – С. 143–145.
6. *Ревина, Ю. Н.* Когнитивные исследования в области терминоведения [Электронный ресурс] / Ю. Н. Ревина. – Режим доступа: http://elar.urfu.ru/bitstream/10995/25318/1/avfn_2013_38.pdf. – Дата доступа: 29.05.2020.
7. *Робустова, В. В.* К когнитивной ономастике / В. В. Робустова // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 19: Лингвистика и межкультурная коммуникация. – 2014. – № 1. – С. 41–49.
8. *Росянова, Т. С.* Когнитивный подход к рассмотрению термина / [Электронный ресурс]. / Т. С. Росянова. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/kognitivnyy-podhod-k-rassmotreniyu-termina. – Дата доступа: 28.05.2020.

УДК 81'33

А. А. Барковіч, К. С. Астапкіна (Мінск)

ІНТЭРНЭТ ЯК АСЯРОДДЗЕ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕНЧАЙ ПРАКТЫКІ

Апасродкаванае камп'ютарнымі тэхналогіямі асяроддзе сучаснай камунікацыі вызначае *новыя якасці* эвалюцыі і дынаміку развіцця маўленчай практыкі. Гэтым абумоўлена неабходнасць пераасэнсавання ролі і магчымасцей ключавых

кампанентаў камунікацыйнага асяроддзя, іх *фенаменалагічнай сутнасці*, вывучэння патэнцыялу іх узаемадзеяння. Сучасная камунікацыя ва ўмовах з'яўлення эфектыўнага інструментарыю найноўшага пакалення пачала неверагодна рэзультатыўна вызначаць межы і структуру нашай свядомасці. Інтэрактыўны характар апасродкаванай тэхнічнымі прыладамі і сацыяльнымі сеткамі маўленчай практыкі пацвярджае антрапацэнтрычнасць *камунікацыі* як працэсу, «зборнага ключавога паняцця, своеасаблівага канцэпту ў дачыненні да цэлага шэрага яго складнікаў» [3, с. 13]. У цэнтры гэтага працэсу, безумоўна, знаходзіцца *асоба* – як суб'ект, як аб'ект і як увасабленне характэрных асаблівасцей камунікацыйных адносін Інтэрнэту [1].

Антрапацэнтрычнасць інтэрнэт-дыскурсу – яго істотная характэрыстыка, развіццё якой адбываецца ў кантэксце *гуманітарнай гіперстратэгіі* развіцця Інтэрнэту [4, p. 187]. Але разам з тым неабароненасць асобы набывае ў новым камунікацыйным фармаце выразныя абрысы. Усе негатыўныя ўплывы камерцыялізацыі і дэперсаніфікацыі глабальнага праекта пад назвай *Інтэрнэт* адбіваюцца на стылі і ўзроўні жыцця кожнага чалавека і на маўленчай практыцы. Пакуль канцэпцыя замяшчэння чалавечай асобы штучным інтэлектам тэсціруецца на ўзроўні стварэння і навуковага абгрунтавання магчымасцей *камунікацыйных асоб*, але паступова становяцца рэальнымі тэхналогіі стварэння адаптыўнага гіперасяроддзя з перспектывамі яго аўтаномнай функцыянальнасці.

Сёння развіццё маўленчай практыкі Інтэрнэту сутыкаецца з шэрагам нявырашаных праблем, а мара аб вольным доступе да ведаў і супрацоўніцтве ажыццяўляецца з рэальнай рызыкай страціць пры гэтым не толькі прызначаныя для абмежаванага або неабмежаванага кола адрасатаў звесткі, але і практычна ўсю асабістую інфармацыю: «...неабмежаванасць тэхналогій знішчае канфідэнцыяльнасць. Відэакамеры назіраюць за асабістым жыццём, камп'ютары збіраюць персанальныя даныя, а камунікацыйныя сродкі робяць прыватную інфармацыю вядомай усяму свету» [6, p. 76].

Пра праблему несупадзення асацыятыўнай структуры чалавечых ведаў і фрагментарнай структуры апасродкаванай «машынамі» інфармацыі пісаў класік і тэарэтык медыйнай сферы М. Маклюэн яшчэ ў 1964 г., задоўга да з'яўлення Інтэрнэту, у кнізе "Understanding Media: The Extensions of Man": «Форма пераструктуравання чалавечай працы і асацыяцыі вызначалася працэсам фрагментацыі, які складае саму сутнасць машыннай тэхналогіі» [7, p. 9].

Такім чынам, здольнасць Інтэрнэту вызначаць многія аспекты маўленчай практыкі была адзначана яшчэ ў 60-я гг. XX ст., пасля з'яўлення першых камп'ютараў, калі М. Маклюэн заўважыў, што медыя не толькі выступаюць пасіўным каналам трансляцыі інфармацыі, але і ўскосна фарміруюць ментальную сферу моўнай асобы [7]. С тых часоў Інтэрнэт як сфера выкарыстання камп'ютарных праграм і штучных моў аказвае сур'ёзнае ўздзеянне на сваіх стваральнікаў, людзей. Мысленне чалавека ў інтэрнэт-камунікацыі прыпадабняецца спрошчанаму да мінімуму пытальна-зваротнаму інтэрфейсу камп'ютара з усімі атрыбутамі лёгкага і шаблоннага, але штучнага інфармацыйнага спажывання. Семантыка Інтэрнэту аднамерная і несупярэчлівая, да гэтага абавязваюць законы жанру: калі натуральная мова ўключае ў сябе сотні тысяч шматзначных лексем, то ў штучных мовах, абмежаваных строгім наборам знакаў і правіл, адзінак у сотні разоў менш, прычым яны абсалютна адназначныя.

Пакуль вылічальныя магчымасці камп'ютараў, у адсутнасць інтуітыўных мадэлей, адкрыццё якіх усё яшчэ наперадзе, не даюць падстаў для аптымізму ў рашэнні складаных прыкладных задач, бо «вылічальная машына не можа зраўняцца з чалавечай істотай пры апрацоўцы яшчэ не выкрышталізаваных даных» [2, с. 322]. Колькасць такіх даных пастаянна ўзрастае, асабліва ў Інтэрнэце. Наўрад ці яны існуюць у хаатычным выглядзе, але законы іх існавання пакуль схаваны ад камп'ютарна-апасродкаванага зроку чалавека і кампетэнцыі камп'ютарных праграм [8]. Для камп'ютарных праграм, увогуле, непераадольным бар'ерам з'яўляецца, напрыклад, *канатацыя* – узровень не столькі лексічнай семантыкі, колькі дыскурсіўнай арганізацыі маўлення. Зразумела, пакуль рана чакаць ад камп'ютарнай праграмы паўнавартаснага разумення комплексу парамоўных элементаў камунікацыі, хоць менавіта такія асаблівасці дапамагаюць эфектыўна аб'ядноўваць асобныя словы і сказы ў тканіну дыскурсу. Інтэрнэт-дыскурс, як, магчыма, ніякі іншы дыскурс патрабуе адзінага семіятычнага падыходу да даследавання вербальных і невербальных сродкаў паводзін людзей у камунікатыўным акце.

У кантэксце выкарыстання камп'ютарных праграм для перадачы зместу, інфармацыі выяўляюцца шматлікія праблемы сумяшчэння фармалізаванай матэматычнай логікі з чаканнем творчага, уласцівага толькі інтуітыўнай логіцы чалавека выніку. Здавалася б, дакладнае мноства інфармацыйных складнікаў павінна выдаваць дакладныя вынікі. На практыцы ж па-за «зрокам» лагічна бездакорных і адладжаных алгарытмаў камп'ютараў застаюцца істотныя складнікі *зместу* камунікацыі і маўлення.

Мозг чалавека выкарыстоўвае павольны, але надзейны алгарытм паралельнай апрацоўкі даных па многіх каналах. У выніку сума дасягнутага пераўзыходзіць арыфметычную суму асобных прыватных дасягненняў. Усё гэта дае чалавечаму розуму велізарную перавагу перад камп'ютарнымі праграмамі ў стандартызаваных сітуацыях, бо для ўліку экстра- і інтрарэлевантнай інфармацыі патрэбны не толькі тэкстуальны, але і кантэкстуальны шлях апрацоўкі даных, сацыякультурная, камунікацыйная і, зразумела, дыскурсіўная дасведчанасць у стратэгіях маўлення і паводзін. Чалавек здольны своечасова спыніцца і зрабіць высновы нават пры недакладных, няколькасных даных, якімі могуць быць практычна любыя адзінкі жывой мовы.

Чалавек дзейнічае ў соцыуме, і наяўнасць сацыяльных сувязей, у першую чаргу мовы, аб'ядноўвае і арганізуе асяроддзе існавання чалавека. Апасродкаванае мовай мысленне не можа існаваць ізалявана, для размовы патрэбны суразмоўца, хай яго камунікацыйная асоба і будзе зменена ў Інтэрнэце.

Між іншым, па задуме Ц. Бернерса-Лі, Інтэрнэт ствараўся як пляцоўка для раўнапраўнага супрацоўніцтва людзей пасродкам маўленчай практыкі: «Кожны павінен мець магчымасць размяшчаць свае ўласныя гіпертэкставыя спасылкі на даступную ўсім інфармацыю і суправаджаць імі інфармацыю для сябе. Кожны павінен мець магчымасць прыватным чынам анатаваць як асобныя спасылкі, так і іх спалучэнні» [5, p. 220]. Аднак рэальнасць унесла істотныя карэктывы ў тэарэтычныя пабудовы стваральніка Сусветнага павуціння: разам з прагрэсіўнымі ідэямі ў камп'ютарным аўтаматычным дызайне адлюстраваўся супярэчлівы і не заўсёды дасканалы змест сацыяльнай практыкі. З аднаго боку, інстытуцыянальны дыскурс Інтэрнэту, напрыклад, не дазваляе неабмежаванае распаўсюджанне маўленчай прадукцыі, абараняючы аўтарскія правы. А з іншага, любая інфармацыя, у тым ліку асабістыя даныя, якія размяшчаюцца на

далучаных да камунікацыйнай сеткі камп'ютарах, з-за недасканаласці сродкаў камп'ютарнай бяспекі, фаерволаў, антывірусаў і г. д. з лёгкасцю трапляе ў публічную сферу. Звесткі аб фізічных асобах даступны не толькі праз унікальныя *IP*-адрасы персанальных камп'ютараў у Інтэрнэце, але і з даных аналізу маўленчай практыкі.

Прыкладаў неадназначнасці тэхналагічных рашэнняў па развіцці маўленчай практыкі Інтэрнэту дастаткова. Так, супярэчлівы характар мае камунікацыйная рэалізацыя несумненна карыснага ўдасканалення Інтэрнэту ў напрамку стварэння «воблачнай тэхналогіі». Выкарыстоўваючы інавацыйныя падыходы ў апрацоўцы і захаванні даных, яна стварае прынцыпова новую камунікацыйную сітуацыю поўнай залежнасці камунікантаў ад суб'ектаў больш высокага іерархічнага ўзроўню, якія захоўваюць даныя. Дыстанцыйнае захоўванне інфармацыі і яе апрацоўка па «воблачнай тэхналогіі» істотна дэперсаніфікуе Інтэрнэт, перадаючы пэўны аб'ём праў ад камунікацыйных асоб камунікацыйным кластарам – «юрыдычным асобам»: «Публічнае воблака фізічна існуе ў юрысдыкцыі ўладальніка – пастаўшчыка паслуг» (http://be.wikipedia.org/wiki). Але ёсць дастаткова аргументаў як за, так і супраць функцыянальнасці «воблачнай тэхналогіі» як спосабу арганізацыі камунікацыі ў камп'ютарызаваным асяроддзі. Так, хоць канфідэнцыяльнасць «воблачных» даных абаронена прававымі нормамі, маўленчая практыка Інтэрнэту сведчыць, што найбольш каштоўную і асабістую інфармацыю мэтазгодна захоўваць толькі на персанальным камп'ютары, а не на «публічных» серверах камунікацыйных сетак. *Публічнасць* у дадзенай сітуацыі азначае ў першую чаргу прыватную ўласнасць удзельніка КампАК больш высокага статусу, арганізаванай па іерархічным прынцыпе камунікацыйнай сеткі Інтэрнэту. Інфармацыя з любога камп'ютара, злучанага з Сусветным павуцінне, патэнцыяльна можа быць выкарыстана пасродкам іншых камп'ютараў.

З лінгвістычнага пункту гледжання Інтэрнэт дастаткова аб'ектыўна адлюстроўвае як індывідуальныя, так і сістэмныя асаблівасці маўленчай практыкі. Сацыяльныя і псіхалагічныя рысы карыстальнікаў Інтэрнэту могуць быць прааналізаваны і апісаны моўнымі сродкамі, што дазваляе рабіць адпаведныя абагульненні ў лінгвістычнай сістэме каардынат. У прыкладным аспекце моўная практыка Інтэрнэту валодае выключнымі ўласцівасцямі і эмпірычным матэрыялам для развіцця лінгвістыкі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Барковіч, А. А.* Прэзентацыя асобы ў камп'ютарна-апасродкаванай камунікацыі / А. А. Барковіч // Компьютерно-опосредованная коммуникация и дискурс – 2014 : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т, филол. фак. ; редкол. : А. А. Баркович (отв. ред.), В. И. Куликович. – Минск : БГУ, 2015. – С. 3–7.
2. *Винер, Н.* Машины изобретательнее людей? (Интервью для журнала «Юнайтед Стэйтс энд Уорлд Рипот») / Н. Винер // Кибернетика, или управление и связь в животном и машине. – М. : Наука, 1983. – С. 319–327.
3. *Потапова, Р. К.* Речевая коммуникация: От звука к высказыванию / Р. К. Потапова, В. В. Потапов. – М. : Языки слав. культур, 2012. – 464 с.
4. *Barkovich, A.* Informational Linguistics: The New Communicational Reality / A. Barkovich. – Newcastle: Cambridge Scholars Publishing, 2020. – 271 p.
5. *Berners-Lee, T.* Weaving the Web: the original design of the World Wide Web by its inventor / T. Berners-Lee, M. Fischetti. – N. Y. : HarperBusiness, 2000. – 246 p.
6. *Garfinkel, S.* Database Nation: The Death of Privacy in the 21st Century / S. Garfinkel. – Sebastopol : O'Reilly & Associates, 2000. – 336 p.
7. *McLuhan, M.* Understanding Media: The Extensions of Man / M. McLuhan. – N. Y. : McGraw-Hill, 1964. – VII + 359 p.
8. *Williams, G. P.* Chaos Theory Tamed / G. P. Williams. – Washington, D.C. : Joseph Henry Press, 1997. – 499 p.

УДК 811.161.3’373:392.1 (476.2-37 Светлагорск)

А. М. Воінава (Гомель)

НАМІНАЦЫІ РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ СВЕТЛАГОРСКАГА РАЁНА

Вывучэнне дыялектнай мовы, у якой захоўваецца і адэкватна адлюстроўваецца шматвяковы вопыт народа, па-ранейшаму застаецца адным з самых актуальных. Абрады з’яўляюцца неад’емнай часткай мовы і народнай культуры. Час уносіць пэўныя змены ў гэтую сферу народнай культуры, хоць для абрадаў у цэлым характэрны іх павольны тэмп, кансерватыўнасць, традыцыйнасць, моцная пераемнасць. Традыцыйная абраднасць як культурная форма выконвае пэўныя камунікатыўныя функцыі, паколькі забяспечвае наяўнасць асаблівых інфармацыйных сувязей – спецыфічнага спосабу этнакультурнай інфармацыі, садзейнічае пераемнасці этнасу і забяспечвае стабільнасць яго ў часе. Абраднасць стварае ўмовы для акумуляцыі і перадачы культурнага вопыту этнасу, выконвае важную функцыю захавання этнічнай спецыфікі жыццёвага ўкладу і форм зносін.

Абрад асэнсоўваецца як паслядоўнасць дзеянняў, зваротаў да прадметаў, якія маюць сімвалічны сэнс, і звязаных з імі славесных выказванняў. Вырваныя са сваіх звычайных сувязяў, дзеянні, прадметы ў абрадзе трапляюць ва ўмовы новых заканамернасцей іх функцыянавання і злучэння, набываюць знакавы характар. У сукупнасці канструктыўныя адзінкі абраду ўтвараюць спарадкаваную знакавую сістэму.

Так, у складзе сямейна-абрадавай лексікі багатай і разнастайнай з’яўляецца лексіка радзіннай абраднасці як аднаго з найбольш важных комплексаў сямейнай абраднасці, які мае даўнія развітыя традыцыі бытавой культуры, уяўляе значную цікавасць і з’яўляецца актуальным для вывучэння і этнографаў, і лінгвістаў. Радзінна-хрэсьбінны абрад працягвае сваё існаванне і ў нашы дні, няхай і ў моцна змененым выглядзе. Як гэта ні парадаксальна на першы погляд, у ім можна досыць выразна ўбачыць пераемнасць у адносінах да Радзімы ў традыцыйнай культуры: разнастайныя інавацыі і мадыфікацыі, як правіла, закранаюць толькі паверхневыя ўзроўні рытуалу (якія адносяцца да плана выражэння), у той час, як глыбінныя, змястоўныя схемы адрозніваюцца неверагоднай устойлівасцю і аднастайнасцю.

У складзе радзіннай абраднасці вызначаюцца тры асноўныя моманты: само нараджэнне, ачышчэнне маці і бабкі-павітухі і прыём у грамадства новага члена [1, с. 319]. Характэрнай прыкметай абрадавай сітуацыі з’яўляецца абавязковасць такога кампанента, як паўтаральнасць. Абрад – гэта вызначанае традыцыяй дзеянне ці сукупнасць дзеянняў, таму абрадавае найменне можа абазначаць адно дзеянне (выкупіць кашу) ці мноства акцый (хрысціць дзіця).

Назвы абрадаў і іх этапаў можна падзяліць на дзве групы: абрады, якія праводзяцца пры нараджэнні дзіцяці, і абрады, якія праводзяцца пры хрышчэнні нованароджанага.

Лексемы, якія зафіксаваны пры нараджэнні і да хрышчэння, прадстаўлены наступным чынам.

1. Падрыхтоўка да нараджэння. Абрад уяўляе сабой зносіны чалавек – сілы прыроды, Бог, нізшыя духі. Абрад як нараджэнне міфалагічных уяўленняў аб’ектывізуе спецыфічную свядомасць яго ўдзельнікаў. Таму зразумелым становіцца строгае выкананне неабходных дзеянняў, ужыванне спецыфічных слоў.

Набліжэнне родаў і самі роды будучая маці і ўсе члены сям'і ўтойвалі, каб не сурочыць і каб яны прайшлі лёгка. Нараджэнне дзіцяці суправаджалася тайнай і шматлікімі забабонамі – цяжарнай неабходна было *засцерагацца, аберагацца: Жанчына павінна быць асцярожнай. Барані Бог што-небудзь рабіць у святы і ў нядзелю* [2, с. 340]; *Калі абрэжа бярэмянная валасы, то дзіця народзіцца лысае і доўга валасы не вырастуць. А калі што-небудзь рэзаць ці секчы ў нядзелю, то дзіця будзе з "заячай губой"* [2, с. 340].

2. Назвы асоб, якія ўдзельнічалі пры нараджэнні новага члена грамадства. Пры нараджэнні дзіцяці галоўнымі асобамі з'яўляецца, канечне, *парадзіха* 'жанчына, якая раджае або толькі што нарадзіла дзіця'. Акрамя літаратурнай, на тэрыторыі Светлагорскага раёна сустракаюцца таксама назвы *рожаніца, парадуха, радзіха: Бывала так, што рожаніца ражала дома* [2, с. 338]; *Радзіху вадзілі вакол стала* [2, с. 336]; *Да жанчыны-парадухі прыходзілі жанчыны* [2, с. 266]; *Бабка дапамагала парадзісе* [2, с. 341].

Паспяховыя роды шмат залежалі ад умення і вопыту *бабы, бабы-павітухі*: *Звалі бабку-павітуху* [2, с. 338], а таксама *баба, бабка, бабушка, бабка-павітушка*: *Звалі бабу, якая панімая* [2, с. 336]; *Звалі бабку, якая прымала роды* [2, с. 337]; *Бабка-павітушка прыходзіць са сваім поясам* [2, с. 337]. Бабай абавязкова павінна быць немаладая паважаная жанчына, у якой ёсць свае дзеці. Бабка нярэдка прыбягала да магічных дзеянняў: развязвання вузлоў, расшпільвання гузікаў, расплятання касы і пад. Яна ведала, як адрэзаць пупавіну, куды схаваць яе: *Звычайна пупавіну і паслед закопвалі пад тым вуглом хаты, куды не траплялі сонечныя прамяні. Туды ж вылівалі і ваду, дзе першы раз купалі дзіця* [2, с. 341]. Распаўсюджана і лексема *бабіць* 'прымаць дзяцей у час родаў', утвораная ад адпаведнага назоўніка: *Выбіралі бабу, каб бабіла* [2, с. 341].

Нованароджанага ў Светлагорскім раёне называюць *навароджаны: Навароджанае дзіця ўзвешвалі на бязмене* [2, с. 338]; *дзіця, дзіцё: Прыходзіла бабка, купала дзіця* [2, с. 340]; *Бяруць бабу, якая прымала дзіцё* [2, с. 336]; *дзіцёнак: У етых полачках бабка купала дзіцёнка* [2, с. 338].

3. Назвы рытуальных прадметаў або сімвалаў, якія выкарыстоўваліся падчас абраду: *рушнік* (*Пасля купання бабка выцірае аб чысты рушнік рукі* [2, с. 338]); *хлеб* (*Хлеб клалі для таго, каб дзіця не пужалася вады* [2, с. 338]); *палатняныя полачкі* (*У етых полачках бабка купала дзіцёнка* [2, с. 338]). Пры першым купанні часта дабаўлялі *рамашку, вотрубі пшанічныя*: *Клала траву для дзіцёначка: рамашку, вотрубі пшанічныя* [2, с. 338].

Пры з'яўленні ў сям'і нованароджанага, каб засцерагчы яго ад сурокаў, каб вырас дужым і прыгожым, яго хавалі ад злых людзей: *Злым людзям кідалі вугольчыкі ўслед з прыгаворам* [2, с. 338].

4. Назвы абрадаў. Пасля нараджэння дзіцяці ў хаце рабілі *атведкі, адведкі, вответкі, радзіны: Прыходзяць у атведкі толькі жанчыны* [2, с. 337]; *Калі жанчына нараджла, прыходзілі ў вответкі да ёй* [2, с. 340]; *У першы тыдзень тройчы прыходілі ў адведкі* [2, с. 342]; *Радзіны – гэта таямніца, дзе толькі жаночыя справы* [2, с. 337].

5. Назвы ежы *(аладкі, наліснікі, коржыкі, кісель): У асноўным гатавалі блінчыкі, халоднае, кісель* [2, с. 336]; *кампот: А галоўным быў кампот з яблыкамі і грушамі сушанымі, каб не балеў жывот* [2, с. 336]; *мёд: Гарбуз на хрэсьбіны надзяром, чарніц сушоных намочым – яны набракаюць – атрымліваецца павідла. Мы называлі мёд* [2, с. 336]; *мак: Маку натаўком* [2, с. 336].

Тэматычная класіфікацыя абрадаў, якія праводзяцца пры хрышчэнні нованароджанага, прадстаўлена такім чынам.

1. Назвы абраду хрышчэння і яго частак (*хрышчэнне, хрэсьбіны, крэсьбіны, хрысціны, радзіны): Пасля хрышчэння дзіцяці рабілі хрысціны* [2, с. 338]; *Калі вярталіся з царквы, то сядалі за стол, празнавалі радзіны* [2, с. 340]; *Бацька і маці не прысутнічалі на хрышчэнні* [2, с. 339]; *біць кашу, выкупляць кашу: Кум кашу б'е* [2, с. 336]; *дзяліць кашу: Кашу падзялілі* [2, с. 339]; *красці кашу*: *А госці хочуць украсці кашу* [2, с. 340]; *разбіць гаршчок: Кум павінен быў разбіць гаршчок (пабіць кашу)* [2, с. 342].

Калі нараджэнне дзіцяці суправаджалася тайнай і шматлікімі забабонамі, то ў наступным этапе радзіннага абраду ўдзельнічае вялікая колькасць народу: *На хрэсьбіны прыглашалі ўсіх родственнікаў* [2, с. 341].

2. Назвы асоб, якія ўдзельнічаюць у абрадзе.

«Усе прыведзеныя факты даюць нам падставу разглядаць частку абрадаў, звязаную з нараджэннем дзіцяці, як акт прыёму нованароджанага ў грамадства. Асноўнымі тут з'яўляюцца хрысціянскія моманты, асабліва правядзенне хрышчэння: весь абрад называўся хрышчэнне, а дзеючыя ў ім асобы – кум і кума», – сцвярджае вядомы даследчык усходнеславянскай этнаграфіі Д. К. Зяленін [1, с. 323].

Пры хрышчэнні галоўнымі ўдзельнікамі былі *бацюшка: Бацюшка галоўку дзіцяці мочыць* [2, с. 342]; *хросныя бацькі, хросныя радзіцелі: Хросныя бацькі далжны былі, як родныя бацькі, даглядаць за дзіцём* [2, с. 340]. У адносінах да бацькоў хросныя дзіцяці называліся *кум* і *кума*: *Выбіралі кума і куму* [2, с. 338].

Нованароджаны пры хрышчэнні называўся *крэснік, хрэснік*: *Яны частавалі хрэсніка* [2, с. 340]; *Прыглашае выпіці за здароўе крэсніка* [2, с. 338].

3. Назвы рытуальных прадметаў або сімвалаў, якія выкарыстоўваліся падчас абраду. Гэтыя прадметы выступаюць як своеасаблівы код, што мае разнастайныя функцыі. Адным з самых значных прадметаў у радзінна-хрэсьбінным абрадзе, як і ва ўсіх астатніх (вясельным. пахавальным), з'яўляўся *каравай, хлеб (Неслі хлеб да іх і прасілі быць хроснымі* [2, с. 338]) – сімвал багацця, жыцця, шчаслівага лёсу, у якім пераплятаюцца мужчынскі і жаночы пачаткі.

Пры правядзенні абраду хрышчэння выкарыстоўваліся іншыя рэчы і прадметы, якія мелі назвы: *крыж, крэшчык*: *Трэба хросны каб крэшчык купіў* [2, с. 337]; *хлеб-соль: Кума прыходзіла ў дом з хлебам-соллю* [2, с. 337]; *чарапкі, чарапочкі, чарапянкі* – абломкі, асколкі разбітага глінянага, чыгуннага або фарфоравага вырабу (ТСБМ, 5 (2), с. 295): *Чарапкі клалі на галаву маладым, каб яшчэ дзеці раджаліся* [2, с. 337]; *заслон: Кума з кумой паднімалі на заслоне* [2, с. 338]. Удзельнікі хрэсьбіннага абраду абавязкова абменьваюцца *падаркамі: Куму – на рубашку, куме – на плацце, і бабе таксама* [2, с. 338].

Пасля таго, як хрышчэнне дзіцяці закончылася, бабу дадому вазілі летам на *баране* ці *калясцы: У канцы хрэсьбін бабку 'цягалі на баране'* [2, с. 336]; *Садзілі на каляску і трэбуюць магарыч* [2, с. 343], а зімой – на саначках: *Бабку тожа зімой вазілі на саначках па сялу ў краму, за выкуп* [2, с. 338].

4. Навы абрадавай ежы. Найбольш пільная ўвага надавалася *кашы, бабінай кашы, кумавай кашы*, гаршчок з якой абвязвалі стужкамі, чаплялі цукеркі: *Каша магла быць рысавай або грэцкай* [2, с. 336]; *Называлася то бабіна каша, то кумава каша* [2, с. 264]. Часта першы раз падавалі *падстаўную кашу*: *Іншы раз давалі падстаўную кашу* (Баравікі Светл.).

Абрады, звязаныя з сямейным жыццём чалавека, з'яўляюцца праяўленнем традыцыйнай культуры беларусаў, таму ў генетычных адносінах амаль уся лек-

сіка належыць да агульнаславянскага лексічнага фонду: *бабка*, *дзед*, *кум*, *радня*, *хрысціць*, *каша*, *гаршчок*, *мятнік*, *ручнік*, *кажух*, *маці*, *бацька*, *парадзіха* і інш. [3]. Большасць зафіксаваных лексем – матываваныя найменні. Фактар матываванасці слова звязаны з лексічным значэннем, прадвызначае лексіка-семантычную характарыстыку слова, яго семантычную валентнасць, эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць і вобразнасць. Пад матываванасцю слова звычайна разумеюць «абумоўленасць яго значэння значэннем іншага слова, ад якога яно ўтворана» [4, с. 121], усведамленне сувязі значэння і гукавой абалонкі, якая выражае гэта значэнне [5, с.153].

Больш дакладнае, на нашу думку, азначэнне разглядаемага паняцця падае В. І. Блінова, якая лічыць, што «матываванасць – структурна-семантычная ўласцівасць слова, якая дазваляе ўсвядоміць рацыянальнасць сувязі значэння і гукавой абалонкі слова на аснове яго суадноснасці з аднакаранёвай (аднакаранёвымі) і аднаструктурнай (аднаструктурнымі) адзінкамі» [6, с. 6].

Як паказвае аналіз, самым пашыраным тыпам структурна-семантычнай матывацыі разглядаемых назваў з'яўляецца намінацыя паводле працэсуальнай прыкметы: *падаркі*, *роджаніца*, *парадуха*, *парадзіха*, *хрышчэнік*, *мятнік*, *хрэсьбіны*, *красціны*, *радзіны*, *адведкі*, *вотведы*, *сматрыны*, *павітуха*, *рубаха*. У такой дэрывацыі ўдзельнічаюць суфіксы *-к-*, *-ух-*, *-іц-*, *-ах-*, *-ын*.

Радзей утвараюцца найменні ад назоўнікаў: *кажух*, *бабушка*, *ручнік*.

Зафіксаваны на тэрыторыі Светлагорскага раёна і складаныя назвы:

прыметнік + назоўнік – *падстаўная каша*, *хросны бацька*, *хросная маці*, *вотрубі пшанічныя*, *кумава каша*;

дзеяслоў + назоўнік або назоўнік з прыназоўнікам – *біць гаршчок*; *збіраць на шапачку*; *класць на кашу*.

Даволі значную групу складаюць экспрэсіўныя абрадавыя назвы. Асаблівасцю эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі з'яўляецца тое, што эмацыянальная афарбоўка накладаецца на лексічнае значэнне слова, але не зводзіцца да яго: дэнататыўнае значэнне слова ўскладняецца канататыўным. Такія лексемы, акрамя намінатыўнай, маюць яшчэ і экспрэсіўную функцыю, якая робіць іх адметнымі, выразнымі ў лексічнай сістэме народна-дыялектнай мовы. Дадатковыя сэнсавыя кампаненты, уключаныя ў семантычную структуру слова, дазваляюць перадаць такія эмацыянальна-ацэначныя адносіны суб'екта да прадмета, як ласкальнасць, іронія, кпіны.

У складзе эмацыянальнай лексікі можна выдзеліць наступныя групы.

1. Словы з яркім канататыўным значэннем, якія ўтрымліваюць ацэнку фактаў, з'яў, прыкмет, што даюць адназначную характарыстыку: *Жадала яму быць* ***багатым***, ***здаровым***, ***шчаслівым*** [2, с. 340]; *Гавораць усё* ***добрае*** *для дзіцяці* [2, с. 340]; *Жалалі* ***дабра*** *і маці, і дзіцяці* [2, с. 265].

2. Мнагазначныя словы, нейтральныя ў асноўным значэнні, якія атрымліваюць якасна-эмацыянальнае адценне пры пераносным ужыванні: *Спасіба табе, кумок, мой галубок* [2, с. 341]; *А я гарна кветачка* [2, с. 339].

3. Словы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, якія перадаюць розныя адценні пачуццяў.

Выключным багаццем экспрэсіўных адценняў валодае лексіка са значэннем асобы. Шырока прадстаўлена яна ў радзінна-абрадавых песнях: *Ох, кумка мая, прынясу я жыта* [2, с. 339]; *Ой, учора, мае кумочкі, у нас радзінкі былі* [2, с. 341], *Бабку просяць* [2, с. 339]; *Калі сын, будзе пісаць, калі дочка, будзе вышываць* [2, с. 339]; *Аль сына. Альбо дачушку* [2, с. 339]; *Мяне маменька радзіла* [2, с. 339].

Памяншальна-ласкальныя суфіксы назоўнікаў, што сустракаюцца ў радзінных песнях, у сваёй большасці звязаны не з памяншэннем прадмета (*хацінка* – не маленькая хата), а з выражэннем адносін павелічальнасці або ласкальнасці. Так, суфіксы *-еньк-*, *-аньк-*, *-іньк-* выяўляюць станоўчыя адносіны да аб'екта, маюць значэнне яркай эмацыянальнасці і размоўнай экспрэсіўнасці: *Бабка мая, любенька мая* [2, с. 339]; *Не кукуй, зязюлечка, рана, Не кажы, што ночачка мала* [2, с. 339]; *Мяне маменька радзіла* [2, с. 339]; *Туга ножанькі звіла* [2, с. 339].

Такія ж адносіны выражаюцца з дапамогай суфіксаў *-аньк-*, *-іньк-*: *Просіць баба-бабусінька* [2, с. 258]; *А гарненька рыбанька хароша* [2, с. 339];

-к-, *-ок-*: *Ой, кумка мая* [2, с. 339]; *Калыбелька разрісованая* [2, с. 339], *На табе, Марына, карову з цяляткам* [2, с.128]; *У нас радзінкі былі* [2, с. 341]; *Усю нядзельку гуляць* [2, с. 341]; *Мы на хрэсьбінкі прыйшлі* [2, с. 341];

-ачк-, *-очк-*, *-ечк-*, *-ейк-*: *Кума мая, кумачка* (Светлагорск); *Штоб танцорачкай была* [2, с. 339]; *Скажы ты мне праўдачку* (Яланы Светл.); ***Табе сыночка я радзіла*** [2, с. 339];

-чык: *Па рубельчыку даці* [2, с. 341];

-ятк-: *Дадому з дзіцяткам* [2, с. 341].

У складзе суфіксальных утварэнняў можна вылучыць словы максімальнай ступені экспрэсіўнасці – такія дымінутывы, якія ўтвараюцца ад дымінутываў: *бабулечка* ад *бабуля*: *Дам табе, **бабулечка**, Тры пуды маку* (Шупейкі Светл.); *бабусенька* ад *бабуся: Бяжыць к сваёй **бабусеньке*** (Яланы Светл.). У такіх назоўнікаў праяўляецца ўзмоцненая ступень ласкальнасці, мяккасці, добрых адносін.

Радзей у складзе радзіннай лексікі Светлагорскага раёна выяўляюцца прыметнікі і радзей прыслоўі з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, якія адназначна выражаюць узмацняльна-станоўчыя адносіны: *Унучачку здаровянька* [2, с. 338]; *Бабка мая, любенька мая* [2, с. 339].

У песнях, звязаных з радзіннай абраднасцю, фіксуюцца моўныя звароты, заснаваныя на супрацьпастаўленні: *Мая каша з канапелькамі, а вы, госцікі, з капейкамі* [2, с. 340]; *Сава не родзіць сокала, а такога чорта, як сама* [2, с. 338]; *Якое палена – такі клін, які бацька – такі сын* [2, с. 338].

Іншамоўная лексіка ў межах разглядаемага семантычнага поля складае даволі кампактную мікрагрупу і адносіцца пераважна да так званых «культурных» запазычанняў: *кофта*, *хвартух*, *хуста* і інш.

Абрадавая лексіка, якая да сённяшняга часу шырока функцыянуе на тэрыторыі Светлагорскага раёна, вызначаецца багатай і складанай сістэмай лексічных сродкаў, варыянтнасцю і разнастайнасцю сродкаў з іх семантычнымі і граматычнымі асаблівсцямі, з'яўляецца неад'емнай часткай духоўнай культуры беларусаў, у якой захаваны старажытныя моўныя з'явы.

ЛІТАРАТУРА

1. *Зеленин, Д. К.* Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин. – М. : Наука, 1991. –511 с.
2. Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўт.-уклад. : В. С. Новак, В. К. Шынкарэнка [і інш.]. – Гомель, 2013.
3. *Фасмер, М.* Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / М. Фасмер; пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачёва; под ред. и с предисл. Б. А. Ларина. – М., 1986–1987.
4. *Моисеев, А. И.* Мотивированность слов / А. І. Моисеев // Исследования по грамматике русского языка. Учен. зап. ЛГУ. – 1963. – Вып. 68, № 322.
5. *Супрун, А. Е.* Лекции по лингвистике / А. Е. Супрун. – Минск, 1980.
6. *Блинова, О. И.* Предисловие / О. И. Блинова. // Мотивационный диалектный словарь. Говоры среднего Приобья. – Томск, 1982.

УДК 811.161.3’367’37(045)

Т. І. Гарановіч (Мінск)

БЕЛАРУСКІЯ СІНТАКСІЧНЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ ЯК АДЗІНКІ ДВАІСТАЙ ПРЫРОДЫ

У русістыцы даследаванні сінтаксічных фразеалагізмаў (СФ) узыходзяць да прац Н. Ю. Шведавай і Дз. М. Шмялёва. У артыкуле «О некоторых типах фразеологизированных конструкций в строе русской разговорной речи», надрукаваным у часопісе «Вопросы языкознания» ў 1958 г., Н. Ю. Шведава піша аб існаванні ў гутарковым маўленні вялікай колькасці фразеалагізаваных сінтаксічных канструкцый – непадзельных і ўзнаўляльных шаблонаў з устойлівай формай і адносна свабодным лексічным напаўненнем пераменных кампанентаў. Найбольш чыстым відам такіх збудаванняў – уласна фразеалагізмамі – даследчыца лічыць канструкцыі, у якіх “спалучэнне кампанентаў не вызначаецца дзеючымі ў мове сінтаксічнымі нормамі і з’яўляецца з пункту гледжання гэтых норм нематываваным”, а пастаянны кампанент “амаль цалкам дэлексікалізаваны і пазбаўлены катэгарыяльных значэнняў”[1] [14, с. 95]. У рускай мове большасць сінтаксічных фразеалагізмаў, паводле Н. Ю. Шведавай, складаюць канструкцыі з займеннікам *что*.

Працытаваны артыкул адлюстроўвае змест часткі дысертацыйнага даследавання Н. Ю. Шведавай, прысвечанага сінтаксісу размоўнага маўлення, аўтарэферат якога выйшаў з друку таксама ў 1958 г. У гэтай працы даследчык, сярод іншага, прадстаўляе сваё разуменне ўласцівых СФ суб’ектыўна-мадальных значэнняў як выражэння стаўлення моўцы да таго, што паведамляецца, і вылучае 6 груп гэтых значэнняў: 1) акцэнтаванне, 2) ацэнку, 3) сцвярджэнне, 4) валевыяўленне, 5) уразуменне, 6) характарыстыку прыкметы адносна яе сапраўднасці, адпаведнасці сутнасці таго, што называецца [15]. Пазней гэта тыпалогія знойдзе адлюстраванне ў семантычнай класіфікацыі сказаў фразеалагізаванай структуры А. В. Вялічка.

На наяўнасць у рускай мове “сінтаксічных формул, якія вызначаюць сінтаксічна звязанае значэнне шэрага канструкцый”, звяртае ўвагу Дз. М. Шмялёў [16, с. 132], які называе такія канструкцыі *фразеасхемамі* або *фразеалагічнымі мадэлямі*. На яго думку, у адрозненне ад лексічных фразеалагізмаў, яны “не звязаны строгай замацаванасцю свайго лексічнага складу” і ў межах адной мадэлі “дапускаюць рознае “лексічнае напаўненне”, прычым “фразеалагічнасць” значэння з’яўляецца агульнай для ўсіх канкрэтных канструкцый, якія ўтвараюцца паводле дадзенай мадэлі” [16, с. 136].

Пазней сінтаксічныя фразеалагізмы разглядаліся шэрагам іншых вучоных, а ў 1980 г. іх апісанне было ўключана ў акадэмічную “Русскую грамматику” пад рэдакцыяй Н. Ю. Шведавай, дзе яны азначаюцца як “збудаванні, у якіх сувязі і адносіны кампанентаў з пункту гледжання жывых граматычных правіл аказваюцца невытлумачальнымі” [12, с. 216]. Да сінтаксічных фразеалагізмаў даследчык адносіць, у першую чаргу, фразеалагізаваныя сказы – “сказы з індывідуальнымі адносінамі кампанентаў і з індывідуальнай семантыкай”, у якіх словаформы звязваюцца адна з другой ідыяматычна, а службовыя і займеннікавыя словы, часціцы, выклічнікі функцыянуюць не паводле дзеючых сінтаксічных правілаў [12, с. 382]. Менавіта ў такой трактоўцы, са спасылкай на

[1] Тут і далей пераклад наш. – *Т. Г.*

Н. Ю. Шведаву, тэрмін *сінтаксічны фразеалагізм* ужываюць многія сучасныя даследчыкі, у прыватнасці А. В. Вялічка [5; 6], Лім Су Ён [9], М. У. Усеваладава [7], А. П. Ушакова [13], В. Ю. Мелікян [10] і інш.

Значным этапам у вывучэнні СФ на матэрыяле рускай мовы сталі даследаванні А. В. Вялічкі [5; 6]. Яна прапанавала семантычную класіфікацыю гэтых адзінак і вылучыла 6 груп значэнняў СФ (ацэнка, згода/адмаўленне, мадальнасць, адзінасць/множнасць, акцэнтаванне, абумоўленасць), якія ў істотнай ступені карэлююць з тыпалогіяй суб'ектыўна-мадальных значэнняў Н. Ю. Шведавай. У дачыненні да гэтых канструкцый А. В. Вялічка ўжывае тэрмін *сказы фразеалагізаванай структуры*, пад якімі разумеюцца "нестандартныя прэдыкатыўныя структуры, знакі другаснага ўтварэння, якія ўключаюць кампаненты двух тыпаў, якія забяспечваюць спалучэнне ў іх прыкмет фразеалагічнасці і сінтаксічнасці. З аднаго боку, гэта пастаянныя кампаненты са страчанымі або аслабленымі лексічнымі і граматычнымі значэннямі і функцыямі, якія з'яўляюцца канструктыўна і семантычна ўтваральнымі; з другога боку, гэта пераменныя кампаненты са свабодным лексічным напаўненнем" [6, с. 68]. У аўтарэфераце дысертацыі даследчык прыводзіць гэту дэфініцыю ў мадыфікаваным выглядзе і азначае сказы фразеалагізаванай структуры як "нестандартныя прэдыкатыўныя сінтаксічныя структуры, збудаванне і семантыка якіх не падпарадкоўваюцца рэгулярным сінтаксічным сувязям і дзеючым у мове заканамернасцям. Кампаненты ў іх звязаны ідыяматычна, а прамыя лексічныя і граматычныя значэнні кампанентаў, якія ствараюць структуру, страчаны ці моцна аслаблены" [5, с. 3].

Для абазначэння такіх канструкцый В. Ю. Мелікян ужывае тэрмін *сінтаксічныя фразеалагічныя адзінкі* і разумее іх як структуры, што характарызуюцца "ўзнаўляльнасцю, устойлівасцю, структурна-семантычнай цэласнасцю, ідыяматычнасцю, спецыфічным характарам адносін паміж кампанентамі, а таксама выконваюць у мове камунікатыўную і эстэтычную функцыі" [10, с. 52]. Паводле М. У. Усеваладавай, *сінтаксічныя фразеалагізмы* – гэта замацаваныя ў мове "сістэмныя сінтаксічныя мадэлі, ускладненыя модуснымі (суб'ектыўнымі) сэнсамі" [7, с. 454]. Н. А. Дашян аперыруе тэрмінам *фразеалагізаваныя сінтаксічныя структуры* і трактуе іх як "пастаянныя марфолага-сінтаксічныя схемы, якія напаўняюцца розным лексічным матэрыялам" [8, с. 3].

Пры тым, што разуменне гэтых спецыфічных збудаванняў у розных даследчыкаў аднолькавае або вельмі блізкае, для іх найменя выкарыстоўваюцца розныя тэрміны – *сінтаксічны фразеалагізм*, *фразеасхема*, *сказ фразеалагізаванай структуры*, *сінтаксічная фразеалагічная адзінка*, *фразеалагізаваная сінтаксічная структура*, *сінтаксічная фразема*, *фразеалагізаваная сінтаксічная канструкцыя* і інш. У нашым даследаванні для абазначэння канструкцый такога тыпу мы ўжываем тэрмін *сінтаксічны фразеалагізм* і ў сваім выбары абапіраемся на А. М. Баранава і Дз. А. Дабравольскага, якія ўказваюць на існаванне ў русістыцы ўжо сфармаванай традыцыі выкарыстання менавіта гэтага найменя [1].

На падставе праведзенага аналізу навуковай літаратуры і фактычнага матэрыялу, прадстаўленага больш чым 1600 беларускіх СФ, мы даём уласнае азначэнне сінтаксічных фразеалагізмаў і разумеем іх як устойлівыя прэдыкатыўныя структуры, якія ўтвараюцца паводле сінтаксічных мадэлей з абагульненым модусным значэннем і характарызуюцца ідыяматычнасцю, узнаўляльнасцю, наяўнасцю ў іх складзе пастаянных і пераменных лексічных кампанентаў.

Асноўныя характарыстыкі СФ, пералічаныя ў прыведзенай дэфінцыі, мы разгледзім на матэрыяле твораў вядомага беларускага літаратуразнаўцы, кры-

тыка, пісьменніка, загадчыка кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта П. В. Васючэнкі, якія выдатна адлюстроўваюць спецыфіку і прыгажосць гэтых канструкцый [2; 3; 4].

Сінтаксічныя фразеалагізмы будуюцца паводле м а д э л е й – пэўных структурных схем. Напрыклад, наступныя СФ утвораны паводле мадэлі *N дык N*:

(1) *Пане*! *Вось* ***кот дык кот***! *Паглядзіце, які рыжанькі*! = ‘вось вельмі добры кот’;

(2) *От* ***тавар дык тавар***! *Галоўнае, эканомія якая*! *Гэта я яго прыдумаў купіць*! = ‘тавар вельмі добры’;

(3) *– Ото ж былі* ***часы дык часы***! *– настальгаваў пан Кубліцкі. – Гускі, кароўкі, пчолкі, мядок… А тут рэпа ды рэпа… А жыццё мінаецца…* = ‘часы былі вельмі добрыя’.

Мадэль прадугледжвае наяўнасць п е р а м е н н ы х к а м п а н е н т а ў, якія ў структурных схемах СФ абазначаюцца праз указанне часціны мовы і, пры неабходнасці, яе граматычнай формы; у прыведзеных прыкладах пазіцыю пераменнага кампанента *N* займаюць назоўнікі *кот*, *тавар* і *часы*. Разам з тым у склад СФ уваходзяць п а с т а я н н ы я к а м п а н е н т ы, якія прадстаўляюцца ў структурных схемах канкрэтнымі лексічнымі адзінкамі: у мадэлі *N дык N* пастаянным кампанентам выступае часціца *дык*.

Наступная ўласцівасць СФ – гэта ў с т о й л і в а с ц ь, якая праяўляецца ў іх непадзельнасці: у маўленні СФ ужываюцца як цэласныя адзінкі, таму прыведзеную вышэй мадэль *N дык N* нельга скараціць да *N дык* або *N N* і замест *кот дык кот* з прыкладу (1) сказаць *кот дык* або *кот кот*. Выключэннямі ў гэтых адносінах з’яўляюцца толькі тры СФ – *якое там* / *дзе там* / *дзе ж X*, *мала* + пытальнае слова + прэдыкатыўная аснова і *чаму б* (*і*) *не* Inf, якія могуць ужывацца ў выглядзе парцэляваных канструкцый, г. зн. без пераменнага кампанента:

(4) *– Яно, казаў той, нядобрая прыкмета – вяртацца… – спрабаваў пераканаць сябрука пан Кубліцкі, але* ***дзе там***! *Пабег пан Заблоцкі дадому, адно пяткі замільгацелі*! ‘дзе там было пераканаць яго’ = ‘пераканаць яго было немагчыма’.

Чарговай асаблівасцю СФ з’яўляецца і д ы я м а т ы ч н а с ц ь, пад якой мы разумеем невыводнасць семантыкі ўсяго збудавання з сукупнасці значэнняў яго кампанентаў, што асабліва добра відаць на прыкладах, што ў даслоўным разуменні былі б бессэнсоўнымі:

(5) *Яна пасоўвалася па беразе, далікатна ведучы Шчупачка па ручаінцы,* бо ***рыба ёсць рыба*** *– яна без вады не можа* = ‘у рыб ёсць свая спецыфіка: ім патрэбна вада’;

(6) *– Вой*! *Пану Крыштапу Халімону ў лоб трапіла*!.. *– стогне пан Кубліцкі. – Што зробіш*! ***На вайне як на вайне***! *Плі*! *– крычыць у запале пан Заблоцкі* = ‘тое, што адбываецца, звычайна для вайны’;

(7) *Хто казаў, што Каляровая Затока мёртвая*? *Людзі*? ***Мала што яны казалі***. *А ці так гэта*? = ‘тое, што яны казалі, не мае значэння’.

СФ *рыба ёсць рыба* ў прыкладзе (5) будуецца паводле мадэлі *X ёсць X*, у якой пазіцыі тэмы і рэмы займае адзін і той жа назоўнік. Пры літаральным разуменні такое выказванне не мае камунікатыўнай вартасці, паколькі ў рэме не паведамляецца нічога новага, а паўтараецца тое, што ўжо вядома і адлюстравана ў тэме – ‘рыба з’яўляецца рыбай’. Аднак насамрэч па прычыне ідыяматычнасці мадэль *X ёсць X* выступае ў значэнні ‘наяўнасць пэўных асаблівасцей, заканамернасцей, уласцівасцей’ і ў дадзеным кантэксце актуалізуе патрэбу рыбы ў вадзе – ‘у рыб ёсць свая спецыфіка: ім патрэбна вада’.

СФ *на вайне як на вайне* ў прыкладзе (6) аформлены паводле мадэлі *Х як Х* і мае форму параўнання. Аднак калі ў звычайным параўнанні супастаўляюцца розныя аб'екты, як правіла, знаёмы і незнаёмы, у гэтым выпадку пазіцыі кампаранта і кампарата займае адзін і той жа кампанент *Х*, у прыведзеным прыкладзе *на вайне*, такім чынам, *Х* параўноўваецца сам з сабой, што не мае сэнсу з пункту гледжання логікі. Аднак па прычыне ідыяматычнасці мадэль не інтэрпрэтуецца літаральна, а як цэласная адзінка выражае семантыку звычайнасці *Х*, такім чынам, *на вайне як на вайне* значыць 'тое, што адбываецца, звычайна для вайны'.

У шэрагу СФ адбываецца дэсемантызацыя пастаянных кампанентаў, што вызначае ідыяматычны характар усёй мадэлі. Так, у СФ мадэлі *мала* + пытальнае слова + прэдыкатыўная аснова лексема *мала*, якая выконвае функцыю пастаяннага кампанента, губляе свае прамыя значэнні 'нямнога, у невялікай колькасці; недастаткова, менш, чым патрэбна', а ўся структура выражае семантыку 'нязначнасці, неістотнасці', такім чынам, *мала што яны казалі* ў прыкладзе (7) значыць 'тое, што яны казалі, неістотна'.

СФ таксама характарызуюцца ў з н а ў л я л ь н а с ц ю: яны не ўтвараюцца ў працэсе маўленчай дзейнасці, але захоўваюцца ў гатовым выглядзе ў свядомасці носьбітаў мовы і толькі выбіраюцца і выкарыстоўваюцца імі ў адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі маўлення. Паколькі СФ з'яўляюцца стандартнымі рэакцыямі на пэўныя акалічнасці, то пры паўтарэнні гэтых акалічнасцей кожны раз ужываюцца тыя ж самыя ўстойлівыя канструкцыі. Напрыклад, у сітуацыях, якія выклікаюць неабходнасць у экспрэсіўнай форме выразіць немагчымасць, у беларускай мове выкарыстоўваюцца СФ, збудаваныя паводле мадэлі *дзе* (*ж*) + інфінітыў / прэдыкатыўная аснова:

(8) *Апамятайся, пане*! ***Дзе ж набрацца грошай на яшчэ аднаго каня****?* = 'знайсці грошы на яшчэ аднаго каня немагчыма';

(9) *Беглі, беглі паны, боты стапталі, засапліся – але* ***дзе ты іх дагоніш****!* = 'дагнаць іх немагчыма';

(10) ***Дзе ж таму беднаму Трытону****, нават сабраўшы ўсе ягоныя сціплыя ашчаджэнні,* ***узбіцца на той аквапарк***? = 'Трытону немагчыма стаць уласнікам аквапарку'.

Яшчэ адна ўласцівасць СФ – гэта наяўнасць а б а г у л ь н е н а г а м о д у с н а г а з н а ч э н н я. Тэрмін *модусное значэнне* мы, паводле Н. Ю. Паўлоўскай, разумеем як стаўленне моўцы да выказвання, кампанентамі якога з'яўляюцца эмацыянальнасць – пачуццёвае ўспрыманне суб'екта, і мадальнасць – тое, што мысліцца, мае інтэлектуальную, рацыянальную аснову [11]. Сінтаксічныя фразеалагізмы могуць выражаць эмоцыі, ацэнку па прыкмеце 'добра–дрэнна', (ня)згоду, (не)магчымасць, (ня)значнасць, вартасць, неактуальнасць, павіннасць, адпаведнасць норме і інш., і ва ўсіх гэтых семантычных варыянтах яны выражаюць модуснасць, напрыклад:

(11) *Але ў хаце пачынае тварыцца якоесь дзіва*: *поліўка бурапеніць, пара шугае пад столь, а са столі пачынаюць падаць непрытомныя мухі. Паны дзівяцца, круцяць насамі*: ***што за праява такая****, усе мухі павыдыхалі* = 'тое, што ўбачылі паны, вельмі дзіўна' – здзіўленне;

(12) "*Ах, якія штонікі прыгожыя*! *– захапляецца ў думках дзеўка Дрыпа. –* ***Чаму б не за гэтага замуж***? *Можа ён, калі гэты несімпатычны Максімілян памрэ, замест яго царом зробіцца*?" = 'магчыма, варта пайсці замуж за яго' – мэтазгоднасць;

(13) *І тады незнаёмая* (***якая там незнаёмая***!) *ужыла стары спосаб* = ‘яна насамрэч не незнаёмая’ – адмаўленне;

(14) *Такія свінні, **калі і** прадаюцца дзе-небудзь у белым свеце, **дык толькі ў Смургонях*** = ‘такіх свіней можна купіць толькі у Смургонях’ – акцэнтаванне выключнасці.

У адрозненне ад лексічных фразеалагізмаў, семантыка якіх замацоўваецца за спалучэннямі пэўных лексем, значэнне СФ замацавана за мадэлямі, паводле якіх яны ўтвараюцца, такім чынам, усе СФ, збудаваныя паводле адной структурнай схемы, маюць аднолькавае значэнне. Так, адным з семантычных варыянтаў мадэлі *N дык N* з’яўляецца ‘высокая якасць *N*’, таму ў адпаведных кантэкстах усе СФ такой структуры маюць гэта значэнне. СФ у прыведзеных вышэй прыкладах (1)–(3) аб’ядноўвае семантыка высокай якасці, пры гэтым у першым з іх яна адносіцца да ката, якога рэкламуе прадавец, каб прывабіць пакупнікоў; у другім – да асліка, з нагоды набыцця якога цешыцца пан Заблоцкі; у трэцім – да часоў, калі, як узгадвае пан Кубліцкі, ім жылося вельмі добра. Паколькі семантыка высокай якасці замацавана за мадэллю, ад лексічнага напаўнення пераменных кампанентаў яна не залежыць. У прыкладах (8)–(10) СФ, утвораныя паводле мадэлі *дзе* (*ж*) + інфінітыў / прэдыкатыўная аснова, маюць агульнае значэнне ‘немагчымасць’, якое, у залежнасці ад кантэксту, адносіцца да пакупкі яшчэ аднаго каня (8), спробы дагнаць рыцара і вараненькую кабылку (9) і набыцця аквапарку (10).

Рэалізуючы сваю модусную семантыку, СФ, па-першае, мадыфікуюць змест паведамленняў як верагодны, немагчымы, пажаданы і г.д., па-другое, адносяць яго да пэўнага часавага плану, у чым праяўляецца ўласцівая ім п р э д ы к а т ы ў н а с ц ь:

(15) *Конь Гарцук закахаўся на старасці год, а **чаму б і кату Буркуну не закахацца***? = ‘верагодна, што і кот Буркун можа закахацца’ – верагоднасць у аднесенасці да будучага;

(16) *Частаваліся хто чым хацеў*: *хто – кілбасамі, хто – аўсом, хто – марцыпанамі, хто цукеркамі. Мядзведзю асабліва рэпа спадабалася. Ён проста роў ад задавальнення, **хоць вушы затыкай*** = ‘мядзведзь так моцна роў ад задавальнення, што ўсе астатнія былі вымушаны затыкаць вушы’ – вымушанасць, якая мысліцца ў мінулым часе.

Такім чынам, сінтаксічныя фразеалагізмы, з аднаго боку, характарызуюцца ўстойлівасцю, узнаўляльнасцю і ідыяматычнасцю, уласцівымі лексічным фразеалагізмам. З другога боку, прэдыкатыўнасць, утварэнне паводле пэўных сінтаксічных мадэлей і наяўнасць у іх складзе пераменных кампанентаў набліжае гэтыя збудаванні да свабодных сказаў. Спалучэнне рыс як фразеалагізмаў, так і свабодных сказаў вызначае дваістую прыроду СФ. Акрамя пералічаных асаблівасцей сінтаксічных фразеалагізмаў вылучаюцца яшчэ дзве, спецыфічныя толькі для гэтых збудаванняў – наяўнасць абагульненага модуснага значэння і яго замацаванасць за мадэлямі, паводле якіх утвараюцца СФ.

ЛІТАРАТУРА

1. *Баранов, А. Н.* Аспекты теории фразеологии / А. Н. Баранов, Д. О. Добровольский. – М. : Знак, А. Кошелев, 2008. – 656 с.

2. *Васючэнка, П. В.* Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага / П. В. Васючэнка. – Мінск : Кнігазбор, 2018. – 104 с.

3. *Васючэнка, П. В.* Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі : казачныя аповесці / П. В. Васючэнка. – Мінск : Мастац. літ., 2003. – 96 с.

4. *Васючэнка, П. В.* Каляровая Затока : экалагічная казка / П. В. Васючэнка. – Мінск : Мастац. літ., 2008. – 143 с.

5. *Величко, А. В.* Предложения фразеологизированной структуры в русском языке: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01 / А. В. Величко. – Н. Новгород, 2017. – 41 с.
6. *Величко, А. В.* Предложения фразеологизированной структуры в русском языке: дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01 / А. В. Величко. – М., 2016. – 507 л.
7. *Всеволодова, М. В.* Теория функционально-коммуникативного синтаксиса / М. В. Всеволодова. – М. : URSS, 2017. – 649 с.
8. *Дашян, Н. А.* Фразеологизированные синтаксические структуры в русском языке (на материале простого предложения): автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.04 / Н. А. Дашян. – Ереван, 2011. – 24 с.
9. *Лим, С. Ё.* Принципы лингвистического описания синтаксических фразеологизмов: на материале синтаксических фразеологизмов с общим значением оценки: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 / С. Ё. Лим. – М., 2001. – 26 с.
10. *Меликян, В. Ю.* Синтаксические фразеологические единицы: фразеосинтаксические схемы / В. Ю. Меликян. – Ростов н Д. : ДОНИЗДАТ, 2019. – 268 с.
11. *Паўлоўская, Н. Ю.* Катэгорыя мадальнасці ў сучаснай беларускай мове: кагнітыўная структура, функцыянальны статус, сродкі выражэння : дыс. … д-ра філал. навук: 10.02.01 / Н. Ю. Паўлоўская. – Мінск, 2002. – 231 л.
12. Русская грамматика: в 2 т. / редкол. : Н. Ю. Шведова [и др.]. – М. : Наука, 1980. – Т. 2: Синтаксис. – 709 с.
13. *Ушакова, А. П.* Синтаксические фразеологизмы с семантикой иронического неодобрения в современном русском языке: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 / А. П. Ушакова. – Ярославль, 2018. – 22 с.
14. *Шведова, Н. Ю.* О некоторых типах фразеологизированных конструкций в строе русской разговорной речи / Н. Ю. Шведова // Вопр. языкознания. – 1958. – № 2. – С.93–100.
15. *Шведова, Н. Ю.* Очерки по синтаксису русской разговорной речи / Н. Ю. Шведова. – М. : Изд.-во Акад. наук СССР, 1958. – 31 с.
16. *Шмелев, Д. Н.* Синтаксическая членимость высказывания в современном русском языке / Д. Н. Шмелев. – Изд. 2-е, стереотип. – М. : КомКнига, 2006. – 152 с.

УДК 811.124’37+159.942


О. В. Герасимович (Минск)

К ПРОБЛЕМЕ ИНТЕРПРЕТАЦИИ ЛАТ. *ACEDIA* ‘УНЫНИЕ’

Уныния допускать нельзя. Большой грех – уныние...
М. А. Булгаков



Питер Брейгель Старший “Acedia” (1558)



Эдвард Мунк “Меланхолия” (1892)

В последние годы (первое десятилетие XXI века) в рамках лингвоконцептологии наметилось новое исследовательское направление (*теолингвистика*), связанное с изучением языка и концептов, в котором с различных сторон анализируются религиозные концепты как единицы религиозного сознания, константы религиозного идиолексикона, религиозная лексика, исследуются особенности религиозной картины мира.

Культуролог П. С. Гуревич, рассматривая религию как феномен культуры, также подчеркивал, что “религия – провозвестница человеческих ценностей, носительница нравственных императивов” [5, с. 244].

Согласно немецкому философу Н. Гартману, миру позитивных ценностей противостоит мир негативных ценностей, или неценностей, но это противостояние

осуществляется не по типу асимметричного соотношения или зеркального отражения: идеальному единству мира ценностей (добродетелей) соответствует идеальная разобщенность и раздробленность мира неценностей (пороков) [3, с. 342]. В национальных языках один и тот же грех мог иметь различные обозначения ввиду особенностей перевода, поэтому нередко используются латинские обозначения грехов: SUPERBIA ‘гордыня’, AVARITIA ‘сребролюбие’, GULA ‘чревоугодие’, LUXURIA ‘сладострастие’, INVIDIA ‘зависть’, IRA ‘гнев’, ACEDIA ‘уныние’. Обращение к переводным латинско-русским словарям К. А. Тананушко, О. А. Петрученко, И. Х. Дворецкого показало, что существительное *acedia* не зафиксировано ни в одном из них, однако в труде последнего автора указано прилагательное *acēdior* ‘быть мрачным, угрюмым’ [7, с. 22].

Первоначальный список из восьми худших человеческих страстей появился в трудах греческого монаха-философа Евагрия Понтийского (346–399): “Есть восемь всех главных помыслов, от которых происходят все другие помыслы. Первый помысл чревоугодия (*Γαστριμαργία*), и после него – блуда (*Πορνεία*); третий – сребролюбия (*Φιλαργυρία*); четвертый – печали (*Λύπη*); пятый – гнева (*Ὀργή*); шестой – уныния (*Ἀκηδία*); седьмой – тщеславия (*Κενοδοξία*); восьмой – гордости (*Ὑπερηφανία*)”.

Словарь древнегреческо-русского языка И. Х. Дворецкого субстантив *ἀκηδία* фиксирует в двух значениях: 1) ‘беззаботность, беспечность’, 2) ‘пренебрежение к себе, самоотверженность’ [6, с. 63], а лексему *λύπη* в трех: 1) ‘скорбь, печаль, горе’, 2) ‘печальное положение’, 3) ‘страдание, мука, боль’ [6, с. 1040], что свидетельствует о многозначности вербализаторов исследуемого порока.

Православная богословская традиция унаследовала восьмеричную классификацию страстей Евагрия Понтийского. Согласно учению святителя Игнатия Брянчанинова, смертные грехи – это *чревообъядение, любодеяние, сребролюбие, гнев,* ***печаль*** (огорчение, тоска, отсечение надежды на Бога, сомнение в обетованиях Божиих, неблагодарение Богу за случившееся, малодушие, нетерпеливость, скорбь на ближнего, ропот, отречение от креста), ***уныние*** (леность ко всякому доброму делу, в особенности к молитве, оставление молитвы и душеполезного чтения, невнимание и поспешность в молитве, небрежение, неблагоговение, праздность, многоспание, празднословие, кощунство, забвение заповедей Христовых, нерадение, лишение страха Божия, ожесточение, нечувствие, отчаяние), *тщеславие, гордость*, т.е. сохраняется двойственное понимание порока, выражаемое в латинском одной лексемой *acedia*.

Согласно заключению К. Изарда, “как и другие <…> эмоции, печаль универсальна. Ее переживание свойственно любому человеку, вне зависимости от его этнической принадлежности, религии, места и времени проживания” [8, с. 199], однако следует заметить, что *печаль* и *уныние* принадлежат к важнейшим русским культурным стереотипам, что подтверждает глубоко разработанная синонимика, выражающая широкий ряд смысловых оттенков этого чувства: *огорчение, тоска, горе, скорбь, хандра, меланхолия, отчаяние* и под. Словарь синонимов русского языка под редакцией А. П. Евгеньевой представляет следующий синонимический ряд с доминантой *грусть: печаль, уныние, кручина* [16, с. 258]. В “Словаре русских синонимов и сходных по смыслу выражений” под редакцией Н. Абрамова *грусть* не выделяется, поэтому мы можем сделать вывод, что *грусть* и *печаль* не дифференцируются: *печаль, горе, горесть, грусть, кручина, отчаянье, скорбь, прискорбие, скука, томление, тоска, траур,*

уныние, сокрушение, ипохондрия, меланхолия, соболезнование, сожаление, боль, горечь [1, с. 287–288]. Другое представление об интересующих нас эмоциональных концептах дает “Русский синонимический словарь” К. С. Горбачевича: *печаль, грусть, скорбь, горесть, уныние, кручина, кручинушка, сухота* [4, с. 277].

По данным Национального корпуса русского языка, наибольшим количеством документов и числом вхождений в них характеризуется лексема *печаль* (3859/9233), далее идут *тоска* (2997/7066), *лень* (1774/3068), *уныние* (1196/1854), *меланхолия* (762/1516), *апатия* (365/428), *безделье* (344/424) [12], что подтверждает мысль О. В. Покровской о том, что не только количественные, но и “качественные характеристики и частотность употребления членов синонимического ряда интерпретируются как показатель актуального интереса носителей языка к определенному понятию и соответствующим реалиям действительности” [14, с. 6]; т.е. в русском языковом сознании наиболее актуальны субстантивы *печаль, тоска, лень, уныние.*

Обращение к словарю С. И. Ожегова, к сожалению, не дает нам возможности в полной мере понять, что такое *уныние*, или отделить его от похожих терминов: *уныние* ‘безнадежная печаль; гнетущая скука’; *печаль* ‘чувство грусти, скорби, состояние душевной горечи’; *грусть* ‘чувство печали, уныния’; *тоска* ‘душевная тревога, уныние’; *меланхолия* ‘болезненно-угнетенное состояние, тоска, хандра’ [15].

Психолог Е. П. Ильин отмечает, что определение С. И. Ожегова не очень точно в психологическом смысле: “Если рассматривать уныние как эмоциональное состояние человека, то в нем в какой-то степени может присутствовать и скука как потеря интереса к происходящему, но главной составляющей данной эмоции представляется оценка безысходности ситуации, связанной с удовлетворением потребности, влечения, с достижением задуманного и желаемого. <…> уныние связано с неблагоприятным прогнозом на исход еще не закончившегося процесса, когда все же остаются какие-то шансы на успех, достижение цели. Когда же человеком завладевает ощущение безнадежности или итог становится окончательно ясным, возникают другие эмоции – разочарование, отчаяние, печаль, горе” [9, с. 166.]

Обобщение различных определений термина *уныние* позволяет охарактеризовать это состояние как длительное пониженное или негативное настроение, недовольство, обида, разочарованность, сопровождающиеся общим упадком сил и снижением жизненного тонуса. В тяжелых случаях уныние может привести к депрессии – угнетенному состоянию, которому сопутствует постоянное чувство тоски, тревоги, апатии, безучастное отношение к действительности, тягостное чувство вины и невозможности получения удовольствия от жизни, стремление к одиночеству и покою, субъективное чувство интеллектуальной тупости и безволия. Современной медициной XXI век официально признан “веком депрессии”. По данным эпидемиологических исследований, ежегодно около 150 млн жителей нашей планеты обнаруживают признаки этой болезни. По прогнозам ВОЗ, в 2020 году депрессия должна была выйти на первое место в мире среди всех заболеваний [10].

Несмотря на то, что развитие депрессии обусловлено тонкими биохимическими нарушениями в центральной нервной системе, в первую очередь, нарушением нормального метаболизма нейротрансмиттеров (веществ, регулирующих психическую деятельность), а также понижением в организме уровня серотонина, по мнению психолога Б. Ничипорова, депрессия – это не клиническое

состояние, а нравственно-психологическое [13, с. 47]. У современных людей она появляется как реакция на хронический стресс. В медицине существует такое понятие, как депрессивная личность, когда людям присуща генетическая предрасположенность к страсти уныния, к депрессивным состояниям. Испанский биолог Д. Медина в книге “Ген и семь смертных грехов” также утверждает, что именно гены несут ответственность за праздность, уныние и нежелание работать и в определенных дозах лень даже полезна, так как позволяет обдумывать важные решения, сохранять силы для будущих свершений [11, с. 32–33].

В середине XX века уныние, связанное с умственным переутомлением, конкретизировалось как акедия. В 1940-е годы шведский нейрофизик Р. Гранит описывал, как опасен “смертельный холод акедии” для научного работника. Педагог В. Шёстранд указывал, что причина акедии – перерасход ментальной энергии и завышенные требования, которые предъявляет человеку научная среда: “...находясь в академических кругах среди людей с высоким уровнем интеллекта, человек очень быстро осознает и вынужден признать – перед лицом своей совести и перед лицом окружающих – неполноту собственных знаний. Отсюда рукой подать до невротических синдромов разного рода”. В статье “Научная акедия” (1967) Х. Зеттерберг описывает другие причины чувства пустоты и неуверенности в себе, которое поджидает многих ученых: “Акедию вызывает излишняя специализация, сконцентрированность на своем предмете исследования” [2].

Таким образом, исследуемое нами явление относится преимущественно к психоэмоциональной сфере; наиболее частотными вербальными операторами лат. *acedia* в религиозном и секулярном фрагментах русской языковой картины мира выступают как лексемы *печаль, тоска, лень, уныние, меланхолия, тоска, апатия* и др., так и сама калька с греческого языка – *акедия*.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Абрамов, Н.* Словарь русских синонимов и сходных по смыслу выражений / Н. Абрамов. – 7-е изд., стереотип. – М. : Рус. словари, 1999. – 431 с.
2. Акедия: синдром потери смысла [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://newtonew.com/culture/akediya-sindrom-poteri-smysla. –Дата доступа: 23.10.2020.
3. *Гартман, Н.* Этика / Н. Гартман; пер. А. Б. Глаголева. – М. : Владимир Даль, 2002. – 708 с.
4. *Горбачевич, К. С.* Русский синонимический словарь / К. С. Горбачевич. – СПб. : ИЛИ РАН, 1996. – 510 с.
5. *Гуревич, П. С.* Культурология: учебник для вузов / П. С. Гуревич. – 5-е изд. – М. : Проект, 2003. – 336 с.
6. *Дворецкий, И. Х.* Древнегреческо-русский словарь : ок. 70 000 слов : в 2 т. / И. Х. Дворецкий ; под ред. чл.-кор. Акад. наук СССР проф. С. И. Соболевского ; с прил. грамматики, сост. С. И. Соболевским. – М. : ГИС, 1958. – Т. 1. – 1043 с.
7. *Дворецкий, И. Х.* Латинско-русский словарь : 50 000 тыс. слов / И. Х. Дворецкий. – М. : Рус. яз., 1976. – 1096 с.
8. *Изард, К.* Эмоции человека / К. Изард. – М. : Изд-во МГУ, 1980. – 439 с.
9. *Ильин, Е. П.* Психофизиология состояний человека / Е. П. Ильин. – СПб. : Питер, 2005. – 412 с.
10. Интересная статистика ВОЗ по депрессии на 2020 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.b17.ru/blog/voz_2020. – Дата доступа: 23.10.2020.
11. *Исаева, Е. Л.* Семь смертных грехов. Наказание и покаяние / Е. Л. Исаева. – М. : РИПОЛ классик, 2009. – 320 с.
12. Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https:// ruscorpora.ru/new/search-main.html. – Дата доступа: 23.10.2020.
13. *Ничипоров, Б. В.* Введение в христианскую психологию: размышления священника-психолога / Б. В. Ничипоров. – М. : Школа-Пресс, 1994. – 192 с.
14. *Покровская, О. В.* Языковой образ человека в синонимических репрезентациях: опыт разработки частной теории: на материале русского и английского языков: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.02.19 / О. В. Покровская; Кемеров. гос. ун-т. – Кемерово, 2008. – 23 с.
15. Словарь русского языка : 70 000 слов / С. И. Ожегов ; под ред. Н. Ю. Шведовой ; Акад. наук СССР, Ин-т рус. яз. – 22-е изд., стереотип. – М. : Рус. яз., 1990. – 921 с.
16. Словарь синонимов русского языка: в 2 т. / под ред. А. П. Евгеньевой. – М. : АСТ; Астрель, 2003. – Т. 1: АН / ИЛИ РАН. – 680 с.

УДК 811.161.3’373.23:008(045)

А. В. Ельницкая (Минск)

КУЛЬТУРНЫЕ ЦЕННОСТИ БЕЛАРУСИ В ГОРОДСКОМ ОНОМАСТИЧЕСКОМ ПРОСТРАНСТВЕ

В статье представлен фрагмент исследования внутригородских названий г. Минска, отражающих в своей внутренней форме культурные ценности страны. Объект исследования – минские урбанонимы (1341 единица); предмет– заключенная в них историко-культурная информация. Цель исследования – раскрыть эту информацию, выявить ее тематические составляющие.

Согласно определению Н. В. Подольской, урбаноним – это вид топонима, «собственное имя любого внутригородского топографического объекта, в том числе агороним, годоним, хороним городской, экклезионим, ойкодомоним» [1, с. 154]. В данной статье рассматриваются *годонимы* – названия городских линейных объектов (улиц).

Исследование внутригородских названий позволяет выявить, чем население города (в составе страны в целом) гордится и какую систему ценностей транслирует миру. Урбанонимы можно образно определить как «культурные вывески», содержащие свернутую историко-культурную информацию о городе и стране.

Важно отметить, что в номинации внутригородских линейных и нелинейных объектов Беларуси одним из ведущих является *меморативный принцип*, в соответствии с которым названия хранят и сообщают сведения о выдающихся (прецедентных) личностях и событиях, интегрируясь в общее информационное поле города. По именам личностей (антропонимам) и событий (хрононимам), которые были увековечены в названиях улиц, можно судить о том, какие именно аспекты истории представляют ценность для страны. Данный принцип обусловливает существующую во многих государствах культурную традицию именования объектов в память об известных персонах. Второй из доминирующих по количеству соответствующих ему урбанонимов принципов номинации – *географический* (в соответствии с ним географические объекты называются по ассоциации с другими объектами, обычно расположенными поблизости или существовавшими ранее в данном месте, а также природными объектами). Оба этих принципа являются базовыми в топонимике Беларуси, но урбанонимное пространство каждого города наполняет их индивидуальным содержанием.

Среди меморативных названий белорусской столицы выделяются две наиболее распространенные группы мотиваторов – это антропонимы участников освободительных войн, революций, восстаний (в частности, Великой отечественной войны: *ул. Гастелло*, *ул. Гебелева*, *пл. Казинца* и др.) и деятелей культуры и искусства (*ул. Янки Мавра*, *ул. Григория Ширмы*, *ул. Валентия Ваньковича*). Это закономерное следствие традиций внутригородского наименования советского периода, воспринятых современной годонимической системой Беларуси (как и других стран СНГ, где по-прежнему высок удельный вес новых отантропонимных образований).

Говоря об отражении национально-культурных ценностей в урбанонимии, надо учитывать такой нюанс, как сильно выраженная инертность политически маркированной составляющей корпуса минских годонимов, устойчивость к общественным настроениям: в 1990-е гг. без последствий остались решения Комиссии по названию и переименованию улиц и площадей Мингорисполкома о переименовании *ул. Свердлова* (в *ул. Вацлава Ластовского*), *ул. Мясникова* (в *ул. Князя Глеба Менского*), *ул. Берсона* (в *ул. Адама Станкевича*), а также улиц *Воло-*

дарского, *Советской*, *Комсомольской* и *Интернациональной* – были осуществлены лишь единичные перенаименования типа *ул. Урицкого → Городской Вал* (для сравнения отметим, что в других городах Беларуси смена идеологической парадигмы сильнее повлияла на состав городских номинаций). Поэтому в данной публикации мы сосредоточимся на годонимах, не имеющих сегодня спорных оценок в связи с их идеологической маркированностью.

Итак, внутригородские наименования, связанные со сферами культуры и искусства (составляют 13 % корпуса минских годонимов), представлены именами

а) выдающихся белорусских писателей-классиков (*ул. Якуба Коласа*, *ул. Максима Богдановича*, *ул. Ивана Шамякина*);

б) художников (*ул. Валентия Ваньковича* – его работы хранятся в музеях Вильнюса, Кракова, Парижа, Петербурга; *ул. Язепа Дроздовича* – белорусского Леонардо да Винчи, как его прозвал Петр Сергиевич), скульпторов и архитекторов (*ул. Архитектора Заборского* – автора проекта Музея истории Великой отечественной войны; *ул. Азгура* – скульптора-монументалиста);

в) режиссеров, внесших значительный вклад в развитие белорусского кинематографа (*ул. Виктора Турова*, *ул. Михаила Пташука*), и актеров (*ул. Стефании Станюты* – народной артистки Беларуси);

г) композиторов (*ул. Тикоцкого* – основателя белорусской национальной оперы; *ул. Юрия Семеняко*) и музыкантов (*бул. Мулявина*, названный в честь руководителя всемирно известного белорусского ансамбля «Песняры»).

Урбанонимическая картина Минска демонстрирует также гордость за достижения белорусских (и советских) ученых в разных областях науки. Некоторые из них получили признание не только внутри страны, но и за рубежом (таких годонимов в нашем материале насчитывается 79, или 5,9 %). Так, *ул. Игната Домейко* названа именем талантливого ученого, получившего степень кандидата философских наук в возрасте 15 лет и внесшего вклад в развитие мировой географии; *ул. Некрашевича* увековечивает память о белорусском ученом-языковеде, первом руководителе Института белорусской культуры; *ул. Академика Карского* – академика-этнографа и языковеда Ефимия Карского; *ул. Академика Жебрака* – ученого-селекционера, первым в мире получившего гибрид от скрещивания разных видов пшеницы. В минском урбанонимном пространстве есть значительная часть номинаций, связанных с представителями русской культуры (*ул. Сеченова*, *ул. Станиславского*, *ул. Менделеева* и др.), что обусловлено общей историей, территориальным соседством и тесными контактами с Россией.

Следует упомянуть и немногочисленный (0,4 % от общего количества годонимов), но при этом особенно значимый пласт городских номинаций, связанный с древнейшими родами Беларуси, отсылающий нас ко времени вхождения белорусских земель в состав Великого Княжества Литовского и напоминающий о богатом прошлом страны. Таковы номинации *ул. Ельских*, *ул. Тышкевичей*, *ул. Острожских*, *ул. Прушинских*, *сквер Эдварда Войниловича*. К ним по исторической ценности примыкают годонимы, мотивированные названиями народностей (*ул. Кривичская*, *ул. Татарская*), в то или иное время проживавших на территории Беларуси. Существование в городском пространстве подобных номинаций поддерживает преемственность в восприятии событий белорусской истории.

Отметим тот факт, что в урбанонимном пространстве Минска (как и в целом Беларуси – в отличие от некоторых других стран) отсутствуют названия литературных и мифологических персонажей, т.е. предпочтение отдается именно увековечиванию реальных людей, которые вписаны в национальную историю.

Помимо объемного пласта имен известных белорусских деятелей, городское языковое пространство столицы изобилует географическими номинациями, которые свидетельствуют о том, что белорусы любят и ценят природу своей земли (в нашем материале 17,2 % таких единиц). Общеизвестно, что Беларусь называют «легкими Европы» благодаря уникальному сочетанию болот и лесных массивов (составляющих 45 % территории), что отражается в таких годонимах, как *ул. Болотная*, *ул. Подлесная*, *ул. Сосновая*, *ул. Каштановая*, *ул. Луговая* и прочих. Беларусь «синеокую», воплотившуюся в таком поэтическом образе из-за многочисленных рек и озер (в связи с чем северная часть страны называется Белорусским Поозерьем), пролегающих на ее территории, представляют номинации *ул. Озерная*, *ул. Нарочанская* (мотиватор – самое большое озеро Беларуси, которое имеет большое значение в контексте белорусской культуры: его называют «белорусским морем», и данный гидроним часто упоминается в белорусской поэзии), *ул. Свислочская*, *Днепровская* (обязана своим названием самой большой белорусской реке). Как мы видим, городское языковое пространство столицы Беларуси – это неотъемлемая часть белорусской культуры, которая является зеркалом, отражающим особенности страны.

Итак, анализ городского ономастического пространства г. Минска позволяет сделать вывод, что наибольшую ценность для белорусов представляют история государства, национальные достижения в сфере науки, культуры и искусства, а также мир природы – все то, что в совокупности составляет уникальный культурный портрет страны.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Подольская, Н. В.* Словарь русской ономастической терминологии / Н. В. Подольская. – М. : Наука, 1978. – 198 с.

УДК 811.161.3'42'371:32.019.5 (=161.3)

А. М. Ермакова (Гомель)

КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ ЧАЛАВЕЧАГА ЛЁСУ Ў МОЎНАЙ СВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Лексічная адзінка апошнім часам у даследчых мэтах усё часцей разглядаецца як канцэпт. Адзінка, якой чалавек аперыруе ў працэсе кагніцыі і канцэптуалізацыі ведаў пра свет. Агульнанацыянальныя канцэпты ўтвараюць моўную карціну свету пэўнай лінгвакультурнай супольнасці, што фіксуецца ў межах семантычнай сістэмы мовы. Канцэпты нараджаюцца ў свядомасці індывіда як вобразы, якія вербалізуюцца больш ці менш дакладна. А гэта значыць, што яны могуць быць даследаваны лінгвістычнымі метадамі.

Мадэляванне моўнай карціны свету магчыма пасродкам аналізу канцэптаў, што ўваходзяць у яе. Карціна свету – цэнтральнае паняцце канцэпцыі чалавека, якое як ідэальнае ўтварэнне выражаецца знакавымі формамі, напрыклад такой, як натуральная мова. Менавіта мова дае магчымасць рэканструкцыі свядомасці, бо гэта – “прастора сэнсаў, у якой жыве чалавек” [1, с. 44]. Даць характарыстыку найбольш значных, базісных уяўленняў чалавека аб свеце можна праз аналіз культурна значных канцэптаў. Такія ўніверсальныя паняцці, як *лёс*, складаюць ядро нацыянальнай і індывідуальнай свядомасці.

Змест канцэпту становіцца даступным у выніку аналізу семантыкі слоў, фразеалагізмаў, сказаў, тэкстаў.

Паэтычны свет, па меркаванні Ю. М. Лотмана, з аднаго боку, уяўляе сабой мадэль рэальнага свету, з дрогога боку, складаным чынам суадносіцца з ім. Паэтычны тэкст – гэта дыялектычны механізм пошуку ісціны, тлумачэння акаляючага свету і арыенціроўкі ў ім. “Мэта паэзіі не ў пошуку асаблівых прыёмаў, а ў пазнанні свету і зносінах паміж людзьмі, самапазнанні, самапабудове чалавечай асобы ў працэсе самапазнання і камунікацыі. У канчатковым выніку мэта паэзіі супадае з мэтай культуры ў цэлым” [2, с. 131].

Крыніцай нашага даследавання паслужаць паэтычныя тэксты выдатнага беларускага паэта Рыгора Барадуліна.

Канцэпт вербалізуецца моўнымі адзінкамі. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы зафіксаваў наступныя значэнні слова *лёс* [3, с. 41] .

Лёс, -у, м. р.

1. Ход падзей, якія складваюцца незалежна ад волі чалавека; збег акалічнасцей.

Я жыў, ***як мне дазволіў Бог,*** */* [4, с. 141].

Шаноўны спадару Лёсе, / Нікому ў жыцці яшчэ / Цябе абыйсці не ўдалося, / Пакуль несупыннасць цячэ [4, с. 257].

Падвешвае лёс калыску бяссонную / Кожнаму / За цёплую зорку ягоную [5, с. 161].

2. Доля. Людскі лёс. Жаночы лёс.

І зморшчынкамі на тваім ілбе / Праклала сцежкі ***доля незямная****. / Яна падказвае* ***тваёй зямной / Азяблай долі****, / Як пялегваць мрою. / Душа жыве забытаю манею, / Дрыжыць над кожнай звычкаю старой* [4, с. 148].

І як з жыццем ні хітрыш, – / Яно табе ставіць крыж [5, с. 162].

3. Развіццё чаго-н.; далейшае існаванне, будучыня. Гістарычны лёс нацыі. Лёс чалавецтва.

Індывідуальны лёс неаддзельны ад лёсу этнасу. Броўнаўскі рух нашых індывідуальных лёсаў складаецца ў агульны нацыянальны і адзіны ў выніку:

Мы нясем свой крыж наканаваны (адзін на ўсіх)*, / Хто плячо падменіць* (ніхто акрамя нас не вырашыць нашыя праблемы), *Не чакаем. / Як ні душаць нас, мы не знікаем. / ... / Трэба – / Самі зробімся крыжамі, /... / У нябёсах душаў і ў паглядах / Беларусь – / Наш крыж наканаваны…* [4, с. 149].

Крыж – спынены вятрак / І ўсмешка руху, / ... / Крыж – скачанелы птах / І ўзмах сумневу, / ... / ***Крыж – гэта мы****, / Што ўсё ўхапіць хацелі / І нецярпліва рукі развялі. / Але здранцвелі й ценямі ў быллі, / Дрыжэцьмем / Над сваёй глухой пасцеллю* [4, с. 182].

Стварэнне асабістага жыцця – адзін з найбольш складаных відаў чалавечай творчасці, а жыццёвыя шляхі аказваюцца такімі заблытанымі і звілістымі. *Пасад і званяў абляціць лісцё,/ І застанецца голы ствол слупка / Магільнага. / І змесціцца жыццё / У сукупнасці апошняга радка. / Пра што ён скажа / Чытачу жывому, / Што цягне ўсё яшчэ / Зямную стому?..* [6, с. 120].

Да якой ступені чалавек самастойны ў выбары шляху, дзе межы яго свабоды і волі, ці ёсць тое, што не залежыць ад яго, якія сілы вызначаюць накірунак шляху? І што такое лёс?

На балі жыцця надзея чужая / Лёс на белы вальс запрашае [5, с. 162].

Уяўленні аб чалавечым лёсе разнастайныя і часам супярэчлівыя. Як быццам спрэчка эпікурэйцайў і стоікаў цягнецца і па сённяшні дзень. Ідэя свабоды чалавека як магчымасці самастойнага выбару лёсу супрацьпастаўлена ўяўленню аб немагчымасці супрацьстаяць яму.

Лёс не толькі фатум, але і развіццё, далейшае існаванне, будучыня.

Чалавек павінен вытрымліваць удары лёсу, не быць слабым, не даць яму магчымасць сябе “аплакаць”: *Дзеці застаюцца, / Каб бацькам / Болю і бяды не стала меней. / Іржавець старым, / Як тым цвікам, / Што жыццё трымае / Мокрай жменяй* (лёс вольны рабіць усё з чалавекам). */ … / Застаюцца дзеці ды сябры, / Покуль застаемся мы сабою* (застаемся дюдзьмі, любім і сябруем, здольныя адчуваць боль). */ Доля ўсё ўглядаецца савою, / Дзе аплакаць / Дрэва без кары…*(не аплача, покуль мы застаемся сабою, трымаем сваю “кару”, абаронены болем за самых блізкіх, нясем за іх адказнасць) [4, с. 17].

Чалавек павінен прыняць будучыню, не ўмешвацца ў ход падзей.

Вучыць не трэба маладых, / Ні лашчыць,/ Ні даваць пад дых,/ Ім думаць / Трэба даць магчымасць. / Дзяліць не трэба маладых / На гнедых, / Шэрых, / На рудых, – / Абы яны былі з вачыма. / Дзе дзёрзкасць і непрымірэнне, / Нібыта ў першы дзень тварэння…[6, с. 126].

Змены ў лепшы бок магчымыя ў жыцці пазітыўнага чалавека, які валодае смеласцю і рашучасцю, здольны перайсці ад пасіўнага да актыўнага фарміравання жыццёвага шляху: *Не забудзься, што кожны / Твой* ***крок*** *на прыкмеце. /* ***Множ дабро колькі моцы****, / Не лічачы множ. / Прышануй цішыню / Ў гэтым стомленым свеце, /* ***Каб пачуць****, як ступае / Гасподзь басанож* [4, с. 135]. Чалавек зусім не вольны ў выбары свайго жыццёвага шляху і рэалізацыі асабістага лёсу. І любая актыўнасць можа прывесці да непапраўнага, бо можна пагоршыць свой лёс. Аднак і пасіўнасць асуджаецца: *Апосталам балюча на зямлі, / Балюча й за бязмозглых, і за мудрых. / Як* ***зняць з плячэй з бядою хатулі****?* (працівіцца, супрацьстаяць бядзе) */ Хто* ***лёс праспаў*** *свой , / Як спытаць,* ***чаму дрых****?* [4, с. 147].

Чалавек можа зразумець, усвядоміць свой лёс і дабіцца самарэалізацыі. Падобная жыццёвая пазіцыя патрабуе вельмі высокай ступені адказнасці, гатоўнасці прыняць усё, праз што давядзецца прайсці на шляху да мэты: *Ці зважае на брэх прарок, / Што* ***прыйшоў ратаваць*** *ад аблуды, / … / Ці зважае на смех прарок, / Што* ***прыйшоў разбудзіць*** *сумленне, /…/ Ці зважае на гнеў прарок, / Што* ***прыйшоў разняволіць*** *волю* (Той, хто прыйшоў ратаваць, разбудзіць, разняволіць, будзе асмеяны, выслухае брэх і вытрымае гнеў. Аднак яго намаганні не марныя) */ За прарокам / Наколькі сілы /* ***След у след ідуць небасхілы*** (небасхілы не паспяваюць за такім чалавекам!) [4, с. 146].

“Лёс ставіцца да чалавека такім самым чынам, як зямля, ля якой яго трымае сіла цяжару, але без якой чалавек не здолеў бы хадзіць. Мы павінны прыняць свой лёс, як зямлю, на якой мы стаім, – зямлю, якая служыць нам трамплінам для нашай свабоды. Свабода без лёсу немагчымая; свабода можа значыць толькі свабоду ў адносінах да асабістага лёсу” [6, с. 22].

ЛІТАРАТУРА

1. *Вендина, Т. И.* Средневековый человек в зеркале старославянского языка / Т. И. Вендина. – М. : Индрик, 2002. – 336 с.

2. *Лотман, Ю. М.* Анализ поэтического текста: Структура стиха // Ю. М. Лотман. О поэтах и поэзии / Ю. М. Лотман. – СПб, 1996. – С. 18–252.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. – Мінск. : Галоўная рэд. Беларус. Сав. Энцыкл., 1979. – Т. 3: Л – П. – 672 с.

4. *Барадулін, Р.* Калі рукаюцца душы… / Р. Барадулін, В. Быкаў. – Мінск, 2003. – 344 с.

5. *Барадулін, Р.* Босая зорка / Р. Барадулін. – Мінск : ГА Беларус. таварыства “Кніга”, 2000. – 177 с.

6. *Барадулін, Р.* Выбраныя творы : у 2 т. / Р. Барадулін. – Мінск : Мастац. літ., 1984. – Т. 2: Вершы, паэмы, радкі дарог. – 335 с.

УДК 811.161.3’342

Т. Г. Казакевіч (Мінск)

ФАНЕТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ВУСНЫМ МАЎЛЕННІ

Вывучэнне вуснага маўлення – гэта адзін з перспектыўных напрамкаў развіцця сучаснай лінгвістыкі. Устойлівая ўвага лінгвістаў, скіраваная на вывучэнне жывога вуснага маўлення, абумоўлена тым, што ў працэсе сучаснай камунікацыі ўзрастае яго роля, пашыраюцца функцыі. Сучасны чалавек імкнецца выкарыстоўваць мову эфектыўна, у працэсе зносін змяншаючы свае намаганні і выдаткі, але пры гэтым дасягаючы выніку – быць зразуметым і дакладна перадаць інфармацыю.

Агульная тэндэнцыя да мінімалізацыі маўлення, імкненне да эканоміі сваіх намаганняў, сродкаў у працэсе зносін вызначаюць тыя працэсы, якія маюць праяўленне на лексічным, граматычным і фанетычным узроўнях мовы пры вусным маўленні. На характар працякання гэтых моўных працэсаў уплывае сітуацыя, у якой знаходзіцца моўца ці суразмоўнікі, прадмет і мэта выказвання, індывідуальныя асаблівасці.

Працяканне фанетычных працэсаў у вусным маўленні залежыць ад умоў камунікацыі, а таксама ад таго, як вымаўляе моўца, як ён ставіцца да свайго вымаўлення. Цяжка ўявіць, што існуе нейкі адзіны стыль вымаўлення. Ёсць варыянты вымаўлення, якія залежаць не толькі ад тэмпу маўлення, націску, суседства гукаў, працы органаў маўлення, але і ад прыватных асаблівасцей моўцы, яго эмацыянальнага і псіхафізіялагічнага стану.

Вымаўленне можа быць выразным, калі нам трэба прыцягнуць увагу слухача да інфармацыі, калі гаворым здалёк, калі цягнем словы з нейкай прычыны і інш. Пры нязмушаным звязным натуральным маўленні назіраем значна меншую дакладнасць вымаўлення, непаўнату ў артыкуляцыі, гукі могуць вымаўляцца невыразна, рэдукавана. Ступень спантаннасці вуснага маўлення, хуткі тэмп і высокая частотнасць ужывання адзінак абумоўліваюць ступень непаўнаты.

Моўца напружвае органы маўлення менш, калі размова ідзе пра вядомыя суразмоўцу факты, калі ён знаходзіцца сярод знаёмых і родных. У такіх сітуацыях людзі разумеюць адзін аднаго добра, напружваць органы маўлення няма патрэбы, бо ўсе ўдзельнікі размовы ведаюць, пра што ідзе гаворка. У выніку гукі вымаўляюцца менш дакладна, канец слова ці фразы “глытаюцца”, выпадаюць гукі, склады. Калі кола слухачоў пашыраецца, да размовы далучаюцца незнаёмыя людзі, ад моўцы патрабуецца большая дакладнасць вымаўлення, большае напружанне органаў маўлення, каб быць зразуметым.

Акрамя недакладнасці ў вымаўленні, вуснае маўленне вызначаецца часам асаблівай рытмізаванасцю, адметным чаргаваннем націскных і ненаціскных складоў. Словы могуць губляць націск, вымаўляцца карацей і менш выразна і аб’ядноўвацца з націскным словам у адзін такт. Часам у такіх сітуацыях дакладнаму разуменню спрыяе інтанацыя, з якой прамаўляе моўца.

Для фанетыкі вуснага маўлення характэрна варыятыўнасць. Розная інтэнсіўнасць працякання фанетычных працэсаў абумоўлена стылем вымаўлення.

Галосныя гукі не пад націскам трапляюць пад рэдукцыю. Галосныя першага пераднаціскнога склада ў параўнанні з націскным карацейшыя не менш чым у два разы, але ў вымаўленні захоўваюць свае асноўныя якасці і ўспрымаюцца выразна. У іншых ненаціскных складах галосныя яшчэ больш кароткія, але захоўваюць свае якасці і адрозніваюць словы.

Галосныя [і],[ы],[у] звычайна захоўваюць свае якасці ў ненаціскных складах, іншыя галосныя трапляюць пад аканне і яканне. Гук [у] на пачатку слова пасля галоснага не пад націскам мае рэдукцыю і змяняе сваю артыкуляцыю на [ў]: *ва ўніверсітэце, Вольга Уладзіміраўна [ўлаz'ім'іраўна]* і інш.; пачатковы [і] – на [й]: *яна ішла [йана‿йшла], да Івана [да‿йвана]*, пасля цвёрдых зычных – на [ы]: *ён ішоў [йон ‿ышоў]* і інш. Гук [а] з пэўных прычын дапускае якасную рэдукцыю: трава *[тръва]*, вада *[въда]* і інш.

Выпадкі нулізацыі ненаціскных галосных гукаў у вусным маўленні магчымыя і абумоўлены няпоўным стылем вымаўлення: *дзесяць [z'эс'ц'] рублёў, бібліятэка [б'ібл'атэка], напішу [напшу]* і інш. Калі галосны гук страчваецца паміж аднолькавымі і блізкімі па артыкуляцыі зычнымі, яны ў вымаўленні некаторых моўцаў зліваюцца ў адзін доўгі зычны: *дваццаць [двац͡ц] рублёў* і інш. Знікненне галоснага можа выклікаць і страту складу: *дзесяць [z'эс'], дваццаць [двац͡ц]* і інш.

Шматлікімі з’яўляюцца выпадкі ўстаўлення кароткага гука [а] ў запазычаных словах, якія заканчваюцца нехарактэрнымі для беларускай мовы спалучэннямі зычных гукаў: *міністр [м'ін'істар], кадр [кадар], метр [м'этар], спектакль [сп'эктакал']* і інш.

Зычныя гукі ў канцы слова перад наступным словам пры маўленні трапляюць у пазіцыю перад гукамі рознага тыпу. Пры поўным стылі і няхуткім тэмпе звонкія зычныя канца слова аглушаюцца: *год [гот] будзе, народ [нарот] быў* і інш. Пры хуткім тэмпе перад звонкімі звонкія канца слова не аглушаюцца. Падобнае ж узнікае заўсёды ў выпадку далучэння энклітыкаў: *народ бы [народ‿бы]быў* і інш. Пры хуткім тэмпе назіраецца таксама асіміляцыя па месцы і спосабе ўтварэння: *народ чысціў [нароччысц'іў], шалаш склалі [шалассклал'і]* і інш.

Пазіцыя канца слова – пазіцыя, дзе ў беларускай мове можна назіраць не толькі асімілятыўныя працэсы, але і спрашчэнне групы зычных са знікненнем гука. Напрыклад, у спалучэнні зычных [дт] у канцы іншамоўнага слова, што адлюстроўваецца на пісьме і з’яўляецца нормай літаратурнай мовы: *Кранштаа**т**, Шмі**т**, Рэмбран**т***.

У назоўніках жаночага роду, якія заканчваюцца на *-сць*, пры хуткім і сярэднім тэмпе маўлення назіраем працэс спрашчэння ў канцы слова: *радасць [радас'] вялікая, творчасць [творчас'] мастакоў, смеласць [с'м'элас'] знікла* і інш.

Пры хуткім тэмпе маем страты гукаў [z'], [ц'] *у* спалучэннях зычных у лічэбніках: *шэсць [шэс'] кніг, семдзесят [с'эмс'ат'], восемдзесят [вос'эмс'ат'], пяцьдзясят [п'аz'ас'ат],* у форме інфінітыва: *у нас ёсць [йос'] папера, хачу сесці [сэс'] там, трэба класці [клас'] туды* і інш.

Гэтыя прыклады ілюструюць характэрнае для носьбітаў мовы імкненне да набліжэння да фанетычнай структуры маўлення “зычны + галосны + зычны + галосны” з пазбяганнем у вымаўленні спалучэнняў зычных гукаў, паколькі беларусам характэрна агульная ненапружанасць, расслабленасць органаў у час маўлення.

У вусным маўленні пры вымаўленні спалучэнняў зычных на марфемным стыку даволі частотным з’яўляецца працэс спрашчэння спалучэнняў зычных. Так, цэнтральныя выбухныя зычныя гукі часта не вымаўляюцца ў такіх спалучэннях: *стк → ск: артыстка ([артыска]), машыністка ([машын'іска]); стц → сц: аб артыстцы [артысцы], аб нявестцы [н'ав'эсцы]; нтк → нк: студэнтка ([студэнка]), магістрантка ([маг'істранка]);нтц → нк: аб студэнтцы ([студэнцы]), аб магістрантцы ([маг'істранцы]);зд[т]к →з[с]к: паездка ([пайэска]); гск [кск]→ ск: пецярбургскі ([п'ец'арбурск'і]* і інш. У пэўных выпадках гэта стала нормай: *выязны, позна; посны, кантрасны, сэрца* і інш.

На марфемным стыку перад суфіксамі, якія пачынаюцца на [с], актыўнымі з’яўляюцца працэсы асіміляцыі і наступнага сцяжэння гукаў: *гарадскі [гарацк'і]*, *канадскі [канацк'і]*, *шведскі [швецк'і]* і інш. Пры суфіксальным утварэнні можам назіраць накладанні матэрыяльна супадальных кампанентаў кораня і суфікса (*мінскі – Мінск+ск+і, віцебскі – Віцебск+ск+і*).

Фанетычныя працэсы накіраваны на палягчэнне вымаўлення, іх інтэнсіўнасць абумоўлена многімі фактарамі, часта яны выклікаюць рэдукцыю (сцісканне) форм слоў ці спалучэнняў слоў. Рэдукаваныя формы з’яўляюцца натуральнымі. Як правіла, змены, рэдукцыя закранаюць частотныя адзінкі вуснага маўлення, што не перашкаджае моўцу і суразмоўніку паразумецца. Людзям, для якіх беларуская мова з’яўляецца народнай, важна навучыцца разумець носьбіта з любой манерай маўлення, каб ажыццявіць з ім камунікацыю. Разуменне фанетычных працэсаў, якія адбываюцца ў вусным маўленні, з’яўляецца важным у адэкватным апісанні сучаснага жывога вуснага маўлення пры распрацоўцы праграм па аўтаматычным распазнаванні і сінтэзе маўлення, аўдыявізуалізацыі маўлення, фарміраванні моўных фондаў, наладжванні “дыялогу” паміж камп’ютарам і чалавекам і інш.


УДК 378.147:811.161.3’243


Л. С. Кныш (Мінск)

ПАРТРЭТ ЧАЛАВЕКА: НЕКАТОРЫЯ ФРАГМЕНТЫ ЎРОКА
(пры вывучэнні беларускай мовы як замежнай)

Адной з тэм, якая вывучаецца з замежнымі студэнтамі (у прыватнасці з кітайскімі), з’яўляецца партрэтная характарыстыка чалавека. Яна карэлюе з такімі тэмамі, як “Мая сяброўка”, “Мой сябар”, “Мая сям’я”, “Знешні выгляд чалавека” і іншымі і ўваходзіць істотным складнікам у гэтыя тэмы. Ды і ўвогуле з’яўляецца важнай пры засваенні актыўнай лексікі і мовы ў цэлым. Таму пры вывучэнні гэтай тэмы можна вылучыць некалькі асноўных этапаў, якія паспрыяюць глыбокаму засваенню матэрыялу.

І. Лексіка. Яе семантызацыя можа быць рознай, у прыватнасці, як прэзентацыя з малюнкамі-партрэтамі (ніжэй некаторыя з іх як прыклад).

	Галава 头 Твар 脸 Лоб **前**额 Скура **皮肤** Падбароддзе 下巴		Барада **胡子**
	Брыво, бровы **眉毛** Вока, вочы **眼睛** Зрэнка, зрэнкі 瞳孔		Язык **舌**头
	Рот **口**，**嘴** Нос **鼻子** Пераноссе **鼻梁** Вусны, губы **嘴唇**		Вяснушкі **雀斑**

	Вейка, вейкі 睫毛 Павека, павекі **眼皮**		Зубы **牙**齿
	Вуха, вушы **耳**朵		Радзімка **胎痣**
	Скронь **太阳穴** Шчака 脸颊		Зморшчынка 皱纹
	Валасы 头发 Скула 颧骨 Сківіца 颌骨		Чэрап 颅骨
	Лысіна, плеш 秃顶		Патыліца 后脑勺子 Шыя 脖子
	Бакенбарды 颊须		

II. Праца з мэтай даць рознабаковую характарыстыку паняццям, напрыклад:

твар

а) па форме: шырокі, прадаўгаваты, круглы;

б) па колеры скуры: бледны, румяны, смуглы, загарэлы;

в) па адментых прыкметах: у зморшчынках, у вяснушках, з плямамі, з радзімкамі;

валасы

а) па даўжыні: кароткія, доўгія, да плячэй;

б) па аб’ёме: рэдкія, густыя, пушыстыя;

в) па колеры: светлыя, чорныя, белыя, каштанавыя, рудыя, пафарбаваныя, натуральныя;

г) па форме: прамыя, кучаравыя, хвалістыя;

лоб

а) па памеры: высокі, нізкі;

б) па ступені адкрытасці: закрыты, адкрыты;

вочы

а) па форме: маленькія, вялікія, вузкія;

б) па колеры: шэрыя, карыя, чорныя, блакітныя, зялёныя;

в) па адлюстраванні эмацыянальнага стану: сумныя, вясёлыя, радасныя, хітрыя;

вейкі

а) па даўжыні: доўгія, кароткія;

б) па аб’ёме: густыя, рэдкія;

в) па форме: прамыя, загнутыя;

г) па наяўнасці макіяжу: нафарбаваныя, ненафарбаваныя;

бровы

а) па даўжыні: доўгія, кароткія;

б) па шырыні: тонкія, вузкія, шырокія;

в) па аб’ёме: рэдкія, густыя;

г) па форме: выгнутыя, роўныя (прамыя);

д) па наяўнасці макіяжу: нафарбаваныя, ненафарбаваныя;

шчокі

а) па форме: пухлыя, упалыя;

б) па колеры: ружовыя, румяныя, бледныя;

нос

а) па форме: доўгі, прамы, кірпаты, з гарбінкай, бульбінай;

б) па памеры: вялікі, малы;

вусны

а) па форме: пухлыя, тонкія;

б) па наяўнасці макіяжу: нафарбаваныя, ненафарбаваныя;

падбародак плоскі, з ямачкай, востры, мужны;

вушы вялікія, маленькія, аддапыраныя;

вусы (у мужчыны)

а) па даўжыні: доўгія, кароткія;

б) па аб’ёме: густыя, рэдкія;

в) па форме: прамыя, закручаныя;

г) па колеры: чорныя, рудыя, светлыя, сівыя;

барада (у мужчыны)

а) па даўжыні: доўгая, кароткая;

б) па аб’ёме: густая, рэдкая;

в) па колеры: чорная, рудая, сівая;

шыя кароткая, доўгая, “лебядзіная”.

зубы роўныя, крывыя, прыгожыя, белыя.

ІІІ. Заданні рознага тыпу па тэме, скіраваныя на выбар неабходнага слова, на апісанне партрэта па малюнках, на замацаванне матэрыялу ў цэлым, напрыклад.

Заданне 1. Устаўце замест кропак прапушчаныя словы.

1. У маёй сяброўкі … кучаравыя валасы, … нос, … вушы.
2. У майго бацькі … вусы, … лоб, … нос, … твар.
3. У майго дзядулі … вочы, … бровы, … нос, … шчокі, … барада.
4. У яго … лоб, … валасы, … зубы, … вушы, ён не вельмі прыгожы.
5. У яе доўгія … валасы, … вусны, … зубы, … вочы, … вейкі, … бровы, яна проста прыгажуня.

Знаёмімся з мімікай. Міміка: базавыя варыянты



Міміка – гэта выраз твару, пры якім чалавек перадае свае пачуцці, настрой.


Заданне 2. Пранумаруйце малюнкі-маскі, адкажыце на пытанні:

1. Які малюнак-маска перадае здзіўленне?
2. Які малюнак-маска перадае сум, смутак?
3. Які малюнак-маска перадае гнеў?
4. Які малюнак-маска перадае агіду, непрыемнасць?
5. Які малюнак-маска перадае радасць?
6. Які малюнак-маска перадае спалоханасць, нечаканасць, жах.

Заданне 3. Складзіце апісанне па малюнках.

1 

2 

3 

4 

5 

6 

7 

8 

IV. Дыялогі. Праца з дыялогамі.

Прачытайце дыялогі па ролях, знайдзіце апісанне партрэтнай характарыстыкі і падкрэсліце яго ў тэксце.

Дыялог 1

– О!!! Прывітанне, Аліна!!! Ты такая прыгожая. Не разумею. Што не так? Што змянілася?

– Вітаю, Кастусь. Я ўчора пафарбавала валасы ў светлы колер. Вось і ўсё.

– Так, так. Цяпер бачу. Табе вельмі пасуюць светлыя валасы. І яркі макіяж таксама табе вельмі пасуе. Ну, проста прыгажуня!

– Дзякуй! Шчыры дзякуй!

– Дык, можа, Аліна, сходзім у кіно?

– Ну, што ж, можна і ў кіно.

Дыялог 2

– Вітаю, Ван!

– Прывітанне, Алесь.

– Ці ведаеш ты вунь тую дзяўчыну? Яна мне вельмі спадабалася. Хачу пазнаёміцца.

– Якая дзяўчына? Тая брунетка, з прычоскай карэ і з чырвонай памадай?

– Не, тая, што побач. У яе белыя валасы, вялікія блакітныя вочы, доўгія пушыстыя вейкі, маленькі носік і пухныя вусны. Яна такая прыгожая!

– Дык гэта ж мая аднакласніца Аліна. Я вас пазнаёмлю. Абавязкова.

– Дзякуй табе. Я такі шчаслівы!

Дыялог 3

– Макс! Я сёння быў у краме і бачыў тваю маці. Я заўважыў, што ты да яе зусім не падобны. У яе цёмныя прамыя валасы, кірпаты нос, шэрыя вочы. Яна невысокая, зграбная.

– Так. Я выліты бацька. Як дзве кроплі вады. Так кажа мая маці. Ты ж бачыш, у мяне светлыя валасы, чорныя вочы, нос прамы, вушы вялікія і нават радзімка на правай шчацэ, як у бацькі. А ты да каго падобны? Я ж не ведаю тваіх бацькоў.

– Я? Я падобны да матулі. Усё ўзяў ад яе: і кучаравыя светлыя валасы, і блакітныя вочы, і маленькія вусны, і ямачкі на шчоках, а таксама вяснушкі на носе. А бацька ў мяне грузін. Ад яго, як бачыш, нічога… Затое мая сястра ўся пайшла ў бацькаву радню. І з аблічча, і характарам.

– Як цікава. А нашы дзеці? Да каго будуць падобныя яны?

– Пажывём, пабачым…

<u>Запомні!!!</u>
Падобны да бацькі
Падабная да маці
Падобныя як дзве кроплі вады

Заданне 4. Задайце пытанні адзін аднаму паводле ўзору.

У з о р

1. – Я падобны да свайго дзядулі. А ты да каго падобны?
   – …
2. – Мая малодшая сястра падобная да маці. А твой брат да каго падобны?
   – …
3. – Ты падобны да бацькі?
   – Не, я …

Заданне 5. Складзіце свой дыялог на ўзор прачытаных.

Заданне 6. Працягніце дыялог. Дайце поўнае апісанне (ці адметнае), па якім Алесь зможа пазнаць Алену на чыгуначным вакзале.

– Прывітанне, Алесь!

– Вітаю, Макс!

– У мяне да цябе вялікая просьба. Ты не мог бы сёння а 5-й гадзіне сустрэць маю сястру Алену на чыгуначным вакзале? Бо я ў гэты час буду на занятках. У нас будзе кантрольны тэст па граматыцы.

– Вядома, сустрэну. У гэты час я вольны, але як я яе пазнаю?

– О! Алена…

V. Тэкст. Для засваення тэмы можна прапанаваць тэкст, напрыклад “Мая сястра Ніна”.

Мяне завуць Ліза. А гэта мая старэйшая сястра Ніна. Яна не падобная да мяне, бо ў яе блакітныя вочы і доўгія светлыя валасы. А ў мяне зялёныя вочы, кароткія чорныя валасы, маленькія вушы і пухлыя вусны. У Ніны прыемны свежы колер твару, прыгожыя маленькія вусны, праўда, трэба сказаць, што зрок у яе не вельмі добры. Яна носіць акуляры. Але яны яе не псуюць. Мая сястра стройная і зграбная. У яе добрая фігура. Ніна заўсёды элегантная і выглядае асабліва прывабна, калі ідзе з сябрамі ў кіно або ў тэатр.

Ніна вывучае замежныя мовы ва ўніверсітэце. Яна вучыцца на пятым курсе. Летам яна працавала ў турыстычным агенцтве. Яна выдатна ведае французскую і італьянскую мовы. Зараз вывучае польскую. Ніна любіць вандраваць. Яна ўжо пабывала ў Парыжы, Лондане, Бостане, Пекіне, Варшаве, Маскве і іншых гарадах.

Ніна любіць дасціпны гумар і жарты. Яна заўсёды мяне падбадзёрвае, бо я не так аптымістычна ўспрымаю жыццё. А яшчэ Ніна кемлівая, прыгожая і вясёлая. Яе ж сябар Васіль, наадварот, маўклівы і спакойны. У яго каштанавыя валасы, абаяльная ўсмешка і карыя вочы. Ён любіць спорт і шмат чытае. Фігура ў яго зграбная і натрэніраваная. Ён высокі і спартыўны. Ніна часта кпіць з яго, але ён ніколі не крыўдуе на яе.

Заданні да тэксту

- Прачытайце ўважліва, знайдзіце апісанне знешнасці герояў, падкрэсліце.
- Чым адрозніваюцца сёстры Ліза і Ніна? Прачытайце.
- Апішыце Васіля. Які ён?

Заданне 7. Апішыце каго-небудзь са сваёй групы (аўдыторыі).

VI. Дамашняе заданне. Складзіце падрабязнае апісанне знешнасці (партрэтнай характарыстыкі) сябра/сяброўкі; брата/сястры; бацькі/маці або інш.

УДК 81’374.3

А. М. Лапцёнак (Мінск)

АСАБЛІВАСЦІ ПАДАЧЫ ПРЫНАЗОЎНІКАЎ У ТЛУМАЧАЛЬНЫМ СЛОЎНІКУ

Прызначэнне тлумачальнага слоўніка – “тлумачыць сэнсавы бок лексічных адзінак, словазлучэнняў і марфем” [13, с. 7]. Службовыя часціны мовы, і прыназоўнік у прыватнасці, у гэтым сэнсе займаюць асобае месца. Падача прыназоўнікаў у слоўніку залежыць ад асаблівасцей іх фармальнай і зместавай структуры. У якасці рэестравых адзінак у “Тлумачальным слоўніку беларускай мовы” (ТСБМ), як і ў некаторых іншых тлумачальных слоўніках, традыцыйна апісваюцца толькі аднаслоўныя прыназоўнікі, а адзінкі, што складаюцца з больш чым аднаго кампанента, падаюцца або ў межах фразеалогіі (гл., напрыклад, *у адносінах → адносіны, з мэтай → мэта* і інш.), або ў якасці асобнага зна-

чэння, адценне ці ўжыванне з указаннем на састаўны характар (гл.: *налева ад → налева*, *паралельна з → паралельна* і г.д.). Па-рознаму афармляюцца прыназоўнікі і ў залежнасці ад складанасці семантычнай структуры. Калі прыназоўнік ужываецца ў складзе спалучэнняў, у якіх рэалізуюцца адносіны толькі аднаго семантычнага тыпу, яны спецыяльна не пазначаюцца, а апісваюцца больш вузкія значэнні, у гэтым сэнсе афармленне прыназоўнікаў не адрозніваецца ад іншых адзінак. Але калі спалучэнні прыназоўнікаў вельмі разгалінаваныя і прадстаўлены шматлікімі значэннямі, пры іх дадаткова пазначаюцца тыпы адносін, якія разбіваюць слоўнікавыя артыкулы на пэўныя семантычныя блокі для больш зручнага ўспрыняцця інфармацыі[1]. Аднак аналіз слоўнікавых матэрыялаў паказаў неаднастайнасць і супярэчлівасць прадстаўленых відаў адносін. У сувязі з перавыданнем фундаментальнага тлумачальнага слоўніка беларускай мовы лічым неабходным разгледзець пытанне іх лексікаграфічнага афармлення. У цэнтры нашай увагі – пытанне падачы ў слоўніку менавіта невытворных прыназоўнікаў з разгалінаванай семантычнай структурай.

На сённяшні час яшчэ няма адназначнага разумення сутнасці семантыкі прыназоўнікаў. Украінская даследчыца Н. Кушч прааналізавала тры падыходы да семантыкі прыназоўнікаў [6]. Некаторыя лінгвісты вызначалі прыназоўнік як своеасаблівую марфему. Да такога меркавання набліжаліся І. А. Бадуэн дэ Куртэнэ, А. М. Пяшкоўскі, В. У. Вінаградаў і інш. Канцэпцыю марфемнай прыроды абгрунтаваў Е. Курыловіч, згодна з ёй прыназоўнікі маюць толькі граматычнае значэнне і абсалютна пазбаўлены намінатыўнага лексічнага значэння, паколькі не адлюстроўваюць прадметаў і з'яў рэчаіснасці, а толькі ўказваюць на адносіны і сувязі паміж імі.

У працах украінскага даследчыка І. К. Кучарэнкі прадстаўлена супрацьлеглая думка: прыназоўнік вызначаецца як самастойнае слова, яго значэнне ідэнтычнае лексічнаму значэнню паўназначных слоў. Навуковец сцвярджае, што асноўная роля прыназоўніка палягае ў тым, каб фарміраваць састаўны член сказа, у якім прыназоўнік выконвае ролю паўназначнай звязкі.

Найбольшае пашырэнне атрымала пазіцыя, згодна з якой прыназоўнік – гэта службовае слова з аслабленым лексічным значэннем. Так, ужо ў "Граматыцы беларускай мовы" 1962 г. адзначана, што яны не маюць самастойнага лексічнага значэння і набываюць яго толькі ў злучэнні са знамянальнымі словамі, а магчымасць выражаць сінтаксічныя адносіны вызначаецца як функцыя прыназоўнікаў [4, с. 446]. У "Лексікалогіі беларускай літаратурнай мовы" падкрэсліваецца, што службовым часцінам мовы ўласціва лексічнае значэнне, але на першым плане ў іх граматычная функцыя [7, с. 25]. У большасці пазнейшых крыніц адзначаецца толькі, што з дапамогай прыназоўнікаў "выражаюцца адносіны" паміж кампанентамі словазлучэння. Навукоўцы па-рознаму кваліфікавалі сутнасць гэтых адносін: *функцыянальна-семантычныя, семантыка-граматычныя, сінтаксічныя адносіны.* П. П. Шуба пісаў, што "вызначэнне такіх адносін фактычна з'яўляецца кваліфікацыяй функцыянальнага значэння прыназоўніка[2]" [14, с. 44] і з часам паняцці "значэнне" і "адносіны" ў дачыненні да прыназоўнікаў у пэўнай ступені атоесніліся.

[1] Гл. у ТСБМ, напрыклад, блокавае афармленне прыназоўніка *ад*, які мае 21 значэнне, *з* – 38 значэнняў, *на* – 47 значэнняў і г.д.

[2] Даследчык адзначае таксама, што вытворныя прыназоўнікі маюць і ўласнае лексічнае значэнне, якое ў складзе словазлучэння становіцца яго функцыянальным значэннем.

Аднак няма адназначнага падыходу і да відаў адносін прыназоўнікаў. П. П. Шуба прыводзіць наступныя функцыянальныя значэнні гэтых лексем: прасторавыя, часавыя, аб'ектныя (якія дадаткова падзяляе на 7 падгруп), трансгрэсіўныя, значэнні меры і ступені, атрыбутыўныя (сярод якіх выдзяляе квалітатыўныя і квантытатыўныя), дыстрыбутыўныя, значэнні прыналежнасці, генетычныя, кампаратыўныя, значэнні спосабу дзеяння, прычынныя, мэтавыя і значэнні прыблізнасці [14, с. 44–46; 15]. Гэта ж класіфікацыя значэнняў прыназоўнікаў прыводзіцца і ў "Беларускай граматыцы" 1985 г. [1, с. 201–202]. Але, на наш погляд, часам мяжа паміж адносінамі невыразная, пэўныя спалучэнні з прыназоўнікамі могуць атрымліваць неадназначную трактоўку. Так, трансгрэсіўныя адносіны ілюструюцца прыкладам *піліць бервяно на дошкі*, які можна ацэньваць як рэалізацыю мэтавых адносін, а *высах у палку* – адносін меры і ступені. Значэнні прыблізнасці могуць ацэньвацца як колькасныя атрыбутыўныя значэнні (*пачакаць з хвіліну, атрымаў каля ста рублёў*). Як піша сам даследчык, "класіфікацыя функцыянальных значэнняў … не можа лічыцца вычарпальнай і бясспрэчнай" [14, с. 46]. Небясспрэчнасць пацвярджаецца і некаторымі фактамі, адзначанымі ў распрацаваным ім пазней слоўніку прыназоўнікаў беларускай мовы: напрыклад, у прыназоўніка *без* выдзяляюцца акалічнасныя адносіны [16, с. 14], у прыназоўніка *у* – адносіны стану, падабенства і ўмовы [16, с. 140–146], якія адсутнічаюць у прыведзенай ім класіфікацыі. Пры апісанні прыназоўніка *з* аўтар выдзяляе аб'ектныя адносіны і як раўнапраўныя з імі абмежавальныя адносіны, сумеснасці і ўласцівасці [16, с. 28–30].

У пазнейшых работах колькасць адносін зменшылася, аднак аднастайнасць не была дасягнута. Аўтары даведніка "Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум" прыводзяць прасторавыя, часовыя (так!), аб'ектныя адносіны, меры і ступені, прыналежнасці, мэты, прычыны, атрыбутыўнасці, спосабу дзеяння, кампаратыўныя [9, с. 231]. У вучэбна-метадычных выданнях для ВНУ адзначаюцца прасторавыя, часавыя, аб'ектныя, атрыбутыўныя значэнні, прычыны, мэты, спосабу дзеяння, меры і ступені[1] (гл., напрыклад [3, с. 8]).

У прапанаваных М. І. Канюшкевіч матэрыялах для слоўніка [5] значэнне ўказваецца згодна са спецыяльна прынятай у камунікатыўным сінтаксісе тэрміналогіяй. Даследчыцай прыводзяцца, напрыклад, наступныя значэнні: адверсатыў, бенефіцыянтыў, генератыў, дыменсіў, дырэктыў (сярод іх таксама дырэктыў-старт і дырэктыў-фініш), дыстрыбутыў, дэлібератыў, каўзатар і каўзатыў і інш. Гэта сістэма дазваляе дастаткова дакладна апісаць кожнае ўжыванне прыназоўніка, аднак яна немэтазгодная для тлумачальнага слоўніка, прызначанага ў тым ліку і звычайным карыстальнікам.

Адназначна пытанне колькасці і віду семантыка-сінтаксічных адносін не вырашаецца і з пазіцый сінтаксісу. Паколькі прыназоўнікі – словы, з дапамогай якіх выражаюцца адносіны паміж галоўным і залежным словамі словазлучэнняў з падпарадкавальнай сувяззю, ускосна яны аналізуюцца ў раздзеле "Словазлучэнне"[2]. Аналіз навуковай літаратуры засведчыў неаднастайнасць і тут. Часцей за ўсё выдзяляюць аб'ектныя, суб'ектныя, атрыбутыўныя, акалічнасныя і камплетыўныя адносіны[3] [8, с. 8–9], якія могуць ускладняцца дадатковымі адценнямі або сумяшчаць некалькі значэнняў як асноўных. Адметная пазіцыя прадстаў-

[1] Адметна, што ў школьнай практыцы таксама выдзяляюцца гэтыя віды адносін, акрамя адносін меры і ступені [2, с.170].

[2] Мы ўлічваем, што ў сінтаксісе апісваюцца прыназоўнікавыя і беспрыназоўнікавыя словазлучэнні.

[3] Т. Р. Рамза замест *камплетыўныя* ўжывае тэрмін *колькасныя* адносіны [10, с. 29].

лена М. Г. Булахавым, які выдзяляў 9 тыпаў семантыка-сінтаксічных адносін: аб'ектныя, суб'ектныя, азначальныя, азначальна-колькасныя, абмежавальныя, прасторавыя, часавыя, прычынныя, мэтавыя (цыт.па: [10, с. 27]).

Як бачым, у тэарэтычнай і навучальнай літаратуры прадстаўлены розныя пазіцыі і падыходы да пытання. Але лексікограф павінен забяспечыць аднастайнасць інтэрпрэтацыі моўнага матэрыялу ў слоўніку, таму мусіць прытрымлівацца нейкага аднаго погляду. Аналіз лексікаграфічных выданняў засведчыў і тут розныя падыходы да гэтага пытання.

У асобных слоўніках тлумачэнні прыназоўнікаў падаюцца без выдзялення семантыка-стылістычных адносін. Напрыклад, так былі выдадзены тлумачальны слоўнік пад рэдакцыяй Д. М. Ушакова, МАС, "Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы", дзе пазначаюцца толькі склонавыя формы назоўнікаў, з якімі ўжываюцца прыназоўнікі.

Неаднастайна падаваліся прыназоўнікі ў 17-томным тлумачальным слоўніку рускай мовы [11]. У першых тамах семантыка-сінтаксічныя адносіны дадаткова не выдзяляліся, яны з'яўляюцца ў 4 томе пры распрацоўцы прыназоўніка *за*. Але аднастайна падаваліся толькі акалічнасныя адносіны, а іншыя фармуляваліся больш-менш свабодна. Так, у прыназоўніка *за*, акрамя акалічнасных, выдзялялі "отношения заместительства, обмена", "отношения принадлежности, владения", "объект, на который направлено какое-либо действие, внимание и т.п." [11, т. 4, с. 201–208]. Ды і далейшае афармленне прыназоўнікаў у слоўніку было неаднастайным. Магчыма, у выніку такога разнабою і неаднастайнасці кваліфікацыі ў другім і трэцім выданнях слоўніка ад такога афармлення адмовіліся, там прыназоўнікі дадаткова не структуруюцца паводле адносін, якія выражаюцца ў спалучэннях.

Падыход да адлюстравання семантыка-сінтаксічных адносін быў рэалізаваны ў "Слоўніку ўкраінскай мовы" ў 11 тамах [12]. Лексікографы, акрамя акалічнасных (прасторавыя, часавыя, мэты і прычыны, акалічнасныя (ці спосабу дзеяння)) значэнняў, выдзяляюць аб'ектныя, азначальныя, колькасныя, часам сустракаюцца камбінаваныя: колькасна-азначальныя (*об*), азначальна-акалічнасныя (*в, по*), аб'ектна-акалічнасныя (*по*) адносіны. У перавыданні слоўніка быў захаваны такі падыход і выпраўлены недахопы.

Выдзяляюцца тыпы семантыка-сінтаксічных адносін і ў ТСБМ. Слоўнікавыя артыкулы прыназоўнікаў распрацоўвалі А. Я. Баханькоў (1–2 тт.), І. Гайдукевіч (2 т.), з другога тома да работы над слоўнікам падключаецца П. П. Шуба, які і ў далейшым займаўся распрацоўкай прыназоўнікаў. Таму прынцыпы іх падачы і спосабы апісання ў ТСБМ у асноўным супадаюць з прадстаўленымі ў яго аўтарскім слоўніку.

Захаванне ў новым тлумачальным слоўніку беларускай мовы структуравання значэнняў прыназоўніка паводле больш абагуленых, абстрактных значэнняў падаецца важным. Гэта не толькі захаванне лексікаграфічных традыцый. Такое афармленне дазваляе больш цэласна і поўна ўспрыняць семантыку адзінкі, асабліва калі значэнняў шмат, захаваць агляднасць слоўнікавага артыкула, даць аднастайнае апісанне ўсяго масіву прыназоўнікавых лексем. Але, на нашу думку, тыпы адносін павінны быць максімальна абстрагаваны і перадаваць найбольш абагуленую семантыку, а больш падрабязная інфармацыя будзе адлюстравана ў асобных значэннях прыназоўніка. З улікам таго, што новы тлумачальны слоўнік распрацоўваецца з прымяненнем праграмнага прадукту, усе віды адносін павінны быць загадзя вызначаны і прадстаўлены спісам.

Як ужо адзначалася вышэй, не выклікае пытанняў і розначытанняў у даследчыкаў выдзяленне акалічнасных адносін. Для захавання стройнасці і агляднасці слоўнікавых артыкулаў разнастайныя падвіды аб'ектных значэнняў немэтазгодна дадаткова актуалізаваць. Па-першае, розным прыназоўнікам уласцівы свае дадатковыя падзначэнні, па-другое, яны атрымаюць належнае падрабязнае апісанне ў лексіка-семантычных варыянтах пад лічбавай нумарацыяй. У межах азначальных адносін правамерна выдзеліць уласна азначальныя і колькасныя адносіны, паколькі прыназоўнікі ў межах першага і другога тыпаў звычайна маюць і рознае марфалагічнае напаўненне.

Такім чынам, намі выдзяляюцца прасторавыя, часавыя, прычынныя, адносіны спосабу дзеяння, меры і ступені, аб'ектныя, азначальныя і колькасныя адносіны.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская граматыка : у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства; рэд.: М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1. – 431 с.
2. *Валочка, Г. М.* Беларуская мова: вучэб. дапам. для 7 кл. / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. Ін-т адукацыі, 2020. – 238 с.
3. Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова» / аўт.-склад.: Г. М. Канцавая, В. М. Шавель, М. В. Швед. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2013. – 136 с.
4. Граматыка беларускай мовы : у 2 т. / рэд. : К. К. Атраховіч, М. Г. Булахаў, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1962. – Т. І: Марфалогія. – 680 с.
5. *Канюшкевіч, М. І.* Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання. Матэрыялы да слоўніка : у 3 ч. / М. І. Канюшкевіч. – Гродна : ГрДУ, 2008. – Ч. 1. – 492 с.
6. *Кущ, Н.* Прийменник: основні підходи вивчення, лексико-граматичні ознаки, перспективи дослідження / Н. Кущ // Лінгвістичні студії: зб. наук. праць. / укл. : А. Загнітко (наук. ред.) [та ін.]. – Донецьк : ДонНУ, 2006. – Вип. 14. – С. 90–95.
7. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / Ін-т мовазнаўства; пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 462 с.
8. *Маршэўская, В. В.* Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс: дапам. / В. В. Маршэўская. – Гродна : ГрДУ, 2008. – 159 с.
9. *Плотнікаў, Б. А.* Беларуская мова: Лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. – Мінск : Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – 672 с.
10. *Рамза, Т. Р.* Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапам. / Т. Р. Рамза; пад агул. рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : БДУ, 2003. – 202 с.
11. Словарь современного русского литературного языка: в 17 т. / АН СССР, Ин-т рус. языка ; редкол.: Ф. П. Филин [и др.]. – М.; Л. : Наука, 1948–1965. – 17 т.
12. Словник української мови : в 11 т. / АН УРСР, Ін-т мовознавства; за ред. І. К. Білодіда. – Київ : Наук. думка, 1970–1980. – 11 т.
13. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т., 6 кн. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства; пад агул. рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – 5 т., 6 кн.
14. *Шуба, П. П.* Лекцыі па беларускай марфалогіі / П. П. Шуба. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1975. – 80 с.
15. *Шуба, П. П.* Прыназоўнік у беларускай мове / П. П. Шуба. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. – 224 с.
16. *Шуба, П. П.* Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П. П. Шуба. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 168 с.

УДК 811.161.3: 81'376

Г. П. Латушка (Мінск)

СТРУКТУРНАЯ І СЕМАНТЫЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СІНТАКСІЧНА НЯЧЛЕННЫХ ВЫКАЗВАННЯЎ ЗГОДЫ І НЯЗГОДЫ

Пад *сінтаксічна нячленнымі выказваннямі* (СНВ) мы разумеем кароткія інтанацыйна аформленыя выказванні, што складаюцца з аднаго слова ці ўстойлівага спалучэння слоў і служаць для выражэння мадальных і экспрэсіўных адносін, напрыклад: *Так*, *Не*, *Яшчэ чаго*, *Ніколі*, *Абавязкова* і інш.

СНВ з'яўляецца самым сціслым і хуткім сродкам вербальнай рэакцыі асобы, які здольны непасрэдна ўплываць на адказ суразмоўцы і ўвогуле на ход раз-

мовы, а таксама выражаць стаўленне моўцы да суразмоўцы і да зместу паведамлення. Як адзначае Л. С. Кныш, «выкарыстанне спецыфічных сінтаксічных канструкцый – непазбежны выклік экстралінгвістычных фактараў, якія характэрны для гутарковай камунікацыі: спантаннасць, сітуацыйнасць, натуральнасць маўлення, неафіцыйны характар, абавязковая дыялагічнасць» [4, с. 9]. Даследчыца СНВ (у яе тэрміналогіі – *камунікатываў*) у рускай мове А. Ю. Віктарава заўважае, што такія выказванні характарызуюцца выражэннем хуткай спантаннай рэакцыі на выказванне, сітуацыю, з'яву [1, с. 7].

Вялікая колькасць СНВ будуецца на аснове выклічнікаў (як вытворных, так і невытворных), таму што гэта мінімальныя адзінкі з эмацыянальна-экспрэсіўнай функцыяй. Але ў якасці сінтаксічна нячленных выказванняў выступаюць і словы іншых часцін мовы і нават цэлыя словазлучэнні (*Божухна ты мой мілы*; *Аж смешна*; *Ашалець можна*). СНВ страчваюць першапачатковую семантыку – яны дэсемантызуюцца і пачынаюць выражаць эмоцыі. Напрыклад, СНВ *Блін!* не называе стравы, а *Божачкі!* не з'яўляецца зваротам да Бога: першы выраз у залежнасці ад сітуацыі можа выражаць раздражненне, здзіўленне, незадаволенасць і г. д., другі – спалох, радасць, здзіўленне і іншыя эмоцыі.

Прыведзеныя прыклады сведчаць пра вялікую структурную разнастайнасць СНВ згоды і нязгоды. Мы прапаноўваем прадставіць мноства такіх выказванняў у выглядзе палёў (поле для СНВ згоды і поле для СНВ нязгоды). У структурным плане ядро адзінак, якія ўтвараюць блокі згоды і нязгоды, складаюць нячленныя выказванні *Так* і *Не*, але некаторыя СНВ могуць быць развітымі, параўн.: *Не* і *Яшчэ не*. Зыходзячы з гэтага, варта казаць пра пэўную шкалу члянімасці СНВ: адны з іх з'яўляюцца цалкам нячленнымі (*Ага*; *Ну*), іншыя (напрыклад, *Ці не занадта вы многа хочаце?*) знаходзяцца на перыферыі члянімасці і ў межах структурнага падыходу лічацца члянімымі. Прычым у кожным канкрэтным выпадку назіраецца розная ступень страты зыходнага значэння, розны характар семантычнага зруху, ступень адасаблення той ці іншай формы ад агульнай парадыгмы [3, с. 84]. Працэс фразеалагізацыі такіх выразаў увесь час працягваецца, і адзінкі, якія раней кожны раз ствараліся нанова, паступова ператвараюцца ў рэакцыі, што ўзнаўляюцца цалкам. О. Есперсэн, напрыклад, прапаноўвае вылучаць на шкале члянімасці выказванняў тры кропкі: нячленныя выказванні (inarticulate), паўчленныя (semi-articulate), члянімыя (articulate) [2, с. 304]. Частковая члянімасць такіх выказванняў можа праяўляцца як у граматычным плане (частковым захаванні парадыгмы, параўн., напрыклад: *<Не,> <вы / ты> (па)чакай(це)*; *Ну(-у), ведаеце (-еш)*; *<Ты <што,>> з глузду з'ехала (з'ехаў)?*), так і ў лексічным (СНВ маюць абмежаваную колькасць варыянтаў, параўн.: *<Ну> вось і добра / слаўна / цудоўна / цудоўненька*). Лексічная члянімасць СНВ таксама дэтэрмінуе члянімасць у семантычным плане, у іх можа захоўвацца спалучальнасць з асобнымі словамі і іх камбінацыямі, яны могуць пашырацца залежнымі словаформамі, якія функцыянуюць як дадатковыя элементы, і ў гэтым выпадку захоўваецца марфолага-сінтаксічная нячленнасць выказванняў, спалучальнасць жа з іншымі словамі носіць аграматычны характар. Параўн.: *Яшчэ* ***не***; ***Каб ты праваліўся*** *са сваёй работай!*

Такім чынам, палі СНВ згоды і нязгоды можна акрэсліць наступным чынам. Ядро такога поля складаюць цалкам нячленныя выказванні, у складзе якіх няма ні галоўных, ні даданых членаў (*Так*, *Не*, *Безумоўна* і інш.); каляядзерную зону – адзінкі, у якіх этымалагічна можна вылучыць сінтаксічную структуру (*Яшчэ чаго* <ты захацеў>, *Ні ў якім разе* <я не пагаджуся>, *З задавальненнем* <усё

зраблю>); далей ідуць тыя выказванні, якія маюць граматычныя і лексічныя варыянты (*А ты думала (думаў)?..*; *<Добра / Ладна,> чорт з вамі / табой*; *Дзе / куды / якое <там>*); перыферыю складаюць выказванні, якія можна лічыць структурна члянімымі, але ўзнаўляльнасць і ўстойлівасць паступова пазбаўляюць іх члянімасці, ператвараючы ў гатовыя формулы (*А ты сумняваўся?*, *Я пас*, *Не каркай*). Некаторыя выказванні вызначаюцца большай устойлівасцю і набліжаюцца бліжэй да ядра, а ў некаторых гэтыя якасці праяўляюцца не так выразна, і адзінкі размяшчаюцца бліжэй да перыферыі, таму дакладна і бясспрэчна размясціць СНВ у полі нельга (падрабязней гл. [5, с. 65–69]). Вылучэнне ядра і перыферыі поля адбываецца з апорай на структурны і функцыянальны падыходы, спалучэнне якіх дазваляе прадставіць СНВ максімальна шырока і поўна.

У семантычным плане СНВ згоды і нязгоды таксама характарызуюцца вялікай разнастайнасцю. Згода і нязгода ўяўляюць сабой палі з цэнтрам, каляядзернай зонай і перыферыяй. Цэнтр складаюць «*чыстыя*» і найбольш адназначныя ды моцныя ў сваім праяўленні згода і нязгода, у каляядзернай зоне да іх дадаюцца іншыя значэнні (напрыклад, згода з сумненнем, нязгода з абурэннем і г.д.), на перыферыі магчыма поўная нейтралізацыя згоды і нязгоды (напрыклад, выражэнне няведання) або змена аднаго паняцця на супрацьлеглае (энантыясемія). Створаная намі класіфікацыя выразаў згоды і нязгоды ў славянскіх мовах мае дзяленне на поўную і няпоўную, у межах якіх вылучаюцца розныя семантычныя групы (падрабязней гл. [6]). Аднак пераход між поўнай і няпоўнай згодай/нязгодай мае выгляд кантынуума: прыблізна класы можна размясціць па прынцыпе адваротнай градацыі: ад тых, у якіх згода/нязгода праяўляюцца з найбольшай сілай, пасля – моцна, менш моцна, часткова, да тых, у якіх яны выяўляюцца мінімальна ці нават сціраюцца. Поўная згода падзяляецца на такія групы, як *безапеляцыйная згода*, *паспешлівая згода*, *згода-супакойванне*, *пацвярджэнне* (+ *самапацвярджэнне*, *падтакванне*, *згода-бажба*), *адабрэнне* (+ *пахвала*), *згода-пабуджэнне*, *згода-дамова*, *згода-галасаванне*, *паблажлівая згода* (+ *выкрыванне*), *згода-выклік*, *згода-бласлаўенне*, *ветлівая згода*, *згода-кантакт*, *энантыясемія*, *акцэнтуатар*; няпоўная згода прадстаўлена наступнымі групамі: *згода-сумненне*, *згода-дапушчэнне*, *вымушаная згода*, *згода-прымірэнне*, *частковая згода*, *частковае адабрэнне*, *згода-задуменнасць*, *згода-выклік*, *згода-пагроза*, *згода-незадаволенасць*, *згода-абыякавасць*, *няведанне*, *знешняя згода* (*нязгода пад выглядам згоды*). Поўная нязгода ўключае такія групы, як *паспешлівая нязгода*, *афіцыйная нязгода*, *адмова* (+ *самаадмова* і *нязгода-бажба*), *неадабрэнне*, *нязгода-шкадаванне*, *забарона*, *абурэнне*, *інвектыва* (*абраза*), *нязгода-колкасць*, *нязгода-незадаволенасць*, *нязгода-пагроза*, *нязгода-нявер'е*, *нязгода-здзіўленне*, *нязгода-крыўда*, *адыход ад тэмы* (*прымірэнне*), *ветлівая нязгода*, *нязгода-спалох*, *перарыванне камунікацыі*, *энантыясемія*, *акцэнтуатар*; няпоўная нязгода прадстаўлена наступнымі групамі: *нязгода-змякчэнне*, *нязгода-сумненне*, *частковая нязгода*, *ухіленне*, *згода пад выглядам нязгоды*. Сярод пералічаных класаў вылучаюцца прамежкавыя паняцці між згодай і нязгодай – *вымушаная згода*, *згода-абыякавасць*, *нязгода-сумненне*, *ухіленне* і г.д. (адны з іх на лініі «згода – нязгода» размяшчаюцца бліжэй да згоды, іншыя – да нязгоды); пасярэднія з'явы (напрыклад, *няведанне*), а таксама двухбаковыя, зменныя (напрыклад, *энантыясемія*, *нязгода пад выглядам згоды*, *згода пад выглядам нязгоды* і г.д.). Так жа сама, як і класы для выражэння няпоўнай згоды, згаданыя групы адзінак уяўляюць сабой пераходны

этап, сярэдзіну між згодай і нязгодай, утвараючы градацыю: *поўная згода – няпоўная згода – няпоўная нязгода – поўная нязгода*, прычым у кожным з гэтых блокаў групы і самі адзінкі таксама можна размясціць па прынцыпе градацыі.

У табліцы прадстаўлены класы згоды і нязгоды, размешчаныя па прынцыпе адваротнай градацыі: ад тых, у якіх згода і нязгода праяўляюцца найбольш моцна, да тых, у якіх яны нейтралізуюцца.

СНВ згоды і нязгоды

Групы згоды	Групы нязгоды
Поўная згода / нязгода	
Безапеляцыйная згода[1] (*Ёсць*[2])	Афіцыйная нязгода (*Ніяк не*)
Паспешлівая згода (*Ага-ага*)	Паспешлівая нязгода (*Не-не-не*)
Згода-супакойванне (*Добра-добра*)	Адыход ад тэмы (прымірэнне) (*Ну ладна, ладна*)
Пацвярджэнне (*Анягож*)	Адмова (*Ніколі*)
Самапацвярджэнне (*Ага*)	Самаадмова (*Дык дзе там*)
Падтакванне (*Во-во*)	–
Згода-бажба (*Каб я быў жыў*)	Нязгода-бажба (*Каб я з гэтага месца не ўстаў*)
Адабрэнне (*Добра*)	Неадабрэнне (*Жудасць*)
Пахвала (*Малайчына*)	Інвектыва (абраза) (*Блазен*)
Згода-пабуджэнне (*Давай*)	Забарона (*Ні-ні*)
Згода-дамова (*Па руках*)	–
Згода-галасаванне (*Абераў*)	–
Паблажлівая згода (*Вось бачыш*)	–
Выкрыванне (*Ага*)	–
Згода-выклік (*А чаму б і не*)	–
Згода-бласлаўенне (*Амін*)	**Нязгода-пагроза**[3] (*Толькі паспрабуй*)
Ветлівая згода (*Калі ласка*)	Ветлівая нязгода (*Пардон*)
Згода-кантакт (*Ясна*)	Перарыванне камунікацыі (*Досыць*)
Энантыясемія (*Не*)	Энантыясемія (*Ну-ну*)
Акцэнтуатар (*Не*)	Акцэнтуатар (*Не-е*)
–	Нязгода-шкадаванне (*Шкада*)
–	Абурэнне (*Пабойцеся Бога*)
–	Нязгода-колкасць (*Ды ну?*)
–	**Нязгода-незадаволенасць (***Куды там*)
–	Нязгода-нявер'е (*Лухта*)
–	Нязгода-здзіўленне (*Жартуеш?*)
–	Нязгода-крыўда (*Падумаеш*)
–	Нязгода-спалох (*Барані Божа!*)

[1] Назвы груп згоды і нязгоды, размешчаныя ў адным радку, суадносяцца між сабой як цалкам ці амаль супрацьлеглыя (*адабрэнне – неадабрэнне*, *ветлівая згода – ветлівая нязгода* і г. д.) у межах аднаго блока (*поўная згода* і *поўная нязгода* ці *няпоўная згода* і *няпоўная нязгода*).

[2] Усе групы згоды і нязгоды ілюструюцца прыкладамі СНВ. Аднесенасць нячленных выказванняў да той ці іншай групы тлумачыцца ў тым ліку кантэкстам (гл. [6]).

[3] Групы, вылучаныя паўтлустым шрыфтам, суадносяцца між сабой як супрацьлеглыя ў межах розных блокаў (*няпоўная згода – поўная нязгода*).

Заканчэнне табліцы

Няпоўная згода/нязгода	
Згода-сумненне (*Хіба што*)	Нязгода-сумненне (*Ды не*)
Згода-дапушчэнне (*Бадай што*)	–
Вымушаная згода (*Ну, хай*)	–
Згода-прымірэнне (*Ладна*)	–
Частковая згода (*Амаль што*)	Частковая нязгода (*Не зусім*)
Частковае адабрэнне (*Гэта ўжо лепш*)	–
Згода-задуменнасць (*Ага*)	–
Згода-выклік (*Эх, была не была*)	–
Згода-пагроза (*Ну, глядзі*)	–
Згода-незадаволенасць (*Дзіўнае пытанне*)	–
Згода-абыякавасць (*Адзін чорт*)	–
Няведанне (*Ліха яго ведае*)	–
Знешняя згода (нязгода пад выглядам згоды) (*Яно-то так. Толькі…*)	Знешняя нязгода (згода пад выглядам нязгоды) (*Не, але…*)
–	Нязгода-змякчэнне (*Не, чаму ж*)
–	Ухіленне (*Я б не сказаў*)

Такім, чынам, як у структурным, такі і ў сэнсавым плане СНВ згоды і нязгоды ў славянскіх мовах маюць структуру поля. У структурным плане ў полі такіх выказванняў можна вылучыць чатыры апорныя кропкі: ядро, якое прадстаўлена цалкам нячленнымі выказваннямі; каляядзерную зону, што складаецца з адзінак, у якіх этымалагічна можна вылучыць сінтаксічную структуру; зону, дзе размяшчаюцца выказванні, якія характарызуюцца наяўнасцю граматычнай і лексічнай члянімасці; перыферыю, на якой размяшчаюцца выказванні, што можна лічыць структурна члянімымі. Між названымі зонамі адбываецца размяшчэнне выказванняў у выглядзе кантынуума, бо ў кожным канкрэтным выпадку назіраецца розная ступень члянімасці, працэс пераходу такіх выразаў у разрад СНВ увесь час працягваецца. У семантычным плане згода і нязгода таксама ўяўляюць сабой палі. У цэнтры размяшчаюцца «чыстыя» і найбольш адназначныя ды моцныя ў сваім праяўленні згода і нязгода, далей ад ядра да гэтых паняццяў дадаюцца іншыя (напрыклад, сумненне, абыякавасць, крыўда, змякчэнне і г. д.), на перыферыі магчыма поўная нейтралізацыя паняццяў згоды і нязгоды (напрыклад, выражэнне няведання) або змена аднаго паняцця на супрацьлеглае (энантыясемія).

ЛІТАРАТУРА

1. *Викторова, Е. Ю.* Коммуникативы в разговорной речи: на материале русского и английского языков : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.19 / Е. Ю. Викторова ; Сарат. гос. ун-т им. Н. Г. Чернышевского. – Саратов, 1999. – 17 с.
2. *Есперсен, О.* Философия грамматики / О. Есперсен. – М. : Изд-во иностр. лит., 1958. – 400 с.
3. *Какорина, Е. В.* Проблемы фиксации и лексикографического описания коммуникативов: на материале работы над «Толковым словарем русской разговорной речи» (ТСРР) / Е. В. Какорина // Труды Ин-та рус. яз. им. В. В. Виноградова / Акад. наук, Ин-т рус. яз. –М., 2019. – Вып. 20: Взаимодействие лексики и грамматики. – С. 76–100.
4. *Кныш, Л. С.* Гутарковая камунікацыя ў мастацкай прозе Максіма Гарэцкага: спосабы стылізацыі : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / Л. С. Кныш ; Акад. навук, Ін-т мовазнаўства. – Мінск, 2006. – 20 с.
5. *Латушка, Г. П.* Сінтаксічна нячленныя выказванні са значэннем згоды і нязгоды ў славянскіх мовах : дыс. … канд. філал. навук : 10.02.19 : у 2 т. / Г. П. Латушка. – Мінск, 2020. – Т. 1. – 174 с.
6. *Латушка, Г.П.* Сінтаксічна нячленныя выказванні са значэннем згоды і нязгоды ў славянскіх мовах : дыс. … канд. філал. навук : 10.02.19 : у 2 т. / Г. П. Латушка. – Мінск, 2020. – Т. 2 : Дадатак. – 246 с.

УДК 811.134.2’42(045)

Н. В. Лещенко (Минск)

ФОРМЫ ОБРАЩЕНИЯ В ОБИХОДНО-РАЗГОВОРНОМ ДИСКУРСЕ НА ИСПАНСКОМ, БЕЛОРУССКОМ И РУССКОМ ЯЗЫКАХ

Функциональное описание обращения, как непосредственной составляющей межличностного общения, вписывается в актуальную проблематику исследований, посвященных изучению успешного взаимодействия коммуникантов. Сопоставительный анализ структурно-семантических форм адресации с учетом особенностей их коммуникативно-прагматической реализации в обиходном дискурсе позволяет установить национально-культурные особенности речевого поведения у представителей каждого этноса.

В русле речеактового подхода под обращением понимается «языковое средство, призванное обслуживать сферу человеческого общения и устанавливать связь между высказываниями участников общения, несущее значительную коммуникативную нагрузку и выполняющее ряд речевых функций в процессе непосредственного речевого контакта» [3]. Обращение всегда целенаправленно и соотнесено с определенным контекстом. Реализуя себя как элемент дискурса, обращение напрямую связано с соответствующей ему системой координат: участием конкретных личностей (с определенными интересами, целями, намерениями), с темой, регистром речи, конкретным местом и временем. Тем самым обращение становится способным к трансляции не только фактуальной информации, но и модально-экспрессивной, соотносящейся с иллокутивной силой всего высказывания. Обращение редко реализуется самостоятельно, чаще всего оно входит в последовательность речевых актов, подчиняя свою иллокутивную силу иллокутивной силе акта сообщения [4].

В обиходно-разговорном дискурсе в ситуациях аффективного общения с положительной оценочностью основными формами обращений являются: 1) имена собственные (*Коленька*, *Дашуня*, *Кацярынка*, *Fran*, *Juanca*, *Paco*); 2) термины родства (*матуля*, *дачушка, зяцюхна*, *сыночек*, *папулечка, мамочка*, *papi*, *mamaíta*, *mamá*, *papá*); 3) метафоричные оценочные номинации (*даражэнькі, золатка, прыгажуня*, *мая ясачка*; *моё сокровище*, *лапушка, котик, солнышко; cariño*, *tesoro*, *corazón*, *guapa*, *reina*, *princesa*, *preciosa*, *prenda mía*, *cielo/cielito*).

В настоящей публикации основное внимание будет сконцентрировано на функционировании имен собственных в указанном дискурсивном поле русского, белорусского и испанского языков. В русском и белорусском языках наблюдается относительно схожая картина: ласковая форма обращения говорящего традиционно выражается посредством уменьшительно-ласкательных суффиксов. В качестве производной основы могут использоваться полные, усеченные (краткие) и гипокористические (ласковые) формы имен собственных. В белорусском языке «Слоўнік асабовых уласных імён» [6] фиксирует, например, такие варианты: *Надзюша*, *Кацярынка*, *Кацярыначка*, *Анатольчык*, *Слаўка*, *Гануля*, *Натуся*, *Ленанька*, *Аляксейка*, *Янка*, *Яська*. Ср. примеры из русского языка: *Дарьюшка*, *Дашенька*, *Дашуля*, *Сашенька*, *Леночка*, *Манюня*. И русская и белорусская антропонимические системы характеризуются наличием большого количества формообразующих средств, разнообразием форм субъективной оценки и обилием эмоциональных оттенков в данных формах. Уменьшительные суффиксы, сохраняя свое значение, превращаются в эмоционально-оценочные суффиксы субъективной оценки.

Так, например, суффикс *-енька-* во многих формах русских имен играет ту же структурную и функциональную роль, что и суффикс *-очка-*: формы *Мишенька, Коленька* / *Мишечка, Колечка* имеют одинаковое значение, относят к одному прагматическому уровню, разница может проявляться в частотности употребления. Уменьшительные имена, образованные при помощи суффикса *-к-*, обретают оттенок пренебрежения, презрения, умаления достоинства именуемого (*Машка, Наташка, Гришка* и т.п.). Исторически это напрямую было связано с существовавшей традицией использовать полуимена (образованные при помощи суффикса *-к-*) для уничижения при обращении лица из привилегированного сословия к более низкому классу. Данное наблюдение хорошо иллюстрирует пример из романа Л. Н. Толстого «Воскресенье», в котором главная героиня Катюша Маслова описывается следующим образом: *Старых барышень было две <…> Софья Ивановна наряжала, учила девочку читать и хотела сделать из нее воспитанницу. Марья Ивановна говорила, что из девочки надо сделать работницу, хорошую горничную, и потому была требовательна, наказывала и даже бивала девочку, когда бывала не в духе. Так между двух влияний из девочки, когда она выросла, вышла полугорничная, полувоспитанница. Ее и звали так средним именем – не* ***Катька*** *и не* ***Катенька****, а* ***Катюша*** [5].

Личное имя, как вместилище разного рода информации – исторической, гендерной, социальной, национоально-культурной, чутко реагирует на динамику развития социума. В социальном контексте языкового коллектива наиболее употребительные формы обращения теряют свою экспрессию, а с ней и стилистическую окраску, и начинают использоваться как нейтральные. Согласно исследованию В. В. Звягинцевой в современном русском языке имена собственные на *-ка* (*Танька, Вовка, Галка*) в функции обращения могут передавать как пейоративную, так и мелиоративную оценку, особенно в детской и подростковой среде [3]. Особенность прагматического значения форм *Васька, Васенька* состоит в том, что, употребляясь по отношению к детям, они указывают на младший возраст (или недостаточную взрослость): *Гришенька* – совсем маленький, *Гришка* – ребенок уже подрос.

Описывая деривацию русских имен, А. Вежбицкая отмечает, что в русской культурной традиции исключительно важную роль играет «степень интимности личных отношений» [1, с. 49–50]. Четкая дифференциация производных имен собственных, включающих сокращенные, ласкательные, уменьшительные и фамильярные формы, возможна только в контексте.

В белорусском языке в бытовой коммуникации, как уже было отмечено выше, употребляются разнообразные уменьшительно-ласкательные (*Цімоша, Данік, Паўлуша, Аркаша, Санік*) и усеченные формы собственных имен (*Алесь, Віця, Федзя, Сцёпа*). Разговорно-бытовые формы могут образовываться при помощи разнообразных суффиксов: *-ка* (*-ко*) – *Алежка, Барыска, Ігнатка*(о), *Мыколайко*; *-ік* (*-ык*) – *Антонік, Петрык, Борык*; *-ак, -ок* (*-ёк*) – *Барысок, Якубок, Ромак, Ванёк, Віцёк*; *-чык – Навумчык, Мішчык*; *-ша, -аша*(*-оша*), *-уша* (*-юша*), *-еш*(*-ёш*), *-яш – Паўлуша, Харытоша, Геша, Таляш, Мыцёш* и др.

Особенностью антропонимической системы белорусского языка является наличие диалектных форм обращений: *Дзёмка, Ваныш*, т.е. можно постулировать территориальную закрепленность не только самих антропонимов, но именно их уменьшительно-ласкательных форм [7]. Каждое имя приобретает соответствующую окраску в той среде, где употребляется.

В обозначенной тональности дискурсивного употребления имен собственных испанский язык реализует разные структурные варианты. Прежде всего, это разнообразные гипокористические формы имен собственных, образованных от супплетивных основ (*Paco* < *Francisco*), а также посредством усечения начальной (*Tina* < *Ernestina*, *Toni* < *Antonio*) либо финальной части (*Isa* < *Isabel*, *Cata* < *Catalina*) полной формы имени собственного. В некоторых случаях возможно одновременное усечение начальной и финальной части антропонима, например: *Gus* < *Agustín*.

При упрощении финальной части имени собственного зачастую добавляется гипокористический суффикс *-i*: *Susana* > *Susi*, *Pilar* > *Pili*, *Beatriz* > *Beti*, *Patricia* > *Pati*, *Victoria* > *Viki*. Исследователи фоносимволизма постулируют наличие у звука [i] положительно окрашенных коннотативных значений, проявляющихся в разных языках, которые связываются с понятиями «объектов малого размера», «маленький», «ребенок», «нежность», т.е. с детоцентрической коммуникацией, которая изначально является сферой функционирования диминутивов [9]. Эти значения коррелируют со значением, которое реализует финаль *-i*, функционируя в качестве уменьшительно-ласкательного суффикса не только имен собственных, но и сочетаясь с терминами родства (*mami*, *papi*), метафорическими номинациями (*gordí*), в нежном и ласковом общении взрослых с маленькими детьми, а также в качестве экспрессивного диминутива при доброжелательно-ласкательной тональности речи (*churri*, *chiqui*, *bobi*[*s*], *cari*, *cuqui*, *guapi*[*s*]).

Во многих индоевропейских языках этот суффикс является продуктивным в обозначенном дискурсивном поле. Например, в английском: *daddy*, *mammy*, *granny*, *Charlie*, *Tommy*, *Billy*, *Betsy*. В испанском языке при заимствовании английских имен собственных сохраняется форма соответствующего гипокористика: *Micky/Miki*, *Dani*, *Juli*. Ср. примеры из немецкого языка: *Heini*, *Kathi*, *Olli*, *Pauli*; французского языка: *bibi*, *mimi*, *Cathy*, *Kiki*, *Titi*, *Gaby*, *Lily*, *Suzy/Zizi* (подробнее об этом см. [9]).

Примечательно, что в целом для фонетической системы испанского языка не характерны существительные, заканчивающиеся на *-i*, их крайне мало, и в основном это заимствования: *agutí*, *carmesí*, *jabalí*. Но в доброжелательно-ласковой тональности речи обозначенных ситуаций общения он используется достаточно уверенно, главным образом в сфере антропонимики: «la terminación en -i no se da en nombre patrimonial alguno en castellano (ni siquiera en los nombres propios), pero es frecuentísima en hipocorísticos» [9]. Таким образом, неспецифичный суффикс имени существительного как части речи закрепляется в узкой сфере коммуникации и употребляется с определенным прагматическим значением. В славянских языках можно провести схожую типологическую параллель: в сфере аффективного именования с оттенком мелиоративности закрепились формы с финалью на *-ша*: *Тимоша*, *Антоша*, *Витюша*, *Саша*, *Гриша*, *Паша*, *Миша*. Ср. возможные варианты с суффиксом *-к-*: *Тимошка*, *Антошка*, *Витюшка*, *Сашка* и др. Исследуя системно-грамматические функции диминутивов в речи ребенка, В. Д. Воейкова указывает, что диминутивы позволяют значительно упростить систему типов склонения в русском языке и унифицировать финаль непродуктивных слов разных типов склонения, т.е упростить процесс усвоения родного языка [2].

Палатализация начальной, финальной и серединной частей испанских имен собственных является еще одним продуктивным средством фонетической эксп-

рессии в испанском языке: *Chelo < Consuelo, Nacho < Ignacio, Chus < Jesús, Merche < Mercedes, Manacho < Manuel Ignacio, Chema < José María*. Вероятно, процессу палатализации щелевых звуков (альвеолярного [s] и интердентального [θ]) способствуют гласные переднего ряда [i, e], при этом звуки [s, θ] трансформируются в палатальный [ĉ]. Указанное явление хорошо иллюстрируют следующие примеры: [se], [θe] > [ĉ]: *Vicente > Chente, Mercedes > Merche, Marcela > Chela, Sergio> Chejo*; [si], [θi] > [ĉ]: *Silvio > Chivis, Rocío > Chío, Alicia > Licha*; *Ignacio > Nacho* [8].

Уменьшительно-ласкательная форма обращения в сочетании с соответствующей мелодикой речевого акта передает прагматическое значение положительного отношения к адресату, в отличие от полной формы обращения, иллокуция которой может быть связана с указанием на желание проконтролировать, сделать замечание и пр. (основная функция – вокативная, второстепенная – оценочно-характеризующая). Начальная позиция обращения в высказывании реализует вокативную функцию, служит для привлечения внимания, а также задает смысловую перспективу. В. В. Звягинцева выделяет в этом случае функцию инференциального прогнозирования высказывания, которая позволяет адресанту программировать определенный перлокутивный эффект, а при ее правильном декодировании адресатом выстраивать соответствующую стратегию речевого поведения [3]. Обращение в финальной позиции усиливает иллокутивную составляющую высказывания (вопрос, ирония, просьба и др.). Актуализируясь в речи, обращение несет в себе предикативность и согласуется с иллокутивной силой, соответствующей коммуникативному акту. Данное наблюдение относится в равной степени к трем сопоставляемым языкам.

Особенности образования и употребления гипокористик представляют собой довольно сложную тему при кажущейся простоте и прозрачности. Она требует более тщательного исследования языковых фактов, причем должны учитываться многие факторы: собственно языковые, диахронические, социально-статусные, поскольку даже такая первичная систематизация сходств и различий позволяет обозначить динамику синхронии и обнаружить определенные тенденции развития данного феномена.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Вежбицкая, А.* Язык. Культура. Познание / А. Вебицкая; пер. с англ. отв. ред. М. А. Кронгауз; вступит. ст. Е. В. Падучевой. – М.: Рус. словари, 1996. – 416 с.

2. *Воейкова, М. Д.* Системно-грамматические функции диминутивов в усвоении русского языка ребенком [Электронный ресурс] / М. Д. Воейкова. – СПб., 2004. – Режим доступа : http://iling. spb.ru/grammatikon/child/vo.html. – Дата доступа : 15.01.2021.

3. *Звягинцева, В. В.* Обращение в семейном дискурсе : автореф. дис. … канд. филол. наук / В. В. Звягинцева. – Курск : Курск. гос. ун-т, 2011. – 21 с.

4. *Рыжова, Л. П.* Обращение как компонент коммуникативного акта : автореф. дис. ... канд. филол. наук / Л. П. Рыжова. – М., 1982. – 15 с.

5. *Толстой, Л. Н.* Воскресенье [Электронный ресурс] / Л. Н. Толстой. – Режим доступа : https://ilibrary.ru/text/1462/p.2/index.html. – Дата доступа : 15.01.2021.

6. *Усціновіч, А. К.* Слоўнік асабовых уласных імён / А. К. Усціновіч; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2011. – 240 с.

7. *Шумская, І. А.* Размоўна-бытавыя формы асабовых імён Брэстчыны / І. А. Шумская [Электронны рэсурс] // Беларуская анамастыка / пад рэд. М. В. Бірылы, В. П. Лемцюговай. – Мінск, 1985. – Рэжым доступу : http://lingvarium.org/maisak/data/Shumskaya_1985+toc.pdf. – Дата доступу : 15.01.2021.

8. *Espinosa Meneses, M.* De Alfonso a Poncho y de Esperanza a Lancha: los Hipocorísticos [Recurso electrónico] / M. Espinosa Meneses // Primera revista electrónica especializada en comunicación. – 2001. – № 21. – Modo de acceso : http://www.razonypalabra.org.mx/anteriores/n21/21_mespinosa.html. – Fecha de acceso : 16.01.2021.

9. *Monzó Gallo, C.* Hipocorísticos en /-i/: iconismo fonético de la afectividad / C. Monzó Gallo // Revista española de lingüística. – Madrid : SeL – 2017. – № 47/2. – P. 7–28.

УДК 811.161.3'0'373

С. М. Макітрук (Мінск)

НАМІНАЦЫІ ПАСЕСІЎНАГА ТЫПУ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ДЗЕЛАВОЙ ПІСЬМЕННАСЦІ
(на матэрыяле “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы”)

У мове старабеларускіх дзелавых помнікаў знайшлі адлюстраванне шматлікія найменні падаткаў, пошлін, плацяжоў і штрафаў. Так, намі на матэрыяле “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы”, яго картатэкі і асобных кніг Літоўскай метрыкі былі сабраны 518 аднаслоўных і 258 неаднаслоўных такіх назваў выплат, якія з’яўляюцца цікавымі для вывучэння ў анамасіялагічным аспекце, і 44 адзінкі асоб-зборшчыкаў (41 аднаслоўнае найменне і 3 неаднаслоўных): *бочечное* ‘пошліна з тавараў, аб’ём якіх вымяраўся бочкамі’, *закосное* ‘грашовы падатак за кашэнне сена’, *помостное* ‘маставая павіннасць’, *поденное* ‘плата за адзін дзень работы’, *вина панская* ‘штраф з пана за няяўку ў суд’[1] і г.д.

Структура вытворных найменняў уключае ў сябе анамасіялагічную прымету і анамасіялагічны базіс. “Анамасіялагічны базіс – гэта зыходнае паняцце анамасіялогіі, якое дазваляе аднесці данае слова да класа слоў з тоесным граматычным значэннем (тое, што ляжыць у аснове абазначэння). У анамасіялагічнай прымеце выражаецца паняцце аб асноўных адзнаках, якасцях названай рэальнасці, а таксама адносіны паміж імі, якія ўсталёўваюцца ў працэсе назвы (тое, што ўдакладняе асноўны змест паняцця, якое абазначаецца, абмяжоўваючы яго або канкрэтызуючы)” [4, с. 34]. У манаграфіі “Тыпы прадметных найменняў у мове стараруской дзелавой пісьменнасці” Т. Р. Трафімовіч вылучае пяць анамасіялагічных прыкмет (агентыўная, аб’ектная, нумаральна-тэмпаральная, пасесіўная, лакатыўная) і на іх аснове – пяць тыпаў вытворных найменняў (агентыўны, аб’ектны, нумаральна-тэмпаральны, пасесіўны і лакатыўны) [3].

Катэгорыя пасесіўнасці адносіцца да адной з найбольш старажытных моўных катэгорый. У яе аснове ляжыць паняцце пасесіўнасці, пад якім разумеюць пэўныя адносіны паміж дзвюма асноўнымі субкатэгорыямі – прыналежнасць і валоданне, калі паміж імі складаюцца адносіны пэўнага характару. “Катэгорыя пасесіўнасці – гэта полісістэмнае моўнае адзінства, што фарміруецца разнастайнымі моўнымі сродкамі, сярод якіх – прыналежныя прыметнікі, прыналежныя займеннікі, родны і давальны склоны назоўнікаў, дзеясловы тыпу *даць, мець, належаць*” [2, с. 51]: *wни* ***мнѣ*** *не давали wсмъ годовъ того поклони, и теперь ми дали wсмьдесять грошей* (КСД, 183, 1514); *тотъ отчичъ Войтко ... самъ тую землю держати и пахати и податки съ нее* ***до скарбу господарьского*** *платити, пополняти зможетъ* (АВК, XVII, 300, 1541); *За покоморное* ***отъ пана Митни Шевца*** *дошло до рукъ нашыхъ* (ИЮМ, I, 126, 1681); *вси станове ... поступили, для обороны тежъ земской ... платъ посполитый земскій, серебщизну* ***съ людей*** *своихъ* ***тяглыхъ****, отъ кождоѣ сохи оромоѣ попяти грошей* (АЗР, III, 43, 1551) і г.д.

У дадзеным артыкуле робіцца спроба разгляду анамасіялагічнай структуры старабеларускіх найменняў падаткаў, пошлін, плацяжоў і штрафаў, якія маюць значэнне пасесіўнасці.

Абагуленая анамасіялагічная прымета пасесіўнага тыпу паказвае на прыналежнасць, канкрэтная падкрэслівае, каму належыць аб’ект (асобе / групе асоб /

[1] Прыклады падаюцца па: Гістарычны слоўнік беларускай мовы.– Мінск: Беларус. навука, 1982–2017. – Вып. 1–37 [1].

калектыву), а прыватная называе менавіта таго, каму належыць аб'ект [3, с. 111–112]: *ордынщина, татарщина, тивунщизна (тивунщина, цивунщина).* Да вытворных прадметных найменняў такога тыпу адносяцца тыя, у якіх прысутнічае пасесіўная прымета па прыналежнасці або валоданні.

У старабеларускіх дзелавых помніках назвы пасесіўнага тыпу ўжываліся з суфіксамі ***-щизн-***: *тивунщизна*; ***-щин-***: *ордынщина, татарщина, тивунщина, цивунщина*. Так, у найменні *татарщина* абагуленая анамасіялагічная прымета паказвае на прыналежнасць, канкрэтная анамасіялагічная прымета называе, на карысць каго збіралі падаткі, а прыватная анамасіялагічная прымета іх называе. Такім чынам, *татарщина* – гэта падатак, які плацілі татарам.

Напрыклад, *ордынщина* 'падатак на карысць Арды': *они зъдавна з волостью нашою Свислоцкою городы рубливали и* ***ордынъщину*** *давали* (КЗ, 727, 1499); *татарщина* 'падатак, які плацілі татарам': *отпустили есмо* ***татарщину*** *грошей 15* (РПП, 330, 1492); *тивунщизна (тивунщина, цивунщина)* 'падатак у карысць цівуна': ***цивунщины*** *уставилъ панъ Ѳетко писарь на мѣсто и волость осемдесятъ копъ грошей широкихъ* (АСД, III, 10, 1548); *тивунщины съ тое части на выѣждчого даютъ съ того жъ села Гнѣздиловского меду пудъ и полъосма гроша литовскихъ* (АВК, XVI, 11, 1555). З разгледжаных прыкладаў бачна, што для ўтварэння аднаслоўных назваў падаткаў у помніках дзелавой пісьменнасці старабеларускай мовы быў распаўсюджаны суфіксальны спосаб.

У старабеларускай мове для абазначэння падаткаў, плацяжоў, пошлін, штрафаў ужываліся і неаднаслоўныя найменні, якія можна аднесці да пасесіўнага тыпу. У такіх намінацыях часцей прыналежнасць выражалася прыметнікамі, якія паказвалі, на карысць каго трэба было плаціць або з каго браліся грошы: *вина господарская* 'штраф на карысць гаспадара', *вина духовная* 'штраф за парушэнне царкоўна-рэлігійных норм', *вина панская* 'штраф з пана за няяўку ў суд', *вина правная* 'штраф за знявагу суда', *вина статутовая* 'штраф, вызначаны статутам', *вина судовая* 'штраф на карысць суда', *вина урядовая* 'штраф на карысць урада'; *дань церковная* 'від пабору на карысць царквы', *куница змирская (смирская)* 'від пабору ў карысць князя', *куница замонастырская, соборная (зборная)* 'віды пабору духавенства на карысць епіскапа', *мыто господарское* 'пошліна на карысць гаспадара', *податокъ господарский* і *подачка господарская* 'від спецыяльнага пабору'. Разгледзім некаторыя з іх: *за* ***вину господарскую,*** *которую они до скарбу господарского заплатили… увезаломъ и подаломъ въ року теперешнемъ* (КСД, 28, 1586); *поплатившы* ***вины урядовые*** *и стороне шкоды, предъ се тая угода наша въ кождого вряду при зуполной моцы вечными часы зостати маетъ* (ИЮМ, VIII, 296, 1610); *Жаловали намъ вси священницы мѣста Виленского, штожъ дей небожчикъ Макарей, митрополитъ Кіевскій и всея Руси, ввелъ былъ имъ многіе новины, почалъ былъ на нихъ* ***соборные куницы*** *непомѣрно брати* (АЗР, I, 174, 1498).

Выкарыстоўваліся ў старабеларускіх дзелавых помніках і некаторыя сінанімічныя бівербальныя найменні: *податокъ господарский* і *подачка господарская*: *волно ему … того пляцу вживати и* ***податки господарские*** *полнити* (ИЮМ, XXX, 8, 1577) і *Маетъ онъ самъ … с тое моее половины пляцу и з двора ужывати и* ***подачки гдрьские*** *и меские полнити* (АВК, XXXIX, 607, 1579). Але такія канструкцыі былі вельмі рэдкія.

У старабеларускіх дзелавых помніках не было зафіксавана назваў асоб-зборшчыкаў падаткаў, пошлін і плацяжоў, якіх можна было аднесці да гэтага тыпу.

Назвы найменняў пасесіўнага тыпу суадносяцца з назвай анамасіялагічнай прыметы, якая з'яўляецца матывавальнай для вытворных абазначэння падаткаў, пошлін, плацяжоў і штрафаў. Але паняцце прыналежнасці не адносілася да прадуктыўных пры матывацыі вытворных найменняў: у дзелавых помніках старабеларускай мовы зафіксаваны 5 аднаслоўных назваў (2%) і 16 неаднаслоўных назваў (2%) ад усёй колькасці сабраных найменняў. Таксама трэба адзначыць, што намінацыі гэтага тыпу не мелі паралельнага ўжывання аднаслоўных і неаднаслоўных найменняў.

Прааналізаваны матэрыял паказаў:

- сярод сабраных намінацый ужываюцца назвы, утвораныя шляхам суфіксацыі;
- у старабеларускіх дзелавых помніках неаднаслоўныя найменні разам з аднаслоўнымі адзінкамі ўтваралі сістэму, якая забяспечвала патрабаванні тагачаснай мовы для абазначэння прыналежнасці падаткаў, пошлін, плацяжоў і штрафаў.

У сучаснай беларускай літаратурнай мове пэўная частка разгледжаных найменняў падаткаў, пошлін і плацяжоў адышла да пасіўнага слоўніка ў сувязі са знікненнем тых рэалій і паняццяў, што ляжалі ў аснове значэнняў гэтых слоў: *ордынщина, татарщина, тивунщизна, вина панская, куница змирская, мыто господарское, податокъ господарский* і г.д. Зараз такія намінацыі ў якасці гістарызмаў прыводзяцца ў слоўніках і выкарыстоўваюцца ў навуковай і мастацкай літаратуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы / пад рэд. А. М. Булыкі, А. І. Жураўскага. – Мінск : Беларус. навука, 1982–2017. – Вып. 1 – 37.
2. Категория посессивности в славянских и балканских языках / отв. ред. В. В. Иванов. – М. : Наука, 1989. – 262 с.
3. *Трофимович, Т. Г.* Типы предметных наименований в языке старорусской деловой письменности / Т. Г. Трофимович. – Минск : БГПУ, 2003. – 223 с.
4. Языковая номинация : Виды наименований : сб. ст. / Ин-т языкознания АН СССР; под ред. Б. А. Серебренникова, А. А. Уфимцевой. – М. : Наука, 1977. – 361 с.

СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

АВК – Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею, т. I–XXXIX. Вильна, 1865–1915; АЗР – Акты, относящиеся к истории Западной России, т. I–V, СПб, 1846–1853; АСД – Археографический сборник документов, т. I–XI, Вильна, 1867–1890; ИЮМ – Историко-юридические материалы, т. I–XXXII, Витебск, 1871–1906; КЗ – Литовская метрика. Книги записей. «Русская историческая библиотека», т. XXVII. СПб, 1910; КСД – Литовская метрика. Книга судных дел. «Русская историческая библиотека», т. XX. СПб, 1903; РПП – Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском. Вильна, 1867.

УДК 81'367.623:[811.161.3+811.111]

В. А. Мусіенка (Мінск)

СЕМАНТЫЧНАЯ ДЭРЫВАЦЫЯ Ў СФЕРЫ МЕНТАЛЬНАЙ ЛЕКСІКІ
(на матэрыяле густаторных ад'ектыўных намінацый)

Тэрмін *дэрывацыя* мае лацінскае паходжанне: слова *derivation* ужывалася спачатку ў значэнні 'ацвярдзенне, адхіленне'. Дэрывацыя разглядалася як адхіленне ад звычайнага або зыходнага стану, змяненне напрамку развіцця, адгалінаванне. Выконваючы агульнанавуковую тэндэнцыю і традыцыю ў вызначэнні тэрміна *дэрывацыя*, лінгвістычны тэрмін *семантычная дэрывацыя* варта выкарыстоўваць пры апісанні семантычных працэсаў, якія прыводзяць да адхіленняў ад зыходнага значэння слова, яго змяненняў.

С е м а н т ы ч н а я д э р ы в а ц ы я – гэта працэс з'яўлення ў слове семантычна вытворных значэнняў, семантычных канатацый, дадатковых значэнняў,

працэс пашырэння семантычнага аб'ёму слова, які прыводзіць да ўзнікнення семантычнага сінкрэтызму, вынікам якого з'яўляецца ўжыванне палісеміі [1, с. 204]. Дэрывацыя мае некалькі кірункаў змяненняў, якія вызначаюць асноўныя тыпы самой дэрывацыі: метанімічныя і метафарычныя працэсы змяненняў у семантычнай структуры слова, пашырэнне і звужэнне лексічнага значэння, гіпербала, літота, іронія як прадстаўнікі другасных тыпаў змены значэння.

Найбольш актыўнымі механізмамі семантычнай дэрывацыі ў сферы ментальных намінацый у беларускай і англійскай мовах з'яўляюцца метанімічны і метафарычны пераносы. Разгледзім семантычную дэрывацыю другасных ментальных намінацый у лексіка-семантычнай групе густаторных ад'ектываў у беларускай і англійскай мовах.

Ядро густаторнага семантычнага поля складаюць назвы чатырох галоўных смакавых адчуванняў: *кіслага, салодкага, горкага* і *салёнага*. Прататыпічная смакавая сітуацыя салодкасці выкарыстоўваецца для выражэння пачуццяў і рэакцый у рэцыпіентнай зоне. Так, вытворныя ЛСВ прыметніка *кіслы* – (англ. *sour*) будуюцца на аснове асацыяцый, звязаных з кіслым смакам і выразам твару (характэрнай грымасе) пры прыёме кіслай ежы: 'які выражае незадаволенасць; маркотны, панылы' (*кіслы настрой, кіслая ўсмешка*), 'feeling or expressing resentment, disappointment, or anger' 'які адчувае або выказвае крыўду, расчараванне або гнеў' (*а* ***sour look*** *– кіслы погляд, а* ***sour face*** *– кіслы твар, а* ***sour and disillusioned woman*** *– кіслая і расчараваная жанчына; а* ***sour note*** *– кіслая нота*). У беларускай мове, як бачна, смакавае адчуванне кіслага звязана з унутраным псіхічным станам чалавека і выражае агульную яго засмучанасць. У англійскай мове назіраецца ўсплёск кепскага і непрыязнага настрою да навакольных, а таксама непрыемная, невясёлая або нядобрая атмасфера.

Ад'ектыў *салодкі* (англ. *sweet*) ад першаснага значэння спараджае асацыяцыі, звязаныя з прыемным смакам або рэчывамі, якім уласціва цукровасць, мядовы смак і пад.: 'поўны дастатку, задаволення, шчасця, радасці (пра жыццё, лёс)' (*салодкае жыццё, салодкія маладыя гады*). У беларускай і англійскай мовах назіраецца супадзенне другасных ментальных ЛСВ, якія агульна выражаюць задаволенасць чымсьці або калі ў чалавека прарываюцца эмоцыі шчасця, прыемнай усхваляванасці ад якіх-небудзь дзеянняў: 'прыемны, які прыносіць задавальненне, асалоду' (*салодкі сон, салодкая дрымота, салодкія пацалункі*), 'прыемны на ўспрыманне (пра голас, гукі, пах і пад.)' (*салодкі голас, салодкія словы*), 'making you feel happy or satisfied' 'які прымушае чалавека адчуваць сябе шчаслівым або задаволеным' (***sweet dreams*** *– салодкія сны,* ***sweet victory*** *– салодкая перамога, an act of* ***sweet revenge*** *– акт салодкай помсты, а* ***sweet shot*** *– салодкі ўдар*). Таксама назіраецца супадзенне другасных ментальных ЛСВ у дабрыні характару чалавека, яго ветлівасці: 'празмерна далікатны, занадта ласкавы' (*салодкая манера, салодкая мана, салодкая песня*), 'having or showing a kind character' 'якія мае або праяўляе добры характар' (*а* ***sweet smile*** *– салодкая ўсмешка,* ***sweet people*** *– салодкія людзі,* ***sweet-tempered*** *– з салодкім характарам*).

Ад'ектыў *горкі* (англ. *bitter*) у першасным значэнні паказвае моцную і непрыемную едкасць смаку. Такая база праз вытворныя ЛСВ праяўляецца ў самых розных аспектах унутранага стану чалавека, абумоўленага горам, бедамі, нягодамі. Адчуванне горычы нібыта прасякае ўнутраныя псіхічныя працэсы людзей і ўвасабляецца ў ЛСВ пеяратыўнага зместу. Назіраюцца супадзенні ў беларускай і англійскай мовах, калі чалавек перажывае няўдачы ў жыцці: 'поўны гора; цяжкі, гаротны' (*горкае жыццё, горкая жаночая доля*), 'выкліканы

цяжкім горам’ (*горкія слёзы*), ‘які выклікае гора, непрыемнасці’ (*горкая вестка, горкая праўда*), ‘making you feel very unhappy; caused by great unhappiness’ ‘які прымушае вас адчуваць сябе вельмі няшчасным; выкліканы вялікім няшчасцем’ (*to shed* ***bitter tears*** *– ліць горкія слёзы, а* ***bitter disappointment*** *– горкае расчараванне,* ***bitter experience*** *– горкі вопыт*). Таксама поўныя супадзенні другасных ментальных ЛСВ назіраюцца ў такіх станах, калі чалавек адчувае сябе бяздольным, калі з ім абышліся несправядліва: ‘які жыве ў цяжкім горы; бяздольны’ (*горкі сірата, горкі бядняк*), ‘feeling angry and unhappy because you feel that you have been treated unfairly’ ‘які адчувае сябе злым і няшчасным, бо адчувае, што з ім абышліся несправядліва’ (*a* ***bitter*** *feeling – горкае адчуванне*). Толькі ў беларускай мове развіўся ЛСВ, звязаны з доўгім, працаёмкім працэсам, калі чалавек вымушаны быў доўгі час цягнуць жылы: ‘набыты ў выніку цяжкай працы, доўгіх выпрабаванняў’ (*горкі хлеб, горкі вопыт*). Толькі ў англійскай мове развіўся другасны ментальны ЛСВ, звязаны з поўным гневу і раздражнення канфліктам паміж людзьмі: ‘very serious and unpleasant, with a lot of anger and hatred involved’ ‘вельмі сур’ёзны і непрыемны, з вялікай колькасцю гневу і нянавісці’ (*a long and* ***bitter dispute*** *– доўгая і горкая спрэчк*а).

Прыметнік *салёны* (англ. *salty*) у першасным сваім значэнні выказвае процілегласць прэснасці або салодкасці і мае наступныя другасныя ментальныя намінацыі, якіх даволі мала і якія цалкам супадаюць у дзвюх мовах: ‘дасціпны да рэзкасці, непрыстойнасці’ (*салёнае слоўца, салёны анекдот, салёныя і смешныя жарты*), ‘amusing and sometimes slightly rude’ ‘пацешны і часам злёгку грубы’ (*a* ***salty sense of humour*** *– салёнае пачуццё гумару*). З гэтай нагоды становіцца ясна, што і беларускамоўныя, і англамоўныя выкарыстоўваюць гэты ад’ектыў для таго, каб паказаць дарослую прыземленасць і прастату ў адносінах. Гэтая нотка пазітыву найбольш праяўляецца ў прыметніку *пікантны*.

Прыметнік *пікантны* ў першасным значэнні характарызуе вастрыню смаку, яго рэзкасць. Сэнсавая арганізацыя гэта полісеманта (англ. *piquant, savoury, spicy, pungent*) для англійскай мовы праяўляецца наяўнасцю фантастычнага шэрага лексічных адзінак, «расплясканы» фарбамі адценняў другасных ментальных намінацый. Поўнае падабенства праяўляецца ў такіх ЛСВ, калі чалавек абуяны эмоцыяй зацікаўленасці: ‘які сваёй незвычайнасцю выклікае цікавасць’ (*нечаканыя і пікантныя здарэнні*), ‘не зусім прыстойны’ (*пікантны анекдот*), ‘exciting and interesting’ ‘захапляльны і цікавы’ (*a* ***piquant novelty*** *– пікантная навінка*). Толькі ў беларускай мове развіўся ЛСВ: ‘прывабны, спакуслівы’ (*пікантная жанчына, пікантныя кадры з фільмаў*). Слова *пікантны – piquant* прыйшло з французскай, літаральна ‘які джаліць, калючы’. Толькі ў англійскім *savoury* развіліся такія ЛСВ, як ‘piquantly pleasant to the mind’ ‘пікантна прыемны для розуму’ (*a* ***savoury triumph*** *– пікантны трыумф*), ‘morally exemplary’ ‘узорны з маральнай кропкі гледжання’ (*a* ***savory reading*** *– пікантнае чытво*). Гэтае слова паходзіць ад старафранцузскага *savoure* ‘смачны, духмяны’, якое ўтвараецца ад лацінскага *sapor* ‘смак’. Вельмі дзіўнае супадзенне назіраецца ў беларус. *пікантны* і англ. *spicy*: ‘не зусім прыстойны’ (*пікантны анекдот*), ‘somewhat shocking or indecent’ ‘які шакіруе або непрыстойны’ (*a* ***spicy story*** *– пікантная гісторыя,* ***spicy jokes*** *and suggestive songs – пікантныя анекдоты і двухсэнсоўныя песні*). Варты ўвагі таксама англ. *pungent* са сваім унікальным другасным ментальным ЛСВ: ‘if you describe what someone has said or written as pungent, you approve of it because it has a direct and powerful effect and often

criticizes something very cleverly' 'калі чалавек пагаджаецца з тым, што гэта прамая, моцная і разумная крытыка' (*a* ***pungent analysis*** *– пікантны аналіз; a* ***pungent critic*** *– пікантны крытык,* ***pungent language*** *– пікантная мова*). Як можна заўважыць, гэта сумесь станоўчай і адмоўнай канатацыі – крытыка, быццам як вострая і непрыемная, але трапная. Само слова *pungent* першапачаткова з'явілася ў значэнні 'вельмі балючы або пакутлівы' і пайшло з лацінскага *pungent* 'калючы'.

Асобнай увагі заслугоўвае ад'ектыў *апетытны* (англ. *appetizing*), які ў першасным сваім значэнні з-за смачнасці, прыгажосці на пагляд выклікае жаданне есці, узбуджае апетыт. Пры пераасэнсаванні толькі ў беларускай мове ўзнік такі ЛСВ, як 'прывабны (звычайна пра жанчын)' (*Яе каціная дзікая прыгажосць і апетытныя формы не пакідаюць шанцаў канкурэнткам, а адсутнасць нават намёку на унісекс робіць Ліму адной з самых сексуальных мадэляў нашага часу*. "Наша Ніва"). У англійскім адпаведніку *appetizing* другасныя ЛСВ не развіліся. Само ж слова было запазычана з французскай мовы ад *appétissant*, якое ўзыходзіць да лацінскага *appetitus* 'жаданне да' (ад *appetere* 'шукаць', ад *ad-* 'да' + *petere* 'шукаць').

Як відаць з вышэйпрыведзеных прыкладаў, характэрнай рысай дадзенай групы густаторных намінацый з'яўляецца негатыўная ацэнка, а менавіта ад'ектывы *кіслы – sour* (*кіслы настрой, кіслая ўсмешка, a* ***sour look*** *– кіслы погляд*), *горкі – bitter* (*горкае жыццё, горкая жаночая доля,* ***bitter tears*** *– горкія слёзы*), якія канцэнтруюць шматлікія шэрагі другасных ментальных ЛСВ вакол сваіх зыходных паняційных сфер. Станоўчая канатацыя назіраецца ў прыметніках *салодкі – sweet* (*салодкае жыццё, салодкія маладыя гады,* ***sweet dreams*** *– салодкія сны*), *салёны – salty* (*салёны анекдот, салёныя і смешныя жарты, a* ***salty sense of humour*** *– салёнае пачуццё гумару*). Цэнтры пазітыўнай атракцыі адлюстроўваюць тыя сферы жыцця і дзейнасці моўных калектываў, у якіх эмацыйная нагрузка выказванняў дыктуецца ўмовамі побыту, агульнай ідэалогіяй, нормамі маўленчых паводзін, грамадскім становішчам, узростам, полам.

Аналогія як праяўленне тэндэнцыі да рэгулярнасці дапамагае ўтвараць словы, якія патрабуюць мінімальных разумовых намаганняў пры стварэнні новага ЛСВ (***spicy jokes*** *and suggestive songs – пікантныя анекдоты і двухсэнсоўныя песні*).

Эмацыянальна-ацэначныя найменні на аснове метафарычнага і метанімічнага пераносаў ствараюць яркасць вобраза, высокую ступень кампрэсіі інфармацыі ў адным слове, заснаваных на параўнанні прыкмет прадметаў па іх падабенстве: *апетытныя формы мадэлі*, г. зн. прывабная жанчына, прынадная на выгляд, спакуслівая; *a* ***spicy story*** *– пікантная гісторыя*, г. зн. гісторыя з вострымі колкасцямі па падабенстве са смакам, які шчыпле.

Такім чынам, аналогія дапамагае пашырыць рамкі існуючай нормы, спрыяе замацаванню ў мове нерэгулярнай з'явы, якая не адказвае агульнапрынятым нормам. Пранізваючы ўсю сістэму мовы, яна ўдасканальвае мову як сродак зносін і захавання яе камунікатыўных магчымасцей.

Прынцып аналогіі рэалізуецца непасрэдна з дапамогай прататыпа, шляхам выкарыстання аб'екта ў прататыпічнай сітуацыі. У працэсе найменавання ўсталёўваецца сувязь моўных элементаў з фактамі рэальнай рэчаіснасці, уключаючы паняційны клас найменавання прадметаў у пэўную сістэму другасных ментальных ЛСВ, звязаных з названым паняццем.

Вобразнасць, выразнасць другасных найменняў служаць для перадачы насмешкі над сацыяльнымі, этычнымі, эстэтычнымі, моўнымі і іншымі ўмоў-

насцямі і аўтарытэтамі. Адсюль сэмантычная непразрыстасць, ідыяматызм другасных ментальных дэрыватаў, якія ўтвараюцца па прататыпічнай мадэлі, але з абавязковым выкарыстаннем семантычных пераносаў, з актуалізацыяй сем, якія знаходзяцца на ўзроўні нізкай прадказальнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. *Трубачев, О. Н.* Приемы семантической реконструкции / О. Н. Трубачев // Сравнительно-историческое изучение языков разных семей. Теория лингвистической реконструкции. – М., 1988. – С. 197–222.

УДК 811.161.3’42:821.161.3 – 1* М. Скобла

Л. В. Паплаўная (Гомель)

ФІГУРЫ ДАБАЎЛЕННЯ Ў ПАЭТЫЧНАЙ МОВЕ МІХАСЯ СКОБЛЫ

Мова паэзіі ўяўляе сабой складанае па генезісе ўтварэнне, вывучэнне якога прыцягвае ўвагу даследчыкаў яшчэ з часоў антычнасці. Як слушна заўважае І. І. Каўтунова, “Паэтычнае маўленне стварае свае пазітыўныя моўныя каштоўнасці, якія пераўтвараюць маўленне ў мову мастацтва. У паэтычным маўленні ўзбагачаецца семантыка моўных сродкаў і з найбольшай паўнатой ажыццяўляюцца сэнсавыя патэнцыі мовы” [1, с. 4].

Выразнасць, асаблівая рытміка-інтанацыйная структура як асноўны арганізуючы пачатак паэтычнага маўлення, непасрэдным чынам адлюстроўваецца ў экспрэсіўных магчымасцях фігур паэтычнага сінтаксісу, заснаваных на паўторах.

Фігуры паэтычнага сінтаксісу, заснаваныя на паўтаральнасці моўных адзінак, атрымалі назву фігур дабаўлення.

Паўтор уяўляе сабой парушэнне пэўнай сінтагматычнай паслядоўнасці, таму пераўтвараецца ў экспрэсіўны сінтаксічны прыём. Паўтарацца могуць гукі, марфемы, словы, словазлучэнні і нават сказы. Таму выдзяляюцца розныя віды паўтораў – *фанетычныя*, *марфемныя*, *лексічныя* і *сінтаксічныя*.

Фанетычны паўтор заснаваны на паўторы гукаў і іх спалучэнняў, а гукавая арганізацыя вершаванай мовы з’яўляецца адным з важнейшых прыёмаў экспрэсівізацыі паэтычнага тэксту. Фанетычныя паўторы надзвычай разнастайныя і прадстаўлены ў паэзіі Міхася Скоблы такімі стылістычнымі фігурамі, як *алітарацыя*, *асананс*, *гукавая анафара*, *гукавая эпіфара*, *гукавое кальцо* і *полісіндэтон*.

Алітарацыя – старажытны стылістычны прыём узмацнення выразнасці паэтычных твораў, заснаваны на паўторы аднародных зычных гукаў у вершаваных радках:

*Тры**с**та летаў **с**пяліў жалуды,*
*Дзве**с**це памятаў гола**с** Адамаў.*
***С**то ў дупло не пу**с**каў халады –*
***С**вечку **с**тавіў па ім на Дзяды.*
***С**мерць **с**у**с**трэў у абдымках кайданаў* [3].

Асананс – стылістычны прыём, які прадвызначае сугучнасць галосных гукаў у рыфме ці паўтарэнне аднолькавых галосных. Як і алітарацыя, асананс дапамагае паэту падкрэсліць асобныя словы, узмацніць інтанацыйна-гукавую выразнасць верша, надаць яму асаблівую мілагучнасць:

М***о**р**а** в**о**стр**а**в**а**м*
*Мр**о**іл**а** с**о**нечным,*
*М**о**кры в**о**сеньскі*
*Бераг **а**дс**о**ўв**а**ючы* [3];

Каханы трыццаць тры разы
І трыццаць тры разы праклятыя,
Я ўкленчу там пад абразы…
Мне страшна будзе йсці дахаты [2].

Для вершаў М. Скоблы характэрна частае выкарыстанне такога віду паўтору, як гукавая анафара.

Да гукавой анафары адносіцца ўжыванне ў пачатку вершаваных радкоў адных і тых жа гукаў або іх спалучэнняў:

І *кожнай былцы вечнае наўме,*
І *мурашу прымроіцца бяссмерце.*
І *будзе ў борце одумна пчале,*
Забудзецца ручай пра шлях няблізкі… [3].
Схіляюцца ў светлай пакоры,
Да*зволіў якую Ўсявышні,*
Да *гэтай святой, непадсуднай,*
Да *гэтай звычайнай старой* [3].

У паэтычнай мове М. Скоблы ўжываецца і супрацьлеглая анафары фігура – гукавая эпіфара, якая заснавана на паўтарэнні аднолькавых гукаў у канцы вершаваных радкоў ці строф:

Верш безабаронны – што ж вы, што ***ж****?!*
*Пад но****ж****.*
*Край, дзе ліўні ходзяць басано****ж*** *–*
*пад но****ж****.*
*Бесядзь і зеленавокі Со****ж*** *–*
*пад но****ж****.*
*Маладзік, бяссоння не трыво****ж****…*
*Пад но****ж*** [4, с. 7].

Эпіфара надае паэтычным радкам Міхася Скоблы мастацкую выразнасць, глыбіню і змястоўнасць. Паэт вельмі часта выкарыстоўвае гэтую фігуру для ўзмацнення пачуццёвага напалу выказвання, падкрэслівання пэўнай думкі, стварэння кампазіцыйнага і рытмічнага малюнка.

Даволі часта ў паэтычных радках М. Скоблы сустракаецца такая фігура паэтычнага сінтаксісу, як гукавое кальцо.

Гукавое кальцо – паўтарэнне аднолькавых гукаў ці гукаспалучэнняў на пачатку і ў канцы асобных радкоў:

К*рыж, ды півоні, ды месячы****к****…*
Выйсці на волю
Хацеў да людзей –
Дротам звязаны веснічкі [2].
І *алені ўстаюць на кален****і****.*
Н*а парэпаных лапах ялі****н***
Выпаўз ельнік на мокрае ўзлессе,
І глядзела вада з каляін… [2].

Кальцо адыгрывае значную структурна-кампазіцыйную ролю і нясе ў сабе сэнсава-эмацыйную нагрузку: гукі, словы ці радкі, якія “бяруць тэкст” у кальцо, – апорна моцны момант тэксту, у іх – тая асноўная думка, у якой, магчыма, ідэйны змест верша.

Да стылістычных фігур, заснаваных на паўторы, адносіцца і полісіндэтон.

Полісіндэтон (або шматзлучнікавасць) – фігура паэтычнага сінтаксісу, сутнасць якой заключаецца ў выкарыстанні адных і тых жа злучнікаў паміж сказамі і аднароднымі членамі сказа. Полісіндэтон выкарыстоўваецца з мэтай перадачы маўлення эмацыянальнага, напружанага:

І *месяц,* ***і*** *ясныя зоры,*
І *сонца,* ***і*** *ў квецені вішні,*
І *сонны асвер па-над студняй,*
І *белых капусніцаў рой –*
Схіляюцца ў светлай пакоры… [3].
Ды няма аб што бразнуцца,
каб *пасыпаўся тынк са сцяны,*
каб *пахіснуліся вушакі,*
каб *спыніўся спалоханы запознены*
цягнік [4].

Полісіндэтон выдзяляе кожны аднародны член, падкрэсліваючы яго ролю, і адначасова стварае адзінства пералічэння, узмацняючы выразнасць выказвання. У паэтычнай мове М. Скоблы полісіндэтон запавольвае тэмп паэтычнага выказвання і надае яму ўзнёсласць.

Найбольш цікавымі і частымі ў паэтычнай мове Міхася Скоблы з’яўляюцца марфемныя паўторы, калі могуць паўтарацца каранёвыя ці афіксальныя марфемы. Паводле пазіцыі і размяшчэння ў паэтычным радку яны бываюць кантактныя і дыстантныя. У паэзіі М. Скоблы пераважаюць дыстантныя каранёвыя паўторы. Яны выконваюць ролю звязнасці, узмацнення сэнсу і ідэйнай значнасці паўтораных слоў, а таксама аб’ядноўваюць размешчаныя на пэўнай адлегласці адзінкі тэксту і спалучаюць іх паміж сабой.

Салавей *мой месяцавокі*
Салаве*ў і суцішаў спеў.*
Знерваваны і адзінокі,
Па-над студняй асвер рыпеў [4].
Ты з крымскіх гор у снах маіх бяжыш
У слуцкае вясёлкавае лета.
Кахай *мяне,* ***каханая****, любі ж –*
Адзінае, чаго як ласкі звыш,
Спакон вякоў вымольвае паэта [4].
У касцёле – ***маліся*** *й кленчы.*
З цёмнай крыпты
Сырой зімою
У ***малітву*** *прасіўся…* [4].
Здымкі класіка. Профіль. Анфас.
Лёс*, выходзіць, вас песціў і* ***лёсціў****.*
Выдавалі штомесячна вас –
Нават гіпсавы Пушкін зайздросціў [4].

Адным з відаў частковага паўтору ў паэзіі Міхася Скоблы з’яўляецца афіксальны, як правіла, прэфіксальны паўтор. Гэты від паўтору актуалізуе значэнне афіксальных марфем і садзейнічае рытмізацыі маўлення:

І лес ***за****плача****, за****рагоча****,***
За*скача****, за****дрыжыць****, за****кленчыць****,***
Прадацца д’яблу не ***за****хоча*
І ў немым сполаху ***за****кленчыць* [4].

***Аква**чаўны. **Аква**лісты.*
***Аква**сцяжына. **Аква**клумбы.*
***Аква**паветра. **Аква**ты* [4].

Марфемныя паўторы дазваляюць паэту структурна выдзеліць найбольш значныя ў сэнсавых адносінах словы, умела абыграць сугучнасць іх знешняй формы і адметнасці значэння.

Лексічныя паўторы звязаны з паўтарэннем асобнай лексемы ў паэтычных радках. У паэзіі Міхася Скоблы найбольш пашыраны *лексічная анафара*, *паліптатон* і *эпанодас*.

Л е к с і ч н а я а н а ф а р а – паўтарэнне аднолькавых слоў у пачатку вершаваных радкоў. Паўтараемая лексічная адзінка можа адносіцца да розных часцін мовы. Найчасцей у паэтычнай мове аўтара паўтараецца займеннік і назоўнік:

***Ён** прахалоду нёс засмяглым вуснам,*
***Ён** целы атуляў салодкім хмелем,*
***Ён** затуляў нас воблакам спакусным,*
***Ён** налятаў дажджом свавольна-смелым* [4].
***Верш** няўзнак становіцца маленнем.*
***Верш**, нібы ружанец, не парвеш.*
***Верш** – тастамант прышлым пакаленням.*
***Верш** – як галаснік у проймах веж* [4].

П а л і п т а т о н – фігура маўлення, заснаваная на паўторы аднаго і таго ж слова ў розных формах. Граматычная змена лексемы стварае дадатковы стылістычны эфект і павышае экспрэсіўнасць выказвання:

*Абручамі задушаны **дуб**,*
Бы ў каморы кадушка з расолам!
Не загадана лекаваць.
***Дуба** даў – пацвяляюцца здані.*
Дзе ж мы будзем волю каваць,
*Як **дубоў** на радзіме не стане?* [3].
Касавурыцца моўчкі шкаляр
*На **Купалу**-ордэнаносца.*
*Вось **Купалу** машына вязе,*
*Вось **Купала** заняты гаворкаю.*
*Вось **Купала** стаіць у чарзе –*
Не па хлеб, па аўтограф да Горкага [4].

Э п а н о д а с – фігура маўлення, якая ствараецца паўторам слоў у сказе ў адваротным парадку. Такі незвычайны паўтор слоў з асаблівай сілай падкрэслівае значэнне паўтораных слоў, выдзяляе іх з кантэксту, акцэнтуе на іх увагу:

І ў тым гатэліку заспаным,
Стамлёным частаю гульбой,
*Я быў на небе. **Сёмым самым**.*
*На **самым сёмым** быў з табой* [3].
І зноў тысячы рук,
Не знайшоўшы прывычнае клямкі,
***хапаюць і тузаюць**,*
тузаюць і хапаюць [5].

Эпанодас называюць люстраным паўторам. У ліку іншых прыёмаў ён вызначаецца сваёй арыгінальнасцю і вялікім экспрэсіўным патэнцыялам.

Трэба адзначыць выпадкі выкарыстання ў вершах М. Скоблы даволі рэдкай і цікавай з'явы – сімплакі – фігуры, у якой спалучаецца анафара і эпіфара – адначасовы паўтор слоў у пачатку і ў канцы сумежных радкоў:

Каханая, пад калясніцай Феба
Сінее пазалочанае неба,
***А мне, як** хлеб штодзённы **ты патрэбна**,*
А мне, як** сон штоночны, **ты патрэбна [4].
***Самыя** пяшчотныя рукі –*
***матчыны**.*
***Самыя** лепшыя песні –*
***матчыны**.*
***Самыя** мудрыя словы –*
***матчыны**.*
Самае страшнае на свеце –
праклён Маці [2].

Сінтаксічныя паўторы звязаны з паўтарэннем у паэтычнай мове аднолькавых сінтаксічных канструкцый. Да іх адносяцца сінтаксічная анафара і сінтаксічная эпіфара.

Сінтаксічная анафара – паўтарэнне ў пачатку радкоў аднолькавых ці аднатыпных сінтаксічных канструкцый:

***Пакіньце мне** іх боскі спеў.*
***Пакіньце мне**, – я не манах,*
Што зачыніўся ў змрочнай келлі… [2].
***Толькі ў лазні** мы ўсе – адно.*
***Толькі ў лазні** усё відно.*
Лазня – свята ў будзённы дзень.
Лазня ў дружбе – асноў аснова.
***Толькі ў лазні** сквірчыць камень.*
***Толькі ў лазні** – свабода слова* [3].

Сінтаксічная анафара павышае эмацыянальнасць паэтычнага выказвання, узвышае яго тон, кампазіцыйна арганізуе, аб'ядноўвае асобныя радкі. Анафара ў паэтычнай мове М. Скоблы выконвае структурна-семантычную і экспрэсіўную функцыі: гарманічна ўпарадкоўвае славесна-вобразныя пабудовы або лагічна паслядоўна разгортвае думкі і спрыяе ўзмацненню інтанацыйнага і эмацыянальнага напружання.

Таксама сустракаюцца ў вершах паэта адзінкавыя выпадкі ўжывання сінтаксічнай эпіфары, калі паўтараюцца аднолькавыя сінтаксічныя канструкцыі ў канцы паэтычных радкоў:

*Усходзіла сонца – **ён біў**,*
*Заходзіла сонца – **ён біў**,*
Пра клопат астатні забыў –
Ён волі хацеў для пагоні [5].

Выяўленчыя функцыі эпіфары звязаны з "канцэнтрацыяй увагі на вынік, на яго непазбежнасць, прадвызначанасць" [6, с. 289]. З дапамогай эпіфары падкрэсліваецца стабільнасць, бясспрэчнасць канчатковага вываду.

Такім чынам, аналіз функцыянальна-прагматычнай прыроды стылістычных фігур паэтычнага сінтаксісу, заснаваных на паўторах, дазваляе зрабіць вывад аб іх значным эмацыянальным, вобразным, эстэтычным напаўненні ў паэтычнай

мове Міхася Скоблы. Разгледжаныя сродкі паэтычнага сінтаксісу дапамагаюць паэту перадаць свой душэўны стан, адлюстраваць дынамізм і напружанасць дзеяння, надаюць паэтычнаму выказванню велічнасць і ўзнёсласць.

ЛІТАРАТУРА

1. *Сковородников, А. П.* Синтаксис текста / А. П. Сковородников – М. : Наука, 1979. – 368 с.
2. *Скобла, М.* Вечны Зніч [Электронны рэсурс] / М. Скобла // Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка. – 2014. – Рэжым доступу : http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=9949. – Дата доступу : 01.05.2020.
3. *Скобла, М.* Вочы Савы [Электронны рэсурс] / М. Скобла // Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка. – 2014. – Рэжым доступу : http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=9951. – Дата доступу : 01.04.2020.
4. *Скобла, М.* Нашэсце Поўні [Электронны рэсурс] / М. Скобла // Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка. – 2014. – Рэжым доступу : http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=9953. – Дата доступу : 01.04.2020.
5. *Скобла, М.* Акно для матылькоў [Электронны рэсурс] / М. Скобла // Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка. – 2014. – Рэжым доступу : http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=9954. – Дата доступу : 01.04.2020.
6. *Хазагеров, Т. Г.* Общая риторика : курс лекций. Словарь риторических приемов : учеб. пособие для вузов по направлению «Филология» / Т. Г. Хазагеров, Л. С. Ширина. – Ростов н/Д. : Феникс, 1999. – 317 с.

УДК: 811.161.3’37+811.111’37

А. А. Салавей (Мінск)

ПАРАЎНАЛЬНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ З СЕМАНТЫКАЙ ВЕРАГОДНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІХ І АНГЛІЙСКІХ МАСТАЦКІХ ТЭКСТАХ

Артыкул прысвечаны выяўленню семантыка-прагматычных асаблівасцей параўнальных канструкцый як маркёраў простай і праблематычнай верагоднасці. Устаноўлена, што іх семантычная спецыфіка звязана з мадальнасцю верагоднасці. Аналізуемыя канструкцыі выконваюць у мастацкім тэксце прагматычныя функцыі стварэння вобразнасці, іранічнага эфекту і ацэнкі.

Адным з асноўных сродкаў пазнання і ўспрымання рэчаіснасці выступае параўнанне. Як пісаў К. Дз. Ушынскі, «параўнанне – аснова ўсякага разумення і ўсякага мыслення. Усё ў свеце мы пазнаём не інакш, як праз параўнанне» [3, с. 328].

Параўнальныя канструкцыі – гэта канструкцыі, з дапамогай якіх прадметы, прыкметы ці сітуацыі апісваюцца не самі па сабе, а ў дачыненні да іншых прадметаў, прыкмет або сітуацый. Параўнанне змяшчае тры складнікі: *суб’ект параўнання* (тое, што параўноўваецца), *аб’ект параўнання* (тое, з чым параўноўваецца) і *прыкмета параўнання* (агульнае ў рэаліях, што параўноваюцца).

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца канструкцыі з параўнальнымі злучнікамі і часціцамі *бы, быццам, быццам бы, нібы, нібыта, як, як бы, as, as if, as though, like*, мэтай – раскрыццё функцыянальна-семантычнага патэнцыялу параўнальных канструкцый як паказчыкаў верагоднасці. Матэрыялам для даследавання паслужылі 100 беларускіх і англійскіх кароткіх апавяданняў, надрукаваных сучаснымі беларускімі і брытанскімі пісьменнікамі за перыяд 2010–2020 гг.

Семантычная спецыфіка параўнальных канструкцый звязана з мадальнасцю верагоднасці і праяўляецца ў іх магчымасці маніфеставаць простую і праблематычную верагоднасць. Верагоднасць – лінгвапрагматычная катэгорыя, што эксплікуе ступень упэўненасці моўцы ў сапраўднасці выказвання.

Мадальны сэнс параўнальных канструкцый з семантыкай простай верагоднасці можна перадаць трансфармацыйнай мадэллю *Я ведаю і я ўпэўнены, што P (P – прапазіцыя)*/*I know and I’m sure that it’s P*; трансфармацыйная мадэль для параўнальных канструкцый з семантыкай праблематычнай верагоднасці – *Мне здаецца, што P, але не выключаю іншыя варыянты*/*It seems to me that it’s P, but I don’t exclude other options.*

Асновай параўнання выступае суб'ектыўная эмацыянальная ацэнка, таму выкарыстанне параўнальных канструкцый у мастацкіх тэкстах карэлюе з асаблівасцямі светапогляду аўтара і яго уменнем як псіхолага дакладна прыкмеціць мастацкія дэталі пры апісанні герояў і падзей.

Параўнальныя канструкцыі адрозніваюцца параметрам рэальнасці/ірэальнасці стандарту параўнання. Адрозніваюць рэальнае і гіпатэтычнае параўнанне. Пры (1) рэальным параўнанні стандарт параўнання існуе ў рэчаіснасці, пры (2) гіпатэтычным – не існуе:

(1) *Вось ён, той салодкі момант, зусім* ***як*** *у дзяцінстве!* (А. Беланожка). *He was supposed to be having the time of his life as a boy of eighteen,* ***like his classmates****, enjoying the summer holiday* (H. Ecer) 'Меркавалася, што ён, будучы васемнаццацігадовым хлопчыкам, будзе добра праводзіць час, як і яго аднакласнікі, атрымліваючы асалоду ад летніх канікулаў';

(2) *Зоя скончыла прафесійныя гадавыя курсы, уладкавалася ў адну са шматлікіх прыватных фірмаў, дзе вырабляюць тыя кухні, і закруцілася,* ***як вавёрка ў коле****, бо трэба, згодна з дырэктарскай устаноўкай, набраць за месяц заказаў на дзевяноста мільёнаў рублёў – заробак дызайнера ўсяго два працэнты ад іх, – таму даводзіцца працаваць да позняга вечара* (Д. Нічыпаровіч). *You look* ***as if you've seen a ghost*** (M. Nezir) 'Вы выглядаеце так, быццам бачылі прывід'.

Некаторыя лінгвісты выкарыстоўваюць тэрміны *вобразныя параўнальныя звароты і параўнальна-раўналежныя звароты*. Вобразныя параўнальныя звароты характарызуюць прадмет праз супастаўленне яго з іншымі прадметамі на аснове падабенства, нейкай агульнай уласцівасці. Асновай такіх параўнанняў становяцца падобныя ці блізкія прыкметы названых прадметаў [2] *Па маім твары,* ***нібы струменьчык крыві****, спаўзае ўсмешка* (А. Гардзей); *He always found this movement intriguing to watch; it was* ***as though her fingers became her beak*** (C. Massey) 'Ён заўсёды лічыў гэты рух інтрыгуючым для назірання; быццам яе пальцы сталі дзюбай'.

Параўнальна-раўналежныя звароты служаць для вызначэння адпаведнасці паміж прадметамі, з'явамі, «падкрэсліваючы толькі адпаведнасць прыкмет або дзеянняў тых самых прадметаў у розны час ці розных прадметаў у той самы перыяд» [2, с. 415]. Яны не могуць звязвацца злучнікамі *нібы, бы, быццам, as if, as though* і інш. Гэтыя звароты не могуць мець мадальнага значэння, таму што не выражаюць умоўнасці або меркавання: *Яшчэ калі яна была дзяўчынкай, то ёй напрыканцы сакавіка здавалася, як гэтая маладая жанчына, крыху слабая,* ***як усе госці****, брала сябе ў рукі, збірала ўсю моц і выганяла сталую і жорсткую зіму* (М. Шулякоўская); *He's thinking, considering the options****, like I was*** *just a few minutes ago* (H. Mantel) 'Ён разважае, разглядаючы варыянты, як і я некалькі хвілін таму'.

Замест паняццяў *рэальнае і гіпатэтычнае параўнанне* часта ўжываюцца тэрміны *сапраўднае і несапраўднае параўнанне.* Сапраўднае параўнанне эксплікуе сітуацыю як аб'ектыўны, сапраўдны факт, што мае месца ў рэчаіснасці: *Потым, як звычайна, урачыста паабяцаў, што, калі стану вялікім,* ***як тата****, буду дапамагаць маме і абараняць яе ад усіх няшчасцяў* (К. Захарэвіч); *Those who came before you were honest, and a lot of them survived* ***exactly like you did****, others died* (A. Rabah) 'Тыя, хто былі да вас, былі сумленныя, і многія з іх выжылі так, як і вы, іншыя загінулі'.

Параўнальныя канструкцыі з семантыкай несапраўднага параўнання служаць сродкам стварэння вобразаў герояў. Падобныя параўнанні заснаваны на аўтарскіх асацыяцыях і не адлюстроўваюць сітуацыі, што адбываюцца ў рэальным часе і прасторы: *Так мільгалі светлячкі ліхтароў, святло якіх ад багатай восеньскай імжы выгіналася ў крывыя,* ***нібы рытм сэрца на стужцы ЭКГ*** (М. Казакевіч); *The mountain range was shaped* ***like a camel****, and the atmosphere was immensely hot* ***as if we were in the desert;*** (I. Kolokouris) ‘Горны масіў быў падобны на вярблюда, і атмасфера была надзвычай гарачая, як быццам мы знаходзіліся ў пустыні’.

Рэальныя параўнанні/параўнальна-раўналежныя звароты/сапраўдныя параўнанні эксплікуюць простую верагоднасць (канстатацыю), гіпатэтычныя параўнанні/вобразныя параўнальныя звароты/несапраўдныя параўнанні – праблематычную верагоднасць (меркаванне).

У мастацкіх тэкстах простая верагоднасць маніфестуецца параўнальнымі канструкцыямі са злучнікамі *як* і *like*, што складаюць 40 і 34 % ад усіх выпадкаў выкарыстання прапанаваных злучнікаў у параўнальных структурах у беларускай і англійскай мовах адпаведна: *Сяргей, напэўна,* ***як і любы нармальны бацька****, ад усяго сэрца жадаў сыну стаць хоць на адну прыступку вышэй за яго ў кар’ернай лесвіцы* (Д. Пятровіч) = ***Я ведаю, я ўпэўнены, што Сяргей адносіцца да класу такіх бацькоў***; *I wanted her to be a doctor* ***like my twin sisters*** (S. Debbache) ‘Я хацеў, каб яна была ўрачом, як мае сёстры-блізняты’ = ***I know, I’m sure that my twin sisters are doctors.*** 60 % беларускіх параўнальных канструкцый са злучнікам *як* і 66 % англійскіх са злучнікам *like* рэпрэзентуюць праблематычную верагоднасць: *Якая гэта была «пупавінка», Салавейчык даведаўся пазней, калі прыйшоў (а дакладней, прыляцеў* ***як на крылах)*** *у раддом* (Д. Пятровіч) = ***прыляцеў у раддом і мне здаецца, што ў яго былі крылы***; *You look at his eyes: they’re large and blank –* ***like*** *they’re seeing nothing* (L. Rourke) ‘Вы паглядзіце на яго вочы: яны вялікія і пустыя – нібы нічога не бачаць’ = *You look at his eyes: they’re large and blank* ***and they seem to see nothing.***

Лексема *as* у параўнальных канструкцыях, таксама з’яўляючыся семантычна амбівалентнай, выступае маркёрам (1) простай (43 %) і (2) паблематычнай верагоднасці (57 %):

(1) *…a secret* ***as old as the world itself*** ‘сакрэт, стары як сам свет’ (P. Langes) = ***I know, I’m sure that the secret is old and the world is the same***;

(2) *That day the surface of the sea was* ***calm as a palm*** *pressed against a blanket* (M. Nezir) ‘У той дзень паверхня мора была спакойнай, як далонь, прыціснутая да коўдры’ = ***That day the surface of the sea was calm and it seemed to be a palm pressed against a blanket.***

Лексемы (1) *быццам* – 78 словаўжыванняў (далей с/у), (2) *нібы* – 24 с/у, (3) *нібыта* – 11 с/у, (4) *бы* – 5 с/у, (5) *як бы* – 4 с/у, (6) *as if* – 81 с/у, (7) *as though* – 11 с/у выкарыстоўваюцца ў вобразных параўнальных канструкцыях з семантыкай сумнення, няўпэўненасці і рэпрэзентуюць праблематычную верагоднасць:

(1) *Але ён* ***быццам і не быў*** *гэтаму рады, бо ўсё неяк мітусіўся****, нібы нешта выглядаючы ў наваколлі*** (М. Волкаў) = ***Мне здавалася, што ён не быў гэтаму раду, але не выключаю варыянт, што ён быў рады***;

(2) *Усё, што адбывалася са мной,* ***было нібы ў сне*** (Г. Шыбут) = ***Мне здавалася, што гэта быў сон***;

(3) *Вуліца штораз прыгажэла,* ***нібыта*** *рабілася маладзейшай, залівалася залацістым святлом, лёгка бегла на пакручасты груд* (М. Рудовіч) = ***Здавалася, што вуліца рабілася маладзейшай***;

(4) *Крывавыя журавіны,* ***бы рассыпаныя пацеркі на ім****, абуджалі у свядомасці Янака дзіцячыя ўспамін, як даўно ён браў гэтыя ягады, стараючыся абагнаць сваю бабулю, якая, шпарка беручы па адной, па-заліхвацку напаўняла чарговае вядзерца* (М. Волкаў) = ***Здавалася, што гэта былі рассыпаныя пацеркі на ім***;

(5) *Пад моцным псіхалагічным узрушэннем Зоя на момант* ***як бы здранцвела****, у падсвядомасці шчымліва калыхнулася заклапочанасць, што Раман пачне яе цяпер папікаць* (Д. Нічыпаровіч) = ***Зоя здавалася здранцвелай***;

(6) *We dress for the weather we want,* ***as if*** *to bully it, even though we've seen the forecast* (H. Mantel) 'Мы апранаемся ў адпаведнасці з надвор'ем, якое мы хочам, быццам бы здзекуемся над ім, хаця і бачылі прагноз' = ***It may seem that we bully it***; *I breathe deeply and feel* ***as though*** *everything is all right now* (S. Evers) 'Я глыбока дыхаю і адчуваю, што быццам усё ў парадку зараз' = ***Everything seems to be all right now.***

Вобразныя параўнальныя канструкцыі як паказчыкі праблематычнай верагоднасці выкарыстоўваюцца аўтарамі значна часцей (61 і 74 % у беларускіх і англійскіх апавяданнях адпаведна), так як гіпатэтычнае параўнанне дазваляе найбольш ярка і вобразна ахарактарызаваць прадмет з дапамогай суадносін мадальных характарыстык паміж часткамі параўнальнай канструкцыі: першая частка – прадмет параўнання – паведамляе аб рэальнай сітуацыі, а другая – вобраз параўнання – характарызуецца ўяўнай тоеснасцю з рэчаіснасцю, часта гіпербалізаванай.

Параўнальныя канструкцыі з семантыкай верагоднасці ў апавяданнях выкарыстоўваюцца пры апісаннях герояў, іх фізічнага і псіхічнага стану, прадметаў навакольнага свету, што дазваляе адрасату найбольш поўна прадставіць вобразы герояў. Акрамя таго, індывідуальна-аўтарскія вобразныя параўнальныя канструкцыі як маркёры праблематычнай верагоднасці ў дзвюх мовах актуалізуюць індывідуальны вобраз унутранага свету аўтара, спецыфіку яго мастацкага і рэальнага светаўспрымання.

Канструкцыі з параўнальнымі злучнікамі і часціцамі выконваюць у мастацкім тэксце прагматычныя функцыі *стварэння вобразнасці, іранічнага эфекту і ацэнкі.*

Функцыя стварэння вобразнасці з'яўляецца вядучай стылістычнай функцыяй усіх тыпаў параўнання. Інструментам стварэння вобразнасці выступае вобразнае мысленне і наша фантазія, якая дае магчымасць убачыць тое, што часта глыбока схавана: *Час цягнуўся марудна, воз рыпеў нязмазанымі коламі, гойдаўся на калдобінах і ямінах,* ***нібы човен на хвалях*** (У. Садоўскі); *Her hair was kinky and her eyes fizzed* ***like Coca-Cola*** (S. Evers) 'Яе валасы былі кучаравымі, а вочы зіхацелі, як кока-кола'.

Функцыя стварэння іранічнага эфекту заключаецца ў прыцягненні іроніі пры дапамозе параўнання: *Нават калі на цябе з усіх бакоў ціснуць пасажыры, якія няшчадна ўпіхваюцца ў аўтобусы,* ***быццам у Ноеў каўчэг****, гэта лягчэй стрываць, чым падарожжа пад зямлёю, хоць так хутчэй* (С. Календа); *I felt* ***like a dolphin dancing in the water*** (B. Eloufy) 'Я адчуваў сябе дэльфінам, які танцуе ў вадзе'.

Ацэначная функцыя параўнальных зваротаў рэпрэзентуе суб'ектыўнае аўтарскае стаўленне да герояў, яго сімпатыю або антыпатыю: *Ён стаяў і ламаўся, **як дурненькі**, не мог адказаць, не мог паглядзець на яе* (Г. Шыбут); *They danced and danced **like mad*** (I. Kolokouris) 'Яны танцавалі і танцавалі, як звар'яцелыя'.

Такім чынам, у беларускіх і англійскіх мастаціх тэкстах параўнальныя канструкцыі могуць выступаць сродкам рэалізацыі верагоднасці розных тыпаў, аднак пераважная колькасць прааналізаваных канструкцый эксплікуюць праблематычную верагоднасць, так як «параўнальныя звароты такога кшталту ўжываюцца галоўным чынам у мове мастацкай літаратуры як эфектыўны эмацыянальна-экспрэсіўны сродак» [1, с. 186]. Семантычная амбівалентнасць лексем *як, like, as* праяўляецца ў іх магчымасці выступаць маркёрамі простай і праблематычнай верагоднасці.

ЛІТАРАТУРА

1. *Бурак, Л. І.* Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Л. І. Бурак. – Мінск : Універсітэцкае, 1987. – 320 с.
2. *Малажай, Г. М.* Параўнальныя канструкцыі / Г. М. Малажай // Беларуская мова : энцыкл. / Беларус. энцыкл. ; пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – С. 414–415.
3. *Ушинский, К. Д.* Собр. соч. : в 11 т. / К. Д. Ушинский. – М. ; Л. : Изд-во АПН РСФСР, 1950. – Т. 8. – 776 с.

УДК 811.161.3'37(045)

А. В. Семянькевіч (Мінск)

СЕМАНТЫЧНАЯ ТЫПАЛОГІЯ АБСТРАКТНЫХ МНОЖНАЛІКАВЫХ НАЗОЎНІКАЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

На працягу доўгага перыяду вывучэння праблематыкі субстантыўнага ліку сутнасць яе тэарэтычных канцэпцый шмат у чым вызначала інтэрпрэтацыя з'явы pluralia tantum (далей plt). У даследаваннях апошняга часу многія дыскусійныя пытанні статусу катэгорыі ліку страцілі сваю актуальнасць, бо змяніўся пункт гледжання на прыроду граматычнага значэння. З аднаго боку, лінгвістыка свядома адмовілася ад жорсткіх меж у вылучэнні і класіфікацыі моўных з'яў. З другога боку, у тэорыі граматыкі быў абвешчаны прынцып вытлумачальнасці, а кагнітыўныя падыходы паставілі задачу вызначыць, якія параметры пазнання навакольнага свету граматыкалізуюцца ў натуральнай мове. Дыскурсіўна скіраваныя даследаванні форм ліку паказалі, што фармальны погляд на субстантыўную лікавую парадыгму, які знаходзіў апраўданне ў тым, што «назоўнікі з выражаным супрацьпастаўленнем паводле ліку складаюць асноўную масу назоўнікаў» [11, с. 471], не знаходзіць пацверджання. Аўтары «Тэорыі функцыянальнай граматыкі» паставілі пад сумненне гэта агульнапрынятае аксіяматычнае палажэнне і выказалі меркаванне, што яно заснавана хутчэй на інтуіцыі, чым на даных статыстычнай базы, таму колькасную праблему, «якія імёны найбольш тыповыя: злічальныя ці пазбаўленыя гэтай здольнасці, наўрад ці трэба лічыць вырашанай» [14, с. 183]. Кваліфікацыя некарэлятыўных назоўнікаў як «anomalia сярод безумоўных назоўнікаў» [10, с. 393], як слоў, «якія пацярпелі аварыю» [7, с. 67], не можа задаволіць сучасную навуку, бо на першае месца выходзіць пытанне аб прычынах непаўнаты парадыгмы ліку. Усе «граматычныя цяжкасці» тлумачэння адзіночналікавых і множналікавых назоўнікаў, якія, на думку А. А. Рэфармацкага, «цікавыя хутчэй для стылістыкі, чым для граматыкі» [10, с. 393], пачынаюць з перыферыі даследавання пераходзіць у цэнтр.

У сучаснай граматыцы сцвердзілася палажэнне аб мнагафактарнасці прычын лікавай некарэлятыўнасці і прынцыповай магчымасці іх выявіць і растлумачыць. Адным з фактараў з'яўляецца іх семантыка. У беларускім мовазнаўстве стратэгіі семантычных аб'яднанняў назоўнікаў plt не даследаваны, што стварае пэўную лакуну ў асэнсаванні іх месца ў граматычнай сістэме мовы.

Аб'ектам аналізу ў гэтым артыкуле сталі беларускія абстрактныя плюратывы. Даследаванне праведзена на матэрыяле 530 лексічных адзінак, выбраных з 18 лексікаграфічных крыніц. Фармальным крытэрыем вылучэння абстрактных plt з'яўляецца іх уласцівасць называць незлічальныя рэферэнты. Лінгвістычная катэгорыя прадметнасці, якая лічыцца анталагічнай асновай назоўніка, аб'ядноўвае ў паняцці «прадмет» субстантыўныя назвы двух тыпаў – прадметы анталагічныя, якія характарызуюцца матэрыяльнай асобнасцю, выразнай вылучанасцю з кола іншых прадметаў, і прадметы гнасеалагічныя, якія называюць уласцівасці, адносіны, дзеянні. Асобнасць, адмежаванасць, індывідуальнае існаванне ў прасторы і часе прадметаў першага тыпу з'яўляюцца ўмовай іх злічальнасці. Дэнататы прадметаў другога тыпу, якія становяцца «прадметамі» толькі ў пазнанні, у моўнай семантыцы, пазбаўлены адасобленасці і магчымасці злічэння. Аўтары «Тэорыі функцыянальнай граматыкі» лічаць, што «менавіта дыскрэтнасць/недыскрэтнасць шмат у чым вызначаюць спецыфіку канкрэтных/абстрактных імёнаў як катэгорый моўнага адлюстравання свету» [14, с. 192]. З філасофскага пункту гледжання «да абстрактных адносяць назоўнікі, дэнататы якіх маюць рэферэнты, якія не валодаюць прасторавай акрэсленасцю і/ці тактыльнай успрымальнасцю», а з пункту гледжання семантыкі «як абстрактныя вызначаюцца назоўнікі, якім адпавядаюць паняцці дзеяння, уласцівасці, якасці, стану» [5, с. 15]. Кагнітыўна-прагматычная значнасць абстрактных назоўнікаў заключаецца ў тым, «каб даць імя нематэрыяльным існасцям» [6, с. 66]. Множналікавыя абстрактныя назоўнікі могуць называць практычна ўсе «нематэрыяльныя існасці» (ідэі), якія прыпісваюцца і некарэлятыўным формам адзіночнага ліку, у прыватнасці называць: а) адцягненае дзеянне (*скокі, перагледзіны*); б) адцягненыя пачуцці ці стан (*зайздрыкі, дрыжыкі*); в) адцягненае паняцце, якое існуе толькі ў чалавечым мысленні і якое нельга прадставіць наглядна (*веды, мудрыкі)*. Аднак нашы назіранні паказваюць, што, у адрозненне ад абстрактных адзіночналікавых, назоўнікі plt не намінуюць адцягненую прымету. Семантычная структура абстрактных плюратываў характарызуецца полісемнасцю і аморфнасцю, таму іх таксаномія вызначаецца меншай дыферэнцыяльнай акрэсленасцю класіфікацыйных рубрык (у параўнанні з канкрэтнымі, зборнымі і рэчыўнымі). Сярод беларускіх абстрактных plt можна вылучыць наступныя.

1. **Назвы абстрактных паняццяў** (254 адзінкі), напрыклад: *абста́віны, адно́сіны, веды, выкладкі, гарызонты, гулі, дамовіны, дрыжыкі, жадункі, забабоны, зайздрыкі, залёты, захады, капрызы, кепікі, лёстачкі, мудроты, нервы, пералёкі, прыцемкі, раздабары, складанасці, стасункі, сховы, узаеміны, упікі, хаханькі, шашні.* У гэты таксон уключаюцца разнародныя па семантыцы словы, якія называюць нематэрыяльныя паняцці. Тым не менш сярод іх можна вылучыць пэўныя семантычныя групоўкі, якія дэманструюць дзеянне механізма намінатыўнай аналогіі. Гэта словы, што даюць неадабральную ацэнку паводзінам, характару чалавека, яго ментальнасці (*брындзікі, выкрутасы, вымудры, выробы, вытрыбенькі, выхітры, вычвары, вычуды, гарэзы, гнявы, гулі, гулюшкі, даліманы, дзіваты, зайздрыкі, закабунькі, залёсткі, дуды, дурыкі, жадункі,*

капрызы, лабунькі, лалы, лёсткі, малімонікі, мудрыкі, наравы, песты, подбегі, прыштукі, пярэбары, разінькі, убегі, упіры, хітрыкі, шалы) або жыццёвай сітуацыі (*дзіркі, злыдні, канцы, недахваткі, незада́лы, нелады, непамыслоты, непярэ́ліўкі неўкладушкі, нецікоты, нягоды, пераліўкі, церні)*; назвы ўзаемаадносін і ўзаемадачыненняў людзей, большасць таксама з неадабральнай ацэнкай (*абыходзіны, адносіны, вузы, зводы, зводні, зносіны, контры, любошчы, падседы, прошукі, стасункі, узаемаадносіны, узаемастасункі, узаеміны, узаемаразлікі, умызгі, упады, фіглі, фіглі-міглі, чэчні, шашні, шуры-муры*); словы, якія негатыўна ацэньваюць спосаб камунікацыі паміж людзьмі і самі выказванні (*байкі, біліндрасы, жартачкі, гудкі, галасы, казалы, кепікі, кеплі, кленічы, клятбоны, кпіны, кпінкі, крыватолкі, нападкі, падшэпты, пераводы, пераказы, перасмешкі, погудкі, прыпікі, прыпінкі, прытычкі, разгалосні, раздабары, размовы, смешачкі, смешкі, стрычкі, талаба́сы, тары-бары, упікі, упінкі, хаханькі, хіхоты, шкелі, шэпты*); назвы стану, псіхічных і фізіялагічных адчуванняў чалавека негатыўнага характару, а таксама захворванняў (*дрыгі, дрыжыкі, злёкі, пералёкі, пранцы, пярэпалахі, курчы, лёкі, рэгулы, сухоты, схваткі, уздухі, узры́гі*); колькасныя і тэмпаральныя паняцці (*дзясяткі, дні, мірыяды, сотні; гадзіны, зацемкі, павадкі, паўгодкі, паўдзёнкі, прыцемкі, поцемкі, прымеркі, пеўні, ранкі, рачанцы, суцемкі, суцінкі, халады, часы*). Як бачна з пералікаў, значная частка множналікавых назоўнікаў, якія называюць абстрактныя паняцці, мае ў сваёй семантычнай структуры ацэначны (пеяратыўны) кампанент.

Галоўнай лексікаграфічнай праблемай рэпрэзентацыі абстрактных plt з'яўляецца ацэнка аўтаномнасці і ўзуальнай значнасці плюральна аформленага значэння назоўніка. Група абстрактных множналікавых назоўнікаў актыўна папаўняецца шляхам семантычнай дэрывацыі (*гарызонты, магчымасці, абавязкі, віды, манеры, нервы, поспехі, формы, сувязі, вучэнні, дзіркі, гімалаі* і інш). Многія даследчыкі рускай неалогіі канца XX ст. адзначаюць «узмацненне грамемы множнасці», якое праяўляецца ў тым, што патэнцыйныя формы множнага ліку становяцца рэальнымі [12; 16; 1]. Праўда, трэба заўважыць, што гэта тэндэнцыя суіснуе і з адваротна накіраванай. У працах Л. А. Брусенскай [3] і В. М. Чараднічэнка [15] прыводзяцца спісы слоў, якія, насупраць, страцілі звычайныя ў XIX ст. формы множнага ліку (напрыклад, *пользы, кручины, борьбы* і пад.). У беларускім мовазнаўстве гэта праблема ў дыяхранічным аспекце не даследавана. З'ява плюралізацыі ў сістэме абстрактнай лексікі патрабуе дэтальнага аналізу рэферэнцыяльных характарыстык слоў, тыпаў кантэкстаў, сінтагматычных сувязей, модусных функцый і іншых фактараў, тым не менш нашы назіранні паказваюць правамернасць вядомага палажэння аб здольнасці абстрактных назоўнікаў перадаваць у форме множнага ліку семантыку разнароднасці, гетэрагеннасці і паўтаральнасці.

2. **Абстрактныя назвы дзеяння** (139 адзінак), напрыклад: *абыходзіны, адведзіны, водведы, выбары, выведы, дакопіны, дэбаты, закладзіны, зборы, манеўры, народзіны, паводзіны, пераведы, перамовіны, распыты, розведы, скокі, уцёкі* і інш. У таксон уключаны плюратывы з архісемай працэсуальнасці. Гэтыя назоўнікі кансалідуе аддзеяслоўнае паходжанне, што вызначае іх семантыку (нязначную па колькасці групу складаюць словы, утвораныя на аснове семантычнага пераносу: *манеўры, музыкі, эвалюцыі, эцюды*). Найбольшую «працэсуальнасць» выяўляюць субстантывы, якія семантызуюцца з выкарыстаннем формулы 'дзеянне паводле пэўнага дзеяслова', напрыклад: *выведы* 'дзеянне паводле дзеясл. *выведваць*'; *пярэбары* – 'дзеянне паводле дзеяслова *перабі-*

рацца’. Аднак такіх плюратываў вельмі няшмат, што гаворыць аб тым, што семантыка дэвербатываў plt у большай ступені спецыялізуецца ў параўнанні з адзіночналікавымі назоўнікамі. У дачыненні да множналікавых працэсуальных намінацый часта ўжываюцца характарыстыкі, якія вызначаюць іх спецыфіку: «дзеянне са значэннем працягласці ці паўтарэння» [9, с. 81], «дзеянні, працэсы, што адбываюцца працягла або выконваюцца многімі» [2, с. 63]; «працяглая ў часе акцыянальная структура» [8, с. 23]. Узнікае заканамернае пытанне: ці з’яўляюцца пералічаныя вышэй характарыстыкі сапраўды спецыфічнымі для абазначэння плюральна аформленага дзеяння ў адрозненне ад сінгулярна аформленага? Для таго каб адказаць на гэта пытанне, трэба найперш разабрацца з самім тэрмінам «дзеянне». У лінгвістычнай літаратуры выказаны спробы ўсе незлічальныя plt аб’ядноўваць у адзін клас «складаных дзеянняў» [13, с. 147–153; 8, с. 19]. На нашу думку, нават умоўнае разуменне гэтага тэрміна (‘усё, што не прадмет’) значна ўскладняе (пры здавалася б, наадварот, простай класіфікацыйнай сістэме) таксанамічную карціну множналікавых назоўнікаў, не вызначае спецыфіку плюратываў у дачыненні да злічальнасці/незлічальнасці і адпаведна іх сінтагматыкі, не дае магчымасці ацаніць прадуктыўнасць тэматычных груп. Акрамя таго, тэрмін «складанае дзеянне» закліканы дыферэнцаваць «складанае» і «нескладанае» дзеянне. Сапраўды, у семантычнай структуры множналікавых дэвербатываў прысутнічае кампанент ‘працяглае, або паўтаральнае дзеянне, або дзеянне, якое выконваецца многімі’, але гэты кампанент у многіх выпадках мініфестуецца не плюральнай флексіяй, а лексічным значэннем назоўніка, якое дэтэрмінуецца семантыкай утваральнага дзеяслова, дзе яго носьбітам з’яўляецца прыстаўка і аспектна-таксіснае значэнне. Пра гэта сведчыць шырока прадстаўленая ў беларускай мове сінанімія дэвербатываў plt і sgt (напрыклад, *выведы – выведванне*, *перашэпты – перашэптванне, даследзіны – даследаванне* і інш.). Лікавыя паводзіны дэвербатываў залежаць ад цэлага комплексу рознаўзроўневых фактараў, якія патрабуць глыбокага аналізу, апісання і сістэматызацыі, але нават нешматлікія прыклады паказваюць, што значэнне «складанага» дзеяння ўласціва не толькі прэдыкатным plt, таму лічыць гэты кампанент іх семантыкі адзіным фактарам плюральнай аформленасці ва ўсіх выпадках наўрад ці правамерна.

Некаторыя абстрактныя назвы дзеяння, аформленыя плюральна, выяўляюць магчымасць прадметнай інтэрпрэтацыі (напрыклад, *ад’ездзіны, даследзіны, запросіны*). Ускладненне іх семантычнай структуры адбываецца па мадэлі рэгулярнага пераносу ‘дзеянне → вынік дзеяння’.

Перыферыйную зону працэсуальных плюратываў складаюць тэрміналагічныя назвы, прадстаўленыя адзінкавымі словамі (3 адзінкі): *настыі, сейсманастыі, хеманастыі.*


3. **Назвы свят, урачыстасцей, мерапрыемстваў, абрадаў і народных звычаяў** (99 адзінак), напрыклад: *агледзіны, адведкі, асяні́ны, бабі́ны, выправіны, грамніцы, дажынкі, дзевяціны, дзяды, жальбі́ны, загавіны, задушкі, закосіны, замовіны, запо́іны, зару́чыны, змовіны, імяніны, Каласавіны, ксціны, кучкі, мярліны, Пакровы, паховіны, пацалуйкі, перазовіны, перапоўзіны, прыкалядкі, саракавіны, уваходзіны, угаворыны, угледзіны, угодкі, улазіны, хаўтуры, хрысціны, хрэсьбіны, шасціны, шлюбавіны, шчадроўкі.* Колькасны склад гэтых намінацый значна павялічыцца, калі браць пад увагу рэгіянальныя назвы (напрыклад, *абжынкі, ачэпіны, басюры, калінкі, камаедзіцы, крыжавіны, кудзельніцы, лазбіны, макрэні, маладзены, мядзіны, пагрэбіны, падвяселіны, патрусіны, пахмелкі,*

пірагі і інш.). Гэтай тэматычнай групай часта прэзентуюць клас множналікавых незлічальных назоўнікаў як найбольш характэрных паводле семантыкі і найбольш старажытных па паходжанні [4, с. 58]. Функцыянальная значнасць адзінак гэтага таксона дэтэрмінуецца экстралінгвістычнымі фактарамі, многія ў слоўніках маюць памету *этн.* Аднак паводле гэтага намінатыўнага стандарту быў утвораны саветызм *Акцябрыны*, а пазней слова *Каласавіны* ‘мерапрымствы ў гонар Якуба Коласа’. Адзначаны выпадкі аўтарскіх неалагізмаў, утвораных паводле словаўтваральнай мадэлі гэтай намінатыўнай групы, напрыклад: *Стаяць дрыготкія асіны, трапечуць лісьцем, Спраўляла восень* ***атрасіны*** *і вецер свішча. Згуляла восень* ***атрасіны*** *– чакай марозаў* (А. Кудласевіч).

Некаторыя назвы дзеяння маюць у семантычнай структуры і працэсуальнае значэнне, і абрадавае, якое ўзнікае ў выніку рэгулярнага пераносу ‘назва сельскагаспадарчай дзейнасці’ → ‘назва абраду, якім яна суправаджаецца’ (напрыклад, *дажынкі, абжынкі, закладзіны*). Калі абрадавыя назвы набываюць акцыянальнае значэнне пэўнай сітуацыі, яны могуць станавіцца злічальнымі, напрыклад: *сёння ў вёсцы двое хрысцін*.

4. **Назвы гульняў** (21 адзінка), напрыклад: *бірулькі, біткі, гарадкі, гарыпні, гарэлкі, даганялкі, дагонкі, жмуркі, карты, класікі, класы, ладачкі, ладкі, нарды, паддаўкі, снежкі, фанты, хованкі, хоўкі, шахматы, шашкі.* Большасць слоў утворана па метанімічнай мадэлі пераносу значэнняў на аснове сумежнасці паняццяў ‘тое, з чым гуляюць (многа прадметаў)’ → ‘назва гульні’; дэвербатывы ўтварыліся з дапамогай марфемных сродкаў, але з захаваннем плюральнай формы вытворных. Назвы гульняў, утвораных іншымі спосабамі (напрыклад, на аснове метафары), маюць форму адзіночнага ліку (напрыклад, *гуляць у млын, вузельчык, вядзьмар, рэдзьку* і інш.).

Такім чынам, таксанамічную карціну абстрактных plt можна прадставіць наступным чынам (малюнак).



Таксанамічная карціна абстрактных plt

ЛІТАРАТУРА

1. *Архипкина, Г. Д.* Когнитивные основания и анропоцентрические параметры грамматической категории числа : дис. … д-ра филол. наук : 10.02.19 / Г. Д. Архипкина. – Ростов н/Д., 2006. – 307 л.

2. Беларуская граматыка : у 2 ч. / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд.: М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985–1986. – Ч. 1 : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / А. І. Падлужны [і інш.]. – 1985. – 430 с.

3. *Брусенская, Л. А.* Семантический и функциональный аспекты интерпретации категории числа в русском языке : дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.01 / Л. А. Брусенская. – Ростов н/Д., 1994. – 301 л.

4. *Дегтярев, В. И.* Категория числа в славянских языках: историко-семантическое исследование / В. И. Дегтярев ; отв. ред. Ф. П. Филин. – Ростов н/Д. : Изд-во Рост. ун-та, 1982. – 320 с.

5. *Забашта, Н. А.* Стилистическое использование форм множественного числа абстрактных имен существительных в русском и испанском языках (сопоставительный анализ) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.05 / Н. А. Забашта. – М., 1984. – 20 с.
6. *Калинина, Л. В.* К вопросу о критериях выделения и отличительных приметах лексико-грамматических разрядов имен существительных / Л. В. Калинина // Вопр. языкознания. – 2007. – № 3. – С. 55–70.
7. *Колесников, А. А.* Семантическое обеспечение грамматических форм имен существительных русского языка / А. А. Колесников. – Киев : Выщ. шк., 1988. – 137 с.
8. *Конявская, С. В.* Семантическое словообразование в системе числа существительных: синхрония и диахрония / С. В. Конявская. – М. : РФК-Имидж Лаб, 2004. – 192 с.
9. *Наркевіч, А. І.* Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы / А. І. Наркевіч. – Мінск : Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 1976. – 245 с.
10. *Реформатский, А. А.* Число и грамматика / А. А. Реформатский // Вопросы грамматики : сб. ст. к 75-летию акад. И. И. Мещанинова / Акад. наук СССР, Ин-т языкознания ; редкол.: В. А. Аврорин., В. М. Жирмунский (отв. ред.) [и др.]. – Л. ; М., 1960. – С. 384–400.
11. Русская грамматика : в 2 т. / Акад. наук СССР, Ин-т рус. яз. ; редкол.: Н. Ю. Шведова (гл. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1980. – 2 т.
12. *Сенько, Е. В.* Неологизация в современном русском языке конца XX века: межуровневый аспект : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / Е. В. Сенько ; Волгогр. гос. пед. ун-т. – Волгоград, 2000. – 50 с.
13. *Соболева, П. А.* Словообразовательная полисемия и омонимия / П. А. Соболева // М. : Наука, 1980. – 240 с.
14. Теория функциональной грамматики: Качественность. Количественность / Т. Г. Акимова [и др.] ; редкол.: А. В. Бондарко (отв. ред.) [и др.]. – СПб. : Наука, 1996. – 264 с.
15. *Чередниченко, О. М.* Квазиабстрактные имена: позиционные условия плюрализации и прагматические характеристики : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.19 / О. М. Чередниченко. – Ростов н/Д., 2002. – 154 л.
16. *Шапошников, В.* Русская речь 1990-х: современная Россия в языковом отображении / В. Шапошников. – М. : Моск. ассоц. лингвистов-практиков, 1998. – 242 с.

УДК 811.161.3

В. А. Скачкова (Гомель)

ЛЕКСІКА СА ЗНАЧЭННЕМ ‘НЕЗЛІЧОНАЕ МНОСТВА, ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЦЬ’ У МОВЕ БЕЛАРУСАЎ

Словы з метрычным значэннем старажытныя па сваіх паходжанні. На працягу гістарычнага развіцця чалавецтвам распрацаваны розныя сістэмы вымярэння. Усім нам вядомыя меры метр, кіламетр, грам, кілаграм і іншыя ўваходзяць у сучасную метрычную сістэму мер. Многія меры страцілі сваю актуальнасць, перайшлі ў склад устарэлых, напрыклад – *аршын, локаць, вярста*. Але існаваў і існуе яшчэ адзін спосаб выражэння няпэўнай, прыблізнай велічыні. Гэта пераходныя меры, яны ўскладняюць і адначасова ўзбагачаюць сістэму мовы. Яны не могуць выражаць дакладную меру. Па сваім утварэнні яны другасныя, узніклі шляхам пераасэнсавання асноўнага значэння, нясуць пэўную экспрэсію, могуць перадаваць і ўзмацняць эмацыянальнасць выказвання.

Словы *гібель, безліч, навала, плойма, рой* утвараюць лексіка-семантычную групу на аснове агульнасці іх метафарычнага значэння ‘незлічонае мноства, вялікая колькасць чаго-н.’.

Слова *гібель* (параўн. рус. *гибель*, укр. *гибіль*) з’яўляецца роднасным дзеяслову *гібнуць*, фіксуецца толькі ва ўсходнеславянскай моўнай падгрупе. У старажытнарускай і старабеларускай мовах яно выражала паняцце ‘пагібель, згуба’ [5, т. 1, с. 618; 2, т. 6, с. 278].

У народных гаворках Беларусі слова *гібель* мае значэнне ‘пагібель, згуба’, а таксама адзначаецца для выражэння ‘незлічонай колькасці, мноства чаго-н.’: *Гібяль*, што тых мошак наляцела [4, с. 67]; У том годзі была *гібяля* сліў [9, с. 119]; Там іх *гібяль* гэтых макрушак [11, т. 1, с. 199].

Значэнне ‘незлічоная колькасць, мноства чаго-н.’ развілося, верагодна, з уяўлення таго, што празмернае мноства якіх-небудзь прадметаў, з’яў можа быць у такой колькасці, што прывядзе да значнага пашкоджання, да ўрону, краху, нават да пэўнай катастрофы. Складана зараз меркаваць, у якой з усходне-

славянскіх моў развілося такое другаснае значэнне слова *гібель*. Бо знаходзім у рускай мове, напрыклад: «Прильнув к стволам, на проезжего глядели пушистохвостые белки, – *гибель* в лесах была этой белки» (А. Н. Толстой. Петр Первый); «На что бы, казалось, нужна была Плюшкину такая *гибель* подобных изделий?» (Н. В. Гоголь. Мёртвые души). Ці звернемся да класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы: «[Марыля]: Лета не за гарою, скора касьба пачнецца, жніво, работы *гібель*» («Раскіданае гняздо»).

У сучаснай беларускай літаратурнай мове гэта адзінка захоўваецца ў першасным значэнні ‘пагібель, згуба’, а таксама другасным – ‘вялікая колькасць, мноства’, якое кваліфікуецца як размоўнае [7, т. 2, с. 48].

Узнікненне слова *плойма* ‘вялікая колькасць дзяцей’ звязана са словамі пладзіць, плод [13, т. 3, с. 284]. Адзінку знаходзім у многіх славянскіх моваў, параўн.: рус., укр., серб. *плойма*, пол. *plojma*, харв. *ploima*. У. І. Даль падаў гэта слова з паметай ‘слова са Смаленскай губерніі’ [3].

У беларускіх гаворках знаходзім слова таксама ў значэнні ‘многа дзяцей’: «*Плойма* гэта ўсе гуркі з хаты выніла», а таксама для выражэння вялікага мноства іншых жывых істот (не дзяцей): «У сыбакі блох *плойма*» [1, с. 333]; «Ета ня жарты: етая *плойма* курэй – дзіва што выдзяруць грады!» [12, с. 218]. У маўленні беларуска-літоўска-польскага пагранічча адзначаюцца фанетычныя варыянты *плуйма, плэйма* [7, т. 4, с. 141].

У мове Янкі Купалы *плойма* – гэта ‘незлічоная колькасць, мноства’ (не пра дзяцей): «Покуль іх бандаў рынецца *плойма*, Покуль на трупах нашых хто стане, На барыкады, Камуна, Да зброі, грамадзяне!» («Парыжская камуна»). Прыдатак *чарада*, далучаны да слова *плойма*, надае яму непаўторную экспрэсію: «Ой, бяда ж, бяседа, была Вельмі гучная бяседа! – Не адходзіла ад стала *Плойма-чарада* суседаў» («Безназоўнае»).

У сучаснай беларускай літаратурнай мове гэта адзінка фіксуецца як размоўная [10, т. 4, с. 276].

Слова *навала* ўзыходзіць да дзеяслова *валіць* ‘імкліва ісці, рухацца натоўпам, патокам’ [10, т. 1, с. 457]. Роднаснымі з’яўляюцца таксама словы *вал* ‘высокая хваля; самкнуты шчыльны строй людзей’ і *наваліць* ‘празмерна накласці чаго-н.’. Гэтую адзінку не знаходзім у іншых славянскіх мовах, параўнаем з рус. *скопление*, укр. *скупчення*. У старабеларускай мове выяўлена слова *навалность* ‘бяда, няшчасце’ [2].

У дыялектнай мове паўночна-ўсходняй, паўночна-заходняй частак Беларусі *навала* – гэта ‘бяда, гора, напасць’: «*Навала* ў іх хату нейкая ўвалілася – усё гініць» [8, с. 196]. На паўночна-заходняй тэрыторыі назіраецца выкарыстанне слова *навалач* ‘зброд’ [9, с. 298]; ‘не карэнны жыхар; прыезджы чалавек’ [7, т. 3, с. 122].

У мове Купалы слова *навала* па сваёй семантычнай структуры з’яўляецца многазначным: ‘вялікая колькасць каго-н., скопішча’: «А паноў *навалу*, Іх карэнняў жудзі Помніш ты, Барысаў, – Павек не забудзеш» («Барысаў»); ‘празмернасць чаго-н.’: «Мінула праклятцяў *навала*, год дваццаць у шчасці жыву я» («Паклон мой народу за песні»); ‘бяда, няшчасце’: «Ты зноў сюды лезеш, няшчасны! Ха-ха-ха! Вось так *навала*!» («Сон на кургане»). З аналагічнымі значэннямі гэта адзінка фіксуецца таксама ў сучаснай беларускай літаратурнай мове [10, т. 3, с. 211].

З паметай *прастамоўнае* ў сучаснай рускай мове фіксуецца вытворнае ад *навала* прыслоўе *навалом* у значэнні ‘аб наяўнасці чаго-н. у вялікай колькасці, у лішку’: «Разве это рыбалка? Вы приезжайте к нам на Алтай, у нас тайменей

навалом» (Горышин. Лица встречных); «Дров в тайге *навалом* (Е. К. Марысаев. Рыжий черт) [6]. Хутчэй за ўсё слова пранікла на тэрыторыю Расіі і актыўна ўжываецца там у бытавой сферы, нават назіраецца ў літаратурных творах, дзякуючы беларусам, якія перасяляліся ў мінулым стагоддзі ў суседнюю краіну.

Слова *рой* вядзе сваю гісторыю з праславянскай эпохі (**rojь* ‘цячэнне, паток’), звязана са словамі *рака, рынуць* [13, т. 3, с. 496]; параўн. рус. *рой*, укр. *рій*, пол. *roj*, балг. *рой*, харв. *roy*. У старажытнарускай мове гэта адзінка выяўлена ў значэнні ‘сям’я пчол’ [5, т. 3, с. 162]. У старабеларускай мове слова мела аналагічнае значэнне [8, т. 2, с. 186].

У дыялектным ужыванні паўночна-заходняга, паўднёва-ўсходняга моўных масіваў Беларусі пазначаная адзінка мае больш шырокі аб’ём значэнняў: ‘сям’я пчол’ [1, с. 389; 7, т. 4, с. 302]; ‘вялікая колькасць насякомых’: «Мух *рой* бызыкае ў хаце» [11, т. 4, с. 309; 7, т. 4, с. 302]; ‘перан., вялікая колькасць каго-н.’: «Цэлы *рой* ваўкоў» [7, т. 4, с. 302]; ‘у знач. прысл., у вялікай колькасці’ [1, с. 389]. Гэта значэнне ўзнікла шляхам метафарызацыі на аснове асацыятыўнай сувязі паводле прыметы ‘мноства’.

Звернемся да класіка беларускай літаратуры. Купала ўжывае гэта слова прыкладна з такім жа аб’ёмам значэнняў. У значэнні ‘мноства’ сустракаем слова ў такіх радках: «То не *рой* друганоў падымаецца, Дзе зваёваных трупы ляжаць, – Гэта гурты казакаў злятаюцца Закаваны народ катаваць» (З песень аб няволі); «Натхненна гэтак пеў, заводзіў *Рой* чалавечы на свій лад, – Рака шуміць так ў разводдзе, Так стогне ў буру сосен рад» (урывак з паэмы).

Вытворны прыметнік *ройны* паэт уключае ў радкі сваіх твораў са значэннем ‘поўны, напоўнены’: «Мая песня сёння будзе радасцямі *ройнай*, Аб любімых кандыдатах У Савет Вярхоўны» («Нашым кандыдатам…»).

У Купалы знаходзім таксама вытворныя прыслоўі *ройна* і *ройма* за значэннем ‘значна, у вялікай колькасці’: «Хоць сохі, хоць косы гуляюць так *ройна*, – Ня поймеш адкуль узялісь; Людзей запытаешь, аткажуць спакойна: “Забраны край” гэты калісь» («Забраны край»).

Сучаснай беларускай літаратурнай мове слова *рой* вядома з тым жа аб’ёмам значэнняў, што і ў дыялектнай мове і ў мове Купалы [10, т. 4, с. 714].

У беларускай мове словы з агульным значэннем ‘мноства, вялікая колькасць’ даволі распаўсюджаныя. Асабліва ў бытавой сферы назіраецца ўжыванне самых разнастайных адзінак. Гэта ці асобныя намінацыі (*сіла*, *моц*, *хмара*, *лавіна*, *бездань*, *лес*, *мора* і г.д.), ці ўстойлівыя спалучэнні (*па горла*, *дай божа*, *да чорта*, *да халеры*, *як бобу*, *як грыбоў*, *як сабак*, *цэлы воз* і г.д.) з рознымі адценнямі значэнняў і з рознымі спосабамі ўтварэння. Гэта лексічная група адкрытая, яна ўвесь час папаўняецца за кошт народных гаворак, размоўнай лексікі і запазычанняў з розных моў.

Дыяхранічны аналіз паказвае, што ў семантычным аб’ёме прааналізаваных адзінак значэнне ‘мноства, вялікая колькасць’ развіваецца паступова на працягу гістарычнага развіцця мовы на аснове асацыятыўных семантычных паралеляў.

Зварот да твораў Янкі Купалы абумоўлены тымі фактарамі, што менавіта класік беларускай літаратуры лічыцца па праву пачынальнікам і зараджальнікам новай літаратурнай мовы і тыя працэсы, што адбываліся ў мове напрыканцы XIX – першай палове XX стагоддзя, знайшлі адлюстраванне ў творах песняра.

ЛІТАРАТУРА

1. *Бялькевіч, І. К.* Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны / І. К. Бялькевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 512 с.

2. Гістарычны слоўнік беларускай мовы / пад рэд. А. М. Булыкі ; Нац. акад. навук Беларусі ; Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа. – Мінск : Беларус. навука, 1982–2017. – Т. 1–37.
3. *Даль, В. И.* Толковый словарь живого великорусского языка : в 4 т. [Электронный ресурс] / В. Даль. – 8-е изд. – М. : Рус. яз., 1981–1982. – Режим доступа : https: //azbyka.ru/otechnik/ Spravochniki/tolkovyj-slovar-zhivogo-velikorusskogo-jazyka-v-i-dalja.
4. *Касьпяровіч, М. І.* Віцебскі краёвы слоўнік (матар'ялы) / М. І. Касьпяровіч ; пад рэд. М. Я. Байкова, Б. І. Эпімаха-Шыпілы. – Выд. 2-е, стэр. – Менск : Ін-т беларус. культуры, 2011. – 371 с.
5. *Срезневский, И. И.* Материалы для Словаря древнерусского языка : в 3 т. / И. И. Срезневский. – М. : ГИС, 1958. – 3 т.
6. Словарь русского языка : в 4 т. [Электронный ресурс] / РАН, Ин-т лингвист. исследований ; под ред. А. П. Евгеньевой. – 4-е изд., стер. – М. : Рус. яз. ; Полиграфресурсы, 1999. – Режим доступа : http://feb-web.ru/feb/mas/mas-abc/14/ma233001.htm?cmd=0&istext=1.
7. Слоўнік беларускіх гаворак паўднёва-заходняй Беларусі і яе пагранічча : у 5 т. / уклад. Ю. Ф. Мацкевіч [і інш.] ; рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979–1986. – 5 т.
8. Слоўнік мовы Скарыны / уклад. У. В. Анічэнка. – Мінск : Выш. шк. 1977–1994. – Т. 1–3.
9. *Сцяшковіч, Т. Ф.* Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці / Т. Ф. Сцяшковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 618 с.
10. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / пад агул. рэд. К. К. Атраховіча : у 5 т. – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – Т. 1–5.
11. Тураўскі слоўнік : у 5 т. / склад. А. А. Крывіцкі, Г. А. Цыхун, І. Я. Яшкін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982–1987. – 5 т.
12. *Шатэрнік, М.* Краёвы слоўнік Чэрвеньшчына / М. Шатэрнік ; Беларус. Акад. навук ; Аддзел гуманіт. навук ; Камісія для ўкладаньня слоўніка жывой беларус. мовы : пад рэд.: М. Я. Байкова, Б. І. Эпімаха-Шыпілы. – Менск : Выданьне Беларус. Акад. навук, 1929. – 328 с.
13. *Фасмер, М.* Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / М. Фасмер ; пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачева. – 4-е изд., стер. – М. : Астрель : АСТ, 2007. – 4 т.

УДК 81.373.423

В. Б. Скрамблевіч (Мінск)

ТЫПАЛОГІЯ АМОНІМАЎ У БЕЛАРУСКІМ І ІТАЛЬЯНСКІМ МОВАЗНАЎСТВЕ

Ва ўмовах развіцця міжнароднага супрацоўніцтва, пашырэння эканамічных, навуковых і культурных сувязяў паміж Рэспублікай Беларусь і Італіяй значную цікавасць выклікаюць даследаванні беларускай і італьянскай моў у кантрастыўным аспекце, што дае магчымасць вызначыць колькасныя і якасныя характарыстыкі тыповых адзінак моўных сістэм, а таксама асаблівасці іх функцыянавання. Актуальнасць кантрастыўнага аналізу беларускай і італьянскай лексікі звязана з практычнымі задачамі: неабходнасць выявіць разыходжанні ў семантычнай структуры і выкарыстанні міжмоўных лексічных адпаведнікаў абумоўлена наступнымі мэтамі: а) прадбачыць і папярэдзіць інтэрферэнцыю лексічнага ўзроўню; б) падрыхтаваць лінгвістычную базу для перакладчыкаў і выкладчыкаў моў. Вынікі кантрастыўных даследаванняў даюць магчымасць па-новаму падысці да стварэння двухмоўных слоўнікаў, якія фіксуюць у лексікаграфічнай форме нацыянальную спецыфіку семантыкі слоў.

У апошні час у лексікалагічных даследаваннях вялікую ўвагу надаюць усебаковаму вывучэнню праблем аманіміі, якая ўяўляецца адной з самых складаных у семасіялогіі і лексікаграфіі. Кола пытанняў, звязаных з аманіміяй, надзвычай шырокае: паходжанне і функцыянаванне амонімаў, іх класіфікацыя, крытэрыі размежавання полісеміі і аманіміі і структурныя адрозненні паміж гэтымі з'явамі, дыферэнцыяцыя значэнняў у амонімаў. Але яны не могуць быць паспяхова вырашаны без канкрэтнага вызначэння самога паняцця амонімаў, паколькі гэта мае прынцыповае значэнне для даследавання іх структурна-семантычных тыпаў у розных мовах.

У беларусістыцы пад аманіміяй разумеюць гукавое супадзенне адзінак, якія адрозніваюцца паміж сабой значэннем [1]. Тыпалогія амонімаў залежыць не толькі ад іх лексічнага значэння, але і ад марфалагічных, фанетычных і графічных асаблівасцей. Як адзначаюць даследчыкі, зрабіць поўную фіксацыю і строгую класіфікацыю амонімаў вельмі цяжка па прычыне яе непазбежнай мнагалікасці і недастатковай фармальна-семантычнай акрэсленасці [2]. Каб упэўніцца ў справядлівасці гэтай думкі, мы вырашылі звярнуцца да некалькіх крыніц [1; 2; 5] і прааналізаваць тыпалогію амонімаў па кожнай з іх (табл. 1).

Т а б л і ц а 1

Тыпы амонімаў у беларускай мове

Амонімы і іх тыпы	Паводле А. Я. Міхневіча	Паводле А. Я. Баханькова	Паводле П. У. Сцяцко
Лексічныя	Маюць поўнае гукавое супадзенне ва ўсіх формах і адносяцца да адной часціны мовы	Іх неабходна разглядаць на ўзроўні слоўнікавых форм. Адносяцца да адной і той жа часціны мовы	Словы з аднолькавым гучаннем, якія не маюць супольнай семантыкі (агульных сем)
Поўныя	Супадаюць ва ўсіх граматычных формах	Аманімічныя словы, якія супадаюць ва ўсіх сваіх формах. Могуць быць лексічнымі або лексіка-граматычнымі	Супадаюць цалкам усімі сваімі словаформамі
Няпоўныя	Таксама частковыя: адно з сугучных слоў ва ўсіх сваіх формах супадае па гучанні з часткай форм іншага слова ці з адной асобнай яго формай	Аманімічныя словы, у якіх асобныя формы не супадаюць. Могуць быць лексічнымі або лексіка-граматычнымі	Няма поўнага супадзення ў словаформах. Канкрэтызуюцца як частковыя, амаформы, граматычныя амонімы
Амафоны (або фанетычныя амонімы)	Словы, якія аднолькава гучаць, але адрозніваюцца напісаннем	Словы, якія аднолькава гучаць, але пішуцца парознаму	Гучаць аднолькава, але пішуцца парознаму
Амаформы (або марфалагічныя амонімы)	Словы, якія звычайна адносяцца да розных часцін мовы і супадаюць толькі ў некаторых марфалагічных формах	Аднолькавыя па гучанні і напісанні формы ў межах граматычнай парадыгмы аднаго і таго ж слова або парадыгм розных слоў	Гл. графу «Няпоўныя амонімы»
Амографы (або графічныя амонімы)	Словы, якія аднолькава пішуцца, але парознаму вымаўляюцца	Словы і формы слоў, якія аднолькава перадаюцца на пісьме, але ў вымаўленні адрозніваюцца пастаноўкай націску	Супадаюць графічным абліччам. Супярэчаць самой існасці амонімаў як слоў з аднолькавым гучаннем, бо гучаць неаднолькава
Граматычныя	–	Тое, што амаформы	Тое, што няпоўныя амонімы
Лексіка-граматычныя	–	Адносяцца да розных часцін мовы, розных лексіка-граматычных класаў	–

Заканчэнне табліцы 1

Сінтаксічныя	Канструкцыя, якая можа атрымаць больш чым адну семантыка-сінтаксічную інтэрпрэтацыю	–	–
Міжмоўныя	Словы, якія амаль поўнасцю супадаюць па гучанні ў дзвюх мовах	–	–
Амаморфы	–	Марфемы, якія супадаюць па гучанні і напісанні, але адрозніваюцца па значэнні	–

Такім чынам, нават невялікі агляд падцвярджае меркаванне аб немагчымасці ўніфікаванай класіфікацыі амонімаў. Безумоўна, нейкую агульнасць поглядаў можна заўважыць, як, напрыклад, у дачыненні да лексічных амонімаў або наконт таго, што амафоны, амаформы, амографы трэба адрозніваць непасрэдна ад амонімаў. Але адразу можна заўважыць несупадзенне ў тэрміналогіі.

Адметным выпадкам у беларускай мове з'яўляецца сінтаксічная і міжмоўная аманімія. У даследаваннях сінтаксічнай аманіміі навукоўцы ў асноўным кіруюцца класіфікацыяй рускіх лінгвістаў, у прыватнасці М. П. Калеснікава. Ён выдзяляе больш за 15 адзінак аманімічных канструкцый, якія размяжоўваюцца сінтаксічнымі сродкамі ўтварэння. У беларускай мове знойдзена і даказана існаванне 11 тыпаў сінтаксічнай аманіміі: аманімія сказаў з уключанымі словамі, аманімія сказаў з аднароднымі членамі, аманімія граматычнай канструкцыі са злучальным словам *які*, двухчленная парадыгматычная аманімія, аманімічныя сказы-тоеснасці, марфолага-сінтаксічная аманімія, лексічна-катэгарызацыйная аманімія, аманімія інфінітыўных сказаў з суб'ектна-аб'ектным давальным склонам, аманімічныя спалучэнні назоўніка з родным прыіменным, граматычна-катэгарызацыйная аманімія, аманімія сказаў з займеннікамі [3].

Міжмоўная аманімія ў беларускім мовазнаўстве ў асноўным вывучаецца пры супастаўленні беларускай і рускай моў. Пры класіфікацыі міжмоўных амонімаў аманімічныя пары падзяляюцца на міжмоўныя лексічныя; міжмоўныя марфалагічныя; міжмоўныя графічныя амонімы, або амографы, і міжмоўныя лексіка-граматычныя амонімы. У даследаваннях лексікі дзвюх блізкароднасных моў для міжмоўных амонімаў ужываецца таксама тэрмін *амалексы-гетэрасеманты* – словы двюх моў, якія знаходзяцца ў семантычных адносінах выключэння і маюць толькі рэгулярныя адрозненні ў знешнім выглядзе (напрыклад, рус. *боронить* 'разрыхляць глебу бараной, баранаваць' – беларус. *бараніць* 'пільна ахоўваць ад нападу ворагаў') [4].

Не стала выключэннем у дачыненні да дыскусій наконт аманіміі і італьянская мова. Аднак трэба адзначыць, што пытанне аманіміі ў італьянскай лінгвістыцы вывучана недастаткова і разглядаецца як «fenomeno legato alla polisemia» ('феномен, які цесна звязаны з полісеміяй'). Традыцыйна ў італьяністыцы выдзяляюць амонімы лексічныя, амафоны і амаформы, але, як можна заўважыць у табл. 2, падыход да іх трактоўкі не зусім аднолькавы [6; 7; 8].

Т а б л і ц а 2

Тыпы амонімаў у італьянскай мове

Амонімы і іх тыпы	Паводле Т. З. Чарданцавай	Паводле М. Дардано	Паводле Ф. Казадэі
Omonimi ‘амонімы’	Словы, якія супадаюць па гучанні і адрозніваюцца па значэнні	Словы, якія характарызуюцца тоеснасцю азначальных пры адрозненні азначаемых	Словы, якія маюць аднолькавую форму
Assoluti ‘поўныя’	–	–	Лексемы, у якіх супадае ўся сістэма форм
Lessicali ‘лексічныя’	–	Адносяцца да адной і той жа граматычнай катэгорыі	Omonimi perfetti (‘ідэальныя амонімы’) – словы, якія супадаюць па фаналагічнай і графічнай формах
Parziali ‘частковыя’	–	–	Адносяцца да розных часцін мовы і супадаюць у асобных формах (называюцца таксама «relativi» ‘адносныя’, або «testuali» ‘тэкставыя’)
Omofoni ‘амафоны’	Словы, якія супадаюць па гучанні, але адрозніваюцца напісаннем	Словы, якія маюць аднолькавае гучанне	Eterografi (‘«чыстыя» амафоны’) супадаюць выключна ў фаналагічнай форме. Quasi omofoni (‘амаль амафоны’) – словы, якія адрозніваюцца адной літарай
Omoforme ‘амаформы’	Словы, якія належаць да адной або розных часцін мовы, маюць рознае, а часам і блізкае значэнне, але супадаюць па гучанні і напісанні	–	–
Omografi ‘амографы’	Словы, якія аднолькава адлюстроўваюцца на пісьме, але адрозніваюцца па значэнні і гучаннем	Адлюстроўваюцца на пісьме аднолькавымі графемамі	Eterofoni (‘«чыстыя» амографы’) супадаюць выключна ў графічнай форме. Capitonimi ‘капітонімы’ (разнавіднасць амографаў) – словы, якія маюць рознае значэнне, а пры напісанні іх адрозніваецца першая (вялікая ці малая) літара
Grammaticali ‘граматычныя’	–	Адносяцца да розных граматычных катэгорый	–
Lessico-grammaticali ‘лексіка-граматычныя’	–	Вынік канверсіі	–

Morfologici ‘марфалагічныя’	–	Тоеснасць форм аднаго і таго ж слова; тоеснасць адпаведных форм розных слоў (называюцца таксама «paradigmatici» ‘парадыгматычныя’)	–

Калі параўнаць абедзве табліцы, можна заўважыць, што назвы граф амаль цалкам супадаюць – у адрозненне ад іх напаўнення. Вельмі важны момант, які адрознівае класіфікацыю амонімаў у беларускай і італьянскай мовах, заключаецца ў падыходзе да самой з’явы аманіміі.

У беларусістыцы з’ява аманіміі вывучаецца як асобны, самастойны феномен і супрацьпастаўляецца з’яве полісеміі. У сучасным італьянскім мовазнаўстве аманімія разглядаецца скрозь прызму тэрміна *ambiguità linguistica* (літаральна ‘моўная двухсэнсавасць’), які аб’ядноўвае і абагульняе ўсе выпадкі, калі адной і той жа моўнай форме адпавядае некалькі значэнняў. Ambiguità linguistica падзяляецца на лексічную, фаналагічную, граматычную, сінтаксічную, міжмоўную і прысутнічае на ўсіх узроўнях мовы. А таму ў італьянскай мове такім беларускім паняццям, як, напрыклад, *сінтаксічныя амонімы* або *міжмоўныя амонімы*, будуць адпавядаць тэрміны *ambiguità sintattica* і *ambiguità interlinguistica*.

Найбольш шырока *ambiguità linguistica* прадстаўлена ў лексіцы (ambiguità lessicale), бо менавіта лексеме дастаткова часта ўласціва мець больш за адно значэнне. Такім чынам атрымліваецца, што ў італьяністыцы класіфікуюцца не аманімія і полісемія, а ambiguità lessicale, якая рэалізуецца ў полісемантах і амонімах розных тыпаў: лексічных, амафонах, амографах, фальшывых сябрах перакладчыка і іншых падобных да лексічнай аманіміі з’явах.

Лінгвіст М. Дардано пры класіфікацыі амонімаў разглядае амонімы, амографы і амафоны ў адзінай звязцы: паводле яго, амонімы (gli omonimi) адначасова з’яўляюцца амографамі (gli omografi), якія, у сваю чаргу, могуць быць (праўда, не заўсёды) амафонамі (gli omofoni).

Асобныя пытанні ў італьянскім мовазнаўстве ўзнікаюць пры адрозніванні поўных і частковых амонімаў, паколькі далучэнне амоніма да таго ці ншага тыпу залежыць ад таго, разглядаюцца формы слова асобна або ўнутры парадыгмы лексемы, да якой гэтыя формы адносяцца. Ключавым крытэрыем у дадзенай сітуацыі будзе з’яўляцца тоеснасць формы і прыналежнасць да той ці іншай часціны мовы.

У завяршэнні адзначым, што даследаванне аманіміі на матэрыяле беларускай і італьянскай моў можа дапамагчы вызначыць:

- структурныя асаблівасці аманімічных адзінак у дзвюх мовах;
- характар фармальна-сэнсавых адносін паміж амонімамі;
- выявіць шляхі і спосабы папаўнення саставу аманімікі;
- параўнаць квантынатыўныя характарыстыкі амонімаў;
- выявіць ступень аманімічнай насычанасці ў даследуемых мовах.

Цесныя беларуска-італьянскія культурныя сувязі абумоўліваюць неабходнасць пашырэння кантрастыўных даследаванняў, асабліва на ўзроўні семантыкі, што, у сваю чаргу, робіць магчымым супастаўленне моўнай карціны свету і маўленчых паводзін двух народаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Кунцэвіч, Л. П.* Аманімія / Л. П. Кунцэвіч, А. Я. Міхневіч // Беларуская мова : энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – С. 30–31.
2. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.
3. *Прыгожая, В. А.* Сінтаксічная неадназначнасць і яе тыпы / В. А. Прыгожая // Труды БГТУ. – Минск : БГТУ, 2012. – № 9 (156) – С. 7–10.
4. *Роўда, І. С.* Рознаўзроўневая намінатыўная адпаведнасць беларускай і рускай моў (у сувязі з праблемай лексічных лакун) / І. С. Роўда. – Мінск : БДУ, 1999. – 170 с.
5. *Сцяцко, П. У.* Уводзіны ў мовазнаўства : дапаможнік / П. У. Сцяцко. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 231 с.
6. *Черданцева, Т. З.* Очерки по лексикологии итальянского языка / Т. З. Черданцева. – М. : URSS, 2020. – 184 с.
7. *Casadei, F.* Lessico ed educazione linguistica / F. Casadei, G. Basile. – Roma : Carocci, 2019. – 217 p.
8. *Dardano, M.* La lingua italiana / M. Dardano, P. Trifone. – Bologna : Zanichelli, 1985. – 480 p.

УДК 811.162.3

Г. А. Смалянка, А. П. Занкавіч (Мінск)

МОВА ЯК АДНА З ГАЛОЎНЫХ ФОРМАЎ ІСНАВАННЯ І ВЫРАЖЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Мова – гэта даволі своеасаблівы феномен культуры. П а - п е р ш а е, мова з’яўляецца важным самастойным элементам культурнай спадчыны народа, адной з асноўных частак культуры, п а - д р у г о е – яна спецыфічны спосаб існавання і захавання культуры ў цэлым, дапамагае авалодаць усім багаццем чалавечай дзейнасці (культуры народа). Любая культура з’яўляецца нацыянальнай, яе спецыфічныя рысы адлюстраваны ў мове пры дапамозе асаблівага, непаўторнага бачання свету.

Мовы маюць свае спецыфічныя, характэрныя для іх рысы, бо кожны носьбіт мовы вырас у пэўных кліматычных умовах, у розных геаграфічных шыротах, меў свой занятак, што і наклала адбітак на ўспрыманне свету і, у сваю чаргу, паўплывала на мову. Сапраўды, прыроднае асяроддзе (клімат, раслінны і жывёльны свет, ландшафт і пад.), гістарычныя ўмовы жыцця людзей істотна ўплываюць на характар заняткаў народа (жывёлагадоўля, земляробства, паляванне, рыбны промысел, гандаль і пад.). Адзначаная спецыфіка адлюстроўваецца ў мове. Беларуская мова мае асаблівасці, якія праяўляюцца на ўсіх моўных узроўнях – ад гука да сказа.

Нацыянальны каларыт найперш выяўляецца ў лексічным складзе мовы. Кожны народ вылучае і замацоўвае ў назвах найбольш важныя для яго аб’екты і прадметы акаляючага асяроддзя, і свае ўяўленні аб іх. У склад лексікі беларускай мовы, напрыклад, уваходзяць каля дваццаці назваў балота (*дрыгва, твань, багна, бездань, імшара* і пад.), каля дзесятка назваў ляснога масіву (*бор, гай, дуброва, пушча, хмызняк* і пад.), назваў палеткаў (*кукурузнік, жытное, прасянішча, аўсянішча* і пад.) і г.д.

У мовах народаў паўночнай тэрыторыі Еўраазіяцкага кантынента сустракаюцца шматлікія назвы аленяў, снегу, тундры і г.д.; мова арабаў адрозніваецца шырокім ужываннем вялікай колькасці найменняў верблюдаў; мовы народаў так званых марскіх дзяржаў налічваюць нямала спецыфічных назваў ветру, суднаў. Для кожнай мовы, такім чынам, характэрныя словы, якія называюць спецыфічныя паняцці, прадметы, здабыткі культурнай дзейнасці народаў. Большасць такіх адметных слоў не мае адпаведнікаў у іншых мовах.

Кожны народ мае свае вобразна-мастацкія сімвалы краіны, хараства, красы, самабытнасці, моцы, даўгавечнасці, сціпласці, мудрасці і г.д. Найбольш выразна

гэта выяўляецца пры супастаўленні аналагічных паняццяў і сітуацый у розных мовах і культурах. Напрыклад, у розных культурах існуюць адрозненні ва ўспрыманні колеравай гамы. Так, у многіх краінах Паўднёвага Усходу белы колер можа ўспрымацца як сімвал жалобы, смутку, а ў беларусаў гэтую функцыю выконвае чорны колер. Белы колер у славян – сімвал чысціні, прыгажосці, любві, хоць у паганскія часы ён з'яўляўся сімвалам і нараджэння смерці. Смерць і пахаванне блізкага чалавека для славян – вялікае гора, смутак, а ў асобных народаў гэтыя падзеі выклікаюць іншыя, больш станоўчыя эмоцыі.

Назвы расліннага і жывёльнага свету таксама ствараюць розныя асацыяцыі ў розных народаў, некаторыя з такіх назваў становяцца адпаведнымі сімваламі. У прыватнасці, успамінаецца вядомы верш М. Багдановіча "Слуцкія ткачыхі":

І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж персідскага ўзора
Цвяток радзімы васілька.

Кветка васілёк, такім чынам, з'яўляецца сімвалам краіны, гэта вобраз роднай Беларусі. Для Расіі сімвал радзімы – *бяроза*, а для нарвежцаў *бяроза* – увасабленне вынослівасці, стойкасці. Няма сумненняў у тым, што па-рознаму ўспрымаюцца народамі *воўк, сабака, зубр, карова, заяц, бусел, жораў* і інш.

Працяглы працэс развіцця культуры таго ці іншага народа фіксуюць, перадаюць нашчадкам і фразеалагічныя адзінкі. Большасць фразеалагізмаў захоўваюць менавіта культурна-сацыянальны каларыт.

У кожнай мове існуюць фразеалагізмы, адным або некалькімі кампанентамі якіх з'яўляюцца нацыянальныя ўласныя імены, назвы прадметаў нацыянальнай культуры, у якіх адлюстравана гісторыя народа. Параўнайце беларускія ўстойлівыя выразы тыпу *якую кашу заварыш, такую і еш; лыкі аднаго лапця; калі з роду баравік, то лезь, браце, у кошык; мілей свая хата, як чужая веска; пасылаць у Магілёўскую губерню; ад Глуска да Кракава – скрозь бяда адзінакава* і рускія *назвался груздем, полезай в кузов; щи лаптем хлебать* 'пра вельмі блізкага чалавека'*; как с писаной торбой возиться* 'удзяляць шмат увагі'; *мамаево побоище; казанская сирота; как швед под Полтавой* і пад. У прыведзеных устойлівых выразах лексемы *каша, лыка, кошык, хата, вёска* і *щи, лапоть, торба, кузов* указваюць на сферу матэрыяльнай культуры. На канкрэтныя гістарычныя факты, краіназнаўчыя веды паказваюць словы ўстойлівых выразаў *Магілёў, губерня, Глуск, Кракаў* і *мамаев, побоище, казанский, швед, Полтава.*

Ужыванне спецыфічных устойлівых выразаў для выказвання падзякі, пажаданняў, прывітання і г.д. таксама з'яўляецца адметнай нацыянальна-культурнай прыкметай. Вельмі гасцінны, добразычлівы беларускі народ карыстаецца шматлікімі выслоўямі ад звычайных шырокавядомых *Добры дзень! Выбачайце, калі ласка! Дзякуй Вам! Вітаю Вас* і пад. Да больш складаных маўленчых адзінак тыпу *Вам шчасце-долю і хлеба ўволю! Каб вам шчасце і здароўе, і дзяціне, і сябрыне! Каб вас ліханька не ўзяло! Каб дзяды не ведалі бяды, а ўнукі не бачылі мукі! Каб у дамочку, садочку, у хлявочку, у полечку ўсё радзіла і пладзіла! На доўгі век, на добрае здароўе!*. Адметнасцю беларускай мовы, асабліва вуснай, з'яўляецца выкарыстанне пры звароце да знаёмых і незнаёмых людзей даўніх клічных форм назоўніка (*дружа, браце*), пытальнай часціцы *ці*, прыналежных прыметнікаў. Нездарма Ф. Багушэвіч назваў беларускую мову «адзежаю душы» беларусаў.

Нацыянальная спецыфіка выяўляецца і ў фанетыяным складзе мовы. Беларуса і сёння пазнаеш па цвёрдым вымаўленні асобных зычных (*шчырасць, жыццё, чорны*), па звонкім *дзе* і густым *чаго* (як казаў Пімен Панчанка). У дачыненні да адметнасці беларускай мовы М. Шавыркін зазначае: “У беларускай мове пазбягаюцца выпадкі збегу зычных: слова павінна гучаць вольна, разносіцца ўшыркі, трымацца на прасторы, як душа адчувае сябе сярод раўнінных краявідаў”. Уласцівыя беларусам “дзеканне” і “цеканне” надаюць выказванням мілагучную звонкасць, а поўнагалоссе – напеўнасць, мяккасць маўлення, зацвярдзеласць асобных зычных – паслядоўную трываласць, прыродную магутнасць. Самабытнасць беларускай мовы, яе непаўторнасць падкрэслівае выдатны пісьменнік У. Караткевіч: “Наша мова вечная, бо ўся яна, як наш характар. Здаецца, кволая ад пяшчотнай мяккасці, яна раптам кідае наверх схаваную ад усіх жалезную мужнасць і сілу. І, як быццам дамогшыся свайго, б’е, як перапёлка ў жытах, – мякка, а за тры вярсты чуваць. “Эль” – як саладкае віно, “дзе” – як шкляной палачкай па крышталю, мяккае “с” – як соннае ціўканне сінічкі ў гняздзе. І побач “р”, як гарошына ў світку, і доўга, спявуча, адкрыта гучаць галосныя. А “г” прыдыхае так ласкава, як маці на лобік дзіцяці, каб перастаў сніць дрэнны сон”.

Універсальным сродкам перадачы вобразна-мастацкіх уяўленняў чалавека, эмоцый, пачуццяў і г.д., выкліканых уздзеяннем твораў выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, музычнага ды іншых відаў мастацтваў, таксама з’яўляецца мова. Яна акумулюе разныя погляды на пачутае і ўбачанае, зберагае вобразы, якія ўзнікаюць у свядомасці ад таго ці іншага твора мастацтва, “матэрыялізуе” разнастайныя думкі людзей.

Культура, адлюстраваная ў мове, жыве ў метафарах, фразеалагізмах, прыказках і прымаўках, фальклорных творах і г.д. Кожны носьбіт мовы фарміруе сваё бачанне свету менавіта на аснове паняццяў, якія замацаваныя ў мове яго продкамі. Іншымі словамі, мова з’яўляецца носьбітам і перадатчыкам нацыянальных вобразна-мастацкіх адносін да свету, нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці, фіксуе спецыфіку светаадчування, светаўспрымання і пазнання. Мова не проста адлюстроўвае тое, што ёсць у культуры, а фарміруе культуру і развіваецца ў культуры.

УДК 811.161.3’37:398.8

Н. П. Цімашэнка (Гомель)

ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СЕМАНТЫЧНАЕ ПОЛЕ АБ’ЕКТНАСЦІ Ў ТЭКСТАХ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ

Аб’ектнасць – гэта семантыка-граматычная катэгорыя, звязаная са здольнасцю працэсуальнай адзінкі пазначаць дзеянне, стан, працяглую ў часе ўласцівасць, якая накіравана на прадмет ці асобу або якая выяўляецца ў адносінах да яго, і спалучацца з імем у форме ўскоснага склону з аб’ектным значэннем. Прызнанне аб’екта важнейшым семантычным кампанентам сказа патрабуе асэнсавання данай сінтаксічнай катэгорыі з боку комплексу яе семантычных значэнняў. Аналіз усемагчымых праяўленняў катэгорыі семантычнага аб’екта ў структуры сказа дае магчымасць выявіць сродкі сучаснай мовы, якія выкарыстоўваюцца для рэалізацыі семантычных функцый аб’екта (поле аб’ектнасці), і пабудаваць іерархію гэтых сродкаў (цэнтр – перыферыя) па прыметах найбольшай спецыялізаванасці для выяўлення дадзенай семантыкі і найбольшай рэгулярнасці функцыянавання ў мове беларускіх народных песень. Гаворка ідзе аб вызначэнні структуры поля аб’ектнасці ў мове.

Канцэпцыя поля, на думку Б. Ю. Нормана, заключаецца ў тым, што «двухбаковым (г. зн. значным) моўным катэгорыям уласціва палявая структура» [1, с. 58]. І сапраўды, кожная моўная сутнасць мае сваё тыповае праяўленне – так званы цэнтр поля, які ўтвараецца аптымальнай канцэнтрацыяй усіх прымет, уласцівых дадзенай катэгорыі. У накірунку ж да ўскраіны, да перыферыі, самабытнасць дадзенай катэгорыі памяншаецца, некаторыя з яе істотных прымет знікаюць, аднак з'яўляюцца іншыя, больш ці менш выпадковыя прыметы. Калі цэнтр служыць прадстаўленнем поля ў яго проціпастаўленні іншым палям, то на перыферыі адбываецца перакрыжаванне, узаемапранікненне палёў, нейтралізацыя значэнняў. Такім чынам, у моўным полі «захоўваецца самае галоўнае, што характарызуе палявую структуру: паўната і максімальная інтэнсіўнасць прымет у цэнтры структуры і іх разрэджанасць і аслабленне на перыферыі» [Там жа, с. 58–59]. Трэба дадаць, што магчымасць падыходу да мовы як да структурнага аб'екта з сістэмай сувязей і адносін паміж элементамі структуры засноўваецца «на прызнанні ўзаемаабумоўленасці функцыянальных і семантычных характарыстык адзінак мовы» [3, с. 36].

Лексіка-семантычны аспект фарміравання катэгорыі аб'ектнасці прадстаўлены наступнымі групамі.

1. Намінацыі, якія змяшчаюць сему адушаўлёнасці:

а) назвы чалавека (асобы): *Пытаецца казак* ***у дзеўкі,*** *// Скуль дарожанька ідзе* [2, с. 64]; *Прапалола дзеўка васілёчкі // Да й ажыдала* ***казачэнька*** *з поля* [2, с. 73]; *Няхай майго* ***маладога*** *// Ніхто не займае* [2, с. 100]; *Не ўсе тыя* ***дзевак*** *бяруць, // Што заляцаюцца* [2, с. 105]; *Сядзіць дзеўка ля ваконца // Ды* ***з казака*** *смяецца* [2, с. 107]; *Не дай мяне* ***за п'яніцу,*** *// После ж будзе жаль* [2, с. 131]; *Маці* ***зяця*** *не пазнала, // У хату не пазвала* [2, с. 134]; *Лепей мне* ***ў таткі,*** *чым мне* ***з нялюбым*** *// Увесь век жыці і гараваці* [2, с. 180]; *Устала Гэля, як бы не спала, // Абняла* ***Антося,*** *пацалавала* [2, с. 201]; *Дурная дзеўча, неразумная //* ***Па кавалеру*** *плача* [2, с. 119];

б) назвы жывёл, птушак: *Не пазволю я, сынок родненькі, // Тую* ***зязюлю*** *ўбіці* [4, с. 47]; *Я й* ***коніка*** *меў і ехаць хацеў* [2, с. 89]; *Як буду твая, // Напаю* ***каня*** *// З зімненькае крынічанькі* [2, с. 61]; *Ой, ты будзеш сеяць, араці, // А я буду* ***валы*** *паганяці* [2, с. 73]; *Сівенькі галубчык // Сядзеў на дубочку, // Кліча* ***галубочку*** [2, с. 54]; *А ці не відзелі, а ці не слышалі //* ***Галубку*** *маю?* [2, с. 98]; *Адлятае саколічак, адлятае, // Пакідае* ***сакаліну,*** *пакідае* [2, с. 410].

2. Намінацыі, якія не змяшчаюць сему адушаўлёнасці:

а) лексемы з канкрэтна-прадметным значэннем: *Сядзіць мамачка, сядзіць родная, //* ***Рушнік*** *вышывае, // А малодшы брат на парозе сеў, //* ***Ружжо*** *зараджае* [4, с. 46]; *Ой, вазьму я гостру* ***косу,*** *// Канопелькі скошу* [2, с. 121]; *Там дзевачкі часта хадзілі, // На ваду* ***вяночкі*** *насілі* [2, с. 201];

б) лексемы, якія абазначаюць адзенне, абутак: *Я зніму* ***парчу,*** *// Ножкі абвярчу, // А назад як павярнуся, //* ***Боцікі*** *куплю* [2, с. 61]; *Ды й памыла, ды й пакачала // Міламу* ***сарочку*** [2, с. 200];

в) лексемы, якія абазначаюць прадукты харчавання: *Пастой, пастой, мая Кася, // Дай каню* ***вады!*** [2, с. 61]; *Дзеўка* ***воду*** *бярэ, // Казак каня вядзе* [2, с. 64]; *Ой, выпіла* ***чарачку*** *для прыметы, // А майго мілага нету* [2, с. 94]; *Не еж* ***хлеба,*** *не пі* ***вады,*** *// Мая шчабятуха* [2, с. 105]; *Мусіў казак для дзяўчыны //* ***Жбан піва*** *купіці* [2, с. 113]; *Ах, люблю, люблю* ***мёд*** *салодзенькі, // Люблю малойца, хто малодзенькі* [2, с. 175];

г) лексемы, якія абазначаюць назвы цела чалавека: *Пад белым шатрочкам дзеўка стаяла, // Русую* ***касіцу*** *сваю часала* [2, с. 87–88]; *Я зніму парчу, //* ***Ножкі*** *абвярчу, // А назад як павярнуся, // Боцікі куплю* [2, с. 61]; *Скора міла прыбяжала, //* ***За ручэньку*** *падзяржала* [2, с. 73]; *Тады на цябе забуду, // Як* ***вочы*** *заплюшчу* [2, с. 105]; *Цераз рэчаньку, цераз быструю // Падай* ***ручэньку****, падай другую* [2, с. 109];

д) лексемы, якія называюць прыродныя аб'екты: *І каня я меў, і* ***сцежку*** *я знаў, // І маці пускала* [2, с. 89]; *Я* ***дарожку*** *размяту, // Сама к міламу пайду* [2, с. 82];

е) лексемы, якія абазначаюць назвы дрэў, раслін: *Прапалола дзеўка* ***васілёчкі*** *// Да й ажыдала казачэнька з поля* [2, с. 73]; *Гнула, гнула* ***вішаньку*** *не нагнула, // Да ўпала пад вішаньку дай заснула* [2, с. 94]; *Там мая дзяўчынанька // Ды й* ***пшанічку*** *поле* [2, с. 103]; *Яна поле, поле, //* ***Асот*** *выкідае* [2, с. 103]; *А толькі зламлю* ***вінаградачку*** *// Свайму татульку на парадачку* [2, с. 180];

ж) лексемы, якія называюць абстрактныя паняцці: *Дзевачка плача,* ***долю*** *праклінае* [2, с. 111]; *Ванька, Ваня, дружок мой, // Спадабаўся* ***розум*** *твой* [2, с. 131]; *Ой, пачуеш ды ты* ***навіначку*** *// Смутну, невясёлу* [2, с. 254]; *Журылася красная дзяўчоначка // Ды* ***па*** *свайму* ***гору*** [2, с. 323].

Акрамя таго, намі выяўлены выпадкі, калі ў ролі семантычнага аб'екта выступаюць не ўласна назоўнікі, а займеннікі (*хто/што* і іх дэрываты): *Дзеўча* ***таго*** *паслухала, // Села і паехала* [2, с. 327]; *Адвярніся, мілы, //* ***Цябе*** *я разую, //Да ў белае лічка // Сем раз пацалую* [2, с. 333]; *Ён* ***мяне*** *любіў, – // Хараша была* [2, с. 334]; *Я* ***цябе*** *любіў, //Я* ***цябе*** *кахаў* [2, с. 66]. Сустракаюцца выпадкі, калі семантычны аб'ект выражаны субстантываванай формай: *Няхай майго* ***маладога*** *// Ніхто не займае* [2, с. 100]; *Лепей мне ў таткі, чым мне* ***з нялюбым*** *// Увесь век жыці і гараваці* [2, с. 180]; *Каб майго* ***мілога*** *іншы не любілі* [2, с. 180].

Такім чынам, у мове беларускіх народных песень у ролі семантычнага аб'екта часцей за ўсё выступаюць імёны адушаўлёныя (перш за ўсё асабовыя), а субстантываты ў гэтых адносінах аказваюцца перыферыйнымі. Той факт, што намінацыі, якія змяшчаюць сему адушаўлёнасці, найбольш часта рэалізуюцца ў структуры сказа, тлумачыцца перш за ўсё экстралінгвістычнымі фактарамі. Галоўнай дзеючай асобай у песнях з'яўляецца, як правіла, жывая істота – чалавек, які пастаянна знаходзіцца ў пэўных зносінах з іншымі людзьмі. Таму чалавек можа выступаць не толькі ў якасці семантычнага суб'екта, але і ў якасці семантычнага аб'екта, на які накіраваны розныя дзеянні. Гэта абумоўлена і семантыкай разглядаемых намі народных песень (сямейна-бытавыя, песні пра каханне). Неабходна дадаць, што ў ролі адушаўлёнага аб'екта паралельна з чалавекам вельмі часта выступаюць назоўнікі, якія называюць птушак. Выкарыстанне вобразаў птушак з'яўляецца распаўсюджаным у фальклоры. Акрамя таго, у беларускіх народных песнях героі-суб'екты часта накіроўваюць свае дзеянні на канкрэтныя прадметы розных лексіка-семантычных груп.

Граматычным цэнтрам поля аб'ектнасці для выяўлення аб'ектнай семантыкі і найбольшай рэгулярнасці функцыянавання з'яўляецца прамое дапаўненне, у ролі якога выступаюць асабовыя, неасабовыя імёны і займеннікі ў вінавальным склоне без прыназоўніка: *Выжань свой* ***тавар****, // Што ад бацькі нагнала, // Тыя* ***авечкі****, // **Што** маці даравала* [4, с. 95]; *Яна ж* ***мяне*** *рано збудзіла, // А збудзіўшы – за вадой паслала* [4, с. 97]. Да перыферыі поля аб'ектнасці адносяцца іншыя спосабы прадстаўлення аб'екта ў структуры выказвання: *Выйдзі, сэрца, на ганачак, // Дай* ***каню вады****, // Дай* ***каню вады*** [2, с. 67] (давальны і родны

склоны); ***Мне*** *матуля прыказала, // Каб я* ***з хлопцам*** *не стаяла* [2, с. 67] (давальны і творны склоны); *Як успомню* ***аб дзяўчыне****, // Душа й сэрца баліць* [2, с. 225] (месны склон). Неабходна адзначыць, што функцыянальна-семантычнае поле аб'ектнасці, як і суб'ектнасці, не можа існаваць ізалявана. А. У. Бандарка сцвярджае, што «поле суб'ектнасці, з аднаго боку, перакрыжоўваецца з такімі палямі, як станавасць і персанальнасць, а з другога – з полем аб'ектнасці (перакрыжаванне тычыцца той сферы перыферыі суб'ектнасці, дзе яе прыметы сумяшчаюцца з тымі ці іншымі праяўленнямі аб'ектнасці). Магчымасць сумяшчэння прымет суб'екта і аб'екта ў адным і тым жа элеменце структуры сказа сведчыць аб тым, што пры выразным проціпастаўленні цэнтральных тыпаў суб'екта і аб'екта ў перыферыйных зонах поля суб'ектнасці проціпастаўленне "суб'ект – аб'ект" страчвае абсалютны характар, паміж суб'ектнасцю і аб'ектнасцю няма рэзкай мяжы» [5, с. 69].

Сінтаксічную катэгорыю аб'ектнасці мы разглядаем як структурна-семантычную з сістэмай значэнняў, што аб'ядноўваюцца ў адзінае, агульнае значэнне накіраванасці дзеяння, прыметы, адносін на аб'ект. Разнавіднасці аб'ектных адносін вычляняюцца ў адпаведнасці з моўнай семантыкай: у некаторых аб'ектных канструкцыях да асноўнага значэння накіраванасці дзеяння на аб'ект дадаюцца розныя адценні, якія характарызуюць і ўдакладняюць гэту накіраванасць, што дазволіла выдзеліць функцыянальныя тыпы аб'ектных адносін. Семантыка-сінтаксічная катэгорыя аб'ектнасці аб'ядноўвае, з аднаго боку, немаркіраваны, нейтральны тып – уласна аб'ект, з другога боку, тыпы, маркіраваныя пэўнымі адценнямі значэнняў. Кожная разнавіднасць аб'екта выражае асаблівы аспект абагульнення на ўзроўні сінтаксісу і вызначаецца па функцыянальных, абагульненых сэнсавых дадзеных. Трэба дадаць, што агульнае аб'ектнае значэнне ўстанаўліваецца шляхам абагульнення прыватных аб'ектных значэнняў. Члены аб'ектнай сістэмы супрацьпастаўлены членам іншых сістэм, якія выражаюць іншы тып сінтаксічных значэнняў, а паміж сабой (у межах адной сістэмы) знаходзяцца ў адносінах унутрыаб'ектных проціпастаўленняў. Прымета, па якой проціпастаўляюцца члены аб'ектнай сістэмы, з'яўляецца сэнсаадрознівальнай.

У беларускіх народных песнях катэгорыя аб'ектнасці прадстаўлена наступнымі групамі.

1. Уласна аб'ект. Значэнне непасрэднага фізічнага або псіхалагічнага ўздзеяння на аб'ект без якіх-небудзь дадатковых адценняў рэалізуюць словазлучэнні з дзеясловамі, семантыка якіх патрабуе распаўсюджання аб'екта ў пэўным склоне. Большасць з іх патрабуе вінавальнага склону прамога аб'екта: *Дзеўка з бору не выходзіць, //* ***Мухамор*** *яна знаходзіць* [2, с. 54]; ***Каня*** *варанога, //* ***Коніка*** *сядлае, //* ***Сядло*** *залатое // На яго ўскладае* [2, с. 55]; *Янка* ***коніка*** *паіў, // Маня* ***воду*** *чэрпала, // Люлі, люлі, люлі, // Маня* ***воду*** *чэрпала* [2, с. 59]; *Хлопцы* ***песню*** *пяюць // І паходам ідуць* [2, с. 64]; *Прапалола дзеўка* ***васілёчкі*** *// Да й ажыдала* ***казачэнька*** *з поля* [2, с. 73]. Іншыя дзеясловы праз свае марфалагічныя ўласцівасці або словаўтваральную структуру патрабуюць іншых ускосных склонаў: *Скора міла прыбяжала, //* ***За ручэньку*** *падзяржала* [2, с. 73].

2. Мысленчы аб'ект. Гэта аб'ект, на які накіравана думка, пачуццё або ўспрыняцце. Такі аб'ект магчымы пры дзеясловах і назоўніках, звязаных з дзейнасцю інтэлекту, што надае такім словазлучэнням некалькі своеасаблівы характар. Мысленчыя адносіны ў словазлучэннях абумоўлены выключна лексіка-семан-

тычным значэннем галоўнага слова. У гэтай групе аб'ядноўваюцца наступныя прыватныя значэнні, пашыраныя ў тэкстах песень: аб'ект маўлення і паведамлення (*Распытаюся**,** разгукаюся // **Аб жыцці-быцці** яго* [2, с. 58]; *Распытаюся **пра здаровейка** яго* [2, с. 58]; *Як стаялі, так стаяць, // **Пра матушку** гавараць* [2, с. 82]); аб'ект мыслення і пазнання: (*Я **на цябе** // Не забуду, // Пакуль век жыва буду!* [2, с. 403]; *Я й сама **тое** знаю* [2, с. 129]); аб'ект пачуццяў (***На красу** сваю любавалася* [2, с. 48]; *Я **па табе** скучыла, // Мой міленькі дружок* [2, с. 81]; *А **на** свайго **міленькага** // Зажурылася* [2, с. 84]; *Салавей пяе у клетцы, // Плача маладзец **па дзеўцы*** [2, с. 191]; ***Над табою**, дзяўчыначка, // Казак насмяецца* [2, с. 326]; *А я, маладзенька, **па ём** журуся* [2, с. 375]); аб'ект успрыняцця (***На цябе**, мой міленькі, // Не нагляджуся* [2, с. 82]; *А ўстань, устань, мілая, дай прачніся, // **На** маю **калясачку** падзівіся* [2, с. 94]; *А ці відзелі, а ці вы слышалі // **Галубку** маю?* [2, с. 98]). Найбольш частотнымі формамі выражэння залежнага кампанента ў сінтаксічных канструкцыях з такім значэннем з'яўляюцца вінавальны і месны склоны.

3. Аб'ект-адрасат. Аб'ектные адносіны з адценнем прызначэння і адрасата звязаны са спецыфікай функцый давальнага склону. У адзінкавых выпадках у мове беларускіх народных песень для рэалізацыі гэтага аб'ектнага значэння выкарыстоўваецца родны склон з прыназоўнікам *для*. У даны разрад аб'ектных адносін аб'ядноўваюцца наступныя значэнні: дзеянне ажыццяўляецца на карысць аб'екта (*Пастой, пастой, дзяўчыначка, // Дай **каню** вады* [2, с. 60]; *Не псуй слёзачкамі лічка, – // Куплю **табе** чаравічкі, / Насі здарава* [2, с. 183]; *Мусіў казак **для дзяўчыны** // Абедаць прынесці* [2, с. 113]); дзеянне ажыццяўляецца на шкоду аб'екта (*Да другое ходзіш, // З другою гаворыш, // А **мне**, маладзенькай, // Няславаньку робіш* [2, с. 277]); уласна адрасатнае (*Там, у зялёненькім садочку / Казак **дзяўчыне** гаварыў* [2, с. 90]; *Ах, прыбіраўся, да **ўсім** скланяўся: // **Айцове**, **матулі**, а сваёй **мілай**, // А сваёй **мілай**, а чарнабровай, // Ох, да найніжай ён скланяўся* [2, с. 278–279]; *Мілы да другой ідзе, // **Сабе** песеньку пяе* [2, с. 279]). Форма давальнага склону ў такіх канструкцыях з'яўляецца тыповым фармальным паказчыкам данага значэння.

4. Аддзяляльны аб'ект. Залежнасць семантыкі аб'ектных словазлучэнняў ад формы склону кіруемага кампанента асабліва яскрава праяўляецца ў словазлучэннях са значэннем пазбаўлення, удалення і г.д.: *А мамачка, мамачка, нябога, // Знімі мяне **з камушка** з бялога* [2, с. 50]; *Напаю каня // **З** зімненькае **крынічанькі**, // **З** поўнага **вядра*** [2, с. 61]; *Зляці, салавейка, // **З дрэва** высокага* [2, с. 93]. Такі аб'ект выражаецца родным склонам.

5. Суправаджальны аб'ект. У такіх канструкцыях аб'ект, як правіла, суправаджае дзейнасць суб'екта і выражаецца формай творнага склону: *А як жа мне поўнай быць, // **З бераж**камі** роўнай плыць?* [2, с. 59]. Праз форму творнага склону ў беларускіх народных песнях можа перадавацца значэнне ўдзельніка дзеяння, якое ажыццяўляе суб'ект (*Стопчаш боцікі казловенькія, // **З дзеўкамі** танцуючы* [2, с. 90]; *Сама не знаю, // **З кім** жыці маю* [2, с. 95]; *Лепш у татулькі // Горы капаць, // Чым **з** благім **мужам** // Век гараваць* [2, с. 179]; *А **з** любай **жаной** вячэрачка смачна* [2, с. 218]), або значэнне ўзаемнасці дзеяння (*Мне матуля прыказала, // Каб я **з хлопцам** не стаяла* [2, с. 67]; *А я маці не баюся, // А я **з табою** ажанюся* [2, с. 91]; *Ой, не піў бы я і не еў бы я, // **З** харошаю **дзяўчыначкай** // Пасядзеў бы!* [2, с. 70]).

6. Аб’ект дасягнення. Залежнае слова ў такіх канструкцыях абазначае аб’ект, да якога накіравана дзеянне, але які на самой справе не ахоплены дзеяннем: *Праміж гарою // Казак за ёю // Сівым, сівым конічанькам // Едзе* ***за ёю*** [2, с. 70]; *Прахадзіла ўсю цёмну ночку, // Прыблудзіла* ***к*** *зялёнаму* ***дубочку*** [2, с.74]; *Аддай, мамачка, аддай, родная, //* ***За каго*** *я хочу* [2, с. 89]; *Ой, прыблудзіла красна дзеўка //* ***К*** *круту* ***берагу*** [2, с. 92]; *Адзін ўража не лажыўся, //* ***За мной*** *ночку валачыўся* [2, с. 150].

7. Аб’ект сродку дзеяння. Гэта значэнне непасрэдна звязана з семантыкай залежнага кампанента. Назоўнікі маюць канкрэтнае лексічнае значэнне: яны абазначаюць прадмет, які служыць сродкам пасціжэння прамога аб’екта, і ўжываюцца пры дзеясловах пэўнага кола ў выніку неабходнасці развіць дзеяслоў шляхам указання на сродак, з дапамогай якога ажыццяўляецца дзеянне: ***Чым*** *цябе лячыць, дачушка, // І дзе цябе дзеці?* [2, с. 56]; *Ён мяне любіў, я яго прынадзіла, // Я яго прынадзіла русаю* ***касою****, // Русаю* ***касою****, дзявочай* ***красою*** [2, с. 58]; *Конік ваду п’е, //* ***Капытцам*** *грабе* [2, с. 62]; *На ганачку стаяла, //* ***Бровачкамі*** *маргала* [2, с. 74]; *Яна умывала бела сваё ліца // Крынічнай* ***вадой*** [2, с. 98]; *Яна расчасала сваю русу косу // Частым* ***грэбянём*** [2, с. 92]; *Там арала дзяўчыніца //* ***Канём*** *вараненькім* [2, с. 113]; *Кінуў* ***платочкам*** *– не дастаў, // Кінуў* ***яблычкам*** *– не ўлучыў* [2, с. 110]. Найбольш частотная форма выражэння такога аб’екта – творны склон без прыназоўніка, аднак у песенных тэкстах сустракаецца аб’ект са значэннем сродку дзеяння ў форме меснага склону з прыназоўнікам *на*: *Гой, гой, // Едзе міленькі мой //* ***На*** *шэрым* ***канёчку****, //* ***На*** *шэрым* ***канёчку*** [2, с. 58].

8. Аб’ект-крыніца. Гэта значэнне характэрна для тых выпадкаў, калі аб’ект выступае як матэрыял, аснова для іншага аб’екта. Аб’ект-крыніца і аб’ект сродку дзеяння вельмі блізкія па сваёй семантыцы. Часцей за ўсё аб’ект-крыніца выражаецца формай роднага склону з прыназоўнікам *з*: *Сашы мне шляхрочык //* ***З*** *макавага* ***цвету*** [2, с. 72].

9. Аб’ект адсутнасці. Такое значэнне вынікае з адмоўнай формы дзеяслова: *А я, бедна, гарую, // А* ***без дроў, без дроў, //*** ***Без лучыначкі*** *// Цёмну ночку начую* [2, с. 344]; *Нашто мяне пытаеш, // Калі* ***хаты*** *не маеш* [2, с. 151]. Родны склон – асноўны носьбіт адзначанай семантыкі.

10. Распазнавальны аб’ект. Словаформа з такім значэннем, як правіла, ужываецца ў месным склоне з прыназоўнікам *па*. Аднак аб’ект такога тыпу ў мове народных песень прадстаўлены зрэдку: *То я свайго міленькага //* ***Па шапцы*** *пазнала* [2, с. 57]; *Дзе мой мілы запяе – //* ***Па голасу*** *ўзнаю* [2, с. 58].

Сярод адзначаных аб’ектных значэнняў у мове беларускіх народных песень цэнтральнае месца ў функцыянальна-семантычным полі аб’ектнасці займаюць уласна аб’ект, аб’ект-адрасат і аб’ект сродку дзеяння. Зрэдку функцыю аб’екта выконвае не назоўнік або займеннік, а інфінітыў (так званы аб’ектны інфінітыў): *Я свайго міленькага // Цераз Дунай відзела, // Верна слова мовіла, //* ***Жаніцца*** *пазволіла* [2, с. 282].

Такім чынам, паміж сінтаксічнай і семантычнай уласцівасцю моўных з’яў маецца двухбаковая залежнасць. Для рэалізацыі кожнага з відаў аб’ектных адносін выкарыстоўваецца свой комплекс сродкаў: ужываюцца пэўныя лексіка-семантычныя групы дзеясловаў, аб’ект выражаны пэўнай склонавай формай, акрэслена кола магчымых прыназоўнікаў. Адзін з такіх сродкаў з’яўляецца вырашальным, асноўным і служыць паказчыкам якога-небудзь тыповага аб’ект-

нага значэння. Прасочваецца выразная ўзаемасувязь паміж унутраным, змястоўным бокам сінтаксічных канструкцый – іх семантыкай, і знешнім – спосабам выражэння ўласцівых ім значэнняў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Норман, Б. Ю.* Язык: знакомый незнакомец / Б. Ю. Норман – Минск : Высш. шк., 1987. – 222 с.
2. Песні пра каханне / пад рэд. А. С. Фядосіка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.
3. Семантико-функциональные поля в лексике и грамматике : межвуз. сб. науч. тр. – Л., 1990. – 132 с.
4. Сямейна-бытавыя песні / Склад. І. К. Цішчанка ; склад. муз. часткі Г. В. Таўлай ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 752 с.
5. Теория функциональной грамматики. Субъектность. Объектность. Коммуникативная перспектива высказывания. Определенность / неопределенность // редкол.: А. В. Бондарко (отв. ред.) [и др.]. – СПб. : Наука, 1992. – 304 с.

УДК 81’374.2=133.1=161.3

В. У. Фурс (Мінск)

ДЭШЫФРАЦЫЯ ФРАНЦУЗСКІХ АБРЭВІЯЦЫЙ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ: З ВОПЫТУ ЎКЛАДАННЯ СЛОЎНІКА

Утварэнне скарачэнняў і абрэвіятур розных тыпаў з’яўляецца адным з найбольш прадуктыўных спосабаў словаўтварэння; з часам іх колькасць у мове павялічваецца. Гэта звязана як з універсальным моўным законам эканоміі сродкаў, так і са спецыфікай сучаснай інфармацыйнай прасторы, перанасычанай фактамі, з’явамі, лексічнымі адзінкамі. Хуткасць перадачы інфармацыі адыгрывае ў XXI стагоддзі надзвычай важную ролю, асабліва з улікам няспыннай эвалюцыі спосабаў і сродкаў камунікацыі. Акрамя таго, даследчыкамі заўважана станоўчая роля абрэвіятур у эканоміі энергіі гаворачага і слухаючага як пры спараджэнні, так і пры атрыманні інфармацыі [7, s. 430]. Апошняя заканамернасць выконваецца толькі пры ўмове, што рэцыпіенту добра знаёмае тое скарачэнне, з якім ён сутыкаецца. Менавіта таму вельмі важнай рысай абрэвіятур з’яўляецца даступнасць і агульназразумеласць, што забяспечваецца праз наяўнасць адпаведных лексікаграфічных выданняў. Для беларускага мовазнаўства вывучэнне абрэвіяцый у розных аспектах іх функцыянавання таксама з’яўляецца актуальнай задачай, што адзначана ў даследаваннях А. А. Лукашанца [4], Ю. М. Кардубан [2], Л. Сегень [7] і іншых.

Маладасследаваным, але надзвычай цікавым з’яўляецца пытанне міжмоўнай эквівалентнасці абрэвіятур. У 2016–2020 гг. падчас удзелу ў навукова-даследчай працы “Міжмоўная эквівалентнасць уласных і запазычаных абрэвіяцый і скарачэнняў у французскай і беларускай мовах” у складзе часовага навуковага калектыву супрацоўнікаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі пад кіраўніцтвам к.ф.н., дацэнта А. А. Завадскай (МДЛУ) мы мелі магчымасць на канкрэтным моўным матэрыяле ўбачыць спецыфіку лексікаграфічнай дэшыфрацыі іншамоўных актыўных абрэвіяцый і скарачэнняў сродкамі беларускай мовы.

Мэтай нашай даследчай дзейнасці з’яўлялася ўкладанне “Французска-беларускага слоўніка скарачэнняў”. У якасці базавых крыніц былі абраныя наступныя выданні: В. Когут “Большой словарь сокращений в современном французском языке: более 9000 сокращений” [3], С. Савончик “Французско-русский словарь сокращений” [6]. Для ўніфікацыі з наяўнай беларускай моўнай практыкай выкарыстоўваліся “Руска-беларускі слоўнік скарачэнняў: у 2 т.” [5] і “Англійска-беларускі слоўнік скарачэнняў” Ю. Кардубан [1].

У даследаванні, прысвечаным функцыянаванню французскіх абрэвіятур, А. П. Шапавалава адзначае, што паводле спосабаў перакладу на рускую мову (што ў вялікай ступені справядліва і для перакладу на беларускую) абрэвіятуры падзяляюцца на тыя, якія перакладаюцца праз наяўныя ідэнтычныя рускія скарачэнні (звычайна гэта міжнародныя федэрацыі, камітэты, арганізацыі) і тыя, дзе кожны кампанент перакладаецца з дапамогай слоўніка (адзначаецца шмат складанасцей пры перакладзе тэрмінаў) [8, с. 23]. Укладанне правай часткі словаспіса французска-беларускага слоўніка скарачэнняў сродкамі беларускай мовы дазволіла ўбачыць, што адзінак другога тыпу значна больш, чым інтэрнацыяналізмаў. Такім чынам, толькі невялікая колькасць скарачэнняў знайшла свае адпаведнікі ў беларускай мове, астатнія перакладаліся паслоўна. Падчас лінгвістычнай апрацоўкі моўнага матэрыялу выявіліся некаторыя тэндэнцыі, тыповыя для французскай мовы ў адрозненне ад беларускай.

1. **Скарачэнні ўласных імёнаў:**

Sarco *Nicolas Sarcozy, président de la France (2007–2012)* – Нікаля Сарказі, прэзідэнт Францыі (2007–2012);

VGE *Valérie Giscard d'Estaing, président de la France (1974–1981)* – Валеры Жыскар д'Эстэн, прэзідэнт Францыі (1974–1981).

2. **Скарачэнні для медыцынскіх і калямедыцынскіх паняццяў,** у тым ліку назвы не вельмі пашыраных хвароб:

FMH *Fédération des Malades et Handicapés* – Федэрацыя хворых і асоб з разумовымі і фізічнымі недахопамі;

SCC *Syndrome du Canal Carpien* – сіндром запясцевага канала.

3. **Скарачэнні для этыкетных формул і шаблонаў:**

SBAM *Sourire-Bonjour-Au-revoir-Merci* – усмешка-прывітанне-да пабачэння-дзякуй;

TSVP *Tournez, S'il Vous Plaît* – глядзі(це) на абароце; перавярні(це), калі ласка;

TVB *[tevebe] Tout va bien* усё ідзе нармальна, усё ў парадку.

4. **Скарачэнні для наймення груп асоб:**

VMEH *visiteurs des malades dans les établissements hospitaliers* – наведвальнікі (хворых) у бальніцах;

CTS *consorts* – іншыя абвінавачаныя.

5. **Скарачэнні для ўстаноў, звязаных з рэчамі, якім у Францыі надаецца надзычайная ўвага** (віно і культура яго спажывання; кава і какава):

INVO *Institut national des vins d'origine* – Нацыянальны інстытут марачных вінаў;

VCC *vin de consommation courante* – віно шырокага спажывання;

VDPCE *vin de divers pays de la communaute europeenne* – віно з розных краін Еўрапейскай супольнасці;

VQPRD *vins de qualité produits dans des régions déterminées* – віны найвышэйшай якасці, вырабленыя ў пэўных раёнах;

IRCC *Institut de recherche sur le café et le cacao* – Навукова-даследчы інстытут кавы і какавы.

6. **Скарачэнні для ўстаноў, аналагаў якім не існуе ў Беларусі,** паколькі аб'ектам вывучэння не надаецца такая пільная ўвага:

FNDVA *Fonds National pour le Développement de la Vie Associative* – Нацыянальны фонд развіцця грамадскага жыцця насельніцтва;

SDTB *Société pour le Développement des Techniques Bancaires* – Таварыства развіцця тэхнікі банкаўскіх аперацый.

7. **Скарачэнні для абазначэння спецыфічных (жартоўных) рэалій ці падзей:**

FLNJ *Front de Libération des Nains de Jardins* – Фронт вызвалення садовых гномаў. Гэта "Таемнае таварыства", якое складаецца з вясёлых маладых людзей, якія лічаць за прыемнае выкрадаць садовых гномаў (керамічныя або пластыкавыя статуэткі, якія прадстаўляюць герояў германскіх казак і легенд і выкарыстоўваюцца для ўпрыгожвання садоў) у краіне і за мяжой. "Вызваляюць іх", размясціўшы на ўскрайку лясоў, на пустках, у грамадскіх парках і г.д.

8. **Вялікая колькасць скарачэнняў для лакальных, рэгіянальных аб'яднанняў і ўстаноў:**

VALUVAL *valorisation de l'universite de valenciennes* – павышэнне прэстыжнасці універсітэта Валансьена;

TCL *Transports en Commun Lyonnais* – Ліёнскі грамадскі транспарт;

TNM [teɛnɛm] *Théâtre National de Marseille* – Марсельскі нацыянальны тэатр.

9. **Некаторыя скарачэнні маюць шмат розных значэнняў, тады іх пераклад робіцца асабліва складаным:**

FD *Faculté de Droit* – юрыдычны факультэт; *Faits Divers* – рознае (пра падзеі ў газетах і часопісах); *Fausse Déclaration* – няправільная (ілжывая) падатковая дэкларацыя; *Film Documentaire* – дакументальны (кіна)фільм; *Forêt Domaniale* – дзяржаўны лясны запаведнік; *Frais divers* – іншыя выдаткі; розныя выдаткі; *Frais de Douane* – мытныя выдаткі; *Fraude Douanière* – парушэнне мытнага рэжыму; кантрабанда.

Часам адно і тое ж слова з французскай мовы перакладаецца рознымі адпаведнікамі на беларускую, напрыклад, французскае *Société* – адпаведна *кампанія*, *таварыства*, *прафсаюз*:

SERS *Société d'aménagement et d'Équipement de la Région de Strasbourg* – кампанія па ўладкаванні і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні Страсбурга і яго ваколіц;

Société Européenne des Satellites – Еўрапейскае таварыства касмічных спадарожнікаў;

Syndicat de l'Enseignement Supérieur – прафсаюз работнікаў вышэйшай адукацыі.

Атрыманыя намі высновы карэлююць з меркаваннем А. П. Шапавалавай, што ступень распаўсюджанасці скарачэнняў у розных сферах не аднолькавая, "у большай колькасці яны прысутнічаюць у грамадска-палітычнай лексіцы (найменні партый, прафсаюзных, грамадскіх і іншых арганізацый, таварыстваў і інш.)" [8, с. 36]. Даследчыца тлумачыць значную распаўсюджанасць менавіта гэтых тэматычных груп лексікі, звязваючы гэта найперш з газетным стылем, вельмі важным для французскай культуры, які часта спараджае скарачэнні ці дае ім новае жыццё [Там жа, с. 38].

Багаты моўны матэрыял, які стаў асновай "Французска-беларускага слоўніка скарачэнняў", можа быць выкарыстаны для далейшых мовазнаўчых даследаванняў. Дэшыфрацыя скарачэнняў з'яўляецца як нетрывіяльным выклікам для лінгвіста, так і карысным інструментам авалодвання мовай і разумення культурных рэалій для ўсіх зацікаўленых.

ЛІТАРАТУРА
1. *Кардубан, М. Ю.* Англійска-беларускі слоўнік скарачэнняў / Ю. М. Кардубан. – Мінск : Тэхналогія, 2010. – 192 с.
2. *Кардубан, Ю. М.* Асновы перадачы англійскіх складанаскарочаных слоў на беларускую мову / Ю. М. Кардубан. – Мінск : МДЛУ, 2009. – 31 с.
3. *Когут, В. И.* Большой словарь сокращений в современном французском языке : более 9000 сокращений / В. И. Когут – М. : СПб. : Центрполиграф, 2008. – 620 с.
4. *Лукашанец, А. А.* Складанаскарочаныя словы ў сістэме беларускага словаўтварэння / А. А. Лукашанец // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія. – 1995. – № 2. – С. 26–31.
5. Руска-беларускі слоўнік скарачэнняў : у 2 т. / Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 2 т.
6. *Савончик, С. С.* Французско-русский словарь сокращений французского языка = Dictinnaire franco-russe des abreviations françaises / С. С. Савончик. – Орёл : Тип. «Труд», 2014. – 1028 с.
7. *Сегень, Л.* Пытанні абрэвіяцыі ў сучаснай беларускай мове / Л. Сегень // Białorutenistyka białostocka. – Białystok, 2011. – Т. 3. – S. 429–441.
8. *Шаповалова, А. П.* Опыт построения общей теории аббревиации (на материале французских сокращений лексических единиц) : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.19 / А. П. Шаповалова. – Нальчик, 2004. – 46 с.

УДК 378.147:811.161.1’342.9(045)

Чжао Синь (Пекин, КНР)

МЕТОДИЧЕСКИЕ ПРИЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ НАВЫКА РИТМИЧЕСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ РУССКОГО СЛОВА

В статье рассматривается один из трудных аспектов в процессе обучения русскому языку в китайской аудитории – формирование навыка ритмической организации русского слова; причина возникновения таких трудностей для китайских студентов и методические приемы их преодоления.

Фонетика русского языка представляет значительные трудности для китайских учащихся, и этой проблеме следует на занятиях по русскому языку уделять особое внимание. Ритмическая организация русского слова при обучении произношению китайских учащихся – одна из центральных тем корретировочного курса фонетики.

Русская ритмика слова имеет особое своеобразие и отличается от ритмики слова в других языках благодаря подвижности и разноместности ударения, а также многосложности структурной организации русских слов [1, с. 145]. О. А. Артемова в своей работе пишет: «...известно, что на основе свойств русского ударения быть подвижным и разноместным и в связи с многосложной структурой слов в русском языке, можно выделить большое количество ритмических моделей. Число этих моделей зависит от фонетической структуры слова: наличия энклитик, проклитик, ударности/безударности служебных слов, произношения различных групп слов, связанного с интонацией и синтагматическим членением речи» [Там же].

Например:

«*часов в пять*

3 1

[ч’исоф_пˈат'] и часов / в пять; [чˈисоф/ф пˈатˈ]

3 3 2

(брат_и_сестра) [брат_ы_с 'истра)] брат / и / сестра; [брат/ и/ сˈистра]

облачность без_ осадков [облачˈнъстˈ б 'ъзлсаткьф]

3 3 2

облачность / без / осадков[облачˈнъстˈ/ бˈэс/асаткъф] и. т.д.».

Нарушения ритмики слова в речи могут быть вызваны разными причинами.

1. Недостаточностью мускульного напряжения при произношении ударного слога (характерно для носителей языков фиксированным ударением).

2. Заменой напряженности ударного слога длительностью (характерно для носителей языков, где фонологически различаются долгие и краткие гласные).

3. Неправильной артикуляцией безударных гласных, более сильным выдохом при произношении безударных гласных.

4. Ритмическая организация родного языка на определенном участке фонетической системы – беднее изучаемого. В этом случае носители языка не будут слышать всех различий, имеющих место в изучаемом языке. Например, представители языков с фиксированным ударением будут нарушать ритмику русского слова, стремясь к постоянному месту ударения (поляки будут перетягивать ударение на предпоследний слог, французы на последний и т.д.). Таким образом, восприятие и произношение различных ритмических структур в русском языке представителями этих языков будет нарушено [1; 2].

Из выше перечисленных причин нарушения ритмики русского слова не трудно понять и причины нарушений ритмики русского слова китайскими учащимися. Так как китайский и русский языки относятся к разным языковым семьям, у них разные фонологические системы, например: в русском языке допускается разная последовательность согласных звуков в слоге, а в китайском языке невозможно сочетание согласных в пределах одного китайского слога; русскому языку присуще ударение, а в китайском языке тон. Тоны в китайском языке фиксированые. В путунхуа (китайский литературный язык) имеется 5 разновидностей тона; первый (ровный), второй (восходящий), третий (нисходяще-восходящий), четвертый (нисходящий), пятый (легкий тон). Тон выполняет смыслоразличительную функцию. В путунхуа один и тот же слог может быть прочитан минимум четырьмя способами. Тоны путунхуа имеют небольшие различия по долготе звука. Обычно третий тон является самым длительными, а четвертый – самым коротким, первый и второй тон по долготе находятся между третьим и четвертым. Слоги в китайском языке очень короткие, максимум 3 гласных вместе, но тон падает только на гласный, который первый по порядку в алфавите. Например, в китайском языке 6 гласных звуков: [a o e i u ü]. Если в одном слоге есть 2 гласных [a] и [o], то тон падает на звук [a], если рядом звуки [i] и [e], то тон падает на [e]. При этом слог без тонов не меняет своего произношения, т.е. редукция гласных отсутствует в китайском языке.

Приведем пример: *chuāng, chú, chóu* Слог *[u](произносится как русское [у]) под тоном или без тона, слоги перед тоном или после тона, произносятся одинаково, и тон падает на звук слога строго по порядку в алфавите. как уже упомянулось выше.*

Так как в китайском языке, по сравнению с русским, все слоги короткие, необходимо в китайском языке правильно и четко прозизносить каждый слог. Приведем пример: в китайском языке у одного иероглифа максимум 2 слога: [*chuang*] (*chu-ang*). Здесь и слог [*u*] который без тона и слог [*ang*] под тоном нужно произносить полностью, не сокращая.

Таким образом, нарушения, которые возникают при обучении ритмике русского слова у китайсих учащихся, можно разделить на две *группы*.

Первая группа: произношение ударного гласного. Здесь наблюдаются следующие нарушения:

а) изменение места ударения, стремление к фиксированному ударению;

б) изменение ударного гласного по степени интенсивности, длительности и тону.

Вторая группа: изменение длительности русских редуцированных гласных в сторону их увеличения или уменьшения, изменение качества гласных в различных фонетических позициях слова.

Для исправления таких ошибок в учебных изданиях предлагаются всевозможные упражнения, которые направлены на формирование навыка ритмической организации русского слова (см., например, [3; 4]).

Мы предлагаем следующие упражнения.

I. Произношение ударных гласных полного образования в односложном слове. Модель [та́т].

1. Слушайте и повторяйте:

[а] – бак, дал, жар, лак, нас, пар, раб, там, цап, шаг;

[о] – бок, гол, дом, жён, зоб, кон, пол, фон;

[у] – бук, гул, дуб, кум, луж, пуд, рук, фут, худ, цуг;

[ы] – бык, дыр, лыж, пыж, рык, сын, тын, шип;

[е] – бег, дел, деть, медь, пел, сер, сечь, тень, тем, хек, чек, щец;

[и] – бил, гид, кит, лик, пик, рис, чин, щит;

2. Читайте следующие предложения с правильным ударением.

А. Он мой сы́н. Вот наш са́д. Там мой сто́л. Тот стул мо́й. Твой друг ту́т. Тот дуб ста́р. Он нас зва́л.

Б. Да́й мне тот шар. Мой брат взял но́ж. Наш дом был пу́ст. Здесь был мой сы́н. Ваш друг звал ва́с. Весь сыр ешь са́м.

II. Ритмика 2–3-сложных слов; длительность ударных и безударных гласных; произношение безударных гласных [ʌ], [ъ]. Переключение органов речи с одних артикуляций на другие между слогами с гласными разного качества. Модель [тʌ-та́].

Слушайте и повторяйте:

а) вода́, вола́; дома́, дала́; мала́, моя́; оса́, она́, Ока́; бока́, пажа́, паша́, пока́, фата́;

б) ага́т, база́р, бара́н, бога́т, зака́з, наза́д, сказа́л, шага́л;

в) брала́, врага́, права́, стака́н, слаба́, страна́, строка́, трава́;

г) ботва́, бахча́, война́, одна́, окна́, пошла́, парча́, тоска́, толпа́;

д) Байка́л, вокза́л, карма́н, позва́л, трамва́й.

III. Модель [ʌ-тʌ-та́] – тренируются те же явления, что и в предыдущей модели, на материале трехсложных слов с неприкрытым начальным слогом.

Слушайте и повторяйте:

а) Абака́н, аппара́т, арома́т, Арара́т, ороша́л, окопа́л;

б) адмира́л, адреса́т, аспира́нт, обвиня́л, обеща́л;

в) адвока́т ͡отказа́л. Аспира́нт ͡опозда́л. Отобра́л ͡автома́т. Осветѝл ͡аппара́т. Основной ͡аргумент.

IV. Модель [та́-тʌ(ъ)] – тренируются те же явления, что и в модели [тʌ-та́], но с иным соотношением долгого и краткого слогов.

Слушайте и повторяйте:

а) А́да, а́за, ба́ба, жа́ба, за́да;

б) Ма́йка, ма́рта, ма́сло;

в) Та́рса, тра́вма, тря́ска;

г) Па́пка ͡бра́та. Ва́ша ͡ча́шка. На́ша ͡ма́ма. О́ба ͡дру́га. Па́чка ͡ма́сла.

Э́то бы́ло про́сто. А́ла мы́ла сы́на. Ма́ша вста́ла ра́но. Э́то ка́рта ми́ра. Э́то ва́ша ма́рка.

V. Модель [та́-тът] постановка безударного гласного [ъ]. Противопоставление по длительности ударного и заударного слогов.

Слушайте и повторяйте:

а) вы́бор, вы́вод, вы́воз, вы́пад, ды́рок, лы́жах, ры́нок;

б) ве́дал, бе́лок, де́лал, ле́том, се́ктор,

в) го́мон, до́мом, по́вод, ро́бот, ро́пот, ше́пот.

VI. Модель [та́-тъ-тът][та́-ть-тʌ(ъ)] – закрепление артикуляции безударного гласного [ъ] и противопоставления по длительности ударного и заударных слогов:

а) вы́боров, вы́водок, вы́водов, вы́говор, вы́дохом;

б) бе́дствовать, ве́домость, де́йствовать, ле́вого, не́водов, ре́ктором;

в) за́пад – за́пада, за́пах – за́паха, гра́мот – гра́мота;

г) то́пот – то́пота, ко́смос – ко́смоса, хо́лод – хо́лода.

VII. Модель [тʌ-та́-тът] сопоставление редуцированных гласных[ʌ]-[ъ].

Читайте и повторяйте:

а) ары́ком, баты́ром, запла́ывом, засы́пан, копы́том, рассы́пан;

б) блокно́тов, ваго́нов, гормо́нов, фасо́но;

в) кварти́ра‿с‿парке́том, кварти́ра‿с‿балко́ном,авто́граф‿напи́сан‿арти́стом, програ́мма‿с‿портре́том .

VIII. Модель [тъ-тʌ-та́(т)] – сопоставление гласных двух степеней редукции в пределах слова. Три степени длительности слога в трехсложном слове.

Читайте и повторяйте:

а) бараба́н, борона́, борода́, багажа́, полоса́, показа́л, покара́ть;

б) полотна́ – плотна́, паровоз – провоз, парохо́д – прохо́д.

IX. Редукция гласного [э]после твердых согласных: произношение безударных гласных [ыᵊ],[ъ]; различение ударного и безударных слогов по длительности; повторение артикуляции твердых согласных [ж]-[ш]-[ц].

Читайте и повторяйте:

а) шесты́, шесты́х, шепну́ть, шеде́вр; Шелко́вица, шелкови́чный, шелкови́стый;

б) жены́, жела́нье, жесто́кий, жемчу́жный; боже́ство пожале́ть, пожела́й, пожева́ть; доро́жек, мо́жет, помо́жет, расска́жет, ска́жет, све́жесть, сте́ржень, тя́жесть;

в) це́на, це́нность, це́ль, цепо́чки, це́рковь, це́х.

Таким образом, все выше перечисленные типы моделей по ритмике отражают главную особенность ритмических моделей русского слова. Надеемся, что наши предложенные упражнения помогут китайским студентам сформировать правильную ритмическую организацию русского слова.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Артемова, О. А.* К вопросу о ритмике русского слова в связи с обучением произношению нерусских // Язык, сознание, коммуникация : сб. ст. / ред. В. В. Красных, А. И. Изотов. – М., 1999. – Вып. 10. – С. 145–149.

2. *Битехтина, Н. Б.* Русский язык как иностранный: фонетика : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений, обучающихся по направлению 050300 Филол. образование / Н. Б. Битехтина, В. Н. Климова. – М. : Рус. яз. Курсы, 2011. – 126 с.

3. *Логинова, И. М.* Автоматизация навыков произношения русского слова : учеб. пособие для иностр. студентов-филологов I курса / И. М. Логинова. – М. : УДН, 1981. – 71 с.

4. *Щукин, А. Н.* Практическая методика обучения русскому языку как иностранному : учеб. пособие / А. Н. Щукин. – М. : Флинта, 2018. – 327 с.

УДК [811.161.3+811.112.2’37](045)

Т. Ф. Шубич (Минск)

ЗНАЧЕНИЕ ЭТНОНИМОВ В БЕЛОРУССКИХ И НЕМЕЦКИХ ФРАЗЕОЛОГИЧЕСКИХ ЕДИНИЦАХ

Статья освещает вопросы использования этнонимов в составе фразеологических единиц, которые представляют особую языковую значимость. Этнонимы заключают в себе исторические и лингвистические элементы развития языка. В статье представлен анализ типологической классификации этнонимов на примере белорусского и немецкого языков. Описаны основные стереотипы этнического характера, существующие в современных белорусском и немецком языках. Рассмотрены факторы, влияющие на положительную или негативную коннотацию в отношении к представителям других народов.

Фразеологические единицы, в состав которых входят этнонимы, вызывают особый интерес лингвистов, историков, географов, социологов. Они сохраняют и являются прямым историческим свидетелем развития языка и народа, взаимосвязей и отношений к другим языкам и народностям, особенностей восприятия представителей этнической группы как себя, так и других народов. Благодаря своей устойчивости и консервативности они заняли свою нишу в современной языковой парадигме.

По утверждению В. А. Никонова, в этнонимах, которые представляют собой названия народов, племен и родов, даже далеко живущих, прослеживается типологическая закономерность, связанная с образом жизни и направлением хозяйствования народа. Самый первый семантический тип этнонимов представлен самоназваниями, обозначающими своих в противоположность всем не своим, чужим [3]. Они несут в себе отличительную черту, характеристику, которые не всегда соответствуют действительности, но при этом сохраняют историческую обусловленность. Таким образом, этнонимы называют целую общность, народность с характерными исключительно для нее чертами.

По мнению Е. Л. Березович, при создании образа соседей в сознании носителя национальной культуры весомую роль играет оппозиция «свой – чужой»: территориальные соседи находятся в позиции между своим социумом и чужим, однако ближе остаются к чужакам [1, с. 238]. В особенности это актуально для национальностей с неоднородным этническим составом.

Часто этнонимы приобретают дополнительную эмоциональную окраску, что увеличивает их значимость для языкового континуума. Этнонимы быстро развивают переносное значение и активно задействованы в образовании фразеологических единиц.

В качестве материала для анализа были взяты 22 белорусских фразеологизма, в состав которых входит этноним.

Результаты показывают, что чаще всего в качестве этнонимов среди белорусских фразеологизмов встречаются этнические группы: цыгане (7), казаки (4), русские (3), евреи (3), татары (3), немцы (2).

Наибольшей актуальностью пользуется этноним *цыгане*. Это связано с тем, что исторически кочевой народ цыган активно заселял современные белорусские земли и сегодня они также остаются частью белорусского народа. Реже встречается этническая группа «евреи» и «татары», «немцы», «русские». Все народы достаточно близкие территориально к белорусской национальности, что и легло в основу многих устойчивых выражений.

За основу для анализа этнонимов была взята классификация Е. А. Голубовской:

1) «позитивный – негативный» (положительная или негативная эмоциональная окраска);

2) «свой – чужой» (критерий, означающий соответствие или противостояние общепринятым нормам конкретной народности);

3) «про – анти» (соответствует характеристикам объекта или противостоит им).

По первому критерию позитивная эмоциональная коннотация встречается в 8 фразеологизмах. Среди них 3 относятся к цыганскому этносу, 5 – к казакам. Например, *Цярпі, казак, атаманам будзеш*; *вольны казак*. Казаки один из самых смелых и вольных народов, что и нашло отражение в языке.

Негативная эмоциональная оценка встречается в четырех фразеологизмах в отношении евреев. Например, *жыдоўскае царства; жыды ня вызначаюць Хрыста.* Отношение к евреям со стороны белорусского народа всегда было настороженным. Считалось, что они пользуются простыми крестьянами и обманывают простых людей.

Критерий «свой» – «чужой» довольно явно виден в языке. Так, фразеологических единиц, соответствующих критерию «чужой», оказалось значительно больше, чем «свой»: 18 этнонимов со значением ‘чужой’ и 5 со значением ‘свой’. К «чужим» относятся все, за исключением внутренних этнонимов. Ср.: *рускі месяц – Гродзенскія зайцэ.* Этноним *свой* часто ассоциировался с родом деятельности жителей определенной местности.

Третий критерий является отражением тех правил и норм, которые приняты у определенной народности. Из выявленных нами фразеологизмов 8 относятся к критерию «про» и 2 к критерию «анти». Например, *як на татарскай працэсіі* – татары достаточно воинственный народ и известен своими битвами, фразеологизм отражает прыть татарского народа во время боя.

Фразеологизм *Цыган цыганскую праўду гаворыць* противоречит представлению белорусов о цыганской национальности. Белорусы не обвиняли цыган в обмане, что со временем могло изменится, но исторически цыгане вошли в историю белорусского языкового континуума как народность с положительной репутацией. В этом случае очевиден критерий «анти».

Статистические данные доказывают, что белорусская нация исторически относится лояльно к представителям других этнических групп. Свои коренные этнические группы встречаются в языковой картине белорусов реже и соответствуют роду занятий людей, проживающих на этой территории. Белорусы сами по себе толерантный, мирный и гостеприимный народ.

Другие национальности встречаются чаще и связано это не только с территориальной близостью, но и с торговыми отношениями, ведением и участием в войнах (чаще негативная коннотация). Этническая неоднородность также сказывается на восприятии народом самого себя и другой нации, которые, как правило, позиционируются как «чужие». Также стоит отметить, что «свои», даже если они проживают не на одной территории, но принадлежат к одной культуру, будут оставаться и восприниматься как свой народ.

В немецкой фразеологии этнические прототипы представлены следующими этническими группами: американцы (5), французы (4), русские (2), швейцары (2), шведы (1), китайцы (1), датчане (1), англичане (1), голландцы (1), австрийцы (1), испанцы (1). Чаще всего во фразеологических единицах встречаются этнонимы *американцы* и *французы*. Это обусловлено исторической дружбой этих стран и продолжением развития политических и экономических отношений.

Редко можно встретить следующие этнонимы *китайцы, испанцы, англичане, голландцы, австрийцы*. Такую непопулярность можно объяснить недостаточным знанием о других культурах, а также сложившимися стереотипами.

В основу анализа опять легла классификация Е. А. Голубовской, согласно которой этноним можно разделить на три группы:

1) «позитивный» – «негативный»;

2) «свой» – «чужой»;

3) «про» – «анти».

По первому критерию «позитивный» – «негативный» фразеологизмов с положительной эмоциональной окраской выделено 3 этнонима: 2 – с этнонимом *американец* и 1 – с *испанец*. Например, фразеологизмы: *die Tante aus Amerika* – Тетя из Америки, *stolz wie ein Spanier* – гордый, как испанец. Америка представляется сильной и богатой страной, выгодным союзником. Испанцев немцы видят гордой нацией.

Относительно негативно воспринимаемых можно с уверенностью утверждать, что их доля значительно больше. Так, было выделено 7 фразеологизмов: англичане – 1, французы – 1, голландцы – 1, австрийцы – 1, швейцарцы – 1, русские – 1. Например, *den Holländer machen* – убегать, *Dank vom Haus Österreich* – спасибо от австрийского дома. Голландцы отличились своей трусливостью, а австрийцы признаны самой неблагодарной страной в мире. Оба эти этнонима приобрели негативную коннотацию.

По второму критерию «свой» был выделен 1 фразеологизм с внутренним этнонимом *немец* и этнонимом *французы*: *Ein echter deutscher Mann mag keinen Franzen leiden* – немецкий мужчина не может обидеть француза (дословно). Исторически известно особая дружба Франции и Германии, благодаря которой французы также вошли в историю Второй мировой войны, хотя сами французы в войне активного участия не принимали и сдались самостоятельно одними из первых. 2 фразеологизма с этнонимом *китайский*, например, *das ist für mich chinesisch* – это для меня китайская грамота. Китайский язык – один из самых сложных языков. По нашему предположению, китайская грамота связана с трудностями в понимании языка другой народности.

По второму критерию было выявлено 4 фразеологизма: 2 – с этнонимом *швейцарцы*, 2 – с этнонимом *китаец*. Например, *hausen wie die Schweden* – хозяйничать как шведы (разрушать, опустошать). Немцы переоценивали жестокость шведов и недооценивали их интеллектуальное и материальное превосходство, например, *den Gehirn wie ein schweizer Käse haben* – мозг как решето.

По последнему критерию «про» было выделено 5 этнонимов: американцы 2, англичане – 1, швейцары – 1, датчане – 1.

Например: *Amerikanische Versteigerung* – торги, аукцион, *englische Woche* – напряженная неделя. Торги долгое время были популярны в Америке, после чего эту практику переняла Европа, являются частью американской культуры. Ритм жизни англичан для немцев чересчур динамичен.

«Анти» представлена в 4 фразеологизмах: 1 – с этнонимом *китайский*, 1 – с этнонимом *русские* и 2 – с этнонимом *французский*, например, *sich (auf) französisch empfehlen* – уйти не попрощавшись, уйти по-английски, выражение относящееся к англичанам, доподлинно неизвестно, почему немцы применяют здесь именно французскую народность. *Flüchten wie 20 Russen* – убегать, как 20 русских. Русские никогда не убегают, русский народ отличается своим патриотизмом и храбростью. Но немцы так и не признали факта поражения во Второй мировой войне.

Таким образом, можно сказать, что соседи воспринимались немцами чаще негативно, а страны-партнеры имели положительную репутацию. Это можно объяснить еще и историческими отношениями.

Эти данные позволяют с полной уверенностью утверждать, что этнонимы, входящие в состав фразеологических единиц, являются отражением картины мира данного народа, заключают в себе ключевые знания о культуре, истории народа, взаимоотношениях с соседями, отношению к другим культурам, о том, как народ видит другую национальность через призму собственной самоидентификации.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Березович, Е. Л.* Ономастический портрет «человека этнического» : принципы построения и интерпретации / Е. Л. Березович, Д. П. Гулик // Встречи этнических культур в зеркале языка / редкол.: Г. П. Нещименко [и др.]. – М. : Наука, 2002. – С. 232–253.
2. *Лепешаў, І. Я.* Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2004. – 448 с.
3. *Никонов, В. А.* Этнонимы / В. А. Никонов. – М. : Наука, 1970. – 271 с.
4. Слоўнік беларускіх народных параўнанняў / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ.; уклад.: Т. В. Валодзіна, Л. М. Салавей ; навук. рэд. В. М. Макіенка. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 482 с.
5. *Seiler, F.* Deutsche Sprichwörterkunde / F. Seiler. – München, 1922. – 480 S.
6. *Krüger-Lorenzen, K.* Deutsche Redensarten und was dahinter steckt / K. Krüger-Lorenzen. – München : Heyne Verl., 2001. – 860 S.

УДК 811.161.3’367’0

Э. В. Ярмоленка (Мінск)

ТВОРНЫ ПРЫЙМЕННЫ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Дапаўненні шырока прадстаўлены ў разнажанравых тэкстах старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы. Яны выражаюцца рознымі часцінамі мовы, але часцей назоўнікамі ва ўскосных склонах без і з прыназоўнікамі. У дадзеным паведамленні разгледзім прыйменныя (пры назоўніках і прыметніках) дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону[1].

Вельмі частотнымі ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове былі канструкцыі з дапаўненнямі, выражанымі формамі творнага склону, пры назоўніках, якія па ўтварэнні і значэнні суадносяцца з дзеясловамі: морду надъ девчинами, тымъ млоденъцомъ допущовала (ИЮМ, IX, 293, 1637)[2]; бороды при самомъ тѣлѣ саблею урзненье (АВК, XII, 488, 1684). На думку А. А. Шахматава, “наўрад ці можна сумнявацца, што прыйменнае ўжыванне такіх склонаў [творнага і давальнага – *Э. Я.*] выклікана ўжываннем іх пры дзеясловах, часткова гэта сведчыцца тым, што такія склоны знаходзяць сабе месца пераважна пасля аддзеяслоўных назоўнікаў” [7, с. 314]. Іншыя даследчыкі таксама заўважаюць, што “значэнне творнага істотна не мяняецца, калі на месцы дзеяслова ставіцца адпаведны яму назоўнік, і характарызуем гэтыя значэнні таксама, як значэнні пры дзеяслоўным ужыванні” [6, с. 291].

У старабеларускіх тэкстах, як і ў сучаснай беларускай мове, такія канструкцыі перадавалі розныя значэнні. Найбольшая колькасць прыкладаў прыпадае на творны інструментальны, які ўказвае на прыладу, сродак, пры дапамозе якіх ажыццяўляецца дзеянне, выражанае назоўнікам: привелъ ихъ Гр҃ь … мнѡгихъ

[1] Прыдзеяслоўныя дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону, разглядаліся намі ў паведамленні “Аб функцыянаванні канструкцый з творным склонам у старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове” [8, с. 287–290].

[2] Прыклады падаюцца па: Гістарычны слоўнік беларускай мовы. – Мінск : Беларус. навука, 1982–2017. – Вып. 1–37.

рыбъ зˢ росказа*н*ѧ его закиненою сѣтˢю оуловле*н*емъ до задива*н*ѧсѧ привелъ (Каліст, II, 260б–261); ловене рыбъ норотами, вудами (ИЮМ, XXIV, 215, 1634); отца Гулинского у губу пястью ударенье (АВК, XV, 417, 1670).

Блізкія да разгледжаных вышэй канструкцый такія, якія называюць дзеянне і матэрыял, рэчыва і пад., што з'яўляліся сродкамі стварэння, узвядзення, вытворчасці і пад.: што сѧ пакˢ маслом помазыванья дотычеть (Будны, 225); несказите*л*ное тѣло те*р*пѣ*т* могло ѡбрѣза*н*е, млеко*м* ко*р*мле*н*е и гвоздъꙗ приби*т*ꙗ, и кр*с*тъ (Бельск., 328б); поливанˢе водою (Дзід., 8); бꙋде*т* покропленье тою водою трете*г* днѧ (Хран., 140); За футроване у печы цеклою (ИЮМ, I, 191, 1681). Адзначаны выпадкі ўжывання ў такім значэнні і роднага прыйменнага: Крещеніе ѡ*т*правитисѧ можетˢ, полѣваніемъ воды на главꙋ (Зб. вып., 8б).

Творны са значэннем прылады, сродку ўжываецца і пры назоўніках, якія абазначаюць нематэрыяльнае дзеянне[1]: ѡ невызволенъе з воины листы нашыми (Ст. 1566, 20); ѡ*т* ѡбношенья листо*м* ꙋпоминальнымъ … давность земъскую десе*т* летъ промолъчалъ (Ст. 1588, 248); ѡ дохоженью близъкостью або ꙗкимъ инымъ правомъ имене[s] (Ст. 1588, 231); то е*ст* детракциѧ ѡднымъ сло*в*ко*м* ꙗко мовꙗ*т* або те*ж* рꙋшенемъ головы ки*в*не*н*емъ (Зб. 261, 156); покаранье четвертованьемъ мужобойцы (АСД, I, 346, 1643); на контемтъ стану копланского ... словами непристойными диффамованье (АВК, XI, 280, 1697).

Творны склон зафіксаваны пры назоўніку *оженение*: взложили на мене … поневолное оженене з дочкою неякого попа Чыжа (АВК, XXXIV, 301, 1663). Выкарыстанне творнага склону ў гэтай пазіцыі звязваюць з тым, што яшчэ ў агульнаўсходнеславянскі перыяд пры шэрагу дзеясловаў, якія абазначалі нематэрыяльнае пераходнае дзеянне суб'екта, ужываўся творны інструментальны, праз які названае дзеянне пераўтварае суб'екта [5, с. 281].

Творны прыйменны можа выяўляць прэдыкатыўную прымету: Приспособе*н*е до сн̃овства, оучинен[s]е сыномˢ (Бяр., 168); што было причиною до ганеньѧ и до называн[s]ѧ костантѣ антихрісто*м* (Апакр., 57).

Канструкцыі з творным прыйменным могуць перадаваць суб'ектныя адносіны – называць дзеянне і выканаўцу дзеяння (жывую істоту або прадмет, паняцце): почто не зжалилсѧ еси ѡ приꙗтьи тре*х* ꙗець даміано*м* (Чэцця, 67б–68); арендовал ему десіатую часть перевозу на реце … от розыстіа леду аж до станіа реки ледомъ (ИЮМ, XXXII, 142, 1578); отъ … щаванья псами (АВК, II, 314, 1642); по зепсованю натꙋры наше[s] грѣхо*м* великаꙗ е*ст* в на*с* склонность до ѕлого (Выкл., 9); чаровъ, гꙋсловъ … запѣсованѧ сѧ діаволомъ ... выстерегалисѧ (Зб. вып., 105).

Прыйменныя канструкцыі з творным склонам у старабеларускай мове функцыянавалі паралельна з падобнымі прыдзеяслоўнымі канструкцыямі, параўн.: *битье розгами – бити дупцы, воротами приваленье – привалити каменьми, маетностями шафованье – ласкою шафовати*, *ширмованье шаблею – ширмовати языком*: маеть росказати катꙋ вести до пре*н*кгира и тамъ его дꙋпцы бити (Ст. 1588, 87) – Римошевского ... у пренгера розгами битьемъ всказуемъ (АВК, X, 82, 1695); справа о ширмованье черезъ его около головъ ихъ шаблею добытою (АВК, XV, 68, 1662) – ꙗзыкомъ ꙗко мечемъ з ѡбоихъ сторо*н* ѡстрымъ не ши*р*мовали (Зб. 259, 516).

[1] На думку даследчыкаў, у такіх канструкцыях значэнне прылады крыху аслабляецца і замяняецца больш шырокім значэннем ускоснага аб'екта [2, с. 134].

У старабеларускіх тэкстах атрымаў пашырэнне і творны адносін, які стаіць пры слове, што абазначае якасць [3, с. 418; 4, с. 261]: Мы князь Семенъ, инымъ именемъ Лыгвеній, чинимъ знаменито (АЗР, I, 26, 1389); бѣ҃ше пр*о*рчица sвѣздарька именем сивилла (Сівіла, 2); был государъ тому ѡстрову именемъ Давлитесъ (Трыст., 71). Адзначана ўжыванне ў гэтай пазіцыі і формы вінавальнага склону *на имя*: жаловалъ намъ мещанинъ плебаней витебъское ко*р*мникъ на ˢмѣ҃ костъкодѵлов (КВЗС, 51, 1533).

Спалучэнні з назоўнікам у творным склоне з прыназоўнікам *съ* (*со, зъ*) часта перадаюць адносіны сумеснасці (сацыятыўныя адносіны): алеѯа*н*дръ гѡ*д* мешкалъ во индии со всимъ воиско*м* своим (Алекс. XV, 2); десеть грошей с платкомъ изъ запазушья выпало (АВК, XXI, 41, 1555); украл҃ъ былъ еси пчолы съ кореникомъ у Процька (АВК, XVIII, 43, 1582); зняли ... игольникъ с поесомъ (АВК, XXXVI, 44, 1582); Ключата с тыми вахтовниками кватерниками своими шляхтичовъ учстивыхъ побилъ (АВК, XX, 175, 1601). У такіх канструкцыях звычайна аб’яднаны назоўнікі аднаго семантычнага разраду (*Ключата – вахтовникъ, маетность – млынъ – фолюшъ – одрына, явья – клоймъ* і г.д.): в гумъне явья с клоймомъ (АВК, XXXII, 186, 1596); маетность продала ... зъ млыномъ папернымъ зъ млыномъ мучнымъ зъ фолюшомъ зъ галтаромъ (АВК, X, 260, 1631). Творны сацыятыўны абазначае прадмет самастойны па адносінах да галоўнага слова, які суіснуе з ім [3, с. 416].

Канструкцыі з прыназоўнікам *съ* могуць таксама паказваць адносіны аб’екта, якія нешта змяшчае, і змесціва: въ максима пѫ҃ть кореневъ со пчоломи снѫ҃ли (КВЗС, 134б, 1540); ровоа*с* теды алеѯа*н*дрови золоты[s] кубокъ зъ ѫ҃до*м* подалъ (Алекс., 44б); ѵказовалъ мѣ҃шокъ з пѣ҃нѫ҃зми (Пралог, 576б); записал замок ... з людми (СДГВ, 62, 1679).

Канструкцыі з творным склонам з прыназоўнікам *съ*, у якіх галоўнае слова суадносіцца з дзеясловам, выражаюць аб’ектныя адносіны: на скуточъную розъправу з пенами ... до насъ враду ремисса станула (АВК, XX, 464, 1676). Такія адносіны могуць набываць таксама адценне сумеснасці: тотъ возный ... в Городку, пры бытности моей и пры розмавлѫ҃нью моемъ с княземъ Богданом не был (АВК, XXXVI, 41, 1582); Листъ мой тотъ сховай … до узрѣ҃нья зо мною (АВК, VI, 84, 1584); сполечность з[s] римскимъ костело*м* жадной бы в той мѣ҃ре акцесіи не оучинила (Апакр., 203б); игриска, и заводы ко*н*скіе, и полева*не* со псами, и вшелѧкіе порожніе молодого вѣ҃кѵ забавы ... за ништо собѣ҃ важи*л* (Варл., 260).

Аб’ектныя адносіны могуць выражаць спалучэнні з назоўнікам, суадносным з дзеясловам, з прыназоўнікам *надъ*: вгрожень*ѧ*с*ѧ* в насъ самы*х* и пышного пановань*ѧ* на*д* сѵмненьемъ нашимъ не шукали (Апакр., 203).

Адносіны сумеснасці або ўзаемнасці выяўляюць таксама і канструкцыі з прыназоўнікамі *межи, между, промежи, промежку* і пад.: ка*к* бы ни ѡдна была розность межи тою звездою а сл҃нце*м* (Валх., 45б); постанове*нье промежи за*м*ко*м* и местом Полоцки*м* з стороны люде*и* пу*т*ны*х* сельски*х* и и*н*ши*х* речеи (ПГ, II, 174, 1500); былъ ѡ томъ делъ межи насъ (КСД, 20, 1510).

Пры прыметніках дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону, абазначаюць асобу або прадмет, па адносінах да якіх праяўляецца пэўная прымета. Дапаўненні, якія адносяцца да прыметнікаў, могуць суадносіцца з дапаўненнямі пры дзеясловах (выражаюцца пераважна назоўнікамі ў творным склоне без прыназоўнікаў): чл҃къ зародокъ женˢскіи … сы*т* гнѣ҃во*м* (Зб. 262, 17б), а могуць

не суадносіцца з дапаўненнямі пры дзеясловах (выражаюцца назоўнікамі ў творным склоне без прыназоўнікаў і з прыназоўнікам *съ*): вделали суть вси мудріи серцемъ ко поставлению храма (Скар. КВ, 68); нога грѫбаѧ мѧсом ouказоуеть глоуповъство и кривдолюбіе (Арыст., 179); нашол мѣстце над ѡзером пꙋщами реками и розлогами вдѣлчное и красное (Стрыйк., 514б); мы … надали есьмо … и половину луга Древоскипища, сумежную зъ его милостью паномъ Ходкевичомъ (АВК, XI, 11, 1521).

Выяўлены канструкцыі, дзе ўжываецца творны склон для абазначэння аб'екта, рамкамі якога абмяжоўваецца прымета, што перадаецца прыметнікам (творны абмежавальны): чл҃къ зародокъ женˢскіи коротокъ дн҃ьми (Зб. 262, 17б); молодица красна позором (Зб. 262, 128); Ѡ носѣ ... а боудет ли конець его дологъ и тонокъ. се ест доуренъ и легокъ дѣлы своими и ходом (Арыст., 198); кон находникъ шерстью белы (АВК, XXXIX, 61, 1578); украли ... возничъка шерстью карого (АВК, XXXVI, 233, 1582); дей той сверепы шерстью вороненькое (АВК, XVIII, 224, 1610); птахи нбсные живитъ и лилеи полные такою сличностю приоздобляетъ (Варл., 92б).

Некаторыя канструкцыі выяўляюць аб'ектныя адносіны з сэнсавым адценнем унутранага зместу прыметы, выражанай прыметнікам [1, с. 193]: довольни будете оброки вашими (Скар., ДЗ, 3б); Вы мꙋжеве доволны бꙋдте своихъ жѡнъ чистою любовію (Каліст, I, 47б).

У дзелавых тэкстах прадстаўлена значная колькасць канструкцый з аб'ектнымі адносінамі, утвораных аддзеяслоўнымі прыметнікамі [1, с. 190]: до дня и року своего певного … ничим не отменного (ИЮМ, XXXII, 62, 1578); пустилъ домъ свой властный, никому ничымъ не вступъный ани заведеный (ИЮМ, XXX, 24–25, 1577); кордъ серебром оправный (АВК, XXXVI, 42, канец XVI ст.); речъ слушную и зъ правомъ посполитымъ згодъливую (АВК, XXIV, 4, 1684).

Праведзенае даследаванне паказала, што ў старабеларускай літаратурнапісьмовай мове шырока ўжываўся творны прыйменны склон. Дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону, выкарыстоўваліся для перадачы аб'ектных, суб'ектных адносін, а таксама адносін замяшчэння і сумеснасці. Паралельна з канструкцыямі з творным прыйменным у старабеларускай мове ўжываліся канструкцыі з родным склонам (*полеванье водою – полеванье воды*), а таксама з вінавальным (*именемъ – на имя*). Побач з прыйменнымі канструкцыямі з творным склонам шырока функцыянавалі падобныя прыдзеяслоўныя канструкцыі (*битье розгами – бити дупцы, воротами приваленье – привалити каменьми*).

ЛІТАРАТУРА

1. *Булахаў, М. Г.* Гісторыя прыметнікаў беларускай мовы. Сінтаксічны нарыс / М. Г. Булахаў. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. – Ч. 2. – 296 с.
2. Грамматика русского языка. Синтаксис. Ч. 1. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1954. – Т. 2. – 703 с.
3. *Карский, Е. Ф.* Белорусы / Е. Ф. Карский. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1956. – Т. 2 : Язык белорусского народа. Вып. 2 : Исторический очерк словообразования и словоизменения в белорусском языке; Вып. 3 : Очерки синтаксиса белорусского языка. – 518 с.
4. Сравнительно-исторический синтаксис восточнославянских языков. Члены предложения. – М. : Наука, 1968. – 298 с.
5. *Ломтев, Т. П.* Очерки по историческому синтаксису русского языка / Т. П. Ломтев. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1956. – 596 с.
6. Творительный падеж в славянских языках / под. ред. С. Б. Бернштейна. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1958. – 379 с.
7. *Шахматов, А. А.* Синтаксис русского языка / А. А. Шахматов. – М. : Эдиториал УРСС, 2001. – 624 с.
8. *Ярмоленка, Э. В.* Аб функцыянаванні канструкцый з творным склонам у старабеларускай літаратурнапісьмовай мове / Э. В. Ярмоленка // Адзінаццатыя Танкаўскія чытанні : зб. навук. арт. ; Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак [і інш.]; адк. рэд. В. Д. Старычонак. – Мінск, 2018. – С. 287–290.

УДК 821.161.3 – 1 (бел)

І. А. Бароўская (Гомель)

«МОЙ ЧАРОЎНЫ БЕЛАРУСКІ КРАЙ, БАЦЬКАЎШЧЫНА СВЕТЛАЯ МАЯ»: ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

У 2020 годзе споўнілася 90 год са дня нараджэння выдатнага пісьменніка, паэта, драматурга, публіцыста, сцэнарыста, перакладчыка, класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча. Неяк склалася такая традыцыя, што большасць з нас успрымае яго як аўтара першага беларускага гістарычнага рамана «Каласы пад сярпом тваім». Але шырыня яго захапленняў выклікае павагу: навелы, апавяданні, літаратурныя артыкулы, аповесці, вершы, раманы. Пэўны перыяд у сваім жыцці У. Караткевіч жыў у Кіеве. Гэты горад запаланіў яго душу, выклікаў гэтую незвычайную зацікаўленасць гісторыяй. Як вынік – з-пад яго пяра выходзіць аповесць «Лісце каштанаў». Цікавасць да сваіх каранёў У. Караткевіч пранёс праз усё жыццё, менавіта да сваіх, родных бацькоўскіх мясцін, да дома ў Рагачове, пабудаванага яго дзедам Васілём у 1914 годзе. Гэта любоў глыбока ўвайшла ў сэрца і душу, нарадзіла, падняла з глыбінь душы і сэрца гонар, павагу і адначасова крыўду за некаторых, што сталі *хлопамі*, якія *Не любяць Радзімы, не любяць мовы… Іваны без роду і племені!*:

Што ім з таго, што за кнігу і слова
Народ сем стагоддзяў ставаў у стрэмя?!..
Хамы лічаць заўсёды «*хамскім*»
Матчыну песню і матчыну хату («Фантазія») [1].

Сам пісьменнік прысвячаў вершы сваім землякам, выказваў шчырыя словы любові да роднай зямлі. Мясціны Рагачова натхнялі, суцяшалі душу. У. Караткевіч грунтоўна вывучаў гісторыю, вылучаўся энцыклапедычнымі ведамі. У час вучобы ў Кіеўскім універсітэце на філалагічным факультэце рускага аддзялення пісьменнік пачаў цікавіцца гісторыяй Беларусі, шмат выданняў прачытаў пра нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863–1864 гадоў. Магчыма, адыграў сваю ролю той факт, што даўні продак пісьменніка, як перадавалі яго сваякі, Тамаш Грыневіч удзельнічаў у гэтым паўстанні, за што быў расстраляны недзе пад Рагачовам. Студэнцкія гады сфарміравалі У. Караткевіча як асобу незалежную, сумленную, з гонарам за сваю Айчыну, гістарычную спадчыну. Менавіта ў Кіеве сфарміравалася яго грамадзянская пазіцыя і выпрацавалася жаданне займацца пытаннямі гістарычнага мінулага Беларусі. Яго вельмі прыцягвалі факты паўстання 1863–1864 гадоў, у выніку чаго з’явілася задума аб напісанні твора пра падзеі, абставіны таго перыяду. Летам 1950 года з’явіўся першапачатковы варыянт «Дзікага паляванння караля Стаха».

Вялікі ўплыў на пісьменніка аказала творчасць Янкі Купала, Якуба Коласа. Дарэчы, Якубу Коласу ён паказаў свае першыя вершы, апавяданні, казкі.

Выпадак адыграў важную ролю ў лёсе У. Караткевіча. Здарылася так, што свае асобныя вершы ён паказаў свайму сябру. Вось, як успамінаў сам пісьменнік той самы выпадак («Дарога, якую прайшоў»): «Напісаў я за дзевяць год – горы. Нават трагедыю белым вершам, жахліва трагічную. Але друкавацца і не думаў. У канцы першага года маёй настаўніцкай работы адбылося, аднак, нечаканае.

Мінскі сябра (С. Карпенка) папрасіў мяне даслаць яму вершы, пачытаць. Я даслаў, як бывала і раней. А ён панёс іх у часопіс «Полымя». І раптам улетку 1955 года я атрымаў нумар часопіса са сваім вершам «Машэка». Гэта пераламіла мой лёс. Потым з'явіліся яшчэ вершы» [3].

У вершы апяваўся герой з беларускіх легендаў. Як адзначаў Р. Бярозкін, галоўная вартасць «Машэкі» – у *песеннай атмасферы, у якой жыве і дзейнічае герой легенды* [2]. Вось гэта і стала момантам, пасля якога У. Караткевіч вырашыў займацца гістарычнай літаратурай. Але вядомы і зборнікі вершаў славутага класіка: «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі (вершы і паэмы)», «Мая Іліяда», «Быў. Ёсць. Буду», «Паэзія розных гадоў».

Паэтычная творчасць Уладзіміра Караткевіча вылучаецца інтэлектуальнасцю і філасофскім зместам, глыбінёй, эмацыянальнай напоўненасцю і адкрытасцю. Яго паэзія выхоўвае, выклікае любоў да слаўнага мінулага Айчыны, душа яго «*крычыць*» ад непаразумення:

Я джунглі і ў нас адшукаць сумею.
Сцяблінка звычайнай расянкі балотнай
Цікавей жывей за ўсе архідэі.
У дрэвах з мармуру – іх зваць бярозамі,
У вежах з карункавым іхнім уборам,
Я добра бачу ўчарашнія слёзы
І сённяшні смех з барацьбою поруч («Фантазія») [1].

Найлепшай краінай засталася ў яго *вёска Амерыка, што пад Оршай.* Душа паэта не вытрымлівае, ён рэзка, эмацыянальна выказваецца пра тых, хто адвярнуўся ад родных каранёў, хто забыў сваіх продкаў:

А вы льяцё па чужому слёзы,
Забыўшы радзімы простыя кветкі,
І любіце вершы ёлупаў розных.
Вядома, свінню прыцягвае сметнік («Фантазія») [1].

Уладзімір Караткевіч быў цвёрда перакананы, што абавязковае пранікненне ў гістарычную памяць Беларусі не дазволіць нам згубіць сувязь паміж мінулым і сучасным, дапаможа пазбегнуць памылак. Строгасць і высакароднасць прасочваецца ў кожным радку яго вершаў. Аўтар не саромеецца ў выказваннях, выкарыстоўвае рэзкія словы ў абарону сваёй радзімы:

Маю радзіму, маю зялёную,
Забыць і ў разрад нецікавых сунуць?
Мала вам плюнуць у твары
Чакайце! Яшчэ калі-небудзь плюнуць!
А я ў народ наш заўсёды веру… («Фантазія») [1].

У вершы «Ёсць паданне вякоў, што разбурыць калісь» паэт з вялікай любоўю гаворыць пра родную мову з дапамогай яскравых эпітэтаў і ад'ектыўных параўнанняў: *трапяткая і сіняя, як васілёк, гарачая, як прамень.* Твор кранае сваёй душэўнай шчырасцю, адданасцю, яскрава бачыцца непахісная грамадзянская пазіцыя аўтара – няма жыцця без роднай мовы:

Хай пятля, хай памерці ў журбе,
Хай не будзе ні шчасця, ні будучых дзён,
Калі ў іх не будзе цябе [1].

Сіратой называе сябе паэт без мовы, без слоў анёла *Братка, здароў*. Мова для паэта *ясны хлеб, каханы май, песня продкаў, нашчадкаў палі*:

Без цябе, не з табой – не патрэбен мне рай.

На душы. Ў небясі. На зямлі («Быў. Ёсць. Буду») [1].

Мова для пісьменніка і *булатны клінок*, мова *гордая*, якую і тады народ не забудзе, *калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок* («Беларуская песня») [1].

І як страшна паўтарыць лёс таўраў, калі ў Крыму знаходзяць муры, руіны былога народа, што згінуў і знік невядома чаму. Уладзімір Караткевіч ездзіў у Крым, даследаваў, разважаў і з глыбокім сумам стварыў верш «Таўры», калі стаяў у гарах і ўяўляў, што *ён не ізгой, Не паэт з беларускіх узгоркаў сініх, А апошні таўр Народа свайго*:

Крый нас,божа, калі і нас нас

Нашчадкі

Паглядзяць, Як мы

На таўраў

Глядзім [1].

Нам трэба ў паэта вучыцца так любіць радзіму, так адчуваць смак кожнага слова, зразумець той сум, што перадаецца ў вершы «Мокрыя травы» пасля першага радка *Я сумую па радзіме*. І вось ужо перад намі вырастае вобраз радзімы, яе *лугі і нівы, трыпутнікі, укроп, белая бульба, ціхая паляна, хаты, росныя шаты, канавы, кураслеп, лопух, дажджы і сонца, вільгасць сонечнага лета, коні, жарабя, што бяжыць па лузе, вясёлка.* Лексемы-назоўнікі акаляючай прыроды, развітыя вобразнымі азначэннямі (*рэчкі ціхія і лянівыя, мокры край*), іншы раз метафарычнымі вобразамі (*цёплы мёд яе маліны*) струменяцца ў радку, адлюстроўваючы, душэўнасць, пяшчоту, прастату фактуры і глыбокі лірызм. Як адчувальна сардэчнасць тону, шчырасць, элегічна-сузіральны настрой пры перадачы аўтарам пачуццяў да сваёй радзімы, да роднай Беларусі. Разгорнутай метафарай гучаць радкі *лясная казка, святая песня, Свет адзіны ў вачах*, параўнанне з каханай дзяўчынай дапамагае намаляваць краявіды роднай старонкі: *тугія ўзгоркі – нібы грудзі каханай дзяўчыны…; азёры сінія – нібы вочы яе.* Падобнае сустракаем і ў вершы «Снягір»: *О радзіма, мой светач цудоўны, адзіны, Явар мой, мой агністы снягір на сасне.*

Разгорнуты вобраз радзімы, такі ўсеабдымны, доказны *калумбам зямлі незнаёмай*, што мараць *пра піраміды над Нілам:*

А што вы ведаеце пра краіну,

Ў якой вас маці на свет нарадзіла?

Яна вам нудная, шэрая, сумная.

Ясце яе бульбу, ясце яе сала,

А самі былі толькі ў мінскім ДУМе,

Ды чулі аднойчы імя Купалы («Калумбы зямлі незнаёмай») [1].

Якая страснасць, эмацыянальная напоўненасць сустракае нас у радках-доказах, што наша краіна – лепшая: у нас *буслы чорныя, бабры разумныя, скокі жораваў на весніх азёрах.., Мядзведзі лечацца травамі горкімі, Шукаючы дзікі часнок на лузе, Павук-серабранка ў гняздо пад чаротамі Носіць паветра дзецям пад пузам* («Калумбы зямлі незнаёмай»).

Беларусь для Уладзіміра Караткевіча – *акіян*, у кожнай кроплі якога звініць, адгукваецца незгасальнае жыццё продкаў, што разам з храмамі і гарадамі сышлі ў нетры зямныя. А крыніцы зямлі нашай будуць жыць вечна, і жыць з імі будзе *давеку наш мужны і мудры, вялікі народ* («Надпіс на камяні над крыніцай»).

Спасцігаючы творчасць паэта, міжволі задумваешся аб тым, што непарыўнасць пакаленняў звязвае гістарычнае мінулае, якое нараджае павагу, гонар за продкаў, садзейнічае спасціжэнню народнай мудрасці, што перадаецца ад роду да роду. І Уладзімір Караткевіч разумеў гэта. Ён, акунуўшыся ў гісторыю краіны, суправаджаў свае разважанні рытарычнымі пытаннямі:

Унукі Скарыны,

Дзе ваш гонар, моц, краса? («Верш Багдановічу») [1];

Дзе мой край?

Там, дзе мудрыя продкі ў хвоях паснулі («Беларуская песня») [1].

Нельга абысці ўвагай той факт, што творчасць Караткевіча прыцягвае ўвагу беларускіх бардаў і рок-музыкантаў. Так, у свой час, да 80-годдзя паэта, былі выдадзены 2 альбомы Зміцера Вайцюшкевіча пад назвай «Беларуская песня» і «Дзе мой край», куды ўвайшлі песні на вершы Уладзіміра Караткевіча, напісаныя аўтарам у розныя часы. У альбомы ўкладзены буклеты з тэкстамі песень і вершы Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна і іншых, прысвечаныя класіку. Акрамя таго, рамантычная недаказаннасць пачуццяў, неспакой у спалучэнні са светлым сумам прыцягвалі ўвагу кампазітараў пры стварэнні рамансаў: Я. Глебава «Любы мой», Л. Мурашкі «Дагарэў за брамай неба край» і іншыя.

У заключэнні неабходна адзначыць, што паэтычная творчасць Уладзіміра Караткевіча адкрывае яго для наступных пакаленняў, як грамадзяніна, высакароднага лірыка-філосафа, узнёслага і шчырага рамантыка.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Uladzimir_Karatkievic/Na_Bielarusi_boh_zyvie.html. – Дата доступу : 03.11.2020.
2. *Бярозкін, Р.* У добры час. Артыкул пра творчасць У. Караткевіча (урыўкі). 1956 г. [Электронны рэсурс] / Р. Бярозкін // Машынапіс. – Рэжым доступу : http://archives.gov.by/home/tematicheskie-razrabotki-arhivnyh-dokumentov. – Дата доступу : 28.10.2020.
3. *Караткевіч, У.* Дарога, якую прайшоў [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч. – Рэжым доступу : https://karatkevi.ch/bio/letapis.html. – Дата доступу : 28.10.2020.

УДК: 811.161.3+821.161.3.09(092)

А. С. Баханович (Минск)

ТИПЫ ИРОНИИ В ПРОЗЕ П. В. ВАСЮЧЕНКО

Ирония и ее функции, в пространстве художественного произведения, рассматривается как в литературоведческом, так и литературоведческо-лингвистического плане. Д. Мюкке особо отмечает ироническое видение мира, свойственное современной литературе. Ирония становится не только стилистической фигурой, но и художественным принципом писателей, желающих придать тексту выразительный оттенок и выразить скептическое, язвительное отношение автора к изображаемому.

Понятие иронии не имеет однозначного толкования в силу двойственной природы. Импликативный характер иронии, субъективная оценочность, амбивалентность языкового содержания порождают вариативность интерпретаций иронических высказываний.

Так, О. С. Ахманова дает следующее определение данному понятию: «ирония – троп, состоящий в употреблении слова в смысле обратном буквальному с целью тонкой или скрытой насмешки» [1, с. 185]. Немецкий лингвист М. П. Брандес утверждает, что, «как перенос значения по противоположности, ирония носит ярко выраженный оценочный характер» [2, с. 375]. М. К. Морен

и Н. Н. Тетеревникова полагают, что «стилистическая двойственность иронии объясняется столкновением номинативного и контекстуального значений слова, подчёркивающим их противоречивость» [4, с. 219].

Лингвисты Д. Мюкке и Н. Кнокс усматривают сущность иронии в конфликте субъективного и объективного. Английский литературовед Н. Кнокс дефинирует иронию как «конфликт двух значений, для которых специфична драматическая структура: исходное первое значение, видимость, представляется как очевидно истинное, но когда разворачивается контекст с этим значением, он постепенно открывает непредвиденный и противоположный смысл, реальность – измерение, в котором первое значение выступает как фальшь или ограниченность», т.е. контраст между реальным и видимым: порицание под видом похвалы (blame-by-praise) или похвалу под маской порицания (praise-by-blame) [8].

Мы определяем иронию как прагмалингвистический феномен, состоящий в непрямом языковом выражении продуцентом своего отношения к объекту иронии, средство реализации субъективно-оценочной модальности, а также лингвистическую и эстетическую категорию, основанную на контрасте отрицательного номинативного значения и его притворного положительно образа. Негативная модальность не является обязательной для иронии; однако если она отсутствует в плане содержания (критика под видом похвалы), то она существует в плане выражения (похвала под видом упрека).

Систематизация типов иронии, учитывая разнообразие языковых средств реализации, функций, когнитивных структур, – не представляется возможным. Правомерно взглянуть на таксономии, представленные различными исследователями и выделенные на разных логических основаниях.

Существование вербальной и ситуативной иронии неопровержимо и глубоко отражено в работах следующих лингвистов: О. П. Ермакова, С. И. Походня, Е. В. Мартьянова, D. Muecke, C. Shelley, D, Littman, J. Mey, L. Hutcheon, R. Kreuz, L. A. Juez, M. Harris, X. Zhang. Их различие основано на принципах семиотики: вербальная ирония использует ведущую знаковую систему (естественный язык), ситуативная ирония со знаковой системой не связана (рассматривается с позиций когнитивистики; субъективна и зависит от точки зрения наблюдателя).

Общеизвестная классификация присутствует в трудах Р. Кройца и Р. Робертса. Исследователи выделяют четыре разновидности иронии: сократову иронию, драматическую иронию, иронию судьбы (ситуативную), и вербальную иронию [9].

В научном труде Е. А. Печенихиной анализируются преимущественно языковая и речевая ирония. Для реализации языковой иронии требуется только минимальный контекст или же контекст не требуется вообще, ироническая окраска настолько соединяется со значением слова, что это даже отражено в словарях. Речевая ирония, наоборот, требует отсылки на контекст. Ее основным сигналом является соотнесение содержания высказывания и действительности. Кроме того, Е. А. Печенихина рассматривает индивидуально-авторскую (творческую) иронию как особый вид речевой иронии [5, с. 11].

Австралийский исследователь, Д. Мюкке стремится построить общую теорию иронии в работе «Ирония и ироническое», в которой выявляет следующие разновидности: самообман, иронию событий, двойную иронию, иронию по аналогии, ироническое осмеяние, невербальную иронию, неосознаваемую иронию, ироническую неуместность, ироническое простодушие, наивность, иронию как

риторическое понуждение, сдержанную насмешку или самоумаление, драматическую иронию или зрелище безрассудства (ослепления), космическую иронию (Т. Харди), романтическую иронию, уловку (Д. Хэллер) [11, p. 7].

Рассмотрение иронии как контекстуально обусловленного явления находит отражение в работах С. И. Походни, А. В. Сергиенко, Ж. Е. Фомичевой, Ю. В. Каменской, О. П. Ермаковой, О. Г. Петровой, исходя из которых можно также выделить две основные категории: иронию контекстуальную и текстообразующую. Под контекстуальной понимается ирония в своем стилистическом толковании, как троп, которая реализуется только языковыми средствами. Текстообразующая ирония – это содержательная, мировоззренческая категория, то есть категория сознания [3], взгляд на действительность (Т. Манн), и реализуется при помощи средств экстралингвистических средств.

Исходя из проанализированного материала мы констатируем, что исследователи совмещают лингвистические, психологические, прагматические критерии, в результате чего создание непротиворечивой таксономии с учетом всех факторов невозможно.

Проанализируем более подробно, как реализуются наиболее частотные типы иронии в белорусскоязычных произведениях П. В. Васючэнка «Жаласлівая Каралеўна» и «Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага», в которых было выявлено 48 иронических контекстов. Пётр Васильевич Васюченко известен одновременно как драматург, создатель иронических детских стихов про животных и экологических сказок. А еще он популярен как создатель двух уморительных персонажей – панов Кублицкого и Заблоцкого.

Драматическая ирония предполагает наличие третьего участника коммуникации – наблюдателя (зрителя, читателя, интерпретатора авторского замысла), который и является настоящим адресатом иронии. Объект иронического осмеяния, являющийся непосредственным участником коммуникации, воспринимает только буквальный смысл сказанного и неспособен понять истинные намерения продуцента иронии. Цель иронии в следующем примере – высмеять образ и максимально принизить трезвость суждений служанки Дрыпы, которая не понимает, что ее ужасно постриг не француз, а стригаль (овечий парикмахер) и действительно считает себя подходящей партией для царя: *Там, на рынку, дзей як кіем набіта, няма дзе голкай ткнуць. Дзеўку Дрыпу гандляры хапаюць за рукавы, за світу: купі хусту! Купі пернікі! Купі чорта лысага!*

– Чаго зяпу разявіла, шаношная мамзеля? – пытае панок у белым хвартуху.

– Выбачайце, спадарыку, – нясмела кажа дзеўка Дрыпа, – ці не вашэць летась стрыгла авечкі ў тутэйшага пана Кіндзюшкі.

– Не, гэта не я! – спрытна адказвае панок. Я з Парыжа, пранцузскі цырульнік, гэта па вашаму пастрыгач. Магу й цябе пастрыгчы, станеш вочынна красівая, вужасна прыўкрасная.

«А што, хіба й так, раздумвае сабе Дрыпа. – Цар Максімілян абы-каго замуж не возьме».

Выделим также классический пример *вербальной иронии*, которую М. Абрамс и Дж. Харфам рассматривают как высказывание, в котором значение, употребляемое говорящим, коренным образом отличается от значения, которое якобы выражено [6, p. 202]. Необходимо отметить, что отличие вербальной иронии от драматической заключается в том, что она создается говорящим намеренно. Например, восклицание пана Кубліцкага, что Дрыпа выглядит как

королевская дочка, явно противоречит фактам и создает иронию: *Выходзіць Дрыпа з бадуна ні цавай, ні варонай, а рыхтык абскубаная авечка. Усіх вераб'ёў на рынку ўспудзіла. Але йдзе сабе вясёлая, бо ў прыполе звіняць яшчэ два талеры <…> тым часам паны Кубліцкі і Заблоцкі, галодныя ды сярдзітыя мірна яе чакаюць. Адчыняюцца дзверы й уваходзіць дзеўка Дрыпа, але яе не пазнаць.*

– Не, ты не Дрыпа, – урэшце выціскае з сябе пан Заблоцкі. – Ты якаясь іншаземная паненка, мо нават каралеўская дачка.

Ирония судьбы (или ситуативная ирония) – особая разновидность иронии, которую Г. Колстон и Р. Гиббс охарактеризовали как «*…недостаточно изученную двоюродную сестру вербальной иронии*» [7, p. 3–21]. По мнению C. Shelley и J. Lucariello, ситуативная ирония не связана с определенной семиотической системой и образуется в ситуации, при которой говорящий усматривает несоответствие ожидаемого и реального положения дел – альтернативную версию событий или нарушение социальных норм [12, p. 776]. Ирония активируется, когда в ситуации обнаруживается комбинация следующих характеристик: неожиданность, человеческая слабость, результат и противодействие [10, p. 129–145]. Следующий пример иллюстрирует иронию, которая возникает в результате столкновения ожиданий рассказчика с истинным ходом событий. Предположение пана о том, что в гипермаркетах людей разделывают на котлеты, иронично по своей сути, поскольку очевидно противоречит действительности. Автор намеренно подчеркивает наивность и неосведомленность сельских жителей в новшествах современной жизни: *Пабачым паноў ужо на кірмашы ў Смургонях. Там шмат чаго памянялася – «няма таго, што раньш было». Вясёлы хлопец не прапаноўвае нікому загадкавыя мармышкі. Знікла буда пастрыгача, і на ягоным месцы вырасла стадола з шыльдаю «Салон моды». Стаіць яшчэ вялізазная стадола з шыльдаю «Гіпермаркет», у якую патыркацца страшна, бо невядома, што там з людзьмі робяць, можа сякуць на катлеты.*

Принимая во внимание классификацию Д. Мюкке, мы можем выделить один из нетривиальных типов иронии – *неосознаваемую иронию*. Пан Кублицкий демонстрирует ироническое простодушие, когда говорит, что готов уступить единственные штаны пану Заблоцкому, если тот умрет первым, и как-нибудь проживет и без них. Авторский посыл направлен на распознание ироничности читателем, так как художественный персонаж абсолютно наивен и не осознает насмешливости своего высказывания: *Вось гэта былі паны дык паны! Былі ў іх на дваіх адны штаны. Хто першы ўставаў, той тыя штаны й надзяваў.*

– А што пане Заблоцкі, некалі настане час паміраць. Каго тады ў труну ў белых штанах пакладуць? Бо на двух белых штаноў не хопіць…

– Хто перше памрэ, хай на таго тыя белыя штаны і накладуць, – флегматычна адказвае пан Заблоцкі.

– Тады, пане, хай табе дастануцца гэныя белыя штаны, а я ўжо як-небудзь і без белых штаноў па свеце пахаджу… – велікадушна кажа пан Кубліцкі.

Мы пришли к выводу, что попытки создать неопровержимую таксономию непродуктивны. Основная проблема всех существующих классификаций, на наш взгляд, заключается в их субъективности, так как индивидуальность восприятия художественного текста является общепризнанной. Следует признать, что ирония не является ни тропом, ни фигурой и ее нельзя считать исходным компонентом. Иронический контекст может создаваться или интенсифицироваться при помощи вариативных тропов так же, как и обходиться без стилисти-

ческих фигур и основываться на общих когнитивных механизмах (умении распознавать нарушения смысловой целостности высказывания, выявлять несоответствия реальной ситуации нашему знанию о нормальном ходе событий).

ЛИТЕРАТУРА

1. *Ахманова, О. С.* Словарь лингвистических терминов : ок. 7 000 терминов / О. С. Ахманова. – 2-е изд., стер. – М. : Сов. энцикл., 1969. – 607 с.
2. *Брандес, М. П.* Стилистика текста: теоретический курс : на материале нем. яз. : учебник / М. П. Брандес. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Прогресс-Традиция : Инфра-М, 2004. – 413 с.
3. *Каменская, Ю. В.* Интертекстуальные включения как средство актуализации текстообразующей иронии в раннем творчестве А. П. Чехова / Ю. В. Каменская // Проблемы литературного диалога : сб. науч. тр. / Сарат. гос. ун-т ; редкол.: Е. Е. Захаров (отв. ред.) [и др.]. – Саратов, 2002. – С. 90–96.
4. *Морен, М. К.* Стилистика современного французского языка : учебник / М. К. Морен, Н. Н. Тетеревникова. – М. : Высш. шк., 1970. – 262 с.
5. *Печенихина, Е. А.* Языковое выражение иронии в произведениях Ж. М. Эсы де Кейроша : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.05 / Е.А. Печенихина ; Моск. гос. ун-т. – М., 2010. – 24 с.
6. *Abrams, M. H.* A glossary of literary terms / M. H. Abrams, G. G. Harpham. – 10th ed. – Boston : Wadsworth Cengage Learning, 2011. – IX, 448 p.
7. *Colston, H. L.* A brief history of irony / H. L. Colston, R. W. Gibbs // Irony in language and thought: a cognitive science reader / ed.: H. L. Colston, R. W. Gibbs. – N. Y. ; London, 2007. – P. 3–21.
8. *Knox, N. D.* Irony / N. D. Knox // Dictionary of the history of ideas : in 4 vol. / ed. Ph. P. Wiener. – N. Y., 1973. – Vol. 2. – P. 626–634.
9. *Kreuz, R. J.* Asymmetries in the use of verbal irony / R. J. Kreuz, K. E. Link // J. of Lang. a. Social Psychology. – 2002. – Vol. 21, № 2. – P. 127–143.
10. *Lucariello, J.* Situational irony: a concept of events gone awry / J. Lucariello // J. of Experimental Psychology: General. – 1994. – Vol. 123, № 2. – P. 129–145.
11. *Muecke, D. C.* Irony and the ironic: the critical idiom / D. C. Muecke. – 2nd ed. – London : Methuen, 1982. – 110 p.
12. *Shelley, C.* The bicoherence theory of situational irony / C. Shelley // Cognitive Science. – 2001. – Vol. 25, № 5. – P. 775–818.

УДК 821.161.3-4 Васючэнка

А. І. Белая (Баранавічы)

МЕНТАЛЬНЫ ПАРТРЭТ БЕЛАРУСА Ў ЭСЭІСТЫЦЫ П. В. ВАСЮЧЭНКІ

Сучаснае беларускае мысленне найлепей выяўляецца ў форме інтэлектуальнага эсэ, а першая частка вядомага выслоўя Рэнэ Дэкарта «Я мыслю – значыць існую» ёсць інтэгральная матрыца эсэ. Няма эсэ без уласнага «Я» перадусім, але і няма эсэ без «Я», якое мысліць. Аднак не трэба блытаць эсэ з філасофскім трактатам. Так сцвярджае беларускі філосаф В. Акудовіч. На яго думку, «эсэ – не зусім чыстае мысленне, а вольнае дыханне мыслення. Гэта значыць, што эсэ мысліць не толькі ўласна мысленнем, а ўсёй сваёй дрогкай субстанцыяй» [1, с. 240]. Інакш кажучы, прадмет, што спасцігаецца эсэістычна, «нібы сам стварае дысцыпліну пра сябе, з аб'екта метадалогіі ператвараецца ў суб'ект, з паняцця, якое мысліцца, – у мысленчае [мыслящее] разуменне самога сябе» [4].

Эсэізм дазваляе дасягаць найбольшай змястоўнасці пісьма, спалучаючы рознаўзроўневыя і разнаякасныя паняцці. Гэтую асаблівую якасць насычанасці думкі, якая вызначаецца ўзаемаадштурхоўваннем і ўзаемапрыцягненнем разнародных паняццяў, М. Эпштэйн называе інтэлектуальнай пругкасцю [Там жа]. Эсэ, на яго думку, ёсць шматсастаўнае імя ўласнае свайго прадмета. Эсэіст мог бы напісаць аповед пра што заўгодна, зыходзячы з асаблівых, непаўторных уласцівасцей пэўнага прадмета. Такім прадметам для П. Васючэнкі як эсэіста з'яўляецца беларуская ментальнасць. Найбольш скандэнсавана аўтарская думка ў эсэ «Беларус вачыма беларуса». Яно адкрывае рубрыку «Выніковыя эсэ» ў аўтарскім зборніку «Ад тэксту да хранатопа». Як адзначае пісьменнік, «ва ўсіх спробах акрэсліць тып беларуса – ці робяць гэта суседзі, ці робяць свае, –

заўжды будзе прысутнічаць момант непрасветленасці, недапраяўленасці, недавыказанасці. <…> У Беларусі шмат чаго алагічнага, невытлумачальнага, не падуладнага сілагізму. У гэтым трагедыя і абранасць» [3, с. 124–125].

Варта таксама адзначыць аб'ектыўную запатрабаванасць эсэ ў пераломныя, памежныя эпохі, бо менавіта праз эсэістычнасць знаходзіць выйсце кантакт індывідуальнай і грамадскай свядомасці. Іманентная эсэ няпэўнасць карэлюе з хісткасцю новай карціны свету, а тэндэнцыя ўхіляцца як суцэльнага сцвярджэння, так і чыстага адмаўлення набліжае яго да ментальнасці творцы-беларуса як *сярэдняга* чалавека. Элементы эсэ ўжо з пачатку XX ст. арганічныя для дарожных нататак, лістоў, успамінаў, абразкоў, запісак, дзённікаў, замалёвак, імпрэсій, «вершаў у прозе» (ад Цёткі, Ядвігіна Ш., З. Бядулі, М. Гарэцкага да прозы «Маладняка», ранняй прозы К. Чорнага).

Вобразнасць у эсэ – элемент звышмастацкага цэлага. Уварванне мастацкага вобраза, метафары, будзённага або гістарычнага факта ў галіну мыслення таксама спрыяе стварэнню ўнутры яго пругкай сферы іншамыслення і неймавернасці. У эсэ «Беларус вачыма беларуса» такі эфект, у прыватнасці, стварае ўведзены П. Васючэнкам вобраз «мілай маскоўскай знаёмай», якую здзіўляюць і ўражваюць нелагічныя/супярэчлівыя рысы нашых суайчыннікаў (але разам з тым пры нагодзе яна згадвае пра свае тры кроплі беларускае крыві…). Такі прыём дазваляе аўтару ажыццявіць погляд збоку на асобныя ментальныя рысы беларусаў, і асабліва некампліментарныя. Аўтар эсэ так выказваецца пра пакручастыя шляхі беларускай самаідэнтыфікацыі: «Беларуская асаблівасць палягае ў тым, што мы пачынаем прыдумваць сябе пасля таго, як нас ужо нехта прыдумае. Гэтая чужая думка пачынае свярбець, і тады беларус мусіць думаць пра сябе сам, ужо ў мэтах самазахавання» [3, с. 122].

Беларусаў, старэйшых па гістарычным узросце, прывучылі выконваць ролю меншых братоў пры моцных суседзях, але на гэтую ролю, адзначае П. Васючэнка, мы ўнутрана не згадзіліся. Паводле слушных разваг пісьменніка, кожны народ сябе прыдумвае – праз саманазву, міф і прыхарошаную гісторыю. Прыдумваючы сябе, выводзячы свой радавод з легендарных вытокаў, дабудоўваючы сваю гісторыю «за рознымі акупацыямі і адраджэннямі», мы стварылі беларуса міфалагізаванага. Але паколькі, як адзначалася, рабілі гэта запознена, то суседзі нашы ўжо надзялілі нас «такімі міфалагічнымі якасцямі, як звышцярплівасць, звышталеранцыя, забітасць, затурканасць, прыгнечанасць, мужыцкасць, бясконцая адданасць большаму брату» [3, с. 123]. Гэтай атрыбуцыі, аднак, настойліва супраціўляўся беларус гістарычны, які тым ці іншым чынам адыгрываў сваю ролю ў гістарычнай драме. Міф пра беларуса звышцярплівага, звышталерантнага, звышміралюбівага ўшчэнт рассып*а*ўся, калі ён браўся за зброю ў той час, як ад яго гэтага не чакалі. Трэці тып, вылучаны П. Васючэнкам, – беларус рэальны, які «прарос» з дзвюх вышэйзгаданых іпастасей у найноўшую гісторыю. І незалежна ад таго, выявіць ён у ёй пасіўнасць ці актыўнасць, – «у ягоных руках уласная экзістэнцыя і экзістэнцыя тых беларусаў, што прыйдуць пасля яго» [3, с. 124].

Палемізуючы са сваёй «маскоўскай знаёмай», П. Васючэнка абараняе «антрапалагічную рэпутацыю» беларуса гістарычнага, міфалагізаваную (папсаваную) у свой час М. Някрасавым, і супрацьпастаўляе погляду паэта погляд мастака. У палясоўшчыка на карціне І. Крамскога «вочы – бы два зледзянелыя возеры пад блакітна-сталёвым небам, іх позірк не абяцае чужынцу нічога добрага…» [3, с. 126]. Што да беларуса рэальнага, дык ён, лічыць П. Васючэнка, пераважна

захаваў тыя тыповыя рысы, што былі адзначаны яшчэ У. Караткевічам у эсэ «Зямля пад белымі крыламі». П. Васючэнка называе Беларусь краінай волатаў і снайпераў, а поспехі ў біятлоне звязвае з даўнейшымі партызанскімі якасцямі нашых суайчыннікаў – уменнямі страляць і ўцякаць…

Тутэйшасць – небездакорны, але, безумоўна, адметны тып нацыянальнай самаідэнтыфікацыі нашых суайчыннікаў, эмблема так званага патрыятызму месца [2, с. 76]. П. Васючэнка пераканаы: Янка Купала ведаў кошт гэтаму «“тут” як цэнтру беларускай свядомасці, яго фатуму і болю, з якімі беларус не развітаецца, напэўна, ніколі, бо нават тутэйшасць як хвароба ёсць часткаю яго самога». І, змушаныя цягам стагоддзяў змяняць свае імёны і нават мовы, беларусы «дасюль захавалі сваё найпершае – пракаветнае “тут”» [3, с. 128–129]. Як паказаў гістарычны досвед, рознага роду прыхадні сыходзілі тымі ж дарогамі, што і з’яўляліся, а тутэйшы чалавек працягваў жыць на сваёй зямлі.

Патрыятызм месца ўвасабляецца ў адносінах беларуса да свайго жытла. Хата – адзін з дамінантных локусаў нацыянальнай культуры. «За някідкай, нецікавай абалонкаю дзеецца ўласная містэрыя, таямніца, дзяліцца якой беларус ні з кім не жадае. Душа як хата, хата як душа – сімвалы беларускага эзатэрычнага існавання, адменнікі дзвюх сакраментальных формулаў яго існавання: “Я тут” і “Я ёсць”» [3, с. 132]. На першы погляд камусьці можа здацца, што беларус ахвотна адмаўляецца ад роднай мовы, ад суверэнітэту як нацыянальнага дому. Але насамрэч, сцвярджае П. Васючэнка, ён іх нікому не аддасць.

Гістарычна сфарміравалася ў беларусаў і такая рыса, якую П. Васючэнка называе звычкай да самапрыбяднення («А беларусы ж нічога не маюць…»). Аднак, як ён перыфрастычна сфармуляваў, зборліваму беларусу не пагражае галодная смерць: апошняга мяшка з бульбай у яго не будзе ніколі! Нездарма беларус, на думку аўтара, і сёння здзіўляе сваёй бульбаманіяй (як працягам геаманіі). І, зноў жа, прага працы на зямлі не сведчыць пра тое, што беларусы апанаваныя голадам. «Гэта сведчанне неспатоленага голаду духоўнага, настальгіі па “сваім”. Беларусу важна, каб на стале ў яго было сваё – “свая цыбулька, свой часнок”» [3, с. 139].

Адметнасць беларускага духу П. Васючэнка метафарызуе як блукаючую ваду падземнага возера. «Яго засыпаюць жвірам, заганяюць у падземныя лабірынты, і ніхто не ведае, дзе ён паўстане далей. Ён неўміручы, як гэтая блукаючая вада» [3, с. 140]. Адна з формаў захавання беларускага духу – так званая ўнутраная эміграцыя, якая не патрабуе ад’езду ў іншыя краіны. (З. Бядуля ў рамане «Язэп Крушынскі» ўжывае выраз «нутраныя замежнікі», які ўзыходзіць да часоў ідэалогіі РАППа.). Нашы паэты маўчалі гадамі, адзначае П. Васючэнка, а мова – дзесяцігоддзямі. Пакрыёмага існавання амаль ніхто не заўважаў да таго часу, пакуль беларусы зноў не выходзілі з лабірынту. І. Мележу належыць адзін з вобразных этнонімаў беларусаў – «людзі на балоце». П. Васючэнка інтэрпрэтуе яго, маючы на ўвазе такія ментальныя рысы нашых суайчыннікаў, як, з аднаго боку, вонкавы спакой, а з другога – непрадказальнасць. Гэтую стыхію рызыкоўна выпрабоўваць, засцерагае аўтар эсэ, і прыгадвае яшчэ адну асаблівасць балота: на ім немагчыма што-небудзь трывалае збудаваць, але і разбурыць дарэшты таксама немагчыма. «Балота – не мора, каб бушаваць і бурапеніць» [3, с. 140].

Важнай рысай ментальнага партрэта кожнага народа з’яўляюцца яго ўяўленні пра іншыя народы (гетэрастэрэатыпы) і адносіны да іх прадстаўнікоў. П. Васючэнка выказвае думку пра тое, што ў беларусаў няма вялікай любові да якога-небудзь іншага народа ці нацыі, але яны не маюць і грунтоўнай нянавісці

да іншых народаў. Ім не ўласцівы радыкальны нацыяналізм, беларускі месіянізм, ваяўнічы антысемітызм. Дададзім да гэтых разваг, што ў айчыннай літаратуры адбілася неадменная цікавасць герояў-беларусаў да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей як да суб'ектаў адрознай (ці роднаснай) культуры або ментальнасці, схільнасць да параўнання асобных ментальных рысаў, пры гэтым не заўсёды на карысць уласных.

«Беларус не можа ненавідзець іншыя народы, але ў штурханіне, барацьбе за месца пад сонцам ёсць у яго свая стратэгія», – інтрыгуе чытача аўтар эсэ. І гэтай стратэгіяй з'яўляецца пацвельванне, «мяккая, ачышчальная тэрапія смехам. Беларус не жадае ліха сваім суседзям, калі іранізуе з іх» [3, с. 140]. І апраўдвае гэтую стратэгію беларусаў тая акалічнасць, што «найболей ахвотна і дасціпна яны пацвельваюцца з саміх сябе» [3, с. 143], пра сябе склалі і самыя крыўдныя показкі. А высмейваюцца ў першую чаргу тыя рысы, якія нам прыпісваюцца, у тым ліку правінцыялізм, вясковасць, ксенафобія, здрадлівасць. «Самаіронія беларусаў – папераджальны захад супраць нянавісці. Мы смяёмся з тых міфалагемаў, якімі нас надзяляюць, і прымушаем іншых смяяцца, а не ненавідзець» [3, с. 144].

Жыццё, хвароба, смерць – адзінкі шэрагу экзістэнцыйных дыхатамій, якія вызначаюць галоўнае, чым жыве чалавек, незалежна ад гістарычнага часу і ўмоў існавання. Людзі падобныя, пісаў Э. Фром, бо ўсім трапілася адна «чалавечая сітуацыя» [2, с. 84], але яны і ўнікальныя, бо кожны вырашае яе па-свойму. Невыпадкова П. Васючэнка закранае ў сваім эсэ адносіны беларусаў да хваробы і смерці. Менавіта ў час хваробы беларус выяўляе тую звышцярплівасць, якая часта робіцца прадметам міфатворчасці, і здольны вытрываць любы боль. Цягам доўгага часу сфарміраваўся страх простага беларуса перад лекарам і недавер да яго (мае месца і агульны недавер да вучоных людзей як прадстаўнікоў іншай сацыяльнасці). З гэтага вынікае і невялікае жаданне лячыцца ў бальніцы. Бо, як трапна заўважае П. Васючэнка, «няма ў нас такой ментальнае рысы – ахвоты да ляжання. У Беларусі Ілья Мурамец не пралежаў бы і трыццаці трох дзён, бо яго сцягнулі б з печы» [3, с. 146]. А ўлетку беларусам увогуле няма калі хварэць ды паміраць! Разам з тым, канстатуе назіральны аўтар, апелюючы як да рэчаіснасці, так і да мастацкай рэальнасці, менавіта ў бальніцах беларусы як нідзе выяўляюць цярплівасць ды законапаслухмянасць; бальніца прышчапіла беларусам кепскую звычку – хадзіць шоргаючы ды ўгнуўшыся. Можа, і ўсе хваробы пайшлі ад гэтай звычкі – існаваць угнуўшыся ды шоргаючы? Аўтарская іронія далей змяняецца аптымізмам, які ўласцівы эсэісту не толькі як чалавечай індывідуальнасці і суб'екту творчасці, а і як носьбіту рыс нацыянальнай ментальнасці: «Не абмінулі гэтай хваробы многія народы. У тым ліку і мы, грэшныя. Праходзіць час, і людзі выпрастваюцца, паколькі кожнай хваробе пакладзены канец. Беларусы ж паводле ментальнасці настроены на неўміручасць, бо яны, як кажа філосаф Валянцін Акудовіч, абраныя вечнасцю» [3, с. 147].

Падсумоўваючы сказанае, адзначым: эсэістыка П. Васючэнкі – яскравы ўзор сучаснага інтэлектуальнага дыскурсу, які можна ахарактарызаваць не толькі як мысленчае спасціжэнне пэўнага прадмета, а і як асабовае самавыяўленне суб'екта творчасці. Эсэістычнае спасціжэнне беларускай ментальнасці, якая характарызуецца, па словах пісьменніка і навукоўца, праявамі непрасветленасці, недапраяўленасці, недавыказанасці, алагічнасці, невытлумачальнасці, непадуладнасці сілагізму, адпавядае паказчыкам інтэлектуальнай пругкасці (М. Эпштэйн). Яе ўзмацняюць мэтазгодная, дарэчная інтрузія мастацкага вобраза,

метафары, фактаў побыту і/ці з’яў быцця ў галіну мыслення. П. Васючэнка вылучае тры ўмоўныя тыпы беларуса і рэльефна абмалёўвае асноўныя рысы іх ментальнага партрэта. Асаблівая ўвага нададзена з’яве тутэйшасці, што маркіруе «патрыятызм месца» нашых суайчыннікаў, і, у яе кантэксце, – сімволіцы хаты. Даследаванне беларускай ментальнасці непадзельна ў эсэ П. Васючэнкі з іроніяй, якая рэпрэзентуе аўтара як суб’екта беларускай нацыі і культуры, а аб’ектыўна складае адметнасць дыскурсу пераходных перыядаў. Значнае месца ў аналізаваным творы займаюць не толькі аўта-, але і гетэрастэрэатыпы беларусаў; з пазіцый каштоўнаснай іерархіі нашага народа даследуюцца такія экзістэнцыйныя дыхатаміі, як здароўе і хвароба, жыццё і смерць.

ЛІТАРАТУРА

1. *Акудовіч, В.* На рыштаваннях горада Сонца / В. Акудовіч // Дзеяслоў. – 2020. – № 5. – С. 233–254.
2. *Белая, А. І.* Беларуская проза першай трэці XX ст. : станаўленне сістэмы персанажаў, тыпы і эвалюцыя мастацкіх характараў / А. І. Белая ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранавіцкі дзярж. ун-т. – Баранавічы : БарДУ, 2018. – 352 с.
3. *Васючэнка, П.* Беларус вачыма беларуса / П. Васючэнка // Ад тэксту да хранатопа. – Мінск : Галіяфы, 2009. – С. 122–150.
4. *Эпштэйн, М.* Эссеистика как нулевая дисциплина [Электронный ресурс] / М. Эпштейн. – Режим доступа : http://old.russ.ru/antolog/intelnet/mt_essayistic.html. – Дата доступа : 11.10.2020.

УДК 82-17+[821.161.3+821.162.1]“16”

А. У. Бразгуноў (Мінск)

САТЫРА Ў “ПАСОЛЬСТВЕ І КАРОТКІМ АПІСАННІ ПЕРАМОВАЎ З МАСКВОЮ” Г. ПЕЛЬГРЫМОЎСКАГА[1]

У пачатку XVII ст. Рэч Паспалітая і Маскоўская дзяржава з новым імпэтам прыступілі да вырашэння праблем ва ўзаемаадносінах, спароджаных Інфлянцкай вайной і дынастычнымі праектамі. Развязанне спрэчных пытанняў было мэтай дыпламатычнай місіі, адпраўленай Рэччу Паспалітай у канцы верасня 1600 г. у Маскву, місіі, сакратаром якой быў прызначаны Г. Пельгрымоўскі. Запісы, зробленыя як па шляху ў Маскву, так і ў самой сталіцы суседняй дзяржавы, пасля вяртання аўтара на радзіму паслужылі яму асновай для вершаванапразаічнага апісання пасольства. Акрамя відавочна інфармацыйнай (як і што адбывалася), дыдактычнай (як трэба праводзіць перамовы), выхаваўчай (як трэба адстойваць інтарэсы радзімы), у творы вырашаюцца пэўныя ідэйныя і эстэтычныя задачы. Аднак характар вырашэння шмат у чым быў абумоўлены адрозненнямі ў дзяржаўна-палітычным і культурна-грамадскім уладкаванні названых дзяржаў, адрозненнямі, якія часта аказваліся ў фокусе ідэйна-эстэтычнай крытыкі з боку аўтара. У гэтай сувязі мне хацелася б закрануць вынесеную ў загаловак дадзенага артыкула праблему.

Патэнцыял сатырычнага выяўлення ў “Пасольстве...” ў многім прадвызначаецца яго тэматычнай шматпланавасцю. Акрамя падрабязнага і каларытнага апісання дыпламатычных рытуалаў і баталій, царскіх аўдыенцый і абедаў пры двары, аўтар прыводзіць таксама жывапісныя сцэны побыту ў Маскве саміх паслоў, пэўныя дэталі з жыцця баяраў і простага люду. Ён дае пераважна адмоўныя ацэнкі норавам і звычаям рускага народа, яго рабскай псіхалогіі, як і ігнараванню ўладамі пытанняў кнігавыдання, навукі і асветы. Па трапнай заўвазе Р. Кшывога, творца наогул “не ўпускае ніводнай нагоды, каб паказаць маскоўскую культуру ў негатыўным асвятленні” [5, с. 21].

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах выканання тэмы Г20Р-383 пры падтрымцы БРФФД.

Прычына такога стаўлення бачыцца не ў індывідуальных асаблівасцях характару Г. Пельгрымоўскага, не ў жаданні адпомсціць словам за прычыненыя падчас пасольства крыўды і нязручнасці, а ў яго светапоглядных установаках. Няма сумнення, што аўтар пазіцыянуе сябе ў якасці прадстаўніка "вышэйшай культуры", які дзеля паспяховага выканання дыпламатычнай работы вымушаны пакутаваць сярод "варвараў". Тут нельга не згадаць трапную характарыстыку, дадзеную Г. Пельгрымоўскаму як аўтару С. Кавалёвым: "Цікаўнае вока пана пісара заўважае шмат каларытных дэталяў, а скептычны розум дае ім паблажліва-іранічную або здзекліва-саркастычную ацэнку" [2, с. 285]. У многім гэта нагадвае адчуванні еўрапейскага каланіста, які воляй лёсу аказваецца між дзікіх плямёнаў нязведаных краін. У многім, але не ва ўсім. Неаднойчы ўжо заўважалася даследчыкамі, што ў XVI–XVII стст. у Еўропе запанавалі спецыфічныя ўяўленні што да ступені цывілізаванасці народаў, прычым вектар "цывілізацыя → варварства" быў скіраваны з Заходняй Еўропы ў бок Маскоўскай дзяржавы. Замацаванню стэрэатыпа паспрыялі многія чыннікі. Не апошнюю ролю адыгралі ў гэтым гістарыяграфічныя крыніцы кшталту "Трактата пра дзве Сарматыі" М. Мяхоўскага, дзе Масковія на цывілізацыйнай "шкале" была аднесена акурат да азіяцкай, г. зн. варварскай, часткі. Або такія апісанні звычаяў маскавітаў, якія прадстаўлены ў трэцяй частцы сёмай кнігі "Хронікі Еўрапейскай Сарматыі" А. Гваньіні. Таму Г. Пельгрымоўскі ў сваёй крытыцы "адсталасці" маскавітаў не арыгінальны:

Nie zabawią nauką, czytać, pisać mało,
Samym trochę władykom ledwo się dostało...
Dość mądry, dość uczony, dość to biegły będzie,
Gdy obiedną zapoje z popy stojąc w rzędzie [6, s. 152].

(*"Не займаюць сябе навукай, мала чытаюць і пішуць, // Адны толькі ўладыкі трохі цямяць. // Дастаткова мудрым, дастаткова вучоным, дастаткова абазнаным палічаць, // Калі хто заспявае абедню, стаўшы побач з папамі"*.)

Падобнае ўспрыняцце не толькі маскавіта, а праваслаўнага чалавека наогул, у тым ліку і святара, як малаадукаванага, у сацыяльна-культурную прастору Рэчы Паспалітай было прыўнесена ці не П. Скаргам у яго палемічным творы "Пра адзінства Царквы Божай" (1577).

Трактаванне апанента як ніжэйшага па культурным статусе стварае толькі перадумовы для сатырычна дыскурсу, паколькі, як заўважае В. Цюпа, "дэгераізацыя сама па сабе яшчэ не складае дастатковых падставаў для сатырычнай мастацкасці. Неабходная а*ктыўная аўтарская пазіцыя высмейвання*, якая перакрывае заганнасць свайго аб'екта і стварае мастацкую цэласнасць прынцыпова іншага тыпу" [3, с. 58]. А гэта азначае, што аўтар павінен праявіць сваю індывідуальнасць, сатыра мае набыць суб'ектыўную афарбоўку, павінна быць прапанавана альтэрнатыва, больш высокая ў ідэйна-эстэтычнам плане. Прытым для сатыры, як вядома, характэрна рэзка выяўленая негатыўная афарбоўка, адмысловае перабольшванне, завастрэнне, гіпербалізацыя з'явы.

Cóż Moskwa, co szczyrości, Boga nie ma w sobie
I wszytko, co jest złego, skryła w swej osobie? [6, s. 173].

(*"Што ўжо казаць пра масквy, якая не мае шчырасці, Бога ў сабе // І ўсё што ні ёсць злое схавала ў сваёй асобе?"*)

Такой безапеляцыйнай заявы з боку Г. Пельгрымоўскага было відавочна недастаткова. Таму ён звяртаецца да разгорнутай аргументацыі, якую змяшчае

ў апісанні сесіі перамоў за 17 студзеня (вершы 2793–2999). Кожная з трох частак аргументацыі мае красамоўную назву – “Эпітэты маскоўцаў”, “На маскоўскую няволю”, “На маскоўскае тыранства”. Аўтар прыпадабняе маскавітаў аднавокім цыклопам, якія не бачаць нічога, акрамя таго, што знаходзіцца пад самым носам. Крытыкуючы мясцовыя ўяўленні – “шчаслівыя і дабраславёныя тыя людзі, якія падобныя неразумнаму зверу на зямлі” [6, с. 153], робіць выснову: такія калі не будуць узнесены на неба, то прычакаюць пашаны ад аслоў. Або, горш за тое, піша, што маскавіты – “нелюдзі, лернейская зараза, амаль усяе Еўропы вечная ганьба і параза” [6, s. 152]. Не здаволіўшыся міфалагічнымі і біблійнымі параўнаннямі, Г. Пельгрымоўскі ўпісвае маскавітаў таксама і ў гістарычную тыпалогію, заяўляючы:

Zagasło Kaligule niezbożne pogaństwo,
Zagasło Neronowi podobne tyraństwo
Przed moskiewskim [6, s. 154].

(*“Змізарнела бязбожнае язычніцтва Калігулы, // Змізарнела ўласцівае Нерону тыранства // Перад маскоўскім”.*)

У цэлым, як зазначалася вышэй, аргументацыя скіравана на тое, каб выставіць апанентаў варварамі, што не жадаюць прыняць агульнаеўрапейскіх нормаў права і этыкету. Аднак, ствараючы своеасаблівы каталог заган, аўтар не толькі дае сваю эстэтычную ацэнку, але і раскрывае прычыны “адсталасці” маскавітаў, чаму яны абралі “тыранства і няволю маюць замест законаў” [6, s. 155]. Уся справа, на думку Г. Пельгрымоўскага, палягае ў несвабодзе, а таксама ў няведанні старажытнай гісторыі і Бібліі, якія для еўрапейца той эпохі служылі не толькі крыніцай найвышэйшага пазнання ды люстрам узорных паводзін, але і размежавальным знакам паміж светам цывілізацыі і светам варварства:

Wy, Moskwa, co czynicie, zaście też poganie,
Że was mierzi, co dobrzy czynią krześcijanie,
Że i drugim niewoli, i sobie życzycie [6, s. 156].

(*“Вы, масква, тое робіце; сапраўды, вы таксама язычнікі, // Калі вам агідна тое, што робяць добрыя хрысціяне, // Калі і іншым, і сабе жадаеце несвабоды”.*)

Іншая справа – жыхары Рэчы Паспалітай, наогул заходніх краін, так званага рах Latina, якія з дзяцінства імкнуцца да вывучэння вызваленых навук, “без якіх – усім нам вядома – чалавек нішто” [6, s. 152], да спасціжэння дзеяў старажытнай гісторыі і суаднясення ўласных учынкаў з біблійным узорам. Для Г. Пельгрымоўскага, адданага патрыёта Вялікага Княства Літоўскага, Маскоўскае княства выступае своеасаблівым антыідэалам, што стварае перадумовы для сатырычнага вырашэння ідэйных супярэчнасцяў. Гэта той “аб’ект адмаўлення”, пра неабходнасць якога ў сатырычным творы гаворыць Ф. Шылер, зазначаючы, што “галоўнае заключаецца ў тым, каб само гэтае адмаўленне ўзнікла з ідэала, які процістаіць рэчаіснасці” [4, с. 415]. Аўтар гэтае процістаянне з боку Маскоўскага княства агульнаеўрапейскаму, адзіна правільнаму з яго пункту гледжання ладу жыцця, заўважае не толькі ў звычаях, норавах, рэлігійнай практыцы, стаўленні да чужаземцаў, візантыйскай цырыманіяльнасці княскага двара. Часам ён спыняе ўвагу на паводзінах маскавітаў у нестандартных бытавых сітуацыях, кшалту выпадку з катамі: просьба літоўскай дэлегацыі прыслаць ката для барацьбы з мышамі скончылася тым, што кожнаму ўдзельніку пасольства на асаб-

лівы загад цара з Астрахані быў дастаўлены і падораны асобны, індывідуальны кот [6, s. 52]. Падобныя ўласна гумарыстычныя эпізоды надзвычай рэдкія ў творы, найчасцей яны праяўляюцца ў сатырычным модусе. Ці не самым яскравым прыкладам тут можа паслужыць “Расповед прыстава” пра вялікага князя маскоўскага:

Że między święte idzie i pewna to o nim,
Że cuda niesłychane, dziwy wielkie po nim.
Gdy kto także innych grobów Kniaziów dotknie,
Byłby chrom, skacząc pójdzie, najmniej się nie potknie.
Kto ślepy albo z matki głuchem się urodzi,
Gdy kniaź zechce, ów zaraz do wzroku przychodzi.
I niemi i garbaci zdrowie swe miewają,
Za to mu też i pokłon i chwałę wzdawają [6, s. 158].

(*“Што ён роўны са святымі і дакладна вядома, // Што зыходзяць ад яго нечуваныя, вялікія цуды. // Таксама калі хто дакранецца да магіл іншых князёў, // Калі кульгавы, пойдзе, скачучы, і нідзе не спаткнецца. // Хто сляпы або каго маці спарадзіла глухім, // Калі князь захоча, адразу робіцца пад яго поглядам нармальным. // І нямыя, і гарбатыя вяртаюць сабе здароўе, // За што прыносяць яму паклон і славу”.*)

Аўтар відавочна не толькі з’едліва высмейвае “цудатворныя” здольнасці цара Барыса Гадунова, але і з яўным сарказмам паведамляе, што падобныя дзівосы сыходзяць нават ад магілы царовага бацькі, Фёдара Гадунова. Паколькі апошні не толькі не быў царом, але і не вызначаўся святым ладам жыцця, прыкладанне да яго канцэпцыі пра боскае паходжанне царскай улады, а тым больш пасмяротнай цудатворчасці, выглядае абсурдна. Але менавіта давядзенне вітуацыі да абсурду і з’яўляецца тым стылістычным сродкам, з дапамогай якога аўтар выказвае сваю саркастычную ацэнку сітуацыі. “Мала што можа Мікола Мажайскі ў параўнанні з імі” [6, s. 158], – маючы на ўвазе Гадуновых, па-блюзнерску заяўляе прыстаў стасоўна абраза аднаго з самых шанаваных на Русі святых. Безумоўна, стаўленне да абраза як да жывога чалавека, не магло не ўразіць Г. Пельгрымоўскага:

Raz tylko pobłądził był Kniaź z jego porady,
Gdy go zbito pod Kiesą; wzięto mu narady,
Gdy opałę narzucił nań był wielką za to,
Że mu dzwonić nie kazał na hańbę przez lato [6, s. 159].

(Аднойчы толькі памыліўся князь праз яго прадказанне, // Як быў біты пад Кессю; знялі з яго аклад, // Паколькі [князь] наклаў на яго вялікую апалу за тое, // Бо, каб зняславіць, загадаў не званіць яму на працягу года).

Пры ўсёй неверагоднасці сітуацыі аўтара нельга папракнуць у бяздумнай фантазіі, паколькі падобныя апісанні можна сустрэць і ў іншых мемуарных помніках разгляданай эпохі. Можна, згадаць “пакаранне” сялянамі абразоў шляхам выкідвання ў гной або вывешвання ў лесе дагары “нагамі” за няспраўджанне ўскладзенай на іх абарончай функцыі ў “Дыярыушы” Самуэля Маскевіча [1, с. 37].

Хаця сатыра як спосаб адлюстравання не з’яўляецца вядучай у творы Г. Пельгрымоўскага, яна, прынамсі з дзвюх прычын, адыгрывае тут істотную ролю. Па-першае, праз сваю тэндэнцыйнасць, прадузятасць, скептычную зараджанасць ва ўспрыняцці праяў “іншасці”, неадпаведных ідэйна-эстэтычным

уяўленням аўтара, і іх кантраснае проціпастаўленне з “нормай” аўтара яна адыгрывае істотную ролю ў мадэляванні аб’екта апісання. Па-другое, служыць важным сродкам выяўлення аўтарскай свядомасці і светапогляду, у тым ліку і эстэтычных уяўленняў.

ЛІТАРАТУРА

1. Дыярыушы XVII стагоддзя (1594–1707 гады) / укл., пер. з пол. мовы: А. У. Бразгуноў ; рэд. кал.: А. У. Бразгуноў (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2016. – 467 с.
2. *Кавалёў, С.* Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу / С. Кавалёў. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 376 с.
3. *Тюпа, В. И.* Модусы художественности / В. И. Тюпа // Введение в литературоведение : учеб. пособие / Л. В. Чернец, В. Е. Хализев, А. Я. Эсалнек [и др.] ; под. ред. Л. В. Чернец. – М. : Высш. шк., 2004. – 680 с.
4. *Шиллер, Ф.* О наивной и сентиментальной поэзии / Ф. Шиллер // Шиллер Ф. Собр. соч. : в 7 т. / под общ. ред. Н. Н. Вильмонта, Р. М. Самарина ; пер. с нем. под ред. Л. Е. Пинского ; послесл. В. Ф. Асмуса. – М. : Гос. изд-во худож. лит. 1957. – Т. 6 : Статьи по эстетике. – 794 с.
5. *Krzywy, R.* Wstęp / Roman Krzywy // Pielgrzymowski, Eliasz. Poselstwo i krótkie spisanie rozprawy z Moskwą ; Poselstwo do Zygmunta Trzeciego / wyd. i oprac. R. Krzywy ; red. nauk. tomu: D. Chemperek, J. S. Gruchała. – Warszawa : Wyd. Neriton, 2010. – 454 s. – (Humanizm Polski / Polonica, t. IV).
6. *Pielgrzymowski, E.* Poselstwo i krótkie spisanie rozprawy z Moskwą ; Poselstwo do Zygmunta Trzeciego / E. Pielgrzymowski / wyd. i oprac. R. Krzywy ; red. nauk. tomu: D. Chemperek, J. S. Gruchała. – Warszawa : Wyd. Neriton, 2010. – 454 s. – (Humanizm Polski / Polonica, t. IV).

УДК 821.161.3-31.09(045)

І. А. Бурдзялёва (Мінск)

ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў АПОВЕСЦІ Б. ПЯТРОВІЧА «СТАХ»

Трагічны гістарычны лёс беларусаў, вымушаных існаваць на геапалітычным скрыжаванні ва ўмовах своеасаблівага «еўрапейскага скразняку», у прасторы супрацьстаяння двух цывілізацыйных сістэм Захаду і Усходу, вызначыў светаадчуванне беларусаў як экзістэнцыйнае. Праблемы фізічнага выжывання ў стабільна паўтаральных памежных сітуацыях, адчуванне катастрафічнасці быцця, адзіноты, пакуты, пакінутасці, складанасці нацыянальнага самавызначэння абумовілі экзістэнцыйную свядомасць нацыі. Гэта натуральнае, стыхійна народжанае экзістэнцыйнае светаадчуванне ўвасобілася ў мастацкай літаратуры, не толькі ў творах празаікаў з моцным рэалістычным струменем – М. Гарэцкага, Я. Коласа, К. Чорнага, М. Зарэцкага, але і ў паэзіі Я. Купалы, М. Багдановіча, А. Гаруна і іншых аўтараў, засяроджаных на спасціжэнні псіхалагічнай і эмацыянальнай глыбіні асобы. Праявы экзістэнцыйнага светабачання адзначаюцца ў іх творах у асэнсаванні спецыфічных канстытуцыйных сітуацый, праз якія літаратура экзістэнцыялізму адлюстроўвае жыццё – сітуацыі катастрофы, крызісу, разбурэння, смерці, у даследаванні атрыбутыўных з’яў, характэрных для паэтыкі экзістэнцыялізму, – свабоды, адзіноты, адчужанасці, сутыкнення рацыянальнага і ірацыянальнага і г.д.

Першынства ў стварэнні экзістэнцыйнага героя ў беларускай літаратуры належыць, безумоўна, М. Гарэцкаму. «У спасціжэнні свайго быцця ён увесь час балансуе на мяжы выратавання і самаразбурэння. Урэшце ён мусіць змірыцца з тым, што не можа змяніць: са сваёй несвабодай, з уладай над сабой кону, са сваёй маласцю, слабасцю і смерцю. Мусіць трываць жыццё, трываць абсурд свету або бунтаваць, але ўсё роўна памерці», – піша Л. Сінькова [2, с. 108]. Агульнапрызнаным прадстаўніком экзістэнцыялізму як літаратурнага напрамку, сфарміраванага ў сярэдзіне XX стагоддзя, з беларускіх пісьменнікаў выступае В. Быкаў. Варта адзначыць, што ў беларускай літаратуры пра экзістэнцыялізм

дазволена гаварыць і аналізаваць мастацкія тэксты пад адпаведным філасофскім экзістэнцыйным ракурсам адносна нядаўна, што тлумачыцца найперш культурна-гістарычнымі прычынамі, табуяваннем да канца 80-х гг. XX ст. савецкім літаратуразнаўствам пэўных літаратурных напрамкаў, аўтараў і тэм.

Экзістэнцыялізм, як прадуктыўны культурагенны фактар эпохі, вызначыў духоўныя пошукі інтэлігенцыі, моцна паўплываў на мастацтва па абодва бакі Атлантычнага акіяна. Варта адзначыць, што згодна тэарэтыку экзістэнцыяльнай псіхалогіі Р. Мэю, экзістэнцыялізм у наш час – не проста філасофскі напрамак, а ў першую чаргу культурны рух, які адлюстроўвае глыбокае эмацыйнае і духоўнае вымярэнне сучаснага чалавека ў існуючай на дадзены момант псіхалагічнай сітуацыі, выражэнне ўнікальных псіхалагічных праблем, з якімі ён вымушаны сутыкаецца. Беларускія пісьменнікі ў складаным соцыякультурным і грамадска-палітычным кантэксце мяжы тысячагоддзяў, у спасціжэнні «індывідуальнай экзістэнцыі» і пошукаў адказаў на запыты свайго часу, зноў і зноў актуалізуюць комплекс ідэй і мастацкі вопыт экзістэнцыяльнай літаратуры. Прычына гэтага – яўная алагічнасць і абсурднасць свету, катастрафічныя настроі, якія з часам небезпадстаўна мацнеюць.

Экзістэнцыяльная свядомасць выяўлялася найперш у нетрах традыцыйнага рэалізму, які пашыраў свае магчымасці і перспектывы. У выніку сфарміраваўся непаўторны тып экзістэнцыяльнага псіхалагізму (вызначэнне Т. М. Тарасавай [3]), традыцыя якога перайшла межы XX–XXI стагоддзяў, пра што сведчыць творчасць такіх аўтараў, як В. Казько, А. Федарэнка, У. Сцяпан, Ю. Станкевіч, Б. Пятровіч. Невыпадкова многія творы Барыса Пятровіча маюць дзве даты напісання. Так, раман «Спачатку была цемра» пісьменнік перанёс праз дзесяцігоддзі, пераасэнсоўваў і перарабляваў яго, пазначыўшы 1995 і 2011 гадамі. Кніга «Спакушэнне» (2013) часткова складаецца з твораў, напісаных у папярэднія гады. У кнігу «Пуц*і*на» ўвайшлі дзве аповесці, якія былі напісаныя раней, аднак дапрацоўваліся цягам гадоў і пад адной вокладкай выйшлі ў 2015 г. Кніга складаецца з твораў «Стах» (2002–1995) і «Пуціна» (2003), дастаткова рэпрэзентатыўных для творчай манеры пісьменніка. Як пазначана ў анатацыі да кнігі, у іх «яскрава спалучыліся рысы экзістэнцыялізму, класічнага пісьма і стылёвага авангардызму»» [1]. Хаця гэтыя творы пісаліся ў розны час і дастаткова адрозныя стылістычна, С. Дубавец пад час прэзентацыі кнігі адзначыў, што «аб'ядноўвае іх трывожнасць, якая прысутнічае практычна ва ўсіх творах».

Экзістэнцыяльная свядомасць узмоцнена ў Б. Пятровіча, мабыць, яшчэ і біяграфічнымі фактарамі. У беларускай інтэрнэт-бібліятэцы Kamunikat сказана, відавочна са слоў самога пісьменніка, што ён «прыйшоў у свет 17 ліпеня 1959 году. Памёр увечары 1 верасня 1970-га, каб ранкам наступнага дня зноў нарадзіцца і жыць» [3]. Таму матыў смерці прысутнічае ў многіх яго творах. Герой аповесці «Стах» шмат у чым носіць адбітак асобы аўтара, нягледзячы на тое, што для свайго героя пісьменнік абраў іншы шлях творчага самавыяўлення – жывапіс. Узаемаадносіны героя са смерцю склаліся з дзяцінства: «З маленства ён адчуваў, што лёс рыхтуе яго да адзіноты. І як мог супраціўляўся таму. Смерць не ўлічыла гэта. Яна і падумаць не магла, што ў ягоным кволым цельцы пасяліўся такі моцны дух… Але яму споўнілася ўсяго дзесяць, і ёй закарцела трохі падрасціць яго… А потым яна са смехам заўважыла, як хапаецца ён за сваё жыццё, не ўсведамляючы, што ягонае зямное існаванне можна назваць хіба суцэльнай пакутай, а шчасце ўяўным і прыдуманым» [1, с. 47]. З ранку свайго жыцця герой

пабываў на мяжы двух станаў, і гэта прымушае яго час ад часу весці дыялог са смерцю, жыць з аглядкаю на яе. Матыў непазбежнасці смерці, шляху да яе праз самапазнанне, калі чалавек праходзіць праз рай дзяцінства, чысцец дарослаці і пекла творчасці становіцца галоўным у аповесці «Стах». Перажыванне героем гэтых стадый прасочана ў трох асобных частках, якія праз эпіграфы адсылаюць да «Боскай камедыі» Дантэ. Адрознасць гэтых перыядаў падкрэсліваецца стылёвымі і кампазіцыйнымі асаблівасцямі частак трыпціха.

Да трывожнасці, якую адчуў у аповесцях С. Дубавец, варта было б дадаць боль як неад'емны кампанент жыцця ў абсурдным і няўтульным свеце. Самарэфлексіі героя напоўнены болем і расчараваннем. Першая частка трыпціха «Экспрэс, або Няспраўджанасць адзіноты» адбываецца ў аўтобусе, пад час начнога падарожжа Стаха-студэнта побач з прыгожай незнаёмкай. Апісанне чыста фізіялагічных пачуццяў да дзяўчыны-суседкі перамяжаюцца ўспамінамі з часоў вясковага дзяцінства і густа перасыпаны адкрытымі экзістэнцыйнымі разважаннямі аўтара. «Усё на свеце глыбока асабістае. Усё ў адзіночным ліку. Чалавек – самая адасобленая, самая замкнутая ў сабе істота з усіх статкавых. Ніхто не можа пабыць у скуры іншага. Чалавек – уяўны свет, які з'яўляецца з ягоным нараджэннем і знікае з ягонай смерцю» [1, с. 25]. Трошкі далей: «Самае доўгае шчасце можа не даць шчасця, а самае доўгае гора не быць горам. Не таму, што ўсё адносна і залежыць толькі ад нашага ўспрыняцця, а таму, што няма нічога вечнага. Апроч адзіноты» [1, с. 26]. Нягледзячы на знешнія атрыбуты нармальнага, паспяховага жыцця героя, першая частка заканчваецца той жа шчымлівай нотай бясконцай адзіноты ў свеце. «Ён так і застаўся адзінокім. Нічыім тут, чужым усім. І гэтай жанчыне побач, і той дзяўчынцы ў суседнім пакоі, і тым людзям, што за сценамі дома, у майстэрнях, на выставах, у часопісах…» [1, с. 49]. Стах увесь час сувымярае і асэнсоўвае сваё жыццё праз прызму смерці, разважае, што жыццё – уцёкі-набліжэнне да яе. У сітуацыі часовасці жыцця, жыцця як адтэрміноўкі, герой усведамляе адзіноту як неабходную праяву існавання, якой немагчыма пазбегнуць, але якая з часам робіцца ўсё большай пакутай. Адзіна магчымы паратунак і выбаўленне ад яе – смерць. Рана ці позна, «ён яшчэ зразумее гэта. Жахнецца… І аддасца ёй…» [1, с. 49].

Дыялектычнаму вырашэнню дыхатаміі жыццё/смерць прысвечана і другая частка трыпціха «Удол, або Актава пазнання», суаднесеная праз Дантаўскі эпіграф з чысцом. Гэта частка – фантастычныя прыгоды Стаха ў іншасвеце, у віртуальнай рэчаіснасці, дзе паэтыка ўмоўнасці дазваляе сканструяваць шэраг штучных алегарычных сітуацый-выпрабаванняў, праз якія праходзіць герой. Яны пачынаюцца ў вядомым дворыку Скарыны ў Вільні і далей разнастайным чынам працягваюцца ў чарадзе размежаваных між сабою дворыкаў. Зарука пераходу з аднаго дворыка ў наступны – неабходнасць зрабіць выбар, які патрабуе ад героя смеласці і мужнасці. Ключавым у экзістэнцыяльнай філасофіі з'яўляецца пастаноўка і вырашэнне праблемы свабоды, якая разумеецца як выбар чалавекам адной з бясконцых магчымасцей. У гэтай частцы аповесці намаляваны алегарычны шлях руху і сталення героя, яго самапазнання праз шэраг выпрабаванняў, праз усвядомлены выбар у драматычных умовах. Кампазіцыйна іспыты-выпрабаванні арганізаваны паводле актавы – ад «До» папярэдняй актавы да «ДО» наступнай. Свабода героя праз яго выбар робіцца канцэптуальным цэнтрам кожнага мінісюжэту, паказанага ў кожным дворыку актавы пазнання. Так, перадапошні дворык адпавядаў ноце «**СІ…**Ён быў пусты.

Толькі – дзверы, дзверы, дзверы… у сценах. І на кожных дзвярах надпіс: «Шчасце», «Гора», «Багацце», «Страх», «Радасць», «Боль», «Каханне»… і далей – усе мажлівыя пачуцці і станы чалавека…

Яму ж хацелася выбраць дзверы з надпісам, які ўключаў бы ў сябе ўсе гэтыя паняцці, каб раз і назаўсёды пакончыць з гэтымі пакутамі, з гэтымі выпрабаваннямі, з гэтымі вандроўкамі па дворыках…

Ён выбраў дзверы з надпісам «Смерць». Адчыніў іх і…

ДО …выйшаў на тую ж самую вуліцу, з якой увайшоў некалі ў Скарынаў дворык» [1, с. 73].

Такая "закальцаванасць" жыцця і смерці сцвярджае, што смерць – гэта выбаўленне ад цяжару і пакут жыцця, але яна аказваецца і новым пачаткам. Нездарма герой, паміраючы ў іншасвеце, вяртаецца ў рэальнасць. Аўтар ілюструе ўласную сентэнцыю, агучаную ў першай частцы: «Усё ў гэтым свеце ўзаемазвязанае, запраграмаванае і закальцаванае. І нуль, а не згвалтаваная васьмёрка – вось сімвал гэтай закальцаванай бясконцасці» [1, с. 8]. Канчатковым этапам пазбаўлення героя твора ад цяжару існавання з'яўляецца асэнсаванне ўласнай смяротнасці і прыняцце яе.

«Боская камедыя» Дантэ мае дзевяць кругоў пекла. Стах у віртуальнай прасторы прайшоў толькі восем выпрабаванняў. Апісаннем дзявятага круга выглядае трэцяя частка «Чаканне, або Зацемкі», якая праз эпіграф з «Боскай камедыі» непасрэдна і адсылае да пекла.

Што ёсць пеклам у гэтай частцы: пакутлівае стварэнне карціны, падсумаванне і пераасэнсаванне жыццёвага шляху перад абліччам хуткай смерці, прадказанай таямнічым незнаёмцам у скверыку на месцы былых лютэранскіх могілках. А можа гэта смерць, якая так і не адбылася, і герой зноў адчувае непазбежнасць занурыцца ў пачуццё безвыходнай адзіноты? «І вяртацца яму давядзецца туды, куды, па-шчырасці, чамусьці вяртацца не хочацца… Чаму? Што было ў ягоным жыцці дагэтуль? Праца, сям'я, беднасць… Што будзе цяпер? Беднасць, сям'я, праца… І, па вялікім рахунку, усё роўна, калі перапыняць, перарываць гэты ланцужок: у трыццаць гадоў, у шэсцьдзясят альбо ў сто… Дык, можа, чым раней, тым лепш? Толькі людзі, якія не задумваюцца над сваім жыццём, чапляюцца за яго…» [1, с. 118]. Хутчэй за ўсё, усё разам, а найперш адчуванне бясконцага паўтарэння, што само з'яўляецца пакутай.

Сапраўднае пазнанне быцця магчыма толькі ў "парогавай сітуацыі", што і адбылося са Стахам. Ведаючы, што жыцця засталося толькі на тыдзень, ён напружана працуе над карцінай, якая павінна адлюстраваць асноўны модус існавання чалавека ў свеце: «Там былі людзі. Там былі фарбы. І людзі і фарбы змагаліся між сабою, як дабро змагаецца са злом. Карціна была сном не сном, явай не явай, як, уласна, і само жыццё» [1, с. 88]. Канцэптуальную і кампазіцыйную завершанасць карціна набывае тады, калі пасля містычнай сустрэчы ў скверыку Стах на залатым сячэнні дамаляваў могілкі. Сэнс не толькі ў прыняцці непазбежнай смерці, якая аднолькава завяршае дабро і зло гэтага свету. Чаканне хуткай смерці дапамагло мастаку глыбей і дакладней адчуць аб'яднанасць смерцю розных фрагментаў і з'яў быцця, іх дыялектычную ўзаемасувязь праз катэгорыю смерці. Можа, дзякуючы такому філасофскаму разуменню смерці як краевугольнага каменю, які трымае ўсю мазаіку супярэчлівых праяў быцця, карціна не стварала цяжкага ўражання: «Карціна ж, пры ўсёй сваёй змрочнасці,

дыхала такою надзеяй, выпраменьвала такую дабрыню і спакой, такую ўпэўненасць, што будучыня ў нас не проста ёсць – яна светлая і шчасная, што назваць карціну трэба было неяк інакш» [1, с. 113]. Першапачатковая назва «Зыход» пасля доўгіх разважанняў мастака змянілася на «Чаканне». Роспачны настрой перамяжоўваецца ў гэтай частцы аповесці з сацыяльным аптымізмам, надзеяй у надыход лепшых часоў для Беларусі хаця бы ў сілу закальцаванасці этапаў жыццё/смерць/уваскрашэнне. Сэнс прадчування ці нават ведання часу ўласнай хуткай смерці і ў тым, што герой, працяты болем ад адчування абсурду рэчаіснасці 90-х гадоў, усведамлення адзіноты і бяссілля нешта змяніць, пры гэтым прыўзнімаецца над самім сабой, стварае выдатную карціну, якая перажыве яго, і становіцца сапраўдным Майстрам.

У аповесці прысутнічае схаваная адсылка да вядомага эсэ А. Камю «Міф пра Сізіфа» і разам з тым палеміка з ім. У фантастычна-алегарычнай другой частцы трыпціха ў бязмежнай прасторы аднаго з дворыкаў герой трапляе ў каменяломню і мусіць уключыцца ў ланцуг людзей, якіх цягнуць на сваіх плячах глыбы граніту да краю вялізнай прорвы, куды скідваюць камяні і вяртаюцца зноў да каменяломняў. І гэтак дзень пры дні. Наканаванасць на бясконцую бессэнсоўнасць не выклікае непакоры. Філасофія насельнікаў гэтай прасторы нагадвае, што называецца, звычайную жыццёвую мудрасць: «Раз дадзена нам гэткае жыццё, гэткі лёс – трэба жыць» [1, с. 69]. У якасці самаапраўдання свайго пасіўнага прыняцця жыццёвай катаргі, роўнай кары антычных багоў, сусед Стаха па ланцугу кажа, што «мне наканавана гэта: ні да чаго не імкнуцца, жыць, як жыву… І таму, нават калі б я ведаў, што заўтра надыдзе канец свету, я сёння ўсё роўна насіў бы каменне…» [1, с. 70]. Бунт Стаха прыводзіць яго ў наступны дворык, дзе апісаны магчымы варыянт сапраўднага райскага жыцця, але ў ім няма руху, як і ў папярэднім. Што надае рух быццю? Як вынікае з твора Б. Пятровіча – магчымасць свабоднага выбару, які рухае чалавека па шляху самапазнання да фінальнай кропкі яго асабістага існавання. У антычнага Сізіфа яе не было. У чалавека ёсць. У трактоўцы пісьменніка чалавек асуджаны на бясконцую паўтаральнасць цыклаў жыццё/смерць, зноў і зноў прыходзіць у свет, у якім у стане адзіноты і няпэўнасці праходзіць праз выпрабаванні і расчараванні, караскацца па жыцці, набліжаючыся да смерці, калі цяжкая ноша жыцця скідваецца ўніз, а потым зноў паўтараць жыццёвы цыкл ад пачатку. У дадзеным выпадку шчаслівы той, хто нараджаецца творцам, які мае магчымасць зафіксаваць сваё «Я», сваю экзістэнцыю праз мастацтва.

Варта вярнуцца да сцвярджэння аўтара, што сімвал закальцаванасці быцця «нуль, а не згвалтаваная васьмёрка». Паміж нулём-кругам, сімвалам паўтаральнасці, і васьмёркай, якая ёсць перавёрнутым знакам бясконцасці, няма супярэчнасці. Усё ў гэтым свеце бясконца паўтаральнае. Сімволіка васьмёркі абыгрываецца ў творы кампазіцыйна: восем пранумераваных падчастак у першай частцы трыпціха, кампазіцыйная актава ў другой, а ў апошняй Стаху нібыта застаецца сем дзён жыцця, а на восьмы ён ідзе насустрач смерці, якая так і не адбылася, бо незнаёмец, як высветлілася, знарок паблытаў даты. Стаху зноў даводзіцца вяртацца ў жыццё, што не выклікае ў героя аніякай радасці, бо гэта зноў бясконцая адзінота і балючыя рэфлексіі.

Матыў смерці ў аповесці Б. Пятровіча з'яўляецца дамінантным, ён аб'ядноўвае ўсе фрагменты аповесці і выступае той канцэптуальнай асновай, з якой суадносяцца ўсе астатнія падставовыя экзістэнцыяльныя катэгорыі: існаванне, адзінота, свабода, выбар, самапазнанне.

ЛІТАРАТУРА

1. *Пятровіч, Б.* Пуціна : аповесці / Б. Пятровіч. – Мінск : Кнігазбор, 2015. – 200 с.
2. *Сінькова, Л.* Беларуская “звышлітаратура” : літаратуразнаўчыя і літ.-крыт. артыкулы / Л. Сінькова. – Мінск : Кнігазбор, 2019 – 224 с.
3. *Тарасава, Т.* Экзістэнцыяльная свядомасць і формы яе ўвасаблення ў беларускай прозе XX ст. / Т. Тарасава // Весн. Брэсцкага ўн-та. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2017. – № 2. – С. 54.

УДК 821.161.3 – 32.09

М. М. Воінава-Страха (Мінск)

АНТАЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў НАВЕЛІСТЫЦЫ АЛЕНЫ БРАВА

Проза Алены Брава даўно з’яўляецца аб’ектам пільнай увагі літаратуразнаўцаў і крытыкаў. Даволі часта ў фокусе ўвагі даследчыкаў аказваецца “жаночы” аспект творчасці пісьменніцы. Гендарная скіраванасць – цалкам натуральная з’ява ў мастацкай прасторы XXI стагоддзя, бо пры ўсёй дынаміцы і “асучасненні” свядомасці грамадства безліч жанчын працягваюць жыць “у патрыярхальным дыскурсе і цярпліва прымаюць яго жорсткія ўмовы – поўнае самаадрачэнне дзеля блізкіх. <…> Свет насамрэч трымаецца на іх непражытых жыццях, прынесеных у ахвяру здольнасцях, нязведаных радасцях” [3].

Тым не менш аналіз шэрагу тэкстаў А. Брава дазваляе адзначыць, што яе малая проза выходзіць за рамкі чыста гендарнай праблематыкі. У навелістыцы аўтара прасочваецца выразны акцэнт на асэнсаванні самой сутнасці чалавечай экзістэнцыі. Паказваючы самыя розныя аспекты быцця гераінь, пісьменніца з усім майстэрствам псіхалагічнага аналізу раскрывае глыбіню праблем, звязаных з іх асобаснай самаідэнтыфікацыяй і самарэалізацыяй.

Так, у няспынных пошуках сваёй існасці знаходзіцца гераіня навелы “Ясным утром в Пинар-дель-Рио”. Трывалай асновай яе існавання з’яўляецца ўсепаглынальная любоў да сына і каханне да мужчыны, які, не будучы яе мужам, стаў без перабольшання адзіным сімвалам на выратаванне яе душы, моцна скаванай сацыяльна абумоўленымі ланцугамі. Акрэсленая сітуацыя выразна парадаксальная па сваім змесце. З аднаго боку, каханне – універсальная аксіялагічная катэгорыя і, здавалася б, яе дамінуючае становішча ў асабістай экзістэнцыйнай сістэме вылучаецца гарманічным характарам. З іншага боку, гэта каханне супярэчыць хрысціянскім нормам маралі, бо навідавоку парушэнне адной з дзесяці біблейскіх запаведзяў.

Дадзеная акалічнасць дэстабілізуе псіхаэмацыянальны стан гераіні і прыводзіць яе ў стан татальнага душэўнага разладу. Непрымальна варожым здаецца ўсё: нелюбімы муж, сувязь з якім пераўтварылася ў невыноснае бярэмя, яго сваякі, вымушаны кантакт з якімі настолькі абцяжарвае, што сямейнае жыццё нагадвае хутчэй тэатралізаванае прадстаўленне, грамадскі лад вакол у цэлым, існаванне згодна з парадкамі якога выклікае толькі сорам і непераадольнае супраціўленне.

Першапрычына вынікае з кантэксту навелы: немагчыма пабудаваць зладжаную сувязь на фундаменце, створаным з ілжы, якая “как гниющая слизь мертвого моллюска в перламутровой раковине… Раковина-гроб, вместилище смердящей плоти” [2, с. 321]. Адносіны, створаныя на аснове кахання, валодаюць жыццестваральнай сілай. Калі ж адзінае, чым яны падмацоўваюцца, – гэта цярпенне і маўклівае выкананне абавязкаў, разбуральная сіла імкліва нарастае, не пакідаючы кампрамісных варыянтаў, бо толькі “любовь превращает обыкновенное в прекрасное, а не наоборот” [2, с. 322].

Калі сэнсаўтваральным стрыжнем свайго жыцця гераіня навелістычнага апавядання “Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца” выбрала сына, такім чынам рэалізуючы толькі адну са сваіх іпастасей – маці, то ў гераіні “Ясным утром в Пинар-дель-Рио” прасочваецца відавочная тэндэнцыя да самаідэнтыфікацыі сябе як жанчыны. Хвароба сына Ігната дадае цёмных фарбаў у яе мацярынскія будні, але не перашкаджае прабівацца няхай кволаму, але патэнцыяльна выратавальнаму агню кахання.

Паколькі першапачаткова ў быційную аснову памылкова закладзены катэгорыі, якія супярэчаць аксіялагічнаму кодэксу, працэс жаночай самаідэнтыфікацыі застаецца незавершаным і, як вынік, гераіня пераўтвараецца ў “заживо погребенную наложницу мертвого фараона” [2, с. 309]. Напаткаўшая смерць аб’екта кахання гераіні не пакідае шанца для вызвалення з замкнёнага кола быцця і далейшай асобаснай самарэалізацыі.

Навелістычная парадаксальнасць, дамінантнае ядро якой утварае антытэтычнасць загалоўка (“Ясным утром в Пинар-дель-Рио”) і фінальнага сегмента твора (смерць доктара), – сэнсаўтваральная ў кантэксце дадзенай навелы. Змест быційнай сістэмы іманентна разбуральны па сваім характары, калі яго ключавыя складнікі выходзяць за рамкі спрадвечных законаў універсуму.

Анталагічная карціна ў навелістычным апавяданні “Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца” адрозная па сваёй сутнасці. Прыярытэт у быційнай аснове галоўнай гераіні складае гіпертрафіраваны клопат пра сына. Падобная празмерная трывожнасць і падпарадкаванне сэнсу ўласнага жыцця турботам пра дзіця можа выклікаць асуджэнне і нават абурэнне ў выхаванага ў фемінісцкім духу чытача, але ніяк не супярэчыць маральна-этычным асновам быцця ў цэлым і хрысціянскім пастулатам у прыватнасці. Па сутнасці, гэта справа ўласнага выбару кожнага чалавека. Парадаксальным жа з’яўляецца той факт, што працэс самаразбурэння непазбежны і ў дадзеным выпадку.

Першапрычына, згодна з разважаннямі гераіні, крыецца ў тым, што чалавек, “як і любая матэрыяльная *“сістэма”*, <…> схільны да самаразбурэння, і, відавочна, тым у большай ступені, чым больш у ім уласна чалавечага...” [1, с. 69]. Меркаванне галоўнай гераіні выразна супярэчлівае і адначасова экзістэнцыяльнальнае па сваёй сутнасці, пра што сведчыць адсылка і да абсурднасці свету, і да адчужанасці ў ім адзінокай асобы: “Цяпер вам, нарэшце, зразумела, дзеці, чаму СУМЛЕННЕ, СПАГАДА і... правільна, ЛЮБОЎ! – абмяжоўваюць нашыя шанцы на выжыванне? Затое ўсё груба-таўстаскурае і прымітыўнае мае зайздросную энтрапію і, адпаведна, бесклапотнае існаванне – язык не паварочваецца назваць гэта жыццём, зрэшты, у духоўным плане гэта ўжо і не жыццё, а амаль што стан неарганічнай матэрыі. Бо чалавек у Сусвеце вызначаецца менавіта любоўю і схільнасцю да самаахвярнасці...” [1, с. 69].

Выбар, зроблены галоўнай гераіняй, дазваляе меркаваць аб сталасці яе свядомасці і шырыні светапогляду. Усведамленне прыярытэту здароўя ўнучкі над уласным – не абясцэньванне каштоўнасці свайго жыцця, а разуменне важнасці працягу роду як неад’емнага складніка сусвету. Гэта можна ў пэўнай ступені разглядаць як эгаізм, але не ў прымітыўнай, а самадастаковай яго форме.

Гераіні навел А. Брава настолькі прызвычайваюцца да вымушанай залежнасці, што атрыманая свабода замест палёгкі становіцца нечым “самым цяжкім у жыцці”, “как будто провалилась в пустоту” [2, с. 354]. Нялёгкая праца і падпарадкаванне волі мужа ўспрымаецца гераіняй твора “Homo vitreus” з удзячнасцю,

свядома лічыцца праявай “вышэйшай волі” і нават “боскай ласкай”, бо ёй дадзена магчымасць прайсці “выхаванне душы” не праз строгія правілы манастырскага статута, а ў свецкім жыцці атрымаць той жа вопыт [2, с. 355].

З нашага пункту гледжання, з кантэксту твора “Homo vitreus” вынікае не тыповая гендарная праблема абмежавання жаночых правоў у патрыярхальным свеце. Гераіня сапраўды выбудоўвае свой жыццёвы шлях, абапіраючыся на вопыт чалавека, які стаў для яе і мужам, і бацькам, і дзіцем адначасова [2, с. 355]. Але пунктам адліку ў падобнай быційнай сістэме з’яўляецца не страх ці прыгнечаная жаночая воля, а ўсведамленне значнасці “місіі” яе мужа, які пабудаваў храм сваімі рукамі не з эгаістычных меркаванняў ці сляпой веры. Яго памкненні накіраваны на тое, каб хоць б часткова гарманізаваць навакольны свет: “и блоки таскал, и рубероид стелил, и кресты устанавливал вокруг деревни, чтобы самоубийства в ней прекратились… Руками Миши сделаны лампадки из цветного стекла, что перед иконами висят” [2, с. 356]. І нават “шкляная хвароба” – гэта праява неўтаймаванага жадання напоўніць хараством і радасцю чалавечае быццё.

Такім чынам, у аснове самаўспрыняцця гераіні тэксту “Homo vitreus” – складаны працэс пошуку прызначэння не з уласна пазіцыі жанчыны, а зыходзячы першапачаткова з чалавечай сваёй сутнасці: “я” – неад’емны суб’ект Сусвету, стварэнне прыроды ў цэлым, безадносна да вызначанай гендарнай ролі.

З аналізу навел А. Брава заканамерна выступае пытанне аб першавытоках немагчымасці спынення працэсу самаразбурэння (у творы “Ясным утром в Пинар-дель-Рио” – на духоўна-маральным і псіхаэмацыянальным узроўнях, у тэксце “Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца” – на фізічным з прычыны невылечнасці хваробы гераіні). Дамінуючым матывам у акрэсленым рэчышчы з’яўляецца страх, які і выступае звышпрычынай, што блакіруе патэнцыяльныя ўнутраныя рэзервы для пераадолення перашкод і далейшага асобаснага развіцця: “Страх заставляет проживать фальшивую жизнь, жизнь-имитацию, в то время как моя единственная-неповторимая ковыляет следом, точно выброшенная на улицу собака, – лапа перебита, шерсть в колтунах, но тащится за хозяином: а вдруг позовет? Страх запускает щупальца в сердцевину сердца и высасывает оттуда силу” [2, с. 344].

У навелістычным апавяданні “Крупнік для музы” гераіня канкрэтызуе характар гэтага страху – любоў да дзяцей. З кантэксту твора “Ясным утром в Пинар-дель-Рио” таксама вынікае, што менавіта страх за здароўе сына выступае ў якасці аднаго са стрымліваючых фактараў у працэсе асобаснай самаідэнтыфікацыі. Расстаноўка прыярытэтаў на карысць дабрабыту дзяцей вымушае жанчын вышэйзгаданых навел зрабіць крок назад ва ўласным развіцці і самарэалізацыі.

Сэнсаўтваральны цэнтр быційных формул Валянціны Валовіч (“Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца”) і Раісы (“Сон пионерки”) складае сям’я ў асобе іх сыноў. Аднак наколькі падобнай здаецца жыццёвая пазіцыя абедзвюх гераінь, настолькі дыферэнцыйным з’яўляецца аксіялагічны падмурак іх экзістэнцыі.

Не будучы распешчанай раскошай у дзяцінстве, Раіса сканцэнтравалася на кампенсаванні матэрыяльнага дабрабыту ў жыцці Васіля, свайго сына, чакаючы пры гэтым ад яго, здавалася б, заканамернай удзячнасці, бо, згодна з меркаваннямі гераіні, “за любовь по справедливости полагалась награда” [2, с. 327]. Засяродзіўшыся на стварэнні ўсебакова камфортных умоў для Васіля, Раіса настолькі захапілася гэтым працэсам, што з цягам часу мяшчанскія памкненні

пераўтварыліся спачатку ў стыль жыцця, а потым сфармавалі і адпаведны лад мыслення. Бясспрэчна, “не земляничное мороженое” [2, с. 327] былі гэтыя гады жыцця: цяжкая гандлярская праца істотна адбілася на яе здароўі, але дазволіла забяспечыць максімальны дабрабыт для Васіля.

Навелістычная парадаксальнасць у дадзеным творы заключаецца ў тым, што ні “тонкая наука обхождения с нужными людьми” [2, с. 324], ні бездакорная вера ва ўсемагутнасць грошай не дапамаглі ў кульмінацыйны момант, калі сын апынуўся ў сітуацыі на мяжы жыцця і смерці. Звыклыя метады вырашэння праблем пацвердзілі сваю бессэнсоўнасць: “мозг Василя умирал, клеточка за клеточкой, и ничем необратимость смерти было остановить, сколько и кому ни давай на лапу” [2, с. 325].

Смерць сына стала лакмусавай паперай зместу яе жыцця. Паклаўшы пасля пахавання перад сабой чысты аркуш паперы, Раіса, “полная злой решимости заклеймить и покарать”, нечакана “остолбенела от внезапной мысли, даже ручку выронила: теперь ее жизнь – как этот чистый лист” [2, с. 326]. Гэта раптоўнае адкрыццё спрыяла глыбокай рэфлексіі над сваім лёсам: відавочнай стала і падмена жацтваральных сэнсаў, і маральна-этычных каштоўнасцей, і анталагічных складнікаў у цэлым. Выяўленая ілюзорнасць мар і надзей прымусіла звярнуцца не толькі да перагляду пройдзенага шляху, але і да аналізу ўласнага прызначэння: “После сына остался рисунок. После его отца останется гобелен в далеком южном дворце. А после нее, Раисы, – что? Биде с блестящим краном? Так зачем же все это было…” [2, с. 331].

Свядомая падмена жыццяў – свайго і сына – адбылася і ў Валянціны (“Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца”), якая, тым не менш, зрабіла крок наперад у асобасным развіцці і засяродзілася не на забеспячэнні матэрыяльнага дабрабыту, а пошуку ісціны, схаваных сэнсаў быцця. Засмучаная і разгубленая з прычыны дэфармацыі спрадвечных маральных прынцыпаў, Валянціна прыходзіць да высновы, што «ад слоў “СУМЛЕННЕ”, “СПАГАДА”, “ЛЮБОЎ” засталіся толькі “выпатрашаныя абалонкі” [1, с. 68]. Працэс усеагульнай энтрапіі непазбежны: “Калі чалавек ідзе насуперак усеагульнаму аскаціньванню, прыходзіць смерць са сваім старажытным інструментам. Так, смерць падпарадкоўваетакі адшчапенца ўсеагульнаму закону, бо прах, у рэшце рэшт, мае максімальную энтрапію” [1, с. 70].

У той час як Валянціна (“Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца”) засяродзілася на ўнутраным тэарэтычным асэнсаванні дэфармаваных асноў быцця, гераіня навелістычнага апавядання “Крупник для музы” паглыбілася значна далей у анталагічныя пошукі. Усведамленне сваёй неаспрэчнай адказнасці перад дачкой і маці перапоўнена трагічнай іроніяй, бо любоў да іх “давно превратила кровь в вязкую желеобразную массу” [2, с. 350]. Нягледзячы на праяўленне максімальнай цярпімасці і такту, яна, тым не менш, дэманструе настойлівую рашучасць ва ўстанаўленні асобасных межаў і абароне індывідуальнай прасторы, бо як сумна канстатуе сама гераіня, “надо до крови сражаться, чтобы защитить от других хоть частицу себя” [2, с. 350].

Важна акрэсліць, што ў дадзеным выпадку гэта не тыповая праява фемінісцкай ідэалогіі, а ўсвядомлены працэс пошуку сваёй самасці. Захопленая працэсам творчасці, яна спрабуе знайсці ў жыцці хоць нейкую апору для самаідэнтыфікацыі. Такой матывацыйнай кропкай з’яўляецца пачак змятых лістоў, напісаных самой гераіняй, але яшчэ ў далёкім мінулым. Не толькі часавая адлегласць, але бяздонне няспраўджаных планаў і памкненняў вымушаюць гераіню

гаварыць пра тую маладую жанчыну ў трэцяй асобе, быццам абстрагаваўшыся ад яе. Тая дзяўчына вылучаецца кардынальна рашучай жаццёвай пазіцыяй, яна самадастатковая, валявая, цвёрда ўпэўненая: “единственное, что ты можешь изменить, это твоя собственная жизнь, неумолимо короткая” [2, с. 351]. Менавіта з гэтай прычыны абсалютна бессэнсоўна “играть нелепые роли, ссориться, вести с умным видом пустые разговоры, <…> волноваться из-за событий, что происходят неизвестно где…” [2, с. 351].

Анталагічная пазіцыя гераіні выступае своеасаблівай квінтэсэнцыяй пошукаў жанчын, адлюстраваных у іншых навелістычных тэкстах А. Брава. Не філасофска-тэарэтычныя развагі адносна маральна-этычных прынцыпаў быцця запаўняюць яе свядомасць, бо пры ўсёй значнасці яны вылучаюцца безасабасна-адцягненым характарам. Галоўным жа вынікам у працэсе самаідэнтыфікацыі павінна быць спазнанне сябе як унікальна-індывідуальнай часткі Сусвету. Дасягнуць такога стану магчыма праз адчуванне быцця “тут і цяпер”, праз спасціжэнне “поўнай прысутнасці”, а не яго імітацыі [2, с. 352].

Такім чынам, агульнаключавым матывам анталагічнай праблематыкі ў вышэйразгледжаных навелістычных тэкстах Алены Брава з’яўляецца страта або моцная дэфармацыя індывідуальна-асобаснай асновы экзістэнцыі з прычыны сацыяльна абумоўленых фактараў. Актуальныя рэаліі сучаснасці сфармавалі прыдатныя ўмовы для паўнавартаснага жаночага асобаснага самавызначэння і самарэалізацыі без прывязкі да гендарных стэрэатыпаў. Важным складнікам гэтых працэсаў з’яўляецца самаідэнтыфікацыя асобы не праз прызму іншых суб’ектаў і з’яў рэчаіснасці, а праз фіксацыю свайго быцця “тут і цяпер”, у канкрэтны часавы адрэзак рэчаінасці, бо, як вынікае з кантэксту прааналізаваных твораў, імітацыя прысутнасці, “падмена” жыццяў і аксіялагічных прынцыпаў суправаджаецца нівеліраваннем асобаснага “я” і выступае каталізатарам псіхаэмацыянальнага і фізічнага самаразбурэння. Пошук сябе можа мець станоўчы вынік, калі пунктам адліку выступае першаснае “я”, пазбаўленае знешніх наслаенняў, утвораных шляхам вымушанай адаптацыі да навакольнага свету.

ЛІТАРАТУРА

1. *Брава, А.* Каменданцкі час для ластавак [Электронны рэсурс] / А. Брава. – Мінск. : Маст. літ., 2004. – 183 с. – Рэжым доступу : https://www.rulit.me/books/kamendancki-chas-dlya-lastavak-read-424513-67.html#section_7. – Дата доступу : 28.10.2020.
2. *Браво, А.* Имя Тени – Свет : повести, рассказы / А. Браво. – Минск. : Літаратура і мастацтва, 2012. – 356 с.
3. *Ракоўская, Л.* Хто крадзе веру, розум і волю : інтэрв’ю з пісьменніцай А. Брава [Электронны рэсурс] / Л. Ракоўская // Звязда. – 2014. – Рэжым доступу : http://zviazda.by/be/news/20140612/ 1402522439-hto-kradze-veru-rozum-i-volyu. – Дата доступу : 02.11.2020.

УДК 811.161.3’42 : 908 (476)

А. С. Дзядова (Віцебск)

ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧАЯ СПЕЦЫФІКА ЛЕКСІКІ Ў МАСТАЦКІХ ТВОРАХ ВАСІЛЯ БЫКАВА

На сённяшні дзень пытанні даследавання мовы нацыянальнага мастацкага тэксту ў лінгвакраіназнаўчым аспекце застаюцца не да канца распрацаванымі і асэнсаванымі. А між тым, як адзначае прафесар В. А. Маслава, «*галоўным захавальнікам духоўнага багацця народа з’яўляюцца мастацкія тэксты, моўная прастора якіх адлюстроўвае ўнутраны свет аўтара і асэнсаваны ў яго свядомасці свет знешні*» [1, с. 126].

Імя Васіля Быкава з'яўляецца своеасаблівым «*нацыянальным маркерам*» усёй беларускай літаратуры. Яго творы змяшчаюць у сабе надзвычай цікавы і арыгінальны моўны матэрыял, што сведчыць пра адметнасць нацыянальнай карціны свету беларускага народа, спецыфіку яго ментальнасці і псіхалогіі.

Творчасць пісьменніка ўспрымаецца сучаснікамі і як унікальная з'ява беларускай прозы, і як вялікае дасягненне сусветнай літаратуры. В. Быкаў – адзін з самых папулярных пісьменнікаў XX ст. не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Падчас свайго актыўнага грамадскага жыцця ён адгукаўся на самыя вострыя і надзённыя пытанні гісторыі і сучаснасці, у тым ліку і праблемы звужэння ўжывання мовы ў грамадстве. Родную мову пісьменнік разглядаў як «*самае каштоўнае багацце нацыі*», «*душу народа*», «*своеасаблівы генафонд нацыянальнай культуры*». У свой час у адным з інтэрв'ю В. Быкаў зазначаў, што страта беларускай мовы можа азначаць страту беларускага народа як самастойнай нацыі, якая знікне «*з твару зямлі, як некалі зніклі летапісныя яцвягі, якія насялялі паўночна-заходнюю Беларусь*».

Васіля Быкава можна з поўным на тое правам аднесці да ліку тых празаікаў, якія ў сваіх творах жылі стыхіяй нацыянальнай мовы. Лінгвакраіназнаўчую інфармацыю ў яго мастацкіх тэкстах нясуць разнастайныя нацыянальна-маркіраваныя моўныя адзінкі. Многія з іх змяшчаюць у сабе звесткі пра ўнікальнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа. У межах даследаванай намі нацыянальна афарбаванай лексікі асабліва звяртаюць на сябе ўвагу

1) найменні прадметаў і з'яў традыцыйнага беларускага побыту: **пунька** 'вялікі будынак для захоўвання сена, адрына', **капец** 'куча агародніны (бульбы, буракоў), якая ўкрываецца на зіму саломай, сенам ці галінкамі хвойных парод дрэў', **калаўрот** 'прыстасаванне для ручнога прадзення, якое прыводзіцца ў рух панажом', **даёнка** 'пасудзіна, у якую дояць малако', **качарэжнік** 'у сялянскай хаце месца паміж печчу і сцяной, куды ставяць чапялу, вілкі, качаргу';

2) назвы адзення і галаўных убораў: **ватоўка** 'ватовая фастрыгаваная куртка або безрукаўка', **дзяга** 'рэмень, паясная папруга', **картуз** 'мужчынскі галаўны ўбор з аколышкам і цвёрдым казырком', **кажушок** 'цёплая верхняя вопратка, пашытая з аўчын';

3) назвы ежы і страў: **лапун** 'вялікі тоўсты мучны блін', **аладка** 'невялікі тоўсты мучны або бульбяны блін', **шкварка** 'невялікія засмажаныя кавалачкі сала ці тлустага мяса' і інш.

Прывядзём прыклады ўжывання некаторых лексічных адзінак такога тыпу. Напрыклад, **дранікі** 'бліны з дранай бульбы': «*Каля яе клапатала бабка Мелання – пякла <u>дранікі</u>*» (Сотнікаў); **крупнік (крупенік)** 'крупяны суп, крупеня': «*Елі тут. <u>Крупенік</u>*» (Знак бяды); **ступа** 'драўляная або металічная пасудзіна, у якой таўкуць што-небудзь таўкачом': «*Не забыцца натаўчы <u>ў ступе</u> круп – назаўтра мелася варыць <u>крупнік</u>*» (Знак бяды); **пасталы** 'даўні мяккі сялянскі абутак з цэлага кавалка скуры, які насілі з анучамі і прывязвалі да ног аборамі': «*Ён, аднак, не спыняўся, з роспачным намаганнем выдзіраючы з твані свае <u>пасталы</u>, дабрыў да лазняку і пралез між кустоўя*» (Аблава).

У мове прааналізаваных твораў вельмі шырока ўжываюцца лексічныя адзінкі, якія семантызуюць штодзённую гаспадарчую працу сялян, іх заняткі і сельскагаспадарчыя клопаты. Праілюструем асаблівасці ўжывання некаторых слоў на прыкладзе моўных кантэкстаў. Напрыклад, **варыўня** 'кладоўка для захавання агародніны': «*Ураджай выдаўся неблагі, зернем засыпалі ўсе карабы ў Аўдоцінай <u>варыўні</u>*» (На чорных лядах); **жорны** 'ручны млын з двух гладка

абчэсаных круглых камянёў, пры дапамозе якіх пераціраюць зерне на муку’: «*Пад жорнамі ціхенька мацаў пацук…*» (Знак бяды). Аўтар знаходзіць таксама неабходныя словы і выразы, каб перадаць спецыфіку традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, паказаць «*жывучасць*» традыцыйных народных прыкмет, адметнасць сялянскай псіхалогіі. Пра гэта сведчаць, напрыклад, назвы народных танцаў, якія здаўна былі характэрны для традыцыйнай народнай культуры беларусаў. Гэты найменні тыпу «**Казачок**» ‘беларускі і ўкраінскі народны танец-пляска’, **Лявоніха** ‘беларускі народны танец або музыка да гэтага танца’, **кракавяк** ‘польскі народны танец’: «*…перайграў ім і «Казачка», і «Лявоніху», і «кракавяк»* (Знак бяды).

Адным з найбольш цікавых відаў этнічнай культуры беларусаў, як вядома, з’яўляюцца земляробчыя святы і святы рэлігійнага календара. Здаўна яны лічыліся спосабам пакланення звышнатуральным сілам, паказчыкам моцы народнай душы. Пісьменнік дастаткова шырока ўжывае лексічныя адзінкі, праз якія трансліруецца багацце духоўнай культуры нашага народа. Гэта назвы рэлігійных свят: **Благавешчанне** ‘свята рэлігійнага календара, якое адзначаецца 7 красавіка ў гонар Божай маці і лічыцца ў народзе святам прылёту буслоў’, **Вадохрышча** ‘свята рэлігійнага календара, якое адзначаецца 19 студзеня і звязана з культам вады і яе асвячэннем’, **Вербніца** ‘апошняя нядзеля перад Вялікаднём’ і інш.

Як сродак стварэння мясцовага каларыту ў мове аповесцей В. Быкава часта выкарыстоўваюцца дыялектныя лексічныя адзінкі з лінгвакраіназнаўчым кампанентам значэння. Да іх ліку аднясём назоўнікі тыпу **падворышча** ‘двор, участак зямлі паміж гаспадарчымі будынкамі’, **калі́ўе** ‘бульбоўнік’, **чуні** ‘пяньковыя, вяровачныя лапці’ і інш.

Унікальную нацыянальна-культурную інфармацыю нясе ў сваёй семантыцы безэквівалентная ў рускамоўным дачыненні лексіка, якая дастаткова часта функцыянуе ў мове празаічнага быкаўскага радка. Напрыклад, **асвер** ‘частка калодзежнага жураўля ў выглядзе доўгай жэрдкі, пры дапамозе якой дастаюць вядро з вадой’ (рус. *журавль у колодца; приспособление для доставания воды*): «*Ужо стала відаць у прыцемках крывая вярба ля варот, студня з асверам”* (Воўчая зграя); **бульбоўнік** ‘націнне бульбы’ (рус. *картофельная ботва*): «*Ён левай рукой пачаў выдзіраць бульбоўнік…*» (Воўчая зграя); **кубелка** ‘дзежка з вушкамі і векам для захоўвання прадуктаў і рэчаў’ (рус. *закрывающаяся крышкой кадка*): «*Яны пачалі пераварочваць дагары ўсё дзежкі, кубелкі*» (Знак бяды); **цабэрак** ‘шырокая драўляная пасудзіна з клёпак з двума вушкамі’ (рус. *Небольшой ушат*): «*Сцепаніда раззлавана памянула свайго нядбайнага мужа і пасунула цабэрак*» (Знак бяды); **шнур** ‘вузкая палоска зямлі; надзел’ (рус. *узкая полоса земли*): «*Заставалася выбраць баразён з пяць на шнурку, як, разагнаўшыся, Грыбаед убачыў на краі алешнічку чалавека, які моўчкі махаў да яго рукой – клікаў падысці*» (Воўчая зграя); **цагельня** ‘прадпрыемства, на якім вырабляецца цэгла’ (рус. *кирпичный завод*): «*..цэгла была нехуцавая, дрэнна абпаленая, ён бачыў гэта тады, як купляў, ды на Савацееўскай цагельні не было лепшай…*» (Аблава).

Безэквівалентныя ў рускамоўным дачыненні лексічныя адзінкі, якія семантызуюць у сваім значэнні тыя ці іншыя лінгвакраіназнаўчыя прадметы і рэаліі, уласцівыя для прыроднага свету, навакольля, штодзённага жыцця чалавека, дастаткова свабодна функцыянуюць у моўнай прасторы мастацкага тэксту пісьменніка пры характарыстыцы думак, пачуццяў і перажыванняў герояў на ўлонні прыроды, а таксама пры апісанні навакольнага асяроддзя. Напрыклад,

азіміна (рус. *озимая пшеница*): «*Хістаючыся, пабрыў наўкось па азіміне…*» (Аблава); **баравінка** (рус. *возвышенный участок леса в бору*): «*Але ў гэтым раўнінна-забалочаным краі нідзе ніякай баравінкі…*» (На чорных лядах); **бульбянішча** (рус. *поле на котором растет или рос картофель*): «*Але гэта там, далей на ўзлеску, а тут дзецца ёй не было куды: невысокая насыпка дарогі ды голы прасцяг бульбянішча – тут можна і пасядзець у спакоі*» (Знак бяды); **котлішча** (рус. *насиженное место, родавая усадьба*); **падворак** (рус. *двор около дома*); **падмуроўка** (рус. *подведение каменной или кирпичной кладки под фундамент*): «*Як ён і здагадваўся, котлішча не было заарана, някратаным застаўся падворак, ацалелі падмуроўка ад хаты і вуглавыя камяні ад свірна*» (Аблава). Да разгледжаных вышэй безэквівалентных назваў беларускай мовы далучаюцца іншыя ўжытыя аўтарам найменні з лінгвакраіназнаўчым зместам, якія не маюць аднаслоўных аналагаў у рускай мове: **ржышча** (рус. *ржаное поле*); **тарфянішча** (рус. *осушенное торфяное болото*); *патарчака* (рус. *сучья и корни*); **буслянка** (рус. *гнездо аиста*); **застаронак** (рус. *место в гумне для складывания соломы, мякины, снопов*); **пасуднік** – (рус. *ящик для посуды*).

Уяўленне пра геаграфічныя асаблівасці прыроднага асяроддзя даюць выкарыстаныя В. Быкавым шматлікія прасторавыя найменні і назвы нябесных свяціл (у тым ліку і безэквівалентныя). Напрыклад, **бальшак** ‘шырокая дарога (у адрозненне ад прасёлачнай)’, **поплаў** ‘луг у пойме ракі’: «*На пагорачку ў змешаным рэдкалессі ён павярнуў управа – убок да бальшака і поплаву…*» (Аблава); **выган** ‘месца каля вёскі, дзе пасецца жывёла’*:* «*Над полем і выганам памалу ўсталёўвалася сцюдзёнаватая восеньская ноч*» (Аблава); **узлесак** ‘край лесу’: «*Праз нейкі нядоўгі час* [месяц] *выкаціўся ў іншым месцы, і на гэты раз свяціў доўга і ярка, абліваючы поле, узлесак, чалавека на абмежку бліскучым прывідным святлом*» (Аблава); **маладзік** ‘малады месяц’: «*Раніцай і яшчэ ў першую квадру месяца, на маладзік, як некалі казала маці*» (У тумане); **поўня** ‘фаза Месяца, калі відзён увесь яго дыск’: «*На небе ў ірваным ашмоцці хмараў з’явіўся бліскучы кругляк поўні…*» (Аблава).

Здзіўляюць сваёй разнастайнасцю выкарыстаныя аўтарам назвы балоцістай мясцовасці, якая характэрна для ландшафту Беларусі. Так, у моўнай тканіне аповесці «Аблава» сустракаюцца шматлікія сінанімічныя назвы. У іх ліку такія, як **балота** ‘нізкае багністае месца са стаячай вадой’: «*Пасля дажджоў прырэчнае балота шырока разлілося…*» (Аблава); **імшарына** ‘мохавае балота’: «*Ззаду на цвёрдым беразе за імшарынай гучала галасістая гамана, брахаў сабака, мабыць, там сышліся загоншчыкі*» (Аблава); **багна** ‘топкае балота, дрыгва’: «*Цяжкія ногі ў нязносных сырамятных пасталах адразу памкнулі яго ў глыб багны, ён захліпнуўся*» (Аблава); **твань** ‘дрыгва, багністае месца’: «*Ці яны згубілі яго, ці баяліся лезці ў сцюдзёную, смярдзючую твань?*» (Аблава); **дрыгва** ‘тое самае, што і твань’: «*Але мох дужа не правальваўся, дрыгвы тут не было*» (Аблава) і інш.

Такім чынам, даследаваны з пункту гледжання лінгвакраіназнаўчай спецыфікі моўны матэрыял твораў В. Быкава сведчыць пра тое, наколькі глыбока ў мастацкім тэксце могуць атрымаць моўнае ўвасабленне нацыянальныя асаблівасці рэчаіснасці беларусаў як лінгвакультурнай супольнасці, іх культурна-этнаграфічныя традыцыі і сацыяльна-бытавыя ўмовы жыцця ў мінулым.

ЛІТАРАТУРА

1. *Маслова, В. А.* Современные направления в лингвистике : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений, обучающихся по направлению «Филологическое образование» / В. А. Маслова. – М., 2008. – 266 с.

УДК 8.82-1.82.0.821.161.3

С. У. Калядка (Мінск)

ЭМАТЫЎНАСЦЬ ПАЭЗІІ ЦЁТКІ[1]

Асноўныя матывы паэзіі Цёткі – любоў да радзімы, да чалавека працы, самаахвярнае служэнне народу. Рэвалюцыйная палымянасць і тонкі лірызм, спалучэнне імпульсіўнай энергіі слова з пяшчотнасцю вобразаў – характэрныя рысы яе лірыкі. Названыя асаблівасці творчага самараскрыцця арганізоўвалі ў ёй аўтара-суб'екта, які скіроўваў свае творчыя інтэнцыі як на знешні, так і на ўласны ўнутраны свет з аднолькавай інтэнсіўнасцю. Цётка імкнулася ў сабе запаліць агністае "сэрца Данка", каб гэтай энергіяй падзяліцца са слабымі, нямоглымі, стомленымі на жыццёвай дарозе і згубіўшымі ў сябе веру, адкрыць ім вочы, падарыць веру ў новае вольнае жыццё. У творчай дзейнасці Цёткі, з нашага пункту гледжання, зліліся разам рэвалюцыйны пафас, амаль міфічная вера ў магутны дух чалавека, здольны змяніць рэальнасць, і імкненне захаваць карані роду свайго, народную аснову светапогляду на няпростым шляху да свету і свабоды.

У 1972 годзе ў манаграфіі "Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя" вядомы беларускі даследчык А. Лойка наступным чынам ацэньваў значнасць творчасці Алаізы Пашкевіч: "Цётка *апярэдзіла* Купалу і Коласа і ў рамантычным адухатворэнні з'яў жыцця, і ў канкрэтна-рэалістычным іх выяўленні праз арыгінальную вобразнасць, спароджаную своеасаблівым, індывідуальным метафарычным мысленнем…" [3, с. 185], "тыя кірункі, якія Цётка сілай свайго таленту ўзяла ў 1905–1906 гадах, заставаліся вызначальнымі і ў 1913 годзе" [Там жа, с. 187]. І пазней, у "Гісторыі беларускай літаратуры", апублікаванай у 1989 годзе, А. Лойка зноў акцэнтуе ўвагу на ўпісванні імя Цёткі ў гісторыю беларускай літаратуры "паперадзе Купалы, Коласа, Багдановіча": "Як *першая,* яна шмат у чым прадвычула, прадвызначыла шляхі развіцця ўсёй беларускай паэзіі пачатку XX ст., яе асноўны дэмакратычны пафас. <…> яна *першая* сфармулявала асноўнае дэмакратычнае крэда літаратуры" [4, с. 66]. У сучасных навуковых працах, асабліва маладых даследчыкаў беларускай літаратуры, спрацоўвае ў нечым трафарэтны, шаблонны падыход да ацэнкі станаўлення нацыянальнай літаратурнай традыцыі, дзе ёсць Колас, Купала і Багдановіч і адсутнічае Цётка. Спадчына Алаізы Пашкевіч, з нашага пункту гледжання, не вывучана якраз з пазіцыі яе ролі ў фарміраванні новай мастацка-эстэтычнай мадэлі паэзіі, запачаткаванай Ф. Багушэвічам, ідэйна-тэматычных напрамкаў, якія заўсёды прыпісваюцца Купале і Коласу, як заўважыў А. Лойка, «Цётка *першаю* і на мужыка зірнула ва ўсезямным, агульнагістарычным маштабе, паставіўшы яго ў вершы "Мужык не змяніўся" ў перспектыве "дзевятнасці сотняў" гадоў» [3, с. 186–187]. А ў акадэмічнай "Гісторыі беларускай літаратуры XX ст." (Т. 1, 2001) у раздзеле першым, напісаным пра Цётку, І. Э. Багдановіч акцэнтуе ўвагу на факце пераемнасці, што творчасць Алаізы Пашкевіч "была непасрэдным водгукам на канцэпцыю нацыянальнага адраджэння, сфармуляваную Ф. Багушэвічам. Цётка была *адной з першых яе пераемніц* як у мастацкай творчасці, так і ў грамадскай дзейнасці, ствараючы і пашыраючы разам з Я. Купалам і Я. Коласам, Ядвігіным Ш. і А. Уласавым, братамі Луцкевічамі і Іваноўскім, а таксама іншымі рупліўцамі на гэтай ніве ідэалогію і эстэтыку нацыянальнага адраджэння на пачатку XX ст." [1, с. 119–120]. Пазіцыя, выказаная І. Э. Багдановіч

[1] Матэрыялы падрыхтаваны ў межах выканання НДР № Г20Р-383 пры падтрымцы БРФФД.

і падтрыманая іншымі даследчыкамі, сёння паўстае цэнтральнай у тлумачэнні ролі Цёткі ў літаратурным працэсе, яе імя (Цёткі) адсунута на перыферыю літаратурнай традыцыі, хаця, як адзначаў А. Лойка, яе месца там цэнтральнае. Пазіцыі А. Лойкі і І. Багдановіч уступаюць у пэўны канфлікт, які патрабуе некаторых тлумачэнняў.

Безумоўна, неабходна аддаць даніну захапленню Цёткай паэзіяй Ф. Багушэвіча, да якой апелявала яна сама і ва ўласных творчых пошуках, і ў прадмове да першага паэтычнага зборніка: «Прачытаўшы тую “Дудку”[1], я сказаў: “Дзякуй табе, Мацей Бурачок! Чэсць і слава тваему слову! А ты, “Дудка”, грай і мне голас дай”. З таго дня пачаў і я майстраваць інструмант. Выйшла з-пад рук “Скрыпка”. Цяпер кручу “Струны”» [5, с. 24]. Такім чынам, Алаіза Пашкевіч абазначае цэнтральнай у сваёй творчасці рэвалюцыйна-дэмакратычную традыцыю ў адлюстраванні быцця народа, працягнутую ад Ф. Багушэвіча. Аднак, як адзначыў А. Лойка, а таксама як пісала сама Цётка ў прадмове, яна і стала тым “артыстам, каторы збярэ ўсе нашы беларускія інструманты і наладзіць граннё як мае быць” [Там жа] – гэта значыць дзякуючы акумуліраванню ва ўласнай творчасці на той час лепшых здабыткаў літаратурнага працэсу паэтэса змагла ўзняць лёс мужыка да “агульнагістарычнага маштабу”, паглядзець на праблему з пазіцый сацыяльна-гістарычных перспектыў і многіх лірычных “я”, што яе адрознівае ад Ф. Багушэвіча.

У 1976 годзе быў выдадзены зборнік “Творы” Цёткі, у якой прадмову напісаў С. Александровіч, адзначыўшы: “Яна стварала яркія агітацыйныя і шчырыя лірычныя вершы, рэалістычныя апавяданні і цікавыя падарожныя нарысы, пісала падручнікі і навукова-папулярныя арыкулы, вывучала народны тэатр і фальклор, займалася перакладамі, прымала актыўны ўдзел у выданні першых легальных беларускіх газет і часопісаў” [Там жа, с. 7]. Актыўную дзейнасць Цёткі можна акрэсліць наступнымі найменнямі: натхнёная, няўрымслівая, мэтаскіраваная, паслядоўная, настойлівая, экспрэсіўна-эмацыянальная, з гарэннем думак і сэрца. Эмацыянальны чыннік сацыяльнай актыўнасці і творчага пошуку, безумоўна, у аснове ацэнкі дзейнасці Алаізы Пашкевіч і яе творчасці як прамога дзеяння, непасрэднага водгуку на падзеі. А эматыўны трыгер яе мастацкіх здзяйсненняў заснаваны на супадзенні стадый пражывання і ўвасаблення: здаецца, не існуе адлегласці паміж творчым гарэннем і пражываннем пэўных сітуацый і іх экстрапаляцыяй на мастацкія творы. Скіраванасць аўтарскага перажывання на сацыяльна-палітычныя праблемы свайго часу прадвызначае дамінанту героіка-драматычнага і трагедыйна-драматычнага пафасу, які ўплывае на раскрыццё ў творах “сацыяльнай” эматыўнасці: яна знаходзіць выяўленне ў тэматыцы, праблематыцы, адборы вобразаў, структуры сказаў і многім іншым. Танальнасць шматлікіх выказванняў Цёткі як у вершах, так і артыкулах, лістах узнёслая і эмацыянальная, драматычна завостраная, кшталту ў лісце да Б. Эпімах-Шыпілы ад 18 лютага 1914 года: «“Лучынку” запалілі, але покі што вельмі слаба яна тлее. Трэба больш агню ад маладых сіл. Дровы, з каторых цяпер шчапаецца “Лучынка”, залішне слязьмі-доляй нацягнула, дык слаба гарыць…» [Там жа, с. 277]. Як бачым, у тэксце ліста прэвалююць словы з эмацыянальна-ацэначнай канатацыяй (*слаба, агню, слязьмі-доляй*), якія актуалізуюць праблему, яе няпростае вырашэнне.

[1] Маецца на ўвазе зборнік паэзіі Францішка Багушэвіча “Дудка беларуская” (1891), выдадзены ў Кракаве пад псеўданімам Мацея Бурачка.

У ацэнцы творчасці Цёткі і яе асаблівага погляду на свет, што не зводзіцца да наследавання Ф. Багушэвіча, нельга абысціся без падыходаў гендаралогіі, у прыватнасці ў вызначэнні характару яе ролевай лірыкі. Шматлікія аўтарскія ўвасабленні (Гаўрыла з Полацка, Мацей Крапіўка, Тымчасовы, Цётка) зашыфроўвалі пол і творчую ідэнтычнасць, яны прызваны былі прыхаваць імя, пазбавіць прыкмет жаночай індывідуальнасці і ў той жа час указвалі на жаданне аўтара стаць блізкім сярод пэўных слаёў насельніцтва, быць любым, кожным, тым Чужым, які набыў статус абагульненай асобы. На гэта ўказвала і даследчыца Т. Чабан, пішучы пра Цётку: “Паэтэса, не вытрымлівае ролі да канца, блытае ў вершы мужчынскія і жаночыя формы, не ўжываецца ў маску псіхалагічна” [6, с. 23]. Чаму не ўжываецца ў маску, зразумела: Цётка, выхаваная ў шляхецкай сям’і і атрымаўшая добрую адукацыю, не магла не захаваць у сабе тыя якасці, якія вызначаюць сапраўдную жаноцкасць. У ёй ужываліся разам талент лірыка, аўтара з глыбокімі перажываннямі і рэвалюцыйнага дзеяча, яркага аратара і ўмелага прапагандыста. Т. Чабан упэўнена, што “жанчына павінна шукаць іншых, не мужападобных шляхоў да дасканаласці, не парываючы з традыцыяй, са спрадвечнай жаночай доляй” [Там жа, с. 43]. Цяжка не пагадзіцца з даследчыцай, асабліва ў дачыненні да практыкаванняў аўтараў, якія прымяраюць маскі, але не прапускаюць праз сябе настроі і перажыванні свайго героя, чаго нельга сказаць пра Цётку. Яна імкнецца ў розных ролях перадаць коды жаноцкасці і мужнасці праз характэрныя для беларусаў таго перыяду думкі, развагі, станы, пачуцці і інш. Характары яе лірычных герояў і лірычных “я” часцей мадэлююцца з дапамогай традыцыйных для фальклору спосабаў і прыёмаў. Але, што вельмі важна, а таксама на што ўказвае Т. Чабан, не засяроджваючыся толькі на акрэсліванні сацыяльных аспектаў жаночай і мужчынскай ролі аўтара, гендарныя стэрэатыпы спрацоўваюць і ў аўтарскім стылі Цёткі: “Часам пераход у адным і тым жа вершы ад мужчынскай да жаночай формы робіцца ўсвядомлена, Цётка размяжоўвае мужчынскі і жаночы пачатак у духу міфалогіі. <…> Але вось яна становіцца ветрам, пачаткам разбуральным, які ломіць і крышыць старое, будзіць і нясе змены, і адразу пераходзіць на мужчынскі род, мяняе інтанацыю з плаўнай, песеннай на адрывістую, пульсіруючую” [6, с. 23]. Асаблівасць мужчынскага/жаночага самавыяўлення героя ў паэзіі Цёткі – у непарыўнай сувязі з паэтыкай народнай творчасці, у чым даследчыца ўбачыла “не толькі наследаванне, прыцягненне, але і апазіцыю, адштурхоўванне, спробу пераасэнсавання і пераадолення традыцыйнага псіхалагічнага стэрэатыпу жанчыны, жаночай долі” [Там жа, с. 41].

Прыкладам увасаблення Цёткі ў ролю мужыка стаў верш “Мужыцкая доля”, напісаны ў 1903 годзе. Калі звярнуцца да сутнасці ролевай лірыкі, то ў ёй галоўным персанажам выступае сумарны, умоўны ці аб’ектывізаваны герой – звычайна прадстаўнік пэўнага часу ці эпохі. Гэта той лірычны суб’ект, ад імя якога вядзецца лірычны аповед, прычым, як сцвярджаюць сучасныя даследчыкі, гэты аповед не тоесны аўтарскаму, як і ўнутраны свет лірычнага суб’екта не адпавядае аўтарскаму. У паэзіі Алаізы Пашкевіч выяўляюцца ўсе названыя складнікі ролевай лірыкі, акрамя апошняга – аўтар “перажывае перажыванні” мужыка як уласныя, яны ёй не чужыя, не зважаючы на розныя лёсы аўтара і лірычнага суб’екта. Менавіта пазіцыя *грамадзяніна,* неабыякавага да лёсу людзей побач, дазваляе Цётцы зліцца з героем, адчуць яго боль, гэта пазіцыя максімальна збліжае суб’ектнасць аўтара і суб’ектыўнасць героя. І як адзначае Б. Корман,

«в произведениях “ролевой” лирики стилистически окрашенное слово несет однозначно характеристическую функцию: оно помогает соотнести образ “я” с определенной социально-бытовой и культурно-исторической средой» [2, с. 166]. Сапраўды, становішча мужыка перадаецца з дапамогай эмацыягеннай лексікі: “цяжка”, “з долі выручайся”, “няволя і бяда засталась”, “бедным спаць лажуся” [5, с. 68]. Названыя ацэначныя словы і выразы ўтрымліваюць негатыўныя канатацыі, набываючы ў тэксце функцыі эматыўных маркераў. Яны нібы фіксуюць паслядоўнасць падзей у лёсе мужыка.

У сярэдзіне твора ў выразе “Цярпі, мой Мікітка” адчуваем голас аўтара – гэты голас вылучаецца з канвы спакойнага аповеду, падобнага на споведзь утаймаванага няшчасцямі чалавека, а таму безэмацыянальнага (у тэксце сустрэнем клічнік у двух месцах – у рэакцыі мужыка на пытанне і ў звароце да лёсу з нямым укорам). Цётка не магла не выказаць спачуванне ўціхаміранаму непасільнай працай чалавеку, а таму галасы аўтара і лірычнага суб’екта зліліся ў моманце перажывання цяжкага стану няволі. Зваротак выступае своеасаблівай эматыўнай фігурай, якая злучае дзве часткі твора: у першай частцы апісваецца суровы век мужыка, у другой – яго эмоцыі ў сувязі з уласнай доляй (“Цярплю, сьцяўшы зубы”, “з смагі паміраю”, “дзе ж тут аддыхаці”, “дзе ж ты, мая доля!” [5, с. 68–69]). Гэтыя часткі, ці эматэмы, складаюць лірычны сюжэт твора, у аснове якога змена лірычных падзей у споведзі мужыка. Увогуле, большая частка твораў Цёткі будуецца на двухфазавай структуры эматэмы: канстатацыі фактаў цяжкага існавання мужыка, а затым гарачых закліках да вызвалення яго з панскага ярма. Удумлівы адбор мастацкіх дэталей і пружыністы ўнутраны дынамізм характарызуюць шматлікія вершы паэтэсы з сацыяльнымі матывамі. Напрыклад, у вершы “Нямаш, але будзе”:

Нямаш хлеба, нямаш солі,
Нямаш шчасця, нямаш долі.
Як ля ранку сляза блісне,
Жаль да ночы сэрца цісне [5, с. 71].

Зварот да рытарычнай фігуры – тэматычнага паралелізму, ускладненага анафарай, унутраных паўтораў, антытэзы (ранку – ночы) дапамагае паэту завастрыць увагу на супярэчнасці жыцця селяніна, у якім пераважаюць цёмныя колеры і адмоўныя перажыванні. Вобразы-эматывы “сляза” і “жаль” характарызуюць стан мужыка, што “за крыўду ўстане”, “каб зямля матуляй стала”. Такім чынам, і вобразы-эматывы ў паэзіі Цёткі скіраваны на адлюстраванне ўнутранай барацьбы ў душы селяніна, які доўга цярпеў і чакаў і які, умацаваны ў гарніле выпрабаванняў панскім прыгнётам, набыў уласны голас, адчуў сябе асобай, якая можа і павінна вызначаць сваю будучыню. Эматыўныя сродкі ў вершах Цёткі выконваюць функцыі стымулявання і актывацыі ў расстаноўцы сацыяльных акцэнтаў, выяўленні грамадзянскага пафасу, абазначэнні суб’ектных складнікаў рэвалюцыйна-дэмакратычнай традыцыі.

Як заўважаў С. Александровіч, Цётка “ўвогуле, па складу свайго характару гэта была натура баявая, поўная творчай энергіі і няўрымслівай прагі да барацьбы: яна выступала як палымяны агітатар перад віленскімі рабочымі, ездзіла ў вёску, прымала ўдзел як дэлегат ад Беларусі ў рабоце з’езда жанчын (Масква, май 1905 года)” [5, с. 8]. Эматыўны тып творчай асобы Алаізы Пашкевіч суадносіцца з актыўным удзельнікам рэвалюцыйнай барацьбы, адсюль перавага ў творах агітацыі, прапаганды, заклікаў, пракламацый, якія клаліся

ў многія вершы-рэпартажы па слядах падзей. Агітацыйныя вершы-лістоўкі ўтрымлівалі ў сабе розныя стылістычныя і сінтаксічныя эматыўныя фігуры і сродкі, якія ўзмацнялі гучанне слоў-заклікаў, адрасна скіроўвалі яе звароты да паноў і сялян.

Цётку лічыць таленавітай і надзвычай эмацыянальнай асобай і даследчыца І. Э. Багдановіч. Яна адзначае: “павышаная экспрэсіўнасць вершаў дасягаецца ўжываннем эмацыянальна афарбаванай лексікі (Цётка амаль не карыстаецца словамі нейтральнымі), узрушана-ўсхваляванай інтанацыяй, насычанасцю амаль кожнага радка дзеясловамі” [1, с. 106]. Якасці натуры паэтэсы кіруюць яе творчымі інтэнцыямі і спосабамі ўвасаблення думкі – многія даследчыкі адзначалі недасканаласць верша Цёткі, выяўлялі рытміка-інтанацыйныя збоі, няправільныя формы слоў, карыстанне дыялектнымі і запазычанымі словамі і інш., якія, як і нам уяўляецца, былі абумоўлены тэмпераментам паэтэсы, палымянай душой, страснай натурай, яе гарэннем справай, грамадскім служэннем сваёй Бацькаўшчыне. Цётку смела можна аднесці да эматыўнага радыкала, у свет аўспрыняцці якога прэвалююць эмоцыі, што ўзмацняюць рэвалюцыйна-змагарныя матывы яе творчасці. Яны ж вызначаюць лірычныя вектары ў раскрыцці тэмы паэта і паэзіі, расстання з Бацькаўшчынай, у звароце да дзяцей, вясковых кабет (вершы “На чужой старонцы”, “З чужыны”, “Лучынка”, “Сірацінка”, “Сынок маленькі”, “Вясковым кабетам”, “З Новым годам” і інш.) С. Александровіч заўважыў лірычныя ноткі і ў вершах публіцыстычнага характару, адзначыўшы пры гэтым, што Цётка як “паэтэса выразна грамадзянскага складу трапна перадавала глыбіню думкі і сваю настраёвасць, умела выкарыстоўвала песенную форму і багацце народнай лексікі” [5, с. 17].

Звернемся да верша Цёткі “Скрыпка”, напісанага ў 1906 годзе. Гэты верш можна назваць візітнай карткай паэтэсы Алаізы Пашкевіч, у якім выяўлены яе творчае крэда і важныя мастакоўскія пазіцыі. Па вялікім рахунку яна абазначае тэматычнае поле і праблемны дыяпазон, у межах якіх і адбывалася эвалюцыя творчасці. У творах Цёткі “наймілейшае”, тое, што рве сэрца на часткі (лірычнае), выяўляецца на фоне раскатаў “пярунаў” (грамадзянскага), “смех кветак” і “нівак шэпт” (прыроднае) неадлучна са “звонам серпа, касы” (сацыяльным), а дух народа (гістарычнае) заўсёды ўслаўляўся ў песнях, імі ж абуджаўся і ўмацоўваўся (эстэтычнае, філасофскае). Важна і тое, што эмацыянальная натура Цёткі патрабавала выражэння думкі з дапамогай эматыўных сродкаў: анафары і эпіфары, інверсіі, зваротку. Гранне на струнах паэзіі – дынамічнае дзеянне, якое перадаецца з дапамогай інтэнсіўнага руху дзеясловаў (граці, хадзіці, пераліці, даць, рваць, раззваніла, галасіла, склікала, вітала, весяліла, завыў, закляў, біў), адны з якіх, маючы эматыўную валентнасць, становяцца вобразамі-эматывамі, іншыя – утвараюць лірычны сюжэт, у аснове якога перагук настрояў і пераходы ад эмацыянальна нейтральных да экспрэсіўна выражаных мастацкіх падзей. Дамінантнае “граці” паўстае ў шэрагу найменняў з эмацыянальна-ацэначным кампанентам. У вершы “Скрыпка” развагі аўтара суправаджаюцца самымі рознымі эмоцыямі і пачуццямі – кіпеннем, рвеннем, паслухмянасцю, шчасцем, смехам, жарам, скаргай, што дазваляе нам зрабіць высновы аб эматыўнай прыродзе паэтычнай ліры паэтэсы.

ЛІТАРАТУРА

1. *Багдановіч, І. Э.* Цётка / І. Э. Багдановіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – Т. 1. – С. 103–121.
2. *Корман, Б. О.* Лирика Некрасова / Б. О. Корман. – Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1964. – 390 с.

3. *Лойка, А. А.* Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя: Некаторыя заканамернасці і асаблівасці / А. А. Лойка. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1972. – 240 с.
4. *Лойка, А. А.* Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. : падручнік для філал. фак. ВНУ / А. А. Лойка. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1989. – Ч. 2. – 480 с.
5. *Цётка.* Творы / Цётка ; уклад., прадм. і камент. С. Александровіча. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 306 с.
6. *Чабан, Т. К., Гарадніцкі, Я. А.* Сучасная паэзія і фальклор / Т. К. Чабан, Я. А. Гарадніцкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 128 с.

УДК 821.161.3

П. Р. Кошман (Мазыр)

АКТУАЛЬНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СВЕТААДЧУВАННЯ Ў КНІЗЕ «РАДЗІВА “ПРУДОК”» А. ГОРВАТА

Сучасная беларуская літаратура, арыентаваная на рэпрэзентацыю нацыянальнага свету, для таго, каб захоўваць сваю значымасць для грамадства, мае неабходнасць адаптавацца да тых новых умоў, якія звязаны з развіццём камунікацыйных тэхналогій. Заўважным дасягненнем апошняга часу ў гэтым кірунку стала з’яўленне дзённіка А. Горвата «Радзіва “Прудок”».

Змест кнігі склалі аўтарскія запісы, якія першапачаткова прызначаліся для фэйсбуку, але змаглі выйсці за межы сяброўскага кола сацыяльнай сеткі. Перарывісты аповед сталічнага хіпстара пра перыпетыі свайго жыцця з прыхільнасцю быў сустрэты шырокай чытацкай публікай. Значная роля ў дасягненні гэтага прызнання, безумоўна, належыць сучасным камунікатыўным сродкам, дзякуючы якім А. Горват змог стаць сапраўды медыйнай персонай. Аднак ключавым фактарам папулярнасці дзённіка стала ўсё ж тое, што занатаваныя ў ім падзеі і рэфлексіі аказаліся надзвычай блізкімі для нашых сучаснікаў, уразілі іх незвычайным прыкладам самараскрыцця асобы ў звыклым антуражы сённяшняга жыцця.

Гісторыя Андруся Горвата, аўтара і галоўнага героя «Радзіва “Прудок”», пачынаецца ў Мінску з тых жыццёвых пазіцый, якія можна назваць тыповымі для нашага часу. Трыццацігадовы мінчук, які калісьці прыехаў за вышэйшай адукацыяй у сталіцу, працягвае шукаць сваё жыццёвае прызначэнне. Паводле ўласнага прызнання «фрэндам» у сацыяльнай сетцы, Андрусік Іванавіч адчувае страх паступова зліцца з агульнай людской масай, баіцца стаць праз наступныя дзесяць гадоў такім жа, як і яго сусед, «непатрэбным чалавекам». У імкненні знайсці сябе ў сталічнай рэчаіснасці, вылучыцца ў ёй герой робіць першы арыгінальны і, бясспрэчна, паспяховы з пункту гледжання прыцягнення ўвагі публікі ход: уладкоўваецца на працу ў Нацыянальны тэатр імя Янкі Купалы дворнікам. Разам з гэтай падзеяй у творы выбудоўваецца важны прынцып аўтарскага спасціжэння сучаснай беларускай рэчаіснасці праз судакрананне яе розных адзнак, аддаленых у нашай карціне свету адна ад адной.

Так, успрыманне Купалаўскага тэатру вачамі дворніка – гэта раскрыццё сімвала беларускай культуры ў яго будзённым існаванні. Горват не ўпускае моманту, каб падзівіцца з той сітуацыі, калі ў адным будынку вобразы высокай культуры сумяшчаюцца са звычайнымі жыццёвымі клопатамі. Аднак дзякуючы такому погляду акадэмічнае нацыянальнае мастацтва падаецца неад’емнай часткай беларускай рэчаіснасці, рэпрэзентуецца аўтарам як актуальная з’ява нацыянальнай культуры, якая выклікае цікавасць і мае прызнанне ў звычайных людзей.

У падобным святле праяўляюцца і іншыя атрыбуты-вобразы нацыянальнай культуры. Яны арганічна ўзнікаюць у плыні дзённікавых запісаў, ствараючы адчуванне далучанасці прыватнага жыцця сучаснага жыхара Беларусі да калек-

тыўнай спадчыны краіны. Пацалункі з Ганнай Чарнушкай у сне, убачанае на літаратурнай сустрэчы вуха пісьменніка Марціновіча, развагі адносна накладу дзіцячага часопіса «Вясёлка», першае слова па-беларуску, сказанае дачкой, – гэты шэраг смешных і сур'ёзных назіранняў дэманструе запатрабаванасць нацыянальных вобразаў у аўтарскім светаадчуванні і адначасова ўводзіць прыватны аповед яго дзённіка ў кантэкст традыцыі самавыяўлення беларускай нацыі.

Паступова ў запісах А. Горвата акрэсліваецца яшчэ больш незвычайная ідэя – вяртанне на радзіму свайго дзеда ў вёску Прудок, што каля Калінкавіч, або, як у аўтарскім тэксце, Каленкавічаў. Такі ўчынак, вельмі нетыповы для сучаснасці, выразна супрацьпастаўлены сённяшняй цэнтраімклівай тэндэнцыі, выклікаў вялікую ўвагу інтэрнэт-аўдыторыі. Урэшце, адной з прычын папулярнасці фэйсбукавых запісаў Горвата стала прадстаўленая ў іх магчымасць сачыць за своеасаблівым рэаліці-шоу, заснаваным на мясцовым беларускім матэрыяле. Герой-апавядальнік таксама падыгрывае такому фармату: у анлайн-рэжыме, у форме прамога эфіру з Прудка інфармуе пра свае апошнія прыгоды, а па сутнасці, пра эксперымент на выпрабаванне сілы духу і цела: «Радзіва "Прудок". Перадача "Апошні герой". Электраабагравальнік зламаўся, 3G-мадэм не працуе, малако не кісне. А ў каморы, дзе я сплю, плюс восем» [1, с. 38].

Разам з апісаннем цяжкасцей уладкавання вясковага побыту ў дзённіку з'яўляюцца назіранні за жыццём правінцыі, той часткі беларускай прасторы, якая, як лічыцца, найбольш захавала сувязь з традыцыяй. У адпаведнасці з запатрабаваннямі мэтавай аўдыторыі, зацікаўленай у відовішчах, вобраз вёскі Прудок раскрываецца найперш у шэрагу каларытных замалёвак вясковага жыцця. У жартоўных тонах аўтар паказвае сваё знаёмства з карэннымі жыхарамі, з іроніяй дэманструе свае поспехі ў развядзенні сельскай гаспадаркі, рэкламуе выгады жыцця на ўлонні прыроды. У штодзённых клопатах героя, яго адносінах да людзей, працы, навакольнага свету выяўляецца шэраг рыс, якія складаюць традыцыйную і ў цэлым пазітыўную ацэнку беларуса. З некаторым здзіўленнем аўтар адчувае ў сабе абуджэнне генаў беларускай цярплівасці, калі прыходзіцца палоць лён, і паляшуцкай сквапнасці, калі не можна спыніцца засаджваючы вясной агарод, з гумарам разважае аб сваёй залежнасці ад бульбы і сала. Усе гэтыя эпізоды развіваюць уяўленне аб прывязанасці беларуса да зямлі, яго працавітасці і падаюцца ў той характэрнай жартаўлівай манеры, якую дэманструе наступнае прызнанне: «Відаць, мяне ўкусіў нейкі шалёны беларус. От свята сёння, а я вью на столь, што няможна рабіць» [1, с. 208].

Актуальнасць кнізе «Радзіва "Прудок"» надае тое, што пляцоўкай горватаўскага эксперыменту стала вёска. Блізкасць яе вобраза бадай што для кожнага беларуса дазваляе чытачам супаставіць аўтарскія назіранні з уласным вопытам, адчуць ці ўспомніць далучанасць да сваёй родавай спадчыны. Вяртанне ў вёску выглядае своеасаблівым тэрапеўтычным сродкам для калектыўнай траўмы беларусаў, атрыманай пры масавым пераездзе ў горад. Не прыдуманы і не проста ўзяты з жыцця сюжэт, а менавіта перажываная аўтарам гісторыя наглядна раскрывае асаблівы статус малой радзімы ў свядомасці сучаснага беларуса і разам з тым прысутнасць дэкларатыўных адносін да яе. Больш тыповым для сённяшняга дня выглядае тое альтэрнатыўнае развіццё падзей, калі герой застаецца ў Мінску, а ва ўмоўным Прудку зносяць дзедава селішча. Аўтарскія разважанні даюць магчымасць адчуць тыя незваротныя духоўныя страты, якія нясуць беларусы пры рэалізацыі такога сцэнарыя: «Потым тут выросла б кал-

гаснае жыта, і штогод на Радаўніцу мы, нашчадкі, гулялі б у гульню: тамака быў плот, тутака баба Дуся сядзела на лаўцы. Мы штогод гуляем у гэтую гульню на вотчыне маці» [1, с. 62].

Аднаўленне дзедавай хаты Андрусём Горватам бачыцца развіццём матыву вяртання радзімы, вядомага ў нацыянальнай літаратурнай традыцыі па вобразах роднай хаты ў Ф. Багушэвіча і раскіданага гнязда ў Я. Купалы. Адначасова з навядзеннем парадку на дзедавай сядзібе герой кнігі «Радзіва “Прудок”» узнаўляе гісторыю свайго роду, многія старонкі якой пазначаны агульнымі для ўсяго беларускага народа трагічнымі падзеямі. Лёс продкаў, якія перажылі ссылкі і выгнанні і здолелі вярнуцца на радзіму, выглядае ў сюжэце твора важнай эмацыянальнай падтрымкай самога героя-апавядальніка і, разам з тым, выяўленнем ментальнай сувязі розных пакаленняў беларусаў з роднай зямлёй.

Сюжэт «Радзіва “Прудок”» выяўляе складаную сітуацыю асабістага прызнання радзімы, бясспрэчна каштоўнай прасторы, але нярэдка складанай, нязручнай і для фізічнага, і для духоўнага быцця. Таму вяртанне Горвата на малую радзіму можа быць прызнана кімсьці як смелым, так і неабдуманым учынкам. Тым больш што сённяшні беларус мае магчымасць камунікаваць з усім светам, выбіраць для жыцця іншыя краіны. Герой кнігі таксама быў блізкі да такога рашэння, але стрымаўся, адчуваючы небяспеку страціць сваю беларускую адметнасць, сваю малую радзіму: «Я сам двойчы пачынаў пакаваць чамаданы. Але не з’ехаў, бо ў Польшчы ёсць усё, але няма хаты майго дзеда і яго магілы» [1, с. 181].

Такім чынам, кніга «Радзіва “Прудок”» дэманструе актуальнасць нацыянальнага ў пошуках сучасным беларусам свайго жыццёвага прызначэння. Прыналежнасць да беларускай культуры, клопат аб малой радзіме, цікавасць да менталітэту народа і яго гісторыі паўстаюць у дзённіку вызначальнымі характарыстыкамі асобы героя-апавядальніка і светапогляднай асновай яго адданасці Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Горват, А. І.* Радзіва «Прудок»: дзённік / А. І. Горват. – Мінск : Медысонт, 2018. – 246 с.

УДК 821.161.3.09(092)(043.3)

В. В. Круглова (Мінск)

ВЫКАРЫСТАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ ЛУЧЫНЫ

Даследаванне шматмоўнай літаратуры Беларусі – адна з актуальных праблем сучаснага беларускага і ўвогуле славянскага літаратуразнаўства. Янка Лучына ўвайшоў у гісторыю трох культур: польскай, беларускай і рускай. У большай ступені пісьменнік карыстаўся польскай мовай, радзей – беларускай, і зусім няшмат твораў напісана ім па-руску. Я. Лучына вядомы як аўтар зборнікаў «Poezje» (1898) [1] і «Вязанка» (1903) [6].

Ідэйны змест творчасці Я. Лучыны датычыцца сацыяльных, грамадзянскіх, палітычных, этнічных, канфесійных, філасофскіх пытанняў. Дадзеныя праблемы не страцілі сваёй актуальнасці і цяпер.

Станаўленне новага грамадства характарызуецца інтэнсіўным ростам інвармацыі. Захоўванне інфармацыі ў папяровых варыянтах ускладняе эфектыўнасць працы з ёй. Вырашэнне гэтай праблемы ляжыць у аснове выкарыстання інвармацыйных тэхналогій (ІТ). У апошнія дзесяцігоддзі ўзрастае колькасць інфармацыі, якая існуе выключна ў электронным выглядзе. Таму развіццё ІТ з’яўляецца вельмі важнай задачай.

На дадзены момант у філалогіі праводзяцца даследаванні з выкарыстаннем ІТ. Аднак літаратуразнаўства, у адрозненні ад лінгвістыкі, мае меншую сувязь з камп'ютарнымі тэхналогіямі. Даследаванні ў галіне праблемна-тэматычнага поля, паэтыкі падаюцца амаль несумяшчальнымі з ІТ. На прыкладзе творчасці Я. Лучыны паспрабуем даказаць, што літаратуразнаўства таксама можа мець узаемадзеянне з камп'ютарнымі тэхналогіямі.

Актуальнасць работы заключаецца ў спробе асэнсаваць праблему выкарыстання ІТ пры вывучэнні шматмоўнай літаратуры Беларусі, і прапанаваць шэраг метадаў для вывучэння творчасці Я. Лучыны. Для гэтага неабходна прааналізаваць існуючыя сродкі вывучэння творчасці аўтара, вызначыць іх эфектыўнасць, выявіць найбольш праблемныя сферы ў галіне выкарыстання ІТ у літаратуразнаўстве і знайсці шляхі іх шырокага выкарыстання.

Навуковая навізна работы заключаецца ў тым, што ў ёй упершыню робіцца спроба міждысцыплінарнага даследавання, якое дазволіць акрэсліць перспектывы выкарыстання ІТ у літаратуразнаўстве, у прыватнасці пры вывучэнні творчасці Я. Лучыны.

У літаратуразнаўстве ІТ выкарыстоўваюцца не так шырока, як у лінгвістыцы. Прычынай гэтаму з'яўляюцца істотныя адрозненні літаратуразнаўчай і мовазнаўчай навукі. Нягледзячы тое, што ў абедзвюх навуках аб'ект вывучэння – тэкст, рознымі з'яўляюцца прадметы вывучэння. У літаратуразнаўстве ён часцей за ўсё абстрактны: тэматыка, праблематыка, ідэя, жанр, сістэма вобразаў і г. д. Прадмет мовазнаўства больш канкрэтны: структура слова, этымалогія, часціны мовы, лексіка, граматыка, сінтаксіс, частотнасць ужывання пэўных адзінак. Таму прадмет мовазнаўчай навукі прасцей прадстаўляць у электронным выглядзе і аналізаваць пры дапамозе камп'ютарных тэхналогій.

Аднак і ў літаратуразнаўстве ёсць сферы, у якіх найбольш мэтазгодна прымяняць інфармацыйныя тэхналогіі. Напрыклад, пры даследаванні вершавання на сучасным этапе выкарыстоўваюцца такія камп'ютарныя тэхналогіі, як *Дакладныя метады ў сучасным вершазнаўстве*, *Камп'ютарныя метады статыстычнага аналізу ў сучасным вершазнаўстве*. На дадзены момант існуе некалькі метадаў аналізу літаратурнага твора з выкарыстаннем ІТ, аўтарамі якіх з'яўляюцца М. А. Краснапёрава (Санкт-Пецярбург) [7]; кафедра гісторыі і тэорыі літаратуры Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта: В. С. Баеўскі [2], Н. А. Сямёнава [2], І. В. Бахошка [2], Р. Я. Крысталінскі [2], І. В. Раманава [5], Т. А. Самойлава [5], В. А. Смагіна [5], Я. П. Ямельчанкаў [4], М. Н. Луферэнкаў [4], М. Л. Рагацкіна [4], Л. В. Паўлава [4], Я. Ю. Дваенка [8]; Б. І. Ярхо (Масква) [9].

Пры вывучэнні творчасці Я. Лучыны могуць быць выкарыстаны наступныя метады:


1) Існуюць Нацыянальны корпус польскай мовы (http://nkjp.pl), Беларускі N-корпус (http://bnkorpus.info/korpusSearch.html). У беларускі корпус уключаны пераклад польскамоўнай паэмы «Akwarelki myśliwskie» і верш «Роднай старонцы». Пашыраныя магчымасці пошуку назваляюць выбраць канкрэтнае слова або пэўную часціну мовы, якія выдзя-

Край гожы, некрануты быў перада мною,
Чарот бязмежны, пушча з сіняй глыбінёю,
Дзе хвой выносістых завершаны стажок,
Як галаву ... А побач клён раскошны, дуб стары, гарбаты,
З разлогаю сукоў магутных, вузлаватых.
Падшыта ўсё густым ляшчыннікам, лазой,
Каб ... ў глыбіні схаваць лясной.
Ціхота… толькі дзятла стук заўзяты, бойкі,
Ці крыкне папялістая ў спалоху сойка ...

Малюнак 1


ляюцца ва ўсім тэксце (мал. 1). Такі пошук вельмі зручны, калі, напрыклад, даследчыку неабходна вызначыць ролю прыметнікаў (назоўнікаў, дзеясловаў і г.д.) у творы.

2) Пры аналізе вершаванага твора вельмі важным з'яўляецца аналіз паэтыкі. Выкарыстоўваючы IT, стала вельмі лёгка вызначыць памер верша. Польскамоўныя вершы аналізуюцца ў праграме Metronom (http://metronom.jtomaszewski.com/), рускамоўныя – «Ритм во мне». У поле ўстаўляецца тэкст, праграма аўтаматычна растаўляе націскі. Часам сустракаецца пераакцэнтуацыя, таму памер вылічваецца як сярэдняе арыфметычнае ва ўсіх радках (мал. 2).




Малюнак 2

Пры аналізе польскамоўных вершаў акрамя памеру яшчэ вылічваецца колькасць стоп: напрыклад, у вершы «Dwie zorze» чаргуецца 3- і 4-стопны дактыль (мал. 3).



Малюнак 3

Памер беларускамоўных вершаў можна вызначыць у праграме Nole (мал. 4). Адзіны недахоп прыведзеных праграм заключаецца ў тым, што яны не рас пазнаюць сілабічную і сілабатанічную сістэмы, таму часам памылкова вызначаюць памер верша, напісанага ў сілабічнай сістэме.



Малюнак 4

Праграма для аўтаматычнага аналізу рыфмы яшчэ знаходзіцца ў растрацоўцы. Камп'ютару складаней аналізаваць рыфму, чым іншыя кампаненты верша, бо рыфма залежыць не ад напісання слова, а ад яго гучання. На дадзены момант існуе праграма, якая дазваляе знайсці граматычныя рыфмы. *Граматычная рыфма* ўяўляе сабой сугучнасць слоў, якія стаяць у адной граматычнай форме.

Для аналізу польскамоўных вершаў можна выкарыстоўваюць праграму Morfeusz. Тэкст уводзіцца ў поле і праграма вызначае часціну мовы кожнага слова, яго склон, род, лік, час дзеяслова. Па выніках можна сцвярджаць наяднасць або адсутнасць граматычных рыфмаў. Напрыклад, у вершы «Maj», які складаецца з 16 радкоў, прысутнічае толькі адна пара граматычнай рыфмы (gaj–maj), таму можна сцвярджаць высокую мастацкую вартасць твора (мал. 5).

0	1	**dni**	dzień:s1	subst:pl:acc:m3	2	3	**ból**	boleć:v2	impt:sg:sec:imperf
			dzień:s1	subst:pl:gen:m3				ból	subst:sg:acc:m3
			dzień:s1	subst:pl:nom:m3				ból	subst:sg:nom:m3
			dzień:s1	subst:pl:voc:m3	3	4	**gości**	gościć	fin:sg:ter:imperf
1	2	**lesie**	las	subst:sg:loc:m3				gościa	subst:pl:gen:f
			las	subst:sg:voc:m3				gościa	subst:sg:dat:f
2	3	**śni**	śnić	fin:sg:ter:imperf				gościa	subst:sg:gen:f
3	4	**chce**	chcieć	fin:sg:ter:imperf				gościa	subst:sg:loc:f
4	5	**się**	się	qub				gość	subst:pl:acc:m1
0	1	**gwar**	gwar	subst:sg:acc:m3				gość	subst:pl:gen:m1
			gwar	subst:sg:nom:m3	0	1	**gaj**	gaić	impt:sg:sec:imperf
			gwara	subst:pl:gen:f				gaj	subst:sg:acc:m3
1	2	**strzela**	strzelać	fin:sg:ter:imperf				gaj	subst:sg:nom:m3
2	3	**mar**	mara	subst:pl:gen:f				gaja	subst:pl:gen:f
			mary:s2	subst:pl:gen:p3	1	2	**zima**	zimać	fin:sg:ter:perf
3	4	**wesela**	wesele	subst:pl:acc:n2				zima	subst:sg:nom:f
			wesele	subst:pl:nom:n2	2	3	**maj**	maić	impt:sg:sec:imperf
			wesele	subst:pl:voc:n2				maj	subst:sg:acc:m3
			wesele	subst:sg:gen:n2				maj	subst:sg:nom:m3
0	1	**pól**	pole	subst:pl:gen:n2	3	4	**niema**	niema	subst:sg:nom:f
1	2	**żałości**	żałość	subst:pl:acc:f				niema	subst:sg:voc:f
			żałość	subst:pl:gen:f				niemy:a	adj:sg:nom.voc:f:pos


Малюнак 5

3) Пры вывучэнні творчасці Я. Лучыны было дапушчана некалькі тэкстала-гічных недакладнасцей. Напрыклад, вершы «Z dziejów życia i pieśni» і «Rozkosz natchnienia» лічыліся асобнымі тэкстамі, у выданнях твораў Я. Лучыны змяшчаюцца асобныя пераклады абодвух вершаў. Аднак верш «Rozkosz natchnienia» – гэта варыянт другой часткі верша «Z dziejów życia i pieśni». Верш «Rozkosz natchnienia» быў напісаны і надрукаваны раней, пасля чаго пісьменнік перапрацаваў яго, памяняў месцамі некаторыя строфы і дадаў да верша «Z dziejów życia i pieśni». Высветліць ступень падабенства тэкстаў можна ў праграме Shingles Expert, дзе пацвярджаецца падабенства абодвух тэкстаў, якое складае 42 %.

4) Актыўна распрацоўваецца кантэнт-аналіз. Ён уяўляе сабой падзел тэксту на пэўныя сэнсавыя часткі з мэтай выяўлення ключавых слоў у творы для іх далейшай інтэрпрэтацыі. Напрыклад, пры аналізе верша «Lirnik wioskowy» падаюцца наступныя ключавыя словы і іх частотнасць (табл.):

Слова	Частотнасць	Слова	Частотнасць	Слова	Частотнасць
lira	8	Śpiewna	3	serce	2
piosnka	8	Moja	3	zbudź	2
pieśnia	6	Gdzie	3	skonaj	2
graj	3	Lirnik	2	śpiewak	2

5) Пры афармленні вынікаў даследавання або абагульненні пэўнага матэрыялу мэтазгодна выкарыстоўваць наглядныя сродкі: табліцы, схемы, дыяграмы. У праграме Microsoft Office Excel можна стварыць дыяграму, у якой адлюстроўваюцца суадносіны паміж частотнасцю выкарыстання пэўных сістэмы вершавання і вершаваных памераў у паэзіі Я. Лучыны (мал. 6).



Малюнак 6

Такім чынам, дадзеная работа даказвае, што даследаванне творчасці Я. Лучыны можна паспяхова ажыццяўляць пры выкарыстанні існуючых інфармацыйных тэхналогій. Недахопам пры вывучэнні творчасці з дапамогай ІТ з'яўляецца недастаткова поўная распрацаванасць праграм, якія распазнаюць беларускамоўны тэкст.

На жаль, на дадзены момант адсутнічае ўніверсальны метад аналізу праблемна-тэматычнага поля і зместу мастацкага твора з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій. Аднак пры дапамозе камп'ютарных тэхналогій можна вывучаць фармальны бок мастацкага твора: рыфму, рытм, вершаваны памер, строфіку, паэтычную лексіку, паэтычны сінтаксіс.

Перспектывы выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у літаратуразнаўстве даволі шырокія, што відаць на прыкладзе вывучэння творчасці Я. Лучыны. Пры

ўмове далейшых узаемадзеянняў камп'ютарных тэхналогій з літаратуразнаўствам магчымы новыя распрацоўкі, якія можна прымяняць для вывучэння мастацкіх твораў.

ЛІТАРАТУРА

1. Poezje Jana Niesłuchowskiego. – Warszawa, 1898. – 156 s.
2. *Баевский, В. С.* Применение кластерного анализа для решения некоторых вопросов истории и теории литературы / В. С. Баевский [и др.] // Славянский стих: Лингвистическая и прикладная поэтика; под ред. М. Л. Гаспарова, А. В. Прохорова, Т. В. Скулачевой. – М. : Языки славянской культуры. – 2001. – С. 379–385.
3. *Баевский, В. С.* Лингвистические, математические, семиотические и компьютерные модели в истории и теории литературы // В. С. Баевский – Языки славянской культуры, М. – 2001. – 151 с.
4. *Баевский, В. С.* Структура онегинской строфы. К теории текста и гипертекста. Компьютерный анализ / В. С. Баевский [и др.] // Славянский стих: Лингвистическая и прикладная поэтика / под ред. М. Л. Гаспарова, А. В. Прохорова, Т. В. Скулачевой. – М. : Языки славянской культуры. – 2001. – С. 386–391.
5. *Баевский, В. С.* О мере близости частотных словарей русских поэтов XIX–XX вв. / В. С. Баевский [и др.] // Славянский стих: Лингвистическая и прикладная поэтика; под ред. М. Л. Гаспарова, А. В. Прохорова, Т. В. Скулачевой. – М. : Языки славянской культуры. – 2001. – С. 392–399.
6. Вязанка. – Пецярбург. – 1903. – 24 с.
7. *Красноперова, М. А.* Грамматика и семантика ритмического текста в реконструктивном моделировании стихосложения (к постановке проблемы) / М. А. Красноперова // Славянский стих. VII: Лингвистика и структура стиха; под ред. М. Л. Гаспарова, Т. В. Скулачевой. – М. : Языки славянской культуры. – 2004. – С. 411–420.
8. *Романова, И. В.* Опыт применения компьютерной программы «Гипертекстовый поиск слов-спутников в художественном тексте» / И. В. Романова, Я. Ю. Двоенко // Международный научно-исследовательский журнал; под ред. А. В. Миллера. – Екатеринбург. – 2013, № 3. – С. 12–17.
9. *Ярхо, Б. И.* Методология точного литературоведения: Избранные труды по теории литературы / Б. И. Ярхо; изд. подгот. М. В. Акимова, И. А. Пильщиков, М. И. Шапир; под общей ред. М. И. Шапира. – М. : Языки славянских культур. – 2006. – 927 с.

УДК 82-97+801.73

Л. В. Ляўшун (Мінск)

ЭМАТЫЎНЫ СКЛАДНІК МАСТАЦКАГА КАНОНА ХРЫСЦІЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Хрысціянскае багаслоўе вельмі стрымана ставіцца да сферы эмоцый, хоць эмацыйнае натуральна прысутнічае ў хрысціянскай культуры, паколькі з'яўляецца атрыбутам чалавека. Святаайцоўская антрапалогія падпадзяляе душу па здольнасцях, відах, ці частках на раслінную, адчуваючую і думаючую, альбо, адпаведна Арыстоцелю (Aristot. Ethic. Nicomach., I, 13), – на разумную і неразумную. Неразумная частка душы таксама двусастаўная і складаецца з той, якая падпарадкоўваецца розуму (λογικόν), і той, якая яму не падпарадкоўваецца (ἄλογον)» [7, с. 75–76]. У сваю чаргу тая частка чалавечай душы, якая падпарадкоўваецца розуму, уяўляе сімбіёз адчувальна-пажадальнага (ἐπιθυμητικόν) і афектыўнага (τό θυμικόν) складнікаў [7, с. 76].

Прааналізаваўшы антрапалагічныя погляды найбольш аўтарытэтных хрысціянскіх багасловаў, Ф. С. Уладзімірскі прыйшоў да наступных высноў: «страсць ёсць "рух насуперак прыродзе" (Клімент Александрыйскі, Нямезій Эмесскі, Васілі Вялікі, Грыгоры Ніскі, Ісак Сірын, Іаан Дамаскін, Мялеці Манах і інш.) <…> душа сама па сабе, па сваёй богападобнай прыродзе, бясстрасная, ἀπαθής (Ісак Сірын, Грыгоры Ніскі, Іаан Златавусны, Мялеці Манах і інш.), так што "жарсці ёй не ўласцівыя" (Грыгоры Ніскі, Іаан Златавусны, Ісак Сірын, Ілля Крыцкі і інш.). Адсюль зразумела, што "πάθος" ёсць нешта "ненатуральнае", ненармальнае, "якое прыўваходзіць звонку" у душу (Ісак Сірын, Макары Вялікі, Ілля Крыцкі і інш.); яна – "хвароба душы" і – прытым – выпадковая (Васілі Вялікі, Ісак Сірын і інш.)» [2, с. 433].

Мяркуем, што хрысціянскі творца мае справу менавіта з афектыўным складнікам душы верніка, якая, па вызначэнні хрысціянскіх багасловаў, ёсць «жарсць душэўная», «хвароба душы», альбо «неразумны рух душы» кожны раз, калі гэты рух адбываецца насуперак прыродзе [7, с. 77, 433]. Менавіта гэтая сіла, адпаведна святаайцоўскай антрапалогіі, праяўляецца ў паўшым чалавеку, калі яна не падпарадкавана розуму. І наадварот, як адзначае прап. Максім Выспаведнік, «калі нечый розум няспынна скіраваны да Бога, то пажадлівасць (ἡ ἐπιθυμία) ператвараецца ў жаданне Бога, “Боскую жарсць” (τὸν θεῖον ἔρωτα), а раздражняльнасць і гнеў (ὁ θύμος) – у любоў да Бога (τὴν θείαν ἀγάπην)» [5].

Прычына жарсці, на думку хрысціянскіх антраполагаў, ляжыць не ў прыродзе чалавека; «псіхічная сіла», якая спрыяе ўзнікненню гэтай «хваробы», – намысел (ὁ λογισμός), які азмрочвае розум і ўзнікае «у выніку паслаблення ўлады розуму над ніжэйшай і натуральнай цягай чалавечай прыроды», г.зн. у выніку «дрэннага справавання розуму». Сама па сабе гэтая цяга «яшчэ ні дрэнная ад прыроды, ні дабрадзейная, а ўсё залежыць ад таго кірунку, які надае ёй розум, урабляючы “ніву нашага сэрца”» [2, с. 434]. І глебай для схільнасці розуму да граху з’яўляецца, згодна з святаайцоўскай антрапалогіяй, «разбэшчванне душы, якое вырабіў у чалавеку першародны грэх» [2, с. 439]. А «“выратаванне” жарслівай сілы душы – як яе выпраўленне і асвячэнне – ажыццяўляецца ў хрысціяніне шляхам як бы нейкага “перанакіравання” <…> з цялесных асалод і мірскіх пачуццёвых задавальненняў на Боскую рэальнасць, і ў той жа час – праз падпарадкаванне гэтага жарслівага пачатку неразумнай частцы душы нашаму розуму (як гэтак і было першапачаткова задумана Творцам у дачыненні да чалавека), а таксама дзякуючы дасягненню нейкай умеранасці ў праяве гэтых сіл, іх як бы “прымяншэння”, нармалізацыі “моцы” іх парываў» [6].

Менавіта таму хрысціянскія аскетыка і педагогіка, а разам з імі і іканалогія (тут: вучэнне аб творчасці і мастацкім вобразе.–*Л. Л.*) так пільную ўвагу надаюць паслядоўнаму тэасісу (абагаўленню) жарслівай сілы ў людской прыродзе пад «неапісальнымі таямнічымі ўздзеяннямі (энергіямі) Духа» [3]. Галоўнай задачай пры гэтым прызнаецца «перанакіраванне» неразумнай жарснай сілы з «уяўнасцей» эмпірыі (свету, які «во злѣ лежитъ», 1 Ін. 5:19) на ісцінасць Божай рэальнасці («храмину нерукотворену, вѣчну на небесѣхъ», 2 Кар. 5:1). Такі стан, вызначаецца ў хрысціянскай аскетыцы як «святая жарслівасць», у якой амаль зліваюцца супрацьдеглыя значэнні паняцця *жарсць*, *πάθος* у вызначэнні «таго жарснага саюза любві Творцы і Яго стварэння, які яднае <…> Бога, што падае Свой дабрадар, і чалавека, што імкліва шукае гэтага дабрадару абагаўлення» [6].

Аднак гэты, здавалася б адзін і той жа дабрадар, успрымаецца кожным вернікам «у сваю меру» (Эф. 4:16) у залежнасці ад тыпаў экзістэнцыі, гносіса, аксіялагічнай іерархіі ды інш., якія адрозніваюць дадзенага канкрэтнага індывіда ад усіх іншых. І значыць, стратэгіі і нават, часам, тактыкі «перанакіравання» натуральнай жарслівасці розных індывідаў павінны быць рознымі.

Менавіта такі прынцып і пакладзены ў аснову святаайцоўскай іканалогіі – мастацкага канону хрысціянская культуры. Сутнасць гэтага апошняга творчага імператыву вельмі дакладна сфармуляваная, па-першае, Хрыстовым «ідзіце і навучыце ўсе народы» (Мц. 28:19), а па-другое, – сцвярджаючым і развіваючым гэты боскі імператыў прызнаннем апостала Паўла: «Будучы вольны ад усіх, я зрабіўся слугою ўсім, каб болей здабыць: для іудзеяў я быў як іудзей, каб

набыць іудзеяў; для падзаконных быў як падзаконны, каб здабыць падзаконных; для тых, хто без закона, – як чужы закона, – не будучы чужы для законам перад Богам, але падзаконны Хрысту, – каб здабыць тых, хто чужы закона; для нямоглых быў як нямоглы, каб здабыць нямоглых. Для ўсіх я зрабіўся ўсім, каб выратаваць прынамсі некаторых» (1 Кар. 9: 19–22).

Гэтым жа прынцыпам безумоўна кіруецца і хрысціянская педагогіка: з пункту гледжання педагагічных задач усе вернікі прадстаўлены у адпаведнасці з іх духоўнай асвечанасцю як тры «чыны» – «цялесныя», «душэўныя» і «духоўныя» (Рым. 8:5–7, 13; 1 Кар. 3:1,3–4, 9:1, 12:14, 15:44, 46; Эф. 2:3), альбо «пачатковыя», «паспяховыя», «дасканалыя», альбо «якія ачышчаюцца», «якія прасвятляюцца» і «якія ўдасканальваюцца» (Дыянісі Арэапагіт «Аб нябеснай іерархіі», III. 3).

У адпаведнасці з гэтым прынцыпам святаайцоўскай педагогікі мастацкі канон хрысціянскай культуры (тэорыя вобразу) вызначае для сваіх мастакоў асноўныя мэты: «пачатковым» варта прапаноўваць пераважна творы, якія выхоўваюць іх пачуццёва-эмацыйнае ўспрыманне свету і якія дапамагаюць падпарадкаваць волі «ніжэйшую і натуральную цягу чалавечай прыроды» (агіяграфія з яе яркімі прыкладамі з жыцця падзвіжнікаў); духоўным удасканальваннем «паспяховых» варта кіраваць праз творы, якія развіваюць іх разумова-разважальныя здольнасці і тым самым навучаць іх, як падпарадкаваць волю розуму (экзегетыка з яе часам скрупулёзнымі тлумачэннямі, чаму ў тых ці іншых выпадках варта паступаць так, а не інакш); «дасканалым» жа прапануецца саўдзел у праслаўленні Творцы на вяршынях богапазнання, што магчыма толькі ў стане ἀπάθεια – той самай «святой жарслівасці», якая дасягаецца толькі пасля вызвалення ад жывёльных жарсцей, так ці інакш звязаных з эмпірыяй (панегірык). Менавіта таму часта «прастата пабудовы і выкладу шэрагу літаратурных твораў <...> ранняга часу тлумачыцца не няўмеласцю іх аўтараў, а свядомым імкненнем зрабіць сваю творчасць зразумелай для недасвечаных людзей» [4, с. 330].

Іншая акалічнасць, якую неабходна ўлічваць, даследуючы эматыўны складнік у мастацкім каноне хрысціянскай культуры, тычыцца гнасеалагічных асноў апошняй. Як заўважыў В. У. Бычкоў, у аснове хрысціянскай іканалогіі ляжыць перакананасць у тым, што вышэйшае веданне адкрываецца чалавеку (любога «чыну рупліўцаў») не ў паняццях, а ў вобразах і сімвалах [1, с. 117], у тым ліу мастацкіх, якія па самой сваёй прыродзе не могуць быць вольныя ад эматыўнасці.

Аднак эматыўнасць кананічных мастацкіх вобразаў і сімвалаў, найверагодна, і з'яўляецца праяўленнем той самай «святой жарслівасці», у якую на вершынях абагаўлення ператвараецца «жывёльная жарсць», вызваліўшыся ад цялеснасці і душэўнасці (Рым. 8:5–7, 13; 1 Кар. 3:1,3–4, 9:1, 12:14, 15:44, 46; Эф. 2:3). Інакш кажучы, вобразы і сімвалы хрысціянскай культуры спараджаюць (ва ўсякім выпадку, павінны спараджаць у адпаведнасці з мастацкім канонам) менавіта эмоцыі («святую жарслівасць»), што ніяк не датычныя натуральным рэакцыям чалавечага цела і псіхікі на з'явы «ляжачага ў граху свету» (1 Ин. 5:19), але выяўляюць невыказнае захапленне далучэннем да Боскага быцця.

Спецыфічнасць эматыўнасці, дапушчальнай хрысціянскай іканалогіяй, пераўтварае звыклыя сродкі выражэння, апісаныя ў нарматыўнай паэтыцы, у «паэтыку Ісціны» (Р. Пікія), у творах якой пераследуюцца мэты, зусім не эстэтычныя, не эгаістычна-прагматычныя (у сэнсе здзівіць і пахваліцца літаратурным майстэрствам) і тым больш не маніпулятыўныя (у сэнсе дамагчыся кантролю над паводзінамі і думкамі іншага чалавека для дасягнення маніпулятарам уласных мэтаў).

Такое вось асаблівае стаўленне да ролі і характару эмацыйнасці, прадстаўленае хрысціянскай антрапалогіяй, аскетыкай і педагогікай, натуральна адлюстроўваецца і ў характары эматываў, непазбежна прысутных нават у кананічных творах хрысціянскай культуры. Мэтай такіх твораў з'яўляецца менавіта ператварэнне розных супрыродных чалавеку пажадлівасцей у «святую жарслівасць», якая набліжае яго да богападабенства.

Прывядзём толькі адзін прыклад, каб паказаць, як гэта адбываецца. У «Слове о страсе Божии», якое прыпісваецца свц. Кірылу Тураўскаму, сустракаем вельмі неардынарны вобраз: «Боим же ся *огненаго родства*, яко вечен есть огнь неугасим». Гэты вобраз «огненаго родства», нягледзячы на адсутнасць фармальных эматыўных сродкаў і знакаў, валодае надзвычай высокім эматыўным патэнцыялам і, магчыма, таму быў вельмі распаўсюджаны ва ўсходнеславянскай кніжнасці таго перыяду. Аднак відавочны эматыўны зарад гэтага вобраза ствараецца не выразнай і дасціпнай гульнёй слоў, як гэта можа падацца з пункту гледжання нарматыўнай паэтыкі. Можна нават меркаваць, што гэты эматыў увогуле не ствараецца аўтарам свядома – эмасема накідваецца на нейтральнае ў семантычным плане апісанне ў выніку міжвольнай этымалагічнай экзэгезы, укарэненай у лінгвакультурным кодзе slavia orthodoxa. І менавіта з гэтай прычыны ў адным вобразе спалучаецца значэнне старажытнагрэцкага «генна» (род, сваяцтва) і старажытнаяўрэйскага «гіном/геена» (пекла). Гэтае спалучэнне стварае вобраз, які, пры надзвычайнай лаканічнасці, набывае найглыбокі сэнс, зусім не роўны суме яго сэнсавых складнікаў; вобраз, які разам з тым мае наймоцнае эмацыйнае, духоўна пераўтваральнае ўздзеянне як на самога аўтара, так і на яго адрасата: «огненное родство» азначае вечную пародненасць з пякельным агнём у супрацьлегласць пажаданаму кожным хрысціянінам Богасыноўству – вечнай пародненасці з Хрыстом.

Такім чынам, характар эматыўнасці ўвогуле, як і пэўных эматыўных структур, уключаных у мастацкія творы хрысціянскай культуры, могуць служыць, з аднаго боку, падставай і гарантам кананічнасці, з другога – крытэрам адрознівання кананічных і некананічных (але таксама хрысціянскіх рэлігійных) твораў. Мастацкія вобразы-эматывы кананічных твораў спараджаюць «святую жарслівасць», або «жаданне Бога» і выклікаюць, так мовіць, «эмоцыі ператварэння», якія праз катарсіс спрыяюць раскрыццю духоўнага патэнцыялу асобы, што імкнецца да богападабенства. А вобразы-эматывы некананічных твораў спараджаюць «страсці душэўныя», якія святаайцоўская антрапалогія і педагогіка вызначаюць як «раны, альбо захворванні душы»; яны ўзбуджаюцца і культывуюцца, так мовіць, «эмоцыямі пераканання», праз якія аўтар маніпулюе свядомасцю адрасата з мэтай навязаць яму ўласныя ідэі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Бычков, В. В*. Византийская эстетика / В. В. Бычков. – М. : Искусство, 1977. – 200 с.
2. *Владимирский, Ф. С.* Антропология и космология Немезия, еп. Емесского, в их отношении к древней философии и патристической литературе / Ф. С. Владимирский. – Житомир: Электро-типография насл. М. Денемана, 1912. – 454 с.
3. *Григорий Палама, архиепископ Солунский*. Святогорский томос в защиту священнобезмолвст-вующих / святитель Григорий Палама, архиепископ Солунский // [Электронный ресурс] Право-славие и мир. Электронная библиотека. – Режим доступа: https://lib.pravmir.ru/library/readbook/ 3140. – Дата доступа: 26.12.2020.

4. *Калиганов, И. И.* Болгарская литература в IX–XII столетиях / И. И. Калиганов // Очерки истории культуры славян / ред. кол. : В. К. Волков, В. Я. Петрухин [и др.]. – Москва. Ин-т славяноведения РАН: Индрик, 1996. – С. 327–341.
5. Максим Исповедник, преп. Четыре сотни глав о любви / преп. Максим Исповедник / [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://yakov.works/acts/07/2/isp_dobr3.htm. – Дата доступа: 20.08.2020.
6. *Малков, П. Ю.* Учение святых отцов Восточной Церкви о страстях (в его взаимосвязи с учением о человеческой природе и призвании ее к обожению) / П. Ю. Малков // Богословская конференция Русской Православной Церкви «Жизнь во Христе». Москва, 15–18 ноября 2010 г. Материалы. Синодальная Богословская Комиссия. М., 2012 / [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://azbyka.ru/otechnik/antropologiya-i-asketika/uchenie-svjatyh-ottsov-vostochnoj-tserkvi-o-strastjah-v-ego-vzaimosvjazi-s-ucheniem-o-chelovecheskoj-prirode-i-prizvanii-ee-k-obozheniyu/. – Дата доступа : 22.12.2020.
7. *Немезий, епископ Эмесский.* О природе человека / епископ Эмесы Немезий / пер. с греческого Ф. С. Владимирского. – М.: «Канон+», РООИ «Реабилитация», 2011. – 464 с.

УДК 882. 6. 09 (072. 3)

А. Я. Мантур (Мінск)

ГІСТАРЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ Ў ТЭМАХ І ВОБРАЗАХ

У паказе чалавечых перажыванняў, найтанчэйшых душэўных рухаў, барацьбы галоўнага героя з неспрыяльнымі абставінамі з драматургіяй наўрад ці могуць спаборнічаць іншыя жанры літаратуры і віды мастацтва.

На нашу думку, адметнасць беларускай драматургіі заключаецца ў паказе сапраўдных, набліжаных да чалавечага жыцця законаў яе існавання. Ля вытокаў п’есы стаяў чалавек: аўтар, драматург. Перастварэнне тэксту ў спектакль дасягаецца творчымі намаганнямі рэжысёра, акцёраў і іншых творцаў. Элементы тэатральнага дзеяння – дыялог, жэст, міміка, мізансцэна – імітуюць рэальнае жыццё чалавека.

Феномен драматургіі – стварэнне тэатральнай ілюзіі, падчас такой выразнай і пераканаўчай, што яна можа падацца больш рэальнай, чым само жыццё.

Стварэнне п’есы – гэта майстэрства, для авалодання якім патрэбны не толькі значны жыццёвы досвед, але і адчуванне сцэны, асаблівасцей тэатральнага дзеяння.

Драматургія як жанр літаратуры – самакаштоўная. Яна занадтая да паўнавартаснай эстэтычнай рэалізацыі ўжо на ўзроўні тэксту. Ідэальны працяг жыцця п’есы на сцэне, у яе тэатральнай версіі. Тэатр не толькі дапамагае ўдасканаленню драматургічнага твора, яго мастацкай рэалізацыі, але і выдатныя п’есы, прадуманы рэпертуар спрыяюць узвышэнню тэатра [1, с. 5].

Драматургія і тэатр, у сваю чаргу, узбагачаюць нацыю, дапаўняюць яе гістарычнае жыццё эстэтычна значнымі з’явамі, надаюць яму адухоўленасць і маральнасць. Вялікую ролю ў развіцці беларускай культуры адыгралі нацыянальны тэатр і драматургія.

Беларуская драматургія ў сваім развіцці прайшла шлях ад сінкрытычнага абраду да народнага і прафесійнага тэатра. У вуснай народнай творчасці багата абрадаў, якія ў старажытнасці мелі магічны змест: калядаванне, гуканне вясны, купальскія гульні і інш.

Калядныя гульні паступова ператварыліся з магічнага абраду ў тэатральнае дзеянне. Матыў паміранння і ажывання набываў хрысціянскую трактоўку (эпоха Сярэднявечча).

У эпоху Барока значнае пашырэнне поруч з батлейкай (лялечны тэатр) меў народны тэатр. Самадзейныя артысты па вялікіх святах у людных месцах

выконвалі спектаклі, у якіх услаўлялі Хрыста і выкрывалі ворагаў хрыціянскай веры. Драматургі імкнуліся да сур'ёзнасці і павучальнасці, пазбягалі фальклорных спрашчэнняў [1, с. 6].

У XVIII ст. драматургія набывала свецкі характар. З'явіліся прыдворныя тэатры, з якіх найбольш значным быў Нясвіжскі тэатр Радзівілаў, дзе акрамя замежных твораў ставіліся п'есы першай жанчыны-драматурга Францішкі Уршулі Радзівіл.

Камедыя, вадэвіль, фарс, якія раней успрымаліся як "лёгкія" жанры, могуць займаць у літаратуры цэнтральнае месца. Так адбылося ў XIX ст., калі першы прафесійны літаратар В. Дунін-Марцінкевіч стварыў фарс-вадэвіль "Пінская шляхта".

Новая беларуская літаратура пачалася з паэзіі і драматургіі. З'яўляюцца драматычныя творы Я. Купалы, Я. Коласа, А. Гаруна, М. Гарэцкага. Беларускія драматургі актыўна засвойвалі новыя формы вобразнасці, асабліва тыя, што нараджаліся пад уплывам сімвалізму (драматычныя паэмы Я. Купалы "Адвечная песня", "Сон на кургане", "Раскіданае гняздо", "Тутэйшыя", драматычная аповесць М. Гарэцкага "Антон" і інш.). Аўтары прытрымліваліся ў свай творчасці нацыянальнай традыцыі [2, с. 45–47].

Развіццё беларускай драматургіі мела трагічныя эпізоды ў 1930-гг., звязяныя з вынішчэннем творчай інтэлігенцыі.

Вядома, тэатр, драматургія не могуць замяніць у грамадстве функцыі сродкаў масавай інфармацыі. Іх функцыя – эстэтычная, стварэнне хараства. Але тэатральнае відовішча не існуе, як правіла, у адрыве ад гістарычнага, сацыяльнага асяроддзя, нават калі драматург свядома дэкларуе пазіцыю "чыстага хараства", мастацтва дзеля мастацтва, хаця б таму, што п'еса – твор для сцэны, для чытача і гледача.

Адным з першых беларускіх крытыкаў, які тэарэтычна абгрунтаваў прызначэнне драматургіі, быў М. Гарэцкі. У артыкуле "Наш тэатр" (1913) ён звязваў ролю тэатра ў нацыянальным жыцці з асаблівасцямі беларускага менталітэту.

Прызначэнне драматургіі – не толькі адгукацца на падзеі, але і аналізаваць іх у маштабным агульнакультурным, агульнагістарычным працэсах. З'явы, што назіраліся ў літаратурным, драматургічным, тэатральным жыцці ў 1980–1990 гг., яскрава сведчаць пра гэта. Мінулае набывае крытычнае пераасэнсаванне, вызваляецца з-пад завалаў адназначнага ўсхвалення, прыхарошвання. Напрыклад, драма "Радавыя" А. Дударава з'яўляецца новай спробай пераасэнсавання тэмы Вялікай Айчыннай вайны [3, с. 235].

Цікавасць да вечных маральных, духоўных каштоўнасцей (любоў да роднай зямлі, каханне, самахвярнасць, рыцарства) і імкненне да адлюстравання сапраўднага жыцця можна лічыць новымі тэндэнцыямі, якія будуць абумоўліваць далейшае развіццё беларускай драматургіі.

Драматчнымі жанрамі наша літаратура асабліва аператыўна, амаль з хуткасцю публіцыстыкі, рэагуе на самыя надзённыя праблемы сучаснасці. І таму з драматычнымі творамі часцей здараецца так, што адны быццам саступаюць у цень, другія з'яўляюцца і жывуць доўга. Самыя ж таленавітыя, напісаныя даўно, зноў вяртаюцца на сцэну і жывуць новым жыццём.

ЛІТАРАТУРА

1. *Васючэнка П. В.* Сучасная беларуская драматургія. / П. В. Васючэнка. – Мінск, 2020.
2. *Гніламёдаў У. В.* Гісторыя беларускай літаратуры: XX ст. / У. В. Гніламёдаў. – Мінск, 2000.
3. *Ляшук В. Я.* Вывучэнне аглядавых тэм па беларускай літаратуры. / В. Я. Ляшук. – Мінск, 2001.

УДК 82.09.091

И. И. Морозова (Минск)

ПРОБЛЕМА ПЕРЦЕПЦИИ ПОСТМОДЕРНИСТСКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

Постмодернизм на протяжении многих лет является предметом пристального научного изучения в различных аспектах. В работах известных исследователей отражается концептуальное осмысление литературной проблематики на формальном и содержательном уровнях теоретических аспектов поэтики постмодернизма. Можно с уверенностью утверждать о высокой степени изученности этого художественного явления, невзирая на неоднозначную трактовку эстетических принципов постмодернизма. Однако вызывает определенную озабоченность состояние современной литературной ситуации постмодернистской парадигмы, широко отражающей негативные доминанты художественного сознания: декларативную асоциальность, дискретность мышления, десакрализацию ценностей и норм (что, в свою очередь, актуализирует проблему восприятия литературы субъектом), необходимость корректировки этого восприятия для наиболее адекватного осмысления художественной реальности и формирования сознания реципиента.

В последнее время значительно актуализировался интерес современных исследователей к рассмотрению сущности постмодернизма и его влияния на духовную жизнь общества, поскольку многие представители этого направления по-прежнему транслируют в своих гипертекстах эстетические возможности, позволяющие читателю вести диалог со многими авторами одновременно, субъективно интерпретируя всех и все. Чтобы быть адекватными вызовам искусства постмодерна, необходимо вскрыть узловые точки его смысловых аберраций, способных отразиться в массовом сознании, когда посаженные в головах интеллигенции зерна нового мышления прорастают и в упрощенном, выхолощенном, а иногда и умело преобразованном виде доходят до масс [8, с. 100].

Нет необходимости напоминать о важности художественного наследия для формирования ценностной системы человека. Тем не менее, существуют социокультурные проблемы, которые затрудняют или вовсе не позволяют ввести произведения мировой культуры в ценностный мир современного человека. Постмодернизм, как известно, характеризуется эстетической апелляцией к цитатам, аллюзиям, кодированию, и все это приводит к тому, что любое произведение превращается в «поппури» из предшествующих текстов мировой культуры. «Полуфабрикатность» постмодернистского произведения является также следствием попыток постмодернизма стереть грань между искусством и действительностью» [10, с. 101–102].

Восприятие такого текста требует определенных интеллектуальных и эмоциональных усилий. Исследователи полагают, что первоначальным компонентом восприятия искусства постмодерна должна быть продиктованная интенциональностью субъекта эмпатическая настройка на восприятие, которую можно охарактеризовать как желание сосредоточиться на художественном объекте. Особенностью данной деятельности является определенный настрой реципиента на декодирование художественного текста, на постижение его сущности. Это требует от реципиента желания отыскать скрытый смысл и значение символов, сопоставить с другой реальностью (жизненной, художественной, виртуальной). Воспринимающий, осознающий собственные мнения и предрассудки, способен

к конструированию смыслов относительно инаковости автора. Отличительной чертой данной способности является многовариантность толкования художественного текста, так как современный художественный текст характеризуется незавершенностью и открытостью [1].

Как ни странно, но ряд исследователей усматривает именно позитивное зерно в подобного рода постмодернистских опытах, анализируя неоднозначное творчество российских авторов, утверждая, что оно как раз и направлено на изменение профетического отношения к писателю, на отказ от слияния жизненной практики с придуманной реальностью. Языковая деконструкция в постмодернистских текстах нацелена на разрушение классических канонов, ограничивающих свободу творческого самовыражения, на обнаружение зон, «свободных от тотальной трансляции абсолюта» [2, с. 293]. По мнению Г. Литвинцевой, В. Пелевин в романе «Омон Ра» осуществляет деконструкцию мнимых, иллюзорных идеалов советской действительности. В произведениях В. Пелевина, В. Сорокина, В. Ерофеева, Л. Петрушевской представлен в «анекдотической, маргинальной форме русский утопизм, вера в кумиров, показана та гниль (в прямом смысле этого слова), которая кроется за высокими словами, раскрываются наши традиционные “вечные” вопросы нетрадиционными средствами, путем использования ненормативной лексики, шокирующих натуралистических и физиологических описаний. В “Голубом сале” писатель деконструирует темы, героев, стили, язык великих авторов в творениях их клонов, с целью освободить язык от “великих нарративов”» [6].

Такое эстетическое оправдание деструктивной линии в художественных текстах вызывает недоумение, принимая во внимание способность литературы воздействовать на самосознание человека. Наиболее полно и разнообразно деструктивные тенденции индивидуального сознания и поведения представлены именно в творчестве В. Сорокина. Воодушевленный эстетикой безобразного в творчестве Маркиза де Сада, В. Сорокин представил на суд читателя поток безнравственной словесной грязи, некрофильства, порнографии, каннибализма, садомазохизма, в буквальном смысле фекализма, что, в свою очередь, заставляет исследователей-литературоведов определить такое творчество «канализационной» литературой и дегенеративным искусством, свидетельствующим только о том, что «грубая чувственность восполняет вакуум эмоциональности, характерной для выхолощенной шизоидной позиции». Эстетизация натурализма и эпатажность проявлена и в рассказе белорусского автора С. Календы «Ваніты», текст которого изобилует достаточно подробными описаниями ощущений приступов тошноты и ее физиологическими признаками и последствиями. Навязчивое повествование о подобных рефлексах свидетельствует о психологическом деструктивном сдвиге.

Лексика героев В. Сорокина перенасыщена сексуальными инвективами, нецензурщиной, грубоватым сленгом, свидетельствующими о деградирующем состоянии молодого поколения, художественно воплощенном в «генитальной» литературе. Как считает известный специалист в области изучения психофизиологических аспектов функционирования ненормативной лексики Л. А. Китаев-Смык, «в исторические, переходные периоды у части общества возникает массовая дебилизация. При этом наименее защищенные социальные слои (молодежь и люди с недостаточным образованием) вынуждены использовать эротизацию своей вербальной активности как культурную (антикультурную) защиту. Их речь изобилует словесными протезами – сексуально-скабрезными

выражениями (как неосознанный протест против социального давления). И, наверняка, не случайно сексуальные образы, посылы, считавшиеся еще недавно непристойными (нецензурными) сейчас проникают на экраны телевизоров, на сцены театров, на страницы книг и газет одновременно с нарастающей модой на авангардистское искусство» [5, с. 126]. Безусловно, в реализации эпатажного поведения, деструктивной сексуальности, гипертрофированной ненормативности лексикона выражается своеобразный экзистенциальный, социальный и нравственный протест против существующей несправедливости окружающей действительности. Но этот протест носит разрушительный характер в первую очередь для самого носителя протестных интенций, зачастую превращая его в заложника и раба одновременно собственных деструктивных поведенческих моделей, нарушая целостность человеческого бытия.

В исследовательской практике неоднократно отмечается, что процесс художественной перцепции предполагает сотворчество адресата с художником, активизацию жизненного опыта воспринимающего. Восприятие текста требует от реципиента активной творческой позиции, способности к интерпретации, художественному диалогу. Возникает нелепая, комическая ситуация при восприятии подобного рода текстов, какой художественный диалог здесь может возникнуть? Необходимо понимать, что реципиенты с неустойчивой психикой, чрезмерной импульсивностью и склонностью к аффектации могут попасть в информационную (текстологическую) ловушку, что приведет к смещению в их индивидуальном сознании истинных акцентов и социально-нравственных установок, мировоззренческому сдвигу, поскольку художественные тексты в большинстве случаев обладают многосмысловыми уровнями (скрытыми или явными).

Смена социокультурных парадигм, стремительно ворвавшаяся во все сферы жизни, обнажила самую табуированную, предоставив на всеобщее усмотрение сексуальную свободу и разболтанность человека, стремление выйти за пределы нравственности, морали. Сексуальная раскрепощенность, парадоксальным образом, воспринимается (а то и навязывается) как признак истинной внутренней свободы человека, постулируется принцип сексуальной вседозволенности и приемлемости различных сексуальных извращений. В индивидуальном и обыденном сознаниях прочно укореняется мысль о том, что быть сексуально свободным, лояльным, сексуально озабоченным – это модно, современно, стильно. Наблюдается гипертрофированный интерес к телесности, человеческому телу, наготе, плоть доминирует над душой, о которой мало кто заботится из тех, кто сексуально одержим. В творчестве А. Глобуса широко представлен комплекс указанных тенденций, сыгравшем, по мнению некоторых критиков, революционную роль в развитии белорусского искусства, если иметь ввиду отражение в его текстах («Дамавікамерон», «Літары», «POST SCRIPTUM» и др.) неприкрытой аморальности и непристойности, явной порнографической направленности, что вызывает у исследователей справедливое и вполне объяснимое чувство брезгливости и морального осуждения.

В современных текстах отражено поколение однонаправленных индивидов, определяемых современными психологами как генитальный тип, представлены ситуации, отражающие плоский гедонизм, при котором отношения лишены психологической усложненности и каузальности, нет динамики чувств, есть некая констатация упрощенного взаимодействия сугубо на физиологическом уровне, изрядно сдобренного сексуальными инвективами: «… сексуалізацыя

мысленне – адна з прыкметаў постмадэрнай эпохі … У прыпавесці Ф. Сіўко “Дзень бубна” секс становіцца метафарай унутранай свабоды… Сапраўды, людзі ў прыпавесці выглядаюць носьбітамі нейкай адной функцыі. Нават гратэскна намаляванае грамадска-палітычнае жыццё іх Цюханіі не выклікае ў яе насельнікаў ніякіх эмоцый» [3, с. 116–117]. В подобных художественных текстах моделируется тип усредненного человека, нивелированного и интегрированного в общество с царящей атмосферой потребительства в самом широком смысле слова. За кажущейся эпатажностью, непохожестью, нестандартностью сексуального поведения скрывается тип обычного среднего человека с декларацией узкого принципа «быть как все», с поверхностным отношением к окружающему миру, с однообразием жизненных установок, поступков, лексики и стиля, усиливая ощущения отчужденности и «потерянности».

Вполне закономерно, что в последнее время на смену постмодернизму приходит художественное направление – «новый реализм» (в русской литературе, в белорусской идут активные поиски нового героя), сторонники которого активно противопоставляют искусство драматического оптимизма цинизму и мировоззренческому пессимизму постмодернистского метода. «Аднак паступова сацыяльная стабілізацыя – няхай і адносная – стабілізавала і дітаратуру. Ужо ў першае дзесяцігоддзе XXI стагоддзя можна заўважыць, як у нацыяльнай літаратуры паступова “ўраўнаважваюцца” трагізм і аптымізм, завяршаецца жанравая дыфузія, а замест постмадэрновага героя з’яўляецца новы герой» [4, с. 222–223]. То есть проявлена тенденция в художественном сознании, связанная с постулированием идеи доминирования чувственно-эмоциональной сферы в стремлении противостоять тотальной дегуманизации окружающей действительности. Актуализируется морально-нравственная составляющая индивидуального и общественного сознаний, мировоззренческих установок человека, его поведенческих моделей, причинно-следственных связей, гармонизация эмоциональной сферы как основы личной самодостаточности в борьбе с бездуховностью и бескультурностью, Л. Синькова очень точно отметила стремление думающего человека к ценностно значимым произведениям, «што замацаваны грамадствам у высокім аксіялагічным рэгістры. Інстыктыўна кожны адчувае: кругагляд сучаснага чалавека не павінен быць абмежаваны толькі нейкім культурным фаст-фудам … Літаратура для мас ніколі не пераможа класіку, не зможа заняць яе месца найперш таму, што кожнаму чалавеку наканавана расці і сталець» [9, с. 8–9]. Ярким подтверждением этих констатаций является, как это ни парадоксально, фигура А. Глобуса, который в более зрелом возрасте создает роман «Семья», отражающий цикл миниатюр отрефлексированных раздумий автора о самых дорогих и близких для него людях, которых объединяет такое важное и значимое для всех слово «семья», об ушедших родителях, осознание признания правоты которых приходит гораздо позднее: «…в шестьдесят лет человек гораздо выше ценит многие взгляды своего отца, чем в восемнадцать. А. Мичерлих удачно назвал это “поздним послушанием” … это выполняет функцию сохранения культуры в целом» [7, с. 428]. Автор, выступающий одновременно в качестве и субъекта, и объекта повествования, актуализирует важный вопрос о значимости межпоколенного взаимодействия и ценности внутрисемейной сплоченности, напрочь отказавшись от прошлых причудливых постмодернистских метаморфоз и нигилистического скепсиса.

Общеизвестно, что постмодернизм предстает и как маргинальное течение, и как элитарное. Представители постмодернизма – это, как правило, высокоинтеллектуальные люди, образованные, наделенные аналитическим мышлением,

художественной интуицией и эстетической проницательностью. Только подготовленная аудитория, знающая язык постмодернизма, способна понять смысл деконструкции и пародии на классические тексты, оценить постмодернистскую игру и иронию. Поэтому исследователи неоднократно отмечали, что диалогические отношения между массовым зрителем и современным искусством отличаются неоднозначностью, часто непониманием, а порой и полным отрицанием. Реципиенту порой трудно проявить сопереживание, получить эстетическое удовольствие, а такое высшее проявление переживания, как катарсис, уходит в прошлое, и неклассическая эстетика отмечает это [1].

Это достаточно сложная проблема, ведь текст рассматривается как встреча двух сознаний (автора и воспринимающего), детерминированных предрассудками, то есть заранее сложившимися мнениями. Автор и воспринимающий обращаются друг к другу с целью взаимного понимания, они сопричастны общей теме, проблеме, но эта сопричастность находится на разных уровнях их интеллектуального и культурного развития. Зачастую именно классическая литература является более восприимчивой для реципиента, поскольку не перегружена смысловыми планами и пустой игривостью симулякрами. Нужно исходить из того, что художественное произведение является способом трансляции смыслов, а художественная коммуникация – средством обращения реципиента к миру автора и его героев, понимания культурного контекста художественного произведения, культурных доминант эпохи, своеобразия личности художника, его миропонимания, мироощущения, его индивидуальности. Поэтому необходимо уходить от примитивной и узкой интерпретации текстов, используя синтезированный подход в глубоком осмыслении художественной литературы, совершенствуя познавательные способности реципиента и его индивидуальное сознание, принимая во внимание аксиологическую, суггестивно-катарсическую, воспитательную функции литературы, ее способность воздействовать на самосознание человека. Здесь на передовой должна быть именно интеллигенция, ибо «калі ж чытач хоча ўсё жыццё заставацца інфантылам, выключна звяном у харчовым ланцузку, то гэта яго асабістая праблема. Класічная літаратура тут ні пры чым. А вось інтэлігенцыя – “пры чым”: свяржаць сапраўды вартае належыць у першаю чаргу ёй» [9, с. 9].

ЛИТЕРАТУРА

1. *Беляева, Л. А.* Вызовы искусства постмодерна и современные практики художественного образования / Л. А. Беляева, И. Г. Чугаева // Педагогическое образование в России. – 2016. – № 6 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/vyzovy-iskusstva-postmoderna-i-sovremennye-praktiki-hudozhestvennogo-obrazovaniya/viewer. – Дата доступа: 12.07.2020.

2. *Берг, М.* Литературократия. Проблема присвоения и переосмысления власти в литературе / М. Берг. – М. : Новое литературное обозрение, 2000. – 352 с.

3. *Кісліцына, Г. М.* Blonde attack / Г. М. Кісліцына. – Мінск : Логвінаў, 2003. – 144 с.

4. *Кісліцына, Г. М.* Культурны градыент : ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў / Г. М. Кісліцына; [навуковы рэдактар І.В. Саверчанка]. – Мінск : Права і эканоміка, 2015. – 343 с.

5. *Китаев-Смык, Л. А.* Социально-психологические аспекты материнской речи / Л. А. Китаев-Смык // Вопросы психологии. – 2007. – № 6. – С. 120–128.

6. *Литвинцева, Г. Ю.* Российские «национальные метанарративы» в эпоху постмодерна / Г. Ю. Литвинцева // Universum: общественные науки. – 2017. – № 2 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/rossiyskie-natsionalnye-metanarrativy-v-epohu-postmoderna/viewer. – Дата доступа: 11.09.2020.

7. *Лоренц, К.* Оборотная сторона зеркала. Восемь смертных грехов цивилизационного человечества / К. Лоренц; [пер. с нем. А. И. Федорова]. – М. : АСТ, 2019. – 480 с.

8. *Лукин, А. Н.* Постмодерн: раскрепощение личности и (или) деградация культуры? / А. Н. Лукин // Социум и власть. – 2014. – № 1 (45). – С. 100–105.

9. *Сінькова, Л.* Беларуская “звышлітаратура”: літаратуразнаўчыя і літаратурна-крытычныя артыкулы / Л. Сінькова. – Мінск : Кнігазбор, 2019. – 222 с.

10. *Усовская, Э. А.* Парадигма постмодернизма в культуре XX века / Э. А. Усовская. – Минск : БГУ. – 2006. – 126 с.

УДК 821.161.3-92`06 «Аблава»

Г. Ю. Новік (Мінск)

АЎТАРСКІЯ СТРАТЭГІІ ЯК АСНОВА ТЫПАЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫКІ XXI ст.

Пачынаючы з сярэдзіны 2000-х гг., з'явілася вялікая колькасць тэкстаў (напрыклад, артыкулы і кнігі І. Шаўляковай, Г. Кісліцынай, А. Бязлепкінай, М. Аляшкевіч, І. Запрудскага, В. Губскай, А. Трафімчыка і іншых аўтараў), прысвечаных пераасэнсаванню функцый крытыкі, аналізу яе стану на сучасным этапе, вызначэнню месца ва ўмовах трансдысцыплінарнасці, высвятленню новых тэндэнцый, а таксама жанраў, найбольш распаўсюджаных напрыканцы XX – на пачатку XXI стагоддзяў. Да апошніх нярэдка адносяць крытычную эсэістыку, разнастайныя мадыфікацыі праблемнага артыкула, літаратурныя партрэты і рэцэнзіі. Мы прапануем разглядаць сучасную крытыку не праз жанравую прызму, а з улікам спецыфікі рэалізаваных у ёй аўтарскіх стратэгій. Нягледзячы на тое, што кожны з такіх тэкстаў напісаны з выкарыстаннем метадаў, агульных для любога роду пазнаваўчай дзейнасці, а таксама метадаў літаратуразнаўства і журналістыкі, аўтарскія інтэнцыі ў іх істотна адрозніваюцца.

Напрыклад, творы «Рэстаўрацыя шчырасці» (2005 г.) і «Сапраўдныя хронікі Поўні» (2011 г.) І. Шаўляковай з'яўляюцца ўзорам **крытыцы, набліжанай да літаратуразнаўчых даследаванняў**. Разгляд асобных тэкстаў (такіх як «Зацемкі» Л. Галубовіча, «Нічые» А. Федарэнкі, «Любіць ноч – права пацукоў» Ю. Станкевіча і інш.), вызначэнне актуальных тэндэнцый у сучасным мастацтве слова, а таксама метакрытычныя развагі ў гэтых кнігах выкананы ў акадэмічным стылі. Выразная публіцыстычнасць тут супрысутнічае з глыбінёй апісанняў, ужыты характэрныя тэрміны і канструкцыі. Шырока прадстаўлены цытатны кампанент, які не толькі ілюструе пункт гледжання аўтара, але і з'яўляецца штуршком да далейшых разваг: «"Дабраслаўлёная прырода, што выдумляе, робіць і патэнтуе аўтараў. А пасля лепіць з рэштак крытыкаў," – замілаваны англійскі пісьменнік А. Холмз» [4, с. 4]. Асэнсаванне літаратуры праз прызму антрапалогіі, культуразнаўства і іншых гуманітарных дысцыплін гэтаксама ўзмацніла сувязь гэтых крытычных тэкстаў з навуковым дыскурсам.

Артыкулы І. Шаўляковай адметныя выразна акрэсленай прысутнасцю аўтара, якая, аднак, рэгламентавана навуковым стылем пісьма. Гэтая катэгорыя выражана праз пазнакі сумневу («*верагодна*», «*можна меркаваць*», «*напэўна*» і інш.), упэўненасці («*несумненна*», «*відавочна*» і інш.), каментар уласнага тэксту («*інакш кажучы*», «*г.зн.*» і інш.). У некаторых выпадках суб'ектыўнасць была ўзмоцнена да непрыхаваных дэкларацый («*я, напрыклад*», «*па маіх назіраннях*», «*мне здаецца*» і інш.), што падкрэсліла верагоднасць канвергенцыі пунктаў гледжання крытыка і рэцыпіента мастацкіх твораў. Аднак крытыка І. Шаўляковай, як і большасць навуковых тэкстаў, мае за мэту не столькі камунікацыю, колькі вытлумачэнне і ўпарадкаванне пэўных з'яваў мастацкай рэчаіснасці. Яна скіраваная да супольнасці, дасведчанай у тонкасцях сучаснага літаратурнага працэсу. Таму, нягледзячы на вялікую колькасць сродкаў актуалізацыі чытацкай увагі, верагоднасць дыскусійнага супрацьстаяння паміж удзельнікамі нарацыі таксама зведзена да мінімуму.

У параўнанні з набліжанай да акадэмічнага пісьма крытыкай І. Шаўляковай, у **эсэістычнай крытыцы** акцэнт робіцца на ўзаемадзеянні з рэцыпіентам. Калі ў першым выпадку аўтары звярнуліся галоўным чынам да сістэматызацыі

і данясення інфармацыі, то тут немалаважнае значэнне нададзенае працэсу самога распавядання, а таксама камунікацыі з чытачом. Так, у кнізе «Сыс і кулуары» (2010 г.) Л. Галубовіча камунікатыўнасць падкрэслена за кошт супадзення пунктаў гледжання апавядальніка і рэцыпіента: «*Чытаючы гэтую кніжку, мы <…> знаходзім самотна-шчымлівае паразуменне з яе паэтычным светам*» [2, с. 136] – ці прамых зваротаў да меркаванай аўдыторыі: «*І ўсё ж, шаноўнае спадарства, высновы мае ад прачытання кніжкі, як ні дзіўна, будуць парадаксальныя*» [2, с. 174]. Адвольна мяняючы пункты гледжання, аўтар то робіць высновы, якія могуць узнікнуць у любога сярэднестатыстычнага чытача, то акцэнтуе ўвагу на тым, што меркаванне мае суб'ектыўны характар і можа быць аспрэчана дасведчаным рэцыпіентам. Заклік да палемікі выражаны пазнакамі тыпу «*я ж пагаджуся з усімі разам*» [2, с. 34], «*шчыра скажу*» [2, с. 14], «*мне думаецца*» [2, с. 106], «*цяпер я разумею*» [2, с. 100], а таксама ўспамінамі крытыка.

Камунікатыўнасць крытычных эсэ ўзмоцнена і за кошт уліку аўтарам гіпатэтычнай рэакцыі чытачоў на пэўныя яго думкі: «*Залішне высакапарна? Мабыць, так. А зрэшты, каб было іначай, то навошта б нам, нераўнуючы як Сізіфу, каціць свае словы да Слова*» [2, с. 61]. Разам з тым, аргументаваўшы сваё меркаванне, крытык не пакінуў гіпатэтычным суразмоўцаў магчымасці яго аспрэчыць, што абумовіла скарачэнне дыстанцыі з рэцыпіентам.

Іншым чынам рэалізаваны камунікатыўны аспект у кнізе «Blonde attack» (2003 г.) Г. Кісліцынай. Крытык надала вялікае значэнне публіцыстычным сродкам прыцягвання ўвагі. У тэксце шырока прадстаўлены прыём абстрагавання: напрыклад, эсэ, прысвечанае Л. Дранько-Майсюку, пачынаецца з разваг пра эканомію як першапачатковую сутнасць быцця, а фрагмент пра літаратурна-філасофскі сшытак ЗНО – са згадак найбольш распаўсюджаных тэндэнцый сучаснага кінематографа. Зыход ад аналізу твораў да актуальнага затэксту прызначаны для актуалізацыі абстрактнага мыслення чытачоў і прыцягвання ўвагі тых, хто не зацікаўлены мастацкай творчасцю. Таму ў ролі затэксту выступілі ментальныя змены, якія адбыліся ў 1990–2000-х гг., побытавыя аспекты, рэаліі сучаснага жыцця і інш. Гэта было дапоўнена трапнымі асацыяцыямі, якія дазволілі правесці паралелі між беларускай і сусветнай культурнымі прасторамі: «Гэты сон, які насамрэч сніўся Дж. Б. Прыстлі («Дождж над Годсхілам»), павінен быў бачыць Янка Сіпакоў» [3, с. 49] – а таксама правакатыўнымі тэзісамі тыпу «*Сёння Дудараў як ніколі слабы*» [3, с. 83], «*Нічым мы не лепшыя за першабытных людажэраў*» [166, с. 70].

Дзякуючы эксперыментам з формай, многія з сабраных пад адной вокладкай эсэ рэкламуюць творы беларускіх пісьменнікаў перад шырокай аўдыторыяй. Напрыклад, інфармацыя пра С. Адамовіча пададзена ў выглядзе анкеты, ключавымі пытаннямі ў якой з'яўляюцца медыцынскія паказанні, маральныя перакананні і жыццёвыя прынцыпы. Многія з тэкстаў, рэалізуючы журналісцкія стратэгіі, маюць інтрыгуючыя назвы. У выніку Л. Дранько-Майсюк павінен запомніцца рэцыпіенту як «*Арфей на струнах ліры*», С. Адамовіч – «*Цяжарны супермэн*», творчасць Глобуса набудзе асацыяцыі з «*Ловамі ветру*».

Адметна, што ў эсэістычнай крытыцы нярэдка прысутнічаюць метакрытычныя развагі. Яны закранаюць творчы метад самога аўтара другаснай рэцэпцыі, тлумачаць тыя ці іншыя яго думкі і суджэнні наконт твора. Да прыкладу, у Л. Галубовіча: «*Спадарства, гэта найперш канструктыўная і, можна ска-*

заць, нават дабрадзейна-таварысцкая крытыка» [2, с. 71]. У Г. Кісліцынай прэваліруюць роздумы наконт непасрэдна самой крытыцы, яе сутнасці, ролі і прызначэння, якія аформлены ў выглядзе сентэнцый («Крытык – той, хто любіць літаратуру, а не літаратараў» [3, с. 6]) і падсумаванняў («*Менавіта ў заземленасці маларухомых і не багатых на колеры хтанізмаў <…> крытык знаходзіць абяцанне шпаркага росту <…> Так вяртаюцца ў новую літаратуру старыя вобразы нацыянальнай літаратуры*» [3, с. 19]). Абодва тыпы рэфлексіі скіраваны на крэатыўнага чытача, здатнага ўдзельнічаць у перастварэнні сэнсаў, і таму спалучаюць у сабе рэферэнтны і камунікатыўны аспекты.

Як заўважна, эсэістычная крытыка з'яўляецца носьбітам наратыўнасці, якая спрыяе выразнай рэалізацыі яе асноўных функцый. Аднак некаторыя творы могуць змяшчаць у сабе і пазнакі пераадольвання тэндэнцыі да ўтварэння тэксту як неперарванага ланцужка падзей. Напрыклад, кніга «Адлюстраванні Першатвора» (2004 г.) П. Васючэнкі, складзеная з т. зв. філалагемаў і пятрогліфаў, з'яўляецца ўзорам **фрагментарнай крытыцы**. Фрагменты тут пазбаўлены прычынна-тэмпаральнай сувязі, аднак аб'яднаны пад адной вокладкай на падставе тэматычнай еднасці (кожны з іх так ці інакш звязаны з мастацтвам слова) і наяўнасці агульнага суб'ектнага кампанента.

Як і ў эсэістычнай крытыцы, у фрагментах П. Васючэнкі вобраз галоўнага героя дэтэрмінаваны яскрава выражаным суб'ектывізмам. У якасці пратаганіста, поруч з экзістэнцыяй і літаратурай як складнікамі «*спрадвечнага і адзінага Першатвора*» [1, с. 2], тут выступіла асоба самога аўтара, чыя прысутнасць пазначана ў многіх з фрагментаў. Дзякуючы гэтаму камунікатыўнасць паслаблена, але не знівелявана цалкам. Пацверджаннем могуць служыць апеляцыі да крытычных здольнасцей меркаванай аўдыторыі. Нягледзячы на тое, што ў большасці выпадкаў аўтар займае аўтарытэтную пазіцыю, атаясамліваючы ўласны пункт гледжання з меркаваннем рэцыпіентаў («*Мы памералі глыбіню здрады, пабачылі сваё адлюстраванне на паверхні ледзянога возера. Цяпер сумняваемся, ці было ледзяное возера*» [1, с. 66]), часам ягонае падкрэсліванне суб'ектыўнасці і аповед ад першай асобы дазваляюць рэцыпіентам уступаць у гіпатэтычную дыскусію. Гэтая ж роля адведзена пабуджальным канструкцыям («*Згадайце, з якой бессаромнасцю разглядаюць нас дзеці*» [1, с. 72]) і разнастайным пытальным сказам, прызначаным для актуалізацыі чытацкіх разваг («*А якія ў здрадніка вочы*?» [1, с. 53]).

Некаторыя з фрагментаў змяшчаюць відавочную апеляцыю да агульнавядомых ведаў: «*Грэцкая трагедыя, як вядома, пайшла ад "казлінае песні"*» [1, с. 60]. Іншыя разлічаны на чытача, дасведчанага ў беларускім і сусветным літаратурным працэсе. Гэта сведчыць пра арыентаванасць «Адлюстраванняў Першатвора» на рэцэпцыю ў форме двайнога прачытання, больш уласцівую постмадэрнісцкім тэкстам.

Аўтар неаднойчы звярнуўся да прыёму абстрагавання. Літаратурныя творы ў фрагментах не атрымалі падрабязнага аналізу, але паслужылі імпульсам, сродкам аргументацыі, прыкладам пры раскрыцці больш аб'ёмных тэм – такіх, як культуралагічныя містыфікацыі, рэфлексіі пра асобныя роды, жанры, каноны літаратуры, метакрытычныя развагі. У выніку творчасць асобных пісьменнікаў была зведзена да лаканічных канцэптаў: «*Вертыкаль Міцкевіча – замкі, вежы, неба Айчызны-Літвы. Гарызанталь Коласа – зямля, хата*» [1, с. 86] – ці атрымала пераасэнсаванне, утварыўшы паралелі з творчасцю класікаў сусветнага

мастацтва слова: «*Ян Баршчэўскі – беларускі Уэлс. Ён прадбачыў пальтэргайст, віртуальныя падарожжы ў духу Кастанэды і кланаванне дыназаўраў у стылі «Парка юрскага перыяду», калі распавядаў пра цмока, што вывеўся з яйка, знесенага чорным пеўнем*» [1, с. 80]. Аднак П. Васючэнка, дзякуючы звароту не столькі да фармальнага, колькі да культурна-гістарычнага і тыпалагічнага метадаў, акрэсліў месца творчасці многіх выбітных асоб у кантэксце сусветнага культурнага жыцця.

Такім чынам, пры напісанні крытычных твораў сучасныя аўтары прытрымліваюцца стратэгій, характэрных для навуковага, публіцыстычнага і мастацкага дыскурсаў. Першая дэтэрмінуе стварэнне артыкулаў, якія па форме і метадах нагадваюць літаратуразнаўчыя, у якасці рэферэнтнага складніка маюць мастацкі тэкст і пазбаўлены наратыўнасці (напрыклад, «Сапраўдныя хронікі Поўні» І. Шаўляковай). Другая стратэгія прадугледжвае выкарыстанне журналісцкіх прыёмаў для прыцягвання чытацкай увагі і ўздзеяння на аўдыторыю. За кошт гэтага творы, якія часцей за ўсё з'яўляюцца эсэ, рэалізуюць узмоцненую інтэнцыю на камунікацыю, а ў якасці рэферэнта вызначаюць не толькі асобныя тэксты, але і літаратурны, і агульнакультурны працэс («Сыс і кулуары» Л. Галубовіча, «Blonde attack» Г. Кісліцынай). Трэцяя стратэгія прадугледжвае часткавае знівеляванне наратыўнасці і актуалізацыю постмадэрнісцкага «двайнога прачытання». Рэферэнтны складнік створанай такім чынам фрагментарнай прозы ўключае ў сябе вобраз аўтара, а таксама культурную сітуацыю («Адлюстраванні Першатвора» П. Васючэнкі).

ЛІТАРАТУРА

1. *Васючэнка, П. В.* Адлюстраванні першатвора: літаратура ў філалагемах і пятрогліфах / П. В. Васючэнка. – Мінск : Логвінаў, 2004. – 142 с.
2. *Галубовіч, Л.* Сыс і кулуары : літ.-крыт. эсэ / Л. Галубовіч. – Мінск : Літ. і Мастацтва, 2010. – 173 с.
3. *Кісліцына, Г. М.* Blonde attack : эсэ, арт., літ. партр., рэц., інтэрв'ю / Г. М. Кісліцына. – Мінск : Логвінаў, 2003. – 143 с.
4. *Шаўлякова-Барзенка, І. Л.* Сапраўдныя хронікі Поўні : арт. і рэц. / І. Л. Шаўлякова. – Мінск : Літ. і Мастацтва, 2011. – 181 с.

УДК 821.161.3.09

Л. В. Первушина (Минск)

РЕПРЕЗЕНТАЦИЯ ИСТОРИЧЕСКИХ СОБЫТИЙ В ТВОРЧЕСТВЕ В. СЕДУРЫ

Творчеству Владимира Седуры (1910–1995) – американско-белорусского ученого и писателя (который также публиковался под псевдонимом Владимир Глыбинный) присущ *историзм* – «художественное освоение конкретно-исторического содержания определенной эпохи, а также ее неповторимого облика и колорита» [2, с. 232]. Историзм предполагает актуализацию значимости элементов времени, пространства, а также тщательный анализ определенных исторических периодов времени, отраженных в литературном произведении. Особую важность в тексте приобретают географические места, локальные культуры, в которых раскрывается своеобразие определенной исторической эпохи, а социально-культурные феномены определяются общим ходом исторического развития. Раскрывая «динамику человеческого бытия, изменения и развития общества» [4, с. 298], историзм указывает на особое значение причинно-следственных связей, роль исторических факторов и исторических условий, которые определяют ход событий. Он представляет собой научную тенденцию, которая рассматривает историческое развитие как основной аспект человеческого

существования, а также является формой, «обеспечивающей *со-бытие* людей во времени и пространстве, как социальной связи между поколениями и как схемы взаимодействия между различными социальными системами» [4, с. 301].

Художественное мышление В. Седуры находит свое специфическое проявление в исторической прозе, в которой реконструируются национальные традиции и особенности национального восприятия мира. Постижение истории Беларуси осмысливается через воссоздание прошлого, которое становится опытом исследования жизни в литературной форме, и проникновение в тончайшие движения души создаваемого национального характера. Репрезентация исторических событий в литературном произведении данного автора происходит благодаря обращению к историческому проблемно-тематическому комплексу, а также к художественному исследованию особых, ключевых моментов в литературной и социально-культурной жизни Беларуси. Созданные в США произведения В. Седуры возрождают мысли о далеком прошлом, об узлах противоречия, о событиях, произошедших в историко-культурном социуме Беларуси, а также о быте, привычках, традициях и обычаях определенных слоев населения, так как «жизнь вдали от родины – это бесконечный парадокс: глядя вперед всегда оглядываешься назад» [9, с. 3]. По идейно-тематическому наполнению и авторской художественной концепции рассказы В. Седуры тесно связаны с исторической памятью белорусского народа, со стремлением осмыслить важнейшие вопросы наследия прошлого, созвучные духу современности. Произведения писателя способствуют пониманию исторических уроков, определению преемственности традиций. Они позволяют объективно оценить значение действительных событий и литературной истории.

Историко-художественный метод является основой творческой работы В. Седуры. Данный метод предполагает реконструкцию отдаленного прошлого «путем творческого переосмысления первичного исторического материала (документы, мемуары, фольклорные тексты), а главным художественным принципом становится историзм, понимаемый как наличие определенного общественного развития» [6, с. 33]. Писатель обращается к темам, нацеленным в прошлое, которые отдалены по времени от XX века. Критериями же истинности реконструкции прошлого служат «такие качества, как адекватное изображение исторических событий, а также точность в описаниях быта, пространства и времени» [1, с. 10–12]. Историческая проза В. Седуры представляет собой осмысление и воссоздание определенных событий прошлого в ярких художественных образах особыми литературными средствами. Неотъемлемой частью исторического повествования является реконструкция реальных событий, имевших место в истории, их художественная обработка, переосмысление и добавление вымысла (домысла).

В рассказах В. Седуры «*Полоцкое чудо*» («*Полацкае дзіва*») и «*Рассвет над Лахвою*» («*Сьвітанак над Лахваю*») очевидно яркое проявление историзма. Эти произведения являются частью художественного наследия, созданного писателем, не по своей воле оказавшегося вдали от родины. В повествованиях запечатлены факты истории и представлены увлекательные, информативные рассказы о Ф. Скорине и Н. Гусовском. С одной стороны, в данных рассказах автор стремится к точности, достоверности, объективности изображения действительности, детальному описанию жизни, обычаев и поведения людей, принадлежащих к разным сословиям и социальным классам. С другой – в них присутствуют синтез реального и вымышленного, сочетание исторических

событий, жизненных фактов, документов и полет авторской фантазии. Оба рассказа отличаются глубиной мысли, воспроизведением и реконструкцией важных событий прошлого белорусской истории.

В рассказе «*Полоцкое чудо*» В. Седуро создает повествование, в котором исторический компонент определяется социально-культурной и аксиологической значимостью действительного жизненного материала, взятого в историческом прошлом и положенного в основу сюжета. Писатель обратился к историческому событию, имевшему место в Полоцке в 1486 г. (рождение ребенка в Полоцке, которому суждено стать великим Франциском Скориной – первопечатником, учителем и просветителем), интерпретируя его и выявляя его значимость для развития человечества.

Повествование включает ряд исторических фактов и компонентов, среди которых, прежде всего, присутствует четкое указание на многочисленные исторические, культурологические и ономастические реалии. Разнообразие географических мест, на которые делаются ссылки, выявляет особенности социально-культурной жизни того времени. Определяются существовавшие торговые связи Полоцка с разными регионами Беларуси, четко картируются маршруты и дороги, по которым передвигались многочисленные торговые обозы. Бойкая торговля шла в Полоцке, куда привозились, распродавались и обменивались товары из Смоленска, Витебска, из купеческих поместьев, расположенных на берегах Западной Двины. Из кратких, но емких эпизодов восстанавливается жизнь города, упоминаются меры, принимаемые городскими властями для организации порядка в нем, описывается расположение конкретных улиц – улиц Великого посада, Немецкой, Пробойной, Великой, Витебской, а также Невельского тракта и Торговой площади [7, с. 37].

Большое значение имеет описание величественного Софийского Собора с «его устремленной ввысь колокольней», Спасо-Ефросиньевской церкви «с ее куполом, сияющим весёлым золотом» [7, с. 34], Борисоглебского монастыря «с четырьмя высоченными крестами над его колокольней» [7, с. 34] и старого монастыря Богородицы как высоких духовных ориентиров в жизни людей того времени и их глубокой веры, без которой не было бы самого бытия.

Соотнесение сюжета с определенными датами указывает на тяготение автора к линейной, строго хронологической композиции. Включение в повествование точных исторических дат и событий (например, зима 1486 г. и рождение младенца Франциска Скорины 6 марта 1486 г.) привносит историческую достоверность в повествование.

В системе персонажей представлены образы реальных прототипов, действительных исторических личностей. Читатели знакомятся с семьей Лукаша Скорины, который является главой Полоцкой гильдии купцов, его супругой Магдаленой, сыном Иванкой (которого отец любовно именовал Иваськой), врачом Куртом Бэйкманом и др. К моменту рождения Франциска Скорины старшему сыну Иванке было уже 8 лет. Автор укзывает точный возраст некоторых героев, и в этом проявляется глубокая связь исторического времени с художественным и биографическим. Знание возраста героев помогает определить время важного события – дня рождения великого просветителя Фрациска Скорины.

Представлены социально-психологические и духовно-нравственные основы семьи Лукаша Скорины, описаны ее обычаи, привычки и традиции. Определены ценности семьи: забота о ближнем, доброта, взаимопомощь, любовь к детям,

стремление отца дать им хорошее образование. Художественный текст опирается на реальные картины жизни, которые оцениваются и воспринимаются с позиций современного писателя. Так, отношения в семье доверительные, дружеские, они представлены в несколько сентиментальном и манерном ключе, что отражает существовавшие традиции того времени.

Автор дает и подробное описание внутреннего убранства дома, в котором осуществлялись сделки купца Лукаша Скорины с иноземцами и соотечественниками. А само событие рождения великого Франциска Скорины поднимается до универсального, космического значения. Появление на свет ребенка во время солнечного затмения приобретает мистическое значение и трактуется как великое чудо. Ожидается, что эта особая, гениальная личность принесет особый дар просвещения и образования, что она откроет новые знания для человечества.

В. Седуро создает свою концепцию истории с присущей ему глубиной постижения жизни людей. Его художественная картина мира, отраженная в данном рассказе, включает национальные образы и особенности национального белорусского менталитета. Необходимо отметить, что в данном историческом рассказе очевидно преобладание нравственного начала над социальным.

Основой линейной и хронологически выверенной сюжетной линии рассказа «*Рассвет над Лахвою*» является исторический эпизод из жизни великого поэта эпохи Возрождения Н. Гусовского – перерыв в учебе в Коллегиуме в Вильно и его долгожданная поездка на каникулы на малую родину в горячо любимое им большое село Гусово [8, с. 43]. Автор наполняет повествование историческими деталями, которые подчеркивают достоверность событий. Наличие фактических данных стимулирует интерес читателей и создает неповторимый колорит прошлого, позволяет осмыслить своеобразие эпохи и погрузиться в атмосферу того времени.

Создан психологический портрет школяра Н. Гусовского, его горячее желание вернуться к отцу, «который служил княжеским лесником в Гусове. Земли, за которые отвечал отец, широко распростерлись между Лахвою и Днепром – нетронутые пущи, темные леса и урочища» [8, с. 43]. Присутствуют в тексте и конкретные даты, которые являются вехами в жизни Н. Гусовского: так, например, 5 декабря, подъезжая к своему селу «…забилось сердце Николая, когда он ощутил запахи родного Гуслища» [8, с. 43], а позже – «в декабрьский понедельник 1505 года серым утром отец с сыном отправился в пущу» [8, с. 51].

Автором тщательно изучен и воссоздан уклад жизни прошлого: воспроизводятся детали детских шалостей и игр, описываются музыкальные события и упоминается исполнение народных мелодий на гуслях, цимбалах, дудочках и жалейке. Описываются семейные традиции, любовь к детям, понимание их внутреннего мира, стремление передать им жизненный опыт, лучшие народные традиции и вековые обычаи. Показаны эпизоды тяжелой работы жителей села, отмечается сильная вера людей «в Божье чудо Рождения Христа» [8, с. 51] и духовно-этический принцип жизни белорусского народа: «Если будем верить, жить согласно Христовым заповедям, не погибнем, переживем все невзгоды» [8, с. 51]

В данном повествовании присутствуют и литературно-художественные интертекстуальные переклички с поэмой Н. Гусовского «*Песня о Зубре*» [3], которая считается шедевром европейской поэзии (написанной на латыни в 1523 г.). Поэма доступна сегодня широкой читательской аудитории в переводах на белорусский и русский языки (переводы осуществлены, соответственно, Я. Семиженом и Я. Парецким). В. Седуро представляет свою интерпретацию эпизода охоты на зубра – уникального, мистического дикого животного в жанре

исторической прозы. Автор воспроизводит наиболее значимые эпизоды охоты, представляя ее как важную социально-культурную и историческую практику описываемого времени. *Мотив единства истории и природы* приобретает особый смысл в произведениях В. Седуры как онтологическая, гносеологическая и аксиологическая значимость бытия. Это связано с пониманием автором того факта, что «история творится не “в общем виде”, а в разных зонах и точках социального пространства, а формах особых взаимодействий между различными природными и общественными системами» [4, с. 301].

В то же время, его рассказ – повествование о белорусской природе, сильных и мудрых людях, сложностях жизни. В. Седуро прославляет родной край, отчизну, людей, их мужество, терпение, миролюбие. Таким образом сознание современного человека обогащается знанием, опытом и пониманием истории, в которой передан опыт и раскрыты интенсивные чувства людей эпохи Ренессанса. С одной стороны, основой линейной и хронологически выверенной сюжетной линии данного рассказа является исторический эпизод из жизни великого поэта эпохи Возрождения Н. Гусовского – поездка к отцу в родное село Гусово, с другой, – представлено авторское обращение к классическому произведению Н. Гусовского «*Песня о зубре*». Репрезентация исторических событий основана на воссоздании прошлого «в его историческом содержании и в его неповторимом облике» [5, с. 323].

Эпоха Ренессанса вдохновила В. Седуру, а своеобразная реконструкция реальных событий позволила ему прикоснуться к жизни Ф. Скорины и Н. Гусовского, создать яркие исторические полотна и облечь свои идеи в конкретную художественную форму. Писатель создает произведения, в которых задокументированы подробности исследуемых событий данной эпохи. Обращение к прошлому дало материал для развития сюжета о жизни людей во время Ренессанса, его обработки и современной репрезентации. На основе творческого освоения исторических фактов создаются полотна В. Седуры, сочетающие документальный материал и авторскую фантазию, отражающие разные стороны социального бытия и жизнь реальных личностей, творческое освоение действительности которых несет в себе идею преемственности традиций, значимости искусства и вечных, универсальных, общечеловеческих ценностей. Целью В. Седуры является не только установление фактов и событий прошлого, не только репрезентация событий истории, но и их живая реконструкция, их переосмысление и создание убедительных, своеобразных и оригинальных произведений, в которых зафиксирована история определенного периода. Она содержит в себе новизну авторской интерпретации материала и традиционность исторического подхода, т.к. автор обращает внимание на такие эпизоды реальной и литературной жизни, которые сохраняют свое непреходящее значение для последующих поколений.

Таким образом, осмысление исторических событий в рассказах В. Седуры обусловлено его глубоким интересом к значимым событиям исторического прошлого Беларуси. Историческая проза автора представляет поиск духовно-нравственных основ через воссоздание эпизодов, значительно отстоящих по времени от современной жизни. Доминирующим принципом творчества данного писателя становится постоянное присутствие национальных образов мира, мотивов и интертекстуальных перекличек, связанных с репрезентацией истории страны. Автор не стремится запечатлеть широкую панораму событий, а точно фиксирует важные узлы человеческого бытия, выявляя своеобразие мышления

людей и их менталитет. Воспроизведенный местный национальный колорит Полоцка (произведение «*Полоцкое чудо*») и села Гусово (рассказ «*Рассвет над Лахвою*») передает мировоззрение, мировосприятие и мироощущение времени XV–XVI вв. : это отражено в описании быта, поступков и верованиях людей. Рассказы В. Седуры являются гимном Беларуси, возрождением художественной традиции и вносят весомый вклад и в национальную, и в мировую литературу.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Абдуразакова Е. Р.* Проблема хронотопа в историческом романе Д. Романенко «Ерофей Хабаров» / Е. Р. Абдуразакова // Филологические науки. Вопросы теории и практики в 2 ч. Ч. 2. – 2017. – № 9 (75). – С. 10–13.
2. *Бройтман, С. Н.* Историзм / С. Н. Бройтман // Литературная энциклопедия терминов и понятий; ред. А. Н. Николюкин. – М. : Интелвак, 2001. – С. 232–234.
3. *Гусовский, Н.* Песня о зубре / Н. Гусовский [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://library.by/portalus/modules/belpoetry/readme.php?subaction=showfull&id=1141775262&archive=&start_from=&ucat=&. – Дата доступа: 15.02. 2020.
4. *Кемеров, В. Е.* История / В. Е. Кемеров //Современный философский словарь; ред. проф. В. Е. Кемерова. – М. : Академический проект, 2004. – С. 298–301.
5. *Кожинов, В. В.* Историзм / В. В. Кожинов // Литературная энциклопедия терминов и понятий; ред. А. Н. Николюкин. – М. : Интелвак, 2001. С. 321–323.
6. *Лобин, А. М.* Беллетризация истории как метод репрезентации истории в русской литературе XXI века / А. М. Лобин // Филологические науки: вопросы теории и практики в 4 ч. Ч. 3. – 2017. № 12 (78). – Тамбов; – Грамота. – С. 32–35.
7. *Сядура, У.* Полацкае дзіва / Сядура, У. // Эквівалент : Зборнік эміграцыйнай гістарычнай прозы. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2005. – С. 42–60.
8. *Сядура, У.* Сьвітанак над Лахваю / Сядура, У. // Эквівалент : Зборнік эміграцыйнай гістарычнай прозы. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2005. – С. 33–41.
9. *Юрэвіч, Л.* Проза эміграцыйнага жыцця / Л. Юрэвіч, // Эквівалент : Зборнік эміграцыйнай гістарычнай прозы. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2005. С. 3–4.

УДК 811.161.3’373:821.161.3(045)

С. А. Сігаева (Мінск)

АРХЕТЫП ДРЭВА І ЯГО МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

Абагаўленне дрэва, якое ўзнікла ў свядомаці нашых продкаў многія тысячагоддзі назад, вызначыла сабою структуру ўсіх міфалагічных сістэм. Дзякуючы гэтаму вобразу, вобразу Сусветнага Дрэва, чалавек убачыў свет як адзінае цэлае. Артэфакт Касмічнага дрэва паступова стаў важнейшым сімвалам культуры. Адасобіўшыся ад першастваральнага хаасу, вылучыўшыся з яго, дрэва стала, бадай, непасрэдным матэрыялам для стварэння космасу, ці нават самім космасам. На яго, як на ўжо стварыўшуюся своеасаблівую вось, пачалі нанізвацца разнастайныя элементы свету ад багоў і жывёлін да абстрактных алегорый, напрыклад, часавых.

Дрэва Сусвету – характэрны для міфалагічнай свядомасці вобраз, які засведчаны практычна паўсюдна – ці ў «чыстым» выглядзе, ці ў розных, нават нечаканых, варыянтах: Дрэва Жыцця, Дрэва Урадлівасці, Дрэва Ведаў, Дрэва Кахання, Дрэва Цэнтру, Дрэва Узыходу, Нябеснае Дрэва, Дрэва Апраметнай і г.д. Сустракаюцца і найбольш рэдкія назвы: Дрэва Смерці, Дрэва падземнага царства і іншыя.

Вобраз Сусветнага Дрэва выяўлены на аснове міфалагічных, у прыватнасці касмаганічных уяўленняў, зафіксаваных у паэтычных тэкстах самых розных жанраў, помніках выяўленчага мастацтва, архітэктурных збудаваннях, рэчах хатняга ўжытку. У часавай прасторы гэты вобраз расцягнуты ад эпохі бронзавага стагоддзя і ажно да нашых дзён.

Паводле шматлікіх вусна-паэтычных прыкладаў з жыцця розных індаеўрапейскіх народаў, якія жылі ў лесе, цэнтрам свету, воссю свету, было *Прадрэва* або *Касмічнае Дрэва*, якое злучала цэнтр Пекла, цэнтр Зямлі, цэнтр Неба. Дрэва мадэлюе свет і па гарызанталі, па вертыкалі, і ў часавых адносінах. Прадрэва злучала тры сферы: карэнні яго ў падзем'і, камель – на зямлі, карона – у небе. Вобраз дрэва вызначаў для чалавека яго месца ў космасе. Дрэва – брат чалавека ў прасторы паміж Небам і Зямлёй.

Дрэва – адно з самых высакародных стварэнняў Маці-Прыроды, якая гэтым як бы паказвае пажаданую форму чалавечай душы: форму, якая дазваляе, трывала трымаючыся за зямлю, абавязкова родную, смела ўздымацца ў неба. Дрэва ўяўляе сабой вялікі вобраз імкнення да ідэалу, да Сонца, да Бога.

Дрэва – брат чалавека не толькі ў прасторы, але і ў часе. Нашы продкі жылі ў цыклічным часе, з надзеяй на вечны кругазварот пераўтварэнняў, на адраджэнне, падобнае таму, што і дрэва адраджаецца кожнай вясной пасля зімняга памірання.

Патрэбна адзначыць, што вертыкальная структура Прадрэва, якая складалася з трох узроўняў, або касмічных зонаў (ніжняга – карані, сярэдняга – камель, верхняга – голле), мае здвоеныя супрацьлегласці гэтым зонам або бінарныя апазіцыі: Зямля – Неба, Зямля – Апраметная, Агонь (сухое) – Вільгаць (мокрае), Мінулае – Сённяшняе, Сённяшняе – Будучае, Дзень – Ноч і г.д.

Пары гэтыя перамяшаліся ў структуры дрэва з траістымі адзіноцтвамі: мінулае – сапраўднае – будучае; продкі – сучаснікі – нашчадкі; тры часткі цела: галава, тулава, ногі; тры стыхіі: агонь, зямля, вада. Усе пары і тройкі адлюстроўвалі самыя розныя сферы жыцця – анатамічную, часавую, прычынна-выніковую. Людзі паступова разумелі ўзаемасувязь супрацьлегласцей.

Шэраг фактараў сведчаць пра тое, што вобраз Дрэва Сусвету суаднесены з агульнай мадэллю шлюбных адносін і, калі глядзець значна шырэй, з пераемнай сувяззю пакаленняў, якая адлюстроўвалася пры дапамозе генеалагічных дрэў.

Такім чынам, вертыкальная структура дрэва болыш звязана з касмалогіяй, у той час як гарызантальная – з рознымі магічнымі рытуаламі. Гарызантальная структура Дрэва Сусвету ўтвараецца самім дрэвам і выявамі па яго баках, імі могуць быць жывёлы або людзі. Гэтыя кампазіцыі даволі часта выступаюць у болыш позні перыяд, асабліва ў творах хрысціянскага і будзійскага мастацтваў. Абавязковай умовай з'яўляецца тое, што аб'ект рытуала ці яго вобраз заўсёды знаходзіцца ў цэнтры, а ўдзельнікі – злева і справа. Уся гэтая паслядоўнасць элементаў па гарызанталі ўспрымаецца як рытуальная сцэна, асноўная мэта якой – забеспячэнне дабрабыту, урадлівасці, спадчыннасці.

У дрэве нярэдка намаляваны восем галінак – па чатыры з кожнага боку. Чатыры галінкі – гэга і чатыры бакі свету, і чатыры асноўныя колеры, якія найчасцей сустракаюцца ў прыродзе: чырвоны, сіні, чорны і белы.

Няма нічога дзіўнага, што дрэва гэтак трывала ўвайшло ў нашу генетычную памяць. Псіхолагі зараз даказваюць, што на пэўным этапе развіцця дзіцячай псіхікі яно выяўляецца як першасны вобраз, у малюнках дзіцяці дрэва значна перабольшвае.

Яшчэ можна адзначыць, што гарызантальная структура схемы Дрэва Сусвету мадэлюе не толькі лічбавыя адносіны і бакі свету, але і поры года, гадзіны сутак, якіх таксама чатыры – раніца, дзень, вечар, ноч. Увесь свет, які ўжо зведаны чалавекам і які яшчэ ўвогуле не спазнаны, прыводзяць да нейкай

пэўнай сістэмы міфапаэтычнай канстанты дрэва – магічныя лічбы. Двойка, як тлумачаць этнографы, валодае бінарнымі супрацьлегласцямі (яны згаданы вышэй). Тройка, якая выходзіць з падзелу самога дрэва па вертыкалі на тры часткі, увасабляе абсалютную дасканаласць і невычарпальнасць. Адсюль хрысціянская Троіца, тры сыны ў казцы, тры сацыяльныя групы ў любым грамадстве, тры спробы ва ўсялякай справе, – ад казачнага дзеяння да самай сучаснай спартыўнай гульні. Сімвал усяго гэтага – узнікненне, развіццё і завяршэнне.

Асаблівая роля Дрэва Свету для міфапаэтычнай эпохі вызначаецца тым, што яно выступае як непасрэднае звяно паміж сусветам (макракосмасам) і чалавекам (мікракосмасам) і з'яўляецца месцам іх перасячэння. Гэта гарантавала цэласны погляд на свет, вызначала месца чалавека ўвогуле і кожнага чалавека ў прыватнасці ў агромністым свеце. У культурным развіцці чалавецтва канцэпцыя Сусветнага дрэва пакінула пра сябе сляды ў шматлікіх касмалагічных, рэлігійных і міфалагічных уяўленнях, адлюстраваных у мове, моўных тэкстах розных накірункаў, рытуалах, мастацтве, архітэктуры, паэтычных вобразах і г.д.

З імем Якуба Коласа звязаны здабыткі нацыянальнай пейзажная лірыкі пачатку XX стагоддзя. Паэтычнае Коласава бачанне абапіралася на з'явы звычайнага, будзённага жыцця навакольнага свету і штораз пранікала глыбей у таямніцы гэтага жыцця – так, як дапытлівы розум і чуйная душа адкрываюць неспазнаны чалавечы свет.

Для чалавека, усё жыццё якога праходзіла на ўлонні прыроды і было ўключана ў адвечны кругабег яго існавання – праз будзённую сялянскую працу, праз святочную традыцыю рытуалу, абраду, – з першых год дзяцінства найбліжэйшы лес станавіўся родным домам. Паступова ў ім адчувалася ўсё да драбніц, але мова гэтага лесу, яго жывы, зменлівы голас-шум непакоілі душу чалавека, будзілі яго фантазію, імкненне разгадаць патаемны сэнс жыцця.

Невыпадкова ўсе творы Коласа, у якіх распрацаваны матыў своеасаблівага дыялога чалавека і прыроды, прасякнуты глыбокім філасофскім асэнсаваннем жыцця.

Прыродзе надаецца своеасаблівая роля, яна выступае як неад'емны кампанент твораў. Пейзаж адыгрывае выключна важную ролю ў коласаўскай канцэпцыі свету, меншую – у канцэпцыі чалавека. Пейзажы, заўсёды паэтычныя, поўныя багатага духоўнага зместу, як бы ўзнімалі рэальны бытавы і сацыяльны свет, у якм існавалі, дзейнічалі персанажы, свет амаль заўсёды цяжкі, супярэчлівы, нагадвалі яму іншыя вымярэнні, больш шырокую перспектыву, больш светлае гучанне. Адсюль характары, дзякуючы пейзажным карцінам, духоўна таксама паглыбляліся, эмацыянальна ўзбагачаліся. Прырода для коласаўскага героя як бы «сховішча» ад рэальных цяжкасцей жыцця, ад нягод і нястач.

Гаворачы пра артэфакт дрэва ў творах Я. Коласа, нельга не закрануць вобраз лесу, які заусёды цудоўна апаэтызаваны ў яго творах. У сваёй паэме «Суд у лесе» Я. Колас з натхненнем выказвае сваё асабістае стаўленне да лесу:

Люблю я лес, адвечны бор,
Дзе узносяць хвоі ўгору шапкі,
Дзе рассцілаюць елі лапкі
І востры верх імкнуць у прастор [1, т. 6, с 102].

Пры апісанні лесу аўтар узгадвае ўсе састаўныя і неад'емныя часткі яго, гэта значыць у першую чаргу дрэвы, кусты, імхі, жывёлы і нават... баравікі, якія ён вельмі любіў збіраць.

Традыцыйныя ў фальклоры вобразы-сімвалы дубоў, якія нагадваюць пра свяшчэнныя дрэвы часоў паганства, даволі часта выступаюць на першы план. Дуб у Я. Коласа – гэта ўвасабленне Прадрэва.

Адной з крыніц вобразнасці паэмы «Новая зямля» з'яўляецца адлюстраванне паганскіх анімістычных і антрапамарфічных уяўленняў нашых продкаў:

І соку кропелькі, як слёзы,
Як град пасыпалісь з бярозы,
Аж шкода нейк было дзярвякі:
Здавалісь ранай тыя знакі,
Адкуль паліўся сок халодны
І пакідаў свой камель родны [1, т. 6, с. 58].

Падобныя вобразы ў Коласа маюць не толькі адбітак філасофскай развагі, але і глыбокі псіхалагічны змест, тут ёсць пранікненне ў своеасаблівую псіхалогію адухоўленай прыроды. Асаблівую ўвагу пісьменніка прыцягвае воблік адзінокага дрэва, які з найбольшай сілай і паўнатой дазваляе раскрыць унутраны стан героя.

Паэтычна сэнсоўнай формулай дыялектыкі жыцця, услаўленнем непарыўнай сувязі таго, што можна назваць асобай, сталі афарыстычныя словы Коласа, сказаныя ў паэме «Рыбакова хата»:

Пытае бура старца дуба:
Чаму цябе я не зламлю?
І кажа дуб: – Я ўрос у зямлю,
З зямлёю жыць у дружбе люба [1, т. 7, с. 216].

Гэтай ідэяй, па сутнасці, акрэслены цэлая філасофія жыцця, якую Я. Колас настойліва і паслядоўна выказаў у многіх творах.

У Я. Коласа ёсць шэраг асобных вершаў, якія ён прысвячае магутнаму дрэву, дзе найбольш поўна раскрываецца гэты вобраз і на прыкладзе якога можна прасачыць само разуменне і ўспрыманне Коласам дрэва. Пачынаецца верш «Дуб» з агульнага апісання ўспрыняцця дуба, вылучэння яго. Паэт падкрэслівае, што нельга не заўважыць такога асілка:

Сілачом стаіць
Дуб разложысты,
І з далёк відаць
Пышны верх яго [1, т. 14, с. 211].

Далей Колас падмацоўвае веліч дрэва наступнымі радкамі:

А ў нізе пад ім Неман коціцца,
Срэбрам-стужкаю павіваецца.
У нагах трава
Нізка сцелецца...

Аўтар, як і пры апісанні дуба ў некаторых «Казках жыцця», зноў звяртаецца да спробы перадаць моц і веліч дрэва, яго непахіснасць і трываласць:

У глыб зямлі ўвайшлі
Карані яго,
Крэпка дуб стаіць,
Не варушыцца!

Моц дрэва падкрэсліваецца пры апісанні яго асобных частак:

Так размашыста
Раскіданы

Ва ўсе стораны
Лапы крэпкія.
Комель – слуп-скала
Дыша сілаю,
А ўгару зірнеш –
Шапка валіцца.

Потым аўтар, прызнаючы веліч і сілу магутнага дрэва, гарманічна прыбаўляе да яго апісання:

Дуж ты, дуб стары,
Сын вякоў сівых!...

У наступных радках Колас як бы па-чалавечы спачувальна адносіцца да яго:

Многа бур ты знёс
На вяку сваім!

Думкі самога Коласа, яго разважанні аб жыцці перадае дрэва: «Чым цікава гэтае жыццё, – сказаў адзін дуб, ды гэта тым, што яно хоць і ідзе па пэўных законах, але вечна змяняецца і разгортвае новыя старонкі. І колькі б ты ні жыў, ніколі не пасягнеш яго мнагамернасці» («Купальскія светлякі») [1, т. 5, с. 50].

Дрэва – увасоблены ідэал дынамічнай раўнавагі гарызантальнага і вертыкальнага, глебы, у якую ўваходзіць каранямі, і неба, да якога цягнецца вяршыняю.

У фальклоры замацаваліся ўстойлівыя вобразы-сімвалы: бяроза сімвал вернасці, яблыня – цвёрдасці, дуб – мудрасці і сілы, сасна – мужнасці, елка – цярпення.

Літаратура – гэта верхні паверх нацыянальнага логасу, яна не так набліжана да космасу, як, напрыклад, вусная народная творчасць, бо аўтары абапіраюцца не толькі на нацыянальнае, але і на інтэрнацыянальнае.

Своеасаблівым мостам паміж старажытнымі архетыпамі і людзьмі выступаюць сімвалы, што адкрываюць чалавеку сакральнае, кампенсуюць адарванасць ад прыроды. Мастак, выкарыстоўваючы тыя ці іншыя артэфакты і сімвалы, абапіраецца на міфалогію, вусную народную творчасць і спрадвечную культуру. Вывучаючы творы мастацкай літаратуры ў адносінах вобразнасці, характараў, ужываемых мастацкіх сродкаў, мы спасцігаем веды пра народнае светаадчуванне ў цэлым.

ЛІТАРАТУРА

1. *Колас, Я.* Збор твораў у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Народная асвета, 1975. – 14 т.

УДК 821.161.3-31(=581)

Го Синьай (Тяньцзинь, КНР)

ТВОРЧЕСТВО СВЕТЛАНЫ АЛЕКСИЕВИЧ В КИТАЕ

Светлана Алексиевич – первый белорусский лауреат Нобелевской премии. Нобелевская премия по литературе 2015 г. была присуждена писательнице «за полифоническое творчество – памятник страданию и мужеству в наше время». Ее произведения отчаются от других невымышленной правдой, что привлекает к ним особое внимание в глобальном контексте мировой литературы.

Творчество С. Алексиевич очень популярно за пределами Беларуси. В Китае на данный момент издано пять книг: «Цинковые мальчики» (переведена У Ланьханем и Тянь Давэем, из-во «Куньлунь» в 1991 г.), «Чернобыльская молитва» (перевена Фан Цзуэ и Го Чэнэ, из-во «Хуачэн» в 2015 г.), «Последние свидетели» (перевена Цинлан Ли Ханем, из-во «Цзючжоу» в 2015 г.), «У войны

не женское лицо» и «Время секонд хэнд» (перевены Люй Нинсы в 2015 г. и 2016 г., из-ва «Цзючжоу» и «Чжунсинь»). Писательница была удостоена четырех китайских литературных премий, в том числе премии Шанхайской книжной ярмарки, премии Пекинской книжной ярмарки, почетной премии Вэньцзинь – важнейшей литературной награды Китая. Кроме того, Алексиевич посещала Пекинский университет, Шанхайский союз писателей и Шанхайскую книжную ярмарку с целью выступления и обмена опытом. Корреспондент узнал из издательства «Чжунсинь» о том, что 10 декабря 2015 г. 1000 книг «Время секонд хэнд», которые вышли монопольно в приложении «Чжанъюэ», распродали за 25 минут. Отсюда стало очевидно, что писательница пользуется огромной популярностью среди китайских читателей.

На собрании по обмену опытом Шанхайского союза писателей участники (研究室, 2016) [1] выражали искреннее восхищение книгой «Чернобыльская молитва», написанной после преодоления множества трудностей, поэтому они хотели узнать глубже, как писательница справилась с ними в процессе творчества. Алексиевич отметила, что для нее трудность не в том, может книга выйти или нет, а в том, как писать. Речь идет о создании своей философии и открытии своего кругозора. По ее словам, писателю нужен новый смысл, нельзя повторять бездарное и единообразное. Отвечая на вопрос о том, как выстоять перед горем опрошенных, она сказала: «Когда вы изучаете зло, надо выделять зло, как больному болит, когда хирург удалит опухоль. Но без горя не может существовать прогресс…» Некоторые писатели интересовались коммуникацией между писательницей и участниками опросов, на что Алексиевич отвечала: «Мой метод познания человека лежит через интервью, мы беседовали обо всем обычными словами, таким образом, участник был разговорчивым. Я не даю информацию, я пишу эмоциональную историю».

Переводчик книги «Время секонд хэнд» Люй Нинсы отметил в интервью газете Южных городов（黄茜，2016）[2]: «Читая эту книгу, ощущаю потрясение в душе, даже, полагаю, переводить ее на китайский язык – это не обычная задача, а историческая ответственность. Как ранние значительные произведения Алексеивич, “Время секонд хэнд” на основе множества интервью, через устный рассказ повествует об изменеиях за 20 лет после распада СССР (1991–2012). Люй Нинсы считает эту книгу «памятником» для «красных людей». Переводчик сказал, что в процессе перевода он стремился к тому, чтобы читатель понимал отображенную в книге эпоху через простые и ясные слова. После того, как произведение вышло в свет на внутренем рынке Китая, оно получило положительные оценки из разообразных кругов. Опытный издатель Го Микэ считает, что “Время секонд хэнд” – книга, которая помогает людям чувствовать “сложное настроение”… Стиль перевода квалифицирован и точен, практически не к чему придраться». Люй Нинсы так отвечал на вопрос о причине решения переводить эту книгу: «Издательство Чжун Синь получило право на издание в первой половине года, оно обратилось ко мне. Я думаю, что это очень важная книга, мой интерес к ней больше, чем к ее ранним произведениям, потому что она описывает эпоху, в которой мы живем, исторические трансформации и тесно связана с Китаем во многих сферах. А в ее творчестве обнаруживаются темы и исторические факты, о которых раньше нам было любопытно узнать. Алексиевич сама назвала “Время секонд хэнд” “энциклопедией распада СССР”. Я считаю, что

данная книга объективно, с разных точек зрения простых людей, путем тщательного и прямого интервью, а не путем изображения от третьего лица демострирует переживания и чувства поколения, переживающего распад СССР».

Исследования китайских ученых по творчеству С. Алексиевич углубляют, и, главным образом, анализируют значение и ценность ее произведений с точки зрения писательского метода и «женской литературы». Так, в статье «Анализ травматического нарратива мемориальной литературы – оценка С. А. Алексиевич и Чжан Чуньжу», написанной Шу Цзинцзюань (舒婧娟，纪实文学的创伤叙事探析−评S.A阿列克谢耶维奇和张纯如，2015) [3], белорусская писательница сравнивается с американской писательницей китайского происхождения Чжан Чуньжу, которая также известна своей документальной литературой. Они обе в своих произведениях через интервью записали воспоминания переживших войну женщин, через коллективную память восстанавливают историческую правду, фокусируют внимание на личных ранах маленького человека.

В статье «Рассуждения о чертах полифонического повествования в творчестве Алексиевич С. А.» (написана Лю Шипином и Ли Яньпин) (刘石平、李艳萍.，论S.A.阿列克谢耶维奇作品的复调叙事特征，2019) [4] отмечено соединение устного, невымышленного содержания с методом создания полифонического романа. Авторы отмечают, что в творчестве Алексиевич слышится «звук утопии» (здесь оказывается мечтой, которую пытаются осуществить, но в конце концов это невозможно), выявляются черты «диалогизма» и «многоголосия». В то же время авторы подчеркнули три особенности произведения: преемственность традиции русского полифонического повествования, стремление к написанию истинной истории и внимание к словам маленького человека.

В статье «Алексиевич: лейтмотив и стратегия формирования женских исторических слов» (написана Фэн Юйчжи и Цзэн Линой) 冯玉芝、曾丽娜，阿列克谢耶维奇：女性历史话语建构的主旨与策, 2019 [5] главным образом дается оценка творчеству С. Алексиевич с точки зрения «женской литературы». Высказывается мнение, что мужская память предпочитает фиксировать череду событий, а в женской памяти более существенны эмоции и чувства – женское повествование стало символом смысла «человек является центром истории и событий», в нем не только разум, но и эмоция. Произведения С. Алексиевич оставляют потрясающее впечатление у китайских читателей, передают им больше информации о минувшем веке от процветания до упадка, о простых людях, живших в ту эпоху. В Китае также постепенно появляется документальная литература, проводятся сравнительные исследования. Будь то метод творчества, точка зрения или женский взгляд – все привлекает внимание китайских ученых и читателей.

В интервью китайской медиакомпании «Соуху» (柏琳, 2016）[6] С. Алексиевич отметила, что в течение поездки по Китаю она больше всего хочет побеседовать с китайцами на тему любви. На самом деле большинство читателей заинтересовано более обширными темами, включая то, как она рассматривает трандициоую русскую литературу, как поинмает горе народа в ходе трансформации во «Времени секонд хэнд», как владеет искусством невымышленной литературы?... Но стоит поразмышлять, о чем еще заботится литература? Окончив поездку, устав и приехав в гостиницу, писательница все еще хотела разговаривать о любви. Она спрашивала молодых редакторов, что такое любовь? Девушка отвечала: «По-моему, любовь является холстом, на нем нари-

сованы разные цветы: гнев, печаль, привязанность и слезы». И китайские читатели надеются на то, что будут иметь возможность познакомиться с новыми замечательными книгами С. Алексиевич, уже о любви.

ЛИТЕРАТУРА

1.**研究室**. 诺奖得主阿列克谢耶维奇访问上海作协.**上海作家网**. 2016.08
2.**黄茜**. 吕宁思：《二手时间》会让读者震撼.**南方都市**报, 2016.03
3. **舒婧娟**.纪实文学的创伤叙事探析— 评S.A**阿列克**谢耶维奇和张纯如[J].**湖北民族大学**,2015
4. **刘石平、李**艳萍. 论S.A.**阿列克**谢耶维奇作品的复调叙事特征[J].**湖南涉外**经济学院学报, 2019 (03)
5. 冯玉芝、曾丽娜.**阿列克**谢耶维奇：女性历史话语建构的主旨与策略[J].**中**华女子学院学报, 2019.12 (06)
6. **柏琳**.**她太疲倦了，只想和中国人**谈谈爱— 诺奖得主的十日中国行.**新京**报, 2016.08

УДК 821.112.2+821.161.3

Т. С. Супранкова (Мінск)

АКСІЯЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ФАЎСЦІЯНЫ ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА Ў НЯМЕЦКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРНЫХ ПРАСТОРАХ

Эпоха Асветніцтва – вызначальны этап у гісторыі Новага часу, калі з’яўляюцца важныя філасофскія канцэпты і каштоўнасныя ўстаноўкі, калі ідэі роўнасці і свабоды становяцца ключавымі ў перастварэнні свету, а найбольш важнымі інструментамі пры гэтым павінны былі выступіць мастацтва і адукацыя. У літаратуры пачынаюць фарміравацца новыя мастацкія напрамкі, заснаваныя на рацыяналістычным сэнсуалізме. Пісьменнікі таксама адлюстроўваюць гэтыя аксіялагічныя аспекты ў сваёй творчасці, выступаючы з ідэямі роўнасці ўсіх людзей, незалежна ад паходжання, рэзка крытыкуючы сацыяльную няроўнасць у грамадстве, абараняючы чалавечую годнасць, заклікаючы адмовіцца ад тыраніі, рабства, абмежаванасці. Пачалі з’яўляцца творы, у якіх выказвалася незадаволеннасць існуючым парадкам жыцця, адстойвалася свабода творчай асобы, пракламаваўся самабытны шлях развіцця нацыянальнай культуры, асабліва гэта назіраецца ў сентыменталізме. Разам з гэтым узбудзілася цікавасць да старажытных сюжэтаў і тэм, якія нарадзілі нацыянальныя літаратуры. Яны творча пераасэнсоўваліся і перапрацоўваліся, станавіліся “вечнымі”, уступаючы ў дыялог з іншымі культурамі.

Прыкладам такой міжкультурнай камунікацыі з’яўляецца і ананімны твор “Гісторыя доктара Ёгана Фаўста, знакамітага чарадзея і чарнакніжніка” аб доктары Фаўсце, што пабачыў свет у франкфурцкай друкарні Ё. Шпіса ў 1587 годзе. Гэта першая па часе зафіксаваная версія сюжэта, які пазней атрымае назву *фаўсціяна*, хоць прататыпаў і перадумоў да ўзнікнення менавіта такога топасу ў сусветнай культуры было даволі шмат. “Фаўст” – галоўны і выніковы твор асветніка Ё. В. Гётэ, які, як вядома, дапрацоўваўся і карэктаваўся ім да апошніх дзён жыцця, і толькі ўжо пасля смерці аўтара з’явіўся перад чытачом у поўным выглядзе.

Да распрацоўкі сюжэта пра мага-чарадзея Фаўста, запазычанага з народных кніг і лялечных пастановак, Гётэ прыступае яшчэ ў студэнцкія гады. Менавіта тады пачынаючы літаратар “Буры і націску” створыць свайго “Пра-Фаўста”, ці Першага “Фаўста” (Urfaust, 1769–1773), які будзе напісаны ў лепшых традыцыях нямецкага сентыменталізму: галоўныя героі шцюрмерскага “Фаўста” – бурныя геніі, якія выступаюць супраць сацыяльных умоўнасцяў, супрацьпастаўляючы сваю самабытнасць і натуральнасць усяму хвораму і рэгрэсіўнаму ў соцыуме. Пра першую пробу пяра не было б нічога вядома сучаснікам, калі б не

руплівая праца фрэйліны Веймарскага двара Л. фон Гёххаўзэн, якая папрасіла маладога пісьменніка перапісаць “Фаўста”, калі ён зачытваў твор для блізкага акружэння ў 1775 г. у Веймары.

Ранні этап творчасці Гётэ прыпаў на час, калі ў літаратуры пачынае фарміравацца новы мастацкі напрамак, процілеглы рацыянальнаму класіцызму Ё. К. Готшэда. Пачынаецца рух таленавітых маладых пісьменнікаў на чале з Ё. Г. Гердэрам, яны ўслед за Ж.-Ж. Русо заклікалі вярнуцца “назад да прыроды”, адмовіцца ад старых стэрэатыпаў і ўстояў. Пачыналі з’яўляцца творы, у якіх выказвалася незадаволеннасць існуючым парадкам жыцця, адстойвалася свабода творчай асобы, сцвярджалася ўнікальнасць “бурных геніяў”, услед за Г. Э. Лесінгам і Ф. Г. Клопштакам пракламаваўся самабытны шлях развіцця нацыянальнай культуры. Пачыналася эпоха “Sturm und drang” (буры і націску). Не дзіўна, што народная легенда пра дзівака-мага Фаўста, геніяльнага вучонага, прафесійныя нормы якога рэзка супярэчылі нормам яго эпохі, так прыцягвала ўвагу прадстаўнікоў “Буры і націску”, ці шцюрмераў. З’явілася цэлая плеяда твораў фаўсціяны: “Ёган Фаўст” П. Відмана, сцэнкі Я. Ленца, драма “Жыццё і смерць доктара Фаўста” Ф. Мюлера.

У міжкультурнай камунікацыі эпохі Асветніцтва нельга не адзначыць уплыву яшчэ аднага “бурнага генія” Ф. М. Клінгера, чый жыццёвы лёс быў звязаны з рускай культурай канца XVIII – пачатка XIX стагоддзяў. Яго фаўсціяна – раманы “Фаўст, яго жыццё, дзеі і звяржэнне ў пекла” (1790), “Гісторыя Рафаэля д’Акільяса” (1793), “Гісторыя Джафара Бармекіда” (1792–1794), “Фауст усходніх краін” (1796). Але Клінгер сваёй мастацкай вобразнасцю і свабадалюбствам прыйшоўся па душы іншаму часу і аказаў уплыў на наступную літаратурную традыцыю рамантызма, у тым ліку і на беларускіх раматыкаў.

Першая частка “Фаўста”, другога “Фаўста”, з’яўляецца ў друкаваным варыянце 1808 годзе. Гэты твор значна адрозніваўся ад першай версіі. Ускладнілася філасофская праблематыка, а разам з ёй і жанравая прырода “Фаўста”, сінтэзуючы і спалучаючы ў сабе шмат якія літаратурныя плыні розных эпох: антычнай, барокавай, класіцысцкай, ракайнай, сентыменталісцкай, перыяду веймарскай класікі. Гэтая традыцыя будзе працягнута Гётэ і ў другой частцы яго неўміручага твора, якая пісалася з 1825 г. па апошнія дні яго жыцця да 23 сакавіка 1832 года. Нават раскрыць запячатаны скончаны твор паэт загадаў толькі пасля сваёй смерці. Такім чынам, “Фаўст” становіцца духоўным тэстамантам пісьменніка сваім суайчыннікам і нашчадкам. Кожная наступная эпоха і культура не абыдзе гётэўскую версію і паспрабуе даць сваю інтэпрэтацыю славутаму сюжэту.

З гётэўскай версіі міжкультурная камунікацыя топаса фаўсціяны пашыраецца, міф набывае скаладанейшыя філасофскія канатацыі і новыя аксіялагічныя аспекты, якія становяцца цікавымі для еўрапейскіх філосафаў, пісьменнікаў, драматургаў, мастакоў і кінематаграфістаў. З’яўляецца шмат версій і мадыфікацый міфасюжэта, якія непасрэдна ці апасродкавана адсылаюць нас да гётэўскага тэксту (у першую чаргу), ці да версіі народнай легенды. У нямецкай культуры рамантыкі ў першую чаргу ўспрынялі аксіялагічныя аспекты фаўсціяны. Рамантычны “Фаўст” (драматычны ўрывак) з’яўляецца ў А. фон Шамісса ў 1803 годзе. Пісьменнік-рамантык увогуле праяўляў вялікую цікавасць да народных кніг. Нясканчаная драма “Спадчына Фартуната” легла ў аснову аповесці “Цудоўная гісторыя Петэра Шлеміля”, дзе відавочна прысутнічаюць таксама алюзіі на “Фаўста”. Верш “Доктар Фаўст” збіральнікамі фальк-

лору А. фон Арнімам і К. Брэнтана быў размешчаны ў “Чарадзейным рогу хлопчыка” (1806–1808). Славуты казачнік В. Гаўф у год сваёй смерці (1827) скончыў працу над “Мемуарамі сатаны”, якія вытрыманыя ў лепшых традыцыях “Фаўста” Гётэ. У 1828 г. Х. Д. Грабе піша драму “Дон Жуан і Фаўст”, у 1836 г. выходзіць лірыка-эпічны твор “Фаўст” Н. Ленаў, гэты сюжэт цікавіў і Г. Гейнэ.

У беларускай культурнай прасторы такім сюжэтам з’яўляецца “Камедыя” (1787) К. Марашэўскага, беларуская асветніцкая драма, якая ўвайшла ў рукапісны зборнік, апісаны А. Сычэўскай у 1909 г. у артыкуле “Да пытання аб Мальеру ў польскай драматычнай літаратуры XVIII стагоддзя”. У 1911 г. тэкст “Камедыі” Марашэўскага з каментарамі быў апублікаваны ў кнізе “Да гісторыі польскага і рускага народнага тэатра” У. Перэтца, а ў 1920 г. – кірыліцай этнографам Я. Карскім. Паспрабуем правесці кампаратыўны аналіз “Камедыі” К. Марашэўскага з “Фаўстам” Ё. В. Гётэ з мэтай вылучыць аксіялагічныя аспекты асветніцкай фаўсціяны.

Твор К. Марашэўскага прасякнуты біблейскімі вобразамі Адама, чорта, матывам грэхападзення (разам з фаўсціянай узыходзіць да архетыпу забароны і паршэння) і інш., праз якія аўтар імкнецца паказаць сучасных беларускіх сялян, растлумачыць іх учынкі. Выбар галоўнага героя селяніна Дзёмкі – тыповая для асветніцкіх твораў рыса пазасаслоўнасці. Уступны маналог галоўнага героя дае нам магчымасць убачыць побытавую культуру і жыццё беларускіх сялян: “*Ох, як нешчаслівае жыццё маё! Хаджу я, хаджу праз цалюханькі дзень, аж ногі анямелі, рук не чуваць ад працы і тапара, а горш яшчэ ад цапа; малачу ад самых курэй, аж мала што не да поўдня, як бы сам адзін. Праўда, што і жонка памагала, да што ж яе за работа? Ведама – жаноцкая справа; цюкнець колька разы цапом, аж зараз яе і ліхо бярэць – то сядзець, то ляжэць, то колікі падапруць, толькі чорт леньскі яе дусіць, а потым яшчэ з гоманам і кляцьбою пойдзець*” [6, с. 58].

Адчай і роспач гучаць у словах Дзёмкі не столькі таму, што абставіны і жыццё вымушаюць яго працаваць, а таму што ён разумее бессэнсоўнасць і безвыніковасць нялёгкай працы. “Трагедыя Дзёмкі не ў тым, што нібыта ён не хоча, не жадае працаваць, цураецца працы, а ў тым, што ён пачынае пераконвацца ў бессэнсоўнасці і абясцэньванні працы, у выніку чаго само жыццё траціць сваю прывабнасць і сапраўдны чалавечы сэнс. Працуеш, працуеш, а задаволіць мізэрную, мінімальную патрэбу, скажам, у самым неабходным – у адзенні – не ў сілах: няма грошай”, – адзначае Я. Усікаў [7, с. 77].

Далей з вуснаў селяніна вылятаюць словы абвінавачвання ў бок першага чалавека: “*Каб то Адам, першы наш ацец, не саграшыў, так бы і мы гэтак не працавалі б. Ох! Дурак ты, дурак, нашто табе было ірваць яблык з дзерава праклятага? Прападзі яно! Каб мне не велена было, то б я не парухаў бы, а што горшае, а не парухаў бы. А мы б у раю, як паны б на зямлі, жылі б, клопату жаднага не мелі б, аб сярмягу тагды не клапаціліся б, і голыя б у раю перахадзілі б. А цяпер, як сярмяжка здзярэцца, хоць ты з галавы выйдзі, неадкуль узяць, а горш, што незашта купіць”* [6, с. 59]. На думку Я. Усікава, К. Марашэўскі шукае прычыны жыццёвай неўладкаванасці не ў сацыяльных абставінах, а ў яго суб’ектыўных якасцях, у яго “нібыта маральнай недасканаласці” [7, с. 83]. І гэта не дзіўна, таму што асветніцкая ідэалогія была скіраваная таксама і на маральнае ўдасканаленне чалавека. Але аўтара цікавяць і псіхалагічныя працэсы, якія адбываюцца ўнутры гэтага простага чалавека, гавораць нам пра яго духоўную эвалюцыю і ўзвышаныя памкненні.

С. Лаўшук вельмі слушна адзначае наступную рысу характару Дзёмкі: “Вельмі ўдала драматург зрабіў выбар тыпалагічнай мадэлі характару героя: згрызоты і цяжкасці жыцця добра-такі прыціснулі яго, але не зламілі, а толькі сагнулі. Усякае ж сагнутае, як правіла, імкнецца разагнуцца. Калі і як – гэта залежыць ад розных абставін. Важна, каб непашкоджаным заставаўся стрыжань, аснова. І такі стрыжань у Дзёмкі быў – пачуццё ўласнай годнасці, якое ў яго выяўлялася хоць і імпульсіўна, але паслядоўна і псіхалагічна адэкватна” [3, с. 25].

Вельмі каларытная фігура чорта з’яўляецца ў К. Марашэўскага ў чацвёртай сцэне пасля чарговага Дзёмкінага наракання на Адама: “*Вот і цяпер мазоліцца трэба. Аддыхнуць некалі. Мала што кроўю не пацею, аж пакуль не пакуль на кавалак хлеба зараблю. Зямля ўжо неўраджайная стала. Дужа многа наклапоцішся і нагаруешся, пакуль не ўродзіць <…> А як жа нам на яго не наракаць і не плакаць. Хэ, хэ, хэ. Ох, Адам, Адам, каб цябе ніколі больш не ўспамінаў*” [6, с. 63]. Размова з чортам пачынаецца з прычыны віны Адама. Стомлены жыццём Дзёмка тлумачыць свае асабістыя крыўды складанай безвыніковай працай. С. Кулік заўважае: “З вобразам д’ябла мы сустрэнемся ў любой чэшскай, украінскай, польскай і рускай інтэрмедыі, што павязаная з біблейскімі матывамі. У старадаўняй легендзе, пакладзенай у аснову «Фаўста» Гётэ, не апошняе месца належыць д’яблу. Магчыма, што з гэтай легендай і звязана традыцыя надзялення нячысціка рысамі філосафа-мараліста, якім падае яго чытачу К. Марашэўскі” [2, с. 312].

У духу асветніцкай філасофіі Марашэўскі звяртае ўвагу на вобраз чорта, які чорны знешне. Д’ябал прапануе Дзёмку звярнуць увагу ў першую чаргу на ўласную чарнату, якая знаходзіцца ўнутры яго: “*Трэба ў аснове сябе пазнаць. Недастаткова глядзець на сябе вачыма цялеснымі, але трэба і душэўнымі*” [6, с. 65]. Так гучыць вядомы яшчэ з Антычнасці тэзіс, які пераклікаецца з кантаўскім заклікам мець мужнасць карыстацца ўласным розумам. Даследчык С. Лаўшук заўважае: “Гэта вобраз-аксюмаран. Такога нячысціка, які б адстойваў боскія запаведзі, у драматургіях усходніх славян больш няма” [4, с. 65]. Такім чынам, вобраз Чорта становіцца тыпалагічна блізкі гётэўскаму Мефістофелю, без якога немагчымым будзе самаўдасканаленне Фаўста. Толькі ў беларускім варыянце прапануецца іншы алгарытм дзеянняў: тры выпрабаванні. К. Марашэўскі ў сваёй п’есе выкарыстоўвае знакаміты матыў забароны і яе трохразовага парушэння, які мы сустракаем у Бібліі і ў фальклоры. Задача простая – Дзёмка павінен маўчаць на працягу гадзіны. Калі ён вытрымае, то атрымае сто рублёў, калі не – д’ябал забярэ яго душу ў пекла (таксама фаўсціянскі матыў). Селянін згаджаецца на пастаўленыя ўмовы.

Але ўсе тры разы іспыт быў правалены, бо Дзёмка палічыў больш важным за ўласнае жыццё навучыць дзяцей, дапамагчы братам без усялякай прагі атрымаць частку багацця і растлумачыць недарэцы, што проста смешна баяцца нейкую дудку. Аўтар хоча паказаць, што сумленне, пачуццё добразычлівасці, імкненне дапамагчы бліжняму – самыя важныя маральныя якасці, якія дапамагаюць герою лепш пазнаць сябе і прасвятляюць яго душу. “Формально пари выиграл черт. Но морально победил Дёмка, ибо во всех трех случаях он заговорил по своему бескорыстному благородству. Своим поведением он опроверг самого себя, доказал, что ни первородный грех, ни Божий рок не имеют отношения к человеческой судьбе, так как все зависит от самого человека”, – лічыць А. Мальдзіс [5, с. 412].

Нягледзячы на пройгрыш, Дзёмка ўсё роўна перамагае маральна (хоць і следуе за чортам у пекла), таму што застаецца чалавечным і спагадлівым. Тут нельга не правесці аналогію з Фаўстам Гётэ, які, нягледзячы на шматлікія няўдачы і памылкі ў канцы апраўданы аўтарам за альтруізм, шчырае імкненне зрабіць лепш гэты свет і дапамагчы людзям.

Таксама д'ябал К. Марашэўскага і Мефістофель Ё. В. Гётэ маюць падобныя рысы, бо іх нарадзіла эпоха Асветніцтва. І адзін, і другі персанажы прадстаўлены не проста як нячысцікі з пекла, якія вырашылі прынізіць чалавека, але, наадварот, даюць яму магчымасць выратаваць сваю душу. Мефістофель у сваёй размове з Госпадам кажа аб чалавеку:

Я памаўчу пра сонца, пра сусветы –
Мне рупіць пра насельнікаў планеты:
Зямны бажок нязменны, тая ж плоць,
Якую ты стварыў яе, Гасподзь.
Адна бяда – не задзіраў бы носа,
Калі б не ведаў ён святла нябёсаў.
Ён розумам святло тваё заве
І з ім усё-такі жывёлінай жыве,
Ён, як цыбаты конік той,
З дазволу кажучы, – цвіркоча
І скача ўверх з травы густой
І ў шыр нябесную падняцца хоча.
А жыў бы добра, калі б з проса,
Як той казаў, не соваў носа [1, с. 159].

Мефістофель, як і д'ябал К. Марашэўскага, хаця і імкнецца дапамагчы чалавеку, але ўсё роўна не верыць, што ён паспяхова пройдзе іспыт і пераканае спакуснікаў у адваротным. Але ў "Камедыі" чорт прадстаўлены як філосаф, мараліст, які заклікае нас усіх зазірнуць у сябе, паразважаць, наколькі абдумана мы паступаем, ці маем мы падставы асуджаць іншых, калі і самі, увогуле, недасканалыя.

Аксіялогія ідэй Асветніцтва выяўляецца, такім чынам, і дзякуючы канцэптам фаўсціяны. У працэсе міжкультурнай камунікацыі былі пераапрацаваны топасы фаўсціяны ў "Камедыі" К. Марашэўскага. У творы, як і ў "Фаўсце" Ё. В. Гётэ, звяртаючыся да сюжэтаў аб грэхападзенні і аб дамове з д'яблам, беларускі драматург у русле асветніцкіх традыцый прадстаўляе галоўных герояў, засяроджваючы ўвагу на пачуцці чалавечай годнасці, пазасаслоўнасці, гуманнасці, альтруізме і маральным удасканаленні чалавека. Важным аспектам з'яўляецца і дэістычная ідэя маральнай перамогі чалавека – стваральніка свайго ўласнага лёсу, і, як гэта не парадаксальна, атрымаць яе "дапамагае" чорт. У лепшых традыцыях Асветніцтва нацыянальныя каштоўнасці набываюць універсальныя рысы, робіцца акцэнт на самабытнасці культуры кожнага народу і на важнасці яе для сусветнага культурнага працэсу.

ЛІТАРАТУРА

1. *Гётэ, Ё. В.* Выбраныя творы / Ё. В. Гётэ; уклад., прадм. Л. Баршчэўскага і П. Копанёва, камент. Л. Баршчэўскага і В. Сёмухі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. – 640 с.
2. *Кулік, С. М.* Біблейскія матывы ў "Камедыі" К. Марашэўскага / С. М. Кулік // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 310–314.
3. *Лаўшук, С. С.* Гарызонты беларускай драматургіі / С. С. Лаўшук. – Мінск: Беларуская навука, 2010. – 410 с.
4. *Лаўшук, С. С.* Камедыя / С. С. Лаўшук // Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст.: у 2 т. / рэд. калегія: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – Т. 2. – С. 40–72.

5. *Мальдис, А.* Белорусская литература / А. Мальдис // История всемирной литературы: в 9 т. / редкол.: С. В. Тураев [отв. ред.] и др. – М.: Наука, 1988. – Т. 5. – С. 407–412.
6. *Марашэўскі, К.* Камедыя / К. Марашэўскі // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 3 т. – Мінск, 1997. – Т. 1. – С. 58–115.
7. *Усікаў, Я. К.* Беларуская камедыя (ля вытокаў жанру) / Я. К. Усікаў. – Мінск: Выш. школа, 1964. – 199 с.

УДК 821.161.0.09

М. В. Хаўстовіч (Варшава, Польшча)

“HUTARKA BIŁARUSKA” Ф. ПЧЫЦКАГА: ПРАБЛЕМЫ АТРЫБУЦЫІ І ТЭКСТАЛОГІІ

З сярэдзіны 1850-х гг. мы назіраем імклівае развіццё беларускамоўнае літаратуры. Папярэднія дзесяцігоддзі падрыхтавалі той неабходны грунт, на якім выраслі класічныя творы айчыннага пісьменства. Вядома, адраджэнню “новае, славянскага роду літаратуры” [5, s. 26] паспрыяла агульная грамадска-палітычная сітуацыя ў імперыі (маем на ўвазе перамены, якія адбыліся ў сувязі з прыходам да ўлады Аляксандра ІІ), рост свядомасці люду (пакуль яшчэ люду, а не народу), які вуснамі адукаваных прадстаўнікоў (шляхціцаў-інтэлігентаў, што ўрэшце заўважылі гэты люд-народ) па-сапраўднаму заявіў пра сваё (ці, можа, лепш: яго – люду) існаванне.

Выявілася гэта ў пашырэнні не толькі беларускамоўных рукапісных тэкстаў (*Тарас на Парнасе, Гутарка Данілы са Сцяпанам, Вясна, голад, перапала…, Два д’яблы*, твораў А. Вярыгі-Дарэўскага, Г. Марцінкевіча, І. Мігановіча і інш.), але і першых беларускіх друкаваных выданняў (*Hapon: powieść białoruska, z prawdziwego zdarzenia, w języku białoruskiego ludu napisana*, *Wieczernice i Obłąkany* і інш. В. Дуніна-Марцінкевіча).

Беларускамоўная літаратура гэтага часу ў асноўным закранала сацыяльную праблематыку: дачыненні селяніна з панам: “Іх (літаратараў. – *М. Х.*) грамадскі ідэал – **патрыярхальныя адносіны** (вылучэнне А. Навіны [псеўданім А. Луцкевіча]. – *М. Х.*) між дваром і вёскай, апека двара над сялянамі. Дзеля гэтага яны вымагаюць ад кожнага пана, каб ён быў добры для сваіх падданых” [18, с. 10]. У сувязі з чуткамі пра рэформу гэтыя патрыярхальныя адносіны часам набывалі востры сацыяльны характар. Аднак ніколі ў беларускамоўных тэкстах не закраналася нацыянальная праблематыка; мы не ведаем твораў, у якіх аўтары спрабавалі б звярнуцца да селяніна з мэтай абуджэння ягонае нацыянальнае свядомасці, сцвярджэння ягонае нацыянальнае годнасці. Ці не таму, што люд знаходзіўся на той ступені “тутэйшасці”, якой яшчэ рана было трансфармавацца ў “ліцвінскасць” ці “беларускасць”? І гэта нягледзячы на тое, што існаваў у тыя 1850-я гг. у грамадстве г. зв. “адукаваны клас”, які складаўся не толькі з прадстаўнікоў шляхты, але і з сялянства. Аднак тут трэба браць пад увагу тое, што “адукаваны клас” ад самага пачатку панавання на беларускіх землях Расейскае імперыі дзяліўся паводле рэлігійнае прыкметы на “праваслаўных-рускіх” (доўгі час не расейцаў, а менавіта рускіх) і “католікаў-палякаў”. Зацятая барацьба ідэалогій гэтых двух групаў практычна не давала магчымасці нарадзіцца трэцяй, уласна беларускай. Калі ж улічыць, што ў межах ідэалогіі “католікаў-палякаў” выяўляліся і “правінцыйна-ліцвінскія” сепаратыстычныя тэндэнцыі, то сітуацыя з тагачаснай беларускасцю яшчэ больш ускладнялася.

На пачатку 1990-х гг. А. Каўка прапанаваў даволі перспектыўную (з нашага пункту гледжання) канцэпцыю падзелу беларускага нацыянальнага руху на два этапы: “Пачаткова-падсвядомага руху «ў сабе», здзейсненага пераважна ў рам-

ках польскага нацыянальна-вызваленчага працэсу (1794–1863), і руху «для сябе», усведамленнем уласна беларускіх нацыянальных інтарэсаў і канчатковай мэты – адраджэння беларускае дзяржаўнасці (1863–1918)" [14, с. 445].

Шмат якія сучасныя гісторыкі і гісторыкі літаратуры, пераносячы сённяшнія катэгорыі мыслення ў тагачасныя грамадскія рэаліі і ігнаруючы рэальны стан самасвядомасці ў грамадстве 1850-х гг., адназначна залічаюць усю шляхту і літаратараў, што паходзілі з яе, да польскае нацыі. Прычым не толькі "нацыі палітычнае" (што часткова адпавядала праўдзе), а нацыі ў разуменні дыскурсу XX стагоддзя.

Адукаваны клас, сам не маючы беларускай самасвядомасці, не мог яе пераказаць і сялянству. Зрэшты, шмат якім прадстаўнікам гэтага класу больш залежала на прышчапленні сялянству палітычнае свядомасці. Характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца ліст патрыёта-рэвалюцыянера (падпісаны "Гот") ад 29 кастрычніка 1861 г. з мястэчка Смаргонь Ашмянскага павета студэнту Маскоўскага ўніверсітэта Зянону (?) Сушчыцкаму[1]: "Многие из господ, не ослепленных предрассудками, ясно видят, что между ними и мужиками у нас бездна, которую закрыть может одна резня. Несчастная наша Литва с этим невежеством, с этим православием, с этой белорусской речью, со всем тем, что привело все наши сословия в фальшивое положение. В настоящую минуту мы в такой фазе, что какое ни берет огромное влияние пропаганда между чиновным людом, эгоизм между помещиками все тот же… и оттого ни сверху, от господ, нам нельзя ожидать поддержки, ни снизу, от народа, мы не знаем, как ее получить" [20, с. 281].

"Гот", ацэньваючы палітычны стан у Літве і заклікаючы да адзінства з расейскімі рэвалюцыянерамі, не ведаў, як атрымаць падтрымку народа. Відаць, немалою перашкодаю з'яўлялася тут "православие" і "белорусская речь", а таксама тое, што "царь что-то вроде божества в глазах у мужика – неисповедимый, правдивый и даже святой" [20, с. 280]. У асяроддзі моладзі дэмакратычнай і сацыялістычнай (чырвонай) арыентацыі месца на беларускі нацыянальны дыскурс не знаходзілася. А таму не зусім карэктнымі з'яўляюцца папрокі А. Навіны па адрасе "нашых прадвесьнікаў адраджэньня зь сярэдзіны XIX ст.", якія, аказваецца, "грашылі часам" "нацыянальным шавінізмам" і "нацыянальнай нянавісцю" [17, с. 89].

Беларускі нацыянальны дыскурс не нарадзіўся ў мастацкіх тэкстах 1850-х гадоў. Не было яго[2] і ў агітацыйна-публіцыстычных тэкстах 1860–1863 гадоў. Замест беларускага, поруч з дэмакратычным і сацыяльным, з'явіўся "рэчыпаспалітаўскі", ці проста "польскі". У 1864 г., будучы ўжо "пад шубеніцай", К. Каліноўскі назаве яго так: "polskoje dzieło", дадаючы: "heto nasze dzieło, heto wolności dzieło" [1, s. 332].

Якая яшчэ нацыянальная ідэалогія, апрача "рэчыпаспалітаўскай/польскай", магла пашырацца ў перадпаўстанцкія гады і ў часе Паўстання? Беларуская? Дык беларуская ідэя адно толькі-толькі пачынала выяўляць сябе як прывязанасць-прыхільнасць да свайго роднага кутка, Бацькаўшчыны, Літвы-Беларусі. Цягам першае паловы XIX ст. яна пакутліва нараджалася і не паспела заняць прыкметнага месца ў грамадска-палітычным жыцці краю. Толькі ў часе Паўстання

[1] Арыгінал ліста невядомы. У справе (ГАРФ, ф. 109, СА, оп. 2, д. 309) захоўваецца толькі выпіска з перлюстраванага ліста ў расейскім перакладзе. Зянон Сушчыцкі згад-ваецца ў даносах царскага агента Ю. Балашэвіча. [20, с. 281].

[2] Як выключэнне – *Маніфест аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы да беларусаў*, у якім заклік, што "zo dnia objaulenia hetoho Manichwestu usie rauny, usie syny odnoj Polszczy Ojczyzny naszej", звернуты не проста да мужыкоў, а да беларусаў: "Braty Bialorusy, przyszła pora dobraja". Можа, з гэтай прычыны А. Янулайціс называе яго *Aukso gromata Gudas* (*Залатая грамата беларусам*). [6, s. 224–225; 10].

беларуская ідэя (хутчэй, “правінцыйная, ліцвінска-беларуская”) сталася асноваю дзейнасці К. Каліноўскага і асобных яго аднадумцаў. Дзеля паўнавартаснага станаўлення і развіцця “правінцыйнай, ліцвінска-беларускай” ідэі не хапіла часу. Яна, непрызнаная і ў штыкі ўспрынятая Варшаваю, мусіла загінуць пад гарматамі шматтысячнага царскага войска, дубінамі нацкаванага расейскаю прапагандаю сялянства і на мураўёўскіх шыбеніцах.

У выніку мы не маем іншых беларускамоўных тэкстаў Паўстання, апрача тых, у якіх даводзілася, “że tylko od Rzeczypospolitej polskiej dostanie [lud litewski] «ziemię i wolność»” [11, s. 444]. “Прапольскасць” дадзеных тэкстаў тлумачыцца як салідарызацыя з Варшаваю дзеля агульнае перамогі і дзеля агульнае вольнасці; “прапольскасць” яшчэ і таму, што замяніць яе амаль невядомаю нікому “беларускасцю” не было аніякае магчымасці. К. Каліноўскі разумеў, што і ў недалёкай перспектыве зрабіць гэта не атрымаецца. Дык у сваім развітальным лісце горача раіць: “Dla toho Narodzie, jak tolko kali paczujesz, szto braty twaje s pad Warszawy biuć sa za praudu i swabodu, tahdy i ty nie astawajsa s zadu, no uchapiuszy za szto zmożesz, za kosu, sakieru, cełoj hramadoj idzi wajawaci za swoje czeławieczoje i narodnoje prawo, za swaju ziemlu radnuju. Bo ja tabie s pad szubienicy każu Narodzie, szto tahdy tolko zażywiesz szczaśliwo kali nad taboju Maskala uże nie budzie” [9, k. 58–59].

Не разумелі (ці не хацелі разумець) “прапольскасць” беларускамоўных тэкстаў Паўстання амаль усе расейскія даследнікі, пераважная большасць беларускіх савецкіх навукоўцаў, а таксама сучасныя беларускія публіцысты прарасейскае скіраванасці. Для іх паэтычныя і празаічныя творы Паўстання – супярэчлівыя, тэндэнцыйныя і нават антыбеларускія. Яны не заўважалі і не заўважаюць, што нараджэнне беларускае нацыі ў значнай ступені абумоўлена Паўстаннем 1863 года. І гэтае нараджэнне мусіла прайсці этап, калі хоць і спявалі ды чыталі пра Польшчу, але спявалі і чыталі па-беларуску. Не трансфармаваўшы “тутэйшасць” у “беларускасць”, Паўстанне 1863 г. кананізавала друкаванае беларускае слова, беларускую мову.

Адным з такіх твораў Паўстання была гутарка *Kryúda i praúda*, адбітая літаграфічным спосабам, думаецца, у Пецярбурзе. Яна, пэўна, пашыралася сярод беларускага насельніцтва, але ў адрозненне ад іншых агітацыйных тэкстаў Паўстання не трапіла ў рукі жандараў. З гэтай прычыны яе няма ні ў судова-следчых справах, ні ў справах III аддзялення ці канцылярыі міністра П. Валуева. Аднак здарыўся цуд: ажно два асобнікі выдання захаваліся і дайшлі да нашага часу. Навукоўцы ведалі пра іх існаванне. Першы, здаецца, Я. Карскі выкарыстаў асобнік са славянскага аддзела Расейскае акадэміі навук, дакладна занатаваўшы тытул і апісаўшы выданне: *Kryŭda i Praŭda. Hutarka Biłaruskaja* (sic!). F. Pczycki. 1863 r. Гектографированная брошюра (8°мал., 11 стр.). (Библіотеки Росс. Акад. Н. Слав. Отд. XXV*, 35б 29)” [13, с. 89].

Ужо на пачатку XX ст. мелася магчымасць усебакова прааналізаваць тэкст, высветліць асобу аўтара, прозвішча якога было пазначанае на вокладцы. Аднак не толькі Я. Карскі, але і пазнейшыя даследнікі не маглі даць веры, што аўтар адважыўся паставіць сваё імя на кніжцы антыцарскага зместу, дык лічылі, што Ф. Пчыцкі – гэта ягоны псеўданім [15, с. 303].

Ф. Пчыцкі ўсё ж існаваў. Сведчаннем мог быць расейскамоўны верш *Францу Пчицкому*, напісаны Я. фон Краўзэ [22, с. 157–160]. Апрача таго, у трэцім томе *Bibliografii polskiej XIX stólecia* К. Эстрайхера ў слоўнікавым артыкуле “P…..ki F(ranciszek)” маецца наступны запіс: *Ojczyzna, czyli ziemia, niebo i piekło*. Przez

F. P.[1] Paryż, druk L. Martineta, 1861, w 8ce, str. 32” [2, s. 337]. Відавочна, складальнік бібліяграфіі ведаў, хто хаваўся пад крыптанімам, але чамусьці не расшыфраваў яго цалкам. Праўда, на старонцы 366 гэтага ж тома з’яўляецца запіс, у якім называецца прозвішча аўтара не толькі кіеўскага, але і парыжскага выданняў: “Pczycki Franciszek, *W dzień imienin Ludw. Korzeniowskiego*, (wiersz, po polsk. i po rossyj.) Kiew 1870, w 8ce, str. 15. – *Ob. P. Fr.*[2]” [2, s. 366].

Парыжскае выданне кніжкі Ф. Пчыцкага чамусьці трапіла і ў дадатковыя тамы *Bibliografii polskiej (Lata 1881–1900)*, якую Эстрайхеры (спачатку Караль, а пасля ягоны сын Станіслаў) выдавалі з 1906 г. Цяпер яно занатаванае ў слоўнікавым артыкуле “Pczycki F.”: “*Ojczyzna czyli ziemia, niebo i piekło*. Paryż, 1861, 8, str. 30” [3, s. 356].

Нам удалося выявіць толькі парыжскае 1861 г. выданне Ф. Пчыцкага, што захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве [4, s. 3–4]. Яно, дарэчы, можа пацвердзіць нашую расшыфроўку вобраза тае музы Ф. Пчыцкага, якая, як даводзіць Я. Краўзэ, з’яўляецца царыцаю “роскошныхъ думъ” “певца Сарматов”.

Факт, што паэма *Ojczyzna*… выйшла ў Парыжы ў выдавецтве L. Martinet, у якім друкаваліся кнігі эмігрантаў-літаратараў (напрыклад, у 1860–1861 гг. тут выйшлі ў свет *Pisma* А. Міцкевіча ў адзінаццаці тамах), можа быць сведчаннем, што Ф. Пчыцкі калі не жыў у той час у Францыі, дык меў добрыя дачыненні з польскім патрыятычным асяродкам за мяжою.

Зрэшты, цяпер дакладна вядома, што на пачатку 1860-х гг. паэт жыў у Пецярбурзе і яго з мая 1863 г. па май 1864 г. шукала паліцыя з тае прычыны, што ён “навлекаетъ на себя подозрѣніе въ политическомъ отношеніи”. Уладам было вядома, “что Пчицкій[3] ѣздилъ въ Гродненскую губернію и назвавъ себя Янки, говорилъ крестьянамъ возмутительные рѣчи, въ слѣдствіе сего, его тамъ разыскивали, но онъ успѣлъ скрыться”. Гродзенская губернская адміністрацыя, аднак, не здолела пацвердзіць звесткі пецярбургскага паліцмайстара [23, с. 351–354]. Магчыма, усё ж, крыху пазней Ф. Пчыцкага ўлады знайшлі (матэрыялы могуць захоўвацца ў архіве пецярбургскай паліцыі), але – дапускаем – паліцыі не ўдалося давесці нядобранадзейнасць паэта. Бо, як сведчыць адрасная кніга Пецярбурга, у 1867 г. ён, “Пчицкій Францъ Антоновъ”, жыў у паўночнай сталіцы імперыі па адрасе “Канонерская ул. д. 10, кв. 19” [12, с. 394.], г. зн., не быў высланы.

Цікава адзначыць і тое, што ў гэтай самай адраснай кнізе зафіксаваны і “Корженевскій Людвигъ Осиповъ. Рожд. ул. д. 25, кв. 8. Лекарь ортопедич.” [12, с. 244]. Магчыма, той самы, каго з імянінамі ў 1870 г. віншаваў вершам Ф. Пчыцкі. Звяртаем таксама ўвагу і на тое, што прыяцелі паэта (Я. Краўзэ і Л. Кажанёўскі) былі лекарамі, а г. зн., што і ён мог таксама мець медыцынскую адукацыю.

Беларускія літаратуразнаўцы і кнігазнаўцы XX ст., здаецца, не мелі магчымасці пазнаёміцца з “пецярбургскім” асобнікам кніжачкі *Kryúda i praúda*, бо ў савецкі час Славянскі аддзел Расейскае акадэміі навук быў зачынены, а інфармацыя пра зборы Славянскага аддзела ў агульны каталог бібліятэкі не трапіла. І толькі ў 2002 г. А. Камісарава дэталёва апісала беларускія выданні XIX ст. (у тым ліку і літаграфію Ф. Пчыцкага), якія знаходзіліся колісь у славянскім аддзеле: “Пчыцкі Ф. *Kryūda i Praūda: Hutarka biełaruskaja* (sic!) / F. Pczycki, – Б. м., 1863, – [1], 11 с. Тит. л. и текст написаны от руки и литографированы.

[1] Насамрэч – *F… P…*

[2] Усё ж не *P. Fr.*, а *P…..ki F(ranciszek)*.

[3] У дакументе пазначана, што ён жыве ў Пецярбурзе, што ён “Виленскій дворянинъ” і што ён “Францъ Антоновъ”.

XXV*/б 53. Штамп и экслибрис библиотеки И. А. Бодуэна дэ Куртенэ. На тит. л. запись: «(Od Witolda Jodki Narkiewicza.) Głupstwo kapitalne!»[1]. В конце текста запись: «Ерунда, белиберда, сапоги всмятку»" [16, с. 227].

Відавочна, І. Бадуэн дэ Куртэнэ (1845–1929), які актыўна вывучаў славянскія мовы і дыялекты, атрымаў "*Hutarku biłaruskuju*" ад аднаго Ёдкаў-Наркевічаў: ці то бацькі, ці то сына (абодвух звалі Вітольд). Хутчэй, ад бацькі. В. Ёдка-Наркевіч (1834–1898), які паходзіў са Случыны (маёнтак Бабоўня), быў вядомым лекарам-акулістам, дацэнтам Варшаўскае галоўнае школы (1862–1869)[2]. З малодшым В. Ёдкам-Наркевічам [1864–1924] расейскі навуковец-славіст мог пазнаёміцца ў Дэрпцкім універсітэце ў 1885 г. Першы вывучаў тут медыцыну, а другі працаваў у якасці прафесара.

Якім чынам беларускамоўная кніжка трапіла да В. Ёдкі-Наркевіча мы можам толькі здагадвацца. Але не прымаем версію, што здарылася гэта выпадкова пад час распаўсюджвання гутаркі ў 1863 г., скажам, на Случчыне. З тае прычыны, што на вокладцы выдання маецца прозвішча аўтара. Бо лічым: адмысловую вокладку Ф. Пчыцкі зрабіў толькі для асобнікаў, якія не прызначаліся для чужых людзей. Такім чынам, у Славянскім фондзе БАН захоўваецца ці то ўласны асобнік Ф. Пчыцкага, ці то адзін з адбітых для сяброў. Зважаючы на тое, што В. Ёдка-Наркевіч ужо трэці медык у коле прыяцеляў Ф. Пчыцкага, можна меркаваць, што ўсе яны вучыліся ў Імператарскай медыка-хірургічнай акадэміі ў Пецярбурзе ў 1850-я гг. ці нават на пачатку 1860-х[3].

У адрозненне ад іншых беларускамоўных тэкстаў Паўстання, "*Hutarka biłaruskaja*" *Kryúda i praúda* мае аўтара. Мала таго, што Ф. Пчыцкі свае агітацыйныя творы пазначаў крыптанімам F. P., дык на пэўнай, невядомай сёння колькасці асобнікаў падаў прозвішча поўнасцю. Цяжка сказаць: была гэта проста маладая смеласць і прага славы ці нешта яшчэ іншае.

У 2013 г. *Kryŭdu i Praŭdu* паводле асобніка БАН апублікаваў Ю. Лабынцаў [19, с. 205–213]. Параўноваючы апублікаваны ім тэкст з тэкстам літаграфіі, якая захоўваецца ў бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта, мы звярнулі ўвагу на вялікую (блізу 100) колькасць адрозненняў. Праўда, яны пераважна неістотныя: знакі прыпынку, ужыванне літары ***z*** і ***ż***, ***u*** і ***ŭ***, ***o*** і ***a*** і інш. Атрымаць копію асобніка нам не ўдалося: служба ЭДД БАН адмовіла, бо "брошюра опубликована в материале Лабынцева Ю.", а вядомы гісторык культуры страціў свае матэрыялы "в момент внутриинститутского переезда". Улічваючы тое, што публікацыі Ю. Лабынцава заўсёды вызначаліся дакладнасцю, мы мяркуем, што "Hutarka Biłaruskaja" расчытая ім правільна. Дык маем падставы дапусціць: Ф. Пчыцкі двойчы літаграфаваў свой тэкст. Тым больш, што на тытульным аркушы выдання, якое захоўваецца ў Пецярбурзе, ёсць імя і прозвішча аўтара, а вось на кракаўскім – толькі ініцыялы. Цікава яшчэ і тое, што яшчэ Л. Бэндэ пазначыў у сваёй копіі (захоўваецца ў БДАЛіМ, 66-1-619, а. 13): тэкст пецярбурскае "гутаркі" займае 11 старонак. А мы ведаем, што тэкст "кракаўскае" – 12.

Другі асобнік кніжачкі Ф. Пчыцкага *Kryúda i praúda* захаваўся ў Аддзеле адмысловых збораў Навуковай бібліятэкі Польскае акадэміі навук у Кракаве.

[1] Польскамоўны запіс, відавочна, належыць І. Бадуэн дэ Куртэнэ. Расейскамоўны мог з'явіцца пазней, калі "Hutarka biłaruskaja" знаходзілася ў Славянскім аддзеле РАН.

[2] Якраз у гэты час І. Бадуэн дэ Куртэнэ навучаўся ў Варшаўскай галоўнай школе на філалагічна-гістарычным факультэце.

[3] Відавочна, да мая 1863 г. Ф. Пчыцкі ўжо не лічыўся студэнтам. Інакш у паліцэйскім паведамленні гэта было б адзначана. Зрэшты, паліцыя магла і не мець інфармацыі пра род заняткаў падазраванага.

Як паведамляецца ў *Каталогу рукапісаў бібліятэкі*, у 1956 г. “wiersze treści politycznej podpisane kryptonimem F. P.” былі “wydzielone z zasobu druków” [7, s. 83], перанесены ў аддзел рукапісаў, дзе закаталагізаваныя пад нумарам (sygnaturą) 3847[1]. Відавочна, першапачаткова кніжачка Ф. Пчыцкага захоўвалася ў кнігазборы Кракаўскага таварыства ведаў (да 1872 г.)[2] і Акадэміі ведаў (з 1919 г. – Польскай акадэміі ведаў). А вось супрацоўнікі бібліятэкі навастворанага аддзела ПАН у Кракаве палічылі выданне “*Hutarki biłaruskaje*” рукапісам, апісалі яго ў адпаведнасці з тагачаснымі патрабаваннямі: а менавіта, падалі мову (białoruski), дату ўзнікнення рукапісу (1863), фармат (17,5x11,5), колькасць аркушаў (s. 12) і “szczegóły dotyczące oprawy” (p[ó]łpł[ó]t[no])[3], але чамусьці не пазначылі, што гэта літаграфія.

Упершыню ў навуковы ўжытак кракаўскі асобнік увёў Я. Янушкевіч[4]: “На вокладцы <…> ацалела адно слова *Kryūda*, выразна напісанае залатымі літарамі на чорнай скуры «корешка». Ці то гэта назва першапачатковая, ці то слова «праўда» зацёрлася – не ведаю. Кніжачку цяжка назваць кнігай, а тым больш зборнікам, хоць на тытульным лісце, як і належыць, красуецца Пецярбург, 1863. Выданне танюткае – адна вокладка” [26, с. 87].

Фрагменты “*Hutarki biłaruskaj*” друкаваліся ў трэцяй частцы трэцяга тома *Бѣлорусовъ* Я. Карскага (23 радкі) і ў названай вышэй кніжцы Я. Янушкевіча (72 радкі). У нашых публікацыях твор падаваўся цалкам (220 радкоў) [21, с. 40–43; 24, с. 86–105; 25, с. 614–618]. Аднак з-за частковай адаптацыі, а таксама шэрагу недакладнасцяў аніводную ранейшую публікацыю не выпадае назваць навуковаю.

ЛІТАРАТУРА

1. Do ludu białoruskiego: Pismo z pod szubienicy Konstantego Kalinowskiego // Giller A., Historia powstania narodu polskiego w 1863–1864 r. – t. I. – Paryż, 1867. – s. 332.
2. *Estreicher, K.* Bibliografia polska XIX stulecia, t. III (Ł–Q) / K. Estreicher. – Kraków, 1876. – s. 337.
3. *Estreicher, K.* Bibliografia polska XIX stulecia: Lata 1881–1900: t. III (L–Q) / K. Estreicher. // – Kraków, 1911. – s. 356.
4. *F… P…,* Ojczyzna czyli ziemia, niebo i piekło / F… P…. – Paryż, 1861. – s. 3–4.
5. *Groza, A.* List do M. Grabowskiego / A. Groza. // Gr…ski M., Korrespondencija literacka. – Wilno, 1842. – t. I – s. 26.
6. *Janulaitis, A.* Spausdintieji ir nespausdintieji 1863–64 m. sukiłimo raštai / A. Janulaitis // „Karo Archyvas”. – t. 1. – Kaunas, 192. – s. 224–225.
7. Katalog rękopisów Biblioteki PAN w Krakowie: Sygnatury 3607–4003. – Wrocław-Warszawa-Kraków, 1976. – s. 83.
8. Kryúda i Praúda: Hutarka biłaruskaja, F. P., Petersburg 1863 // Biblioteka Naukowa PAU i PAN w Krakowie: Dział Zbiorów Specjalnych, sygn. 3847, 11 s.
9. Materiały do dziejów powstania styczniowego na Litwie // Biblioteka Narodowa, sygn. 7827 II, k. 58–59.
10. Prykaz ad Rądu Polskaho nad celym Krajem Litouskim i Biełoruskim da Narodu ziemli Litouskoj i Biełoruskoj [y:] 1863 г. Чэрвеня 11: Прыказ ад ронду польскага да народу зямлі літоўскай і бела-рускай Рэжым доступу : http://kalinouski.arkushy.by/archives/prykaz.htm. – Дата доступу : 10.02.2020.
11. *Szwarce, B.I.* Założenie Komitetu Centralnego w r. 1862 / B. I. Szwarce. // W czterdziestą rocznicę Powstania Styczniowego. 1863–1903. – Lwów, 1903. – s. 444.
12. Всеобщая адресная книга С.-Петербурга, съ Васильевскимъ островомъ, Петербургскою и Выборгскою сторонами и Охотою, С.-Петербургъ 1867–68, с. 394.
13. *Карскій, Е.* Бѣлорусы, т. III: / Е. Карскій // Очерки словесности бѣлорускаго племени, ч. 3: Художественная литература на народномъ языкѣ. – Петроградъ 1922, с. 89.

[1] Відаць, гэты нумар быў нададзены кніжцы Ф. Пчыцкага раней. Цікава, што пад нумарам 3846 занатаванае наступнае друкаванае, але з рукапіснымі нататкамі ўкраінскае выданне: “Lwowjanyn. Pryrucznyj i gospodarskyj mesjacołow na rok zwyczajnyj 1863”. Яно таксама было перанесенае “z zasobu druków”.

[2] Вядома, калі яна трапіла ў Кракаў да 1872 г.

[3] Паўпалатном называлі такую аправу (пераплёт), у якой карэньчык пакрываўся палатном, а вокладкі рабіліся з таннейшага матэрыялу, напрыклад, з паперы.

[4] Як сведчыць г. зв. *metryczka*, з кніжачкаю Ф. Пчыцкага яшчэ ў 1970-я гг. знаёміліся Л. Малаш і У. Казберук.

14. *Каўка, А.* Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух / А. Каўка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 т. – т. 1. – Мінск, 1993. – с. 445.
15. *Кісялёў, Г.* Агітацыйная публіцыстыка 1860-х гадоў / Г. Кісялёў // Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў у двух тамах. – т. 2: Новая літаратура: другая палова XVIII–XIX стагоддзе. – Мінск, 2007. – с. 303.
16. *Комисаров, Е. В.* Редкие белорусские издания XIX в. в Славянском фонде / Е. В. Комисаров БАН // Белорусский сборник: Статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. – вып. 2. – С.-П., 2002. – с. 227.
17. *Луцкевіч, А.* Выбраныя творы: Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / А. Луцкевич. – Мінск, 2006. – с. 89.
18. *Навіна, А.* Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры / А. Навіна. – Вільня, – 1921. – с. 10.
19. Польская агитационная «hutarka» 1863 г. и ее оценка Я.И.Н. Бодуэном де Куртенэ // Amicus Poloniae: Памяти Виктора Хорева, М. : Индрик, 2013. – с. 205–213.
20. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.: Материалы и документы, М., 1964. – с. 281.
21. *Хаўстовіч, М.* XIX стагоддзе / М. Хаўстовіч. – Навукова-літаратурны альманах. – кн. 1. – Мінск, 1999. – с. 40–43.
22. *Хаўстовіч, М.* Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў / М. Хаў-стовіч. – Творы невядомых аўтараў. Том 2. – Варшава, 2016. – с. 157–160.
23. *Хаўстовіч, М.* Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX стагоддзя / М. Хаўстовіч. – Том 6 : Беларускія тэксты Паўстання 1863 года. – Варшава, 2020. – с. 351–354.
24. *Хаўстовіч, М.* «Цяпер маскаль пяе мудрагелікі свае» / М. Хаўстовіч // Спадчына – 1999. – № 5–6. – с. 86–105.
25. *Хаўстовіч, М.* Шляхамі да беларускасці / М. Хаўстовіч // Нарысы, артыкулы, эсэ = Szlakami ku białoruskości: Szkice, artykuły, eseje. – Варшава, 2010. – с. 614–618.
26. *Янушкевіч, Я.* У прадчуванні знаходак: З адной вандроўкі ў архівы Варшавы, Вроцлава, Кракава / Я. Янушкевіч. – Мінск, 1994. – с. 87.

УДК 82(476)

М. М. Хмяльніцкі (Мінск)

МАТЫЎ МЯЖЫ Ў ПРАЗАІЧНЫХ ТВОРАХ СЯРГЕЯ ПЯСЕЦКАГА І ПЕТРУСЯ БРОЎКІ: КАМПАРАТЫЎНЫ АСПЕКТ

Рыжская дамова, падпісаная ў 1921 г., стала прычынай раздзялення беларускага народа, сем'яў, прыўнесла новыя ідэалагічныя, філасофскія, ідэйна-тэматычныя аспекты ў мастацтва і літаратуру. Матыў мяжы, тэма кантрабандысцкага жыцця па абодва бакі суседніх дзяржаў атрымалі шматаспектнае ўвасабленне як у польскай (С. Пясецкі, М. Ваньковіч, З. Налкоўская, Р. Капусцінскі і інш.), так і ў беларускай (Я. Купала, П. Броўка, К. Крапіва, З. Бядуля, К. Чорны, В. Быкаў і інш.) літаратурах XX стагоддзя. У якасці аб'екта даследавання звернемся да выбраных празаічных твораў С. Пясецкага і П. Броўкі.

Імя Сяргея Пясецкага (Sergiusz Piasecki, 1901–1964), колішняга намінанта на Нобелеўскую прэмію, ураджэнца Ляхавіч, у апошнія дзесяцігоддзі ўпэўнена вяртаецца на яго радзіму – у Беларусь. Першыя творы гэтага аўтара – «Пяты этап» («Piąty etap», 1937), «Каханак Вялікай Мядзведзіцы» («Kochanek Wielkiej Niedźwedzicy», 1937), «Багам ночы роўныя» («Bogom nocy równi», 1938) – прынеслі яму неспадзяванае, але заслужанае прызнанне ў Польшчы і іншых краінах Еўропы. На сённяшні дзень амаль усе творы С. Пясецкага перакладзены на беларускую і рускую мовы, карыстаючыся выключным попытам у айчыннага чытача.

С. Пясецкі – чалавек незвычайнага лёсу: ён быў сведкам Першай сусветнай вайны, удзельнікам рэвалюцыйных патрасенняў у Расіі, польска-савецкага ваеннага супрацьстаяння. Пасля заключэння Рыжскага пагаднення будучы пісьменнік апынуўся ў Польшчы, на некаторы час асеў у прымежным Ракаве і стаў зарабляць на хлеб надзённы кантрабандай, шмат разоў пераходзячы з рызыкай для жыцця дзяржаўную мяжу. Уражанні ад такіх небяспечных падарожжаў пасля

лягуць у аснову яго твораў 1930-х гг., якія будуць напісаны за кратамі польскай турмы. Сучасны чытач крок за крокам разам з галоўнымі героямі раманаў Пясецкага зможа выпрабаваць, пераадольваючы тагачасную савецка-польскую мяжу, свае сілу волі і мужнасць.

Сімвалічны сэнс назваў твораў С. Пясецкага 1930-х гг. відавочны: асноўныя падзеі ў іх адбываюцца менавіта ўночы, а «*начныя багі*» савецка-польскай мяжы праяўляюць сябе не толькі вопытнымі кантрабандыстамі, рызыкоўнымі агентамі спецслужб, але і яскравымі індывідуальнасцямі, бясстрашнымі людзьмі, выратавальным святлом якім дапамагае сузор'е Вялікай Мядзведзіцы. Аўтабіяграфічны герой С. Пясецкага, кантрабандыст, шпіён, стыхійны філосаф, звяртае ўвагу і на рамантычны бок падзей і з'яў. Ключавы вобраз-сімвал Вялікай Мядзведзіцы вызначае асноўную сюжэтную лінію першага надрукаванага твора польскага пісьменніка: «*Апынуўшыся ў чыстым полі, пачаў разглядаць неба. Яго большую палову зацягнулі хмары, аднак на другой палове ўбачыў сузор'е (як пасля даведаўся ад Петруся Філосафа) Вялікага Воза, або Вялікай Мядзведзіцы. На цёмным фоне неба мігцела сем вялікіх зорак, і я, стаіўшы ўздых, доўга ўзіраўся на іх з радасцю, якая распінала мае грудзі. Прыгадаліся Юзікавы словы: "Калі за намі пагоняцца і разаб'юць групу, дык трымайся так, каб гэтыя зоркі былі заўсёды ў цябе з правага боку. Куды не пойдзеш, заўсёды выйдзеш на граніцу!"*» [2, с. 43].

Пісьменнік, добра ведаючы знутры дзве дзяржаўныя сістэмы, вачыма аднаго з герояў – Рамана Забавы – часта параўноўвае тагачасныя савецкія і польскія рэаліі. Падкрэслім, што ў творах С. Пясецкага не ўзнікае апазіцыі польскае/беларускае (у пісьменніка для такога палітычнага супрацьпастаўлення не было падстаў), а параўнанне амаль заўсёды ідзе па лініі польскае/савецкае: «*Цягнікі, цягнікі, цягнікі… Вагоны, вагоны, вагоны… Тут– горы чамаданаў. Там – горы мяшкоў. Тут у буфеце – абеды, апельсіны, шакалад. Там – зафарбаваная гарбата з содай, засалоджаная сахарынам (у 280 разоў саладзейшы за цукар). Тут – бліскучыя паркеты, цэнтральнае ацяпленне, патокі святла. Там – запляваныя падлогі, пакрытыя дываном сіецця, сабачы холад, лямпы, якія капцяць. Тут – парфумы, шоўк, панчохі на нагах жанчын. Там – смурод брудных залатаных кажухоў, махоркі і дзёгцю, лапці або апоркі на нагах, пудра таксама блакітная, шэрая і жоўтая: пудра голаду і галечы на тварах грамадзян, якія асуджаныя на тое, каб жыць і памерці ў пакутах. Тут – вясёлыя крыкі, смех дзяцей. Там – нахабныя галасы і самыя агідныя на свеце нецэнзурныя словы, рык улады ўсялякага калібру і спалоханыя погляды пасажыраў*» [4, с. 58]

Своеасаблівай воссю мастацкай прасторы ў раманах С. Пясецкага 1930-х гг. з'явілася ўсталяваная дзяржаўная мяжа паміж Польшчай і СССР. Сам аўтар, як і многія героі яго твораў, – гэта рэальныя асобы, тыя, хто, апынуўшыся на памежнай тэрыторыі, стаў на шлях кантрабандыстаў, атрымаў выключную магчымасць для заробку.

У раманах С. Пясецкага шмат эпізодаў самым непасрэдным чынам звязана з дзяржаўнай мяжой, якая стала сінонімам небяспекі, драматычнасці, выпрабаваннем сілы духу, вынослівасці, маральна-этычнай загартаванасці; гэта яшчэ і шчаслівы выпадак, гульня, дзе стаўка вельмі высокая – жыццё або смерць. Асаблівай дакладнасцю ў творах С. Пясецкага вызначаецца апісанне памежнай прасторы Мінск – Ракаў: аўтар згадвае рэальныя назвы вёсак і мястэчак, падае канкрэтныя лічбы вёрстаў альбо нават колькасць крокаў у вызначэнні месца

знаходжання таго ці іншага хутара, тракта, лесу, ракі і г.д., скрупулёзна ўзнаўляе тагачасныя рэаліі польска-савецкай мяжы: «*З Мінска Раман рушыў у дарогу да граніцы папаўдні, хочучы прайсці яе як мага раней. Вельмі баяўся, што ўначы зноў заблудзіцца, бо зваротнай дарогі не ведаў. Вырашыў ісці трактам як мага далей, а потым пачакаць да змяркання і ісці лесам збоку дарогі аж да граніцы <…> Дарога ў Ракаў добра ахоўвалася, паколькі была найкарацейшым злучэннем паміж Мінскам і граніцай. Прадмесце пільнавалі пасты міліцыі і НК, а далей пільнавалі “заградительные отряды”. Каб дабрацца з Ракава ў Мінск, трэба было перайсці сапраўдную граніцу, а потым другую гранічную лінію. Паміж тымі граніцамі кружылі пешыя і конныя сувязныя патрулі. Апрача таго, у некаторых пунктах рабілі засады, пускалі часам дрэсіраваных сабак. Далей шырокім поясам валакліся кавалерыйскія патрулі. “Особые посты” пільнавалі важныя пункты. Дадатковую працу ў тылах вяла мытня*» [4, с. 24–25]. Сапраўды, героі С. Пясецкага не раз даказваюць, што пазнаванне мяжы – складаны і небяспечны занятак, авалодаць якім можа не кожны.

Падзейны змест рамана «Каханак Вялікай Мядзведзіцы» самым непасрэдным чынам звязаны з памежным хранатопам: твор згадкай пра яго пачынаецца і заканчваецца. Нават эпіграф да першага раздзела (зрэшты, як і да некаторых іншых) узяты з песень кантрабандыстаў і ўтрымлівае канцэпт «*мяжа*»:

Na granicy deszcz obmyje,
A słonko wysuszy;
Las od kuli ukryje,
Kroki wietr zogłuszy
(Z piosenki przemytników) [6, с. 13]

***

Granica nakarmi,
Granica napoi,
Granica pocieszy,
Granica wystroi! [6, с. 97]

У гэты складаны час ствараўся «*памежны*» фальклор, часцей баладнага гучання, бо савецка-польская мяжа займала не апошняе месца ў жыцці насельніцтва: тут паміралі, багацелі, здраджвалі, кахалі, гублялі сваякоў, сяброў, але ўсё роўна ішлі, бо «*мяжа прыцягвала іх да сябе, як магніт жалеза*» [3, с. 171].

Матыў блукання, вандроўкі, звязаны для герояў рамана С. Пясецкага з небяспекай і рызыкай смерці, зноў жа актуалізоўваецца дзякуючы памежнаму хранатопу: «*Забава доўга блукаў па лесе, не могучы адшукаць аніякай дарогі. Становішча яго пагоршыла завея, якая зь нечаканай сілай кідала ўгару хмары сьнегу і наўсьцяж расьцярушвала яго ў паветры. Страціўшы надзею выйсьці на добрую дарогу, каб не блудзіць, Забава пайшоў напрасткі на захад. Шлях быў жахлівы, але ўпарта, крок за крокам імкнуўся на перад, скрозь сьнежныя гурбы, скрозь высозныя заспы, утвораныя з занесеных сьнегам кустоў і галін… Пятнаццаць гадзін ужо ў дарозе, а ня ведаў, ці нарэшце ў Польшчы, ці яшчэ ў Саветах. Кожны кіламетр даваўся з такім натужлівым выжыльваннем, што ён зусім не арыентаваўся, як далёка зайшоў*» [2, с. 201–202].

С. Пясецкі паказаў цэлую сістэму жыцця, сямейнага ўкладу і побытавых паводзінаў, абумоўленых блізкасцю мяжы: «*Калі б вечарам, у глухую восеньскую ноч, адкінуць на даўжэйшым адрэзку граніцы павалоку змроку, дык мы б убачылі партыі перамытнікаў, якія цягнуцца да граніцы… Ідуць утрох, упяцёх*

і нават дзесяткам і больш дзесятка. Большыя групы вядуць "машыністы", якія дасканала ведаюць мяжу і пагранічча. Меншыя ходзяць пераважна "на ўласную руку". Ідуць нават жанчыны, некалькі адразу, каб за золата, срэбра і даляры купіць у Польшчы тавараў і з ліхвой прадаць іх у Саветах.

Адхінуўшы заслону змроку на паграніччы, мы ўбачылі б акул граніцы: сялян, якія з абрэзамі, карабінамі, рэвальверамі, сякерамі, віламі і каламі ў руках цікуюць здабычу. Часам убачылі б і дыверсійную банду ў складзе дзесятка ці некалькіх дзесяткаў людзей, узброеных рэвальверамі, карабінамі, гранатамі, а зрэдку і кулямётамі. Убачылі б мы і канакрадаў, што пераводзяць коней з Саветаў у Польшчу і з Польшчы ў Саветы. Нарэшце мы б убачылі нязвыклую постаць… чалавека, які самотна перамервае пагранічча і пераходзіць мяжу… Найчасцей ідзе самымі небяспечнымі дарогамі. Крочыць з рэвальверамі ў руках, з гранатамі за пасам, з кінжалам на баку. Гэта шпіён… Стары, загартаваны, цудам ацалелы ў дзесятках сутычках, рашучы, нібы д'ябал, да шаленства смелы пірат граніцы. Перамытнікі і стражнікі, агенты ўсіх падраздзяленняў выведкі і контрвыведкі, сяляне – усе баяцца яго» [3, с. 56].

Фінал рамана «Каханак Вялікай Мядзведзіцы» зноў жа абумоўлены матывам польска-савецкай мяжы: «*Памалу пайшоў у кірунку Вялікага Сяла. Неўзабаве апынуўся каля пагранічных слупоў. Стаялі змрочныя… Варожа глядзелі на сябе, як барацьбіты, якія, напяўшыся, узважаюць свае сілы…*

Месяц лье на пагранічча бляклыя халодныя праменні. Зоркі свецяць імгліста. Верхам пракрадаюцца хмары. Яны патаемна пераходзяць праз невядомыя людзям кардоны. А на паўночным захадзе цудоўна блішчыць каштоўнымі каменьчыкамі прыгожых зорак найпрыгажэйшая Вялікая Мядзведзіца. Яе пяшчотна ахуталі лёгкія снежна-белыя бухматыя аблокі.

Гэта быў канец майго трэцяга залатога сезона.

Гэта была гадавіна смерці Сашкі Вэбліна, некаранаванага караля граніцы.

Гэта была апошняя ноч на паграніччы» [3, с. 345].

Адметнасць створанай С. Пясецкім у раманах мадэлі памежнага быцця з пункту гледжання гістарычнай перспектывы слушна акрэсліў польскі даследчык Р. Дэмель: «*У "Каханку Вялікай Мядзведіцы" Пясецкі стварыў "кантрабандысцкі эпас", выклікаў да жыцця гераічную легенду "людзей мяжы". Характарастычна, што ён зрабіў гэта па-за традыцыйнымі ў міжваеннай літаратуры канкрэтызацыямі міфа крэсаў, якія звычайна суадносяцца з "супольнасцю пакутнікаў і выгнанцаў", "бастыёнам польскасці" і "аркадыйскім светам". У версіі Пясецкага ўсходняя мяжа Польшчы хутчэй за ўсё не актуалізуе гэтыя вядомыя значэнні: яна ўжо не з'яўляецца фарпостам Еўропы і хрысціянства – зараз гэта "апошняя магчымасць чалавека XX ст., які любіць свабоду". Прастора сумежжа на абшары, які прылягае да штучна створанага польска-савецкага кардона, з'яўляецца анклавам свабоды, нічыйным месцам, вольнай тэрыторыяй паміж двума дзяржавамі*» [5, с. 95].

Памежная рэальнасць стала прычынай чалавечых драм і праявай трагізму новага жыцця для многіх тагачасных жыхароў з абодвух бакоў, што знайшло адлюстраванне і ў творах беларускіх пісьменнікаў. Цікавасць уяўляе мастацкае ўвасабленне тэмы мяжы і кантрабандысцкага жыцця ў літаратуры Беларусі, у якой яна доўгі час была пад забаронай. Але беларускія пісьменнікі ўсё ж звярталіся да гэтага цікавага і драматычнага матэрыялу, бо з ім было звязана жыццё беларусаў па абодва бакі мяжы. Звернемся да досыць паказальнага ў кантэксце заяўленай праблематыкі апавядання П. Броўкі «Кантрабандысты» (1974), у якім

беларускі савецкі пісьменнік увёў у літаратуру дагэтуль невядомыя і неапісаныя як след грамадскія і пабытовыя з'явы. Аб'ектам мастацкага адлюстравання ў творы з'явіліся рэаліі ўсталяванай мяжы, а менавіта такая сацыяльная інстытуцыя, як кантрабандысты («*людзі з таварам штодзённага спажывецкага попыту*»). У апавяданні П. Броўкі гэтым небяспечным заняткам займаліся тры браты Макоўскія – Антось, Марка і Кузя, якія адчувалі сябе ў мясцовасці гаспадарамі жыцця: «*Такіх высокіх, як Макоўскія, ва ўсёй нашай акружцы не было. І выглядам яны ўсе падобныя – даўгацелыя, чорнавалосыя, з нейкімі зеленаватымі і вострымі, як у рысі, вачыма. І можа, таму, што ім самім хацелася чым-небудзь адрозніваца адзін ад аднаго, апраналіся яны па-рознаму. Рабіць гэта было не так цяжка, бо ўсе ведалі, што жывуць яны не са сваёй гаспадаркі, а з таго, што здабываюць, гойсаючы начамі і перавозячы цераз мяжу, туды і назад, розныя тавары. Адным словам, я тады ўпершыню пачуў такое слова, як кантрабандыст*» [1, с. 64].

Аповед у творы П. Броўкі ідзе пра тое, як мясцовыя актывісты-камсамольцы дапамаглі пагранічнікам высачыць і спаймаць мясцовых кантрабандыстаў – братоў Макоўскіх, якія былі надзвычай асцярожныя і спрытныя, таму і не траплялiся памежнай ахове: «*Жылі Макоўскія асобна ад усіх нашых вёсак на хутары Гаёк. Сасновы бор акружаў на ўзгорку іхнюю адзінокую хату. Мелі яны з валоку зямлі, ды мала рабілі на ёй. Больш наймалі. А самі жылі з другога, іх звалі "начнікамі". Каля нашых вёсак пасля вайны з панскаю Польшчаю пралегла мяжа. І Макоўскія, у якіх засталося шмат радні па той бок, наладзілі з імі сувязь. Вазілі туды здабытыя праз перакупшчыкаў золата і шарсцінне, а адтуль сукно, хром, сахарын, розныя напіткі. А яшчэ больш кралі і сплаўлялі за мяжу крадзенае. Аднаго разу абулі ў лапці добрага жарабца і звялі яго з суседняга хутара за граніцу*» [1, с. 65].

Беларускія кантрабандысты добра ведалі мясцовасць, маглі прайсці непрыкметна, таму пагранічнікі вырашылі звярнуцца па дапамогу да тутэйшых хлопцаў-актывістаў: «*А ты падпільнуй з сябрамі, калі яны за мяжу пададуцца, і прасігналь нам. Граніца доўгая, пагранічніка да пагранічніка не паставіш адзін к аднаму, а лес гэты кантрабандысты як свае пяць пальцаў ведаюць, паспрабуй спаймай іх. Асабліва гэтых хітруноў Макоўскіх. Вось чаму я і прашу, каб вы, камсамольцы, памаглі нам*» [1, с. 66], – заключае ўпаўнаважаны пагранатрада Косцін (дарэчы будзе прыгадаць, што ў творах С. Пясецкага мы не знойдзем такой тактыкі і стратэгіі супрацоўніцтва польскіх улад з мясцовым насельніцтвам). Камсамольцы ў апавяданні П. Броўкі ўспрымаюць такое даручэнне вельмі адказна, як пэўную рамантыку жыцця, мараць пра ўдзячнасць савецкай улады за такую паслугу: «*Вось спаймаем кантрабандыстаў, даставім на заставу, а там мяне як арганізатара, вядома, узнагародзяць, возьмуць да сябе ў пагранічнікі, выдадуць на першы раз, можа, і не такую прыгожую форму, як у Косціна, але пасля падымуць вышэй і дадуць такую, як у яго, а калі яшчэ вышэй – такую, як у самага найважнейшага начальніка ўсіх пагранічнікаў*» [1, с. 68]. Дапамагаюць, і за другім разам атрымліваецца, а фінал жа для мясцовых кантрабандыстаў драматычны: адзін з братоў Макоўскіх забіты, двое – апынуліся ў савецкай турме.

У апавяданні П. Броўкі «Кантрабандысты», як і ў раманах С. Пясецкага, узнікае матыў зорак, але ў беларускага пісьменніка пры апісанні гэтай прыроднай з'явы не актуалізоўваецца філасофскі кантэкст, але абуджае ў героя рамантычную мару аб лепшай будучыні. Вось як, напрыклад, разважае адзін з герояў

П. Броўкі: «*Я ляжаў і глядзеў на хмурнае неба, і калі яно праяснялася на момант і на ім успыхвалі дрыготкія зоры, марыў аб тым, што, відаць, і ў маім жыцці выблісне зорка, якая павядзе мяне туды, дзе я магу раскрыць усе свае сілы. А можа, адна з тых, якая высвятляецца цяпер, і будзе маёю*» [1, с. 68].

Параўнальна-тыпалагічны разгляд твораў С. Пясецкага 1930-х гг. і П. Броўкі выявіў падобнае і адрознае ў спосабе ідэйна-мастацкай прэзентацыі матыву мяжы: у польскага аўтара – памежны хранатоп паказаны як небяспечны экзатычны край, поўны таямніц, своеасаблівая зона прыроднага і сацыяльнага «сафары», катэгорыя мяжы С. Пясецкім асэнсоўваецца пераважна ў полі парадыгмы «*жыццё–смерць*», а таксама з філасофска-экзістэнцыяльнай перспектывы; у беларускага пісьменніка матыў мяжы інтэрпрэтуецца часцей праз прызму ідэалогіі, паказваецца драматычны характар жыцця тутэйшага насельніцтва, гэтай прасторы, што ўвасабляе трагедыю падзеленасці народа Беларусі. Акрамя таго, С. Пясецкі і П. Броўка ўводзілі новыя трактоўкі самога памежжа і жыцця на гэтай тэрыторыі, што было абумоўлена тагачаснымі рэаліямі, а праз аўтабіяграфічны дыскурс дасягалі праўдападабенства пры адлюстраванні вядомых і невядомых з'яў і падзей. Для гэтых аўтараў зямля па абодва бакі мяжы – малая айчына, якую яны, нягледзячы на драматычную палітычную і сацыякультурную сітуацыю, прыналежнасць да розных ідэалагічных сістэм, апісвалі з нязменнай любоўю і рамантычнай узнёсласцю.

ЛІТАРАТУРА

1. *Броўка, П.* Збор твораў у дзевяці тамах: т. 7. / П. Броўка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1989.
2. *Пясецкі, С.* Пяты этап: раман (пераклад і прадмова Я. Янушкевіча). / С. Пясецкі. – Мінск : Галіяфы, 2011.
3. *Пясецкі, С.* Каханак Вялікай Мядзведзіцы. / С. Пясецкі. – Мінск: Выдавец Віктар Хурсік, 2009.
4. *Пясецкі, С.* Багам ночы роўныя. / С. Пясецкі. – Мінск: Регистр, 2019.
5. *Demel, R.* Sergiusz Piasecki (1901-1964). Życie i twórczość. / – R. Demel. – Warszawa: LTW, 2001. – 175 s.
6. *Piasecki, S.* Kochanek Wielkiej Niedźwiedzicy. / S. Piasecki. – Warszawa: LTW, 1999.

УДК 821.161.3'04.09+821.131.1'04.09

У. І. Чарота (Мінск)

РЭЦЭПЦЫЯ ІТАЛЬЯНСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ (XVI–XVIII ст.)

У рамках дадзенага даклада мы вырашылі спыніцца толькі на самых цікавых і паказальных, на наш погляд, фактах рэцэпцыі італьянскай літаратуры ў Беларусі ў XVI–XVIII стагоддзях.

Перш за ўсё, італьянска-беларускія культурныя ўзаемасувязі гэтага перыяду адбываліся ў рамках асветы і непасрэдна праз тых беларусаў, якія атрымлівалі адукацыю ў Італіі, падарожнічалі па гэтай краіне. Даследчыкі жыцця знакамітага дзеяча Вялікага княства Літоўскага, маршалка дворнага М. Глінскага (1470–1534) адзначаюць: "Па звычаях веку ён вучыўся ў Італіі, і там прыняў каталіцтва" [14, с. 103]. Акрамя яго "пры дварах герцагаў Ферарскіх, у Мантуі ў палацы Ганзагаў, у Падуі, у Неапалі можна было ўбачыць Радзівілаў, Хадкевічаў, Пузынаў..." [5, с. 148]. Так, напрыклад, Ф. М. Еўлашоўскі (1546–1619) у сваіх успамінах адзначаў, што яго сын Яўхім знаходзіўся ў Італіі больш за дзесяць гадоў і служыў у мантуанскага князя, разам з якім наведаў Неапаль [10, с. 49, 53, 62]. Акрамя таго, з гэтага помніка мемуарнага жанру мы даведваемся, што ў Мантуі даводзілася бываць і А. Скарульскаму, які "быў членам гуртка Радзівіла Сіроткі" [10, с. 53, 106].

З беларускіх навучэнцаў італьянскіх універсітэтаў нельга не згадаць гуманіста, перакладчыка, першадрукара і філосафа Ф. Скарыну (1490–1551), які атрымаў у 1512 г. вучоную ступень доктара лекарскіх навук у італьянскім горадзе Падуя,

М. Гусоўскага (1470–1533), накіраванага ў складзе дыпламатычнай місіі Рэчы Паспалітай у Рым, дзе ён і напісаў “Песню пра зубра”, а таксама С. Буднага (1530–1583), які вучыўся ў Італіі і Швейцарыі [3, с. 177; 7, с. 12], прычым “добра валодаў лацінскай, грэчаскай, італьянскай <…> мовамі” [1, с. 73].

Але звернемся непасрэдна да фактаў.

Цяпер, на жаль, не ўсё можна як след высветліць, дакладна акрэсліць і цалкам асэнсаваць, але некаторыя факты гавораць самі за сябе.

У прадмове Ф. Скарыны да 4-й кнігі “Ездры”, “якая была ім падрыхтавана, але не выдадзена і вядома па спісу XVI ст. (на думку вучоных, зроблены са скарынінскага перакладу)”, ёсць прамое пацвярджэнне таму, што беларускі асветнік і першадрукар быў знаёмы са спадчынай італьянскага мысліцеля, пісьменніка і гуманіста Дж. Піка дэла Мірандала (1463–1494): “Пишется предмова на IV книги Ездрыны учителя. Не единому же не буди то чудно и же сии четвертыи книгы Ездры межы иными Закона Божыя книгами положены суть… О них измену и звлаща святый Герасим, Исидорис и Брито, а за наших часов люди учиненыа Пикоус (делла) Мирандоула и такоже и иные мнози” [6, с. 449].

Згадаем таксама паведамленне вядомага дантазнаўцы І. Ф. Бэлзы пра фундатара Нясвіжскай бібліятэкі ў XVI ст.: “Па распараджэнню прызнанага правадыра кальвіністаў Рэчы Паспалітай вялікага канцлера літоўскага Мікалая Радзівіла (Чорнага) выконваецца копія з партрэта Дантэ, замоўленага ў XV ст. будаўнікамі кафедральнага сабора Santa Maria del Fiore ў Фларэнцыі мастаку Даменіка Мікаліна, які ўбраў паэта ў пурпур рымскіх цэзараў, паводле загаду Баніфацыя VIII дазволенага насіць толькі кардыналам. Копія гэтая ажно да пачатку XIX стагоддзя захоўвалася ў віленскім палацы Міхала Клеафаса Агінскага, які, вандруючы па Італіі пасля паражэння паўстання Касцюшкі, наведаў Равэнну, каб пакланіцца грабніцы Дантэ” [2, с. 6]. Названы даследчык мяркуе, што цікавасць прадстаўніка беларускага магнацкага роду да асобы Дантэ Аліг’еры звязана з “надзвычайна шырокім распаўсюджваннем у эпоху рэфармацыі, у тым ліку і ў славянскіх краінах” [2, с. 6] Песні XIX “Пекла”, дзе выразна выявіліся антыпапісцкія погляды італьянскага паэта. Згаданае знаёмства М. Радзівіла Чорнага (1515–1565) з творчасцю італьянскага пісьменніка, хутчэй за ўсё, адбылося падчас вучобы за мяжой; магчыма таксама, што ў замежных падарожжах; але не выключана, што і ў Кракаве, калі ён быў на каралеўскай службе, а пры двары польскага караля знаходзіліся таксама саноўныя і адукаваныя італьянцы.

Нават каб згаданыя факты былі і заставаліся адзінкавымі, дык яны б усё роўна пераканаўча сведчылі, што знаёмства з італьянскай літаратурай адбылося на Беларусі яшчэ ў XVI стагоддзі. Пра гэта, з большай ці меншай факталагічнай абгрунтаванасцю, сведчаць усе даследчыкі, якія звярталіся да адпаведнай праблематыкі. Згадаем, напрыклад, меркаванне І. В. Саверчанкі: “З творчасцю заходнееўрапейскіх аўтараў эпохі Рэнесансу ды Рэфармацыі беларускія чытачы знаёміліся не толькі праз мясцовыя выданні, але й праз выданні заходніх друкарняў, якія ў вялікай колькасці распаўсюджваліся на абшарах нашай дзяржавы <…> У асяроддзі адукаваных людзей ведалі кнігі <…> Дантэ Аліг’еры, Піка дэла Мірандола, Макіявелі ды шмат якіх іншых” [12, с. 45–46].

Важную ролю ў збліжэнні культур адыгралі таксама італьянскага паходжання архітэктары, мастакі, музыканты і педагогі, іерархі каталіцкай царквы, дыпламаты, а таксама купцы і вандроўнікі, якія траплялі на нашыя землі. Асаблівая роля ў гэтым належыць такой вельмі ўплывовай асобе, як Бона Сфорца (1494–

1557). Гэтая каралева польская і вялікая княгіня літоўская, жонка Жыгімонта I Старога, бясспрэчна, адыграла значную ролю ў развіцці італа-славянскіх, у тым ліку і беларускіх, культурных сувязей.

З вялікага шэрагу непасрэдных дзеячаў асветы і культуры згадаем прапаведніка ідэй Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім італьянца Ф. Соцына (Сацыні) (1539–1604) – у Польшчы ім быў зроблены пераклад Песні XXIV "Раю" з "Боскай камедыі" Дантэ на латынь [8, с. 103], а паслядоўнікам яго вучэння, дарэчы, быў перакладчык "Евангелля" на беларускую мову В. Цяпінскі (1540–1604).

Цікава таксама, што настаўнікам М. Сматрыцкага (1577–1633) быў грэк К. Лукарыс (1572–1638) – доктар Падуанскага ўніверсітэта [3, с. 219]. Найверагодней, што гэта ён пазнаёміў беларускага пісьменніка-палеміста з набыткамі італьянскай літаратуры, у прыватнасці, з творчасцю Ф. Петраркі (1304–1374) і Б. Мантуана (1447–1516). Гісторык беларускай літаратуры І. В. Саверчанка прыводзіць паказальны для нас факт: "… У «Трэнас» Мялет Сматрыцкі ўключыў уласны пераклад з лаціны вершаў Франчэска Пятраркі і Мантуана Баптысты, у якіх крытыкавалася папства..." [11, с. 44].

Аўтарытэтны гісторык беларускай літаратуры А. Ф. Коршунаў адзначаў, што ў XVI–першай палове XVII стст. "… у выдадзеных кнігах мясцовых аўтараў шырока папулярызавалася пераважна ў выглядзе цытат творчасць заходнееўрапейскіх гуманістаў (Ф. Петраркі, Дж. Бакачыо, … Д. Саванаролы)" [3, с. 193]. І. В. Саверчанка таксама звяртае ўвагу, што беларускія публіцысты гэтага перыяду "…пры выбары эфектыўных аргументаў вельмі часта звярталіся да меркаванняў заходнееўрапейскіх аўтарытэтаў эпохі Рэнесансу ды Рэфармацыі: <…> Дантэ Аліг'еры, Франчэска Пятраркі, Піка дэла Мірандола, Макіявелі" [13, с. 165]. Прычым важна адзначыць, што аўтары-беларусы, цытуючы творы аўтарытэтных замежнікаў, іх "каментавалі, уводзячы ў кантэкст айчыннай культуры" [12, с. 46].

Вядома, што дзеяч беларускай культуры, пісьменнік і перакладчык Б. Будны (XVI–XVII стст.) пераставрыў 9 навелу з другога дня "Дэкамерона" Дж. Бакача (1313–1375) ("Аповесць суцяшальная пра купца Барнабаша" ці "Займальная гісторыя пра купца, які пусціўся ў заклад з іншым на цноту ўласнае жонкі"), якую выдавец П. Бластус Кміта ўключыў у 4-ю кнігу "Апафегматаў" ("Кароткія і ясныя аповесці, якія па-грэчаску называюцца "Апафегматы" (Любча, 1614 г.) [4, с. 823].

І гэта не адзіны факт рэцэпцыі творчасці Джавані Бакача беларускімі пісьменнікамі. Даследчыца творчасці заснавальніцы літаратурнага і тэатральнага салонаў у Нясвіжы, паэтэсы і драматурга Ф. У. Радзівіл (1707–1753) Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая лічыць, что сюжэты трагедыі "Золата ў агні"(1750) і камедыі "Каханне – дасканалы майстра"(1752) былі запазычаны з дзясятай навелы дзясятага дня і першай навелы пятага дня "Дэкамерона" Дж. Бакача адпаведна [4, с. 867–868, 872]. Княгіня дала сваю арыгінальную інтэрпрэтацыю сюжэтаў помніка італьянскай, і наогул, еўрапейскай навелістыкі.

У сваёй кнізе "Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях" гісторык М. В. Нікалаеў прыводзіць звесткі пра існаванне на Беларусі рукапіснага перакладу паэмы "Вызвалены Іерусалім" Т. Таса (1544–1595). Пра гэта сведчаць два дакументы з архіву Літоўскай праваслаўнай кансісторыі. Ва Указе ад 1 студзеня 1830 г. з Грэка-уніяцкай калегіі ў Літоўскую грэка-уніяцкую семінарыю было сказана: "Сия Коллегия находя нужным для некоторых соображений иметь в виду перевод на словянском языке Тассовой поэмы освобожденный Иерусалим, находящийся в рукописи в книгохранилище, принадлежащем ныне Литовской Греко-униатской Семинарии…", загадвае кнігу

“на время” перадаць у Грэка-уніяцкую духоўную калегію” [9, с. 115]. З рапарта семінарыі, пасланага ў адказ (разам з запатрабаванай кнігай), вынікае, што паэма Таса была перапісана ў рукапісным зборніку пад загалоўкам «Путь ку житію благочестиву всемъ Православнымъ христіянамъ, отъ многихъ святыхъ и богоносныхъ отецъ и учителей церкви святой православной Кахолической преданный, с трудом иноков общежительной обители Кутеинской изложенный и во типографію братства, православного Могилевского Максима Вощанки поданый року 1704». Акрамя таго, па словах М. В. Нікалаева, “…у рапарце семінарыі паведамляецца таксама, што пераклад Тасавай паэмы ў пададзеным рукапісе не поўны; змяшчае толькі дзесяць песень…” [9, с. 115]. Хто пераклаў гэтыя песні, калі гэтая кніга трапіла ў Жыровіцкую бібліятэку, а таксама далейшы лёс яе, на жаль, невядомы.

Падагульняючы адзначым:

Мы прывялі толькі некаторыя факты, якія могуць служыць доказамі італьянска-беларускіх літаратурных сувязей у XVI–XVIII стагоддзях. Дадзеная праблема патрабуе далейшай шматаспектнай і шматвектарнай пошукавай працы, вынікам якой павінна стаць падрабязная фактаграфія, сістэматызацыя назапашаных фактаў і больш грунтоўнае іх асэнсаванне.

ЛІТАРАТУРА

1. *Ахрыменка, П. П.* Старажытная беларуская літаратура : вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў / П. П. Ахрыменка, М. Р. Ларчанка. – Мінск : Выш. шк, 1968. – 174 с.
2. *Бэлза, И.* Данте и культуры славянских народов: к 700-летию со дня рождения Данте / И. Бэлза // Советское славяноведение. – 1965. – № 4.– С. 3–16.
3. Гісторыя беларускай літаратуры: старажыт. перыяд / пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1985. – 336 с.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стст. – Мінск : Бел. навука, 2006. – Т. 1. Даўняя літаратура XI–першая палова XVIII стагоддзя. – 910 с.
5. *Голенищев-Кутузов, И. Н.* Славянские литературы : статьи и исследования / И. Н. Голенищев-Кутузов. – М. : Худ. лит., 1973. – С. 132–216.
6. *Дарашэвіч, Э. К.* Піка дэла Мірандала Джавані / Э. К. Дарашэвіч // Францыск Скарына і яго час : энцыкл. давед. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1988. – С. 449.
7. *Кароткі, У. Г.* З гісторыі мастацкага слова Беларусі / У. Г. Кароткі // Старажытная беларуская літаратура : зб. : для стар. шк. узросту. – Мінск : Юнацтва, 1990. – С. 5–16.
8. *Моравский, К.* Данте в Польше / К. Моравский // Данте и славяне : сб. ст. – М. : Наука, 1965. – С. 95–156.
9. *Нікалаеў, М.* Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях / М. Нікалаеў. – Мінск : Маст. літ, 1993. – 239 с.
10. Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. / АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы; уклад., уступ. артыкул і камент. А. Ф. Коршунава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 175 с.
11. *Саверчанка, І. В.* Старажытная паэзія Беларусі XVI–першай паловы XVII ст. / І. В. Саверчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 252 с.
12. *Саверчанка, І.* Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі : Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.
13. *Саверчанка, І. В.* Публіцыстычная літаратура Беларусі другой паловы XVI–XVII ст. : праблемы паэтыкі : дыс. ... д-ра філал. навук / І. В. Саверчанка. – Мінск, 2000. – 269 с.
14. *Тарасаў, К.* Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны / К. Тарасаў. – 2-е выд., дап. – Мінск : Полымя, 1993. – 268 с.

УДК 821.161.3.09(092) Навуменка

К. М. Чарота (Мінск)

СРОДКІ МАСТАЦКАЙ ВЫРАЗНАСЦІ Ў АПОВЕСЦЯХ І. НАВУМЕНКІ «СНЕЖАНЬ» І «РАЗВІТАННЕ Ў КАВАЛЬЦАХ»

У аповесці «Снежань» І. Навуменка ізноў звяртаецца да тэмы «сямнаццацігадовых» на вайне. Пісьменнік адлюстроўвае падзеі самага пачатку вайны, калі героі твора не ўсведамлялі яшчэ маштабу трагедыі. Ваенныя падзеі пайшлі

зусім не так, як многія аптымістычна меркавалі ў самым яе пачатку. Адступленне Чырвонай арміі, фашысцкая акупацыя сталі нечаканасцю для многіх, у тым ліку і герояў твора. Пацвердзіліся трывогі герояў аповесці: немцы набліжаліся да Масквы.

Гэтую аповесць можна назваць своеасаблівым працягам апавядання «Сямнаццатай вясной». Тыя ж самыя маладыя хлопцы толькі пад іншымі імёнамі нібы перайшлі з апавядання ў аповесць і пачынаюць рабіць першыя крокі ў падпольнай барацьбе. Толькі яны ўжо не майструюць самаробную міну для дыверсіі, як гэта было ў папярэднім апавяданні, а рамантуюць радыёпрыёмнік, каб ведаць, што робіцца на самой справе на фронце, друкуюць і распаўсюджваюць лістоўкі. Тэма сталення маладых людзей падчас вайны, асэнсоўвалася празаікам у непарыўнай сувязі з яго ўласнай біяграфіяй, у апавядальніку можна легка ўбачыць асобу самога аўтара. Ацэньваючы сітуацыю з вышыні свайго жыццёвага вопыту, і тут пісьменнік паказвае рамантычна-ўзнёслае імкненне да гераізму маладых людзей з несхаванай самаіроніяй: «*Збіраючыся, мы лаем фашыстаў апошнімі словамі, прарочым ім хуткую пагібель. Але немцам ад гэтага, здаецца, не вельмі баліць*» [6, с. 29].

На працягу ўсяго твора прасочваецца яўны канфлікт паміж жаданнямі, імкненнямі маладых людзей і іх рэальнымі магчымасцямі. Наколькі б моцна не хацелася героям аповесці «Снежань» зрабіць акупантам хоць нейкую шкоду, «*ўчапіцца ў іх горлы зубамі*», але «*зубамі фашыстаў, мабыць, не перадушыш*» [6, с. 30]. Як і ў сваіх ранніх апавяданнях, у гэтай аповесці «пісьменнік не засяроджваў увагу на драматычных падзеях, не шукаў выключна гераічных подзвігаў, а паказваў маладых людзей, падлеткаў і юнакоў такімі, якімі яны былі на самай справе: рамантычныя, не падрыхтаваныя да сур'ёзных выпрабаванняў» [4, с. 244–245]. У аповесцях І. Навуменка працягвае удасканальваць сваё майстэрства напісання пейзажных замалевак. Для ўзмацнення драматызму сітуацыі і паглыблення ў атмасферу мастацкага твора пісьменнік дае падрабязныя малюнкі зімовай прыроды: «*На свеце быў снежань, сумны, бясснежны. Аднастайна і нудна гулі вечарамі тэлеграфныя слупы з абарванымі правадамі. Правады былі парваны не ўсе, два ці тры асталіся цэлыя і звінелі на марозе, як струны, перадаючы свой балючы сум мёрзламу дрэву слупоў. Правады былі мёртвыя… Мястэчка замёрзла, стаіўшыся ў змроку снежаньскай ночы*» [6, с. 29]. Дадзенае апісанне прыроды адпавядае агульнаму настрою герояў аповесці, у той час як у пейзажах апавядання «Сямнаццатай вясной» аўтар выкарыстоўваў прыём кантрасту прыроды з настроем галоўнага героя.

Апісанні знешняга выгляду і ўнутранага ўбранства вясковай хаты, у якой збіраліся маладыя хлопцы-падпольшчыкі для таго, каб змайстраваць радыё, з'яўляюцца важнымі элементамі для больш поўнага раскрыцця сюжэта ў аповесці «Снежань». Менавіта дзякуючы непрывабнаму і нават «*убогаму*» знешняму выгляду: «*выбітыя вокны з восені яго маці пазатыкала рознымі лахманамі і рыззём*» [6, с. 30], – хата не выклікае ніякага падазрэння ў мясцовых паліцаяў. А вось унутры ўжо паўстае іншая карціна. Гэтая хата – «лабараторыя» для падрыхтоўкі дыверсій супраць акупантаў: «*Цішкава жыллё ў гэтыя дні, мабыць, падобна да лабараторыі сярэдневяковых алхімікаў. Усюды бутэлькі і бутэлечкі, прабіркі, спіртоўкі, бляшанкі з рознымі парашкамі, кавалкі свінцу і скруткі меднага дроту*» [6, с. 29].

Не толькі тэме вайны былі прысвечаны творы І. Якаўлевіча. Тэма кахання, якая прысутнічала і ў ранейшых апавяданнях пісьменніка, стала цэнтральнай у аповесці

«Развітанне ў Кавальцах» (1974). Аповесць была навеяна аўтару «*як унутранымі пачуццямі, так у той жа меры і грамадскімі… хацелася як бы праверыць асноўныя каштоўнасці жыцця ў інтымнай сферы, у сферы кахання*» [9, с. 176].

Героі аповесці І. Навуменкі «Развітанне ў Кавальцах» – гэта вобразы беларускіх інтэлігентаў. Даследчык літаратуры В. Каваленка адзначаў, што «Пісьменнік з зайздроснай выразнасцю праз перыпетыі інтымнага жыцця вымаляваў праўдзівы сацыяльна-псіхалагічны партрэт беларускай інтэлігенцыі пасляваеннага часу» [3, с. 10].

Галоўнымі героямі твора з'яўляюцца малады студэнт-завочнік Жэня, які працуе настаўнікам у школе ў Кавальцах, і Антаніна, якая таксама ўжо мае дыплом настаўніцы. Англійскі літаратуразнаўца А. Макмілін лічыць, што персанажы аповесці, у параўнанні з героямі яго папярэдніх апавяданняў і аповесцяў на ваенную тэматыку, «*становяцца больш рэфлексіўнымі*» [1, p. 147]. З гэтай думкай нельга не пагадзіцца. Калі героі апавяданняў і аповесці на тэму вайны І. Якаўлевіча, якія мы разглядалі раней, – гэта маладыя хлопцы-падпольшчыкі, якія дзейнічаюць, змагаюцца з акупантамі, то персанажы аповесці «Развітання ў Кавальцах» – гэта ўжо мірныя жыхары пасляваеннага часу, якія паглыблены ў сябе і пастаянна аналізуюць свае думкі і перажыванні. У гэтай аповесці няма падполля, дыверсій, ворагаў-акупантаў, маладыя людзі вучацца ва ўніверсітэце, працуюць на заводзе, кахаюць.

Час, які апісваецца ў аповесці, супадае з так званай урбанізацыяй насельніцтва краіны. Моладзь імкнецца паступіць і вучыцца ў горадзе, любым шляхам «зачапіцца» там, каб не вяртацца ў вёску. Агульны партрэт дзясяцікласнікаў мастак слова падае наступным чынам: «*Дзесяцікласнікі – амаль грамадзяне. У хлопцаў – прычоскі, у дзяўчат – доўгія заплеценыя косы. Кажушка, палітончыка амаль не ўбачыш, носяць дзеці вёскі рознакаляровыя курткі з сінтэтычнага матэрыялу. Жэня Сініцкая, дачка Ганны Андрэеўны, яшчэ з дзявятага класа прыходзіць на ўрокі ў штанах*» [7, с. 89–90]. Знешні выгляд моладзі ніяк не вяжацца з вяскоўцамі. Адразу кідаецца ў вочы моцны ўплыў горада на маладых людзей. І вельмі складана растлумачыць прычыну такога масавага захаплення горадам. Прыезжы госць спрабуе разважаць аб глабальных прычынах масавага пераезду моладзі з вёскі ў горад: «*Лічыцца, што ў вёсцы не хапае культуры і таму моладзь бяжыць у горад. Але я ведаю многа прыкладаў, калі ў калгасах, саўгасах добрыя клубы, у кожнай хаце тэлевізар, але моладзь усё адно не затрымліваецца. Ёсць, мабыць, глыбейшыя прычыны, звязаныя з адносінамі да жыцця*» [7, с. 99]. І гэтая думка героя апавядання вельмі слушная. Менавіта розныя адносіны да жыцця і становяцца асноўнай прычынай масавага эміграцыі моладзі з вёскі ў горад. А яшчэ тая ж прычына не дазволіла каханню маладога настаўніка Жэні да Антаніны стаць шчаслівым і ўзаемным.

Нягледзячы на відавочную сімпатыю Антаніны Разумоўскай да закаханага ў яе маладога спецыяліста Жэні, яна да канца так і не змагла яго зразумець. Малады настаўнік быў блізкі да прыроды, заядлы грыбнік, любіў проста паблукаць па лесе, паслухаць яго музыку, у весцы яму было добра і спакойна. Ён быў зусім не супраць і пасля заканчэння ўніверсітэту застацца працаваць у мясцовай школе настаўнікам, калі б побач з ім была каханая дзяўчына. А вось Антаніне бліжэй быў горад. Нават большую частку свайго адпачынку яна праводзіла не ў вёсцы з бацькамі, а ў горадзе. Аднойчы Жэня прызнаецца дзяўчыне: «*Я хацеў цябе ў лесе сустрэць*…», а ў адказ атрымаў незразумелае: «*Што было б, калі б ты*

сустрэў мяне ў лесе?» [7, с. 105] Для маладога настаўніка лес – гэта «*сакральнае*» месца, дзе ён мог бы прызнацца каханай дзяўчыне ў сваіх пачуццях. Шмат разоў, блукаючы па ім, герой успамінаў, як прыходзіла да яго «*пушыстая дзяўчынка з тоўстымі ножкамі, заплеценай касой, вялікімі, нібы здзіўленамі вачамі*» [7, с. 105] і назірала за тым, як ён, яшчэ малы хлопец, пасвіў кароў. Але так атрымалася, што «пушыстая дзяўчынка» і Антаніна – гэта ўжо два розных чалавека. Успаміны, якія былі дарагімі і важнымі для Жэні, Антаніна не магла з ім раздзяліць: «*Нічога я не помню…*» [7, с. 105]. Гераіні твора вельмі спадабаўся сумесны з Жэняй паход у «*людны, тлумны*» рэстаран. Таму канцоўка аповесці дастаткова прадказальная: Антаніна выходзіць замуж за другога. Гэта характэрна для твораў І. Навуменкі на тэму кахання: у іх «амаль ніколі не бывае шчаслівай развязкі, таго “хэпі-энду”, які з’яўляецца, да прыкладу, абавязковым атрыбутам так званага “любоўнага рамана”. Амаль кожны твор завяршаецца тужлівай, шчымлівай нотай, матывам развітання або расчаравання», а адбываецца гэта, на думку П. В. Васючэнкі, таму, што «закаханыя героі, як правіла, інтэлігенты з абвостранай рэфлексіўнасцю, чые няўдачы, магчыма, тлумачацца тым, што яны спрабуюць зразумець душу каханай розумам, а ў пачуццях крышку ідэалізуюць сваіх абранніц, што неўзабаве прыводзіць іх да расчаравання» [2, с. 710].

І. Навуменка працягвае развіваць сваё майстэрства пейзажыста і ў гэтай аповесці. Ён сам распавядаў, што «аповесць “Развітанне ў Кавальцах” напісаў пад уражаннямі ад маляўнічай даліны ракі Іслач. Пасяліў у гэтыя мясціны сваіх герояў» [8, с. 3]. Немагчыма не заўважыць, з якім замілаваннем і цеплынёй апісваецца ў творы гэтая рака: «*А ўвогуле рачулка жывая. Яна весела булькае ўнізе, аблізваючы карэнні алешын, лазнякоў, якія навісаюць над ёй на ўсім прасцягу, дно яе ўслана жвірам, дробнымі каменьчыкамі, вада сцюдзёная і чыстая. Некалі рачулка ведала лепшыя часы, бо ўся багністая тарфяная лугавіна паміж двума сасновымі пагоркамі была, відаць, яе рэчышчам. Цяпер ля падножжа правага пагорка густа падняўся арэшнік, нават дубы выраслі – рэчка пачала занепадаць даўно*» [7, с. 76].

Апісанне ракі, да якой і душой і сэрцам прыкіпеў галоўны герой аповесці, не проста з’яўляецца фонам, на якім разгортваецца дзеянне. Яно сімвалізуе і дэманструе тыя змены, што адбываюцца ў прыродзе, у жыцці грамадства. Для пісьменніка знішчэнне меліяратарамі гэтай малой рачулкі дзеля дабычы торфу– гэта знішчэнне старога «*вясковага*» ладу жыцця. Для Жэні гэта сапраўдная трагедыя: «*Я быў на ўроках, калі здарылася няшчасце з рачулкай. Меліяратары прыгналі экскаватар і за нейкую гадзіну ўздоўж па лугавіне, побач з рэчкай, пракапалі глыбокую прамую канаву. Яна запоўнілася вадой, рэчка на вачах абмялела. Цяпер пад мастком ледзь цурчыць кволы ручай, рачулка адразу страціла прывабнасць: на аголеных карчах, дзеравяках вісіць ціна, сіратліва, як непатрэбныя, стаяць ля гразкага рэчышча вольхі і лозы*» [7, с. 92].

Неаднаразова І. Навуменка адзначаў, што большасць яго «апавяданняў і аповесцей, пачыналіся з нейкай унутранай, душэўнай музыкі, з настраёвых пейзажных карцін» [8, с. 3]. «*Музыка*» альбо «*музыкальнасць*» як спецыфічны сродак мастацкай выразнасці характэрна і для яго аповесці «Развітанне ў Кавальцах». У якасці прыклада можна прывесці апісанне прыроды, якое галоўны герой сам назваў «*музыкай адзіноты*»: «*Будзе шастаць пад зімовымі вятрамі голле старой ліпы, глуха шумець сасоннік, але ўсё гэта мне прыдзецца слухаць без Анта-*

ніны. Музыка адзіноты. Замерзне рачулка, якая цячэ пад вокнамі яе дома, зімой між аснежаных берагоў і цёмных сосен зробіцца зусім непрыкуметнай, але на мастку я буду стаяць адзін» [7, с. 89].

Меладычная танальнасць, якая праходзіць праз усю аповесць, залежыць ад жыццёвага матэрыялу і нараджаецца яго спецыфікай.

Жанр аповесці ў мастацкай спадчыне І. Навуменкі быў «пераходным» этапам ад апавядання да рамана. Падчас працы над Зборам твораў Івана Навуменкі ў 10 тамах даследчыца І. Баўтрэль выявіла, што аповесці «Снежань» і «Мой сябар Пятрусь» амаль без змен увайшлі ў раман «Сасна пры дарозе» [5, с. 139]. Гэтая акалічнасць яшчэ раз пацвярджае выснову, што І. Якаўлевіч разглядаў апаваданні і аповесці і як самастойныя творы, і як чарнавікі да больш разгорнутых жанравых форм.

ЛІТАРАТУРА

1. *McMillin, A.* Die Literatur der Weissrussen = A history of Byelorussian literature from its origin to the present day / A. McMillin. – Giessen : Schmitz, 1977. – 449 p.
2. *Васючэнка, П.* Іван Навуменка / П. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 3. – С. 689–713.
3. *Каваленка, В.* І радасць, і смутак, і боль… / В. Каваленка // Навуменка, І. Выбраныя творы : у 2 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 1 : Апавяданні. Аповесці. – С. 5–12.
4. *Клімуць, Я.* І. Вобраз маладога пакалення ў ваеннай прозе І. Навуменкі / Я. І. Клімуць // Творчасць Івана Навуменкі : славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст : матэрыялы Рэсп. навук. канф. (да 85-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі), Мінск, 16 лют. 2010 г. / Ін-т мовы і літ. ім. Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2010. – С. 244–247.
5. Кулуарамі творчай майстэрні Івана Навуменкі / С. С. Лаўшук [і інш.] ; навук. рэд. : А. А. Манкевіч ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2020. – 333 с.
6. *Навуменка, І.* Збор твораў : у 6 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 1981. – Т. 1 : Аповесці і апавяданні. – 559 с.
7. *Навуменка, І.* Збор твораў : у 6 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 1982. – Т. 2 : Аповесці і апавяданні. – 558 с.
8. *Навуменка, І.* Знайсці свайго героя / І. Навуменка; гутарыў У. Марук // Звязда. – 1985. – 16 лют. – С. 3.
9. *Навуменка, І. Я.* Збор твораў : у 10 т. / І. Я. Навуменка ; падрыхт. тэкстаў, камент. і паслясл. Н. Пыско. – Мінск : Маст. літ., 2017. – Т. 10 : П'еса, вершы, інтэрв'ю, анкеты, выступленні, водзывы на дысертацыі, некралогі, аўтабіяграфія, успаміны, дзённікавыя запісы, лісты. – 989 с.

УДК 821.161.3+398.21

С. В. Шамякіна (Мінск)

КАЗАЧНЫЯ АПОВЕСЦІ П. ВАСЮЧЭНКІ "ЖЫЛІ-БЫЛІ ПАНЫ КУБЛІЦКІ ДА ЗАБЛОЦКІ" І НАРОДНЫЯ КАЗКІ

Выкарыстанне фальклорных матываў і вобразаў шырока распаўсюджана ў мастацкай літаратуры з часоў уласна яе ўзнікнення. І народныя казкі бадай што найбольш часта з'яўляюцца крыніцай запазычання прыгожым пісьменствам разнастайных элементаў і мастацкіх сродкаў. Так, адзін з самых старажытных літаратурных твораў, вядомых навукоўцам, – егіпецкая "Казка пра двух братоў", створаная на аснове фальклорнага матэрыялу. "Казка пра Амура і Псіхею", што ўваходзіць у склад рамана Апулея "Залаты асёл" і лічыцца адной з першых літаратурных казак, бо ў яе вядомы аўтар, таксама заснавана на калектыўнай народнай творчасці. Дадзеная традыцыя працягваецца і далей, назіраецца ў аўтараў розных часоў, у тым ліку і сучасных. Выразна прасочваецца яна і ў творы беларускага пісьменніка П. Васючэнкі "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі".

Але ж выкарыстоўваючы фальклорны матэрыял, аўтары літаратурных твораў змяняюць яго; вобразы, матывы, сюжэты і іншыя мастацкія элементы трансфармуюцца рознымі спосабамі. Так і ў дадзеным артыкуле творы П. Васю-

чэнкі назіраюцца як рысы, падобныя да тых, што прадстаўлены ў народных казках, так і разнастайныя змяненні і дапаўненні – аналіз тых і другіх аспектаў і з'яўляецца мэтай нашай работы.

Элементы, што маюць паралелі з народнымі казкамі, у творы "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі", на наш погляд, можна аб'яднаць у некалькі груп.

1. Вобразы-персанажы.

Галоўнымі героямі ў творы П. Васючэнкі з'яўляюцца два паны – Кубліцкі і Заблоцкі. Асноўныя характарыстыкі дадзеных персанажаў – лянота, дурасць, фанабэрлівасць, няўменне нічога рабіць самастойна і г.д. – цалкам адпавядаюць вобразам паноў з многіх народных сацыяльна-бытавых казак [5].

У самым пачатку твора аўтар падкрэслівае, што паны Кубліцкі і Заблоцкі – шырока вядомыя ў народзе асобы, пра якіх людзі распавядаюць розныя гісторыі, такім чынам персанажы нібыта ўключаюцца ў фальклорны кантэкст.

Сюжэты казачных аповесцей П. Васючэнкі заснаваны на тым, што паны (часцей за ўсё з-за сваіх адмоўных рыс) трапляюць у розныя смешныя і недарэчныя сітуацыі, што таксама з'яўляецца адным з найбольш частых матываў у фальклорных сацыяльна-бытавых казках і анекдотах.

Згодна тэорыі даследчыка Ю. Юдзіна, усіх персанажаў бытавых казак можна звесці да двух тыпаў: дурань і хітруган [8]. Паны Кубліцкі і Заблоцкі маюць рысы абодвух тыпаў. Часцей за ўсё яны трапляюць у недарэчныя сітуацыі па прычыне свайго глупства, ляноты, хцівасці і г.д. (напрыклад, не маюць ежы, бо праігралі ўсё сваё дабро і вымушаны варыць і есці ўласныя боты; аказваюцца разам са сваёй хатай пад зямлёй з-за надта доўгай гульні ў карты; нават выседжваюць яйка, з якога выводзіцца пачварны Цмок і інш.). Але ў некаторых главах паны паводзяць сабе даволі спрытна. Напрыклад, пайшоўшы на заробкі да багатага пана Кіндзюшкі, яны з-за няўменя працаваць страчваюць яго маёмасць, але выходзяць сухімі з вады дзякуючы хітрым прыдумкам.

Другараднымі персанажамі ў творы П. Васючэнкі з'яўляюцца сяляне – дзеўка Дрыпа, бабка Параска, Ахрэм Верацённік. Дадзеныя героі, як і ў народных казках, прадстаўлены больш разумнымі і ў цэлым пазітыўнымі: яны ўмеюць працаваць, больш проста знаходзяць выхад з цяжкага становішча і г.д.

Усе адзначаныя вышэй аспекты стасуюцца з традыцыйнымі фальклорнымі, але ёсць у разглядаемым творы таксама і элементы, што адрозніваюць яго ад народных казак.

У першую чаргу трэба адзначыць *псіхалагізм*. Псіхалагічныя партрэты персанажаў, матывіроўкі іх паводзін, цікаўнасць да душэўных перажыванняў і памкненняў – рыса, што яскрава адрознівае пісьменніцкую казку ад народнай, у якой персанажы з'яўляюцца стабільнымі, замацаванымі традыцыяй тыпамі без псіхалагічных характарыстык. У творы "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" мы таксама назіраем намнога больш дэталёвую і індывідуалізаваную псіхалагічную абмалёўку персанажаў, чым у народных казках. Прычым гэта тычыцца не толькі галоўных герояў, але і другарадных.

Так, акрамя ляноты, дурноты, ганарлівасці – рыс агульных і традыцыйных для фальклорных вобразаў паноў, мы таксама можам вылучыць адрозненні ў характарах Кубліцкага і Заблоцкага: першы – больш далікатны, выхаваны і асцярожны, другі – больш актыўны, агрэсіўны, смелы. Дадзеныя рысы падкрэсліваюцца і ў мове персанажаў, што таксама нехарактэрна для народных казак. Напрыклад, у главе "Як паны хадзілі паганага Цмока ваяваць" пан Заблоцкі гаворыць пра Цмока: "*Раскірэка чортава, недаверак гэты! Рэпу павырываў, каб*

яму зубы павырывала!...” [1, с. 33] і г.д. Насуперак Заблоцкаму пан Кубліцкі звяртаецца да Цмока ветліва: “*Гэтак, як пан Цмок робіць, рабіць няможна. Нельга есці чужую рэпу ды ясных паненак, і ў статуце гэтак запісана…*” [1, с. 34].

Персанажы-сяляне таксама адзначаюцца большым псіхалагізмам, чым у фальклоры. Асабліва гэта тычыцца дзеўкі Дрыпы, вобраз якой раскрыты ў творы не горш за галоўных герояў. У цэлым падобны тып персанажа характэрны для народных бытавых казак – хітрая і спрытная дзяўчына, якая надта нестандартна выконвае загады паноў, але пры гэтым не атрымлівае ад іх ніякага пакарання. Аднак у фальклоры звычайна ніяк не тлумачацца яе паводзіны, не даецца іх псіхалагічная матывіроўка. У творы ж П. Васючэнкі дзеўка сама тлумачыць асаблівасці свайго характару, папярэджваючы паноў, калі тыя клічуць яе на службу: “*Адно каб паны пасля не шкадавалі. Бо ў мяне ў галаве, ведаеце, фантазіі розныя, лятункі… От як стрэльне што ў голаў, дык усё раблю па-свойму. Натура такая…*” [1, с. 16].

Нават паганы Цмок пасля абразы ад паноў і бабкі Параскі адлятае не проста так, а “плачучы”.

Акрамя таго, некаторыя ўласцівасці персанажаў у творы П. Васючэнкі супярэчаць народным казкам. У апошніх, калі паны ўжо прадстаўлены як носьбіты негатыўных рыс, дык гэтая характарыстыка захоўвацца на працягу ўсяго твора. Паны ж Кубліцкі і Заблоцкі па меры развіцця сюжэту выяўляюць і нешта станоўчае ў сваіх асобах: пачынаюць вучыцца нешта рабіць (вырошчваюць рэпу і г.д.), спрабуюць ваяваць Цмока, ідуць шукаць дзеўку Дрыпу, калі думаюць, што яна згубілася і г.д.

Можна сказаць, што многія персанажы твора “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” маюць рысы *трыксцераў*, але намнога больш індывідуалізаваныя і нестандартныя ў параўнанні з фальклорнымі творамі. Падобны тып вобраза (ці нават архетып), на думку многіх даследчыкаў (Я. Касцюхін [4], Д. Гаўрылаў [2] і інш.), з’яўляецца адным з найбольш распаўсюджаных і папулярных на працягу ўсяго развіцця чалавечай культуры. У фальклорных казках усіх жанраў яны таксама пастаянна сустракаюцца – як у сацыяльна-бытавых (і дурні, і хітрацы маюць такія рысы), так і ў чарадзейных (тып героя-“іранічнага шчасліўца”), і ў анімалістычных (на думку Я. Касцюхіна, дадзены жанр увогуле заснаваны менавіта на міфах аб трыксцерах [4]). І П. Васючэнка, завяршаючы свой твор, звяртае ўвагу якраз на падобныя рысы сваіх герояў і асаблівы інтарэс да іх: “*Чаго яшчэ жадаць! Новых прыгодаў! Не турбуйцеся! Яны будуць! З такімі шалапутамі, як вы, яны заўсёды будуць здарацца. Але, можа, за тое я вас і люблю!..”* [1, с. 101].

Акрамя вобразаў розных герояў паасобку, неабходна звярнуць увагу і на ўзаемаадносіны паміж імі, і на сістэму персанажаў твора ў цэлым. Так, у пераважнай большасці народных сацыяльна-бытавых казак галоўнымі героямі з’яўляюцца сяляне, а паны выступаюць як другарадныя персанажы – ў творы П. Васючэнкі ўсё наадварот. Пры гэтым у сацыяльна-бытавых казках адносіны паміж сялянамі і панамі часцей за ўсё дрэнныя. Пра твор жа “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” такога нельга сказаць: паны і сяляне тут не варагуюць, паны не робяць сялянам наўмыснай шкоды, сяляне не імкнуцца іх падмануць, ашукаць, а часцей за ўсё, наадварот, дапамагаюць выблытацца з бяды.

2. Хранатоп.

Паны Кубліцкі ды Заблоцкі жывуць у нейкі няпэўны час у нявызначанай краіне, падобнай да Беларусі эпохі Сярэднявечча або Новага часу.

Няпэўнасць часу падкрэсліваецца самой назвай твора – выкарыстаннем у ёй тыповага фальклорна-казачнага зачыну *жылі-былі*, што ўказвае менавіта на адноснасць часу (плюсквамперфект дзеяслова).

Акрамя таго, у творы назіраецца пэўнае змяшэнне прыкмет розных эпох. Гаспадарку паны і сяляне вядуць па-сярэднявечнаму, правіць у іх краях нейкі князь Дрыгайла (імя нагадвае князя Свідрыгайла, які жыў у XIV–XV стст.), пан Кіндзюшка назірае за зоркамі ў падзорную трубу (якая была вынайдзена ў XVII ст.), Цмок мае *іншаземны пашпарт* (сістэма пашпартоў пачала актыўна развівацца толькі з XIX ст.) і г.д.

Краіна, у якой адбываецца дзеянне, у творы таксама ні разу не называецца. Тапонімы, якія ўжываюцца ў творы – Еўропа, Мерыка, Ерусалім – дазваляюць лічыць, што апісваецца наш свет, а не нейкі паралельны. Канкрэтна ў краіне, дзе жывуць паны Кубліцкі і Заблоцкі, ёсць горад Смургоні (Смаргонь?) і працякае рака Нёман, што суадносіць дадзеную прастору з Беларуссю. Але ў пэўнай ступені свет у творы ўсё ж альтэрнатыўны – караля суседняй краіны завуць Гарбуз XVIII, над мясцовай рэчкай Парэчкай стаіць Калінавы мост з іншасвету чарадзейных казак.

Такім чынам, і ў гэтым плане казачная аповесць П. Васючэнкі мае як падабенства з народнымі казкамі (няпэўны хранатоп), так і адрозненні (хранатоп няпэўны ў меньшай ступені, чым у фальклоры).

3. Змяшэнне жанраў.

Народныя казкі ў большасці сваёй маюць традыцыйныя, сталыя жанравыя прыкметы, якія выразна адрозніваюць казкавыя жанры паміж сабою. У творы ж П. Васючэнкі, на наш погляд, назіраецца кантамінацыя элементаў з розных фальклорных жанраў (не толькі казкавых, але ж аб'ектам цікавасці ў дадзеным артыкуле з'яўляюцца менавіта яны). Мы можам вылучыць у творы "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" рысы наступных жанраў народных казак:

а) сацыяльна-бытавыя (бытавыя, рэалістычныя) казкі – жанр фальклорнай казкавай прозы, фантастычнасць якога заснавана на паказе незвычайных, дзіўных, але, у прынцыпе, магчымых у жыцці падзей. Дзеянне пабудавана на парушэнні звычайнай логікі, на парадаксальных сітуацыях. Звышнатуральныя сілы, магія адсутнічаюць. Большасць навукоўцаў, якія займаліся вывучэннем дадзенага казачнага жанру (напрыклад, Ю. Юдзін [8], А. Фядосік [6] і інш.), указваюць на яго блізасць да анекдоту. Персанажамі часцей за ўсё з'яўляюцца людзі, пазбаўленыя звышнатуральных рыс: сяляне, паны, папы, гандляры, злодзеі і г.д. Творы часта маюць выразна дыдактычны характар з высмейваннем негатыўных рыс паводзін людзей.

У творы П. Васючэнкі сюжэт таксама пабудаваны на шэрагу парадаксальных, часта анекдатычных здарэнняў (поліўка з ботаў, недарэчная дзяльба маёмасці, выседжванне яйка панамі і да т.п.). Пры гэтым многія з сітуацый, хоць і недарэчныя, але магчымыя ў жыцці. Цэнтральнымі персанажамі з'яўляюцца паны і сяляне, сустракаюцца таксама і гандляры, акторы і пад. Характарыстыка паноў як лянівых, фанабэрыстых, дурных у цэлым адпавядае фальклорнай.

б) Чарадзейныя (чарадзейна-фантастычныя) казкі – жанр, заснаваны на міфапаэтычнай фантастыцы, для якога характэрны звышнатуральныя вобразы (Цмокі, чараўнікі і г.д.), магічныя дзеянні і інш. У падобных творах выкарыстоўваецца асаблівая структура сюжэту, тыпы вобразаў-персанажаў, локусаў і рэчаў, спецыфічныя ўстойлівыя маўленчыя формулы і г.д.

З дадзенага жанру ў творы “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” назіраецца вобраз Цмока і яго маткі (хоць яна тут не Змяіха, як у фальклоры, а Кура Шчабятура), Кіта Велярыба, што плавае “за трыдзевяць зямель”, Калінавага маста (на якім, як і ў чарадзейных казках, героі сустракаюць Цмока), дзівоснага насення, з якога вырастаюць дрэвы з кілбасамі, булкамі, рознымі прысмакамі замест пладоў і інш. Сама формула *жылі-былі*, ужытая ў назве твора, характэрная менавіта для чарадзейных казак.

в) Анімалістычныя казкі (казкі пра жывёл) – жанр фальклорнай казкавай прозы, у якім цэнтральнае месца займаюць вобразы жывёл, што з’яўляюцца галоўнымі героямі і ўбіраюць у сябе ўласцівасці як сапраўдных звяроў, птушак, так і людзей. Людзі ў дадзеных казках таксама часам прысутнічаюць, і жывёлы ўступаюць з імі ў пэўныя стасункі, у тым ліку могуць размаўляць.

У казачнай аповесці П. Васючэнкі таксама сустракаецца шмат вобразаў жывёл, якія маюць чалавечыя рысы і пэўным чынам кантактуюць з людзьмі. Напрыклад, у главе “Дзяльба” паны імкнуцца падзяліць паміж сабой нават маленькае мышаня, якое “спрабуе абразуміць паноў” [1, с. 26] і кажа ім: “*Ці, панове блёкату аб’еліся? Я ж панам не лава і не печ. Мне ж, можа, таксама жыць хочацца*” [1, с. 26]. Ослік у главе “Конь Божы” паказаны як рэфлексуючая істота, для якой характэрна задуменнасць, роздумы пра мінулае і пра Ісуса Хрыста, а таксама жаданне спяваць. Кот Буркун увогуле нібыта носіць вопратку (“чорны храк з белым гальштухам” [1, с. 77]), кіруе мышамі як генерал, кахае прыгожую котку і грае ёй на мандаліне.

Такім чынам, у творы “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” мы бачым элементы з усіх асноўных жанраў народных казак, якія таленавіты пісьменнік здолеў аб’яднаць у новую, цікавую сістэму. Падобнае змяшэнне жанраў увогуле характэрна для літаратурных казак, асабліва з часоў рамантызму.

Твор П. Васючэнкі абазначаны аўтарам як “казачныя аповесці” і такая характарыстыка, сапраўды, у цэлым падыходзіць да яго. “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” мае многія рысы як народных казак розных жанраў, так і непасрэдна літаратурнай казкі. Прычым, аўтарскія казкі як жанр можна падзяліць на тры групы паводле суадносін з казкамі фальклорнымі: творы з амаль поўным запазычаннем сюжэту, вобразаў і іншых элементаў з народных казак; творы з частковым запазычаннем; творы, што амаль не падобныя да фальклорных [7]. У гэтым плане “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” адпавядае другому з адзначаных тыпаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Васючэнка, П.* Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі: казач. аповесці : для сярэд. шк. узросту / П. Васючэнка; маст. У. А. Лукашык. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 103 с.
2. *Гаврилов, Д. А.* Трюкач. Лицедей. Игрок. Образ трикстера в евроазиатском фольклоре / Д. А. Гаврилов. – М. : Ганка, 2009. – 288 с.
3. Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі / рэд. В. К. Бандарчык / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Беларус. нар. творчасць. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 496 с.
4. *Костюхин, Е. А.* Типы и формы животного эпоса / Е. А. Костюхин. – М. : Наука, 1987. – 271 с.
5. Сацыяльна-бытавыя казкі / рэд. В. К. Бандарчык / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Беларус. нар. творчасць. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 520 с.
6. *Фядосік, А. С.* Сацыяльна-бытавыя казкі // Народная проза / А. С. Фядосік, К. П. Кабашнікаў, А. В. Цітавец ; навук. рэд. А. С. Ліс. – Мінск : Бел. навука, 2002. – С. 296–371.
7. *Шамякіна, С.* Беларуская літаратурная казка // Полымя. – 2008. – № 8. – С. 92–97.
8. *Юдин, Ю. И.* Дурак, шут, вор и чёрт : Исторические корни бытовой сказки / Ю. И. Юдин // сост. и отв. ред. В. Ф. Шевченко. – М. : Лабиринт, 2006. – 336 с.

УДК 82.091; 821.581

И. Л. Шевлякова-Борзенко (Минск)

НЕОМОДЕРНЫЕ ПРАКТИКИ В АЗЕРБАЙДЖАНСКОЙ И КИТАЙСКОЙ ЛИТЕРАТУРАХ ПОСЛЕДНЕЙ ТРЕТИ XX ВЕКА: ТОЧКИ СХОЖДЕНИЯ НАЦИОНАЛЬНЫХ ФЕНОМЕНОВ

История теоретико-литературного осмысления модерна даже при беглом рассмотрении оказывается западоцентрированной. Однако обращение к «полицентричной» исследовательской оптике приводит к выводу о том, что модерность как основа и вместе с тем порождение неклассической картины мира многомерна и многолика. В связи с этим сегодня особый интерес представляет осмысление типологически схожих процессов и феноменов на Востоке.

Как известно, любой социокультурный феномен по-разному актуализируется в разных контекстах. Хотя он «может проявляться во внешне схожих структурно-функциональных формах, но это не отменяет различий на институциональном и социокультурном уровне. Поэтому, сегодня, как правило, речь идет о множественности модернов»; при этом каждый конкретный модерн «имеет локальное социокультурное содержание, детерминированное рядом местных факторов, прежде всего, социальным временем, различно протекающим в разных культурах» [6, с. 15–16]. То есть речь идет о потенциальной несинхронизированности, во-первых, модернов и национальных версий модернизма (как художественных «инкарнаций» модерности) различных обществ и культур, во-вторых, о разных темпах развития культурных «сюжетов», связанных с воплощением, «проговариванием» модерна в особых художественных структурах и смыслоформах, внутри самих социокультурных дискурсов. Кроме того, следует помнить о потенциальной эстетической, концептуальной и стилевой негомогенности модернизма даже в рамках одной национальной традиции. Связано это, в числе прочего, с тем, что модернизм – «не матрица, но парадигма развития» [6, с. 23].

Одной их ключевых черт модерна, который в западной традиции ассоциируется с отрицанием предшествующей традиции (классики), является *рефлексивность*: речь идет о перманентном пересмотре социальной реальности в свете новой информации или знания [5, с. 11], результатом чего может стать непрестанный процесс изобретения новых реальностей. В этом смысле модерность в ментальном пространстве Востока разворачивается, на наш взгляд, как проект принципиально иного модуса, аксиологического «залога». Мы полагаем, что специфика последней по времени восточной модерности связана с процессами индивидуации традиции при сохранении приоритета общественно, коллективно значимого. То есть в данном случае общая тенденция к сложному взаимовлиянию процессов глобализации и глокализации приобретает особый формат в «силовом поле» культур, так или иначе центрированных на традиции, классике, понимаемой в данном случае как средоточие национальной аутентики.

Азербайджанский философ А. Аббасов придерживается точки зрения, согласно которой третий этап эпистемологии следует называть *постнеоклассическим* (в общепринятой традиции он именуется *постнеклассическим*). Вслед за многими современными экономистами, философами и социологами, он предпочитает *нео* вместо *не*, поскольку «если второе подразумевает просто отрицание, то первое ассоциируется с инновацией, с развитием на качественно новых основаниях и новом уровне. К тому же, “нео” предполагает более разумное, ува-

жительное отношение к исторически прошлым этапам и достижениям – способствует соблюдению единства преемственности и инновационности» [1, с. 46–47]. Экстраполировать очерченное понятие постнеоклассики на стратегии литературного творчества было бы поспешно, однако по отношению к азербайджанскому литературно-художественному дискурсу последней трети XX в. мы полагаем терминологически уместным употреблять термин *постнеомодернизм* вместо *поздний неомодернизм*.

Можно предположить, что специфика литературного развития в Азербайджане последней трети XX в. связана с тем, что постнеомодернизм фактически становится титульным дискурсом. Мы не имеем в виду (само)провозглашение его ведущим художественным «методом» или «направлением». Речь идет о сложившейся уникальной ситуации, когда ренессансное, «возрожденческое» по интенции движение художественной словесности навстречу смыслам архетипическим, базово-классическим (через интерес к национальной мифологии, фольклору, классическому литературному наследию) наиболее естественно чувствует себя в пространстве модернистской эстетики. И это только на первый взгляд кажется парадоксальным: движение к архетипическому в конце XX в. – это типологически повторяющийся романтический проект возвращения к истокам, который в смысле поэтики просто не может быть строго реалистическим, ибо это всегда возвращение к Мифу и, соответственно, погружение в его поэтику. На любом этапе литературного развития обращение к истокам своеобразия художественной словесности неизбежно означает попытку «выговорить» в поэтике текста сложную, ускользающую, простую и непостижимую одновременно суть национального Мифа. Главный вектор внутреннего движения художественной литературы, ее самоорганизации как сложной системы в значительной степени определяют специфика и изменения коллективных ментальных структур. На уровне общеконцептуальном усиление декадансных настроений в азербайджанской литературе (и особенно поэзии) 1970-х гг. связывается с модернистскими попытками сфокусироваться не на человеке в целом, а на индивидууме. С начала 1970-х изменяются и «способы художественного выражения и отображения. Так, участилось обращение к иносказаниям (читай между строк), многослойным метафорам, сложным и многозначным символам. Выход в творчестве шестидесятников на передний план своеобразных символических образов и вообще поэтического символического мышления был результатом отражения существующих общественно-политических давлений и воздействий на мир художественной мысли» [4, с. 153]. Интересно, что в данном случае мы имеем дело с некой «инверсией» литературного развития: то есть не поэтика текста реагирует на изменения в социокультурном пространстве, но, наоборот, внутри поэтики Текста (художественной словесности в широком смысле) зреют предчувствия неизбежных трансформаций, парадигмальных сдвигов в «поэтике мира».

Китайский неомодернизм (в силу разных причин теоретико- и историко-литературного характера уместнее было бы определить его как *модернизм с китайской спецификой*) – явление современной художественной словесности, или так называемой *литературы нового периода*, точкой отсчета которой принято считать 1979 г., хотя первым новым по духу произведением специалисты называют рассказ Лю Синь-у «Классный руководитель», который был опубликован в 1977 г. и получил широкий резонанс год спустя [3].

Литературный процесс в Китае последних двух десятилетий XX в. представлял собой довольно стремительную смену нескольких литературных «волн»,

различных, прежде всего, в смысле идейно-концептуальном. Эта специфичность темпов литературного развития обусловлена в числе прочего конкретно-исторической спецификой развития КНР: так, по мнению китайских обществоведов, «глобализация стала важнейшей тенденцией мирового развития с 1960-х гг., а для Китая – с 1980-х» [2, с. 314].

1980-е гг. стали временем бурной диверсификации литературной жизни: так, число литературных журналов к 1983 г. уже достигло 500, резко расширились тематический и жанровый диапазоны литературных произведений, произошло разделение художественной словесности на «чистую» («серьезную») и «популярную» («массовую»). Реализм как художественный метод по-прежнему занимает доминирующее положение в литературе нового периода. Однако уже в первое его десятилетие (1976–1986 гг.) концептуальные и стилистические границы реализма существенно расширяются: понятие *современного реализма* в китайской литературе обозначает сложное сочетание классического и «мистического», психологического, а также структурного реализма, что, по мнению исследователей, «отражало одновременное развитие реализма с иными, нереалистическими творческими методами» [8, с. 127]. В конце 1980-х гг. социально-обличительный пафос (и соответствующая проблематика) уступают место художественной психологизации разных сторон и явлений жизни общества. А в 1990-х гг. «значительное место заняли произведения психологического плана с явным влиянием европейского модернизма, с акцентированным анализом эмоции и с неонатуралистическим бытописательством. Прежде весьма однородная, литература КНР переживала зарождение литературных школ и групп. Господствующим направлением на рубеже XX–XXI вв. оставалось реалистическое, но социальная критика в нем становилась всё слабее» [3].

Хотя исследователи говорят об усилении в поэзии и прозе влияния китайского модернизма, в это время, на наш взгляд, целесообразно говорить о постепенном формировании со второй половины 1980-х гг. в рамках общенационального литературно-художественного пространства *неомодернистского* дискурса. Поиски истоков формирования собственно модернистского сегмента в литературе Китая отсылают нас к истории понятия *шанхайский стиль*. Если первоначально (в дискуссиях конца 1920-х – начала 1930-х гг.) оно использовалось как собирательная метафора стиля жизни «компрадоров, хулиганов и проституток», а также «культуры, совершенно лишённой меры и элегантности» (по определению известного в то время писателя и публициста Чжоу Цзожэня), которые противопоставлялись традиционному *пекинскому стилю*, то к концу XX в. это понятие становится самостоятельной эстетической категорией, «обладающей собственными критериями художественности» [7]. В социокультурном дискурсе последней четверти XX в. по-новому актуализируются произведения «шанхайского стиля», написанные в конце XIX ст. (например, роман Хань Банцина «Цветы на море», 1892) и ближе к середине XX в. («Любовь в павшем городе», «Золотой замóк» Чжан Айлин). Своего рода реинкарнация (возрождение на новом витке литературного развития) «шанхайского стиля» знаменует собой, с одной стороны, рост интереса к литературе микрокосма: писатели обращаются к исследованию внутренней вселенной человека, психологичной и субъективной, осмыслению непостижимой и пронзительной красоты повседневности (романы «Песнь о бесконечной тоске», «Я люблю Билла», «Мини», «Мэйтоу», «Фупин» Ван Аньи, которая дебютировала в литературе в 1980-е). С другой стороны, в новом ракурсе предстает проблема диалога Востока и Запада. Можно сделать вывод о том, что

к концу XX в. «шанхайский стиль» в литературе оформляется в уникальное в содержательном и стилевом отношении явление, где «красота и изящество образов, развитый бытописательный план, субъективность изображения и глубокий психологизм создают новый ракурс рассмотрения как актуальной, так и традиционной творческой проблематики: сущности человеческой природы, соотношения эстетического и этического, мира мечты, сосуществования мира иллюзии и реальности» [7]. Эти ключевые параметры «шанхайского стиля», на наш взгляд, в полной мере могут быть экстраполированы на специфику китайского неомодернизма, представляющего собой феномен симфонического типа, который возникает из синтеза традиции, собственного художественного поиска и переосмысленных эстетических и стилевых заимствований.

В целом анализ особенностей воплощения «поэтики мира» в «поэтике Текстов» азербайджанской и китайской литератур 1960-х – 1990-х гг. позволяет говорить о наличии ряда «точек» типологического схождения между азербайджанским постнеомодернизмом и китайским неомодернизмом. Одна из важнейших – это имманентное принятие национальной идентичности коллективистского типа как альфы и омеги индивидуальных исканий. Масштабные (само)идентификационные процессы, как правило, стимулируются обострением глобальных проблем, которые оказываются актуальными для разных обществ и традиций.

Идентичность в новейшей (конца XX – начала XXI вв.) социокультурной парадигме Азербайджана и Китая утверждается как источник развития и преимуществ.

В обеих культурных традициях декаданс рассматривается как источник новых возможностей для национального оптимизма и, следовательно, эстетических перспектив национальной же художественной словесности. Одним из истоков такой феноменальной ситуации является особая роль созерцательности как особого механизма творчества: изобретение и бесконечное совершенствование предпочтительнее «открытиям-озарениям». Возможно, этим также объясняется специфика неомодернистских литературно-художественных практик в азербайджанской и китайской литературах: восприятие традиции, классики как неиссякаемого источника совершенствования, новой перспективы.

Указанная перспектива виделась в опоре на *аутентику* (в случае с литературой – на национальную художественную классику) как ядро нематериальной идентичности. Дело в том, что «достижение значительным числом стран уровня модернити, обязательным этапом которого было разрушение старой идентичности, вновь повысило интерес к “многообразию стилей мышления”, “равенству онтологий” и диалогу»; одновременно стала подвергаться критике (в Китае – последовательно) «рациональность… неизбежно подавлявшая духовные ценности и препятствовавшая формированию новой, нематериальной идентичности» [2, с. 318–319]. В средоточии декадансных настроений и мотивов, там, где в западной традиции (в широком смысле) расширяется до бездонной «черной дыры» так называемая финальная точка истории человеческой культуры, в постнеомодренизме Азербайджана и неомодернистском дискурсе литературы Китая формируются «точки отсчета» новых перспектив – аксиологических, эстетических, стилевых. Иначе говоря, горизонт обновленной идентичности, принципиально созидательной, виден уже из эпицентра неодекаданса.

Таким образом, сущностное сходство глубинных интенций азербайджанского постнеомодернизма и китайского неомодернизма заключается, на наш взгляд, в общей устремленности художественного сознания к аксиологии общенацио-

нального как архетипического (в том числе через актуализацию национальной классики) – при усилении декадансных настроений в условиях утверждения модерного (ревизионистского в основе) мироощущения. Концептуальной основой обоих феноменов – постнеомодернизма в азербайджанской традиции и неомодернизма с китайской спецификой – стала художественная индивидуация коллективного опыта сохранения и трансляции национальной картины мира и системы ценностей. Данные феномены оказали существенное влияние на формирование национальных литературных ландшафтов начала XXI века.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Аббасов, А. Ф.* Постнеоклассическая эпистемология: необходимость и сущность / А. Ф. Аббасов // MÜASİR FƏLSƏFƏ, ELM VƏ MƏDƏNİYYƏT: POSTQEYRİ-KLASSİK EPİSTEMOLOGİYA (Respublika konfransının materialları, 18 may 2011-ci il) Bakı, Elm, 2011. – С. 35–47.
2. *Виноградов, А. В.* Китайская модель модернизации. Поиски новой идентичности. / А. В. Виноградов. / издание 2-ое, испр. и доп. – М. : НОФМО, 2008. – 368 с.
3. *Желоховцев, А. Н.* Современная литература / А. Н. Желоховцев // Духовная культура Китая: энциклопедия: в 5 т. / гл. ред. М. Л. Титаренко; Ин-т Дальнего Востока. – М. : Вост. лит., 2006. – Т. 3. Литература. Язык и письменность / ред. М. Л.Титаренко и др. – 2008. – С. 167–175.
4. *Касымов, Я.* Советский ренессанс и шестидесятники (размышления о поэзии русских и азербайджанских шестидесятников / Я. Касымов // Культура народов Причерноморья. – 2014. – № 275. – С. 148–153.
5. *Кравченко, С. А.* Социология модерна и постмодерна в динамически меняющемся мире / С. А. Кравченко. – М. : МГИМО-Университет, 2007. – 264 с.
6. *Образцов, А. В.* Модернизм / модерн / А. В. Образцов // Модернизм в литературах Азии и Африки. Очерки. – СПб. : Восточный факультет Санкт-Петербургского государственного университета, 2015. – С. 3–93.
7. *Семенюк, Н. В.* «Шанхайский стиль» в современной литературе Китая / Н. В. Семенюк // Общество и государство в Китае: Т. XLIII, ч. 1 / редкол.: А. И. Кобзев [и др.] – М. : Федеральное государственное бюджетное учреждение науки Институт востоковедения Российской академии наук (ИВ РАН), 2013. – С. 642–644.
8. *Турушева, Н. В.* Современная китайская литература как отражение социальных процессов в КНР / Н. В. Турушева // Вестник Томского гос. ун-та. – 2014. – № 383. – С. 126–132.

УДК 821.161.3.09 “19” – 1 «Снежань»

І. І. Шматкова (Мінск)

«ЗАГРУЗКА – ПРАЦЭС – РАЗГРУЗКА – ПАЎЗА»: МАСТАЦКІ СВЕТ ГАЛІНЫ БУЛЫКА

Лірыка Галіны Булыка – адметная з’ява ў беларускім прыгожым пісьменстве, яе вершаванае слова вылучаецца арыгінальнай вобразнасцю, філасофска-інтэлектуальнай заглыбленасцю; творчы шлях паэтэсы – адлюстраванне лёсу жанчыны, на які выпалі шматлікія выпрабаванні часоў тыктанічнага зруху эпох на мяжы стагоддзяў. Прыйшоўшы ў літаратуру разам з яркімі прадстаўніцамі плеяды жанчын-паэтэс другой паловы XX ст., яна сваёй творчасцю аздобіла і ўзбагаціла беларускую літаратуру.

Паэтэса заявіла пра сябе ў літаратуры арыгінальна і вельмі эфектна, зборнік яе вершаў «Сінтэз» (1986) стаў адкрыццём новага тыпу вершаў. Яе творы не былі падобны на вершы яе калег ні па зместу, ні па вобразна-мастацкаму напаўненню; крытыкі «*раскласіфікавалі*» аўтарку як «*хіміка і гарадскую паэтэсу*», а яе творы – як «*навуковую паэзію*». Кніга сапраўды стала сінтэзам спецыфічных яскравых вобразаў: рэчыўных (вершы «Горны лён», «Лазурыт», «Бурштын», «Гіпс», «Свінец», «Золата», «Агонь», «Гліна», «Ёд» і інш), матэматычных («Матэматычны трыпціх», «Локан Аньезі», «Камбінаторыка», «Паралельнасць» і інш.), жывапісных (творы, прысвечаныя палотнам П. Пікаса, Э. Дэга, Р. Кента, Ю. Піменава) і інш. Прычым усе гэтыя шматпланавыя вобразы па-мастацку

цэласна звязаны, сінтэзаваны ў адзіны паэтычны сусвет. Як гэта атрымліваецца ў аўтара – спалучыць у сабе «і фізіка, і лірыка», дакладней сказаць, «*і хіміка, і паэта*»? У чым загадка такога незвычайнага таленту? Неднаразова літаратуразнаўцы спрабавалі правесці аналіз «Сінтэза» Г. Булыкі.

Нарадзіўшыся ў сям'і філолагаў (маці – настаўніца, бацька – вядомы беларускі мовазнаўца А. М. Булыка), Галіна Аляксандраўна з дзяцінства да філалогіі ставілася як да недакладнай дысцыпліны, якая займаецца хутчэй уражаннем ад прадмета, чым самім прадметам. У сваім эсэ «Свет у маіх каардынатах» аўтарка ўспамінала выпадак з дзяцінства, калі маці ў адбітку люстэрка ўбачыла агонь у акне і гэтым прадухіліла пажар: «*Мабыць, з таго часу я і палюбіла ўсялякія гладкія паверхні, здольныя адбіваць – пераўвасабляць навакольнасць. Адлюстроўкі, адбіткі, блікі не адно скажаюць, але і пашыраюць свет. І агонь таксама люблю…*» [2, с. 2]. Сапраўды, адзін з першых даследчыкаў яе паэтычнага таленту літаратуразнаўца С. Кавалёў у сваім артыкуле «Партрэт шкла» дакладна вызначыў цэнтральны вобраз гэтага яе першага рознапланавага зборніка «Сінтэз»: «*шкло ў вершах Галіны Булыка – знак, сімвал усяго складанага і незвычайнага, што знаходзіцца з намі побач і не ўспрымаецца, не ўсведамляецца, зацемненае нашай звыкласцю і абыякавасцю*» [8, с. 90].

Другі паэтычны зборнік аўтаркі «Турмалін» (1994) мае назву рознакаляровага камня, на крышталях якога адкрылі з'яву палярызацыі святла (здольнасць змяняць колер у залежнасці ад асвятлення). І зноў сусракаем тыя ж вобразы, што і ў першай кнізе: рэчыўныя (вершы «Вада», «Лёд», «Соль зямлі», «Мармур», «Слюда» і інш.), жывапісныя (вершы «Пітэр Брэйгель Старэйшы», «Агонь» Дж. Арчымбальда», Я. Вермеер «Дзявочы партрэт у інтэр'еры» і інш.). Але і з'яўляецца новая вобразная сістэма ў мастацкім светапоглядзе аўтаркі – людзі розных прафесій – тыя, хто судакранаецца з такімі блізкімі ёй рэчывамі, прадметамі, – нібы павадыры паміж рознымі сусветамі, прыродным і чалавечым (вершы «Ювелір», «Рэзчык люстраў», «Гутнік», «Звярыннік», «Ганчар», «Садоўнік», «Разьбяр», «Галаснік», «Страхар», «Каваль», «Камяняр» і інш.). Яшчэ адна вобразная сістэма паэтэсы – часавыя каардынаты (вершы «Зала чакання», «Пасажыр», «Статыка руху», «Гадзіннікавая майстэрня», «Спружына», «Пясковы гадзіннік», «Геаметрыя часу», «Плынь» і інш.). Узнікае пытанне – ці можна такую паэзію аднесці да «*навуковай*», тым больш «*хімічнай*»? У адным з інтэрв'ю Л. Дранько-Майсюку на яго пытанне, пра што верш, Г. Булыка зазначыла: «*Гэта наогул пра смяротнага чалавека, які спрачаецца з Творцам у плыні неасправэчнага. Наш час, наша прастора, наша ўздзеянне на навакольнасць несумаштабныя бясконцай вонкавасці*» [6, с. 83].

Акрэсліваючы свае адносіны з хімічнай навукай, аўтарка ўспамінае выпадак, калі яна ледзьве выратавалася падчас выбуху ў хімічнай лабараторыі, пасля чаго яна «*страціла любоў да хімічнай кухні назаўсёды*» [2, с. 4]. Такім чынам, на нейкім жыццёвым этапе перамог «*лірык*». Закончыўшы Вышэйшыя літаратурныя курсы, Г. Булыка згадвае: «*Навакольнасць убачылася не агульнымі рысамі, але пэўнымі сімваламі. Яны прыходзілі з нейкай іншай прасторы і высвятлялі вечныя тэмы. Кнігу* «*Турмалін*» *не пісала, а складала. Кожны верш з'яўляўся ў стане зменены свядомасці…*» [2, с. 5]. Паэтэса вельмі дакладна апісвае этапы ўзнікнення твора: ад ідэі праз метафару да яе крышталізацыі. За што некаторыя даследчыкі паспяшаліся вызначыць яе паэтычнае слова як рацыяналістычнае, цвёрдае, «у вершах няма жаночай пяшчоты і гуллівасці, няма традыцыйнага вобраза каханага» (Л. Дранько-Майсюк). У гэтым выпадку Г. Булыка «пары-

руе»: «*У маіх пошуках не больш рацыяналізму, чым у дзеяннях ральнай птушкі, якая дзяўбе намаляваную рабінавую гронку*» [6, с. 89]. А што тычыцца жаноцкасці ды кахання, то, насамрэч, яны ў паэзіі аўтаркі таксама ў наяўнасці (вершы «Чый ахоўны анёл упадзе…»: «*Не імкніся да зорак, жанчына…*» [4, с. 27], «Ці ж ён суджаны?», «Чаканне»: «*Жанчына там хапаецца за цень…*» [4, с. 29], «Ліліт», «Паэтка» і інш. Крыху пазней Г. Булыка стварае паэтычную нізку «Метакаханне», у якой галоўнымі вобразамі сталі як славутыя жанчыны-сведкі гісторыі (вершы «Кліо», «Каліпса», «Клеапатра», «Дэметра», «Еўфрасіння»), так і прадстаўніцы жаночай лініі з «Сямейнай хронікі» (вершы «Вінцэнта», «Яніна», «Галіна», «Хрысціна»). Дарэчы, ужо пазней, у 2014 г. адна з даследчыц інтымнай лірыкі беларускіх паэтэс А. Брадзіхіна добра ахарактаразавала адметнасці ўвасаблення тэмы кахання ў «*філасофска-інтэлектуальнай*», «*метарэалістычнай*» мастацкай сістэме Г. Булыка [1]. Хаця на пытанне аўтара артыкула пра адносіны да гендарнага падзелу літаратуры аўтарка адказала: «*Гендарны падзел можа быць толькі ў лазні*» [з архіва аўтара – І. Ш.].

Не абыйшла ўвагай у сваёй творчасці паэтэса і балючую тэму Чарнобыля: у яе мастацка-вобразную сістэму ўплятаецца палыновы вянок (верш «Вецер»), з'яўляецца дзіця, якое п'е атруту з малаком маці (верш «Ноч звар'яцела…»), а таксама атручаная радаводная студня (верш «Балота») і інш.

Прыцягвае ўвагу чытача ў творах аўтаркі і ўрбаністычны пейзаж у кнізе «Турмалін» (вершы «Менскі скразняк», «Кальварыя. Восень» і інш.), у больш позняй паэтычнай нізцы «Стары Менск» (2000) (вершы «Траецкае прадмесце», «Касцёл», «Верхні горад»). Дзе вытокі фарміравання такой адметнай эстэтыкі паэтэсы?

Найбольш трапна, на наш погляд, вызначыў феномен таленту Г. Булыка В. Рубанаў у эсэ «На востраве тайны», адзначаючы разам з усім адмысловую прагу ведаў, эрудыцыю і інтэлект аўтаркі: «паэту вёскі надоўга хапае паэтызмаў рэальных, зрокавых, слыхавых (амаль што гатовых), і ён больш прыземлены, ціхапачуццёвы, тады як паэт горада, а злашча жанчына, проста вымушаны імкнуцца ўвысь, у неба, у галактыку, у свет абстрактных матэрый» [7, с. 91]. Сама паэтэса ў вершы «Смалісты след на высахлым палене…», не аспрэчваючы сказанае, акрэслівае так вытокі свайго таленту: «*Інтэлегенты ў першым пакаленні // Мае бацькі. // Мае праваднікі <…> Мой горад рос // на падваконні мулкім // З пабітага ў дарогах чарапка. // І я, // нібы ўскраінная вулка: // Душою не з насення - // з чарапка*» [4, с. 58]. Гэтымі радкамі Г. Булыка яшчэ раз пацвярджае сваю далучанасць да беларускага літаратурнага працэсу канца XX ст., калі адным з вядучых пытанняў самарэалізацыі творцы было вызначэнне ролі інтэлегенцыі, праблема так называемай вясковай і гарадской літаратуры.

Паэзія Г. Булыкі па-ранейшаму прыцягвае сваёй загадкавасцю і таямнічасцю, насамрэч так, як і сама асоба аўтаркі. Доўгі час аматары і знаўцы беларускага прыгожага пісьменства губляліся ў дагадках, дзе знікла імя таленавітай, выбітнай паэтэсы, якая ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. здзівіла сваім вершаваным словам, чаму так доўга не з'яўляюцца яе новыя кнігі. І толькі не так даўно ў Інтэрнэце быў раскрыты сакрэт «*многагаблічча*» Г. Булыкі. Аказваецца, яна доўгі час працавала ў жанры жаночага рамана. Пад шматлікімі псеўданімамі выпусціла шэраг жаночых раманаў у маскоўскіх выдавецтвах «Вагриус» і «Яуза» (В. Васильева «Обретение счастья», Г. Яхонтова «Сны Анастасии», «Черная роза Анастасии», Г. Шаревская «Восток любви», Э. Фокс «Белоснежка и Чернодымка» і інш.). У сааўтарстве са сваімі псеўданімнымі асобамі выдала кнігу: Булыка Г. А., Лісовская Е. В., Яхонтова Г. А. «Великие ученые XX века»

(М.: Мартин, 1999). На пытанне аб траістасці асобы аўтара апошняй кнігі адказала проста: «*Каб было больш важка*» [з архіва аўтара – І. Ш.]. Чаму аўтар доўгі час хавала сябе пад псеўданімамі, прычым рознымі? Магчыма, не хацела афішаваць сябе як аўтара камерцыйнага на той час жанра жаночага рамана. Але ж яе творы ў гэтай форме таксама маюць высокую мастацкую вартасць. Можа гэта ад дзіўных адносін у той час да самога факту існавання «жаночай» літаратуры як да нечага другаснага? Дык, здаецца, час змяніўся. Хоць сама аўтарка не любіць гэтага падзелу на мужчынскіх і жаночых аўтараў і ацэньвае значнасць твораў па іх якасці, але ж час паказвае, што сёння жаночая творчасць набірае папулярнасць і вельмі запатрабавана ў чытача, сёння змяняюцца адносіны да самой жанчыны, спадзяёмся, змяняецца само месца жанчыны ў грамадстве. І адпаведна, жаночая творчасць ужо не будзе аўтаматычна адносіцца да другаснай толькі таму, што яна жаночая, а сапраўды будзе ацэньвацца па сваіх мастацкіх вартасцях.

Здаецца, Г. Булыка знайшла свой шлях у прафесійнай рэалізацыі – сёння яна з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса, які асвячае нафта-газавыя пытанні, – што называецца, «лірык» і «хімік» супалі, знайшлі агульную мэту. Але памятаючы такі цудоўны паэтычны дэбют, тая, як некалі зазначыла сама аўтарка, «*эзатэрычная секта апантаных прыхільнікаў прыгожага пісьменства*» [6, с. 86] ужо доўгі час знаходзіцца ў чаканні яе новых паэтычных адкрыццяў. Тым больш сама паэтэса-хімік так вызначыла свой творчы шлях у хімічнай тэрміналогіі: «*Загрузка – працэс – разгрузка – пауза*» [2, с. 3]. Паўза – «*цёмная фаза назапашвання, найперш, эмацыйнага. Як некалі сказаў Райнер Марыя Рыльке, паэзія – гэта досвед… Дакладная формула. Жыцейскія клопаты і праца ў журналістыцы адбіраюць шмат часу, але патрэбнага досведу не даюць. Больш за тое, шмат энергіі ідзе на рэакцыю нейтралізацыі*» [2, с. 6]. Але ж па закону развіцця тэхналагічнага працэсу, фазы павінны паўтарацца. Будзем з задавальненнем чакаць ад паэтэсы новай «*разгрузкі*» і новых паэтычных кніг!

ЛІТАРАТУРА

1. *Брадзіхіна, А.* 90-60-90 (Сучасны літаратурны працэс: на шляху да ідэалу): зб. навук.-крыт. арт. / А. В. Брадзіхіна; М-ва адукацыі РБ; Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2014. – 200 с.
2. *Булыка, Г.* Свет у маіх каардынатах: эсэ / Г. Булыка // Хатні архіў аўтара – Г. Б. – 6 с.
3. *Булыка, Г.* Сінтэз: вершы / Г. Булыка. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 86 с.
4. *Булыка, Г.* Турмалін: вершы / Г. Булыка. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 94 с.
5. *Булыка, Г.* Механічны сусьвет: З нізкі вершаў «Метакаханьне»: вершы / Г. Булыка // Дзеяслоў. – 2003. – № 3. – С. 3–10.
6. *Дранько-Майсюк, Л.* З табою: з Галінай Булыка гутарыць Л. Дранько-Майсюк / Л. Дранько-Майсюк // Крыніца. – 1994. – № 7. – С. 82–90.
7. *Рубанаў, У.* На востраве тайны: будзённае і вечнае ў паэзіі Галіны Булыка / У. Рубанаў // Крыніца. – 1994. – № 7. – С. 89–91.
8. *Кавалёў, С.* Партрэт шкла / С. Кавалёў // Як пакахаць ружу: літаратурна-крытычныя артыкулы пра маладую беларускую паэзію 80-х гадоў. – Мінск : Маладосць, 1989. – 110 с.

УДК 811.161.3’42’373.2:398:27-468.6(=161.3)

С. А. Вяргеенка (Гомель)

ПРЫРОДНА-ЛАНДШАФТНЫЯ МІФАЛАГЕМЫ Ў ПАЭТЫЧНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСКІХ ЗАМОЎ

Актуальнасць вывучэння прыродна-ландшафтных вобразаў-міфалагем абумоўлена тым, што гэтыя аб’екты, стыхіі з’яўляюцца не толькі тым асяроддзем, дзе пражывае і гаспадарыць чалавек, але і тым, што яны ў значнай ступені фарміруюць светапогляд, менталітэт і этнакультурныя традыцыі народа. Да таго ж элементы ландшафтна-геаграфічнага асяроддзя з’яўляюцца ключавымі элементамі, якія фарміруюць адметную выяву свету беларуса-палешука. Такімі ключавымі элементамі ў міфалагічнай (па прыродзе сваёй) канфігурацыі свету выступаюць **вадаёмы**. Тэматычная група міфалагем, якая суадносіцца з рэаліямі палескага ландшафтнага асяроддзя, надзвычай дэталізаваная: акіян, мора, рэкі, ручаі, азёры, крыніцы, балоты, калодзежы і інш. Культ вады – адзін з самых архаічных, і на працягу ўсяго жыцця чалавека ад нараджэння і да смерці застаецца і сакральным, і эстэтычным арыенцірам, замацаваным у побытавых практыках, абрадах, прыкметах, павер’ях, загадках, замовах. І гэта не выпадкова, калі ўлічыць, што вада – самае пашыранае рэчыва на планеце Зямля. Сусветны акіян займае прыблізна 80 % (дакладней 70,8 %) паверхні планеты, а калі дадаць яшчэ вадаёмы сушы, падземныя воды, леднікі, то карціна атрымаецца настолькі ўнушальная, што па справядлівасці планету варта было б называць не Зямля, а Вада.

Вада – гэта першааснова жыцця, адзін з універсальных вобразаў-сімвалаў традыцыйнай міфалагічна-народнай канцэпцыі будовы свету. Першаступеннае значэнне ключавых, знакавых вобразаў – у іх функцыянальнай напоўненасці. У гэтай сувязі важнымі з’яўляюцца такія характарыстычныя адзнакі вады, як характар руху (рухомая, быстрая, марудная, стаячая), бяспечная ці небяспечная, чыстая ці брудная і г.д. У міфалагічных уяўленнях нашых старажытных продкаў усё значна прасцей: вада можа быць або жывой, або мёртвай. Мёртвая вада – гэта стаячая, брудная, і ў такім плане яна нясе негатыўную інфармацыю. У замоўным жанры акіян, мора, балота – вада стаячая, непазнаная, гэта мяжа паміж “гэтым” і “тым” светам, населеным інтэрнальнымі істотамі і хваробамі. Гэта першазданная стыхія хаоса, што адназначна ўспрымалася патэнцыяльнай пагрозай. І ў той жа час мору-акіяну “приписывается способность порождать всё сущее на земле и саму землю…” [1, с. 281]. Наш старажытны продак ведаў, што зямля нарадзілася ў моры-акіяне і ўтрымліваецца “на трох кітах, трох кіціцах” (запісана ў в. Забалоцце Акцябрскага р-на ад Ахрамчык Н. М.) або, як мяркуе І. С. Каленчукоў з в. Зябраўка Гомельскага р-на, “свет (зямля – С. В.) трымаецца на трох сланах”, што ўпісваецца ў традыцыйнае касмаганічнае ўяўленне нашых старажытных аўтараў і замаўляльнікаў. Сама ж хаатычная, непрадказальная стыхія мора-акіяна, насылаючы розныя хваробы, якія жылі ў іх глыбінях, несла чалавеку пакуты і смерць. Бараніцца ад гэтых шкаданосных хвароб можна было выпрабаваным сродкам – абрадам замаўлення, адправіўшы агрэсараў на іх прывычнае месца жыхарства. Менавіта туды, у гіблае месца, адсылаюцца хваробы. Так, Л. А. Еўжанка з г. Хойнікі ссылае рожу “…у далёкія

краі…, глыбокія моры, дзе людзі не ходзяць, дзе месяц не свеціць і сонца не грэе", а гэта значыць, гэтая прастора адназначна хаатычная, варожая. І ўжо зусім адкрытым тэкстам Е. І. Матарас з г. Тураў Жыткавіцкага р-на адсылае порчу, якую на чалавека насылае "чорт-сатана", туды, "дзе трава не расце, дзе сонца не грэе, дзе вецер не вее, ідзі ў бездну, на дно", туды, дзе і гаспадарыць "князь тьмы" – сатана.

Этнапрастору палескага краю найперш характарызуе топкае\мокрае балота – дамінантная прыродная стыхія, якую з поўным правам можна разглядаць як адзін з архетыпаў і адну з асноўных міфалагем замоўнага жанру. Ва ўсведамленні старажытнага чалавека спрадвеку замацавалася стэрэатыпная ацэнка і адпаведныя адносіны да балота як да параджэння Чарнабога, стыхіі таямнічай, хаатычнай, населенай экстранальнымі істотамі (багнік, балотнік, чэрці, хваробы). Таму зусім не выпадкова ў замове "Ад зубнога болю", запісанай у в. Краснае Брагінскага р-на ад Скідан Г. К., зубны боль адсылаецца "ў сухія ляскі ды ў мокрае балота", бо хвароба "прыйшла ад чорта, а не з неба". Сваімі вобразамі і складнікамі структуры замова выяўляе вытокі старажытнай дыхатаміі "дабро\ ліха", "неба\зямля(балота)", "верх\ніз", "Бог\чорт"; "ад чорта", чытай, з балота – месца знаходжання нячысціка, адпаведна "з неба" – месца знаходжання боскіх сіл. Адпраўляючы хваробу ў балота, замаўляльнік-гуманіст не знішчае яе фізічна, што было б зусім лагічна, каб хвароба больш нікому не пашкодзіла, а вяртае на месца пастаяннага яе жыцця. Што гэта так, пераконвае фрагмент замовы "Ад скулы", запісанай у в. Уборак Лоеўскага р-на ад Пятровай Н. І., дзе замаўляльнік звяртаецца да хваробы: "Скула-скуліца, ідзі за высокія горы, на сухія ляса, на топкія балата, там твае дзеткі, там цябе іх расціць, паіць, гадаваць і да канца века дажываць". Як бачым, ва ўяўленні нашых продкаў, хваробы, як і іншыя насельнікі прыроды, жывуць такім жа жыццём, як і людзі: вядуць гаспадарку, маюць сям'ю, росцяць і выхоўваюць дзяцей і г.д. А гэта значыць, што зададзены з часоў першатварэння рытм і ўклад жыцця працягваецца і прыклад усяму – сусветнавядомая нябесная іерагамія: Неба-бацька і Зямля-маці, дзе каб Маць-сыра зямля нарадзіла і вырасціла ўсё жывое, Бацька-неба павінен апладніць яе нябесным малаком-дажджом.

Жывая вада – гэта вада чыстая, гаючая, праточная. Найперш адзначым прынцыпова важную акалічнасць, што семантычны блок "ісці", "цекчы", "плыць" у міфалагічнай свядомасці адносіцца толькі да вады і больш не ўжываецца ні з адным элементам прыроднага ландшафту: "Шлі тры ракі: адна вадзяная, другая мядовая, трэцяя крававая…" (запісана ў в. Стараград Кармянскага р-на ад Тарасенка З. П.), або "Вадзіца-травіца па мору хадзіла, пясочак сеяла…" (запісана ў в. Бібікі Мазырскага р-на ад Дарошка В. Я.), ці "Цякло тры рэчанькі…" (запісана ў в. Ручное Лельчыцкага р-на ад Семянко Г. П.).

Вобраз вады адназначна характарызуецца яскрава выражанай амбівалентнасцю. З аднаго боку, гэта жыццядайная стваральная сіла (пачатак жыцця), з другога – асацыіруецца з разбуральнымі праявамі прыродных сіл (сусветны патоп, які згубіў усё жывое, апрача таго, хто выратаваўся на каўчэгу). Але ж патоп – гэта і ачышчэнне зямлі ад грахоўнага бруду. Дарэчы, яшчэ з дахрысціянскіх часоў наш прашчур верыў у ачышчальную і гаючую сілу вады. Маніпуляцыі з вадой падчас лекавання-замаўлення скіравана на магічнае ачышчэнне ад хваробы. Так, рытуальнае замаўленне вады даволі шырока практыкавалася ад розных хвароб, напрыклад, ад пухліны ("На груди было вот такое яйцо… Она мне сказала, чтоб я с дому привезла воду. Потом я пила эту воду и мылась вся,

добавляла эту воду даже в ванну. В течение месяца я к бабушке ходила три раза до захода солнца” [2, с. 38, № 79]), ад зглазу (“Чытаюць на воду, якой пояць і ўмываюць бального” [2, с. 52, № 138]; “Калі ў рабёнка разгарэўся твар, і ён плача без прычыны, тады маці западозрывае, што гэта “сглаз”, умывае яго вадой і выцірае сваёй сарочкаю…” [2, с. 52, № 135]), ад храпу (“Патрэбна чытаць замову на ваду альбо малако. Замаўляюць ваду (малако) раніцай пад абразом. Даюць піць яе храпуну тры разы на дзень” [2, с. 75, № 245]), для палягчэння родаў (“Затым на чатыры вуглы стала наліць свячонай вады. Цяжарная жанчына павінна выпіць гэтую ваду вуснамі, трымаючы рукі за спіною” [2, с. 74, № 244]), ад хваробы дзяцей (“Берут ковшик, искупавши ребенка, ставят его на ножки и, ополаскивая, пока льется вода из ковшика, говорят эти слова. Говорится три раза, три раза поливается” [2, с. 54, № 141]), ад спалоху, неўрозу (“Нагаварыць на ваду. Ёй пояць і ўмываюць бальнога” [2, с. 51, № 133]) і інш.

Рытуальнае абціранне, абмыванне, змыванне паганай энергетыкі, зліванне вады над хворым у працэсе замаўлення, выпіванне загаворанай вады мела станоўчыя вынікі, вяло да пазбаўлення ад пакуты, да аднаўлення сіл. Яшчэ адным магічным спосабам замацавання рытуальнага дзеяння і вербальна-тэкставай магіі было сплёўванне, якім часта заканчваўся рытуал лекавання. Так, Н. І. Дземянкова, 1923 г. н., з в. Патапаўка Буда-Кашалёўскага р-на раіла “Пасля кожнай замовы (а ў яе калекцыі 19 адзінак – С. В.) падуць на чалавека і сплюнуць праз левае плячо. Затым паўтарыць яшчэ раз, сплюнуць два разы, падуць трэці раз, сплюнуць тры разы” [2, с. 29, № 42]. Пры лекаванні “Ад апёку” М. М. Цярэшчанка, 1931 г. н., з в. Засінцы Ельскага р-на здзяйсняе наступны рытуал: “Плююць на апёк і чэрцяць вакол апёку тры разы безымянным пальцам”, а затым чытае замову “Госпадзі Ісусе Хрісце, помілуй нас. Зоря от зорі, маё слово от огня, моі слюні от болі” [2, с. 52, № 137].

Найчасцей інфарматары паведамляюць, што напрыканцы лекавання трэба “дзевяць раз дунуць і плюнуць праз левае плячо” [2, с. 108, № 409]. Л. В. Прыходзька, 1939 г. н., з в. Мялешкавічы Лельчыцкага р-на раіла пасля прамаўлення замовы “Ад ляку” (а яшчэ “Падвей”, “Ад ляка”) “Вымаўляць на сходніх днях у мужскі дзень (панядзелак, аўторак, чацверг, нядзеля) перад сном, каля іконы, адзін раз замову і тры разы «Отче наш», пры гэтым сплёўваць тры разы цераз плячо” [2, с. 109, № 415].

Наогул трэба адзначыць, што ва ўсходніх славян прамаўленне лекавай замовы звычайна і заканчвалася “сплёўваннем праз левае плячо”, бо паводле народных уяўленняў, па-першае, на левым плячы знаходзіцца анёл-спакуснік, па-другое, сліна, як і іншыя выдзяленні чалавечага цела, здаўна лічылася нячыстасцю, брудам. Таму такое дзеянне тлумачылася негатыўным стаўленнем ці да “цёмнага анёла”, ці да хваробы, ці да чаго-небудзь небяспечнага. Негатыўная семантыка сліны і плявання захавалася і ў наш час, напрыклад, у зняважлівых (слюнцяй, смаркач і да т.п.) або ў фразеалагічных адзінках “цьфу на цябе”, “пляваць мне на што-небудзь”, якія выражаюць знявагу, абыякавасць, незадаволенасць. Дэманструючы падобнае стаўленне да злога, небяспечнага духа, замаўляльнік імкнуўся пазбавіцца ад яго. Такі прынцып уздзеяння – пакрыўдзіць агрэсара-хваробу – у замовах назіраецца даволі часта: “Ячмень-дурак, не садзісь тут так, а ідзі ты ў поле, у сіне морэ” [3, с. 259, № 1016], або “залатуха – злая старуха, адстань ад рабы (імя)” [3, с. 203, № 755], ці “лішай, лішай, лішавіна, твая маць – жыдавіна, твая маць – свіння, парасятам цыцкі не дала. У рабы Божай (імя) лішая няма” [3, с. 20, № 9] і многія іншыя. Гэтыя і падобныя сітуацыйныя зняважлівыя дзеянні

ўваходзілі і ў замовы і дайшлі да нашага часу як старадаўняя спадчына анімістычна-фальклорнага мыслення і як традыцыя далетапісных вякоў (мы і цяпер, каб не “зглазіць”, не перашкодзіць лішнім, не ў час сказаным словам, гаворым “сплюнь цераз левае плячо”, і то і тройчы сімвалічна сплёўваем, або тройчы стукаем па драўляным прадмеце). Менавіта з перасцярогай не нашкодзіць, не абразіць сакральную існасць існуе цэлы шэраг забарон. Так, нельга пляваць на зямлю, на агонь, каб не пакрыўдзіць, не выказаць гэтым сваім учынкам знявагу да жыццядайнай стыхіі. Як бачым, у гэтай іпастасі сліна (як вадкасць) асацыіруецца з негатыўнай характарыстыкай, што яшчэ раз можа пацвердзіць дуалістычныя ўяўленні нашага продка пры мадэляванні народнай карціны свету, дзе вада заняла сваё адметнае месца і прадстала ў розных іпастасях: гэта і жывая – гуллівая, ачышчальна-гаючая, і разбуральна-знішчальная стыхія. Гэта і ўлонне, дзе нараджаецца і без чаго не можа існаваць усё жывое, і мяжа паміж жывым і мёртвым, і адначасова стыхія “гэтага” і “таго” свету, населеная найчасцей пачварамі, варожымі чалавеку (вадзянік, балотнік, нячыстыя духі, хваробы і інш.). Думаецца, не будзе перабольшваннем, калі сказаць, што ні адзін з прыродных архетыпаў у замоўным жанры не прадстаўлены так шматбакова, як вада.

У структуры міфапаэтычнай мадэлі свету адным з базавых элементаў прасторава-ландшафтнага кода з’яўляецца **лес** – прастора, да якой спрадвеку паляшук (чалавек, што жыве па-лесе) ставіўся насцярожана, надзяляючы яе магічнымі ўласцівасцямі. Тут яшчэ трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што чалавеку прыходзілася ў прамым сэнсе слова адваёўваць у леса прастору і для пражывання, і для вядзення гаспадаркі. Сімволіка леса-пушчы звязана з дыхатаміяй “хаос\космас”, дзе яна хутчэй набывае, што больш лагічна, апазіцыю “прырода\культура”. У дадзеным кантэксце лес успрымаецца хаатычнай прасторай, гэта месца лакалізацыі дзікіх жывёл і дзікарослых раслін, якія непадуладныя чалавеку, гэта і прытулак небяспечных сіл-духаў. Сімвалічны статус лесу рэпрэзентуе перш за ўсё ягоны гаспадар лесавік “найбольш велічны” (А. Е. Багдановіч). Ва ўяўленні нашага старажытнага продка лясун – непрадказальная, амбівалентная істота: ён мог і пакараць чалавека, які нечым парушае агульнапрынятыя правілы паводзін у лесе, мог “пашуткаваць”, напрыклад, збіць з дарогі, завесці ў гушчар лесу, напужаць, з’явіўшыся перад ім у розных абліччах, але часта і дапамагаў – ягадніку паказваў дарогу да ягаднай паляны, а грыбніка вёў да грыбных мясцін. Ведаючы гэта, паляшук, каб наладзіць прыязныя стасункі з гаспадаром лесу, браў для яго з сабой падарункі, прамаўляў замовы, імкнуўся паводзіць сябе ў лесе ціха і прыстойна, маўляў: “у чужы манастыр са сваімі правіламі не ходзяць”. Так і жыхар Петрыкаўшчыны П. У. Казіміраў пры наведванні леса прамаўляе замову “Ад лесуна”: “Хаджу па лясах, па кустах, па імхах, па балотах, па лыкадзёрах, па чарніцах, па малінах – куды не хаджу, ніколі не блуджу, сонца па сонцу, месяц па месяцу, пры частых зорках, пры вячэрніх зорах хаджу, не блуджу, а табе, лясны хазяін, пакорнасць аддам, ад мяне, раба, адматніся, у бярозу абярніся. Амінь” (вар. ад А. П. Чырыч, 1933 г. н. з в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на.; в. Верхняя Алба Жлобінскага р-на ад Н. А. Канаваленка, 1933 г. н.). Г. Р. Сядая, 1925 г. н., з в. Краўцоўка Гомельскага р-на расказвае: “Перад тым, як ісці ў лес, трэба на пень пакласці хлеб і прагаварыць замову, каб задобрыць гаспадара лесу: «Іду ў лес, бяру хлеб і соль і нясу лясному хазяіну…»”.

І ўсё ж лясун – гэта міфалагічная істота, але лес быў густа абжыты мноствам рэальных насельнікаў: звяры, птушкі, паўзуны і многія іншыя, якія маглі пашко-

дзіць чалавеку. Ад іх прымяняліся тыя ж засцерагальныя дзействы – ахвяраванне ў сукупнасці з замовай. Так і нашы інфарматары з в. Ляда Лагойскага р-на Г. К. Навіцкая, 1961 г. н., і К. І. Пятроўская, 1931 г. н., замову “Ад укусу змяі” папярэдне суправаджалі падарункам: “Когда идёшь в лес, берешь с собой кусок хлеба и ложишь его под куст и семь раз читаешь молитву. Тогда ты вообще не встретишь змею”.

Не толькі лясныя “жыхары” і сам лес, але і кожнае **дрэва** нашымі продкамі надзялялася адметнымі ўласцівасцямі і звышнатуральнай сілай уздзеяння на чалавека. Нашы продкі-язычнікі абагаўлялі дрэва. Таму зусім прадказальна, што дрэва займае выключнае месца нават у такім сакральным жанры, як замова. У дэндралагічным кульце найбольш прадстаўнічым, а значыць і частотным, з’яўляецца цар-волат дуб. Ён не толькі характэрная адзнака палескіх краявідаў, але і той магутны эмацыянальна-псіхалагічны фактар, які актыўна ўздзейнічае на лад жыцця, характар мыслення аўтэхтоннага насельніцтва, яго душэўны стан, духоўны вопыт, гэта дамінантны вобраз-сімвал ягонага міфалагічна-старажытнага свету, сімвал даўгалецця, мудрасці, жыццястойкасці. Дуб у міфалогіях многіх народаў суадносіўся з вярхоўнымі боствамі (Зеўс, Юпітэр, Пярун – богі-грамавікі). Велічны дуб з архаічных часоў набыў статус “Сусветнага дрэва”, якое структуруе касмічную прастору: сваімі каранямі абдымае апраметную, “той” свет, вершалінай трымае неба, а ствол – “гэты\белы\Божы” свет. “Сусветнае дрэва” – гэта свайго роду сакральны цэнтр свету, “пуп” зямлі, падмурак, апора космасу, які выступае і як вобраз, і як прынцып касмічнай арганізацыі і парадку. Так па прынцыпу “Сусветнага дрэва” ў замоўным жанры структуруецца сакральна-міфалагічны цэнтр (М. Ц.) у замовах.

Такім чынам, разгледжаныя прыродна-ландшафтныя вобразы-міфалагемы дапамагаюць асэнсаваць светапоглядныя ўяўленні нашых продкаў, якія склаліся ў далетапісныя часы, выявіць пэўную заканамернасць і стадыяльную абумоўленасць ва ўзнікненні вобразаў-сімвалаў, якія захоўваюцца не толькі ў пасіўнай памяці, але і актыўна выкарыстоўваюцца ў паўсядзённых практыках.

ЛІТАРАТУРА

1. Словарь символов и знаков / авт.-сост. Н. Н. Рогалевич. – Мінск. : Харвест, 2004. – 512 с.
2. *Вяргеенка, С. А.* “На моры-акіяне, на востраве Буяне…” (лекавыя замовы Гомельшчыны): фальклорна-этнаграфічны зборнік / С. А. Вяргеенка; пад рэд. В. С. Новак; М-ва адукацыі РБ, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 220 с.
3. «Гаючае слова роднай зямлі» (беларускія лекавыя замовы). Фальклорна-этнаграфічны зборнік / аўтар уступнага артыкула, аўтар-укладальнік Вяргеенка С. А. – Гомель : Барк, 2013. – 340 с.

УДК [811.111+811.161.3]’373(045)

О. А. Зинина (Минск)

АССОЦИАТИВНЫЕ СВЯЗИ КАК ПРОЯВЛЕНИЕ ЛИНГВОКУЛЬТУРНЫХ ХАРАКТЕРИСТИК

Закономерности ассоциирования слов можно рассматривать как «специфический для данной культуры и языка “ассоциативный профиль” образов сознания. Они интегрируют умственный и чувственные знания, которыми обладает конкретный этнос» [3, с. 211]. Отталкиваясь от этого положения, мы поставили задачу выявить показатели национального менталитета с помощью ассоциативно-вербальной сети на материале английского и белорусского языков. Предме-

том данного анализа является выявление сходств и различий репрезентации значений в сознании индивидов двух наций, которые можно представить через сопоставительный анализ ассоциативных полей, представленных реакциями на слова стимулы. Материалом исследования послужили реакции на слова *friend* и *сябр*, представленные в Edinburgh Associative Thesaurus [5] и Славянском ассоциативном словаре [4]. Для более детального выявления сходств и различий можно воспользоваться семантическим гештальтом, при помощи которого возможно выявить этнокультурную специфику языкового сознания в структуре ассоциативного поля. Согласно Ю. Н. Караулову, семантический гештальт характеризует «поле как единицу знания о мире, соотнося его строение с отраженной в нем структурной реальностью» [1, с. 201].

Структура ассоциативных полей «friend» и «сябр» может быть представлена в виде семантических гештальтов, состоящих из определенного набора фреймовых структур. Рассмотрим их применительно к английскому и белорусскому ассоциативным полям анализируемых лексических единиц.

Было выделено два фрейма, которые являются общими для двух языков. Так, в структуре обоих полей выделяется фрейм «тип отношений», причем для английского ассоциативного поля он является доминирующим, т.к. представлен 89 % ассоциаций в гештальте, в то время как в белорусском языке он представлен 23 % ассоциаций. Дальнейший анализ позволил выявить системные связи рассматриваемого концепта, которые представлены следующими характеристиками:

- дружеские отношения: *acquaintance, friendship, mate, pal; таварыш, дружа;*
- семейные отношения: *relation, brother; брат, маці, бацька, сваяк;*
- другие отношения: *neighbor, pen-pal, dog, cat, pet; сабака, чалавек.*

Отдельно следует указать контрастивные отношения, представленные в обоих языках*: enemy, foe; вораг, непрыяцель; злоснік.*

Обращают на себя внимание различия в представленности параметра «семейные отношения» и «другие отношения». Если в английском языке «семейные отношения» представлены только двумя видами ассоциаций, причем они не включают родителей, то в белорусском в данную группу включены все ближайшие родственники.

Подгруппа «другие отношения» наиболее полно представлена в ассоциативном поле английского языка, она включает такие виды ассоциаций, как «сосед» и «друг по переписке», которые отсутствуют в белорусском языке.

Второй фрейм «характеристика отношений» также неравнозначно представлен в ассоциативных полях двух языков. Он является доминирующим в белорусском языке (77 %), в английском составляет лишь 11 %. Рассмотрим структурные параметры данного гештальта.

Для белорусского языка характерны такие ассоциации, как:

- *лепшы, самы лепшы, найлепшы, блізкі*, в которых подчеркивается положительная качественная характеристика;
- *на ўсё жыццё, назаўсёды, заўсёды побач*, в которых выражена длительность отношений;
- *верны, давер, адданасць, упэўненасць*, отражающие такие параметры, как «верность, доверие»;
- *надзейны, надзея, апора, падтрымка, памочнік, дапамога, упэўненасць*, что отражает такие характеристики, как «поддержка, помощь».

В английском ассоциативном поле данный гештальт представлен только одним видом ассоциаций, а именно выражающими положительную качественную характеристику, *good, nice.*

Сопоставив семантические гештальты данных ассоциативны полей, возможно проследить этнокультурную специфику языкового сознания носителей двух лингвокультур. Так, в английском языковом сознании концепт «friend» прежде всего ассоциируется с существующими дружелюбными отношениями между знакомыми, родственниками, соседями или хозяевами и их домашними животными, присутствует противопоставление дружеских и неприятельских отношений. Что касается качественной характеристики, то она выражена весьма нейтрально и не является доминирующей.

В белорусском языковом сознании концепт «сябр» ассоциируется прежде всего с такими характеристиками как верность, надежность, взаимопомощь, духовная близость, длительность дружеских отношений. Белорусы ценят дружеские семейные отношения, включая в них, в отличие от англоязычной лингвокультуры, родителей, что свидетельствует о более тесных отношениях между родителями и детьми.

Таким образом, если в английской лингвокультуре доминирующим является вид отношений, то для представителя белорусской лингвокультуры важным является качественная характеристика таких отношений, придание им особого статуса.

Рассмотрим еще одну пару лексем *time* и *час* и представим сопоставительный анализ их ассоциативны полей.

Для двух ассоциативных полей можно выделить следующие фреймы:

- «отрезок времени»: *hour, day, age, year, minute, past, present* (31 % ассоциаций); *хвіліна, гадзіна, год, стагоддзе, дзень, вечар, раніца* (16 % ассоциаций);
- «устройство, показывающее время»: *watch, clock, machine* (6 % ассоциаций)*; гадзіннік, будзільнік* (4 % ассоциаций);
- «временной ресурс»: *precious, limited, life-long, short* (29 % ассоциаций)*; бясконцы, вечнасць, доугі, сусвет, адноснасць* (11 % ассоциаций)*;*
- «цель»: *for tea, off, leisure, lunch* (15 % ассоциаций)*; праца, справа, перапынак, спатканне, адпачываць, абед, вячэраць* (31 % ассоциаций);
- «ход времени»: *passes, flies, drags* (19 % ассоциаций)*; ідзе, бяжыць, ляціць, прайшло, не хапае, зауседы мала, хутка, хуткасць, імгненне, бягучы* (38 % ассоциаций).

Проведенный анализ ассоциативных полей лексем *time* и *час* показал сходство в количественном выражении только одного фрейма, а именно «устройство, показывающее время». Наблюдаются значительные количественные отличия во фреймах «отрезок времени», «временной ресурс» и «ход времени». В английском языковом сознании время имеет четкие временные рамки, включающие прошлое и настоящее, оно обладает ценностью и проходит с разной скоростью. В белорусской лингвокультуре временные рамки включают в себя время суток, время обладает такими характеристиками, как относительность и длительность, но проходит оно очень быстро. Данные выводы согласуются с теорией последовательных и синхронических культур, согласно которой в последовательных культурах (английская) время устанавливается точно, будущее понимается как продолжение настоящего, время воспринимается как ограниченный ресурс,

поэтому ему придается важность. В синхронической культуре (белорусская) время воспринимается как срок, к которому необходимо выполнить некоторое действие, при этом учитывается бесконечность и эластичность временного ресурса [2, с. 62].

Следует также отметить различия в представленности фрейма «цель». Англоязычные ассоциации основываются на соотнесении понятия «время» с традиционным приемом пищи (обед, чай) или отдыхом. В белорусском языковом сознании цель времени также соотносится с приемом пищи и отдыхом, но значительное место уделено трудовой деятельности.

Таким образом, установленные семантические гештальты позволили определить сходства и различия в восприятии некоторых понятий в англоязычной и белорусскоязычной лингвокультурах, выявить показатели национального менталитета.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Караулов, Ю. Н.* Показатели национального менталитета в ассоциативно-вербальной сети / Ю. Н. Караулов // Языковое сознание и образ мира. – М. : Ин-т языкознания РАН, 2000. – С. 191–206.
2. *Тромпенаарс, Ф.* Национально-культурные различия в контексте глобального бизнеса. / Ф. Тромпенаарс, Ч. Хэмпден-Тернер. 2-е изд. – М.: Дело, Академия народного хозяйства при Правительстве Российской Федерации, 2001. – 448 с.
3. *Уфимцева, Н. В.* Языковое сознание и образ мира славян / Н. В. Уфимцева // Языковое сознание и образ мира. – М. : Ин-т языкознания РАН, 2000. – С. 207–219.
4. *Уфимцева, Н. В.* Славянский ассоциативный словарь: русский, белорусский, болгарский, украинский / Н. В.Уфимцева, Г. А.Черкасова, Ю. Н.Караулов, Е. Ф.Тарасов. – М. : Ин-т языкознания РАН, 2004. – 800с.
5. Edinburgh Associative Thesaurus [Electronic resource] // RALI. – Mode of access: http://rali.iro.umontreal.ca/rali/EAT.

УДК 070.23 (1-37)

І. А. Івашка (Мінск)

КАНЦЭПЦЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ БЯСПЕКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: РЭАЛІЗАЦЫЯ Ў РАЁННЫМ ДРУКУ

Ва ўмовах глабалізацыі інфармацыйныя тэхналогіі набылі трансгранічны характар і сталі неад'емнай часткай многіх сфер дзейнасці. Сёння забеспячэнне бяспекі інфармацыйнай прасторы займае значнае месца ў рэалізацыі стратэгічных нацыянальных прыярытэтаў любой краіны. Акрамя таго, як справядліва адзначае Т. В. Закупень, «інфармацыйныя ўздзеянні аказваюць вырашальны ўплыў на працэсы адукацыі, фарміравання асобы, яе духоўнага свету і могуць выклікаць неадэкватныя сацыяльныя ці крымінальныя паводзіны груп людзей і пэўных асоб, нанесці фізічны, матэрыяльны і маральны ўрон грамадзянам» [4]. І, паколькі асноўным рэгулятарам у інфармацыйнай прасторы выступае права, актуалізуецца патрэба ў заканадаўчых актах, якія б рэгламентавалі паводзіны краін у інфармацыйным полі (такімі дакументамі з'яўляюцца «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Кыргызскай Рэспублікі», «Дактрына інфармацыйнай бяспекі РФ», «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі рэспублікі Казахстан», «Дактрына інфармацыйнай бяспекі Украіны», «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі РБ» і інш.).

Так, у «Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі рэспублікі Казахстан» інфармацыйная бяспека разглядаецца ў сукупнасці двух узаемазвязаных аспектаў: тэхнічнага і сацыяльна-палітычнага [9]. Першы ўяўляе сабой абарону нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў і сістэм ад неаўтарызаванага доступу, выкарыстання, змянення, прачытання ці знішчэння. Другі аспект заключаецца ў

забеспячэнні бяспекі нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ад мэтанакіраванага негатыўнага ўздзеяння, якое можа нанесці ўрон нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Казахстан.

«Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі РБ» (далей – КІБ РБ) разглядае інфармацыйную бяспеку як «стан абароненасці сбалансаваных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы» [6, с. 3]. Аналагічнае вызначэнне прапануе «Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі РБ» [7] і «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Кыргызскай Рэспублікі» [5]. З нашага пункту гледжання, найбольш поўнае азначэнне прапанавана ў «Дактрыне інфармацыйнай бяспекі РФ»: «інфармацыйная бяспека – гэта стан абароненасці асобы, грамадства і дзяржавы ад унутраных і знешніх інфармацыйных пагроз, пры якім забяспечваецца рэалізацыя канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, дастойныя якасць і ўзровень жыцця грамадзян, суверэнітэт, тэрытарыяльная цэласнасць і ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, абарона і бяспека дзяржавы» [2].

Аднак у рабоце мы прапануем карыстацца больш поўным азначэннем Ю. Лісоўскай, якая, спасылаючыся на работы А. Марушчака, звяртаецца да паняцця *інфармацыйнай бяспекі* ў трох аспектах:

1) як «стану абароненасці жыццёва важных інтарэсаў чалавека, пры якіх прадухіляецца нанясенне ўрону праз непаўнату, несвоечасовасць і недакладнасць інфармацыі, якая выкарыстоўаецца (у п. 34 КІБ РБ пералічаныя аспекты разглядаюцца як пагрозы нацыянальнай бяспекі);

2) як негатыўнага інфармацыйнага ўплыву;

3) як несанкцыянаванага распаўсюджвання, выкарыстання і парушэння цэласнасці, канфедэнцыяльнасці і даступнасці інфармацыі» [8, с. 94].

Вядома, што асноўны нацыянальны інтарэс Беларусі ў інфармацыйнай сферы – рэалізацыя канстытуцыйных правоў грамадзян на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, праўдзівай і своечасовай інфармацыі [7]. Таму прыярытэтным у інфармацыйнай сферы становіцца «забеспячэнне даступнасці інфармацыі, яе распаўсюджванне і выкарыстанне для <…> развіцця краіны» [6, с. 2]. Невыпадкова ў КІБ РБ адлюстраваны сучасныя выклікі і пагрозы, якія фарміруюцца ў інфармацыйнай сферы і ўяўляюць небяспеку для канстытуцыйных асноў Беларусі: няўстойлівасць інфармацыйнай інфраструктуры, дыскрэдытацыя грамадскіх ідэалаў і каштоўнасцей, кіберпагрозы [11], небяспека для нацыянальнага інфармацыйнага сегменту ў Інтэрнэце [10] і інш.

Глабальнае ўзрастанне ролі інфармацыі ў сістэме грамадскіх адносін, адкрытасць медыяпрасторы і павышэнне ўзроўню інфарматызацыі насельніцтва [6, с. 10] актуалізуюць ключавыя палажэнні 12 главы КІБ РБ («Захаванне традыцыйных асноў і каштоўнасцей»). Гэта абумоўлена тым, што традыцыйныя каштоўнасці – «адзін з галоўных аб’ектаў для абароны ў інфармацыйным полі» [11]. Уяўляецца, што выкананне большасці асноўных палажэнняў дакумента (у прыватнасці, пп. 15, 47, 48, 49, 56 і інш.) магчыма толькі пры ўмове, што нароўні з рэспубліканскімі СМІ, алгарытмы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі будуць пераняты раённымі выданнямі, паколькі мясцовыя газеты маюць найбольшы ўплыў на лакальную аўдыторыю [1, с. 52].

Інфармацыйная палітыка Беларусі накіравана на прасоўванне *гуманізму, міралюбства, дабрасуседства, справядлівасці, узаемадапамогі, моцных сямей-*

ных адносін, здаровага ладу жыцця, стваральнай працы, прынятых у беларускім грамадстве *норм маралі і пазітыўнай правасвядомасці* (пункт 47 КІБ РБ). Значнае месца ў рэалізацыі гэтых прынцыпаў адводзіцца раённым газетам.

Так, у «Ляхавіцкім весніку*» тэма стваральнай працы* персаніфікавана – у аснове кожнай публікацыі – аповед пра жыхара раёна[1]. Матэрыялы расказваюць пра кіраўнікоў гаспадарак, настаўнікаў, урачоў, працаўнікоў культуры, аддзяленняў сувязі («Ён [Эдуард Рачкоўскі] хлебароб, араты і бадай увесь светлавы дзень праводзіць … на сельскагаспадарчым палетку» («Не трактар арэ – трактарыст», 17.10.2020 г.); «Пра высокі прафесіяналізм Аляксандра Вітко сведчаць … значныя дасягненні СВК “Ляхавіцкі” – сельскагаспадарчага флагмана раёна…» («Самы аграрны юбіляр», 24.10.2020 г.); «…прафесія, выбраная сэрцам, стала прызваннем. І наша зямлячка [Алена Бяліцкая] ганарыцца тым, што яна адна з … сям’і ляхавіцкіх медыкаў» («Профі вышэйшай катэгорыі», 31.10.2020 г.) і інш.

Падобныя падыходы ў асвятленні пытання выкарыстоўваюць «Лідская газета» («…маладая настаўніца сёлета занесена ў віртуальную Кнігу пашаны маладых спецыялістаў сістэмы адукацыі Гродзеншчыны» («Знайшла сваё прызванне – вучыць дзяцей», 03.10.2020 г.); «Што адрознівае маладое папаўненне? Высокі ўзровень падрыхтоўкі, грунтоўныя веды і… вялікае жаданне набыць працоўны вопыт» («У галіне культуры – новыя таленты», 10.10.2020 г.) і «Добрушскі край» («Раніца рабочых участка па ўтрыманні дваровых тэрыторый “Добрушскага камунальніка” Васіля Ярашэвіча і Алы Дунай … пачынаецца аднолькава: прыбіральшчыкі размятаюць сцежкі і тратуары ад апалага лісця» («Каму “золата, а каму – клопаты”», 07.10.2020 г.); «Кіраваць брыгадай … ён пачаў ва ўзросце ўсяго 25 гадоў. Аляксандр прадоўжыў сямейную традыцыю» («Якасць не залежыць ад узросту», 28.10.2020 г.). У полі зроку журналістаў «Лідскай газеты» – прадстаўнікі камунальных службаў, інспектары ДАІ, артысты, пчаляры, маладыя спецыялісты; «Добрушскага краю» – працаўнікі папяровай фабрыкі, народныя майстры, жывёлаводы, механізатары, школьнікі. Асвятленне далучанасці да працы старшакласнікаў – заўважная тэндэнцыя добрушскай раённай газеты.

У суадносінах матэрыялаў пра чалавека да газетнай плошчы «раёнкі» знаходзяцца наперадзе рэспубліканскіх СМІ. У «Ляхавіцкім весніку» сустракаецца ад двух да пяці падобных матэрыялаў за нумар. «Лідская газета» змяшчае ад адной да дзесяці публікацый. Лідарам па публікацыях пра чалавека выступае «Добрушскі край» (ад трох да дзевяці матэрыялаў).

Пытанні сямейных узаемаадносін часта ўздымаюць «Ляхавіцкі веснік» і «Лідская газета». Журналісты першага выдання раскрываюць тэму праз аповеды пра маці («Яна [Валянціна Юрлевіч] заўжды старалася быць падобнай на сваю маці, якую лічыць прыкладам мудрасці, веры, жаноцкасці, шчырасці, адданасці сям’і. <…> Сёння яе дачка Алёна Гецман ужо сама мама двух сыночкаў і ва ўсім бярэ прыклад з іх бабулі» («Матуліна шчасце», 14.10.2020 г.). Акрамя таго, на старонках «Ляхавіцкага весніка» змяшчаюцца фотарэпартажы і асобныя фотаздымкі з адлюстраваннем сямейных каштоўнасцей, нярэдка праблематыка разглядаецца ў сінтэзе з іншымі тэмамі.

Журналісты «Лідскай газеты» апелююць да сямейных аповедаў людзей сталага ўзросту («Таму і быў званок … у рэдакцыю «Лідскай газеты»: “У дарагіх

[1] Вывады зроблены на аснове аналіза нумароў «Добрушскага краю», «Лідскай газеты» і «Ляхавіцкага весніка» за кастрычнік 2020 года. Таксама кропкава былі даследаваны выпускі трох газет за чэрвень–верасень 2020 года.

нам людзей залаты юбілей. Пражылі паўвека ў згодзе, чаму і іншым можна павучыцца”» («Каб на дадзены момант давялося жаніцца, дык мы зноў злучаліся б у пару», 03.10.2020 г.); «…в лидском загсе состоялась торжественная регистрация полувекового юбилея. И вновь прозвучал марш Мендельсона, а затем были теплые поздравления, но уже от детей, внуков, правнуков и тот самый вальс» («Бери пример, молодежь», 21.10.2020 г.).

«Добрушскі край» сямейную тэматыку ўзгадвае радзей. Асноўны вектар публікацый – вопыт прыёмных сем’яў («В свои 30 лет Марина и ее муж Дмитрий воспитывают четырех сыновей и двух дочерей. Для большинства своих детей Сайдулины – приемные родители» («Лучики счастья», 31.10.2020 г.). У большасці выпадкаў сямейныя каштоўнасці разглядаюцца журналістамі ў кантэксце матэрыялаў іншай тэматычнай скіраванасці.

Пазітыўную правасвядомасць рэдакцыі трох выданняў фарміруюць, звяртаючыся да раскрыцця прававых бакоў праблемы праз выпадак з юрыдычнай практыкі раёна. «Добрушскі край» асвятляе праблемныя сітуацыі *па прынцыпе «праблема – вынік»* («… в первый же месяц учебного года подростки попали в поле зрения правоохранителей более десятка раз. <…> По каждому из вышеуказанных фактов… проводят социальные расследования») («Осенние похождения несовершеннолетних», 03.10.2020 г.); «Добрушские подростки повредили надмогильные сооружения на сельском кладбище. <…> привлечь установленных лиц к ответственности нельзя: не достигли 14-летнего возраста» («Превратности “безобидной” игры», 03.10.2020 г.) і інш.

«Лідская газета» падае матэрыялы *праз канцэпцыю «праблема – алгарытм вырашэння»* («Кто без фликера – тому вопрос. Ответ правильный – значит, без штрафа», 17.10.2020 г.; «Решение им подсказали <…>: вызов геодезистов, суд и мир» («Нарушители границы? Как соседи из деревни Широкое не поделили “пограничный” столб», 21.10.2020 г.).

У прававых матэрыялах «Ляхавіцкага весніка» можна назіраць сінтэз падыходаў: выклад фактаў *па алгарытме «праблема – вынік»* («Домік вокнамі ў бур’ян» (27.05.2020 г.) *і матэрыял-справаздача пасля правядзення сумесных праектаў па інфармаванні з* раённым аддзелам па надзвычайных сітуацыях («“Гардэроб” для пажарных. І не толькі», «На сувязі выратавальнікі»; органамі ЗАГС («Шлюб – падзея не радавая» (27.05.2020 г.), сацыяльнымі службамі («Пенсійныя льготы для ліквідатараў аварыі на ЧАЭС» (25.04.2020 г.).

Матэрыялы пра здаровы лад жыцця з’яўляюцца ў трох выданнях як у спецыяльных рубрыках («У аб’ектыве – спорт» і «Журналист изучает ситуацию» (10.10.2020 г.) – «Лідская газета»), тэматычных старонках («Ляхавіцкі раён – 80» у «Ляхавіцкім весніку») і асобных рубрыках («Спортивная орбита» і «Фотофакт» у «Добрушскім краі»). Перыядычнасць выхаду тэкстаў у газетах залежыць ад спартыўных інфармацыных нагод раёнаў.

Бясспрэчна, беларуская мова нароўні з канстытуцыйна замацаваным у дзяржаве двумоўем садзейнічае павышэнню нацыянальнай самасвядомасці беларускага грамадства і фарміраванню яго духоўнасці. Таму пашырэнне сацыяльных функцый і камунікатыўных магчымасцей беларускай мовы, яе паўнавартаснае і ўсебаковае развіццё разам з іншымі элементамі нацыянальнай культуры выступаюць гарантам гуманітарнай бяспекі дзяржавы (пункт 48 главы 12 КІБ РБ).

Нельга не пагадзіцца з П. Жаўняровічам, які падкрэслівае значную ролю раённых СМІ ў пашырэнні беларускай мовы праз яе выкарыстанне на практыцы [3, с. 163]. «Ляхавіцкі веснік» – цалкам беларускамоўная газета. У «Добрушскім

краі» беларуская мова выступае індыкатарам публікацый, у якіх журналісты прыбягаюць да сінкрэтызму ў падачы матэрыялу. Колькасць тэкстаў на беларускай мове ў добрушскім раённым выданні налічвае ад трох да адзінаццаці публікацый за нумар. Наяўнасць беларускамоўных матэрыялаў у «Лідскай газеце» вар'іруецца ад аднаго да адзінаццаці матэрыялаў. Таксама па-беларуску афармляюцца рубрыкі выдання і асобныя анонсы. Адметна, што нацыянальная мова выкарыстоўваецца журналістамі «Лідскай газеты» для раскрыцця тэм, звязаных з гісторыяй краіны і творчасцю лідчан.

Выкарыстанне ў раённым друку нацыянальнай мовы як асноўнага інструмента ў фарміраванні самасвядомасці грамадства павышае цікавасць да ключавых аспектаў пункта 49 КІБ РБ і спрыяе прасоўванню дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, якая накіравана на замацаванне нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага краіны і беларускай мадэлі памяці ў Беларусі і за яе межамі [6, с. 11].

Супрацоўнікі «Добрушскага краю» асвятляюць *гістарычныя працэсы Беларусі* праз наступныя ракурсы:

- *лёс раёна* (рэпартаж, дасланы чытачом – «За историями – на велосипеде» (03.10.2020 г.);
- *мясцовыя легенды* («Одна из городских легенд гласит: они были построены по кредиту управляющего добрушской писчебумажной фабрикой Антона Стульгинского» («Городские легенды», 07.10.2020 г.);
- *сведчанні дабрушан* (рэпартаж з пошукаў парэшткаў непахаваных салдат ВАВ – «История на дне траншеи» (09.09.2020 г.); «Мой дед Семен Бураков был архитектором. При нем в середине прошлого века Добруш активно обретал тот вид, который мои земляки <…> хранят в своих воспоминанях» – «Добруш в моей судьбе», 10.11.2020 г.) і інш.

Дзевяць кастрычніцкіх нумароў выдання змяшчаюць дзесяць матэрыялаў на гістарычную тэматыку.

«Ляхавіцкі веснік» прытрымліваецца падобнай стратэгіі, што і «Добрушскі край», аднак у большасці выпадкаў рэалізуе яе візуальна – праз фотапраект «Ляхавіцкі раён – 80»: «На спартыўных прасторах» (24.06.2020 г.), «Наша купалаўка запрашае» (15.04.2020 г.), «Культурныя людзі» (19.06.2020 г.), «Настальгія аграрных успамінаў» (26.06.2020 г.) і інш. Гэту адметнасць выдання рэдакцыя называе «Рэтратэкай ЛВ» (фотарэпартажы будуюцца па алгарытме супрацьпастаўлення «сапраўднае-мінулае» і суправаджаюцца тэкстоўкай). Колькасць тэкстаў, прысвечаных гістарычнай тэме за разгледжаны перыяд налічвае адну публікацыю.

Глыбей у тэматычным полі працуе «Лідская газета»: вопыт раёна ці горада, апісаны ў выданні, упісваецца ў глабальны гістарычны кантэкст («Наша бібліятэка <…> паспрабавала адлюстраваць грамадска-палітычнае жыццё горада Ліды ў 50-80-я гг. мінулага стагоддзя» («Імгненні савецкай эпохі ў фоталетапісе Лідчыны», 03.10.2020 г.); «Изображение данскера на стене Лидского замка сохранилось на фотографиях конца XIX века, а также на картине белорусского художника Василия Грязнова…» – у кантэксце публікацыі пра ЖКГ («Обширное хозяйство – для комфорта лидчан», 14.10.2020 г.); «<…> Немецкая авиация совершила налет на ленинградские Бадаевские склады <…>. Чтобы получить заветную краюшечку, маленькая Таня вставала еще затемно: нужно было занять очередь» («Гостеприимен и на свежую выпечку скор лидский "Хлебный двор"», 17.10.2020 г.) – як элемент матэрыяла пра хлеб). На дзевяць нумароў выдання прыходзіцца шэсць публікацый на гістарычную тэму.

Аналіз КІБ РБ і журналісцкіх тэкстаў у газетах «Добрушскі край», «Лідская газета» і «Ляхавіцкі веснік» дазваляе рабіць высновы, што тэмы, якія дапамагаюць рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, раскрываюцца ў раённым друку ў большай ступені. Да іх можна аднесці публікацыі, прысвечаныя працоўнаму чалавеку, аграрнаму сектару, здароваму ладу жыцця, правам і абавязкам грамадзян, а таксама матэрыялы-каментарыі спецыялістаў (псіхолагаў, юрыстаў, прадстаўнікоў МНС, органаў ЗАГС, медыцынскіх работнікаў і інш). Разам з тым, журналісты звяртаюцца да сусветных падзей, сямейных каштоўнасцей, а таксама гістарычнай, сацыяльнай і духоўнай тэматыкі (апошняя прадстаўлена ў двух аспектах – светапоглядным і творчым). Аднак: гэтым пытанням удзелена кропкавая ўвага (сацыяльная праблематыка ў большасці выпадкаў прадстаўлена заметкамі ці справаздачамі з элементамі рэпартажу; аб'ём публікацый на духоўную тэматыку ў выданнях складае ад 1/5 ці 1/4 плошчы паласы за два-тры нумары; пытанні гісторыка-культурнай спадчыны ўздымаюцца неперыядычна). Лічым, што мэтазгодным стане павышэнне колькасці публікацый падобнай скіраванасці за кошт скарачэння аб'ёму крымінальнай хронікі і публікацый пра надзвычайныя сітуацыі («Лідская газета», «Добрушскі край»), справаздач і матэрыялаў, якія не маюць прамога дачынення да жыцця раёна («Ляхавіцкі веснік»). Патэнцыял прааналізаваных раённых выданняў дае падставы сцвярджаць, што асвятленне акрэсленых аспектаў можа ўнесці ў газетныя тэксты больш разгорнуты тэматычна-жанравы складнік і павысіць узровень інтарэсу да матэрыялаў у чытацкай аўдыторыі.

Лагічным бачыцца вывучэнне рэалізацыі ключавых палажэнняў КІБ РБ у іншых беларускіх раённых выданнях.

ЛІТАРАТУРА

1. *Баранова, Е. В.* Инновационный медиакластер в стратегии управленческой коммуникации / Е. В. Баранова // Медиа в современном мире. 58-е Петербургские чтения: сб. матер. Междунар. науч. форума (18–19 апреля 2019 г.) / отв. ред. В. В. Васильева. В 2-х томах. Т. 1. – СПбГУ, 2019. – С. 51–52.
2. Доктрина информационной безопасности РФ [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://rg.ru/2016/12/06/doktrina-infobezobasnost-site-dok.html. – Дата доступа : 15.10.2020.
3. *Жаўняровіч, П.* Моўная палітра раённых газет / П. Жаўняровіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://elib.bsu.by/handle/123456789/19593. – Дата доступа : 01.11.2020.
4. *Закупень, Т. В.* Понятие и сущность информационной безопасности и ее место в системе обеспечения национальной безопасности российской федерации / Т. В. Закупень [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.aselibrary.ru/datadocs/doc_965hu.pdf. – Дата доступа : 01.11.2020.
5. Концепция информационной безопасности Кыргызской Рэспублики [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://cbd.minjust.gov.kg/act/view/ru-ru/13652. – Дата доступа: 15.10.2020.
6. Концепция информационной безопасности Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://president.gov.by/uploads/documents/2019/1post.pdf. – Дата доступа: 01.11.2020.
7. Концепция национальной безопасности РБ [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.prokuratura.gov.by/ru/acts/kontseptsiya-natsionalnoy-bezopasnosti-respubliki-belarus/. – Дата до-ступа: 01.11.2020.
8. *Лисовская, Ю. П.* Информационная безопасность в современном глобализованном мире / Ю. П. Лисовская // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. – Мінск : БДУ, 2015. – № 2. – С. 93–97.
9. О Концепции информационной безопасности Республики Казахстан [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://tengrinews.kz/zakon/prezident-respubliki-kazahstan/kultupa/id-U1100000174/. – Дата доступа: 15.10.2020.
10. Опубликована Концепция информационной безопасности Беларуси // БелТА [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.belta.by/society/view/opublikovana-kontseptsija-informatsionnoj-bezopasnosti-belarusi-340452-2019/. – Дата доступа: 01.11.2020.
11. Прэзідэнту прадставілі праект Канцэпцыі інфармбяспекі Беларусі // Лоеўскі край [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.loevkraj.by/2019/03/prezidentu-pradstavili-praekt-kancepcyi-infarmbyaspeki-belarusi/. – Дата доступа: 15.10.2020.

УДК [811.161.3+821.161.3](045)

А. І. Казлова (Мінск)

ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ Ў СВЕЦЕ НА КУЛЬТУРНЫМ І АДУКАЦЫЙНЫМ УЗРОЎНЯХ

На дадзеным этапе развіцця беларускай культуры існуе дастатковы шэраг праблем, з якімі сутыкаюцца мова і літаратура. Характар рэпрэзентацыі айчыннай літаратуры ў свеце варта разглядаць, зыходзячы з кантэксту культуры народа, у якім гэты працэс ажыццяўляецца. Аднак важным таксама з'яўляецца аналіз успрымання беларускай літаратуры самімі ж беларусамі для вывядзення агульнай карціны, якая адлюстроўвае праблемныя кропкі і на сусветным узроўні.

У працах айчынных і замежных навукоўцаў падкрэсліваецца асаблівая роля, якую адыгрывае літаратура ў развіцці культуры і мовы зносін. Забеспячэнне абмену культурнай інфармацыяй паміж народамі ажыццяўляе працэс міжкультурнай камунікацыі. Тэкст, з аднаго боку, з'яўляецца часткай культуры, а з другога – яе неабходным кампанентам, які раскрывае асаблівасці нацыянальнага характару, маральна-эстэтычны ідэал народа, так ці інакш звязаны з агульначалавечай сістэмай культурных каштоўнасцей.

З 2005 года беларускую літаратуру прадстаўляюць два творчыя аб'яднанні: Саюз беларускіх пісьменнікаў (СБП) і Саюз пісьменнікаў Беларусі (СПБ). Першы займае пазіцыю, паводле якой беларуская літаратура пішацца выключна на беларускай мове. З гэтым меркаваннем не згодны прадстаўнікі СПБ. На думку Мікалая Чаргінца падобнае абмежаванне няправільнае, паколькі пісьменнікі павінны мець магчымасць пісаць свае творы на любой мове. Нягледзячы на рознагалоссі, прадстаўнікі абедзвюх пазіцый лічаць, што беларуская літаратура мае дастаткова добрыя перспектывы развіцця, і ўскладаюць надзею на з'яўленне і творчае раскрыццё ўсё большай колькасці маладых таленавітых людзей.

Чаму ж беларуская літаратура перажывае на дадзены момант не самыя лепшыя свае часы? Ці ёсць магчымасць публікацый твораў не толькі на беларускай, але і іншых мовах, а таксама аднаўлення якасці беларускай літаратуры за мяжой?

Пераважна ў свеце няма асаблівага, характэрнага стаўлення да беларускай мовы, гісторыі ці літаратуры. Але характэрным з'яўляецца ўспрыманне і цікавасць да ўтопіі савецкага чалавека. Тым не менш літаратуры часоў Быкава, Адамовіча ўжо няма. Сённяшняя беларуская літаратура перажывае перыяд раздробненасці, паколькі не знайшла сябе наноў. Такім чынам, працэс развіцця *застопарыўся*. Глабальныя ідэі цяпер трансфармуюцца і развіваюцца ў зусім іншых напрамках. Нацыянальныя ідэі, якія цяпер спрабуюць прасоўваць, вычарпалі сябе як аб'екты літаратурнай дзейнасці. Праблемы, з якімі сутыкаецца сучасная беларуская літаратура, – гэта пошук новых нязбітых ідэй і пры гэтым захаванне самабытнасці, культуралагічных асаблівасцей, усведамленне таго, што ёсць беларуская культура і мова сёння, у дадзены перыяд свайго існавання. За адпраўную кропку не варта браць тэмы і праблемы постсавецкага перыяду, гэта таксама трэба пераасэнсаваць.

Прымаючы пад увагу той факт, што мастацкі тэкст адлюстроўвае нацыянальна-культурны аспект, то-бок характэрныя рысы дадзенай культуры, можна лічыць, што ён выступае ў якасці носьбіта і крыніцы аб'ектыўнай інфармацыі пра свет. Паспяховае ўспрыманне тэксту забяспечваецца моўнымі і графічнымі адзінкамі і сродкамі, а таксама агульным фондам ведаў. Цікава, што фонд ведаў пра нашу культуру па большай частцы ў саміх жа прадстаўнікоў культуры

завяршыў назапашваць інфармацыю пасля пэўнага гістарычнага перыяду. Выклікаць жаданую рэпрэзентацыю таго ці іншага твора і літаратуры ў цэлым уяўляецца немагчымым у тым выпадку, калі сам аўтар не мае ўласных, свежых і абноўленых ведаў і меркаванняў. Прапаноўваючы прадукт на сусветнай арэне, хочацца, у першую чаргу, разумець, што менавіта прапануе сам аўтар, і што робіць ён гэта свядома.

Наступнай праблемай з'яўляецца тое, што ў 1995 годзе руская мова была абвешчана другой афіцыйнай мовай Беларусі, што адштурхнула беларускую на задні план. У лепшым выпадку дзясятая частка з 10 мільёнаў жыхароў краіны рэгулярна размаўляе і чытае на беларускай мове. Аднак, дзякуючы ўрокам беларускай мовы і літаратуры, тыдным роднай мовы ў агульнаадукацыйных школах, беларускамоўным імшам у каталіцкіх храмах, 90 працэнтаў беларусаў захоўваюць пасіўнае веданне роднай мовы. Тое, што беларуская мова не выкарыстоўваецца ў паўсядзённым жыцці хаця б на мінімальным узроўні дэструктыўна адбіваецца на фарміраванні ўяўленняў аб роднай культуры, на выхаванні нацыянальнай самасвядомасці, на развіцці мовы і літаратуры, без чаго культура наогул перастае існаваць.

Сучасныя беларускамоўныя пісьменнікі могуць сутыкнуцца з тым, што публікацыя іх твораў на радзіме не ажыццяўляецца па тых ці іншых прычынах. Тыя, каму ўсё ж пашчасціла надрукавацца (В. Марціновіч або А. Бахарэвіч), сутыкаюцца з негатоўнасцю друку перакладзеных версій іх работ. Буйныя сусветныя выдавецтвы ігнаруюць літаратуру, напісаную на мала ўжывальных еўрапейскіх мовах, асабліва калі гэта мова дзяржавы – не члена Еўразвязу.

Такім чынам, распаўсюджванне ведаў пра беларускую культуру, літаратуру нязменна звязана з развіццём самой беларускай мовы. На дадзены момант сапраўды існуюць спосабы развіцця і перспектывы папулярызацыі айчыннай літаратуры. У шматлікіх еўрапейскіх універсітэтах на факультэтах славістыкі на працягу апошніх дваццаці гадоў вывучаецца беларуская мова. У сувязі з гэтым арганізуюцца розныя абмены студэнтамі, стажыроўкі, конкурсы, праекты. Варта ўлічваць той фактар, што мерапрыемствы на адукацыйным, культурным, навуковым і іншых узроўнях таксама будуць спрыяць развіццю беларускай мовы, літаратуры, то-бок і культуры.

УДК:7.046.1

А. А. Карэньгіна, А. А. Філіч, К. Т. Лабан (Мінск)

БЕЛАРУСКАЯ МІФАЛОГІЯ Ў ФАЛЬКЛОРНЫМ ЗАПІСЕ

Міфалогія – сістэма міфаў і ўяўленняў пра навакольны свет, з'яўляецца адной са славянскіх міфалогій і, шырэй, адной з індаеўрапейскіх [1]. Як лічаць аўтары энцыклапедычнага слоўніка "Беларуская міфалогія", "міфалогія, як, бадай, ні адна іншая сфера культуры, мае заўсёды даволі высокі рэйтынг цікавасці з боку самай шырокай публікі" тым больш, што старажытныя (і сучасныя) міфы трывала злучаныя з разнастайнымі сферамі жыцця грамадства і выступаюць своеасаблівым спосабам пазнання "структуры ўсяго ўніверсуму" [2, с. 5]. Міфы існавалі ва ўсіх народаў свету. Старажытныя паданні пра справы багоў і фантастычныя істоты тлумачылі многія з'явы таго часу. Яны спрыялі арганізацыі калектыву, з'яўленню каштоўнасцей, падтрыманню захавання грамадскай і маральнай згуртаванасці, паколькі асновай міфа з'яўляліся не толькі страх і бяс-

сілле чалавека, але і мара аб валоданні моцай і магчымасцямі прыроды. У гэтым значэнні міфы былі стабілізатарам жыцця, забяспечвалі ўнутраную згоду паміж чалавекам і прыродай [7].

Аднымі з самых цікавых складнікаў міфалогіі з'яўляюцца повесці пра духаў. В. С. Новак, аўтар "Славянскай міфалогіі" на матэрыяле, сабраным у Гомельскай вобласці, робіць выснову, што "…менавіта для славянскіх народаў характэрна шырока распрацаваная народная міфалогія. Нават пасля прыняцця хрыціянства міфалагічныя аповеды пра духаў розных локусаў, ведзьмаў, русалак і інш. Працягвалі сваё актыўнае бытаванне ў народнай свядомасці" [8, с. 5]. Таксама гэтыя істоты маюць розныя найменні па месцы пражывання, напрыклад, духі лесу, балота, рэк, азер, хаты, поля і інш. [1]. Не ўсе міфічныя персанажы былі роўныя рангам, не ўсе мелі аднолькавую папулярнасць у народзе. Пра адных у народнай памяці засталося ўсяго па некалькі радкоў, пра другіх можна было б скласці цэлыя кнігі. Здаралася, што адзін і той жа персанаж бачыўся ў розных мясцовасцях па-свойму, мог мець супрацьлеглыя характарыстыкі знешнасці і нораву. Зараз фальклорныя запісы, у тым ліку пра духаў, выкарыстоўваюцца для напісання літаратурных твораў, дзіцячых кніг, казак. Справа ў тым, што сучасная культура значна больш самакрытычная і рацыяналістычная, любое сцверджанне і мысленне падвяргаецца аналізу. Яна дапускае існаванне розных поглядаў і прынцыпаў, але знойдзецца мала міфаў, якія б сучаснікі лічылі праўдай. Сучасная міфалогія адрозніваецца ад старажытнай, яна не з'яўляецца асновай усёй культуры. Міфы ў наш час выкарыстоўваюцца часцей за ўсё як узмацняльнік каштоўнасцей. Яны прадстаўляюць вераванне, надаюць прэстыж традыцыям, вучаць правілам паводзін [7].

Тым больш узрастае актуальнасць даследавання міфалагічных уяўленняў беларусаў, якія можна рэканструяваць праз фальклорныя запісы. Міфалагічныя істоты прысутнічаюць у выхаванні малодшага пакалення літаральна з дзяцінства праз казкі, гутаркі старэйшага пакалення пра містычныя з'явы і пад. Істотна, што беларуская традыцыйная культура вылучаецца незвычайнай глыбінёй фальклорнай "памяці" [2, с. 3]. З гэтай прычыны скрупулёзна сабраныя сучасныя фальклорныя запісы даюць каштоўныя звесткі пра старажытныя ўяўленні нашых продкаў, дазваляюць выявіць адметнасці беларускай міфалогіі і супаставіць з ужо распрацаванымі характарыстыкамі міфічных істот.

Усяго намі прааналізавана тры аповеды пра духаў леса, балота, хаты, запісаныя ад жыхароў вёскі Наваселле (Мінская вобласць, Мінскі раён): тры жанчыны ўзросту ад 50–90 гадоў, настаўніцы Навасельскай сярэдняй школы.

Да духаў лесу належаць Лясун (Лесавік, Лешы, Верасовы Дзядок, Лясны Дзед, Лясны Хазяін) – гаспадар лесу [2, с. 285; 3, с. 50; 6]. У асноўным старэйшае пакаленне часта згадвае пра Лесавіка, які мог як дапамагчы знайсці выхад з лясного гушчару, калі лічыў асобу добрым чалавекам, або наадварот – завесці яшчэ больш у лес, калі чалавек падаваўся злым. Вось фрагмент адной з такіх размоў, запісанай намі:

− Марыя Грыгор'еўна, скажыце, ці сустракалі вы Лесавіка?

− ...Яго заўсёды можна сустрэць, калі ходзіш па грыбы. Насамрэч, Лесавік вельмі часта дапамагае грыбнікам, таксама і мне дапамог – я тады ледзьве ў дрыгву не трапіла. Малая тады была, дык мне Лесавік і дапамог, вужыка прыслаў, так я на яго звярнула ўвагу, бо маці гаварыла, што змеі з жоўтымі або ярка-аранжавымі плямамі жывуць каля балот. Я тады яшчэ громка сказала: "Маці, глядзі якая змейка!". Мая маць падбегла да мяне і ў сторану, бо заўва-

жыла, што я каля балота стаю і змяю разглядаю. Потым яна доўга прычытала і гаварыла, каб я дзядулю Лесавіку дзякавала. Вось так адбылася мая першая сустрэча з гаспадаром лесу. …Пра тое, што ён з імі/вужамі/сяброўе, мала хто памятае. …Калі пойдеш у лес, вітайся з гаспадаром лесу, тады ён заўжды дапаможа табе, калі спатрэбіцца[1].

У табліцах атрыманыя ад інфармантаў звесткі супаставім з характарыстыкамі, распрацаванымі ў даведніках і слоўніках па міфалогіі. Супастаўленне правядзём паводле наступных параметраў: функцыя істоты, знешні выгляд, спосаб камунікацыі – прагнаць або зняць чары, задобрыць або дамовіцца. Вылучаныя крытэрыі параўнання дазваляюць найбольш поўна апісаць міфалагічную істоту, выявіць яе спецыфічныя рысы.

Лесавік	У апавяданні	У беларускай міфалогіі
Функцыя	Дапамагае добрым людзям, а злых не шкадуе. Вельмі любіць дзяцей	Часцей істота не мэтанакіравана шкодная людзям, а гарэзлівая, але якая робіць гэта груба і зло. З іншага боку, Лесуна лічылі справядлівым гаспадаром лесу, які не стане шкодзіць проста так, але можа пакараць за неналежныя паводзіны ў яго ўладаннях, а можа і дапамагчы чалавеку
Знешні выгляд	Быў у форме жывёлы (вужа) з ярка-аранжавымі плямамі на галаве	Прадстаўлены ў выглядзе расліннай або жывёльнай істоты. Таксама ён можа з’явіцца ў выглядзе родных або знаёмых. Апісваецца і як гігант, і як карлік, ёсць меркаванне, што ён мог змяняць свой рост. Калі Лесавік апрануты, то ён падобны да чалавека
Спосаб прагнаць або зняць чары	У размове не згадвалася	Лічылася, што пазбавіцца ад Лесавіка можна з дапамогай малітвы, мацернай брані або абярэгаў. Як нагода для «выкрадання» разглядалі праклён у выглядзе пасылання «да лясуна». Каб знайсці зніклых, рабілі не толькі звычайныя пошукі, але і здзяйснялі абрад «адвядзення» – падавалі дар або пагражалі магіяй або заступніцтвам святых
Спосаб задобрыць або дамовіцца	Павітацца, падзякаваць	Па народных паданнях лясун мог забяспечыць поспех на паляванні і шчасны выпас жывёлы, для гэтага паляўнічым і пастухам было неабходна прынесці яму дар і заключыць з ім дагавор [6]

Натуральна, што атрыманая з аповеду інфарманта характарыстыка Лесавіка больш вузкая ў параўнанні з агульнай міфалогіяй. Тым не менш фальклорныя запісы паказваюць, што функцыі Лесавіка супадаюць з агульнымі міфалагічнымі ўяўленнямі. Знешні выгляд у беларускай міфалогіі шматварыянтны, а са слоў аўтара аповеду мы можам адразу даведацца, што перад намі Лясун. Паводле табліцы можна сказаць, што інфармант не сустракаўся са злым Лесуном, аўтар прапануе сябраваць з гаспадаром лесу.

Згодна з многімі народнымі ўяўленнямі вада адна з асноўных касмічных стыхій. У беларускай міфалогіі вада звязываецца з пачаткам стварэння Сусвету, з пераходам у іншасвет і з многімі другімі рэчамі [2, с. 57]. І людзі не маглі не насяліць яе жыхарамі. І ў каждым вадаёме з’явіўся міфічны гаспадар, дух, увасабленне разбуральнай, варожай чалавеку стыхіі вады – Вадзянік. У яго многа найменняў: Вадзяны, Вадзяны Дзед, Вірнік, Амутнік, Ціхоня [2, с. 59; 3, с. 69; 8, с. 13].

[1] Тут і далей у запісах размоў захоўваюцца асаблівасці маўлення інфармантаў.

Пры размове з нашай знаёмай, нас зацікавіла тэма пра балота, бо ў яго таксама павінны быць духі. Прывядзём фрагмент размовы пра Вадзяніка: “…Памятаю ты ў мяне пра духаў балот пытала, але я нічога пра іх ня ведала. Аднак, магу расказаць пра Вадзянога дзеда або як яго яшчэ клічуць Вадзянік. Дык вось у месцы, дзе я раней жыла, працякала невялікая рачушка, але ўся вёска яе любіла, бо ў той было шмат рыбы, да і купацца мы любілі. …Вось нам тады дарослыя сказалі не падхадзіць, бо ў гэты час усе духі найбольш актыўны, асабліва Вадзяны Дзед. Але мы тады вырайшылі паглядзець на яго і так здарылася, што ён разлаваўся на нас і абліў вадой. Нам тады было не так весела, як зараз табе, так? ...Скажу адно, мне тады здарылася, што там была вялізарная рапуха”.

Вадзянік	У апавяданні	У беларускай міфалогіі
Функцыя	Любіць водных жывёл раззлаваўшыся, можа абліць вадой	Любіць паджартаваць над людзьмі, што прыйшлі да месца яго пражывання. Пры неабходнасці ён можа ствараць магутныя водныя плыні, падымаць моцныя хвалі і нават вывесці возера, сажалку або раку з берагоў. Акрамя таго, у падпарадкаванні духу знаходзяцца ўсе істоты, якія насяляюць вадаём (ад рыб да тапельцаў і русалак) [2, с. 59]
Знешні выгляд	Велізарная рапуха	Можа лёгка мяняць свой воблік, ператварацца ў жывёл, рыб і нават дрэвы [4]. Глыбокі стары сярэдняга росту, з доўгай барадою, з доўгімі валасамі на галаве, з бліскучай шкурай, расплывістым тварам, азызлым пузам, доўгімі нагамі, перапонкамі [3, с. 69]
Спосаб прагнаць або зняць чары	У размове не згадвалася	У вадзе змагацца з вадзяным немагчыма, аднак пры неабходнасці яго можа адпудзіць медзь або жалеза, што толькі моцна яго разлуе. Па гэтай прычыне ў старажытнасці гаспадара вадаёма аддавалі перавагу не раздражняць. Каб скінуць дзеянне чар вадзянога, можна ўкалоць сябе металічнай іголкай – тады на адно імгненне адкрыецца сапраўднае яго аблічча, і чары спадуць [4]
Спосаб задобрыць або дамовіцца	У асаблівыя дні не падыходзіць да вады. У гэтыя ж дні пакідаць сала на пяшчаным беразе	Аддавалі перавагу залагоджваць рознымі гасцінцамі – кідалі ў ваду хлеб ці чорную жывую істоту (курыцу або кошку) [4]

Такім чынам, функцыі Вадзяніка ў фальклорным запісе і звестках па міфалогіі амаль падобныя паміж сабой, а вось знешні выгляд можа шырока вар’іравацца паводле агульных міфалагічных даных. У нашым запісе Вадзяны прадстаўлены канкрэтнай істотай – рапухай. І ў аповедзе, і ў даведніках па міфалогіі адзначаецца, што Вадзянік можа раззлавацца, спосаб задобрыць або дамовіцца ў двух выпадках таксама даволі канкрэтны і падобны.

Галоўная частка жыцця кожнага чалавека праходзіць у хаце, таму вельмі важна каб у ёй быў лад і спакой. У даўнія часы залогам добрага жыцця лічылі сяброўства з Хатнікам. Ён аберагаў ад зла і за малымі дзеткамі прыглядаў, сварыліся з ім толькі дурні. У Хатніка таксама ёсць і другія мянушкі: Дамавік, Гаспадар, Падпечнік [2, с. 528; 8, с. 122]. У міфалагічных уяўленнях беларуса Хатнік надзяляецца ўсімі якасцямі дбайнага гаспадара [3, с. 13].

Пахадзіўшы яшчэ па вяскоўцах, Аляксандра вырайшыла зайсці да суседкі, яна як чалавек дасведчаны, расказала ёй пра духаў хаты, фрагмент аповеду прыводзім ніжэй:

− Ганна Станіславаўна, адкажыце, а вы ведаеце пра якіх-небудзь хатніх духаў?

− Хм, чаму раптам пытаеш пра іх? Хаця я не супраць адказаць на гэтае пытанне. Хатнія духі бываюць розныя, напрыклад, той жа самый Дамавік або Хатнік, называй як хочаш. У агульным сама ведаеш, што ён жыве ў кожнай сям'і, і яны адрозніваюцца адзін ад іншага. Таксама яны могуць быць як злымі, так і добрымі. У асноўным Дамавікі любяць дзяцей і жывёл. Хм, мабыць людзям са злымі намерамі не даруе, а так заўсёды прыйдзе на дапамогу сваёй сям'і, якая трапіла ў бяду. Магчыма ёсць яшчэ якія-небудзь сведкі пра Дамавіка, але гэта ўсе, што я ведаю.

− Дзякуй вам. Скажыце, ці можа Дамавік сысці з дому?

− Ну, гэтага я не ведаю, мабыць, можа. Думаю, калі яго пакрыўдзіць тады да, пакіня гэтую хату і яе ўладальнікаў.

− Цяпер, я зразумела, што з Дамавіком лепей сябраваць, чым стаць ворагамі.

− Да, бо ён памочнік у гаспадарцы па хаце.

Хатнік	У апавяданні	У беларускай міфалогіі
Функцыя	Любіць дзяцей і жывёл. Памочнік у гаспадарцы па хаце. Заўсёды прыйдзе на дапамогу сваёй сям'і, калі яна трапіла ў бяду. Людзям са злымі намерамі не даруе	Захавальнік дома і ўсяго, што ў ім знаходзіцца. Магчымасць прадказваць будучыню, але галоўнае, вядома, гэта мудрасць і ўменне лячыць людзей і жывёл
Знешні выгляд	У кожнай хаце хатнік свой, адрозніваюцца выглядам	Выглядае дамавік як маленькі стары (ростам 20–30 см) з вялікай барадой. Лічыцца, што чым старэй дамавік, тым маладзей ён выглядае, паколькі нараджаюцца яны старымі, а паміраюць немаўлятамі
Спосаб прагнаць або зняць чары	Калі пакрыўдзіць, тады можа пакінуць хату і яго гаспадара	Забіць хатняга духа немагчыма, але можна адпудзіць жалезам. Дамавік не нападае на людзей і таму змагацца з ім не трэба
Спосаб задобрыць або дамовіцца	З ім лепей сябраваць, чым стаць ворагамі	Калі дамавік раззлаваўся, то яго неабходна задобрыць, паднёсшы ў падарунак кашу, хлеб з соллю, курыны пірог або нюхальны тытунь і ветліва папрасіўшы прабачэння [5]

Такім чынам, з табліцы можна зразумець, што функцыі Хатніка з дзвюх крыніц дапаўняюць адна адну. Напрыклад, звесткі ад інфарманта пра тое, што Хатнік заўсёды прыйдзе на дапамогу сваёй сям'і ў бядзе, з даведнікаў па міфалогіі дапаўняюцца магчымасцю прадказваць будучыню. У адрозненне канкрэтнага апісання знешнасці папярэдніх духаў, згаданых у аповедах, у гэтым фальклорным запісе знешні выгляд Дамавіка прадстаўлены абстрактна: істота прымае выгляд такі, які супадае з разуменнем гаспадара. У агульнай жа міфалогіі дух

хаты перададзены даволі канкрэтным антрапаморфным апісаннем. Звесткі пра Хатніка аб'ядноўвае інфармацыя пра неабходнасць для гаспадара сябраваць з гэтым духам.

Як адзначаюць даследчыкі, міфалагічныя ўяўленні пра духаў як фрагмент народнай культуры маюць шырокую геаграфію распаўсюджвання і багатую лакалізацыю (духі лесу, вады, хаты), яшчэ недастаткова вывучаны і маюць вялікія перспектывы для даследавання [8, с. 6]. Апрацоўка многіх фальклорных запісаў дазваляе сістэматызаваць і канкрэтызаваць уяўленні аб міфалагічных стварэннях. З фальклорных запісаў вынікае, што ў кожным месцы сваё разуменне, як жыць побач з духамі, наладжваць кантакт: як пазнаць, дамовіцца, змагацца, задобрыць.

Міфалогія – важны фактар у фарміраванні чалавечага светапогляду і прадстаўлення свету, яна дапамагае развіваць фантазію, дабрыню, забяспечвае ўнутраную гармонію паміж чалавекам і прыродай, што сведчыць пра актуальнасць правядзення падобных даследаванняў.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская міфалогія [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: be.wikipedia.org/wiki/Беларуская_міфалогія.
2. Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.
3. Беларуская міфалогія : дапам. / уклад. У. А. Васілевіч. – 2-е выд. – Мінск : Універсітэцкае, 2002. – 208 с.
4. Водяной [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.anews.com/p/131287551-kto-takoj-vodyanoj.
5. Домовой [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://bestiaria.ru/wiki/Мифология/Славянская_мифология.
6. Леший [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www. mythological-creations.fandom.com/ru/wiki/Леший.
7. Мифы в современном мире [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://scienceforum.ru/2016/article/2016024909.
8. *Новак, В. С.* Славянская міфалогія (на матэрыялах Гомельскай вобласці) / В. С. Новак. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – 329 с.

УДК 811.16`373:811.581`373:635.621

В. И. Коваль (Гомель)

О СИМВОЛИКЕ ТЫКВЫ В СЛАВЯНСКОЙ И КИТАЙСКОЙ ТРАДИЦИОННЫХ КУЛЬТУРАХ

Тыква – крупный шарообразный плод известной бахчевой культуры – наделяется богатой символикой у разных народов благодаря наличию в ней таких важных исходных утилитарных характеристик, как плодовитость, обилие семян, высокие питательные свойства, округлость, использование (в высушенном виде) в качестве легкого и прочного сосуда.

В традиционной культуре славянских народов спелая, наполненная зернами тыква символизирует материальный достаток и благополучие. На Новый год белорусы разбивали на пороге тыкву, чтобы «багата жылося». В Черногории аналогичный рождественский ритуал старались провести таким образом, чтобы семечки тыквы разлетелись в разные стороны дома. В Сербии невеста брала на венчание семена тыквы, чтобы у нее было много детей; в украинской традиции молодые ради счастливой будущей жизни съедали семечки тыквы, выросшей на одной ветке. Кроме того, «формой и величиной тыква уподобляется голове и в этом значении может определять как умного, так и глупого (пустого) человека», что подтверждается хорв. *tikva ti je šupla* (тыква твоя дырявая) ‘о глупце’ и *imati soli u tikvi* (иметь соль в тыкве) ‘о разумном человеке’ [18, с. 335–336].

В русских народных говорах слово *дурак* используется для обозначения некоторых сортов тыквы: *белый дурак* ‘белая крупная тыква’, *русский дурак* ‘небольшая красная тыква’ [СРНГ]. Сходные представления отражены и в болг. *тиква ми е зелена* ‘глупый’ [ФРБЕ]. Представление о пустой тыкве как воплощении глупости находит отражение в художественных текстах: *У кипчаков вместо голов на плечах пустые тыквы с длинными усами* (В. Ян. К последнему морю); *Голову, голову надо иметь на плечах, а не пустую тыкву!* (Ю. О. Домбровский. Обезьяна приходит за своим черепом). Сравн. также: серб. *празна тиква* (= пустая тыква) ‘неспособный, неумелый человек’ [FRHSJ]. Очевидную параллель для славянского языкового материала обнаруживаем и в китайском языке: 傻瓜 (*ша гуа*, букв. глупая тыква) ‘дурак, дурья башка’.

В отдельных случаях тыква осмыслялась как атрибут нечистой силы и воплощение греховности. Известны, в частности, древнерусские изображения беса в вывороченной наизнанку шубе с навешанными на нее тыквами [16, с. 261]. Негативная символика по́лой тыквы отчетливо выявляется в болгарском обычае наказания блудницы: «Сажали ее задом наперед на осла, бранили, поливали водой и били по́лой, высушенной тыквой» [17, с. 545]. В сербской похоронной обрядности пустую тыкву как сосуд для воды или вина клали в гроб больших грешников. В целом в народных верованиях сербов тыква осмыслялась как магический предмет – вместилище нечистых душ и демонов болезней [10, с. 141–142].

Широко известно использование тыквы как ритуализованного предмета, наделяемого негативной (или, во всяком случае, «отгонной») символикой, в обряде сватовства в том случае, когда невеста (или ее родители) выражают отказ сватающимся. Сравн.: укр. *дати (підсунути, піднести) гарбуза* [ФСУМ], белорус. *атрымліваць гарбуз* [СФ], *даваць (даць) гарбуз* [СФ], рус. (диал.) *поднести гарбуз* [СРДГ], пол. *harbuza dostać* [NKPP], болг. (диал.) *дадоха ми тиква в ръка* ‘о женихе, получившем отказ невесты’ [ФРБЕ].

По мнению А. С. Аксамитова, внутренняя форма фраземы *даць гарбуза* может быть восстановлена либо через восприятие тыквы как чего-либо малоценного, не заслуживающего внимания [1, s. 25], либо с учетом актуализации ее округлости, шарообразности, т. е. демонстрируя тыкву, нежелательным сватам давали понять, чтобы они убирались, «катились» подобно тыкве [2, s. 82]. Высказывается также мнение, согласно которому в народной медицине тыкву советовали употреблять для снижения сексуального желания, поэтому вручение тыквы (белорус. гарбуза) при отказе от брачного предложения «прочитывалось» как рекомендация «остыть», успокоиться [5].

Вместе с тем есть основания считать, что тыква в данном случае является негативно осмысливаемым этнокультурным символом, истоки которого могут быть соотнесены с представлениями о внутренней форме других фразеологизмов той же семантики с именными компонентами, являющимися воплощением пустоты, «незаполненности»: рус. (диал.) *чайник прицепить* [СРДГ], *навязать котелок* [СРДГ]. Спелая тыква, будучи по́лой внутри, осмыслялась как знак невезения, «нежелательности» по аналогии с представлениями о встрече с человеком, несущим пустые ведра или другую пустую, ничем не наполненную посуду. Известны случаи, когда на белорусском Полесье «нежелательному» жениху вручали либо тыкву с вырезанной серединой, либо вареную (испеченную) тыкву, у которой, естественно, вырезалась мякоть и удалялись семена: «Калі

дзяўчына не хацела ісці замуж, клалі ў вазок звараны гарбуз» [11, с. 22]; *А як ны хочэ дівка, як откажэ, то вжэ кажуть, што гарбуза спыкла... А того гарбуза ніхто ні пык* [6, с. 267]; сравн. также укр. *печеного гарбуза піднести* ‘отказать сватающемуся’ [ФСУМ].

Сказанное позволяет предположить, что исходной, наиболее архаичной формой выражения отказа сватающимся с помощью тыквы было вручение (или демонстрация) именно по́лой – с вырезанной серединой или испеченной (и потому также по́лой) – тыквы. В дальнейшем, в результате забвения первоначальных представлений, стали использовать «целую» тыкву, так как и в этом случае она воспринималась как по́лый предмет.

Наряду с предположением об актуализации «внутритыквенной пустоты» при ее использовании в качестве символа отказа сватающимся, может быть предложено иное понимание «логики» соответствующего обряда, основанное на восприятии тыквы как женского символа, относящегося к продуцирующей, детородной сфере. В таком случае тыква (при ее ритуальном употреблении) помещается в один логический ряд с вручаемым в случае отказа жениху гороховым венком – символом «нечестности», нецеломудренности невесты [7, с. 33–34], таким образом, не только в принципе исключает возможность сватовства, но и создает для потенциального жениха и его родственников постыдную, крайне унизительную ситуацию. Данное предположение обусловлено выразительной детородной символикой наполненной зернами тыквы, которая в ряде фольклорных сюжетов осмысляется (на основе метафорического уподобления по форме и содержанию) как материнское чрево [12, с. 211].

В связи с темой данной статьи особенно показателен пример, приведенный Павлом Шпилевским в рукописном «Словаре белорусского наречия» (1845): автор связывал оборот *гарбуза ўзяць* с «обычаем белорусцев» бросать в возок сватам разбитую тыкву при несогласии невесты на брачное предложение [4, с. 19]. Очевидно, что в данном случае разбивание тыквы имеет совершенно иной смысл, чем вышеописанные белорусский и черногорский ритуалы, символизирующие благополучие и материальный достаток хозяев дома: бросить в возок сватам разбитую тыкву являлось, скорее всего, выразительным намеком на реальную или воображаемую «разбитость» («нечестность») невесты и естественным образом «ставило крест» на сватовстве. Показательно, что эвфемистические выражения *тыква расколота* и *разломанная тыква* употребляются героями китайского эротического романа XVII века «Подстилка из плоти» (вероятный автор – Ли Юй). Вэйян, главный герой этого произведения, размышляя о достоинствах и недостатках будущей супруги, представленных ему в стихотворных пророчествах, размышляет: «Вот те на! В стихе говорится, что красота непременно влечет к разврату. Неужели девица порченая? А что, если *тыква*, как говорится, *расколота*? Не может быть! Это лишь начало стихотворения». В другом эпизоде собеседник Вэйяна сообщает ему, что его будущими клиентами по определенным причинам не могут быть «девы моложе двадцати, в том числе те, коих можно назвать *разломанной тыквой*».

Обращение к традиционной китайской культуре позволяет выявить (наряду с закономерными отличиями) ряд черт, типологически сходных со славянскими представлениями о тыкве. При этом следует говорить не о тыкве вообще, а об одной ее разновидности – тыкве-горлянке, напоминающей по форме восьмерку.

Китайское название этой тыквы (葫芦, *хулу*) созвучно с иероглифом (福禄, *фулу*), обозначающим счастье и жалование чиновника [15, с. 85], и это обстоятельство не могло не повлиять на формирование положительной символики, связанной с тыквой-горлянкой. Однако определяющими в данном случае являются представления об этом плоде как об аналоге материнского чрева: «Необычная форма тыквы-горлянки, как бы составленной из двух вкладывающихся друг в друга сфер, представала символом реальности как непосредственного продолжения тела ребенка в теле матери [9, с. 237]. Описывая хранящиеся в Эрмитаже традиционные китайские картинки любовно-эротического содержания, О. М. Городецкая замечает: «Полая выдолбленная горлянка (сосуд с перехватом) считалась природным аналогом женственного вместилища. Образ этот нередко встречается в китайской эротической живописи и литературе. Так, один из графических листов серии “Су Во пянь” называется “Союз инь и ян в райских глубинах тыквы-горлянки”» [3, с. 48–49]. Новорожденных в древнем Китае купали в тыкве-горлянке, из которой удаляли семена и мякоть, поскольку такие тыквы порой вырастают внушительных размеров [14].

В одном из китайских мифов, посвященных появлению первых людей после опустошительного потопа, речь идет о брате и сестре Фуси и Нюйва, ставших впоследствии супругами и положивших начало рождению людей в Поднебесной. Перед проливным дождем, приведшим к потопу, дети – мальчик и девочка – успели забраться в выросшую у них огромную тыкву-горлянку, а после резко прекратившегося наводнения они не пострадали: «Дети, сидевшие в тыкве-горлянке, остались в живых. Тыква была упругой, и, упав на землю, она только подпрыгнула несколько раз, но не разбилась. Брат и сестра выбрались из нее целыми и невредимыми. Во время потопа все люди на земле погибли. В живых остались только эти двое детей. У них не было имени, а так как они спаслись в тыкве-горлянке, их назвали Фуси. Фуси – это то же, что и Паоси, то есть “тыква-горлянка”. Мальчика назвали *братец-тыква*, а девочку – *сестрица-тыква*». Супруги Фуси и Нюйва, традиционно изображающиеся в виде мужской и женской фигур с переплетенными змеиными хвостами, почитаются в Китае как божества, возродившие человеческий род [8, с. 41–43].

Роль тыквы-горлянки как продуцирующего начала отражена и в мифе о волшебной собаке Пань-гу: из уха жены древнего правителя Гао Синьвана выскочил маленький золотистый червячок, которого женщина посадила в тыкву-горлянку и прикрыла блюдом. С течением времени в тыкве под блюдом появился Пань-гу (*пань* – блюдо, *гу* – тыква), принявший в дальнейшем человеческий облик, женившийся на княжне и ставший прародителем, первопредком всех китайцев [Там же, с. 31–32].

Тыква-горлянка является обязательным атрибутом одного из Восьми бессмертных (*ба сянь*) – Ли Тегуая. Хромоногий Ли (Ли Железная Клюка), который «изображается высоким человеком с темным лицом, большими глазами, курчавой бородой и курчавыми волосами, схваченными железным обручем», постоянно носит в тыкве-горлянке чудесные снадобья [13, с. 498]. Именно в этом сосуде хранит эликсир бессмертия и Владачица запада – богиня Си Ванму, которая передала волшебный напиток пришедшему к ней стрелку Хоу И для того, чтобы он, выпив его вместе с женой Чан Э, обрел бессмертие [8, с. 157].

Приведенный материал (при очевидной его неполноте) иллюстрирует наличие в славянских и китайских традиционных представлениях не только специ-

фических этнокультурных явлений, но и целого ряда универсалий, связанных с отражением в языке и во внеязыковой действительности одного из фрагментов растительной символики.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Аксамитов, А. С.* Обряд и песня как источник образования фразеологических единиц белорусского языка / А. С. Аксамитов // Acta Balcano-Slavica. XVI. – Warszawa, 1984. – S. 21–31.
2. *Аксамітаў, А. С.* Аб некаторых асаблівасцях мовы беларускай вясельнай паэзіі / А. С. Аксамітаў // Studia z filologii polskiej i słowianskiej. Białorutenika. – Warszawa, 1995. – Т. 22. – S. 81–93.
3. *Городецкая, О. М.* «Весенние картинки» из собрания Эрмитажа / О. М. Городецкая // Китайский Эрос / под. ред. А. И. Кобзева. – М. : OCR Палек, 1998. – С. 46–49.
4. *Гуліцкі, М. Ф.* Нарысы гісторыі беларускай лексікаграфіі (XIX – пачатак XX ст.) / М. Ф. Гуліцкі. – Мінск : Выш. шк., 1978. – 120 с.
5. *Катовіч, А.* Як правільна «даць гарбуза» / А. Катовіч, Я. Крук // Звязда. – 2005. – 25 чэрв.
6. *Климчук, Ф.Д.* Традиционная свадьба полесского села Симоновичи. Венки / Ф. Д. Климчук // Полесский этнолингвистический сборник : материалы и исследования. – М. : Наука, 1983. – С. 262–279.
7. *Коваль, В. И.* Фразеология народной духовной культуры : состав, семантика, происхождение / В. И. Коваль. – Минск : РИВШ, 2011. – 196 с.
8. *Кэ, Юань.* Мифы древнего Китая : пер. с кит. / Юань Кэ ; послесл. Б. Л. Рифтина. – М. : Наука, 1987. – 527 с.
9. *Малявин, В. В.* Сумерки Дао. Культура Китая на пороге Нового времени / В. В. Малявин. – М. : Дизайн. Информация. Картография : Астрель : АСТ, 2003. – 436 с.
10. *Мршевић-Радовић, Д.* Фразеологија и национална култура / Д. Мршевић-Радовић. – Београд : Друштво за српски језик и књижевност Србије, 2008. – 248 с.
11. Палесскае вяселле / уклад. і рэд. В. А. Захаравай. – Мінск : Універсітэцкае, 1984. – 303 с.
12. *Пропп, В. Я.* Фольклор и действительность : избр. ст. / В. Я. Пропп. – М. : Наука, 1976. – 324 с.
13. *Рифтин, Б. Л.* Ли Те-гуай / Б. Л. Рифтин // Духовная культура Китая : энцикл. : в 5 т. / гл. ред. М. Л. Титаренко. – М. : Восточ. лит., 2007. – Т. 2 : Мифология. Религия. – С. 498.
14. Сказки про тыкву [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.liveinternet.ru/community/camelot_club/post424161699. – Дата доступа: 12.12.2020.
15. *Сомкина, Н. А.* Китайская традиция благопожеланий: символика животных и растений / Н. А. Сомкина // Вестн. СПбГУ. Сер. 13. – 2009. – Вып. 2. – С. 77–86.
16. *Толстой, Н. И.* Каков облик дьявольский? / Н. И. Толстой // Язык и духовная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике. – М. : Индрик, 1995. – С. 250–269.
17. *Толстой, Н. И.* Грех / Н. И. Толстой // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. – М. : Междунар. отношения, 1995. – Т. 1. – С. 544–546.
18. *Чёха, О. В.* Тыква / О. В. Чёха // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. – М. : Междунар. отношения, 2014. – Т. 5. – С. 335–337.

ИСТОЧНИКИ ПРИМЕРОВ

СРДГ – Словарь русских донских говоров : в 2 т. – Ростов н/Д. : Изд-во Ростов. ун-та, 1991. – Т. 2. – 223 с.

СРНГ – Словарь руских народных говоров / гл. ред. Ф. П. Филин, Ф. П. Сорокалетов. – Л. : Наука, Ленингр. отд-ние, 1972. – Вып. 8. – 369 с.

СФ – *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1 : А–Л. – 679 с.

ФРБЕ – *Ничева, К.* Фразеологичен речник на българския език (2 т.) / К. Ничева, С. Спасова-Михаилова, К. Чолакова. – София : Изд-во на Българ. акад. на науките, 1974. – Т. 1 : А–Н. – 759 с. ; Т. 2 : О–Я. – 779 с.

ФСУМ – *Удовиченко, Г. М.* Фразеологічний словник української мови : в 2 т. / Г. М. Удовиченко. – Київ : Вищ. шк., 1984. – Т. 1 : А–М. – 303 с.

NKPP – Nowa księga przysłów i wyrażeń przysłowiowych polskich. – Warszawa : Panst. Inst. Wydaw., 1969. – T. 1. – 881 s.

УДК 398

Т. А. Марозава (Мінск)

КЛАСІФІКАЦЫЯ І ЖАНРАВАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ СУЧАСНАГА СТУДЭНЦКАГА ФАЛЬКЛОРУ БЕЛАРУСІ

Студэнцкая культура і яе яскравае праяўленне – фальклорныя творы – адносяцца да адной з самых традыцыйных і ўстойлівых у сістэме сучаснай гарадской культуры. Як адзначыў рускі даследчык К. Э. Шумаў, «да асноўных фактараў,

якія ўплываюць на фарміраванне студэнцкага асяроддзя і, адпаведна, студэнцкіх традыцый, можна аднесці полаўзроставыя, сацыяльныя, прафесійныя, гістарычныя» [2, с. 165]. Спынімся на важнейшых з іх.

Узроставыя фактары вызначаюць адносную аднастайнасць асяроддзя, у якім сярэдняя розніца ва ўзросце ўнутры групы не перавышае аднаго-трох гадоў. Гэта адрозніваe студэнцкае асяроддзе ад дзіцячай (у шырокім сэнсе, бо сюды ўваходзяць школьнікі ўсіх класаў) субкультуры, у межах якой фарміруецца сфера зносін у межах аднаго дакладнага ўзроставага года.

Палавы склад студэнцтва без уліку спецыяльнасці фарміруецца з перавагай жанчын, хаця ёсць установы вышэйшай адукацыі і спецыяльнасці, дзе дамінуюць мужчыны. Аднак, тым не менш, большая частка прааналізваных намі тэкстаў была зафіксавана ад мужчын і адлюстроўвае «мужчынскі» погляд на свет. Названая акалічнасць у многім вызначае і спецыфіку жанраў, і лексіка-стылістычныя асаблівасці фальклорных твораў. Сам жа факт запісаў твораў ад маладых людзей, відаць, можна патлумачыць адносна большай сацыяльнай актыўнасцю студэнтаў-мужчын, іх значнай адкрытасцю. Спецыялізацыя ўстаноў вышэйшай адукацыі і спецыфіка навучання пакідае яскравы адбітак на фарміраванні традыцый унутры студэнцкага асяроддзя. У сувязі з гэтым стэрэатыпныя ўяўленні аб спецыяльнасцях замацоўваюцца ў розных жанравых формах.

Апірышча на *гістарычныя* традыцыі – адна з асноўных рыс, якая ўплывае на развіццё ўяўленняў студэнтаў і аб студэнтах. Так, для студэнцкіх традыцый усіх часоў характэрна праслаўленне п’янства і свабоды нораваў, скасаванне канонаў, рэлігійнае і палітычнае адмаўленне. Менавіта такім чынам фарміруецца спецыфічны стэрэатып паводзінаў, сістэма персанажаў і асноўныя тэматычныя групы студэнцкага фальклору. Яшчэ адна характэрная для студэнцкіх фальклорных жанраў рыса – выкарыстанне розных сродкаў стварэння камічнага. Яна звязана, хутчэй за ўсё, з тым, што для маладзёжнага асяроддзя ўласціва непрыняцце і адмаўленне існуючых «чужых» традыцый (узроставых, грамадскіх і інш.). Як раз у гэтым і праяўляецца юнацкі максімалізм, уласцівы студэнцкай субкультуры ў цэлым.

Генезіс студэнцкага фальклору даследчыкі звязваюць з 70–80-мі гадамі XX стагоддзя, аднак як від творчасці аформіўся ён толькі ў 90-я гады, калі маладзёжная культура падзялілася на асобныя субкультурныя аб’яднанні. Студэнцкі фальклор – найбольш рухавы і інтэрнацыянальны (маюцца на ўвазе краіны былога СССР), таму што любое студэнцкае асяроддзе з ім знаёмае. Як правіла, у якасці мовы трансляцыі выкарыстоўваецца менавіта руская як мова, на якой доўгі час вялося (а ў некаторых краінах, у тым ліку і ў Беларусі, і зараз вядзецца) навучанне ў савецкіх рэспубліках.

Важнай асаблівасцю класіфікацыі фальклорных відаў і жанраў, якія функцыянуюць у студэнцкім асяроддзі, з’яўляецца тое, што яна, абапіраючыся на адзін крытэрый, выяўляе наступную заканамернаць: адны і тыя ж жанры, з рознай ступенню інтэнсіўнасці, прадстаўлены ў кожным з чатырох раздзелаў класіфікацыі, але пры гэтым праяўляюць кожны раз сэнсава адрозную функцыянальнасць, нягледзячы на фармальную аднастайнасць. Традыцыйная класіфікацыя, заснаваная на фармальна-сэнсавым крытэрыі, калі аб’ядноўваюцца ў адзін блок творы толькі канкрэтнай групы/жанру, тут не «спрацоўвае». Прычына – у спе-

цыфічнай функцыянальнасці, якая закладзена ў аснову прапаноўваемага крытэрыя класіфікацыі. У дадзеным выпадку гэты крытэрый – традыцыя, якая рэгулюе і фарміруе адносіны паміж «суб'ектам і аб'ектам» зносін. Адпаведна класіфікацыя фальклорных твораў студэнцкага асяроддзя ўключае ў сябе наступныя разнавіднасці:

1) жанры, якія рэгулююць і фарміруюць адносіны паміж «дасведчанымі» («суб'ектам») і «недасведчанымі» («іншымі суб'ектамі») ва ўласна студэнцкім асяроддзі: анекдоты, афарызмы, жарты, тосты, песні, «дражнілкі»;

2) жанры, якія рэгулююць і фарміруюць адносіны паміж студэнтамі («суб'ектамі») і выкладчыкамі («аб'ектамі»), у тым ліку падчас заняткаў і экзаменацыйных іспытаў: анекдоты, афарызмы, прыкметы, вусныя апавяданні, тосты;

3) жанры, якія рэгулююць і фарміруюць адносіны паміж студэнтамі («суб'ектамі») і «знешнім светам» («астатнімі аб'ектамі»), у тым ліку з іншымі сацыяльнымі і прафесійнымі групамі: анекдоты, розыгрышы, вусныя апавяданні.

Разгледзім найбольш актуалізаваныя фальклорныя жанры, якія бытуюць у асяроддзі сучаснага студэнцтва Беларусі. Усе творы былі ўзяты для аналізу з рэгіянальнага архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ.

Прыкметы

Аналіз фальклорнага матэрыялу студэнтаў паказаў, што ўсе прыкметы могуць быць аб'яднаны ў тры групы. Аднак аб'ядноўвае іх адно – забабонны характар: усе творы гэтага жанру, так ці інакш, звязаны з функцыяй абярэгу ад *нечага/некага*. Так, даволі вялікая колькасць прыкмет, якія бытуюць сярод студэнцкай моладзі, адносяцца да неспецыфічных, агульнавядомых, што сведчыць аб сувязі студэнцкага асяроддзя са «знешнім светам», ці грамадствам. Напрыклад:

Если оказаться между людьми с одинаковыми именами, надо загадать желание и обязательно поменяться местом с одним из них или уйти из «середины»;

Если наступили на ногу, надо обязательно наступить «в ответ», иначе поссоришься с этим человеком;

Если упадет ложка, придет женщина. Если упадет нож, придет мужчина. Если упавший предмет сразу же вымыть, то никто не придет;

Если говорят о чем-то хорошем, нужно плюнуть три раза через левое плечо и постучать три раза по дереву;

Если, выйдя из дома, забыл что-то, нужно вернуться и взять это. Чтобы не было беды, перед выходом надо посмотреться в зеркало [1].

Да другой групы можна аднесці прыкметы ўласна гарадскія, якія сваім узнікненнем абавязаны менавіта гарадскому побыту і прасторы. Напрыклад:

«Счастливый» билет в транспорте (у которого сумма первых двух-трех цифр в номере совпадет с суммой последних двух-трех цифр) нужно съесть, загадав желание;

Нельзя наступать на швы между квадратными бетонными плитами – беда будет;

Насчитаешь сто машин одной определенной марки или цвета – загадай желание [1].

Трэцюю групу складаюць уласна студэнцкія прыкметы, якія ўзнаўляюць у розных мадыфікацыях рысы студэнцкай субкультуры. Некаторыя з іх мадэлю-

юцца па традыцыйнай схеме, якая вядомая вясковай сялянскай культуры і заснавана на ўяўленнях ці аб магіі падабенства («*Чтобы успешно сдать экзамен, надо, чтобы родные или друзья во время экзамена держали палец в чернилах*» [1]), ці аб магіі дзеяння («*Перед тем как войти в аудиторию, нужно постучать трижды по левому косяку*»; «*Во время экзаменов нельзя стричь волосы и ногти*» [1]), ці аб магіі лічбаў («*Если билеты лежат в ряд, нужно отсчитать тринадцатый, тогда повезет*» [1]).

Анекдоты

Колькасны склад анекдотаў, якія бытуюць у студэнцкім асяроддзі, велізарны. Таму пры іх аналізе больш прадуктыўна весці гаворку аб спецыфічнай студэнцкай тэматыцы, якая складае стрыжань гэтага жанру. Вобразнасць студэнцкіх анекдотаў стэрэатыпная. Яна фіксуе ўяўленні аб студэнцкім жыцці з некалькіх бакоў. Гэта:

- побыт – стэрэатыпнасць праяўляецца тут пры стварэнні вобраза студэнта праз яго ўзаемаадносіны з выкладчыкам, са студэнтамі малодшых і старэйшых курсаў, з жонкай/мужам-студэнтам, з «іншымі суб'ектамі» і «знешнім светам». Вынік функцыянавання анекдота гэтай групы – студэнт галодны[1], бедны, знаходлівы, пахабны, сексуальны. Напрыклад:

В метро едет бабка, смотрит – худой студент. Она ему место уступает: «Мальчик, садись». – «Да нет, бабушка, спасибо». – «Садись, мальчик, ты такой худенький». – «Да нет, спасибо, я постою». – «Ты, неверное, отличник?». – «Нет, бабушка, я троечник». – «Ну, давай я хоть твой плащ подержу». – «Это не плащ, бабушка, это мой однокурсник, вот он отличник» [1];

Жена говорит мужу-студенту: «Я уже не знаю, как штопать твои носки. Дырка на дырке». Муж ей советует: «А ты к туфлям пришей» [1];

- апазіцыя «студэнт – выкладчык». Як паказаў аналіз, сярод такіх анекдотаў сустракаюцца ў большасці пераробкі, «прыстасаваныя» да канкрэтных устаноў вышэйшай адукацыі, факультэтаў, «вядомых» выкладчыкаў. Напрыклад:

Умер преподаватель. Студент встречает однокурсников после кладбища, а те все в земле перемазались. «Вы чего такие грязные?» – «Да на "бис" хоронили» [1];

- сесія, экзамен – экстрэмальная сітуацыя. Вобразнасць у энекдотах дадзенай групы наступная: студэнт – знаходлівы, хаця вучыцца дрэнна, ці ведае шмат, але яго недалюблівае выкладчык; выкладчык – нездагадлівы, неаб'ектыўны, часта «пасуе» ў «паядынку» са студэнтам. Напрыклад:

Как ставят оценки на экзаменах: пять – если знаешь преподавателя, четыре – если знаешь, как выглядит учебник, три – если знаешь, какой предмет сдаешь;

Профессор спрашивает студентку: «Можете ли вы доказать, что вода притягивает электричество?» – «Конечно. Каждый раз, когда я залезаю в ванную, звонит телефон»;

У преподавателя было два студента: один любимчик, второй – наоборот. Приходит любимчик на экзамен, вытягивает вопрос «Сколько человек погибло

[1] Трэба адзначыць, што ў творах, зафіксаваных напачатку 2000-х гадоў, гэтая рыса ўжо не сустракаецца, што звязана, відаць, з паляпшэннем умоў жыцця студэнтаў. Тым не менш названая акалічнасць патрабуе свайго далейшага вывучэння.

во время Великой Отечественной войны”. Отвечает, что 20 миллионов, получает «отлично» и уходит. Нелюбимый студент вытягивает тот же вопрос, отвечает, что 20 миллионов. Преподаватель: «Перечислить поименно» [1];

Экзамен на 2 курсе

Все сдувают со шпор… Препод оборачивается – все сдувают со шпор. Препод кашляет – все делают вид, что не сдувают со шпор.

Экзамен на 5 курсе

Все сдувают со шпор… Препод оборачивается – все сдувают со шпор. Студент кашляет, препод поворачивается спиной к аудитории [1];

- узаемаадносіны з іншымі факультэтамі і спецыяльнасцямі – тэматыка, якая транслюе негатыўнае стаўленне да «іншых суб’ектаў». У якасці стваральніка карціны высмейвання выступаюць розныя сродкі камічнага – гумар, гратэск, часам іронія, цікавыя супастаўленні, інтэлектуальныя алюзіі. Напрыклад:

Идут три студента: двое умных, а третий из политеха;

Что такое математика? Это когда в темной комнате ищут черного кота. Что такое физика? Это когда в темной комнате, заставленной шкафами, ищут черного кота. Что такое философия? Это когда в темной комнате ищут черного кота, которого там нет. Что такое научный коммунизм? Это когда в темной комнате ищут черного кота, котрого там нет, но все кричат: «Поймал!» [1].

Вусныя апавяданні

Да экзаменацыйных анекдотаў і прыкмет, анекдотаў аб узаемаадносінах паміж выкладчыкам і студэнтам далучаюцца і вусныя апавяданні аб нетрадыцыйных сітуацыях на экзамене. Часам адбываецца наступная трансфармацыя: падобныя нестандартныя сітуацыі кладуцца ў аснову анекдота, у сувязі з чым складана вызначыць, што было першапачатковым – вусная гісторыя ці анекдот. Адзінае адрозненне тут – аб’ём апавядаемай інфармацыі, хаця і гэты крытэрый досыць умоўны: вядомы анекдоты, якія смела можна было б лічыць апавяданнем. У дадзеным выпадку дасканалая, строгая дыферэнцыяцыя з вызначэннем жанру неабавязковая. Гэта яшчэ раз даказвае той факт, што фальклор значна больш багацейшы, чым тая сістэма тэрмінаў і паняццяў, у якую навукоўцы спрабуюць яго «апрануць».

Афарызмы

Іх можна назваць самымі «традыцыйнымі» сярод студэнцкіх фальклорных жанраў. У нечым яны падобныя на прыказкі і прымаўкі, але валодаюць спецыфічнай змястоўнасцю, якая, уступаючы ў сінтэз са спецыфічнай «падачай» зместу, набывае новы мастацкі эфект. Напрыклад:

От старения нации нас может спасти только смертность старого населения;

Уроки затормаживают развитие и убивают способность к индивидуальному мышлению;

Перед экзаменом не хватает одного дня;

Огромное преимущество экзаменатора в том, что он сидит по лучшую сторону стола;

Он досрочно завалил экзамены;

Сегодня физик – завтра защитник Родины [1].

Такім чынам, прыклады студэнцкага фальклору сведчыць аб тым, што студэнцкая моладзь Беларусі з’яўляецца носьбітам спецыфічнай фальклорнай спад-

чыны, засвойваючы дасягненні мінулага і ствараючы новатворы, у змястоўным і жанравым плане разнастайныя. Як і кожная з'ява культуры, такія творы патрабуюць свайго далейшага дэталёвага вывучэння.

ЛІТАРАТУРА

1. Матэрыялы рэгіянальнага архіва Мінскай вобласці Фонда фальклорных матэрыялаў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору філалагічнага факультэта БДУ.
2. *Шумов, К. Э.* Студенческие традиции // Современный городской фольклор : сб. науч. тр. / отв. ред. С. Ю. Неклюдов. – М., 2003. – С. 103–122.

УДК 008 (476)

А. В. Морозов (Минск)

БЕЛОРУССКАЯ КУЛЬТУРА В КОНТЕКСТЕ МИРОВОГО ГУМАНИТАРНОГО ПРОЦЕССА: ПРОБЛЕМА РЕПРЕЗЕНТАЦИИ

Международный имидж современного государства детерминирован не только его экономической и военно-политической ролью в глобальном мире, но и богатством накопленного историко-культурного наследия и динамикой социокультурного развития.

При рассмотрении проблемы репрезентации достижений белорусской культуры в мировое культурное пространство следует учитывать тот факт, что формирование оптимального культурно-информационного поля основано на стабильном функционировании *дипломатического*, *культурологического* и *PR-дискурсов,* которые взаимосвязаны между собой.

Культурная дипломатия во многом определяет *содержание и практику функционирования дипломатического дискурса*, нацеленного на внешнеполитическую пропаганду достижений культуры в зарубежных странах.

В последние десятилетия на смену «жестким» политическим инструментам регулирования международных отношений пришла новая, более пластичная система методов установления крепких многосторонних связей и альянсов – «мягкая сила» (английский термин *soft power*) – форма политической власти, ориентированная на способность добиваться желаемых результатов на основе добровольного участия, цивилизационной симпатии и привлекательности (в отличие от «жесткой силы», которая подразумевает принуждение). Свое окончательное формирование теория «мягкой силы» получила в трудах американского политолога, профессора Гарвардского университета Джозефа Ная [3; 4]. Согласно концепции Дж. Ная, «мягкая сила» представляет собой своеобразную производную от трех ресурсов государства: его культуры, политической идеологии и внешней политики.

Специфика белорусской модели социокультурного развития определяется национальными интересами суверенитета и независимости Республики Беларусь, внутриполитической стабильности и внешней безопасности, сохранения и преумножения ценностей материальной и духовной культуры. Конечный результат культурной дипломатии Республики Беларусь – сделать страну привлекательной для иностранной аудитории путем реализации на международной арене эффективных социокультурных проектов.

Важнейшим направлением коммуникативной стратегии в рамках культурной дипломатии Беларуси стали *двусторонние и многосторонние связи, сущностными характеристиками* которых *являются многовекторность и стремление к сбалансированности*. Как явствует из Кодекса Республики Беларусь

о культуре [1], белорусское государство исходит из готовности развивать разнообразное культурное сотрудничество со всеми странами мира. Это определяется реализуемым во внешней политике Республики Беларусь принципом многовекторности, который предполагает роль диалогового центра нашей страны на стыке цивилизаций Запада и Востока, места осуществления эффективных форм международного культурного сотрудничества: гуманитарных форумов, конференций и симпозиумов, фестивалей разнообразных видов искусств, выставок, ярмарок, спортивных соревнований и туристических мероприятий. Перспективные направления и формы межкультурного взаимодействия Республики Беларусь с другими государствами и соответствующая коммуникативная стратегия должны быть дополнены комплексом мероприятий, которые осуществляются органами власти и общественными организациями на региональном и местном уровне, в том числе в рамках трансграничного сотрудничества. В процессе осуществления эффективной коммуникативной стратегии политиками, деятелями науки, образования и культуры должна быть разработана система мероприятий, реализация которой будет направлена на совершенствование межкультурного диалога народов и подкрепит позитивные интеграционные процессы на евразийском цивилизационном пространстве [2].

Кроме того, для совершенствования репрезентации достижений белорусской культуры в рамках дипломатического дискурса следует продолжить практику открытия Почетных консульств Республики Беларусь в зарубежных странах и назначения в качестве почетных консулов видных политиков, деятелей культуры и науки, конструктивно настроенных на проведение комплекса мероприятий по межкультурному сотрудничеству и информированию общественности страны пребывания о культурной жизни нашего государства.

В рамках *культурологического дискурса* продвижения белорусской культуры на общемировой уровень и создания соответствующего культурно-информационного поля следует остановиться на перспективных направлениях, формах и кадровом обеспечении международных культурных проектов.

Применение конкретных направлений и форм популяризации белорусской культуры за рубежом диктуется необходимостью формирования положительного имиджа Республики Беларусь на международной арене и связано с *эффективным внедрением* признанных во всем мире технологий брендинга и брендмаркетинга.

Эффективная коммуникативная стратегия в рамках культурологического дискурса предполагает, что культурный бренд Республики Беларусь должен быть поддержан программой социокультурных мероприятий, в рамках которой тактически и стратегически нацеленных на осуществление задач продвижения достижений отечественной культуры за рубежом. Позитивно может быть оценена культурная составляющая практики проведения Года Республики Беларусь в зарубежных странах. Перспективными в плане осуществления продуктивной коммуникативной стратегии представляются следующие формы международного сотрудничества: проведение дней национальной культуры, дней кино; организация концертно-гастрольной деятельности, выставок и других культурных мероприятий; налаживание прямых контактов между субъектами культурной деятельности; организация языковых и краеведческих курсов, проведение семинаров мастер-классов по вопросам сохранения и развития белорусского языка и культуры.

Оптимальная коммуникативная стратегия предполагает, что в практическом плане задачи продвижения отечественной культуры за рубежом могут осуществляться в виде крупномасштабных, в том числе долговременных акций, а также отдельных мероприятий. Солидную основу в этом плане представляет практика обмена национальными годами Республики Беларусь с иностранными государствами, культурная составляющая программ которых занимает значительное, а иногда и превалирующее место. Необходимо также поощрять проведение за рубежом Дней культуры Беларуси и других комплексных мероприятий, организацию взаимных поездок деятелей культуры для развития творческих контактов, обмена опытом, участия в конференциях, симпозиумах и других тематических мероприятиях.

В контексте культурологического дискурса нельзя упускать из виду *необходимость совершенствования* как механизма реализации проектов и обменов в сфере культуры, так и их структуры и показателей эффективности. Вполне очевидно, что при осуществлении коммуникативной стратегии *акцент* следует делать не столько на импорте зарубежной культуры, сколько на экспорте белорусской культуры, ее популяризации за рубежом. Следует стремиться к максимально широкой представленности в зарубежных странах лучших достижений белорусской культуры во всем многообразии ее классических и современных проявлений. Необходимо целенаправленно осуществлять меры по защите авторских прав граждан Республики Беларусь на использование произведений культуры, исполнительской деятельности артистов и творческих коллективов при осуществлении проектов в рамках международного культурного сотрудничества. В контактах с компетентными органами других государств важно добиваться восстановления права собственности на выявленные предметы государственного культурного достояния из числа нелегально вывезенных за пределы страны и их возвращения в Республику Беларусь.

Внедрение в ходе осуществления коммуникативной стратегии технологий брендинга и маркетбрендинга Республики Беларусь в целом и ее отдельных регионов предполагает расширение участия нашей страны в международных туристических обменах, играющих важную роль с точки зрения установления лучшего взаимопонимания между народами и формирования объективного представления об их жизни, традициях и обычаях, воспитания толерантности и уважения к многообразию национальных культур. При этом особое внимание следует уделять целенаправленной работе не только туристических организаций, но и специализированных учреждений культуры по более активному привлечению иностранных туристов в Республику Беларусь. Одним из важнейших направлений работы в развитии системы учреждений культуры Республики Беларусь должно стать *продвижение отечественных продуктов культурного туризма* на международном рынке туристских услуг. Эффективная коммуникативная стратегия должна быть направлена на совершенствование практики информирования потенциальных зарубежных клиентов о возможностях культурного туризма Республики Беларусь, организации участия представителей учреждений культуры в белорусских экспозициях в международных туристских выставках, а также в интерактивных презентациях Беларуси в качестве перспективного туристского направления с точки зрения наличия богатого историко-культурного наследия.

Важной составляющей коммуникативной стратегии является развитие *молодежных обменов*. Особое внимание целесообразно уделять более активному

участию в международном культурно-гуманитарном сотрудничестве белорусских молодежных организаций и общественных объединений. Такое сотрудничество должно способствовать раскрытию творческого потенциала молодежи, ее приобщению к популяризации ценностей национальной культуры за рубежом. Представляет особый интерес распространение опыта работы учрежденного в 1989 году Республиканского общественного объединения «Белорусская Ассоциация клубов ЮНЕСКО» по подключению белорусской молодежи к реализации международных культурно-гуманитарных программ и иностранной молодежи к реализации культурных, образовательных и просветительских проектов на территории Беларуси, проведению международных юношеских форумов и иных мероприятий.

Осуществление продуктивного культурологического дискурса посредством реализации эффективной коммуникативной стратегии как фундамента политики по вхождению белорусской культуры в мировое культурное пространство требует адекватного ресурсного обеспечения. Для решения соответствующих задач необходимо задействовать все имеющиеся в государстве финансово-экономические механизмы. При этом активнее должны привлекаться внебюджетные средства в рамках государственно-частного партнерства на добровольной основе. Заслуживает поддержки деятельность профильных общественных фондов, а также предпринимательских структур, спонсорство которых помогает реализовывать значимые проекты межкультурного сотрудничества.

Конкретная конфигурация форм международного сотрудничества и показатели эффективности функционирования культурологического дискурса и соответствующей коммуникативной стратегии зависят от количественных и качественных показателей, характеризующих практику осуществления целевых проектов и культурных обменов, направленных на знакомство иностранной аудитории с традиционными основами и инновационными формами национальной культуры: лучшие достижения белорусской культуры должны быть представлены за рубежом во всем многообразии ее классических и современных проявлений.

PR-дискурс вхождения белорусской культуры в мировое культурное пространство включает в себя применение различных коммуникативных стратегий и передовых технологий в сфере менеджмента и маркетинга культуры, креативных индустрий и предполагает, прежде всего, целенаправленную информационную поддержку разнообразных акций культурной дипломатии.

Прежде всего, необходимо усовершенствовать существующие интернет-ресурсы, предоставляющие зарубежной аудитории актуальную информацию о культуре Беларуси. Принципиально важно добиться того, чтобы все ведущие учреждения культуры Республики Беларусь размещали на своих сайтах полную и оперативную информацию о своей деятельности и предоставляемых услугах на иностранных языках. Очевидна целесообразность расширения контактов между музеями, архивами и библиотеками Беларуси и других стран в целях обмена специалистами, информационными материалами и копиями документов, а также использования в интересах популяризации достижений белорусской культуры музейных и библиотечных фондов путем обеспечения максимально возможного доступа к ним в соответствии с законодательством Республики Беларусь и международной практикой, а также использования исторических и историко-архивных материалов в выставочной, издательской и медийной деятельности.

Формированию позитивного образа национальной культуры будут также способствовать обмены между радио- и телевещательными компаниями, инфор-

мационными агентствами, а также взаимодействие в области издательского дела. Большое значение имеет усиление поддержки средств массовой информации, популяризирующих культуру Республики Беларусь и обеспечивающих информационное сопровождение белорусских культурных акций за рубежом. Следует уделять должное внимание осуществлению на иностранных теле- и радиоканалах проектов отечественных теле- и радиокомпаний, способствующих продвижению белорусской культуры в медийное пространство зарубежных стран. Большой эффект может представлять инициирование и проведение *общенационального конкурса* инновационных культурно-просветительских и PR-проектов, способствующих продвижению белорусской культуры на мировой уровень.

Эффективной репрезентации достижений белорусской культуры будет способствовать *расширение сети* информационно-культурных центров Беларуси в других государствах. Активное функционирование информационно-культурных центров позволит решить следующие задачи:

- пропаганду белорусского культурного наследия в глобализирующемся мире;
- создание благоприятных условий для взаимодействия национальной культуры белорусов с культурами других народов мира;
- формирование современного белорусского культурно-информационного поля и развитие способов его регионального, национального и транснационального опосредствования;
- ведение культурно-просветительской работы, направленной на популяризацию цивилизационного наследия белорусского народа;
- развитие технологий социокультурной прогностики, включая геополитические, экономические и культурологические аспекты межкультурного взаимодействия белорусского народа в XXI столетии.

Осуществляемый вновь созданными центрами полномасштабный обмен информацией поможет формированию у широких слоев населения норм и ценностей, отвечающих потребностям цивилизации XXI столетия. Кроме того, в рамках реализации национальной коммуникативной стратегии PR-дискурса культурной дипломатии необходимо выработать *комплексную программу* защиты духовно-культурной самобытности белорусского общества от деструктивного информационного воздействия извне.

Таким образом, проведенный анализ позволил сформулировать следующие в ы в о д ы.

1. Алгоритм репрезентации достижений национальной культуры в глобальном мире предполагает поддержание на государственном уровне эффективного функционирования системы дискурсов: дипломатического, культурологического и PR-дискурса.

2. Дипломатический дискурс реализуется, прежде всего, в рамках культурной дипломатии. Конкретное содержание коммуникативной стратегии многовекторной культурной дипломатии Республики Беларусь определяются национальными интересами и основополагающими принципами межкультурного диалога.

3. Культурологический дискурс продвижения белорусской культуры на общемировой уровень основан на качественном совершенствовании проектной деятельности и программ обменов в сфере международных культурных связей.

4. Эффективный PR-дискурс связан с применением инновационных информационных технологий и коммуникативных стратегий с целью создания за рубежом позитивных представлений о Беларуси и ее многовековом историко-культурном наследии.

ЛИТЕРАТУРА

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронный ресурс] : 20.07.2016 № 413-З // Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Режим доступа: http://etalonline.by/?type=text&regnum=Hk1600413#load_text_none_1_. – Дата доступа: 06.09.2020.
2. *Морозов, А. В.* Белорусская славистика в XXI веке: Цивилизационный подход в исследовании истории и культуры Беларуси и России / А. В. Морозов // Россия и Беларусь: история и культура в прошлом и в настоящем : материалы междунар. научной конференции «Россиеведение и белорусоведение в XXI веке: традиционные и новые тенденции в научных исследованиях» (Смоленск, 11–12 окт. 2018 г.) / под ред. Е. В. Кодина. – Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2018. – Вып. 4. – С. 49–62.
3. *Nye, J. S.* Bound to Lead: The Changing Nature of American Power / J. S. Nye. – N. Y. : Basic Books, 1991. – 336 p.
4. *Nye, J. S.* Soft Power. The Means to Success in World Politics / J. S. Nye. – N. Y. : Public Affairs, 2004. – 192 p.

УДК: 398

В. І. Палукошка (Мінск)

ЧАРНОБЫЛЬСКІ ФАЛЬКЛОР: СУТНАСЦЬ ПАНЯЦЦЯ І ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

За дзесяцігоддзі пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі былі праведеныя даследаванні па праблемах медыка-біялагічных наступстваў радыяцыйнага забруджання, але і да цяперашняга моманту ажыццяўляюцца шматлікія праекты рэабілітацыі як людзей, так і тэрыторый. Чарнобыльскай тэрыторыі прысвечаны не адзін мастацкі твор, выйшла безліч зборнікаў, асобных публікацый. У XXI стагоддзі гэта тэма актыўна эксплуатуецца масавай культурай: з'яўляюцца коміксы, камп'ютарныя гульні, тэлевізійныя фільмы і серыялы. Разам з тым амаль адразу пасля катастрофы пачалі распаўсюджвацца разнастайныя чуткі, праройствы, гісторыі пра сустрэчы з незвычайнымі істотамі-мутантамі, анекдоты і выслоўі. У фалькларыстыцы ж з'явіўся яшчэ адзін аб'ект для вывучэння – чарнобыльскі фальклор у новым тэматычным напаўненні.

Да 26 красавіка 1986 года пад чарнобыльскім фальклорам разумелася лакальная творчасць украінскага народа, але пасля аварыі на ЧАЭС межы Чарнобыля і чарнобыльскага ў свядомасці людзей значна пашырыліся. З часам сутнасць дадзенага паняцця ў фалькларыстыцы кардынальна мяняецца: з лакальна-рэгіянальнай з'явы яно паступова пераходзіць у з'яву тэматычную. Калі раней чарнобыльскі фальклор існаваў і разглядаўся ў кантэксце традыцыйнай культуры, то яго семантычнае новаўтварэнне – з'ява сучаснага фальклору. «Сёння, – лічыць украінска-ізраільская даследчыца Л. Фіялкова, – тэрмін чарнобыльскі фальклор пазначае тыя разнажанравыя тэксты, якія з'явіліся і пашырыліся пасля катастрофы і з'яўляюцца сінанімічнымі да ядзернага ці атамнага фальклору», а распаўсюджваюць яго «людзі рознага этнічнага паходжання рознымі мовамі і ў розных сітуацыях у розных краінах» [2].

У сваёй новай тэматычнай мадыфікацыі чарнобыльскі фальклор ужо не лакальная з'ява. Гэтаму спрыялі як эвакуацыя насельніцтва з забруджаных тэрыторый, так і шырокі міжнародны рэзананс, які атрымала навіна аб аварыі на АЭС. Л. Фіялкова пераканана, што чарнобыльскі фальклор – гэта ўжо выключна творы розных жанраў пра катастрофу. Але, на наш погляд, паняцце «чарнобыльскі фальклор», акрамя асобнай групы твораў пэўнай тэматыкі, уключае (усё яшчэ) і такое паняцце як «фальклор Чарнобыля». Пры гэтым, падкрэслім, межы Чарнобыля на сённяшні дзень значна пашырыліся: Чарнобыльскі раён перарос у Чарнобыльскую зону (афіцыйныя зоны адчужэння і адсялення на тэрыторыі трох краін), куды ўжо ўключаюцца населеныя пункты Хойніцкага, Брагінскага,

Нараўлянскага раёнаў Гомельскай вобласці, Клімавіцкага, Касцюковіцкага, Краснапольскага, Слаўгародскага і Чэрыкаўскага раёнаў Магілёўскай вобласці (Беларусь), тэрыторыі Бранскай вобласці (Расія), поўнач Іванкіўскага і Палескага раёнаў Кіеўскай вобласці, а таксама частка Жытомірскай вобласці (Украіна). На дадзенай тэрыторыі, па сутнасці, ужо зусім ці амаль няма ні людзей, ні, адпаведна, традыцый. Але ж, акрамя зоны, ёсць яшчэ забруджаныя тэрыторыі, дзе на сённяшні дзень жывуць людзі, ёсць перасяленцы, якія пераехалі ў іншыя рэгіёны і нават краіны. Усе яны з'яўляюцца носьбітамі не толькі пэўнай культурнай традыцыі, але і транслятарамі ўнікальнага жыццёвага вопыту. Чарнобыльскі фальклор па аналогіі з чарнобыльскімі гаворкамі [1] перастаў існаваць як арэальная цэласнасць, але стаў суадносіцца з фальклорам перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны.

Менавіта ў гэтым, рэгіянальным, значэнні чарнобыльскі фальклор даследуецца беларускімі фалькларыстамі і сёння. Хоць і з нагоды чарговых угодак, але выдаюцца адзінкавыя зборнікі і манаграфіі. У гэтым кантэксце варта ўзгадаць манаграфію В. Ліцьвінкі «Фальклор і этнакультура Чарнобыля» (2006), зборнікі «Справаздачнае: фальклорны зборнік ліквідаваных у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС населеных пунктаў» (2005), «Голоса ушедших деревень» (2008), «Фальклор Магілёўшчыны: матэрыялы з раёнаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС» (2011), «Песні пакінутых вёсак» (2016). Праўда, у большасці такіх выданняў прадстаўлены архіўныя матэрыялы, сабраныя яшчэ да аварыі.

Што ж тычыцца чарнобыльскага фальклору як тэматычнай з'явы (сюды мы адносім успаміны сведкаў, чуткі, праройствы, бываліцы, анекдоты, прыпеўкі, выслоўі і іншыя жанры «радыяцыйнай» тэматыкі), то тут назіраецца яшчэ горшая сітуацыя. Дадзеная фальклорная група прадстаўлена і даследавана слаба. З аднаго боку, апошнім часам выйшла шмат дакументальных, публіцыстычных і мастацка-дакументальных кніг з успамінамі сведкаў і непасрэдных удзельнікаў тых падзей (варта згадаць хаця б «Чарнобыльскую малітву» С. Алексіевіч), безліч інтэрв'ю з ліквідатарамі і перасяленцамі ў сродках масавай інфармацыі і інтэрнэт-прасторы. Дадзеныя матэрыялы з прычыны адсутнасці іншага маглі б стаць крыніцамі для даследаванняў ці хаця б паспрыяць у нейкім сэнсе з'яўленню адпаведных тэматычных выданняў. Аднак асобных фалькларыстычных зборнікаў ці навуковых даследаванняў пакуль няма. Можна знайсці толькі адзінкавыя публікацыі, раскіданыя па разнастайных кнігах і часопісах. Сярод беларускіх – гэта кніга В. А. Гацко «Память Чернобыля» і артыкул Н. Жарскай «Чарнобыльская аварыя ў памяці жыхароў в. Вохар (Чэрыкаўскі раён, Магілёўская вобласць)», апублікаваны ў XVI томе «Гістарычнага альманаха». Не лепшая сітуацыя назіраецца і ў суседніх краінах.

Пра сітуацыю са зборам і даследаваннем чарнобыльскага фальклору ў Расіі інфармацыі вельмі мала. Вядома, што да дваццатых угодак аварыі асобным раздзелам у часопісе «Живая старина» (2006, № 3) былі надрукаваны тэксты традыцыйнага фальклору з Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці і дыялектныя тэксты аб аварыі і эвакуацыі жыхароў Чарнобыльскага раёна Кіеўскай вобласці, падрыхтаваныя адпаведна беларускім і ўкраінскім збіральнікамі. У кантэксце навуковай рэцэпцыі можна назваць артыкул украінскай даследчыцы Г. Бандарэнка «Современные мифы о Чернобыле» ў зборніку артыкулаў «История – миф – фольклор в еврейской и славянской культурной традиции» (М., 2009) і зборнік «Социокультурные последствия Чернобыльской аварии» (М., 2012),

дзе асобная ўвага надаецца стану традыцыйнай культуры, а таксама сацыяльна-культурнай і псіхалагічнай адаптацыі жыхароў Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей (даследаванне праводзілася сумесна з беларускімі і ўкраінскімі навукоўцамі). Гэта фактычна ўсё, што ў нас атрымалася знайсці.

Трохі лепшая сітуацыя назіраецца ва ўкраінскай фальклярыстыцы і філалогіі ў цэлым. Тут варта ўзгадаць публікацыі Л. Фіялковай і Д. Анцібор, прысвечаныя пераважна гумарыстычнаму фальклору. У дыялекталагічных зборніках часта можна сустрэць і тэксты пра жыццё да і пасля аварыі, запісаныя ад перасяленцаў; у мастацка-публіцыстычным альманаху «Єгупець» Б. Жолдакам была надрукавана падборка чарнобыльскіх анекдотаў (№ 8, 2001). У сваім артыкуле «Радиоактивный юмор» Л. Фіялкова прыводзіць падрабязны спіс і аналіз крыніц чарнобыльскага фальклору, якімі ёй даводзілася карыстацца. Мы не будзем яго дубліраваць, адзначым толькі, што большасць з іх створана не прафесійнымі філологамі, і тым больш не фальклярыстамі, таму многія тэксты падаюцца без пашпартызацыі (адсутнічаюць звесткі пра інфармантаў, час і месца запісу), у пераказе ці рэдагаваныя. Але нават у такім варыянце яны ўнікальныя і прадстаўляюць каштоўнасць у якасці крыніц для даследавання амаль не зафіксаванага навукоўцамі фальклору пра чарнобыльскую катастрофу.

Такім чынам, хацелася б яшчэ раз адзначыць, што на сённяшні дзень паняцце «чарнобыльскі фальклор» уключае ў сябе фальклор розных сацыяльных груп і розных краін, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Акрамя таго, сюды адносяць як традыцыйны фальклор, так і канкрэтныя творы адпаведнай радыяцыйнай тэматыкі. Калі традыцыйны фальклор забруджаных тэрыторый адносна актыўна даследуецца і выдаецца, то фальклор пра аварыю на цяперашні момант не толькі слаба даследаваны, але і амаль незафіксаваны.

ЛІТАРАТУРА

1. Говірки Чорнобильської зони : тексти / упоряд.: П. Ю. Гріценко [та інш.]. – Київ : Довіра, 1996. – 358 с.
2. *Фиалкова, Л.* Радиоактивный юмор [Электронный ресурс] / Л. Фиалкова. – Рэжым доступу : http://madan.org.il/node/674. – Дата доступу : 19.09.2016.
3. *Фіалкова, Л.* Чорнобильська катастрофа і фольклор / Л. Фіалкова // Вісн. АН України. – 1993. – № 1. – С. 70–74.

УДК 821.161.3

Т. І. Шамякіна (Мінск)

МАРА ЯК КУЛЬТУРНЫ КАНСТРУКТ
(на матэрыяле паэмы Якуба Коласа “Новая зямля”)

Паняцце “культурны канструкт” пакуль не ўжываецца ў беларускім навуковым дыскурсе. Але яно з’явілася ў еўрапейскай, у расійскай культурнай прасторы, хоць яшчэ і не сцвердзілася ў дэфініцыі – розныя даследчыкі ўкладаюць у яго розны сэнс. Мы разумеем культурны канструкт як паняцце, якое ў той ці іншай ступені характарызуе духоўнае быццё чалавека як *родавай* істоты; тую з культурных традыцый, што дазваляла людзям адаптавацца і выжываць у прыродным і сацыяльным свеце. Культурны канструкт – “вынік групавога адбору, што адбываўся на працягу многіх дзесяткаў і сотняў гадоў” [1, с. 12]. Прычым у іерархіі каштоўнасцей розных народаў можна заўважыць аднолькавыя з’явы і прадметы. Напрыклад, заўсёды шанавалася тое, што звязана з небам, любоўю, прыгажосцю, ісцінай, вечнасцю. А паколькі людзі і марылі заўсёды (што і рабіла іх людзьмі), то мэтазгодна лічыць паняцце “мары” культурным канструктам.

Мара, як мы лічым, – вера ў невядомае і спадзяванне на яго, перажыванне таго, што яшчэ не адбылося; не прадбачанне, а *пачуццё* будучага. Калі б не мары, нішто не магло б прымусіць людзей *дзейнічаць* для ажыццяўлення жаданага будучага.

Агульным месцам з'яўляецца паняцце "амерыканская мара". У апошні час пра "рускую мару" шмат піша вядомы на постсавецкай прасторы пісьменнік і грамадскі дзеяч Аляксандр Праханаў. Так, ён адзначае: "Усе народы свету – летуценнікі. У кожнага народа ёсць свая мара. Яна дазваляла народу прайсці праз тысячагоддзі і не знікнуць. А народы, якія страцілі мару, зніклі. Часам мара афармлялася ў эпасе, выяўлена ў словах, у тых ці іншых словах" [4, с. 3].

Беларуская мара ў найбольшай ступені – як *нацыянальная ідэя* – выяўлена ў нацыянальным літаратурным шэдэўры, айчынным эпасе – паэме Якуба Коласа "Новая зямля". Прычым не толькі глыбінная ідэя – і стрыжнем *сюжэту* ў творы таксама з'яўляецца мара.

Жыццё і творчасць Якуба Коласа нельга разглядаць у адрыве ад яго эпохі. Якуб Колас сфарміраваны часам, асяроддзем, і сам стаў іх, часу, гісторыі, асяроддзя, яркім выразнікам. Час яго фарміравання як пісьменніка – пачатак XX ст. – цікавы і для нас, людзей XXI ст., таму што ў гістарычным працэсе і ў духоўным жыцці грамадства назіраецца не толькі лінейнасць, але і *цыклізм*: некаторыя тэндэнцыі сацыяльнага, палітычнага, мастацкага жыцця маюць схільнасць да паўтарэння. Так, філосафы заўважылі, што ў пачатку любога стагоддзя абвастраецца цікавасць людзей да пытанняў маральна-этычных і псіхалагічных, а ў канцы стагоддзя – да рэлігійна-філасофскіх і касмалагічных. Увогуле, тое, што было адкрыта ў пачатку каляндарнага веку, павінна быць *асэнсавана* ў яго канцы. Акрамя таго, у пачатку XX ст. чуйныя да токаў космасу і гісторыі людзі адчувалі катастрафічнасць, крызіснасць быцця. А сёння, у пачатку XXI ст., пра крызіс гавораць ужо ўсе. І справа не толькі ў фінансава-эканамічным крызісе, а ў крызісе самога прынцыпу жыцця, пабудаванага на несправядлівасці, рабаванні прыроды, міфах пра тое, што выжывае толькі моцны, хітры, жорсткі. Аднак відавочна, што грамадства, заснаванае на суцэльнай канкурэнцыі і гвалце над прыродай, нежыццяздольнае. Людзі мараць пра іншае.

У пачатку XX ст. народы таксама адчувалі, што капіталізм вычарпаў сябе, і прагнулі свабоды і справядлівасці. Безумоўна, і адрозненняў у гістарычных перыядах, раздзеленых стагоддзем, шмат: па-першае, у пачатку XX ст. людзі жылі ў традыцыйным грамадстве і ў сістэме хрысціянскіх каштоўнасцей, якія адкрывалі *прызначэнне* чалавека. Па-другое, за намі, людзьмі трэцяга тысячагоддзя, – трагічны вопыт цэлага стагоддзя, самага катастрафічнага, антыгуманнага ў гісторыі, – нягледзячы на ўсе прыгожыя лозунгі пра дэмакратыю і свабоду. Але тым больш варта зазірнуць у пачатак XX ст., разгледзець тэндэнцыі, што пачалі развівацца ў гады, калі ў літаратуру ўступіў будучы класік Якуб Колас.

У ацэнцы дзейнасці пісьменніка неабходна ўлічваць не толькі гістарычныя цыклы, але і іншыя фактары: унікальнасць Расійскай імперыі, у склад якой тады ўваходзіла Беларусь; адметнасць самой Беларусі з яе драматычным лёсам; нарэшце, уласны жыццёвы шлях чалавека на фоне гістарычных падзей.

XX ст. – новы і надзвычай важны этап у развіцці ўсёй айчыннай культуры. Народ доўга назапашваў цывілізацыйны, мастацкі вопыт, у тым ліку і ў форме фальклору, каб у XXI ст. перайсці на якасна новы этап свайго існавання. Асаб-

ліва плённым быў пачатак стагоддзя. У рускай літаратуры ён называўся Сярэбраным векам (Залаты век – у XIX ст.), а ў Беларусі – перыядам нацыянальнага адраджэння.

У гісторыі чалавецтва ўжо здараліся эпохі, калі амаль адначасова працавалі шмат якія найвыдатнейшыя дзеячы навукі і мастацтва. Філосафы гавораць пра нараджэнне талентаў *плеядамі*, што звязана, відаць, з пэўнымі касмічнымі (сонечнымі) цыкламі ці асаблівымі, яшчэ не пазнанымі, заканамернасцямі ў развіцці цывілізацыі. Напрыклад, плеяда геніяў вызначае ўзлёт грэчаскай антычнасці – у V ст. да н. э., калі былі створаны шэдэўры трагедыі і камедыі, архітэктуры і скульптуры. Або эпоха еўрапейскага Рэнесансу – у XIV–XVI стст., якая таму і называецца Адраджэннем, што адраджала мастацкія традыцыі Антычнасці. І хоць на тэрыторыі Беларусі не квітнела антычная культура (ва ўсялякім разе, сведчанняў пра гэта пакуль не знойдзена), але і ў нас літаратура XII–XIII стст. перажывала росквіт, таму было што адраджаць у XVI ст., калі наша краіна адчула на сабе ўплыў еўрапейскага Рэнэсансу. Прычым лепшыя сыны беларускага народа – Францыск Скарына і Мікола Гусоўскі – не толькі выхоўваліся на ўласнай культуры перыяду Старажытнай Русі, але былі знаёмы і з антычнай спадчынай, і з Бібліяй, і з сучаснай ім культурай Еўропы. Гэта і абумовіла велізарную ролю творчасці названых асоб не толькі ў свой час, але і некалькімі стагоддзямі пазней. Беларускае нацыянальнае адраджэнне пачатку XX ст. як бы аднаўляла, адраджала, працягвала іх традыцыі ў айчыннай культуры. І на аснове ўласных традыцый выбудоўвала сваю мару – *нацыянальную ідэю*.

У пачатку XX ст. у Беларусі ўжо выросла свая народная інтэлігенцыя, якая прагнула рэалізаваць уласныя творчыя магчымасці: імкнулася пісаць літаратурныя творы, ставіць тэатральныя пастаноўкі, маляваць. Але ў першыя гады XX ст. сцвярджаць сябе ў соцыуме таленавітыя людзі, асабліва пісьменнікі, не маглі, бо, як і ў XIX ст., існавала забарона друкаваць творы на беларускай мове. Аднак у 1905–1907 гг. у Расійскай імперыі адбыўся магутны сацыяльны катаклізм – першая руская рэвалюцыя. Гэта быў узрыў народнага гневу, болю, адчаю, выкліканы і паразай у руска-японскай вайне, і “крывавай нядзеляй” (правакацыяй пэўных радыкальных сіл), а галоўнае – беднасцю, галечай працоўных людзей, гвалтам над простым чалавекам з боку чыноўнікаў і багацеяў.

Спалоханы выбухам пратэсту, імператар Расіі Мікалай II у кастрычніку 1905 г. аб’явіў канстытуцыю, якая абвясціла шмат якія свабоды, у тым ліку і свабоду слова. Гэта адразу дало магутнейшы штуршок развіццю літаратуры на Беларусі. Прычым беларускія пісьменнікі, у тым ліку будучыя класікі (Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч, М. Гарэцкі), кіраваліся ў сваёй творчасці ідэямі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення, а іх творы, у сваю чаргу, уздымалі народ на барацьбу, выхоўвалі патрыятычныя пачуцці.

Паэма Якуба Коласа “Новая зямля” стваралася на пераломе эпох і стала адной з важнейшых вех у гісторыі беларускай літаратуры; яна аказала велізарны ўплыў на ўсю паслякастрычніцкую паэзію і прозу. Праўда, ацэнены твор па-сапраўднаму быў не ў 1920-я гг., а значна пазней.

Вядома, што першыя восем вершаваных апавяданняў Якуб Колас напісаў яшчэ да рэвалюцыі 1917 года, адбываючы пакаранне ў Мінскай турме, дзе ўспаміны дзяцінства аказаліся адзіным псіхалагічным паратункам.

Спачатку паэт занатоўваў найбольш яркія ўражанні маленства, якія трывала захоўваліся ў памяці, затым, мяркуючы па ўсім, у яго стала выспяваць задума маштабнага твора, прысвечанага найперш бацьку – лесніку на службе ў князёў Радзівілаў. Якуб Колас адчуваў свой сыноўні абавязак перад бацькам, які рана памёр. Асабістыя пачуцці любові і замілавання – па меры абдумвання твора – набывалі большую глыбіню, розныя нюансы. Пісьменнік зразумеў, што аповед пра прыватнае жыццё простай сям'і можа быць цікавы і для іншых людзей. Чытаючы любы літаратурны твор, чытач адчувае задавальненне, з аднаго боку, ад матэрыялу блізкага і знаёмага з яго ўласнага жыцця, а з другога боку, новага і незвычайнага, чаго яму асабіста зведаць не давялося. Гэта глыбока *фізіялагічны*, *псіхалагічны закон*: нейроны мозгу, каб нармальна функцыянаваць, павінны бачыць, распазнаваць ужо знаёмае, але ім неабходна і расці, злучацца з іншымі нейронамі, а для гэтага патрабуецца новая інфармацыя.

Сям'я самога Якуба Коласа – тыпова сялянская і жыла як тысячы, сотні тысяч сялянскіх сем'яў. Праўда, толькі адзінкі з сялян знаходзіліся на службе – ці ў дзяржаўных установах, ці ў прыватных уласнікаў, як Міхал Міцкевіч у Радзівілаў. Такое дваістае палажэнне ўжо рабіла лёс селяніна незвычайным, дадавала драматызму ў яго існаванне. Тым больш што бацька паэта быў яўна чалавек неардынарны. Зняволены ў засценку, пакараны за сваю мару аб справядлівасці (самую высакародную мару ў свеце), Якуб Колас прагнуў свабоды і таму лепш разумеў уласнага бацьку, які таксама жыў думкай пра волю, хоць і не знаходзіўся за кратамі. Воля для чалавека, які вымушаны служыць, каб карміць сям'ю, заключалася ва ўласнай маёмасці, у дадзеным выпадку – зямлі. Паэма задумвалася як твор пра свабоду, а свабоду бацькі паэта звязвалі з зямлёй, маючы, бясспрэчна, на гэта рацыю.

У савецкі час Канстанцін Міхайлавіч вярнуўся да сваёй задумы: у 1919–1923 гг. напісаў яшчэ дзевятнаццаць раздзелаў і перапрацаваў некаторыя з тых, што стварыў у турме. Твор выкрышталізаваўся, набыў цэласнасць і глыбіню.

Якуб Колас пісаў паэму, прайшоўшы праз імперыялістычную вайну, якая потым атрымала назву Першай сусветнай, перажыўшы Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі, а затым і Грамадзянскую вайну. Усе названыя падзеі парушылі звычайны, натуральны ход жыцця. Для нармальнага чалавека, які не назіраў збоку, па-філасофску асэнсоўваючы, гісторыю, а жыў, так бы мовіць, унутры сацыяльна-палітычных працэсаў, уласнае існаванне ўяўлялася хаосам, поўным бязладдзем і панаваннем дзікіх, неўтаймаваных, варожых асобе сіл. Праблемай стала ўсё – ежа, самыя звычайныя рэчы ўжытку, жыллё, праца. І хоць у цэлым панаваў гістарычны аптымізм і вера ў лепшае будучае, сталыя, разважлівыя людзі, да якіх, бясспрэчна, належаў Якуб Колас, усё больш адчувалі тугу па стабільнасці, нармальнасці, прытулку. А што можа быць больш нармальным, чым праца на зямлі, жыццё на ўлонні прыроды? "Новая зямля" народжана настальгіяй не толькі па ўласным маленстве, але найперш – па *ладу*, бо лад, у народным уяўленні, – гэта гарманічнае, зладжанае ўнутры прыроды і ўнутры соцыуму паўсядзённае жыццё.

Гарантам такога жыцця спрадвеку была зямля. Чалавек на ўласнай зямлі – як немаўля ва ўлонні маці. Нездарма Якуб Колас піша, што зямля «дасць моцы, дасць і сілы». Сюжэтам даволі вялікай па памеры паэмы з'яўляецца *мара* лесніка Міхала аб набыцці кавалка зямлі, сваёй, уласнай, каб яна стала мацярынскай для яго дзяцей, усіх нашчадкаў, а ў больш шырокім плане, як мы зразумелі сёння, – з'явілася гарантам незалежнасці і ўмовай выжывання этнасу.

Пішучы паэму ў разбураным, хаатычным свеце, Якуб Колас спадзяваўся на норму, парадак; даваў і прыклад, хоць вельмі добра разумеў шматлікія заганы жыцця ў былой Расійскай імперыі, залежнасць простага чалавека ад несправядлівых законаў, ад самаўладдзя чыноўнікаў, ад глупства, якое непазбежна праяўляецца ў складана арганізаваных сацыяльных сістэмах, урэшце, ад розных выпадковасцяў. Вось чаму паэма канчаецца трагічна: Міхал не паспеў купіць зямлю – памёр, мара не здзейснілася.

Мара, у адрозненне ад утопіі, якая заўсёды – выключна рацыянальны канструкт, – агорнута паэзіяй, рамантычным адчуваннем жыцця. “Міхал аказаўся таксама, як і Антось, паэтам, які ў мары пра сваю зямлю бачыў адзін-адзіны выхад са становішча. Душа герояў паэмы перапоўнена любоўю да зямлі…” [5, с. 212]. А толькі ў стане замілаванасці і любові і магчыма марыць.

У назве паэмы можна бачыць розныя сэнсы: і палажэнне, у якім знаходзілася на момант заканчэння твора радзіма аўтара ў параўнанні з яго ж уласнымі ўспамінамі, і мара герояў паэмы і самога паэта аб шчасці, і агульначалавечая туга па ідэалу.

Аляксандр Праханаў лічыць, што, у адрозненне ад амерыканскай мары, якая – “горад на ўзгорку”, руская мара – “храм на ўзгорку”. А беларуская, на нашу думку, – “дом на ўзгорку”, абмежаваная пэўная прастора (“родны кут”) – зямля як прытулак, як канцэнтрацыя народных спадзяванняў. Мы мяркуем, што паэма, чаго, можа, і сам аўтар не ўсведамляў, – *мара народа пра самога сябе,* у якой – і адчуванне ўласнага “ўмяшчальнага ландшафту” (Л. Гумілёў), і любоў-замілаванне да яго, і памяць пра спрадвечнае жыццё на *ўласнай* тэрыторыі, якая толькі і дапамагла захавацца беларусам як этнасу. Інакш кажучы, мы – не качэўнікі, мы тут жылі, можа, яшчэ ад неўраў. І таму зямля для народа – паняцце *сакральнае* нават у пазітывісцкіх, секулярных XIX і XX стагоддзях. І адпаведна яна сакральная для кожнага асобнага чалавека, кожнай сям’і. Сакральнасць у дадзеным выпадку – і канкрэтнасць, мара пра прытулак, і абагульненне адначасова. “Мы заключаем законы прасторы і часу ў саміх сабе… Свет шырокі, але ў нашых душах ён глыбокі, як мора. У душы прыхаваны законы, на якіх заснаваны сусвет. Разгадваючы яго незвычайныя таямніцы, мы аднаразова пазнаем нешта пра ўласную незвычайнасць і загадкавасць” [2, с. 226]. Для людзей характэрна міфалагічная свядомасць. Міфы не варта разумець залішне літаральна, сюжэтна – гэта заўсёды сімвалы, абагульненні, агорнутыя моцнымі эмоцыямі. І па вялікаму рахунку, Рай у марах літаральна ўсіх народаў свету – не пэўная далёкая прастора (дзе-небудзь у Месапатаміі), а сад душы. Эдэм унутры нас. Ён і ўвасабляецца ў марах пра жыццё хатняе, сямейнае.

Уся мастацкая тканіна паэмы накіравана на зберажэнне народных традыцый, у тым ліку спрадвечнай мары, а значыць, саду душы. Пры гэтым філасофская сутнасць мары – *захаванне народа* на яго роднай тэрыторыі і ў тым выглядзе, якое робіць яго непаўторным. “Сваёй паэмай Якуб Колас сцвярджае, што сялянскі свет можа стаць той асновай, на якой трэба будаваць новае грамадства. На жаль, голас песняра пачуты не быў” [3, с. 185]. Але ён не быў пачуты *тады*. Сёння шмат хто з беларусаў марыць пра ўласную зямлю, утульную сядзібу, лецішча, жыццё на ўлонні прыроды. Мары часам спраўджваюцца – назіраецца тэндэнцыя перасялення з гарадоў.

Значэнне паэмы ў тым, што яна паказвае жыццё ў яго асновах, абсалютнай норме, прычым паказвае цэласна, не вырываючы кавалкі з асобных сфер рэальнасці і тым больш не імітуючы іх. Так, як жылі героі паэмы, сялянства жыло

спрадвеку. Больш за тое, і сёння, каб існаваць, неабходна вярнуцца да зямлі, прыкласці да яе працу, а галоўнае, тую любоў, якую адчувалі да яе нашы продкі і якая – менавіта любоў! – дапамагала захавацца беларускай нацыі, бо любоў з усіх пачуццяў валодае асабліва моцнай энергетыкай, здольнай нават уплываць на сусвет. Безумоўна, у наш час на вялікіх палях буйных гаспадарак працуюць машыны. Навейшую тэхніку прыватныя асобы выкарыстоўваюць і на ўласных падворках, на лецішчах. І гэта добра. Але спецыфіка сельскай гаспадаркі такая, што асобная жывёла, нават асобная расліна патрабуюць карпатлівай увагі, індывідуальнага падыходу. І тады вяртаецца неабходнасць у выкарыстанні *тых жа* прыёмаў і нават *тых жа* інструментаў, што ўжывалі героі паэмы Якуба Коласа. “Вілы, граблі і мяцёлкі” і сёння ёсць на кожнай вясковай сядзібе, на лецішчах гараджан.

“Новая зямля” – паэма энцыклапедычная па адлюстраванні ўсіх бакоў вясковага існавання, прытым працяглая ў часе менавіта сваёй універсальнасцю. Для гараджан, якія вяртаюцца на зямлю, паэма раптам адкрывае незвычайны, новы для сучасных людзей эстэтычны свет, стылістыку жыцця. З вялікай мастацкай сілай тут знітаваны духоўны свет герояў, харство беларускай прыроды, багацце народных традыцый і мовы. Якуб Колас сцвярджае думку, што чалавек здольны зрабіцца асобай, знайсці гармонію ва ўласнай душы толькі ў *арганічным для сябе асяроддзі*. А з другога боку, адносіны да зямлі, пэўны сельскагаспадарчы вопыт з’яўляюцца неад’емнай часткай культуры народа і адначасова асновай яго жыццядзейнасці.

На пачатку трэцяга тысячагоддзя мысляры, шэраг вучоных, пісьменнікі ўсё часцей гавораць пра недастатковасць навукова падзеленага разумення свету, раз’яднання яго на часткі, заклікаюць да *з’яднання* структурных яго элементаў, спадзяюцца на ўсё большае набліжэнне адно да аднаго навукі і рэлігіі, нават гавораць пра іх сінтэз як верагоднае *асноўнае дасягненне* XXI стагоддзя. Аднак найбольш цэласную карціну свету ў яго шматлікіх сувязях дае *мастацтва* – такія геніяльныя творы, як “Новая зямля”. Зямля ў разуменні Якуба Коласа – садружнасць. Аўтар паказаў садружнасць элементаў прыроды на зямлі, але марыў, каб тое ж было ў соцыуме, а таксама паміж соцыумам і прыродай.

Паэма “Новая зямля” – твор пра мару героя, твор, у якім увасоблена мара геніяльнага мастака, твор і пра нацыянальную ідэю – мару, якая дазваляе захавацца нацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Воеводина, Л. Н.* Мифология и культура / Л. Н. Воеводина. – М. : Наука, 2002.
2. *Кэмпбелл, Дж.* Мифы, в которых нам жить : пер. с англ. / Дж. Кэмпбелл. – Киев : София, 2002.
3. *Навуменка, П. І.* Якуб Колас / П. І. Навуменка // Беларуская літаратура. XI–XX стст. / А. І. Бельскі [і інш.]. – Мінск, 1999.
4. *Проханов, А.* Что есть мечта? Разговор о смысле жизни / А. Проханов // Завтра. – 2018, сент. – № 36.
5. *Тычына, М.* Якуб Колас / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. Акад. навук Беларусі ; Ін-т літ. імя Янкі Купалы. – Мінск, 1999. – Т. 1.

УДК 811.161’374(045)

А. А. Шарейко (Минск)

КРАСНЫЙ ЦВЕТ КАК СИМВОЛ СОВЕТСКОГО ВРЕМЕНИ
(по материалам ассоциативных словарей русского, белорусского и украинского языков)

Языковое сознание носителей любого национального языка формируется с учетом множества экстралингвистических факторов, которые при корректном проведении научно обоснованных экспериментов позволяют выйти на подсо-

знательный уровень, где фиксируются культурные, социальные, конфессиональные и другие признаки, корректирующие национальную картину цветовой ассоциативности. С одной стороны, мы можем утверждать, что эта часть системы динамична, но, с другой стороны, она относительно устойчива, поскольку отражает языковое сознание этноса и соответствует сложившимся традициям и представлениям [4].

Наименования цвета в каждом языке отражают национально-культурную специфику, которая становится важным элементом для уяснения национальной картины мира определенной лингвокультурной общности. В предисловии к «Славянскому ассоциативному словарю» Н. Ф. Уфимцева, отмечая преимущества изучения ассоциативных реакций, утверждает, что эти материалы можно рассматривать как специфичный для данной культуры и языка «ассоциативный профиль» образов сознания. Они интегрируют умственные и чувственные знания, которыми обладает конкретный этнос [9, с. 5].

В каждом языке цветообозначения являются частью закрепленных стереотипов, входящих в ядро ассоциативного поля и ставших типичными для представителей данного народа. В цветовом ассоциативном поле ведущее место принадлежит цветовым признакам, связанным с природно-климатическими условиями, а также заключающих в себе переносно-символические обозначения.

Прилагательное *красный* происходит от древнего общеславянского корня со значением ‘красивый’, ‘прекрасный’. Оно использовалось для характеристики положительных качеств кого-либо или чего-либо. Красный является одним из основных геральдических цветов. На знаменах он символизирует бунт, революцию, борьбу, независимость, кровь. Издавна красный цвет считался цветом мудрости и власти. У древних иудеев он был царским цветом, в православии символизировал божественное проявление. В Древнем Риме цезари носили пурпурные тоги: *В белом плаще с кровавым подбоем, шаркающей кавалерийской походкой, ранним утром четырнадцатого числа весеннего месяца нисана в крытую колоннаду между двумя крыльями дворца Ирода Великого вышел прокуратор Иудеи Понтий Пилат...* (М. Булгаков. Мастер и Маргарита).

Также красный цвет – это один из основных цветов природных стихий. В своих исследованиях А. Вежбицкая говорит об этом так: «Следует заметить, что для “макро-красного” тоже были выделены две положительные точки референции: это огонь и солнце, но связь между этими двумя моделями отлична от той, которая имеется между небом и растительностью» [3, с. 276].

В каждый период существования государства имеется своя система символов, отражающая сложившуюся на данный момент времени культурно-историческую ситуацию. Распознавание символов культуры, ритуалов и категорий эпохи при помощи ассоциативных экспериментов позволяет получить верное представление об особенностях языкового сознания людей, проживающих на определенной территории.

Если мы обратимся к данным ассоциативных словарей, то заметим, что наиболее частой у носителей русского языка на стимул *красный* является реакция флаг [9; 10].

В «Русском ассоциативном словаре» (РАС) Ю. Н. Караулова и Г. А. Черкасовой данная реакция находится на первом месте – встречается 15 раз, в «Славянском ассоциативном словаре» (САС) – 69 (на втором месте). В издании

«Асацыятыўны слоўнік беларускай мовы» (1981) А. И. Титовой и САС наблюдается аналогичная ситуация со стимулом *чырвоны*, на который записана реакция сцяг – 361 и 265 соответственно:

Чырвоны сцяг на іх палае,
То – наша слава, наша свята,
Яго вітае плынь Дуная
І горы сінія Карпата (Якуб Колас. Над Прутам).

Частота реакции *прапор* в украинском языке на стимул *червоний* по данным «Словаря ассоциативных норм украинского языка» (САНУЯ) Н. П. Бутенко (1979) самая многочисленная (261), в САС также оказалась на первом месте (67): *Біля столу стримів* ***червоний прапор*** *і з серпом та молотом, тут же переминалися з ноги на ногу Птіцин, начальник гарнізону Штеренберг, командир батальйону Третьої московської бригади Козлодоєв, місцеве начальство* (В. Шкляр. Залишенець. Чорний ворон).

Можно говорить о том, что для советского человека, в котором всегда воспитывали любовь к Родине, флаг был символом патриотизма и величия Советского Союза: *Я любил тот* ***красный флаг****, под которым воевали с фашизмом не только Василий Теркин, но и Виктор Некрасов, и Лев Копелев, и Булат Окуджава* (Е. Евтушенко. Волчий паспорт).

Еще одной реакцией на стимул *красный*, обусловленной реалиями XX века, является ассоциация *галстук*. Почти все школьники СССР вступали в ряды Всесоюзной пионерской организации им. В. И. Ленина, давали клятву «горячо любить и беречь свою Родину, жить, как завещал великий Ленин, как учит Коммунистическая партия, всегда выполнять Законы пионеров Советского Союза», после которой на шею повязывался красный галстук: *Это был «Дом пионеров». Здесь мне впервые повязали красный галстук* (Ю. О. Домбровский. Хранитель древностей). В РАС реакция *галстук* отмечена 7 раз (4-е место), в САС – 3.

Белорусская аудитория, как следует из материалов словаря А. И. Титовой, на стимул *чырвоны* записала *гальштук* 98 раз. Эта реакция по частоте на втором месте: *Жвіроўскаму-бацьку чырвоны гальштук на худзенькай сынавай шыі непрыемна вока ўкалоў* (М. Зарэцкі. Двое Жвіроўскіх). В САС реакция *гальштук* оказывается только на 6-м месте и зафиксирована 10 раз. Такую разницу можно объяснить тем, что словарь А. И. Титовой увидел свет в 1981 году, а САС был издан уже в 2004 году, после распада СССР. Очевидно, новые реалии и распад Союза повлияли на результаты ассоциативных экспериментов.

Если мы обратим внимание на эту же реакцию *галстук* у носителей украинского языка, то отмечаем ее частоту (128) и второе место (по данным САНУЯ), тогда как в САС частота всего 6: *Ніколи ще я не шкодував так, як зараз, що на грудях у мене не палахкотить* ***червоний галстук*** (Л. Смілянський. Мій прапор Сашко).

Как отмечает В. Ф. Петренко, для того чтобы существовало социалистическое общество советского типа (эпохи развитого социализма), необходима особая форма «двоемыслия» (Дж. Оруэлл) или «кентаврического сознания» (М. Мамардашвили), при котором нормы поведения граждан определяются не декларируемыми и закрепленными в конституции правами, а некими негласными правилами, нарушение или даже попытка обсуждения которых карается «компетентными органами» – этой инквизицией XX века [7].

Октябрьская революция и последовавшие за ней изменения общественно-политического строя, а также события Второй мировой войны нашли отражение в ответах участников ассоциативного эксперимента. Так, на стимул *красный* записано *комиссар, командир, коммунист, Октябрь, революция, партизан, отряд, пролетарский, орден, СССР, знамя*: *Неподалёку на том же участке жил в маленькой дачке третий брат, Николай Алексеевич, тоже* ***красный партизан****, служивший во Внешторге, месяцами живший то в Японии, то в Китае* (Ю. Трифонов. Обмен). Ведь даже в названиях орденов и их колористике фигурировал красный цвет – Орден Красного Знамени, Орден Красной Звезды;

В мартеновском цеху завода «Красный Октябрь» в высоком полусумраке сновали люди в ватниках, гулко отдавались выстрелы, вспыхивало быстрое пламя, не то пыль, не то туман стояли в воздухе (В. Гроссман. Жизнь и судьба. Ч. 1).

Сын сапожника Рахленко из маленького города на Черниговщине – и вот, пожалуйста, такой герой, не какой-нибудь унтер-офицер, вроде Хаима Ягудина, а, можно сказать, красный генерал, в доме полно оружия, в конюшне стоят кони, каких не видел мир, и наш сосед, шорник Сташенок, готовит для них особенную сбрую (А. Рыбаков. Тяжелый песок).

Реакции носителей белорусского языка сходны: *камандзір, партызан, камунізм, армія, бальшавік, камуніст, кастрычнік, СССР, знамя.* Доказательства этому находим и в литературе:

Хацелі судзіць, але зжаліўся і заступіўся былы камандзір брыгады, нешта афармілі, нешта скруцілі (С. Грахоўскі. Мальвы);

Там ляжыць, сырой зямлёй зарыты,

Там схаваны красны партызан… (В. Супрунчук. Кошык дробнай бульбы);

Толькі тады, калі пасталелі, даведаліся, што нашай Бярозаўцы некалі хацелі даць больш прыгожую, на думку мясцовай улады, назву – Чырвоны Кастрычнік (В. Кадзетава. Тэст на першае каханне).

Украинскому языку такие реакции также присущи: *комуніст, комунізм, Ленін, батальйон, комуна, СРСР, партизан, революція*:

Наш великий учитель Ленін сказав: «Усякий комуніст повинен бути добрим чекістом, себто безмилосердним, жорстоким катом ворогів соціялізму, вміти їх карати, мучити, розстрілювати власними руками» (В. Винниченко. Нова заповідь);

Та я тоді став та вже людським голосом і піддав:

– Нехай живе комуна і свободи стяг. Т. 1–2 (О. Вишня. Зібрання творів в 4-х т.).

С 2004 по 2009 год А. В. Кудрина и Б. Г. Мещеряков провели ассоциативный эксперимент в России, Европе, США и других странах с использованием ресурсов электронной почты и социальных сетей (Одноклассники, Facebook) с применением 6 наименований цвета, включая *красный* [5]. Культурно-лингвистический фон слова-стимула *красный*, отражённый в ряде ассоциаций, был следующим: *красота, красивый, нечто лучшее; праздник, торжество; цвет коммунизма, СССР, революционной деятельности; символ опасности и запрета; цвет скорости; смерть, война; коррида, Испания; символ футбольных клубов*. Видим, что ассоциаций, связанных с советским периодом, достаточно и в более поздних экспериментах. Здесь будет уместно привести следующие слова А. Н. Леонтьева: «Значение представляет собой отражение действительности независимо от индивидуальных отношений к ней отдельного человека; человек находит уже готовую, исторически сложившуюся систему значений и овладе-

вает ею так же, как он овладевает орудием, этим материальным носителем значения» [6, с. 277]. Но также прослеживается и динамика в ассоциировании с течением времени: «Ассоциативные эксперименты по исследования цвето-обозначений, проведенные исследователями (А. А. Залевская, А. И. Белов, Е. И. Горошко и др., а также РАС) в разное время свидетельствуют об изменениях в сознании носителей русского языка, о динамике семантического наполнения ассоциативных полей. Так, в ассоциативном поле “Красный” ассоциаты *СССР, комиссар, галстук, революция, большевик, коммунист, Октябрь* и др. “уходят” на периферию сознания современных носителей русского языка. Об этом свидетельствуют их низкие частоты. Доминантами ассоциативного поля современных носителей русского языка становятся такие ассоциаты, как *кровь, любовь, страсть, огонь, красивый, солнце, агрессия* и др.» [1].

Таким образом, для носителей русского, белорусского и украинского языков, проживавших в составе одного государства и общественно-политической системы, *красный* стал тем символом, с которым отождествлял себя советский человек.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Алымова, Е. Н.* Ассоциативная лингвоцветовая картина мира [Электронный ресурс] / Е. Н. Алымова. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/assotsiativnaya-lingvotsvetovaya-kartina-mira-1/. – Дата доступа : 10.12.2020.
2. *Бутенко, Н. П.* Словарь ассоциативных норм украинского языка // Н. П. Бутенко. – Львов : Вищ. шк., Изд-во при Львов. ун-те, 1979. – 120 с.
3. *Вежбицкая, А.* Язык. Культура. Познание : пер. с англ. / А. Вежбицкая ; отв. ред. М. А. Кронгауз ; вступ. ст. Е. В. Падучевой. – М. : Рус. словари, 1996. – 416 с.
4. *Касаткина, Т. Ю.* Психолингвистические предпосылки изучения семантики цвета в разносистемных языках [Электронный ресурс] / Т. Ю. Касаткина. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/psiholingvisticheskie-predposylki-izucheniya-semantiki-tsveta-v-raznosistemnyh-yazykah/. – Дата доступа: 08.12.2020.
5. *Кудрина, А. В.* Семантика цвета в разных культурах [Электронный ресурс] / А. В. Кудрина, Б. Г. Мещеряков // Психол. журн. Междунар. ун-та природы, общества и человека «Дубна». – 2011. – № 1. – Режим доступа : http://www.psyanima.ru/. – Дата доступа : 07.12.2020.
6. *Леонтьев, А. Н.* Деятельность. Сознание. Личность / А. Н. Леонтьев. – М. : Политиздат, 1975. – 304 с.
7. *Петренко, В. Ф.* Образы, символы, представления в идеологической борьбе за ментальное пространство [Электронный ресурс] / В. Ф. Петренко. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/obrazy-simvoly-predstavleniya-v-eologicheskoy-borbe-za-mentalnoe-prostranstvo/. – Дата доступа : 08.12.2020.
8. *Цітова, А. І.* Асацыятыўны слоўнік беларускай мовы / А. І. Цітова. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1981. – 144 с.
9. Русский ассоциативный словарь : ок. 7000 стимулов / Ю. Н. Караулов [и др.] ; Рос. акад. наук. – М. : АСТ : Астрель, 2002 – Т. 1 : От стимула к реакции. – 781, [2] с.
10. Славянский ассоциативный словарь: русский, белорусский, болгарский, украинский / Н. В. Уфимцева [и др.]. – М., 2004. – 792 с.
11. Корпус текстів української мови [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.mova.info/corpus.aspx/. – Дата доступа : 01.12.2020.
12. Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://ruscorpora.ru/new/. – Дата доступа : 29.11.2020.
13. Беларускі N-корпус [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://bnkorpus.info/. – Дата доступа : 02.12.2020.

УДК 811.161.3’243(045)

В. У. Барысенка (Мінск)

НАЦЫЯНАЛЬНА АБУМОЎЛЕНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ПАДРУЧНІКА ПА АЎДЫЯВАННІ ДЛЯ КІТАЙСКІХ НАВУЧЭНЦАЎ

На працягу апошніх 30 гадоў Кітай праводзіць палітыку рэформаў і адкрытасці, у выніку чаго дадзеная краіна пачала займаць лідзіруючыя пазіцыі ў розных галінах сусветнай вытворчасці. Кітай надае вялікае значэнне адукацыі насельніцтва. Ва ўніверсітэтах працуюць замежныя спецыялісты па замежных мовах. Колькасць моў, якія выкладаюцца ва ўніверсітэтах, з’яўляецца адным з паказчыкаў прэстыжу ВНУ. Ёсць універсітэты замежных моў, у якіх студэнты навучаюцца на больш чым 100 моўных спецыяльнасцях. Вывучэнне англійскай і рускай мовы традыцыйна вельмі папулярна. Рускую мову выкладаюць у больш чым 120 ВНУ. Але колькасць моў навучання пастаянна пашыраецца (польская, чэшская, венгерская, румынская, украінская і беларуская). У кастрычніку 2017 года адбыўся чарговы з’езд Камуністычнай партыі Кітая, на якім была зацверджана стратэгічная праграма развіцця краіны «Адзін пояс – адзін шлях». Гэтая канцэпцыя вызначае сучасную замежную палітыку дзяржавы. «Новы шаўковы шлях» аб’ядноўвае краіны Цэнтральнай Азіі, Каўказа і Усходняй Еўропы. У сувязі з гэтым Беларусь разглядаецца як стратэгічны еўрапейскі партнёр, і таваразварот паміж краінамі пастаянна расце. Беларуска-кітайскія адносіны характарызуюцца высокай дынамікай развіцця і актыўнымі сувязямі на ўсіх узроўнях. Можна сказаць, што кантакты паміж дзвюма краінамі вызначаюцца роўнасцю і партнёрствам. У Кітаі ўжо ёсць помнікі класікам беларускай літаратуры – Янку Купалу і Якубу Коласу. Адзін за адным адкрываюцца цэнтры вывучэння Беларусі ў Кітаі, а кітайскія студэнты вучацца ў беларускіх ВНУ. 2019 год быў абвешчаны Годам адукацыі Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Зразумела, што кітайскія перакладчыкі-русісты працуюць у Беларусі, але для адэкватных міжнародных стасункаў патрэбныя менавіта беларусісты, якія ведаюць нацыянальную спецыфіку.

Вывучэнне любой замежнай мовы сёння немагчыма без сучаснага вучэбна-метадычнага комплексу. Такім чынам, велізарнай праблемай з’яўляецца адсутнасць навучальных дапаможнікаў, граматычных даведнікаў, навучальных аўдыё- і відэаматэрыялаў для студэнтаў універсітэтаў КНР, якія навучаюцца на спецыяльнасці «Беларуская мова» або асвойваюць беларускую мову ў якасці спецыялізацыі. Натуральна, што выкладанне беларускай мовы як замежнай (у далейшым – БМЗ) у Беларусі і за мяжой мае свае асаблівасці. У Беларусі ёсць адукацыйны (лінгвістычны, культурны, краязнаўчы) патэнцыял навакольнага асяроддзя. За межамі Беларусі, у Кітаі, усё гэта адсутнічае. Студэнты з’яўляюцца прадстаўнікамі асобнай этнічнай, моўнай і культурнай супольнасці. На першы план выходзяць нават не праблемы дыдактычнай тэорыі, а забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі і ўзаемадзеяння ў асяроддзі замежнай мовы. Такім чынам, ідзе размова пра нацыянальна арыентаваны вучэбна-метадычны комплекс. Вопыту стварэння падобнага выдання ні ў Беларусі, ні ў Кітаі пакуль няма.

Вучэбны дапаможнік па аўдыяванні павінен уяўляць сабой частку вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай мове для кітайскіх студэнтаў. Мэта выдання – навучанне разуменню беларускага маўлення на слых. Навучанне аудыяванню замежнікаў – адна са складаных і актуальных праблем у выкладанні замежных моў. Гэты аспект мае на ўвазе наяўнасць і развіццё спецыфічных псіхалагічных механізмаў: кароткачасовай памяці, накіраванасці ўвагі, імавернага прагназавання. У цяперашні час гэты від маўленчай дзейнасці вылучаецца як самастойны, бо асноўная задача выкладання замежнай мовы – выхад у камунікацыю. Без навыкаў успрымання мовы на слых камунікацыя ў натуральным асяроддзі будзе ўскладненай або немагчымай. Аўдыяванне – гэта таксама самастойны субтэст пры здачы сертыфікацыйнага тэсту любога ўзроўню. Разуменне вуснага маўлення ўяўляе сабой адну з перашкод, з якой сутыкаюцца кітайскія студэнты пры авалоданні беларускай мовай. Пры аўдыяванні фраза як адна з адзінак успрымання разумеецца не шляхам аналізу і наступнага сінтэзу складнікаў яе слоў, а ў выніку распазнання ўсіх інфарматыўных прыкмет. Сегментацыя сказа ажыццяўляецца дзякуючы інтанацыйнаму падзелу. Менавіта інтанацыя дазваляе раскрыць сэнс фразы, бо яна падзяляе фразу на семантычныя блокі. За інтанацыяй замацаваны такія моўныя функцыі, як камунікатыўная, сінтаксічная, лагічная, мадальная. А навучанне беларускай інтанацыі, асабліва пытальнай, уяўляе пэўную цяжкасць для кітайскіх студэнтаў.

Вучэбны дапаможнік па аўдыяванні павінен дапамагчы выпрацаваць у кітайскіх студэнтаў успрыманне слыхавых узораў беларускага маўлення: гукаў і гукаспалучэнняў, слоў і словазлучэнняў, узораў беларускай інтанацыі. Значыць, павінны быць распрацаваны практыкаванні, накіраваныя на развіццё фанематычнага слыху і памяці, на ўсталяванне сувязяў паміж гукавой і пісьмовай формамі маўлення. Развіццю граматычных і лексічных навыкаў спрыяюць заданні на распазнаванне суадносін гукавога ладу і семантыкі, на распазнаванне граматычных формаў сказа на марфалагічным і сінтаксічным узроўні. Студэнты спачатку засвойваюць маўленчыя ўзоры, а потым замацоўваюць навык пераносу вывучаных структур у сітуацыю жывой камунікацыі.

Навучальны дапаможнік уяўляе сабой вучэбна-метадычны комплекс: кніга для студэнта (з функцыямі працоўнага сшытка) і кніга для выкладчыка. Абедзве кнігі складаюцца з некалькіх раўназначных тэматычных модуляў, накіраваных на агульнае валоданне беларускай мовай у якасці сродку зносін. Тэматыка модуляў традыцыйная, напрыклад: «Знаёмства», «Сям’я», «Вучоба», «Вольны час», «Дом», «Здароўе», «Святы», «Горад. Падарожжа». Пры выбары тэматыкі модуляў улічваюцца патрабаванні да маўленчай кампетэнцыі студэнтаў базавага ўзроўню, а таксама нацыянальныя асаблівасці кітайскай аўдыторыі. Студэнты павінны навучыцца вырашаць пэўныя камунікатыўныя задачы: у адпаведнасці з нормамі беларускага маўленчага этыкету ўступаць у камунікацыю, арыентавацца і рэалізоўваць свае асноўныя камунікатыўныя намеры ў розных сітуацыях зносін, напрыклад, у адміністрацыйных установах, у краме, банку, рэстаране, на вуліцах горада, у транспарце, паліклініцы і г.д. Студэнты павінны ўмець ажыццяўляць маўленчыя зносіны ў вуснай і пісьмовай формах у рамках актуальных для дадзеных узроўняў валодання БМЗ тэм, напрыклад, біяграфія, сям’я, вучоба, праца, лад жыцця, вольны час, геаграфія, культура, гісторыя і г. д. Навучэнцы авалодваюць уменнем разумення інфармацыі на слых, якая змяшчаецца ў мана-

лагічных і дыялагічных выказваннях: тэмы, асноўнай ідэі, галоўнай і дадатковай інфармацыі кожнай сэнсавай часткі паведамлення з дастатковай паўнатой, глыбінёй і дакладнасцю. Паслятэкставыя заданні накіраваны на кантроль сфарміраванасці гэтых уменняў і навыкаў. Для студэнтаў узроўню А1 асноўная задача – разуменне інфармацыі, для А2 і В1 – разуменне галоўнай і дадатковай інфармацыі, В2 – разуменне мэтаў, матываў сацыяльных паводзін, характарыстык таго, хто гаворыць, яго адносін да прадмета гаворкі і суразмоўцы. Тэматыка тэкстаў актуальная для сацыяльна-бытавой і сацыяльна-культурнай сфер зносін. Тып тэкстаў – паведамленне, апавяданне, апісанне, а таксама тэксты змешанага тыпу з элементамі разважання. Тэксты аўтэнтычныя і адаптаваныя. Аўдыядатак павінен адказваць сучасным метадычным патрабаванням: кожны трэк ідзе асобна і паказаны пад вызначаным нумарам, гэта значыць яго лёгка знайсці, плюсам з'яўляецца і разнастайнасць галасоў дыктараў: жаночыя, мужчынскія і дзіцячыя. Увесь змест падручніка падпарадкаваны паказу функцыянавання беларускага маўлення на фоне сацыяльнага кантэксту, што спрыяе аналізу студэнтамі падабенства і адрознення паміж беларускай і кітайскай культурамі.

Падручнік дапамагае авалодаць навыкамі разумення беларускай мовы на слых. У ім павінна змяшчацца каштоўная фактычная культуралагічная, краіназнаўчая інфармацыя. Гэта своеасаблівы даведнік, дапаможнік для разумення і запамінання фактаў беларускай культуры. Форма дыялогаў робіць гэтыя факты лёгка засваяльнымі, цікавымі, зразумелымі, блізкімі навучэнцам. Як вядома, надзвычай важны бок засваення замежнай мовы – гэта ўменне рабіць практычныя высновы з набытых ведаў, развіваць уменні, неадкладна прыкладаць іх да жыцця: у нашым выпадку гэта пераход ад атрыманых моўных ведаў да практычных маўленчых (камунікатыўных) уменняў. Аўтарскія дыялогі і тэксты ахопліваюць шырокі спектр магчымых сітуацый знаходжання ў краіне, а лексіка-граматычнае напаўненне дапаможніка дазваляе навучэнцам самастойна выказаць свае маўленчыя намеры. Асаблівасць дапаможніка – яго лінгвакультурная і лінгвакраязнаўчая напоўненасць. Навучальны дапаможнік змяшчае інфармацыю пра рэаліі беларускага жыцця, гісторыю, геаграфію, гарады, вядомых беларускіх дзеячаў палітыкі, спорту і культуры. Таксама прадстаўлена беларуская безэквівалентная лексіка: назвы беларускіх нацыянальныя страў, тапонімы, гідронімы і г. д.

Адной з вядучых сучасных тэндэнцый выкладання замежнай мовы з'яўляецца нацыянальна арыентаваная скіраванасць навучання. Асаблівасць дадзенага падыходу заключаецца ў тым, што ён патрабуе адаптацыі сучасных метадаў і тэхналогій навучання да нацыянальных традыцый адукацыі канкрэтнай краіны і канкрэтнага кантынгента навучэнцаў. Нацыянальна арыентаваны падыход вызначае стратэгію і метады навучання, ён дазваляе вырашаць не толькі агульныя, але і прыватныя пытанні выкладання, звязаныя з распрацоўкай пэўных тэм і іх падачай той ці іншай нацыянальнай аўдыторыі. Пры падборы і арганізацыі навучальнага матэрыялу навучальнага дапаможніка па аўдыяванні для кітайскіх ВНУ неабходна ўлічваць не толькі асаблівасці кітайскай мовы ў параўнанні з беларускай, але і спецыфіку кітайскай ментальнасці, кітайскіх нацыянальных традыцый. З метадычнага пункту гледжання супастаўляльны аналіз рознасістэмных моў адыгрывае важную ролю ў навучальным працэсе. Улік гэтага прын-

цыпу прадугледжвае фарміраванне ўменняў аналізаваць паралельныя структуры роднай (кітайскай) і беларускай мовы, прыцягненне асацыяцый з роднай і беларускай мовы, параўнанне семантычных нюансаў, пошук лексічных эквівалентаў, параўнанне культурных феноменаў і канцэптаў. Усё гэта спрашчае і адначасова матывуе вывучэнне беларускай мовы, а таксама можа прадставіць студэнтам родную кітайскую мову ў нечаканым для іх ракурсе. Гэта, безумоўна, станоўча ўплывае на фарміраванне агульнай лінгвістычнай кампетэнцыі студэнта-лінгвіста.

Адсутнасць беларускага моўнага асяроддзя, навучанне кітайскіх студэнтаў замежнай мове зусім іншай сістэмы накладвае дадатковыя «абавязацельствы» на навучальны дапаможнік. Зыходзячы з гэтага, неабходна выкарыстоўваць нароўні з беларускай кітайскую мову. Шырока вядомыя станоўчыя прыклады падобных дзвюхмоўных дапаможнікаў. Часта шматлікія аўтарскія падручнікі па замежнай мове забяспечваюцца каментарамі на роднай мове навучэнцаў. Заданні да практыкаванняў перакладаюцца на кітайскую мову для таго, каб студэнты хутка маглі прыступіць непасрэдна да іх выканання. На кітайскай мове падаюцца прыказкі і прымаўкі, адпаведныя па сэнсе беларускім парэміям. Усё гэта, нават на зрокавым, графічным узроўні, падкрэслівае нацыянальную арыентаванасць навучальнага дапаможніка і забяспечвае міжкультурную камунікацыю. Прынцыпу нагляднасці адпавядае ілюстрацыйны матэрыял падручніка (фатаграфіі славутасцяў і вядомых людзей Беларусі, страў нацыянальнай кухні, арнаменту і інш.).

Акрамя аўдыяматэрыялаў, дапаможнік неабходна забяспечыць і відэададаткам. Матэрыялам для навучання аўдыяванню могуць стаць урыўкі з аўтэнтычных блокаў навін, мультфільмаў, рэкламных ролікаў, відэакліпаў. Прагляд рэкламных ролікаў – адзін з мадэрнізаваных падыходаў да навучання аўдыяванню. Рэкламныя ролікі – індустрыя, якая матывуе людзей да набыцця таго ці іншага тавару. Цікава, што пры стварэнні таго ці іншага рэкламнага роліка абавязкова ўлічваецца нацыянальны аспект. Прагляд навін не толькі павялічвае цікавасць да лінгвакраязнаўчага зместу, але і матывуе студэнтаў да самастойнага прагляду гэтага віду перадач. Эфектыўна выкарыстоўваць яшчэ адзін сучасны рэсурс для аўдыявання – музычны відэакліп. Прагляд відэакліпаў стаў моднай тэндэнцыяй у жыцці студэнта, абмеркаванне відэакліпаў – гэта цікавы і займальны працэс узаемаабмену, гаворка не толькі пра авалоданне беларускай мовай, але і лад мыслення слухачоў, разуменне іх музычных пераваг, маральных установак, успрыманне жыцця. Песня сама па сабе – унікальны матэрыял, бо ўздзейнічае на эмацыйнае ўспрыманне, мае лінгвакраязнаўчы падтэкст, здымае фанетычныя, лексічныя цяжкасці, служыць самастойным матэрыялам для чытання, а затым для выканання. Пасля прагляду відэаматэрыялу выхад у камунікацыю аказваецца больш плённым, студэнтам прапануюцца пытанні, звязаныя не толькі з сюжэтам і ўспрыманнем лексікі, але і больш шырокія, дыскусійныя.

Суправаджэнне дапаможніка аўдыё і відэазапісамі пашырае магчымасці яго выкарыстання таксама і па-за беларускім моўным асяроддзем, без выкладчыка – носьбіта беларускай мовы – на ўсіх этапах навучання: ад засваення беларускіх гукаў, рытмікі і інтанацыі да асэнсаванага ўспрымання дыялагічнага і маналагічнага выказвання. Падручнік, насычаны рознымі навучальнымі матэрыяламі, студэнты могуць выкарыстоўваць і самастойна. Дапаможнік можа быць выкарыстаны як для звычайнай аўдыторнай, так і для пазааўдыторнай працы.

УДК 378.147:811.161.3(045)

Г. М. Валочка, В. У. Зелянко (Мінск)

КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЯК РОДНАЙ І ЗАМЕЖНАЙ

Ідэя навучання мове ў кантэксце культуры грунтуецца на кумулятыўнай функцыі мовы і прадугледжвае, з аднаго боку, “уваходжанне” ў культуру ў працэсе навучання мове і, з другога боку, авалоданне мовай на аснове спасцiжэння культуры. У наш час гэта ідэя актуалізавалася ў сувязі з развіццём лінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, псіхалінгвістыкі, этналінгвістыкі, сацыялінгвістыкі і неабходнасцю адлюстравання іх дасягненняў у працэсе навучання як роднай, так і замежнай мовам.

Беларуская мова ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі выступае не толькі як прадмет вывучэння, але і як сродак навучання іншым вучэбным прадметам (ва ўстановах з беларускай мовай навучання), а таксама, як адзначаецца ў праекце Канцэпцыі вучэбнага прадмета “Беларуская мова” [4], з’яўляецца найважнейшым сродкам выхавання асобы, паколькі спрыяе ўзбагачэнню духоўнага свету вучняў, далучэнню іх да каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, выступае культурна-гістарычным асяроддзем, што фарміруе адукаванага, высокамаральнага чалавека, які паважае іншыя мовы і народы – носьбіты гэтых моў. Навучанне мове садзейнічае засваенню ведаў, норм і каштоўнасцей, якія рэгулююць узаемадзеянне асобы і соцыуму, і, як вынік, стварае ўмовы для сацыялізацыі вучняў, іх актыўнага ўключэння ў розныя сферы дзейнасці сучаснага грамадства (адукацыйную, культурную, эканамічную, палітычную і інш.).

Рэалізацыя культуралагічнага аспекту ў навучанні беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі звязана з двума напрамкамі – *лінгвакультуралагічным* (усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, развіццё здольнасці адэкватна ўжываць іх у маўленні, авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры) і *сацыякультурным* (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў, традыцый, звычаяў, якія рэгулююць узаемадзеянне і паводзіны людзей у грамадстве) [Там жа, с. 54].

Сучаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па беларускай мове накіравана не толькі на фарміраванне моўных, маўленчых і камунікатыўных ведаў, уменняў і навыкаў вучняў, але і на выпрацоўку каштоўнасна-сэнсавых установак асобы, здольнасці прымаць рашэнні ў розных жыццёвых сітуацыях, самастойна асвойваць любую галіну ведаў. Таму сярод агульнаметадычных прынцыпаў адбору зместу навучання асобае месца займаюць *прынцып навучання мове як феномену культуры* (грунтуецца на выкарыстанні ў якасці дыдактычнага матэрыялу нацыянальна маркіраваных моўных адзінак, якія перадаюць адметнасць беларускай моўнай карціны свету, а таксама культуразнаўчых тэкстаў, што знаёмяць вучняў з гісторыяй і культурай Беларусі: нацыянальнымі каштоўнасцямі, звычаямі і традыцыямі, рысамі нацыянальнага характару, выдатнымі дзеячамі мастацтва, навукі, гісторыі) і *прынцып культурна-моўнага дыялогу* (вызначае два напрамкі навучання беларускай мове ў дыялогу культур: 1) дыялог на моўным узроўні, звязаны з выяўленнем адметнага і агульнага

ў беларускай, рускай і іншых мовах; 2) дыялог на культуралагічным узроўні, заснаваны на спасціжэнні вучнямі каштоўнасцей іншых культур пры навучанні беларускай мове).

Дыдактычны матэрыял у сучасных вучэбных дапаможніках па беларускай мове (5–11 класы) скіроўвае на развіццё лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый вучняў шляхам выкарыстання:

– фразеалагізмаў (напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Правапіс *і, ы, й* пасля прыставак”: *вы(?)сці сухім з вады, дух за(?)маць, ады(?)сці ў нябыт, пры(?)сці ў галаву, абы(?)сці бокам, раз(?)грываць камедыю, пера(?)сці дарогу* – вучні запісваюць фразеалагізмы, устаўляючы, дзе трэба, літары *і*, *ы*, *й*, тлумачаць сэнс фразеалагізмаў);

– прыказак і прымавак (тэма “Прызначэнне літар *е, ё, ю, я, і”*: *Той патрыёт, хто змагаецца за народ. Бацькоў любі, старых паважай, здароўе беражы, Айчыне верна служы* – вучні вызначаюць, якія гукі абазначаны літарамі *е, ё, ю, я, і*, раскрываюць павучальны сэнс прыказак);

– загадак (тэма “Правапіс *не* (*ня*) з дзеепрыметнікамі”: (*Н..) шыта, (н..) кроена, а ўся ў рубцах. На (н..) змераным полі жывёла (н..) злічоная, а пастух рагаты* – вучні запісваюць загадкі, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары);

– устойлівых параўнанняў (тэма “Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га і 2-га скланенняў (у родным і месным склонах адзіночнага ліку)”: *пішчыць як парася ў (плот), засеў як костка ў (глотка), людзей як на (кірмаш), разгуляўся як цяля на (вяроўка)* – вучні ўжываюць назоўнікі, што ў дужках, у патрэбнай склонавай форме);

– афарызмаў (тэма “Беларуская мова як адлюстраванне нацыянальнага бачання свету”: *У нас сваіх хапае слоў, / Крамяных, росных, васільковых, / Ад мурагоў і ад лясоў, / Ад светлых высяў жаўруковых* (Ю. Свірка) – выкарыстоўваючы канкрэтныя моўныя факты, вучні пацвярджаюць думку, выказаную Юрасём Свіркам);

– культуразнаўчых тэкстаў, у якіх паведамляецца пра святы, звычаі і традыцыі, духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці, сімвалы нацыянальнай культуры, рысы нацыянальнага характару, выдатных дзеячаў навукі, мастацтва, тлумачыцца паходжанне і семантыка нацыянальна маркіраваных моўных адзінак, раскрываецца нацыянальная спецыфіка вербальных паводзін і інш.

Змешчаны ў вучэбных дапаможніках дыдактычны матэрыял культуразнаўчага характару накіраваны на ўзбагачэнне слоўніка вучняў нацыянальна маркіраванымі моўнымі адзінкамі (гаваркімі словамі, уласнымі назвамі, устойлівымі параўнаннямі, фразеалагізмамі, прыказкамі і інш.), фарміраванне ўменняў тлумачыць іх сэнс і паходжанне, адэкватна ўжываць у маўленні, развіццё здольнасці здабываць з тэкстаў культуразнаўчую інфармацыю, карыстацца лінгвістычнымі і энцыклапедычнымі слоўнікамі і даведнікамі, ствараць уласныя выказванні на прапанаваную тэму і інш.

Спасціжэнне вучнямі каштоўнасцей і рэалій нацыянальнай культуры, фарміраванне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін адбываецца праз разнастайныя віды заданняў, звязаных з вывучэннем:

– сімвалаў нацыянальнай культуры (напрыклад, раскрыццё сімвалічнага сэнсу паняццяў з прасторы культуры);

– афарыстычных выказванняў стваральнікаў нацыянальнай культуры (напрыклад, тлумачэнне сэнсу крылатых выразаў, афарызмаў);

– беларускай безэквівалентнай (у адносінах да рускай мовы) лексікі (напрыклад, утварэнне безэквівалентных слоў пэўнай словаўтваральнай мадэлі па ўзоры);

– іншамоўных лексем (напрыклад, тлумачэнне семантыкі іншамоўных слоў на аснове інфармацыі пра іх паходжанне);

– норм маўленчых паводзін (напрыклад, падбор беларускіх адпаведнікаў да рускамоўных этыкетных формул) і інш.

Культуралагічны аспект праходзіць чырвонай лініяй і праз увесь працэс навучання беларускай мове як замежнай, бо ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі аптымальнай прызнаецца толькі такая мадэль навучання мове, якая арыентуе на фарміраванне так званай міжкультурнай кампетэнцыі, пад якой разумеецца «здольнасць чалавека існаваць у полікультурным грамадстве, дасягаць паспяховага разумення прадстаўнікоў іншых культур і прадстаўнікоў сваёй культуры» [1, с. 134].

Як і ў навучанні беларускай мове як роднай ва ўстановах адукацыі Беларусі, культуралагічны аспект у навучанні замежных студэнтаў прадугледжвае вывучэнне фразеалагізмаў, прыказак і прымавак, загадак, устойлівых параўнанняў, афарызмаў, культуразнаўчых тэкстаў, а таксама формул маўленчага этыкету.

Так, ужо на першапачатковым этапе мэтазгодна выкарыстоўваць у працэсе навучання лічылкі, чыстагаворкі і хуткагаворкі, прыказкі і прымаўкі, загадкі, невялікія вершы, казкі. Чытанне і асэнсаванне гэтых невялікіх па аб’ёме дыдактычных адзінак ва ўводным курсе беларускай мовы дазваляе папоўніць слоўнікавы запас студэнтаў новымі лексемамі, асэнсаваць і засвоіць рытміка-меладычныя асаблівасці беларускай мовы, а таксама пазнаёміць іх з вопытам і мудрасцю беларускага народа, заключаным у гэтых фальклорных жанрах малой формы.

Пастаяннае выкарыстанне такіх дыдактычных адзінак у адукацыйным працэсе дазваляе прадэманстраваць ужыванне гукаў у розных пазіцыях у слове, а завучванне на памяць прыказак і прымавак, загадак, невялікіх вершаў спрыяе правільнаму гукаўтварэнню і гукавымаўленню. Як справядліва зазначае Ван Гохун, такая работа “дазваляе пераадолець інтэрферэнцыю, якая абавязкова існуе пры накладванні вывучаемай мовы на родную. Па-другое, фарміруецца пэўная лінгвакультуралагічная кампетэнцыя, прысваенне культурных характарыстык другой мовы, моўнай карціны свету другога народа. Па-трэцяе, больш эфектыўна вырашаюцца задачы пераадольвання моўных цяжкасцей” [2, с. 27].

Важным элементам любой нацыянальнай культуры з’яўляецца маўленчы этыкет. У мове, маўленчых паводзінах, устойлівых этыкетных формулах адлюстроўваецца багаты народны вопыт, непаўторнасць звычаяў, ладу жыцця, умоў побыту кожнага народа. Ужо з першых заняткаў замежныя студэнты знаёмяцца з формуламі беларускага маўленчага этыкету: формамі ***вітання*** (*Прывітанне! Добры дзень! / Дзень добры! Добры вечар! / Вечар добры!*), ***развітання*** (*Бывай(-це)! Бывайце здаровы! Усяго добрага (найлепшага)!* і інш.), ***падзякі*** (*Дзякую. Шчыра дзякую. Дзякуй!* і інш.), ***прабачэння*** (*Даруйце. Прабачце. Прашу прабачэння*). Засваенню падлягаюць і этыкетныя формулы, якімі абменьваюцца пры сустрэчы (*Як маешся? Як маецеся? Як жывеш? Што новага?* і інш.), і адказы на іх (*Дзякуй, добра. А як ты (Вы)?* і інш.), формулы маўленчага этыкету за сталом (*Смачна есці! – Узаемна*) і інш.

Праца з дыдактычным матэрыялам па беларускім маўленчым этыкеце, вывучэнне асноўных этыкетных норм, якія знайшлі адбітак ва ўсіх сферах нацыянальнай культуры і асабліва ў мове (этыкетныя формулы і клішэ, жэсты і міміка, інтанацыя), дазваляе студэнтам засвоіць лінгвакультурныя адрозненні паміж беларускай і роднай мовамі і ўключыцца ў працэс міжкультурных зносін, захоўваючы выпрацаваныя грамадствам нацыянальна спецыфічныя і гістарычна зменлівыя правілы маўленчых паводзін.

Вялікім адукацыйным і выхаваўчым патэнцыялам валодаюць культуразнаўчыя тэксты (мастацкія, публіцыстычныя, навуковыя). Выкарыстанне на занятках *уласна культуразнаўчых тэкстаў* (паведамляюць пра культурныя рэаліі: святы, звычаі і традыцыі, духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці, помнікі культуры, гістарычныя і культурныя падзеі, спецыфічныя рысы нацыянальнага характару, выдатных дзеячаў мастацтва, навукі і пад.) і *лінгвакультуразнаўчых тэкстаў* (раскрываюць факты мовы праз прызму культуры: характарызуюць адметнасці мовы як кампанента нацыянальнай культуры; тлумачаць паходжанне і семантыку нацыянальна маркіраваных моўных адзінак; паведамляюць пра нацыянальную спецыфіку вербальных паводзін і пад.) дазваляе пазнаёміць замежных навучэнцаў з фактамі духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа: традыцыямі, мараллю, побытам, жыццёвай філасофіяй, каштоўнасцямі і інш.

Разам з тым культуралагічны аспект у навучанні беларускай мове як роднай і замежнай мае прынцыповыя адрозненні. Калі ў методыцы выкладання моў як замежных культуралагічны аспект дазваляе навучэнцам больш паўнавартасна ажыццяўляць міжкультурную камунікацыю, у методыцы навучання беларускай мове як роднай яго галоўная мэта – фарміраванне “моўнай асобы носьбіта мовы ў кантэксце яго роднай культуры” [3, с. 27].

Такім чынам, культуралагічны аспект у працэсе навучання беларускай мове як роднай і замежнай спрыяе фарміраванню ў навучэнцаў каштоўнасных арыентацый, маральна-этычных і культурных норм, навыкаў маўленчых зносін у кантэксце дыялогу культур. Фарміраванне ў працэсе навучання беларускай мове як роднай не толькі сістэмы тэарэтычных ведаў і ўменняў, але і якасцей асобы дае магчымасць рэалізаваць выхаваўчы патэнцыял вучэбнага прадмета і садзейнічае павышэнню сацыяльнай актыўнасці, вучэбнай матывацыі навучэнцаў і паляпшэнню якасці адукацыі ў цэлым. Асэнсаванне замежнымі навучэнцамі нацыянальнай спецыфікі беларускай культуры і мовы як неад’емнага складніка гэтай культуры (у параўнанні з роднай культурай) дазваляе ім уключыцца ў працэс міжкультурных зносін, наладжваючы свае маўленчыя і немаўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з гэтай спецыфікай, і ў цэлым садзейнічае фарміраванню полікультурнай шматмоўнай асобы, што з’яўляецца стратэгічнай мэтай навучання любой замежнай мове.

ЛІТАРАТУРА

1. *Азимов, Э. Г.* Новый словарь методических терминов и понятий (теория и практика обучения языкам) / Э. Г. Азимов, А. Н. Щукин. – М. : ИКАР, 2009. – 448 с.

2. *Гохун, Ван.* О некоторых особенностях системы обучения китайских студентов русскому языку как иностранному / Ван Гохун // Педагогическое образование в России. – 2016. – № 12. – С. 24–28.

3. *Дейкина, А. Д.* Роль лингвокультурологического подхода в методике преподавания русского языка как родного, как иностранного и как неродного / А. Д. Дейкина, О. Н. Левушкина // Вестн. РУДН. Сер. Вопросы образования : языки и специальность. – 2012. – № 4. – С. 23–28.

4. Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Беларуская мова” (5–11 класы) (праект) / Г. М. Валочка [і інш.]. // Роднае слова. – 2016. – № 1. – С. 53–60.

УДК 37.035

Т. Г. Гуцева (Минск)

АКТУАЛЬНОСТЬ ГУМАНИТАРНЫХ ЗНАНИЙ В ПОДГОТОВКЕ СОВРЕМЕННОГО СПЕЦИАЛИСТА

В конце XX в. появился и начал переходить в плоскость практической политики принцип «человеческого измерения» всех процессов, идущих в обществах и мире в целом. XXI в. вносит в ценностное соотношение наук нечто принципиально новое – небывалую во всей истории культуры роль и оценку человекознания. От самосознания человека будет зависеть сохранение функциональной связи человека и мира. Мы подошли к такому периоду, когда прогресс цивилизации будет определяться исключительно интеллектуально-образовательной и нравственной мощью человека.

Одной из серьезных проблем является информативный крен, в то время когда основной упор следует делать на улучшение качества мышления, то есть на развитие гибкости ума, рефлексивности, открытости новому, на умение работать творчески. Универсализация образования таит в себе угрозу размывания культурной идентичности. Современное образование должно способствовать формированию мировоззренческой устойчивости личности и общества на основе гуманизма и толерантности. Научно-технический прогресс подарил власть над природой. Но глобальная беда – уход в узкую специализацию, вымывание из общественного сознания гуманитарных ценностей. Обществу нужны специалисты, имеющие представления об элементарных нормах нравственности. Современные цивилизационные ритмы общественного и мирового развития стремительно формируют все новые и новые проблемы и вызовы, требующие едва ли не мгновенного решения. В новых условиях обострилась необходимость отойти от строгого академизма и максимально усилить практический аспект в преподавании гуманитарного знания, знания не как самоцели, а знания как инструмента для ориентации в жизни и работе современного специалиста.

Большинство возможных рисков связано с ошибочными знаниями и неверными решениями людей. Научные знания и технологические достижения дали человеку невиданное могущество. Но могущество ослепило человека и не дало ему осознать необходимость самоограничения. Отсюда самомнение разума, безудержный рационализм, разложение целостного облика человека, возникшего в предшествующие религиозные эпохи, и в итоге явление крайней индивидуализации, породившее явную беспомощность в установлении смыслов своего бытия. Глобальный кризис обретает антропологическую природу, а его истоки надо искать на антропологическом уровне, в процессах, происходящих с человеком. Это обусловливает актуальность гуманитарного знания.

Наблюдается явная деградация человеческого духа и духовности как таковой в результате засилья массовой культуры. Но подлинная опасность и далеко идущие последствия этого духовного кризиса пока не осознаются. Продолжает господствовать инерция мышления, рассчитывающего на то, что наука, техника и социальная организация, как и прежде, «вытащат» человечество из глобального кризиса. Этот факт свидетельствует о том, что человечество не готово даже к ограничению одностороннего техногенного развития. Неограниченная экспансия техники влечет за собой исчезновение естественной среды, в которой только

и возможно выживание человека. Внешние мирские блага полностью подчинили себе человека, став его мировоззренческой предпосылкой формирования современного «общества потребления».

Современная жизнедеятельность человечества может повлечь за собой глобальную экологическую катастрофу уже в середине XXI в. Речь идет о новом понимании взаимоотношений человека и природы, возможностей различных цивилизаций, которые могут вступить друг с другом в борьбу на уничтожение. Человечество недооценило все социальные, психологические, культурные и другие негативные воздействия информационных революций.

Стремление к узкой профессионализации высшего образования выражает уже давно проявившую себя в Западной Европе и США тенденцию к превращению большей части населения в «одномерных людей», в «людей толпы, массы», сознанием которых легко манипулировать. Сейчас техника промывания мозгов, пропаганда, реклама, средства массовой информации способны полностью подчинить сознание человека, внушить ему любые цели и ценности, возбудить любые чувства и отношения к вещам и явлениям, сформировать его вкусы, предпочтения. Такого тотального контроля над человеком еще не знала история человечества. Ослабление гуманитарного блока в вузовском образовании будет означать еще один важный шаг на пути к полному духовному порабощению. Будущее формируют люди, мыслящие, живущие и работающие здесь и сейчас. Эффективной может оказаться только такая образовательная система, которая строится на паритете естественнонаучной и гуманитарной составляющей, причем обе играют системообразующую роль.

В последнее время зреет понимание, что у экономики есть свое гуманитарное измерение и что определяющим во многом является не столько решение проблем в экономической сфере, научно-техническом развитии, сколько в идеологии, политике, общественном сознании и порядке, культуре, нравственности. Исторический опыт убедительно показал, что человек, его культура, знания, умение, здоровье, нравственно-духовное состояние имеют ключевое значение для экономики.

Экспансия глобальных проблем рождает особый характер духовных угроз, способных причинить непоправимый урон человеческой цивилизации. Гуманитарное знание, существенной частью которого является культурологическое, – это знание в контексте смысложизненной ориентации студента, учитывающего опыт мотивации и стратегии коммуникации, учет социокультурной обусловленности субъекта познания и его включенность в предметно-практическую деятельность.

Известный ученый Н. Н. Моисеев, развивая теорию цивилизаций, показал, что современный кризис цивилизации в целом является самым серьезным из всех, из которого необходимо найти пути выхода. Этот выход предполагает глубокую мировоззренческую революцию, радикальную смену ориентиров развития. Объективные условия современного цивилизационного развития требуют переориентации общества на профессионализм. Во всех сферах трудовой деятельности ведущим становится человеческий фактор, растет заинтересованность общества в работниках не только с высокими профессиональными навыками, но и с аналитическими, творческими способностями, устойчивой мировоззренческой базой и гуманистическими ценностными ориентирами. Ценностные ориентации определяют содержание направленности личности, составляют ядро ее жизненной концепции и отражают отношение человека к себе, окружающему миру

и другим людям. Ценностная ориентация личности в процессе профессионализиции – это взаимная ответственность друг перед другом, это верность долгу, это терпимость, порядочность, нацеленность на сотрудничество. Нужна новая система ценностей – гуманистическая и новая цивилизация, в основание которой был бы положен принцип приоритета человека. Эта мысль была высказана еще в 1955 году в Манифесте Рассела-Эйнштейна, где говорилось о том, что все мы плывем в одной лодке. Будущее человека в первую очередь зависит от уровня его нравственного развития. Становление профессионала зависит от его мировоззрения, ценностей, оценочной деятельности. Истинный профессионализм предполагает глубокое усвоение и осознание требований профессиональной морали. Чем сложнее становится мир, тем большее значение приобретают те базовые ценности, которые могут объединить человечество. Проблема целей и приоритетов дальнейшего развития выходит на первый план. В результате всего содеянного современный мир столкнулся с проблемами выживания человечества, которое будет вынуждено идти по пути повышения культуры, роста образования, научного развития, укрепления здоровья, по пути утверждения качества во всех формах и видах человеческой деятельности. Главный вывод, вытекающий из накопленного человечеством опыта, – невозможность дальнейшего развития общества без гуманизации человеческой личности. Сложившееся положение в обществе все стремительнее подводит нас к осознанию того, что в основе развития находится сам человек. Перемены возможны, если в центре исторических процессов «разместить человека, увидеть в нем не только рабочую силу, средство (фактор), «винтик», но, прежде всего, цель, результат, смысл существования общества. Общество программирует свое будущее через систему образования. Гуманитарные знания задают ту систему координат, в которой предстоит формировать себя вступающим в жизнь поколениям.

УДК 378.147:811.161.3

Т. П. Дапиро, И. В. Навроцкая (Минск)

СОВРЕМЕННЫЕ МЕТОДЫ ОБУЧЕНИЯ НАУЧНОМУ СТИЛЮ РЕЧИ СТУДЕНТОВ НЕЯЗЫКОВЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

В статье раскрываются понятия метода обучения, традиционных и инновационных методов обучения. Анализируются группы различных методов обучения в аспекте преподавания научного стиля белорусского языка в условиях белорусско-русского билингвизма. Рассматриваются особенности формирования компетенции владения белорусским языком в современной языковой ситуации.

Приоритетной задачей дидактики как науки является поиск таких методов обучения, которые будут приводить обучающихся к высоким результатам в овладении системой знаний, практических умений и навыков. Разработка данных методик ведется по различным направлениям, в том числе по вопросам обучения научному стилю речи.

Роль научной функциональной разновидности национального языка особенно возрастает в процессе обучения студентов неязыковых учреждений высшего образования, поскольку подготовка квалифицированных специалистов разных областей науки, техники, производства предусматривает не только предоставление учащимся профессиональных знаний, формирование соответствующих умений и навыков, набора компетенций, в том числе особенно важной для

специалиста – коммуникативной компетенции, учитывая постоянно возрастающую роль речевой деятельности. Овладение грамотной речью – залог эффективной коммуникации, а также успешной профессиональной и научной деятельности. Нами учитывается авторитетное мнение В. А. Масловой о том, что коммуникация – сложный, символьный и личностный процесс, который позволяет участникам адекватно выразить социальные роли. Познавая общество, человек утверждает себя как личность, делает окружающий его мир частью своей индивидуальности, «присваивает» его [1, с. 167]. Именно поэтому одна из приоритетных задач высшего образования в Республике Беларусь – формирование коммуникативно развитой личности, способной налаживать контакты на национальном языке в письменной и устной формах в профессиональной деятельности.

Нельзя не согласиться с утверждением, что человек входит в человечество через национальную индивидуальность, как национальный человек, а не как отвлеченный человек, как русский, француз, немец или англичанин. Национальный человек – это больше, чем обычный человек, у него есть наследственные черты человека в целом, но есть также черты индивидуально-национальные. Важной составляющей национальной культуры являются аспекты ее носителей – этикет, реакции на различные ситуации, в которых главным «действующим лицом» является слово [Там же, с. 164].

Современные специалисты в области дидактики определяют метод обучения как упорядоченный способ организации взаимосвязанной деятельности обучающего и обучаемого по реализации дидактических целей и задач, способ организации познавательной деятельности учащихся по воспроизведению в их сознании содержания учебного материала [2, с. 3, 195].

Многообразие методов представляет систему *традиционных* и *новых* (*инновационных*) методов обучения.

Так, к некоторым традиционным методам относятся следующие: *словесные, наглядные* и *практические*, принцип выделения которых – источники приобретения знаний учащимися. В зависимости от характера познавательной деятельности выделяют *объяснительно-иллюстративный, репродуктивный, метод проблемного изложения, эвристический метод, исследовательский метод* [Там же, с. 6–7]. Содержание отдельных методов обучения дополняется и обогащается.

Появляются и успешно апробируются инновационные методы обучения, к которым относятся *коммуникативный, программированный, проектный, метод модульного обучения, нетрадиционное занятие (в форме квиза, круглого стола, конференции, исследования, квеста, веб-квеста)* и др. [3, с. 21].

Очевидно, что процесс обучения будет результативным в том случае, если преподаватель использует разнообразные методы обучения в их совокупности. Таким образом, методы и технологии образования необходимо совершенствовать не только в направлении поиска инновационных методик, но и в разработке эффективных сочетаний традиционных и новых методов обучения. Эволюция процессов информатизации, компьютеризации и интеллектуализации, которые характеризуют современную парадигму знаний и производственных технологий, оказывает влияние на систему образования, инициирует возникновение новых комплексных дисциплин (например, информационной педагогики) [4], что еще раз подтверждает необходимость контаминации методов обучения для освоения образовательных программ.

Грамотная научная речь – основной инструмент успешной профессиональной деятельности. В высшей школе необходимо подготовить не только квалифицированного специалиста, но и воспитать коммуникативно-компетентную личность, обучаемую с учетом ситуации билингвизма.

Язык может внушать носителям чувство патриотизма, подобное национальному патриотическому чувству, связанному с идеей нации. Язык, будучи неприкосновенной сущностью, противопоставляемой другим языкам, занимает высокое положение на шкале ценностей, положение, которое нуждается в «отстаивании». В ответ на угрожающий языку сдвиг это чувство верности языку приводит в действие силы, направленные на сохранение языка, оказавшегося под угрозой; в ответ на интерференцию оно превращает стандартизованный вариант языка в символ веры и святыню. Но вряд ли стоит сомневаться, что именно в ситуациях языкового контакта люди лучше всего осознают отличительные особенности своего языка по сравнению с другими и именно в этих ситуациях чистый или стандартизованный язык легче всего становится символом единства группы. Следующая за этим мобилизация чувства языкового патриотизма может успешно противодействовать «естественному» распространению интерференции в двуязычных ситуациях [5].

В связи с этим формирование коммуникативной компетенции студента должно опираться на стремление достичь равноправного двуязычия, то есть одинакового владения белорусским и русским языками. Безусловно, степень коммуникативной компетенции студента зависит и от владения иностранными языками.

Для решения вышеперечисленных задач при обучении научному стилю белорусского языка студентов неязыкового учреждения высшего образования используются традиционные и инновационные методы в их сочетании. Так, наиболее эффективными из традиционных методов являются следующие: *объяснительно-иллюстративный метод* в сочетании с *активизацией познавательной активности обучающихся, метод проблемного изложения, частично-поисковый (эвристический) метод, исследовательский метод.* К инновационным методам, доказавшим свою результативность на практике в преподавании научного стиля белорусского языка, относятся: *коммуникативный, проектный, интерактивный*.

Рассмотрим некоторые из них более подробно, опишем принципы методов обучения, приведем примеры конкретного использования в рамках дисциплины «Белорусский язык: культура речи», преподаваемой в БГУИР, в том числе у студентов 1 курса дневного отделения всех специальностей.

Так, большое внимание в преподавании научного стиля белорусского языка уделяется *объяснительно-иллюстративному методу* в сочетании с *активизацией познавательной активности обучающихся*. В деятельности преподавателя этот метод реализуется в предоставлении учащимся научных текстов по истории белорусского языка, текстов по специальности, комментирующем их чтении и анализе. Тем самым преподаватель организует восприятие и осмысление информации студентами. Активизация познавательной активности обучаемых, управление познавательной деятельностью студентов осуществляются с помощью постановки специально подобранных вопросов и стимулирования учащихся к ответам и рассуждениям, самостоятельному осмыслению нового материала, основных теоретических выводов и обобщений. Названные виды деятельности при обучении научному стилю представлены в учебно-методических пособиях и электронном учебно-методическом комплексе «Белорусский язык: культура

речи», разработанными преподавателями кафедры общеобразовательных дисциплин БГУИР [6; 7]. Например, в упомянутом ЭУМК содержится объемный теоретический материал, позволяющий квалифицированно подготовить и оформить научную работу, осуществлять различные виды научной коммуникации. Практический материал представлен текстами по специальности с комплексом логично организованных вопросов. Наглядно (в виде сравнительных таблиц, рисунков, опорных схем) представлены теоретические сведения, касающиеся в том числе и деловой коммуникации, поскольку важную роль как для студента, так и для специалиста играет умение правильно использовать стилистические нормы в профессиональной сфере общения.

Проблемно-поисковые, *исследовательские задания* по научным текстам, представленные в упомянутых выше научно-методических работах преподавателей кафедры, способствуют активизации творческого мышления студентов, помогают глубже осознать языковые явления и проблемы, а также учиться их самостоятельно анализировать. Стоит также отметить, что в пособиях детально представлено описание научной функциональной разновидности национального языка и определяющих средств, специфика научных текстов и их важных составляющих – терминов, особенности составления научных работ, коммуникативные качества устной публичной научной речи. Большое внимание уделено выявлению специфических особенностей белорусского языка по сравнению с русским, что имеет важное значение с учетом современной языковой ситуации в республике и преобладающим использованием русского языка в общественной жизни.

Для освоения и закрепления теоретического материала, повышения культуры речи в учебно-методических пособиях кафедры [Там же] предлагается большое количество заданий и упражнений, имеющих выразительную *коммуникативную* направленность (например, сформулировать проблемные вопросы к тексту, выделить ключевые слова научной статьи, составить тезисный план и тем самым синтезировать конденсированное содержание текста и др.), в том числе специальные тексты для формирования навыков перевода и редактирования, а также большой список справочной литературы, ознакомление с которой позволит более полно овладеть пройденным материалом.

Комплекс содержит также задания для индивидуальной практической работы, которые носят выразительный творческий, *проблемно-поисковый характер* (самостоятельный выбор темы и подготовка научной статьи на конференцию, подбор необходимой литературы по теме исследования и под.). Итогом такого рода работы со студентами являются доклады на ежегодной университетской конференции [8].

Овладеть культурой речи, в том числе научной, призваны в том числе и разнообразные *интерактивные методы обучения*: работа с видео- и аудиоматериалами выступлений известных ученых, что способствует погружению студентов в языковую среду, активизирует их внимание и познавательную активность, подготовленные преподавателем тестовые раздаточные материалы для аудирования, призванные обеспечить эффективное слушание и познавательную деятельность на занятии, обсуждение дискуссионных проблем, затронутых в представленных видеофрагментах.

Языковая ситуация в Республике Беларусь сегодня несбалансированная, несмотря на наличие фактора государственного двуязычия, которое, к сожалению, не переросло в двуязычие национальное, охватывающее всю нацию. Учитывая,

что источником группового, коллективного и национального двуязычия является индивидуальное двуязычие, владение белорусским языком – обязательная составляющая коммуникативной компетенции специалиста. В последнее время в сфере ИТ белорусскоязычные отношения все чаще возникают из-за наличия белорусскоязычных клиентов, необходимости создания и спроса на белорусскоязычный контент многоязычных и непосредственно белорусскоязычных ИТ-продуктов. Следует отметить, что белорусскоязычность последних воспринимается как черта оригинальности и эксклюзивности [9].

Использование современных методов обучения языку студентов неязыковых учреждений высшего образования помогает как обучающимся, так и самим преподавателям профессионально расти, совершенствовать компетенции, активно и плодотворно взаимодействовать в процессе повышения и «осовременивания» качества образования.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Маслова, В. А.* Homo lingualis в культуре / В. А. Маслова. – М. : Гнозис, 2007. – 320. с.
2. Методы обучения / Мин-во образования Респ. Беларусь, Гомельск. гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ, 1993. – 51 с.
3. *Конышева, А. В.* Современные методы обучения английскому языку / А. В. Конышева. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 176.
4. *Дронь, М. И.* Концептуальные основы становления, функционирования и развития информационной педагогики / М. И. Дронь // Выш. шк. – 2019. – № 1. – С. 55–58.
5. *Вайнрайх, У.* Одноязычие и многоязычие / У. Вайнрайх // Зарубежная лингвистика. III / общ. ред. В. А. Звегинцева и Н. С. Чемоданова. – М. : Прогресс, 1999. – С. 7–42.
6. *Албут, А. А.* Беларуская мова : культура маўлення. Практыкум : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Албут, Т. П. Дапіра, І. В. Наўроцкая. – Мінск : БДУІР, 2017. – 104 с.
7. *Наўроцкая, І. В.* Беларуская мова : культура маўлення. Электронны вучэбна-метадычны комплекс [Электронны рэсурс] / І. В. Наўроцкая. – Мінск : Электронная бібліятэка БДУІР, 2013. – Рэжым доступу : http//erud.bsuir.by. – Дата доступу : 07.09.2020.
8. 55-я юбилейная конференция аспирантов, магистрантов и студентов УО «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники», 22–26 апр. 2019 г. : тез. докл. – Минск : БГУИР, 2019. – 56 с.
9. *Дапіра, Т. П.* Валоданне роднай мовай ва ўмовах трылінгвізму як кампанент прафесійнай камунікатыўнай кампетэнцыі на прыкладзе падрыхтоўкі ІТ-спецыялістаў / Т. П. Дапиро // Язык и межкультурная коммуникация : современные векторы развития : сб. науч. ст. по материалам I Междунар. науч.-практ. конф., УО «Полесский государственный университет», 12 апр. 2019 г. / Мин-во образования Респ. Беларусь [и др.] ; редкол. : К. К. Шебеко [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2019. – С. 159–164.

УДК 811.161.3:087.6.

У. І. Куліковіч (Мінск)

СТРУКТУРА І ЗМЕСТ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАГА ВЫДАННЯ ПА АРФАГРАФІІ

За ўсю гісторыю новай беларускай літаратурнай мовы (з 1906 г. па цяперашні час) нашы вучоныя-тэарэтыкі і практыкі стварылі каля 600 разнажанравых навуковых, вучэбных, метадычных кніг і брашур арфаграфічнай тэматыкі. Гэта манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, навукова-даследчы нарыс, зборнікі практыкаванняў, практыкумы, арфаграфічныя слоўнікі, тэматычныя трэнажоры, памяткі.

Сярод іх вучэбнае выданне (як сказана ў анатацыі: «У навукова-папулярным выкладзе падаюцца “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”, зацверджаныя Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г.» [1, с. 2]) толькі адно, падрыхтаванае выдавецтвам «Пачатковая школа» ў 2010 г. Для параўнання: руская арфаграфія была аб’ектам папулярызацыі ў працах Б. З. Букчыной, Л. П. Калакуцкай, Л. К. Чальцовай [2], М. В. Панова [3].

Таму актуальным, на наш погляд, з’яўляецца вывучэнне тыпалагічных адметнасцей беларускага навукова-папулярнага выдання дзеля распрацоўкі несу-

пярэчлівых рэкамендацый для рэдактараў і карэктараў, будучых аўтараў, без сумнення, запатрабаваных дапаможнікаў, паколькі беларуская навукова-папулярная кніга яшчэ не была аб'ектам комплекснага даследавання. На наш погляд, яна не заслужыла такога стаўлення да сябе. Акрамя гэтага, не так часта ў нашым навуковым дыскурсе можна пабачыць артыкулы, дзе разглядаюцца пытанні культуры выданняў пасля таго, як яны пабачылі свет. Найчасцей мы маем справу з рэцэнзіямі, што канстатуюць з'яўленне выдавецкага праекта або знаёмяць чытача з тымі праблемамі, што разглядаюцца ў кнізе.

Задача артыкула – устанавіць адметнасці структуры і зместу кнігі «Беларуская арфаграфія: апавяданні і гісторыі» як вучэбнага выдання з навукова-папулярным выкладам інфармацыі і сфармуляваць агульныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы такіх выданняў.

Навукова-папулярная кніга (так лічаць многія сучасныя даследчыкі) павінна адмяжоўвацца ад навуковай і даведнікаў, арыентаваных на практычнае выкарыстанне. Яе мэта – спрыяць пашырэнню навукова-пазнавальнага кругагляду і не імкнуцца замяніць падручнік ці інструкцыю. Яе чытач – не спецыяліст у той галіне, з якой звязана тэма кнігі [4, с. 78].

Пры вызначэнні паняцця *навукова-папулярнае выданне* стандарт, навуковыя, даведкавыя і навучальныя матэрыялы акцэнтуюць увагу на такіх яго асаблівасцях, як даступнасць і зразумеласць формы паведамлення, што дасягаюцца з дапамогай розных прыёмаў актывізацыі ўвагі чытача, наяўнасць прыкладаў, якія ілюструюць навуковыя палажэнні, пазбяганне спецыяльных умоўных абазначэнняў, складаных схем, замена вузкаспецыяльных тэрмінаў агульнаўжывальнай лексікай, спрошчанасць дэфініцый, перавага простых сказаў [5, с. 11].

Структура навукова-папулярнага (і не толькі) выдання – гэта сістэмна размешчаныя яго састаўныя часткі (асноўны і дадатковы тэксты, апарат, зместавыя і мастацкія элементы) і ўзаемасувязі паміж імі [6; 7]. Чым больш шматзначныя мэты, тым больш складаная структура [8, с. 132]. Тэрмін *змест* шматзначны. У нашым артыкуле мы будзем разглядаць яго толькі як «пералік раздзелаў кнігі з указаннем старонак, змешчаны ў канцы ці ў пачатку» [9, с. 177].

Паводле аўтарскай інтэрпрэтацыі, кніга «Беларуская арфаграфія: апавяданні і гісторыі» з'яўляецца «адной з першых спроб сістэмнага выкладу «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», зацверджаных Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. Прапанаваны чытачам матэрыял ахоплівае тэмы шасці глаў новай рэдакцыі, у якіх у асноўным сканцэнтраваны змены і ўдакладненні: правапіс галосных і зычных, мяккага знака і апострафа, абрэвіятур, некаторых марфем, вялікай і малой літары» [1, с. 300]. На жаль, аўтар чамусьці не паведамляе, якія яшчэ кнігі падобнай тэматыкі пабачылі свет і чым прапанаванае выданне адрозніваецца ад існуючых. Такая інфармацыя для чытача важная, бо дазваляе ўстанавіць месца выдання сярод аналагічных, суаднесці свае чаканні з той інфармацыяй, што імкнуцца данесці стваральнікі, нарэшце, задаволіць сваю пазнавальную цікавасць, звярнуўшыся да іншых крыніц.

У самім выданні, згодна са зместам (с. 301–303), матэрыял не падзелены на главы ці раздзелы. Кніга складаецца з уводзінаў, 49-ці ненумараваных параграфаў і заключэння (пасляслоўя) з паэтычнай назвай «З легендаў і казак былых пакаленняў…» (с. 299–300). Адметнасць частак у тым, што ўсе яны пачынаюцца з буквіцы – павялічанай пачатковай літары. Ва ўводзінах маюцца чатыры нераўназначныя часткі-параграфы, якія, аднак, не адлюстраваны ў змесце. Першая – «Закон "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі"» (с. 3), другая –

«Чаму мяняецца правапіс?» (с. 3), трэцяя – «З гісторыі беларускага правапісу» (с. 7) – тут ёсць яшчэ дадатковы тэкст пад назвай «Пішацца МАНЧЭСТЭР, а чытаецца ЛІВЕРПУЛЬ» (с. 9), чацвёртая – «Праца над сучасным правапісам». Для вучэбнага выдання неадлюстраванне ў змесце важных частак – недахоп, паколькі гэта не дазваляе чытачу скласці аб'ектыўнае ўражанне пра кнігу пры першым знаёмстве.

Структуру выдання складаюць асноўны, дадатковыя і рубрыкацыйныя тэксты, тэксты, якія можна аднесці да навуковага апарату кнігі, ілюстрацыйны матэрыял, элементы арыентацыі.

Функцыянальнае прызначэнне асноўнага тэксту – пазнаёміць чытача са зменамі, што адбыліся ў арфаграфічнай сістэме беларускай мовы пасля прыняцця адмысловага закона. Тут можна назіраць як пры дапамозе шрыфтавога выдзялення акцэнтуюцца асобныя элементы тэксту, важныя для запамінання. Па-першае, ёсць выдзяленне паўтлустым шрыфтам асобных фрагментаў (сказаў, словазлучэнняў, слоў): «**У новай рэдакцыі беларускай арфаграфіі правіла напісання літар *е, ё, я* ў складаных словах не памянялася:** у першай частцы складанага слова ***е*** захоўваецца **незалежна ад таго**, на якім складзе націск у другой частцы…» (с. 117); «**Нельга блытаць** напісанне запазычанняў…» (с. 121); «**Засяродзьце ўвагу:** гукавое спалучэнне зычнага гука…» (с. 166). Па-другое, шырока прадстаўлена выкарыстанне нахіленага шрыфту. Так выдзяляецца большасць факультатыўных элементаў арфаграфічных правілаў: «Узнікненне гука [ў] у некаторых усходнеславянскіх моў звязваюць з падзеннем рэдукаваных: *лавъка → лаўка*» (с. 157); «у словах з коранем *іс-ці*, *ігр-аць*, *ім-я*, *інач-ай* на месцы ненаціскнога пачатковага каранёвага [і]: *зайсці*, *прыйсці*, *прыйшоў*…» (с. 165). Па-трэцяе, выяўлена і дваістая акцэнтуацыя – спалучэнне нахіленага шрыфту і паўтлустага выдзялення: (1) літар і асобных марфем у словах-прыкладах: *рэв**о**люцыя*, *с**о**вет*, *пр**о**летарый* (с. 9), *дз**я**вяты*, *дз**я**сяты* (с. 17); *адажы**а***, *Антары**а***, *Антані**а*** (с. 21); *д**а**лікатны*, *ч**а**чэнец* (с. 31); *норм**аў***, *правіл**аў*** (с. 19); «ужыванне суфіксаў ***-ава-*** **(*-ява-*)** і ***-ірава-*** **(*-ырава-*)**» (с. 17); «літара ***ё*** пішацца не пад націскам у словах з каранямі ***ёд-***, ***ёт-***» (с. 25); (2) асобных літар, частак слова і нават саміх слоў, пра якія ідзе гаворка ў правіле: «літара ***о*** пішацца толькі пад націскам» (с. 21); «з часткай ***радыё-*** трэба пісаць» (с. 27); «першыя часткі складаных слоў ***медыя-***, ***аўдыя-*** пішуцца разам» (с. 29); ***бензакалóнка*** (с. 117); *Оксфард*, *Орск*, ***Тóкіа***, ***Ватэрлóа*** (с. 21).

На жаль, рэдактары выдання не звярнулі ўвагу на тое, што не ва ўсіх словах абазначаны націскныя склады: *Гаш**а**к*, *Ч**а**лябінск*, *Ш**а**ліхін* (с. 32); *брыд**а**ль*, *дэбаркад**а**р*, *каўт**а**р*, *херт**а**ль*, *Карпентэр*, *Фальстэр*, *Уінчэстэр* і інш. (с. 34)

Задача дадатковых і паясняльных тэкстаў – канкрэтызаваць, дапоўніць асноўны тэкст. У выданні дадатковымі тэкстамі з'яўляюцца анатацыя, дзе ўказаны надзвычай шырокая чытацкая аўдыторыя – настаўнікі, журналісты і рэдактары, вучні і студэнты (с. 2), некаторыя тлумачэнні, цытаты з ўнутрытэкставымі бібліяграфічнымі спасылкамі на кнігу П. Я. Юргілевіча (с. 147); на слоўнік М. П. Лобана (с. 148); слоўнікі рускай мовы (с. 109), электронныя рэсурсы (с. 155, 164, 171, 243), на афіцыйныя выданні «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» 1959 і 2008 гг. (па ўсім тэксце) і раздзелы пад назвай «Актуальны слоўнік» (с. 35–105; 110–111; 194–198; 221–231), што займаюць 26 % усяго выдання. Пра якасць актуальнага слоўніка адна з даследчыц напісала так: «Доктар філалагічных навук, не кажу пра кандыдата, галаву зламае, чытаючы "Актуальны слоўнік" на 70-ці старонках» [10, с. 23].

Дадатковым можа лічыцца і тэкст пад назвай «З легендаў і казак былых пакаленняў…» (с. 299–300). Гэта своеасаблівае пасляслоўе. Аднак радкі з хрэстаматыйнага верша М. Танка, вынесеныя ў загаловак, не маюць дачынення да арфаграфіі. У іх, як і самім вершы, гімне беларускай мове, прасочваюцца вытокі сілы і прыгажосці беларускага слова, якое дапамагло людзям выстаяць, не страціць веры ў заўтрашні дзень. У гэтай частцы аўтар тлумачыць функцыянальнае прызначэнне кнігі: «Навукова-папулярны матэрыял падаецца ў выглядзе лінгвістычных гісторый і апавяданняў, якія могуць стаць падставай для далейшых разважанняў, самастойных абагульненняў, творчага пошуку» [1, с. 300]. «Навукова-папулярныя матэрыялы» не ў стане выканаць гэтую місію!» – адзначае і тлумачыць сваё рашэнне адзін з рэцэнзентаў нашага вучэбнага выдання [10, с. 23]. І з гэтым цяжка не пагадзіцца.

Рубрыкацыйныя тэксты прадстаўлены тэматычнымі загалоўкамі, сярод якіх паводле канструкцыі і сэнсавага складніку пераважаюць комплексныя – тыя, што маюць два сэнсавыя пласты: «Беларуса пазнаюць па аканні, ці Правапіс літары О» (с. 20); «За што літара Ё ўганаравана помнікам, ці Правапіс літары Ё» (с. 23); «У каравуле цівуны ды есавулы, ці Правапіс устаўных літар» (с. 150); «Помнік “кур’ёзнай” літары, ці Правапіс Ў нескладовага і У складовага» (с. 154) і інш. Простых загалоўкаў (не маюць сэнсавага падтэксту, дадатковых умоў) у кнізе ўсяго тры: «Гарэзлівая літара Я» (с. 112); «Ці паўплываюць на правапіс Ў нескладовага смайлікі?» (с. 159); «З легендаў і казак былых пакаленняў…» (с. 299).

Адносна комплесных загалоўкаў С. Кржыжаноўскі яшчэ ў першай палове XX ст. заўважыў: «Узнікненне ўнутры загалоўка злучніка “ці” гаворыць не столькі пра расчляненне тэмы або пра пісьменніцкі прыём дваення яе, колькі пра расслаенне чытача, на якога разлічаны загаловак і кніга… Разлік таго, хто дае назву, у даным выпадку зразумелы: чытаюць дзіцячую кнігу дзеці, але купляюць яе дарослыя; загалоўкам трэба штосьці сказаць і тым, і гэтым» [11, с. 8–9]. У такім выпадку, лічыць даследчык, «кніга аказваецца адрасаванай усім, г. зн. нікому» [Там жа, с. 15].

Да тэкстаў навуковага апарату кнігі можна аднесці згаданыя бібліяграфічныя спасылкі, а таксама фрагменты, аддзеленыя ад асноўнага тэксту і пазначаныя спецыяльным знакам **Nota bene**, які паказвае, што трэба засяродзіць увагу. У такіх фрагментах гаворка ідзе пра асобныя ўдакладненні і дыскусійныя пытанні, што непажадана закранаць у навукова-папулярных кнігах. У прыватнасці, аўтар указвае на памылку друку ў «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (с. 22); на рэкамендацыі «Руска-беларускага слоўніка» (1998) адносна напісання асобных слоў з часткамі *радыё-* і *радые-* (с. 28); на словы з пачатковым *медые-* (с. 29); на некарэктнае напісанне слова *арцішок* у № 5 часопіса «Роднае слова» без указання года выдання (с. 141).

Ілюстрацыйны матэрыял як частка структуры выдання прадстаўлены 28 чорна-белымі ілюстрацыямі, размешчанымі ў пачатку асобных параграфаў і суадноснымі, як правіла, з тэкставым матэрыялам. Іх задача – сфарміраваць эмацыйныя адносіны да ўспрынятай інфармацыі. Яны выкананы ў легкаважным стылі. Такі падыход стварае ўражанне, што нас чакае займальнае, пацешлівае, забаўнае чытанне. Аднак знаёмства з тэкстам пераконвае ў адваротным. У многіх месцах засваенне зместу патрабуе сур’ёзнага, удумлівага, разважлівага і засяроджанага ўспрыняцця надрукаванага. Пра гэта сведчаць і аўтарскія рэмаркі тыпу: «**Засяродзьце ўвагу**» (с. 166).

Сярод элементаў арыентацыі ў выданні маецца змест, калантытулы – верхні справа (рубрыкацыйны), які паўтарае загаловак раздзела і ніжні злева (пастаянны «мёртвы») побач з калонлічбай, дзе ўказаны ініцыялы, прозвішча аўтара і назва кнігі: *В. І. Іўчанкаў. Беларуская арфаграфія: апавяданні і гісторыі*. На думку вярстальнікаў, пастаянны калантытул мае сэнс прымяняць у двух выпадках: (1) калі маецца вялікая верагоднасць згубіць вокладку або (2) калі мяркуецца, што з выдання будуць вырываць старонкі.

Няма ў выданні, на жаль, метадычных тэкстаў – пытанняў, заданняў – важнага элементу любога вучэбнага дапаможніка.

Навукова-папулярная кніга на сучасным этапе – усеагульная запатрабаванасць. Яна патрэбна і школьніку, і студэнту, і спецыялісту ў сваёй сферы, каб ведаць, што адбываецца ў навуковым свеце. Рэдактару ў такім выпадку трэба раз і назаўсёды запомніць, што (1) яна не можа быць аднолькавай для ўсіх, што (2) неабходна дакладна ўяўляць узровень падрыхтоўкі і запатрабаванні кожнай канкрэтнай групы чытачоў.

Структура і змест кнігі «Беларуская арфаграфія: апавяданні і гісторыі» не адпавядаюць існаваным у выдавецкай практыцы асноўным патрабаванням, што прад'яўляюцца да вучэбных і навукова-папулярных выданняў. Дапаможнік, паводле вобразнай характарыстыкі М. Карповіч, з'яўляецца ўзорам «неталерантнасці» у публічнай камунікатыўнай прасторы, кнігай, якая «заблыталася ў тэорыі відаў» [10, с. 23].

Прычын тут некалькі. Першая – рэдакцыйныя супрацоўнікі, якія не падказалі аўтару, «што вучэбнае выданне – гэта адзін від выдання, а навукова-папулярнае выданне – зусім іншы від выдання» [Там жа, с. 23]. Другая – адсутнасць кваліфікаванага рэцэнзента, знаёмага з праблемамі выкладання арфаграфіі ў агульнаадукацыйных установах. Думаецца, такі спецыяліст абавязкова параіў бы аўтару напісаць прадмову з прынцыповай характарыстыкай кнігі, скласці метадычны апарат, патлумачыць складаныя лінгвістычныя тэрміны, сістэматызаваць змест, перагледзіць актуальны слоўнік, форму і методыку выкладу.

ЛІТАРАТУРА

1. *Іўчанкаў, В. І.* Беларуская арфаграфія : апавяданні і гісторыі / В. І. Іўчанкаў. – Мінск: Пачатковая шк., 2010. – 304 с.
2. *Букчина, Б. З.* Письма об орфографии / Б. З. Букчина, Л. П. Калакуцкая, Л. К. Чельцова. – М. : Наука, 1969. – 136 с.
3. *Панов, М. В.* Занимательная орфография : [для ст. школ. возраста] / М. В. Панов ; ил. В. С. Коноплянского. – 2-е изд. – М. : Просвещение, 2010. – 160 с.
4. Редакторская подготовка издания : учебник / С. Г. Антонова [и др.]. ; под ред. С. Г. Антоновой. – М. : Логос, 2004. – 496 с.
5. *Мельнікава, З. П.* Культура літаратуразнаўчага даследавання : вуч.- метад. дапам. / З. П. Мельнікава. – Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2013. – 86 с.
6. *Мильчин, А. Э.* Справочник издателя и автора / А. Э. Мильчин, Л. К. Чельцова. – М. : Студия Артемия Лебедева, 2018. – 1010 с.
7. Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу. Издания. Основные элементы. Термины и определения : СТБ 7.209-2008. – Введ. 12.12.2008. – Минск : Госстандарт, 2009. – 62 с.
8. *Тюрина, Л. Г.* Состав и структура учебной книги как педагогическая система / Л. Г. Тюрина // Теория и практика издательского дела. Хрестоматия : учеб. пособие для студентов специальности «Издательское дело» / авт. сост. В. И. Куликович, В. В. Орлова, О. А. Пригожая. – Минск : БГТУ, 2012. – С. 132–147.
9. *Малажай, Г. М.* Школьны тлумачальны слоўнік беларускай мовы : дапам. для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Малажай, Л. І. Яўдошына. – Мінск : Аверсэв, 2013. – 478 с.
10. *Карповіч, М.* Публічная камунікатыўная прастора / М. Карповіч // Журналістыка-2014 : стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 16-й Міжнар. навук.-практ. канф., 4–5 сн. 2014 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 16. – Мінск : БДУ, 2014. – С. 21–24.
11. *Кржыжановский, С.* Поэтика названий / С. Кржыжановский. – М. : Никитинские субботники, 1931. – 32 с.

УДК 811.161.3’25=581

В. В. Шахаб (Цяньцзінь, КНР)

ВЫКАРЫСТАННЕ ПЕРАКЛАДНЫХ ТЭКСТАЎ ПРЫ НАВУЧАННІ ЗВЯЗНАЙ МОВЕ КІТАЙСКІХ СТУДЭНТАЎ

Беларуская мова як замежная ў якасці спецыяльнасці навучання на працягу апошніх гадоў імкліва распаўсюджваецца ў кітайскіх універсітэтах. Так, з 2017 г. у Цяньцзінскім універсітэце замежных моў пачалося навучанне на ўзроўні бакалаўрыята, з 2018 г. і 2019 г. такая ж спецыяльнасць адкрылася яшчэ ў двух універсітэтах Кітая, і ў 2020 г. адбыўся першы выпуск спецыялістаў-беларусістаў.

Навучанне беларускай мове кітайскіх студэнтаў ладзіцца на аснове агульнапрынятых падыходаў. Засваенне граматычнага ладу мовы і развіццё маўлення ўсведамляюцца як асноўныя задачы навучання беларускай мове як замежнай. Усе існуючыя лінгвадыдактычныя сродкі ў большай ці меншай ступені арыентаваны менавіта на развіццё ў студэнтаў прадуктыўных уменняў пісьмова і вусна выказваць уласныя думкі, разважаць, абгрунтавана карыстацца адпаведнымі моўнымі сродкамі ў розных сферах жыццядзейнасці.

Вопыт паказвае, што на прасунутым этапе навучання беларускай мове варта выкарыстоўваць шырокі лінгвакультуралагічны кантэкст і арыентавацца на актуальныя запыты міжкультурных стасункаў. Таму тэкстацэнтрычны падыход да выкладання бачыцца цалкам абгрунтаваным. Вычлененыя для засваення граматычныя канструкцыі не маюць той сэнсавай напоўненасці, якая абумоўлена іх цеснай сувяззю з іншымі адзінкамі ў тэксце. Як вынік, нельга патлумачыць усёй глыбіні іх логіка-граматычнага ўзаемадзеяння. Гэта азначае, што кожную граматычную адзінку варта разглядаць як патэнцыяльны ці рэальны структурны кампанент тэксту.

З лінгвістычнага пункту гледжання тэкст усведамляецца як графічна замацаванае або вусна выказанае паведамленне, якое характарызуецца структурнай і сэнсавай завершанасцю. Як лінгвістычны факт ён не тоесны твору, бо замацоўвае толькі яго значэнне і гукавую абалонку, аднак з’яўляецца пачатковым пунктам аналітычных і інтэрпрэтацыйных дзеянняў, якія датычацца твораў як цэласнасці.

“Паколькі тэкст – гэта такое ўтварэнне, дзе знешняя форма абавязкова пераходзіць ва ўнутраную форму, якую складае цэласны вобраз зместу, то гэты пераход з’яўляецца найбольш характэрнай унутранай уласцівасцю тэксту” [2, с. 30]. Семантыка тэксту атаясамліваецца з праграмнай арганізацыяй мыслення, што цалкам адпавядае як інфармацыйнай і прагматычнай аўтарскай установоўцы, так і прадугледжанаму выніку разумення. Таму філалагічны падыход да вывучэння моўных з’яў і маўленчых актаў прадугледжвае іх разгляд у тэксце ці яго частцы, у сувязі са значэннем і сэнсам.

Тэкст – гэта лінгвістычная, дыдактычная, метадычная і псіхалагічная адзінка. У лінгваметадычнай літаратуры даследчыкі ў той ці іншай меры прытрымліваюцца думкі, што пры вывучэнні тэксту мэтазгодна размяжоўваць яго форму і змест, якія ў сваю чаргу характарызуюцца цэласнасцю і стрaктурнасцю. Тэкст усведамляецца як складаная макраадзінка, утвораная з шэрагу кампанентаў – лагічных, моўных, маўленчых, экспрэсіўна-эмацыянальных і стылістычных, якую неабходна асэнсоўваць не толькі як знак і значэнне, але і як крыніцу сэнсу.

На ўзроўні ўнутранай формы ажыццяўляецца афармленне адзнак часу і прасторы, вобразнай сістэмы, лексічных і сінтаксічных сродкаў. Эстэтычная

інфармацыя, як слушна заўважае З. І. Тураева, “не аддзяляецца ад матэрыяльнай формы, у якой яна ўвасоблена, і не можа быць перанесена ў другую форму” [3, с. 61]. Іншымі словамі, асэнсоўваючы тэкст як адзінае ўнікальнае сэнсава-граматычнае цэлае і асобныя сказы як мікратэксты ці асобныя кампаненты тэксту, неабходна засяроджваць увагу студэнтаў на думцы, якая выражаецца тэкстам, і моўных сродках, з дапамогай якіх думкі суадносяцца з тым ці іншым стылем. У сваю чаргу варта памятаць, што стылёвыя рысы вызначаюцца экстралінгвістычнымі фактарамі, у тым ліку спецыфікай прадмета маўлення, яго тэматыкай, агульнай мэтавай устаноўкай і шматпланавым узроўнем чытачоў ці слухачоў. Таму ў методыцы навучання мове тэкст разглядаецца ў адзінстве моўных і маўленчых аспектаў у іх сувязі, суаднесенасці і разнастайнасці спалучэння. Інфармацыя, змешчаная ў тэкстах, вызначаецца аўтарскай задумай, характарам сітуацыі зносін, камунікатыўнымі задачамі. Таму адбор сродкаў для вырашэння дыдактыка-метадычных задач абумоўлены перш за ўсё характэрнымі структурна-змястоўнымі і камунікатыўнымі ўласцівасцямі тэкстаў, іх моўнай арганізацыяй, а таксама вопытам суб’ектаў навучальнага працэсу.

У якасці аднаго з варыянтаў працы па развіцці звязнай мовы кітайскіх студэнтаў мы прапануем выкарыстоўваць перакладныя тэксты. Мы кіраваліся тым, што такія тэксты, па-першае, уваходзяць у кола цікавасці кітайскіх навучэнцаў праз знаёмую навучэнцам лінгвакультуразнаўчую інфармацыю; па-другое, стылістычна і жанрава разгалінаваныя; па-трэцяе, утрымліваюць неабходны для актыўнай працы моўны матэрыял.

Разгледзім, як, паглыбляючы веды па тэме “Мая сям’я” на прасунутым этапе, можна арганізаваць працу з перакладнымі тэкстамі з кітайскай мовы. Так, для развіцця звязнай мовы можна выкарыстаць наступны фрагмент з кнігі “Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры” (пераклад з кітайскай мовы на беларускую):

xiào 孝

Шанаванне бацькоў

子女对父母的顺从与敬爱。就言行而论，“孝”包含以下三点要求：其，要谨慎保护受之于父母的身体，以免伤病，令父母担忧。其二，不能违背父母的教导、要求，即便不能认同，也应顺从遵循。其三，应以高尚的德行，成就自己的声誉与功业，以彰显父母的教导。“孝”植根于子女内心对父母的亲爱与尊敬。儒家认为，“孝”是个人德行养成的基础，并将其作为维系和强化父子关系乃至君臣关系的根本。

Шанаванне бацькоў – гэта паслухмянасць перад бацькамі, павага і любоў да іх. Для дзяцей шанаванне бацькоў мае тры аспекты. Па-першае, засцерагайце ад траўмаў і хвароб сваё цела, народжанае бацькамі, каб яны не хваляваліся. Па-другое, не ідзіце супраць настаўленняў, указанняў і просьбаў вашых бацькоў. Трэба заўсёды падпарадкоўвацца бацькам, нават калі вы не згодныя з імі. Па-трэцяе, сваімі высакароднымі паводзінамі здабывайце добрую рэпутацыю і заслугі, каб даказаць правільнасць выхавання бацькамі. У аснове шанавання бацькоў ляжыць любоў і павага з боку дзяцей. Канфуцыянцы лічаць, што шанаванне бацькоў з’яўляецца падмуркам маральнай цэласнасці чалавека і асновай добрых адносін не толькі паміж бацькамі і дзецьмі, але і паміж кіраўнікамі і падначаленымі [1, с. 143].

На аснове тэксту развіваюцца навыкі чытання, актуалізуецца знаёмая і новая лексіка, новыя выразы, удасканальваюцца граматычныя веды. Варта прапанаваць студэнтам зрабіць адваротны пераклад канцэпту і супаставіць яго з арыгіналам на ўсіх узроўнях. “Адваротны пераклад – тое ж, што двухбаковы пераклад. Пісьмовы пераклад тэксту з замежнай мовы на родную, затым пераклад гэтага тэксту на замежную мову з наступным супастаўленнем з арыгіналам. Выкарыстоўваецца ў некаторых выпадках як прыём навучання” [2]. Такім чынам, з дапамогай адваротнага перакладу выяўляецца разнастайнасць перакладчыцкіх трансфармацый, што спрыяе развіццю мовы студэнтаў.

Лексіка для перакладу і актуалізацыі:

Назоўнікі: бацькі, дзеці, любоў, павага, настаўленне, указанне, просьба, паводзіны, рэпутацыя, заслугі, выхаванне, шанаванне, падмурак, адносіны, канфуцыянцы.

Прыметнікі: высакародны, добры.

Дзеясловы: засцерагаць, хваляваццa, даказваць.

Выразы для тлумачэння: з’яўляцца падмуркам, ляжаць у аснове.

Пытанні для абмеркавання:

– Што асабіста для вас азначае “шанаваць бацькоў”?

– Ці ёсць розніца ў адносінах дзяцей да бацькоў у сучасным Кітаі і Кітаі мінулых стагоддзяў?

– Якія законы існуюць у сучасным Кітаі ў адносінах да людзей сталага веку?

– Чаму канфуцыянцы лічаць, што шанаванне бацькоў з’яўляецца асновай маральнай цэласнасці чалавека?

Тэма для эсе: “Шануем мы бацькоў імёны, навукай прыклад нам яны” (У. Жылка).

Для працы па вышэйадзначанай тэме можна таксама прапанаваць правесці дыскусію паводле апавядання Чжу Цыціна “Постаць” (прыведзены пераклад на беларускую мову). Студэнтам рэкамендуецца пазнаёміцца з апавяданнем на беларускай і кітайскай мовах і выказаць меркаванне, наколькі беларуская назва “Постаць” адпавядае кітайскай назве (даслоўна 背影 перакладаецца як “Сілуэт”). Перад правядзеннем дыскусіі варта дэталёва прааналізаваць лексіку перакладу, параўнаць яе з лексікай арыгінальнага тэксту і выказаць уласнае меркаванне, чаму ў перакладным тэксце ўжываецца тое ці іншае слова, ці адпавядае гэта зместу і закладзеным у ім канатацыям. Асаблівую ўвагу варта звярнуць і на сінтаксіс арыгінала і перакладу, абгрунтаваць мэтазгоднасць ці немэтазгоднасць тых ці іншых сінтаксічных трансфармацый.

Лексіка для перакладу і актуалізацыі:

Назоўнікі: выгляд, бабуля, пахаванне, памінкі, радзіма, сябра, рэстаран, гатэль, вакзал, багаж, непрактычнасць, дробязі, цюбецейка, халат, куртка, таўстун, беспрацоўе, натоўп, просьба, адносіны, туга, твар, бруд, мандарыны, слёзы, эмоцыі, палачка, пэндзлік.

Прыметнікі: асцярожны, пільны, мітуслівы, цёмна-сіні, фіялетавы, чорны, спагадлівы, нясцерпны, вандроўніцкі, глыбокі, нерэалізаваны.

Прыслоўі: узімку, шматразова, зашмат, неаднаразова, многа, уначы, складана, бесклапотна, нядоўга, зноў.

Дзеясловы: заплакаць, супакоіцца, усміхацца, паклапаціцца, выправіцца, плакаць, жыць.

Выразы для тлумачэння: бяда адна не ходзіць, фінансавая пастка.

Чжу Цыцін
Постаць

Прайшло ўжо больш за два гады з таго часу, як я апошні раз бачыў бацьку. Але я заўсёды помню яго выгляд са спіны. Узімку два гады таму памерла мая бабуля, а мой бацька толькі што страціў працу. Як кажуць, бяда адна не ходзіць. Я паехаў з Пекіна ў горад Сюйчжоў і спяшаўся разам з бацькам на пахаванне бабулі. Пабачыўшы мітуслівы сямейны двор, я ўспомніў бабулю і заплакаў. Бацька мяне суцяшаў: «Яна ўжо сышла, не сумуй. …»

На радзіме бацька прадаў усю маёмасць, каб выплаціць доўг. Але каб справіць памінкі, давялося зноў пазычаць грошы ў сяброў. І пахаванне бабулі, і беспрацоўе штурхнулі нашу сям'ю ў фінансавую пастку. Пасля пахавання бацька павінен быў паехаць у Нанкін шукаць працу. А я – у Пекін працягваць вучобу. Нарэшце разам з бацькам мы выправіліся ў дарогу.

Калі мы прыехалі ў Нанкін, адзін сябра запрасіў мяне пагуляць па горадзе, і я спыніўся там на дзень. На другі дзень ранкам мне трэба было пераплыць раку Янцзы на параходзе і пасля абеду паехаць у Пекін на цягніку. Бацька сказаў, што ён вельмі заняты і, напэўна, не зможа правесці мяне. Таму ён даручыў знаёмаму афіцыянту ў рэстаране пры гатэлі правесці мяне на вакзал. Ён доўга шматразова паўтараў яму ўсе дробязі, але ўсё ж не мог супакоіцца. Ён баяўся, што афіцыянт не здолее так паклапаціцца пра мяне, як ён. Запомнілася, што бацька зашмат гаварыў і даваў розных парад! Мне на той час ужо споўнілася дваццаць гадоў, і я ўжо неаднаразова ездзіў у Пекін. Пасля доўгіх ваганняў ён вырашыў сам суправаджаць мяне на вакзал. Я спрабаваў адгаварыць яго ад гэтага, але ён толькі сказаў: «Гэта няважна. Будзе лепей, калі я сам паеду з табой».

Мы з бацькам пераправіліся праз раку і ўвайшлі ў памяшканне вакзала. Я пайшоў за білетам, а ён сачыў за багажом, якога ў мяне было досыць многа. Давялося наняць насільшчыка. І бацька пачаў таргавацца з ім. На тыя гады я лічыў сябе самым разумным. Мне падалося, што бацька размаўляе нетактоўна. Але яны нарэшце дамовіліся пра кошт. Правёўшы мяне ў вагон, бацька заняў месца каля ўваходу. Я паклаў фіялетавае футравае паліто на сваё месца. Бацька загадаў мне быць пільным і асцярожным у дарозе і хваляваўся, каб я не прастудзіўся ўначы. Ён таксама папрасіў праваднікоў паклапаціцца пра мяне. Я ўсміхаўся з-за непрактычнасці бацькі. Дарма ён дае ім даручэнні. Яны цікавяцца толькі грашыма. Да таго ж, я ўжо дарослы. Хіба не магу я паклапаціцца пра сябе? Эх! Які ж "разумны" я быў у той час!

Я сказаў бацьку: "Тата, ідзі дахаты". Але ён, глянуўшы ў акно, прамовіў: "Я іду па мандарыны. Чакай мяне тут. Не адыходзь". Я ўбачыў, што за другой платформай стаяць некалькі латочнікаў, якія чакаюць пакупнікоў. Але каб дайсці да яе, бацька павінен быў саскочыць з нашай платформы, перайсці чыгуначнае палатно і падняцца на другую платформу. Для такога таўстуна, як мой бацька, гэта было даволі цяжка. Я памкнуўся пайсці сам, але бацька быў настойлівы і не пагадзіўся. Тата ў чорнай цюбецейцы, цёмна-сінім ватным халаце і чорнай кітайскай куртцы зверху ішоў, перавальваючыся, па чыгуначных рэйках. Ён павольна злез з платформы. Гэта было яму яшчэ не вельмі цяжка. Але падняцца на другую платформу было нашмат складаней. Ён абедзвюма рукамі схапіў край платформы, а ногі закідваў угару. Яго поўнае цела злёгку нахілілася ўлева. Відаць было, што ён стараўся падняцца з усяе сілы. Убачыўшы гэта, я больш не змог стрымаць слёз. Але хутка выцер іх, каб ні ён, ні іншыя не заўважылі, што я

плачу. Калі я зноў паглядзеў у акно, бацька ўжо ішоў назад з аранжавымі мандарынамі ў руках. Ідучы праз чыгуначнае палатно, ён спачатку паклаў мандарыны на зямлю, павольна спусціўся, потым зноў падняў іх. Калі ён падышоў да цягніка, я паспяшаўся падтрымаць яго пад руку. Пасля мы вярнуліся ў вагон, ён паклаў усе мандарыны на маё паліто і, пахлопваючы па кішэнях, стаў абтрасаць бруд са свайго адзення. Ён выглядаў вельмі бесклапотна. Праз некаторы час ён сказаў: “Мне трэба ісці. Не забудзься пісаць мне!” Я ўважліва глядзеў яму ў спіну, калі ён выходзіў з вагона. Зрабіўшы некалькі крокаў, бацька павярнуўся тварам да мяне і сказаў: “Вяртайся на сваё месца. Не пакідай свае рэчы без нагляду”. Я, аднак, не выканаў яго просьбу, пакуль яго постаць не згубілася сярод мітуслівага натоўпу. Мае вочы зноў былі мокрымі ад слёз.

У апошнія гады мы з бацькам жылі вандроўніцкім жыццём. І яно станавілася ўсё горшым і горшым. У маленстве ён ужо пакінуў бацькоўскую хату, каб зарабіць на жыццё. Ён зрабіў шмат вялікіх спраў. У той час ніхто не мог падумаць, што яму так дрэнна будзе ў старасці. Разгублены стан нарадзіў нясцерпную глыбокую тугу, і яго нерэалізаваныя эмоцыі павінны былі знайсці выхад. Вось чаму нават дробязі часта злавалі яго, і тым часам адносіны яго да мяне станавіліся ўсё горшымі і горшымі. Тым не менш, наша расставанне ў апошнія два гады зрабіла яго больш спагадлівым да мяне. Ён пачаў клапаціцца пра мяне, свайго сына, як і раней. Пасля майго прыезду ў Пекін ён напісаў мне ў пісьме: ”У мяне ўсё добра, толькі моцна баліць плячо. Таму не магу карыстацца палачкамі і пэнзлікамі для пісьма. Магчыма, мне засталося нядоўга жыць”. Праз слёзы, што паліліся ад гэтых слоў, я зноў уявіў шырокую спіну бацькі ў цёмна-сінім ватным халаце і чорную цюбецейку з тканіны. О Божа, ці магу я быць упэўненым, што ўбачу бацьку зноў?! [4, с. 137–140].

Пытанні да дыскусіі:

– Якое глабальнае пытанне ўздымае аўтар апавядання?

– Апішыце пачуцці галоўнага героя да бацькі. Дайце ацэнку яго думкам і паводзінам.

– У чым выражалася любоў бацькі да сына?

– Ці існуюць праблемы ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей у Кітаі сёння?

Тэма для эсэ: “Мае эмоцыі пасля прачытання апавядання”.

Такім чынам, адзначым, што на прасунутым этапе навучання беларускай мове кітайскіх навучэнцаў вядучым будзе дыдактыка-метадычны прынцып арыентацыі на тэкст і цесна звязаны з ім жанрава-стылістычны падыход да інтэрпрэтацыі і стварэння тэкстаў. Менавіта пры такім падыходзе будзе забяспечана станоўчае ўздзеянне прынцыпу апоры на адзінкі маўлення пры навучанні мове і апоры на адзінкі мовы пры навучанні маўленню. У сваю чаргу для такой працы могжна паспяхова выкарыстоўваць як адаптаваныя і арыгінальныя, так і перакладныя тэксты.

ЛІТАРАТУРА

1. Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры : Прэса па даследаванні і вывучэнні замежных моў : у 9 кн. – Мінск : Маст. літ., 2019. – Кн. 4. – 183 с.

2. *Новиков, А. И.* Семантика текста и ее формализация / А. И. Новиков. – М. : Наука, 1983. – 215 с.

3. *Тураева, З. Я.* Лингвистика текста (Текст : структура и семантика) : учеб. пособие / З. Я. Тураева. – М. : Просвещение, 1986. – 126 с.

4. *Чжу Цыцін.* Постаць / Цыцін Чжу // Літаратурна-мастацкі альманах AVE. – Мінск : БДТУ, 2019. – 270 с.

УДК 82.035+20+826

І. П. Бязлепкіна (Мінск)

ПРЫЁМ “ПЕРААПРАНАННЯ” Ў АНГЛА-БЕЛАРУСКІМ ПАЭТЫЧНЫМ ПЕРАКЛАДЗЕ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст.

Тэрмін *перааапранання* ў кантэксце мастацкага перакладу быў упершыню выкарыстаны А. Адамовічам у значэнні перанясення “сучасных з’яў і ідэй у вобразы далёкіх дадзенаму часу й месцу паэтаў” [1, с. 531]. Згодна з даследчыкам, “гэты спосаб выкарыстоўваў Я. Купала, перакладаючы “Слова пра паход Ігаравы” ў самы разгар “грамадзянскае вайны”, з тым жа падтэкстам ім была перастворана драма “Эрас і Псыха” польскага паэта Ю. Жулаўскага (1922 г.) і паэма “Парыжская камуна” іншага польскага паэта У. Бранеўскага [Там жа]. Той жа падыход адзначаў А. Адамовіч і ў перакладах У. Жылкі твораў польскага паэта Б. Ясенскага (“Слова пра Якуба Шэлю”), Ю. Гаўрука – з Г. Гейнэ (“Нямеччына”).

У канцы 1920-х і асабліва ў пачатку 1930-х гг. мастацкі пераклад быў хіба не адзіным магчымым спосабам выказвацца на забароненыя тэмы. Ёсць падставы казаць пра тое, што сябры апальнага згуртавання “Узвышша” ў другой палове 1920-х гг. выказвалі набалелае радкамі якога-небудзь іншамоўнага класіка. Так, пераклад У. Дубоўкам верша Дж. Байрана “Ты плакала…” у кантэксце паэмы “Штурмуйце будучыні аванпосты” (1929) набываў першапачаткова неўласцівае яму гучанне:

Джордж Байран! Каб ведалі вы
Нашай краіны нядолю,
Здратаваныя паплавы
І ў корань стаптанае поле.
Нядоля і слёзы сабой
Краіны чало аквячалі…

у твор арганічна ўваходзіў пераклад з Дж. Байрана:

…Ты плакала… Буйной слязой
Сінь воч ускрылася ў той час.
Здалося мне, што пад расой
З’явіліся фіялкі ўраз [4, с. 147].

У гэтым камбінаваным творы праз вобраз дзяўчыны, агорнутай арэолам недасягальнасці, ідэалізаванай прыгажосці, перакладчык адлюстраваў і вобраз сваёй краіны. Абагульненне вобразаў дзяўчыны і Радзімы ў вершы цалкам адпавядала беларускай літаратурнай традыцыі (“Трэнас” М. Сматрыцкага (маці – царква), “Паязджане” Я. Купалы (нявеста – Беларусь).

Незадоўга да стварэння паэмы “Штурмуйце будучыні аванпосты” У. Дубоўка працаваў над перакладам “Паломніцтва Чайльд Гарольда” Дж. Байрана. Скончыўшы працу ў 1930–1931 гг., ён пераклаў паэму “Шыльёнскі вязень”. Паэтычны фрагмент “Развітальная песня” з паэмы “Паломніцтва Чайльд Гарольда”, напісаны Дж. Байранам у адзін з самых складаных момантаў яго жыцця, адпавядаў настроям беларускага перакладчыка, які і сам апынуўся па-за межамі радзімы.

Сімвалічна, што трапляючы ў падобныя жыццёвыя абставіны (развітанне з радзімай, выгнанне, зняволенне), і перакладчыкі “маладнякоўска” – “ўзвышэнскага” перыяду, і іх папярэднікі “філаматы” і “філарэты”, звярталіся не толькі да перакладу твораў адных і тых жа аўтараў, але і да адных і тых жа тэкстаў. Дж. Байрана і “філаматаў” аб’ядноўвала імкненне да змагання, а затым і выгнанніцкі лёс. Невыпадкова пераклад “Развітальнай песні Чайльд Гарольда” ствараўся А. Міцкевічам пасля выкрыцця таварыства, калі паэт быў вымушаны развітацца з Айчынай, а “Санет да Шыльёна” быў пераствораны Я. Чачотам па памяці ў зняволенні.

Можна дапусціць, што і пазбаўлены волі І. Луцкевіч, узяўшыся за пераклад “Кнігі джунгляў” і “Другой кнігі джунгляў” Р. Кіплінга ў 1928 г., меркаваў паказаць праз гэты твор рысы свайго часу. Менавіта так, звяртаючыся да прыёму інтэрпрэтацыі, па просьбе А. Луцкевіча перакладала паэтычныя ўрыўкі з “Кнігі джунгляў” Н. Арсеннева. Параўнаем яе варыянт верша “Падарожная песня малпаў Бандар-Лёгаў” з арыгіналам “Road-Song of the Bandar-Log”:

Арыгінал:	Пераклад Н. Арсенневай:
Here we sit in a branchy row, Thinking of beautiful things we know. Dreaming of deeds that we mean to do, All complete, in a minute or two – Something noble and wise and good, Done by merely wishing we could [8, p. 3]	У калысцы з зялёных галінаў Мы будуем вялікія пляны, Важым прышлыя лёсы народаў, У лятунках праводзім гадзіны… Што мы знаем – ня знана нікому. Мы будуем… Тут раптам зь вярхоўкі Нам гарэшак зьляціць на галоўкі. Наша мова й багата, й прыгожа, Штораз новыя гукі ці словы [6, с. 183].

Н. Арсеннева відавочна генералізавала змест твора, надаўшы малпам місійную ролю “важыць прышлыя лёсы народаў”. Імкненне перакладчыцы сказаць больш, чым у арыгінале (згадкі пра лёсы народаў, мову), адбілася як на змесце, так і на форме твора (выкарыстанне прыёма ампліфікацыі: у прыведзеным вершы Р. Кіплінга 24 радкі, у перакладзе Н. Арсенневай – 35). Заключны заклік у беларускім варыянце: “Дык далей, да нязнанае мэты, / Наша слава задзівіць паўсвета” ў арыгінале адсутнічае і нагадвае ў кантэксце 1920-х гг. хутчэй радкі з тэзаў “узвышэнцаў” – пра імкненне да стварэння творчасці, якую “ўгледзяць вякі і народы”. Калі б тагачасная крытыка больш уважліва паставілася да асобных перакладаў, то яна вымушана была б канстатаваць тое ж, што і чыноўнік асаблівых даручэнняў граф П. І. Капніст пра перакладчыка В. Курачкіна ў час агляду рускай лірычнай паэзіі 1854–1864 гг.: “Захоўваючы часта дух першакрыніцы, ён вельмі трапна ўмее выкарыстоўваць розныя куплеты Беранжэ да нашых сучасных абставінаў, так што, па сутнасці, Беранжэ з’яўляецца толькі сляпой зброяй, і пад прыкрыццём яго імя сп. Курачкін імкнецца дасягнуць свае мэты” [7, с. 84].

Д. Бугаёў згадваў пра асаблівае стаўленне У. Дубоўкі да сваіх перакладаў твораў У. Шэкспіра: “Мяне ўразіла, як чытаў Дубоўка свае пераклады шэкспіраўскіх санетаў: “Выходзіць так, што праўды ў нас няма”, “Найчысцейшай праўды зневажанне”, “Ісціна, якой затулен рот, і зло, што верхаводзіць над усімі”, “Душа мая, зямлі ўсёй асяродак, / Чаму прыгон ты церпіш над сабой?!” Усё гэта – Шэкспір. Але чытаў яго паэт так, што атрымлівалася, нібыта ён

гаворыць і сам пра сябе, пра свае пакуты, пра сваё прыніжэнне ўладай, якая і пра зняволенне вымушала пісаць, як пра нейкае незразумелае падарожжа па краіне – ад Чувашыі да Краснаярскага краю і Далёкага Ўсходу. Тут, у перакладах, Дубоўка сапраўды не баяўся вострых намёкаў, бо Шэкспір быў надзейны абаронца" [3, с. 322–323]. Так жа ставіўся У. Дубоўка і да іншых сваіх перакладаў з Дж. Байрана, бо, як пісаў адзін са шчырых прыхільнікаў творчасці англійскага рамантыка У. Караткевіч, "відаць, Байран, каб дажыў, слухаў бы гэтыя незнаёмыя гукі з прыемнасцю, а магчыма, і палюбіў бы нас – нават калі б не ведаў усяго астатняга, за што нас варта паважаць і любіць" [5, с. 370].

У перакладах У. Дубоўкі з Дж. Байрана, дзе закраналася тэма несправядлівасці, пакут, выгнання – таго, што перажыў і сам перакладчык, немагчыма не заўважыць яго ўсхваляванасці. Складваецца ўражанне, што менавіта пад уплы-ам асабістай крыўды перакладчык замяняў арыгінальныя радкі на функцыянальна адпаведныя, але больш гнеўныя або роспачныя. Асабліва гэта датычыцца перакладаў урыўка з паэмы "Шыльёнскі вязень" і двух аднайменных вершаў "Стансы да Аўгусты" ("Stanzas to Augusta") Дж. Байрана. Разгледзім некалькі строф аднаго з вершаў, вылучыўшы курсівам дапаўненні перакладчыка "ад сябе":

In that deep midnight of the mind,	Калі ў пакутным часе тым
And that internal strife of heart,	Стаяла роспач над душой,
When dreading to be deemed too kind,	*Сябры ўсе нашы па адным*
The weak despair -the cold depart;	*Нас выракаліся з табой;*
<…>	<…>
But thou and thine shall know no blight,	Каб ні табе, ні ўсім тваім
Whatever fate on me may fall;	*Не ведаць ганьбы горка той,*
For heaven in sunshine will requite	*Якая мне ў жыцці цяжкім*
The kind -and thee the most of all [9].	*На долю выпала з ліхвой.*
	За дабрату ў падзяку лёс
	Людзям ад сонца дар нясе.
	О, каб найлепшае прынёс
	Табе за спачуванні ўсе!
	[2, с. 77].

Другая страфа арыгінала перадаецца праз дзве беларускія, хоць у перакладчыцкай практыцы У. Дубоўкі парушэнне эквілінеарнасці здаралася надзвычай рэдка. Выкарыстоўваючы прыём ампліфікацыі і выказваючы ў перакладзе больш, чым у аўтэнтыку, перакладчык усё ж не ішоў на скарачэнне зместу першакрыніцы і не дапускаў страты інфармацыі, дадаючы дадатковую страфу.

Суб'ектыўны элемент прыўнесены У. Дубоўкам і ў другі верш Дж. Байрана "Стансы да Аўгусты". Байранава абазначэнне супраціўнікаў праз паняцце "The World" ("увесь свет") У. Дубоўкам перададзена больш блізкім колам – "тыя, што ў наўколлі, што цкавалі хаўрусам мяне"). Перакладчык нібыта прыгадвае здраду сяброў, хоць пра гэта і не ідзе гаворка ў арыгінале, уводзіць у тэкст гнеўную пагрозу "Панаваць не дазволю я катам / Над сабой, над табой, на зямлі!":

And when winds are at war with the ocean,	Калі з морам змагаецца вецер,
As the breasts I believed in with me,	Як са мною былыя сябры, –
If their billows excite an emotion,	Аднаго толькі шкода мне ў свеце, –
It is that they bear me from Thee.	Што з табой разлучаюць
<...>	вятры...

There is many a pang to pursue me:
They may crush, but they shall not contemn;
They may torture, but shall not subdue me;
'Tis of Thee that I think – not of them.
<...>
Yet I blame not the World, nor despise it,
Nor the war of the many with one;
If my Soul was not fitted to prize it,
'Twas folly not sooner to shun... [9].

<...>
Гора ходзіць за мною па пятах,
Можа нават прыцісне калі, –
Панаваць не дазволю я катам
Над сабой, над табой, на зямлі!
<...>
Што скажу я пра тых у наўколлі,
Што цкавалі хаўрусам мяне?
Калі не паважаў іх ніколі, –
Трэба Збегчы было мне раней!
[2, с. 78].

Параўнаем гэты ўрывак з Гаўруковым варыянтам, які з'яўляецца больш адпаведным арыгіналу:

Пераклад Ю. Гаўрука:

І калі акіянскія хвалі
Уздымаліся аж да нябёс,
Мо таму яны так бушавалі,
Што з табой разлучыў мяне лёс.
Самых лютых пакут не збаюся,
Яны сіл прыдадуць удвая.
Да цябе ў сваіх марах імкнуся,
Яснавокая зорка мая.
Але я не кляну іх за гэта,
Распраўляцца так лёгка з адным!
Хто не ўмее згаджацца са светам,
Таму лепей не звязвацца з ім [2, с. 260–261].

Відавочна, што ў перакладзе Ю. Гаўрука акцэнт пераносіцца з грамадзянскага пратэсту на тэму любові і адданасці, зрэшты, як і ў арыгінале. Гэта зноў-такі сведчыць пра прысутнасць супярэчнасці ў Дубоўкавым метадзе: з аднаго боку, дастаткова блізкае да арыгінала ўзнаўленне лексікі і сінтаксісу першакрыніцы, а з іншага боку, перанос і трансляцыя ўласнага жыццёвага досведу на тэматычна блізкія яму творы замежнага аўтара.

Пераклад вершаў на тэму пакут, несправядлівасці, адзіноты, аднолькава ўдала (хоць і стылістычна па-рознаму: больш публіцыстычна ў У. Дубоўкі, больш лірычна ў Ю. Гаўрука) атрымліваўся ў абодвух перакладчыкаў, якія, падобна Дж. Байрану, зведалі ў сваім жыцці і здраду, і выгнанне. Не абыйшлі ўвагай творчасць Дж. Байрана ў гэты перыяд і іншыя тагачасныя перакладчыкі: асобныя часткі паэмы "Паломніцтва Чайльд Гарольда" ў 1938 г. пераставаралі Язэп Семяжон, а таксама І. Платнер, які незадоўга да высылкі за межы краіны друкаваў свае пераклады на яўрэйскую мову ў часопісе "Штэрн".

Такім чынам, з'ява "пераапранання" займае асаблівае месца ў мастацкім англа-беларускім перакладзе першай паловы XX ст. Яна хоць і мяжуе з такімі відамі мастацкай практыкі, як перайманне і прысвячэнне, што ўзнікаюць на мяжы знешняга ўспрымання і асіміляцыі чужога вопыту, аднак прадугледжвае і асаблівыя ўмовы – немагчымасць або небяспеку выказаць думку ў мастацкай форме ад уласнага імя. Менавіта па гэтай прычыне беларускія перакладчыкі ў складаныя

жыццёвыя перыяды свядома або несвядома “пераапраналіся” ў Дж. Байрана, У. Шэкспіра і іншых палымяных іншамоўных класікаў, якія сваім няскораным і свабодалюбівым духам былі блізкімі адраджэнскім імкненням беларусаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускай літаратуры / А. Адамовіч. – Мінск : Выдавец Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.
2. *Байран, Д. Г.* Лірыка / Д. Г. Байран ; укл., прадм., камент. В. Небышынца. – Мінск : Маст. літ, 1989. – 287 с.
3. *Бугаёў, Д.* Уладзімір Дубоўка : кніга пра паэта / Д. Бугаёў. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 324 с.
4. *Дубоўка, У.* Выбраныя творы : у 2 т. / У. Дубоўка. – Мінск : Беларусь, 1965. – Т. 2 : Паэмы, балады, казкі. – 1965. – 130 с.
5. *Караткевіч, У.* І будзеш свой сярод чужых... / У. Караткевіч // Зб. тв. : у 8 т. – Мінск : Маст. літ., 1991. – Т. 8, кн. 2 : З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытычныя творы, інтэрв’ю, летапіс жыцця і творчасці. – С. 365–374.
6. *Кіплінг, Р.* З кнігі джунгляў / Р. Кіплінг // Дзеяслоў. – 2004. – № 7. – С. 183–188.
7. *Федоров, А. И.* Искусство перевода и жизнь литературы : очерки / А. И. Федоров. – Л. : Советский писатель, 1983. – 352 с.
8. *Kipling, R.* The Jungle Books / R. Kipling. – London : Pinguin Group. – 1994. – 344 p.
9. The Poetical Works of Lord Byron. – London : Oxford University Press, 1912. – 924 p.

УДК 811.161.3’373

І. М. Дубянецкая (Мінск)

НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ БІБЛІЯ. ЛІНГВІСТЫЧНЫЯ СРОДКІ ТРАНСЛЯЦЫІ ФІЛАСОФСКІХ (КАСМАЛАГІЧНЫХ І АНТРАПАЛАГІЧНЫХ) ІДЭЙ У ГЕБРАЙСКАЙ БІБЛІІ (КНІГА РОДУ 2–3) І ПРАБЛЕМА ІХ ПЕРАДАЧЫ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Біблейскі сюжэт пра Адама і Еву адзін з найбольш знакавых для заходняй культурнай прасторы. Прайшоўшы праз тысячагоддзі розных інтэрпрэтацый, адна з якіх нават паслужыла асновай для хрысціянскага дагмату пра першародны грэх, праз незлічоныя мастацкія ўвасабленні – ад высокага жывапісу, скульптуры, архітэктуры да рамесніцкіх вырабаў, ад філасофскіх асэнсаванняў і навуковых даследаванняў да фальклорных сюжэтаў, ад літаратурных прачытанняў да ўжытку ў рэкламнай прадукцыі, – гэтая гісторыя сталася адным з самых пазнавальных культурных кодаў нашай цывілізацыі і пры гэтым засталася прывабнаю, загадкаваю і так, недапрачытанаю.

Уласнабіблейскія персанажы з Кнігі Роду (Рд) 2–3 істотна адрозніваюцца ад тых Адама і Евы, якіх ведае еўрапейская культура і якіх яна, так бы мовіць, сама для сябе сканструявала. У гебрайскім тэксце [1, с. 3–5] няма ані тога Адама, ані тае Евы, ані Адамавай рабрыны, з якой, паводле большасці перакладаў, Ева была зробленая Госпадам Богам, ані яблыка, якім спакусілася Ева. З тае прычыны, што ключавыя дзейнікі гісторыі і яе ключавыя элементы ў арыгінальным тэксце іншыя, уся гісторыя мае іншыя сэнсы, іншыя ўнутраныя сувязі, іншыя акцэнты і падвойныя плыні – нават касмалагічная карціна свету і антрапалагічныя ўяўленні значна адрозніваюцца ад тых, якія мы звыкла прыпісваем гэтаму сюжэту [2–7].

Для сучаснага перакладчыка паўстае сур’ёзная дылема: ці імкнуцца ўвасобіць старажытны тэкст максімальна карэктна і такім чынам дазволіць новаму перакладу канфлікт з устаялай рэлігійнай і залежнай ад яе культурнай традыцыяй, ці пайсці за больш як дзюхтысячагадовай традыцыяй перакладаў і каментароў, не ахвяраваць пазнавальнасцю тэкста, але пры гэтым пакінуць па-за ўвагаю тыя тэкстуальныя адметнасці, якія структуруюць сэнсы зыходнага тэксту. Нават у тым

выпадку, калі перакладчык абірае вернасць біблейскаму тэксту, а не рэлігійнай і культурнай традыцыі, застаецца цяжкавырашальная задача перадачы лінгвістычных прыёмаў, што фармуюць свет арыгінала, сродкамі таргет-мовы.

Тэма гэтая надзвычай вялікая і мусіць дэталёва і розных бакоў абмяркоўвацца ў самастойных даследаваннях [11, с. 12–18]. Тут жа мы прадставім некалькі прыкладаў з Рд 2:4b–3:24 [пра неадпаведнасць сюжэту падзела паміж першым і другім раздзеламі Кнігі Роду гл. 9, с. 214–216], якія выклікаюць складанасць пры перакладзе гісторыі з Рд 2:4b–3:24 на беларускую мову.

Гісторыя ў Рд 2–3 апавядаецца нібыта простай моваю, стылёва блізкай да фальклору. Аднак за гэтай прастатой хаваецца дакладная прадуманасць тэкстуальнай стылёвай мадэлі, дзе няма выпадковых ці неабавязковых слоў. Кожнае слова тут стаіць на адзіна магчымым месцы, фразы будуюцца так, каб усе словы, парадак слоў, паўторы і паралелізмы працавалі на стварэнне агульнай карціны, у якой за відавочным сюжэтам хаваецца другі, а часам і трэці, і простыя сказы поўняцца стоенымі сэнсамі.

Самы, бадай, яркі стылёвы прыём, што найчасцей сустракаецца ў Рд 2–3, – алітэрацыі, радзей падбор аднакарэнных слоў, што ўтварае сугуччы паміж словамі, якія лучаць нібыта розныя аб’екты і рэаліі ў пэўнае адзінства, высвечваюць іх сутнасную роднасць, якой няма навідавоку і пра якую не гаворыцца адкрытым тэкстам. Яны тонка, для няўважлівага чытача незаўважна, утвараюць паралельныя сэнсы, ценявыя, глыбінныя, заўсёды сутнасныя і заўсёды амаль няўлоўныя. Алітэрацыі, з аднаго боку, размыкаюць сюжэт, ствараюць сэнсавую глыбіню тэксту, а з другога, уяўляюць вялікую праблему для перакладчыка, бо далёка не заўсёды магчыма падабраць для іх сугучныя словы ў мове перакладу.

У самой гісторыі Рд 2–3 алітэрацыі звязваюць паміж сабой усіх персанажаў, утвараючы пары. Кожная пара фармуецца праз пэўнае ключавое сугучча, якое ўжываецца для вызначэння абоіх удзельнікаў пары і не ўжываецца больш нідзе. Амаль усе ключавыя сугучныя словы – алітэрацыі.

У сюжэце ўдзельнічаюць чатыры персанажы: Бог, які тут завецца Ягвэ Элогім (у перакладах імя традыцыйна замяняецца на Госпад Бог – гэта таксама вялікая праблема і самастойная тэма для абмеркавання [9, с. 210–211]), чалавек, жанчына і змей.

Дзякуючы таму, што ўсе яны так ці іначай звязаныя ключавымі словамі, за бачным, яўным сюжэтам, тым, які мы найчасцей і ўспрымаем за асноўны, прасвечваецца іншы, больш складаны сюжэт, дзе лінейная ацэначнасць “добракепска”, “правільна-няправільна” размываецца, а часам і ператвараецца ў сваю процілегласць, дзе простая схема “загад – парушэнне – пакаранне” развальваецца, і паўстае складаная, шматузроўневая і шматсувязная карціна, у якой змей гаворыць голасам Бога, чалавек і змей завязваюцца ў нейкі ўраборусавы вузел, і наогул, кожны персанаж з кожным іншым мае сваю няпростую гісторыю” [Там жа, с. 213].

Першая пара паўстае на самым пачатку гісторыі. Бог робіць зямлю і неба (Рд 2:4b), аднак яны не ўтвараюць бінарную апазіцыю, як можна было б чакаць. Зямля тут завецца словам *ha-adamah*, *га-адама́*, што хутчэй значыць “глеба”. Неба застаецца па-за фокусам гісторыі, дзе ўсё адбываецца ў чалавечым свеце, на зямлі. І вось бінарнай параю для зямлі паўстае чалавек – *ha-adam*, *га-адам*. Чалавек і зямля-глеба ўваходзяць у непарыўную сувязь адразу пры першай згадцы чалавека, у Рд 2:5: на зямлі нічога не расце, бо “не было чалавека, *каб* урабляць глебу”. Яшчэ не створаны, чалавек ужо павязаны з глебаю, з зямлёй,

якая будзе для яго і працаю, і карміцелькай, і домам, і ўсім сусветам, і сэнсам існавання. Па-гебрайску *адам* і *адама* гучаць як граматычная мужчынска-жаночая пара. Словы маюць этымалагічную сувязь: абодва паходзяць ад кораню *адам* – "быць чырвоным" і звязаныя са словам *дам* – "кроў". Для тэксту, аднак, важна не столькі лінгвістычная сувязь, як сугучча, якое ўтварае з гэтых слоў мужчынска-жаночую пару: *адам* і *адама*. Тут *адам*-чалавек ня толькі зроблены з *адама*-зямлі, але і ягоным асноўным пакліканнем у жыцці, ягонай мэтаю і прызначэннем з'яўляюцца клопат пра *адама*-зямлю і праца дзеля яе – *авед га-адама* (*ʿabed ha-adamah*, в. 2:5, а таксама 2:15 у дачыненні да саду), што значыць "урабляць глебу", а літаральна – "служыць зямлі". Пасля ўсіх пературбацый, звязаных з парушэннем забароны на спажыванне плода з Дрэва, доляю *адама*-чалавека застаецца праца на *адама*-зямлі (гл. Рд. 3:17–19). І ў гісторыі Каіна, якая працягвае гісторыю саду, Каін працуе на *адама*-зямлі (Рд. 4:2, 12), якая там адыгрывае ў лёсе чалавека яшчэ большую ролю. Яна часам успрымаецца як жывая істота, нават разяўляе рот, каб прыняць кроў брата Каіна (Рд. 4:11). У абодвух сюжэтах сувязь паміж чалавекам і зямлёю ўзмацняецца і супольным праклёнам (спачатку ў Рд. 3:17, потым у Рд. 4:11). Лёс чалавека навечна звязаны з зямлёю. А таксама з ім звязаныя і лёсы ўсіх жывых істот, бо яны прыйшлі да жыцця з *га-адама* як важны складнік чалавечага свету (Рд 2:18–20).

У гэтым тэксце не варта перакладаць *ha-adam* як асабовае імя, Адам. Тут гэта значыць проста чалавек, чалавечая істота па-за гендэрнай ідэнтычнасцю і без асабовага імені, бо ўжываецца з пэўным артыклем *га* (Можна зазначыць, што чалавек упершыню набывае ўласнае імя толькі пасля гісторыі Каіна, у Рд 4:25, дзе Адам ужываецца без артыкля).

Калі на вонкавым (касмалагічным) плане чалавек *га-адам* утварае пару з сваім светам, *га-адамá*, то на ўнутраным (антрапалагічным) плане ён уваходзіць у іншую бінарную апазіцыю, таксама алітэрацыйна акцэнтаваную. Гэта стаўленне чалавека да сваёй сэксуальнасці і да сваёй унутранай іншасці, у якім ствараецца пара мужчына, *іš*, *іш* жанчына, *іššah*, *ішшá*. Гэтыя словы таксама гучаць як граматычная мужнынска-жаночая пара, хаця яны не звязаныя этымалагічна і вытворныя ад розных каранёў.

Тут неабходна некалькі слоў сказаць пра паходжанне жанчыны. У Рд 2:21–22 Ягвэ Элогім увёў чалавека ў трансавы сон – забуць, а тады "*узяў адзін з бакоў ягоных* і закрыў цела на тым месцы. І зрабіў Госпад Бог з боку, які Ён узяў з чалавека, жанчыну". І дзе яна, славутая рабрына, з якой, паводле традыцыі, была зробленая жанчына і якой ад пятага стагоддзя аргументавалі другаснасць жанчыны ў дачыненні да мужчыны? Біблейскае слова *ṣelaʿ*, *цэлá*, якое ўжываецца ў Бібліі 41 раз, нідзе і ніяк не азначае "рабрыны". Гэтую традыцыю распачала Вульгата, пераклаўшы слова *цэла* як costae – "рабрына". Сэптуагінта была апошнім на два тысячагоддзі перакладам, дзе гэтае слова знайшло адэкватны адпаведнік: πλευρά (pleura) – "бок".

У Гебрайскай Бібліі *цэла* значыць менавіта бок. Найчасцей яно ўжываецца як архітэктурны тэрмін у дачыненні да храма ці ахвярніка, у якога ёсць два бакі, правы і левы. Часам яно пазначае бакавы пакой або бок узгорка. Тут, у Рд 2:21–22 хутчэй за ўсё маецца на ўвазе менавіта архітэктурны вобраз, бо дзеяслоў, ужыты для паўстання жанчыны, – *binah, біна* – будаваць. Літаральна фраза гучыць "Ягвэ Элогім збудаваў з боку, які ён узяў з чалавека, жанчыну". У гэтай касмалагічнай канцэпцыі чалавек першапачаткова не мае ніякай гендэрнай прывязкі – ён проста чалавечая істота. Але ў ягонай прыродзе ёсць два бакі, якія

патэнцыйна могуць несці значэнне мужчынскасці і жаноцкасці. Гэта значыць, мужчынскасць і жаноцкасць былі закладзеныя ў чалавека, але без патрэбы не разрозніваліся. Калі ж з'явілася патрэба, Бог раздзяліў гэтыя бакі і з аднаго чалавека паўстала разнаполая пара з рознымі касмалагічнымі функцыямі і задачамі, прычым кожная палова была цэласнаю ў сабе: Бог "закрыў тое месца целам", так што ніякіх вонкавых слядоў раздзялення не засталося. Але чалавек адразу адчуў і пазнаў унутраную еднасць, былое адзінства, калі павітаў жанчыну як "костку ад свае косткі" і "цела ад свайго цела" і выказаў імкненне да аднаўлення колішняга адзінства, сказаўшы, што мужчына "прылепіцца да жанчыны, і будуць адным целам" (Рд 2:23–24).

Жанчына – *iššah, iшшá*, сваім з'яўленнем мяняе ўсю сітуацыю, усе ўсталяваныя адносіны, прыярытэты ды ацэнкі. Пасля таго, як яна "вычляняецца" з *га-адáма*, той застаецца тым, кім быў, – чалавекам, звязаным з *га-адамá*. Але і яна таксама – чалавек, і ў дачыненні да яе *га-адам* пачынае звацца "мужчынам" – *iš, iш*. Такім чынам, жанчына перш, мужчына потым. І калі задача чалавека працаваць на зямлі, то задача жанчыны – даваць жыццё. У Рд 3:20 чалавек дае ёй імя *Ḥawwah, Хава*, бо яна, маўляў, "будзе маці ўсіх *жывых*" – *ḥaj, хай*.

Але адначасова з тым жанчына застаецца незалежным суб'ектам, з якім чалавек непазбежна сутыкаецца твар у твар. І гэтае сутыкненне мяняе яго: *га-адам* робіцца мужчынам, *га-iш*, у гэтай гісторыі толькі ў дачыненні да *га-iшша,* жанчыны [10, с. 185].

Яшчэ адна нечаканая глыбінная сувязь развіваецца паміж чалавечай параю і змеем. Чалавек і жанчына лінгвістычна злучаныя са змеем словам *ʻarum*/*ʻarom* (*ʻарум/ʻаром*). Гэтае слова ўпершыню сустракаецца ў сумежных фразах, у апошнім сказе другога раздзела (2:25) і першым сказе трэцяга (3:1). На жаль, падзел паміж раздзеламі пралёг праз семантычна цэласны эпізод. "Яны былі абоеʻ*arumim* (*ʻаруммім*), чалавек і жонка ягоная, але не саромеліся" – і адразу: "Зьмей быў самы *ʻarum* (*ʻарум*) за усіх польных зьвяроў, якіх зрабіў Ягвэ Элогім". Слова *ʻаруммім* – форма множнага ліку ад *ʼarom*, "голы", якая супадае з множным лікам слова *ʻаруммім* – "разумны, хітры, разважны, здольны". У перакладзе гэтая сэнсаўтваральная гульня слоў прападае, бо ў нас няма магчымасці перадаць *ʻарум* і *ʻаром* адным словам. Сэнс гэтай лінгвістычнай гульні ў ненавязлівай дэманстрацыі нейкай сіметрыі, падабенства паміж чалавекам і змеем. Нездарма менавіта змей – і толькі змей – можа падштурхнуць жанчыну да лёсавызначальнага выбару. Гэта той выпадак, калі тонкія, амаль незаўважныя сувязі ўнутры тэкста ствараюць паралельны сюжэт, які размыкае гісторыю, размывае ў ёй усе відавочныя схемы. Такім чынам, паміж чалавечай параю і змеем завязваецца лёсавы вузел, які з цягам гісторыі будзе толькі шчыльнець. Так, у 3:7, пасля парушэння забароны, вочы ў людзей расплюшчыліся, і яны "ўведалі, што яны голыя" (*ʻэрумім*), і ім стала праз гэта прыкра. Сувязь са змеем далей мацнее з увядзеннем яшчэ адной алітэрацыі: выпраўляючы чалавека ў свет па-за садам, Ягвэ Элогім дае яму адзеннне са скуры – *ʻor* (*ʻор*). І хаця гэта, відаць, звычайная чалавечая скура на чалавечым целе, яна мае змяіныя канатацыі. Змей і чалавек – абодва з вонкава гладкай скураю. Абодва – аголеныя. Абодва – разумныя.

Па-іншаму фармуюцца "сепаратныя" сувязі са змеем у чалавека і жанчыны. Яны набываюць розныя лёсы пасля таго, як адмовіліся прызнаць сваю адказнасць за зроблены выбар. І калі чалавек перакладае віну на Бога і на жанчыну

(“Жанчына, якую ты даў мне, каб была са мною, яна дала мне з дрэва, і я еў.”, Рд 3:12), то жанчына вінаваціць змея: “Зьмей зманіў мне, і я ела” (Рд 3:13. Тут алітэрацыю ўдалося захаваць у беларускім перакладзе). І вось у выроку змею Бог кажа пра ворожасць паміж нашчадкам змея і нашчадкам жанчыны: “ён паразіць цябе ў галаву, а ты паразіш яго у пятку” (Рд 3:15). Тут двойчы паўтараецца рэдкі дзеяслоў *šuph* (*шуф*), які падкрэслівае, што паводзіны нашчадкаў і змеевых, і жанчыніных у дачыненні адно да аднога сіметрычныя і апісваюцца адным і тым жа дзеяннем. Толькі змеевыя нашчадкі атрымаюць удар у галаву – гэта значыць, у тое, што зверху і наперадзе, а жанчыніны ў пятку – у тое, што ўнізе і ззаду. Такім чынам, жанчына і змей закруціліся ў свой ўраборусавы вузел.

У Рд 3:19 Ягвэ Элогім кажа чалавеку: “Ты пыл, і ў пыл вернешся”. А перад тым, у 3:14, Бог сказаў змею, што той будзе “есці пыл усе дні свайго жыцця”. І вось цяпер высвятляецца, што пыл – гэта чалавек! Дык што – ці каго – будзе есці змей? І што есць чалавека? Слова *ʻaphar* (*ʻафар*) – “пыл” лучыць чалавека і змея, закручваючы іх абодвух у яшчэ адну ўраборусавую сувязь.

Таксама згадаем яшчэ адну бінарную апазіцыю з глыбокай лінгвістычнай канцэпцыяй. Мы вызначылі парныя сувязі паміж чалавекам і зямлёй як вонкавыя, касмалагічныя і паміж чалавекам і жанчынай як унутраныя, антрапалагічныя. Пары людзі–змей, жанчына–змей і чалавек–змей можна вызначыць як гарызантальныя і сіметрычныя. У процівагу ім адносіны паміж чалавечай параю і іхным творцам, Ягвэ Элогімам, вертыкальныя і ерархічныя. Тут асноўным аб’яднаўчым паняткам выступае веда і здольнасць ведаць, а ключавым словам стаецца *jadaʻ* (*ядаʻ*) – “ведаць” і вытворнае ад яго *daʻat (даʻат*) – “веда”. Як боскі, так і чалавечыя персанажы ўступаюць у свае адметныя стасункі з ведаю – яны маюць, прагнуць ці здабываюць яе. Веда дабра і зла належыць Богу. “Ведае Элогім”, – кажа пра Бога змей (Рд 3:5). “Вось, чалавек стаўся як адзін з нас, хто ведае дабро і зло,” – кажа сам Ягвэ Элогім (Рд 3:22). Набыццём веды пазначаны і працэс чалавечага сталення. Менавіта прага веды матывавала жанчыну парушыць забарону ды сарваць і з’есці плод, бо змей паабяцаў, што “расплюшчацца вашыя вочы, і будзеце як багі, што ведаюць дабро і зло” (Рд 3:5). І вочы сапраўды расплюшчыліся. І нават веда прыйшла – “і ўведалі, што яны голыя”. Дзеяслоў *jadaʻ* (*ядаʻ*) – “уведалі” – аднакрэнны з *daʻat* (*даʻат*) – “веда”. Яго не варта перакладаць “зразумелі” або “пазналі”, як досыць часта прапануюць перакладчыкі, бо тут неабходна захоўваць прычынна-выніковыя сувязі аповеду: людзі з’елі плод з дрэва веды і як вынік уведалі. Толькі вось што яны ўведалі? Жанчына прагнула разумення і мудрасці (*haskil*, *гаскіл*), а атрымала веду (*daʻat, даʻат*) – таго, што яны *ʻэруммім* – веду сваёй галізны, сваёй цялеснасці, а таксама сваёй сувязі са змеем, які быў “самы *ʻарум*” сярод усёй жыўнасці. Аднак змей не мае веды і не здабывае і яе. А людзі здабываюць, хаця і не так, як уяўлялі.

Па здабыцці веды “чалавек назваў імя сваёй жонкі Хава (Ева), бо яна была маці ўсяго жывога” (Рд 3:20). Імя *Chawwah* (*Хавва*), якое чалавек дае жанчыне, звязанае ў тэксце са словам *chaj* (*хай*) – “жыццё”, і, калі *хай* прачытаць як назоўнік, сэнс фразы будзе “маці ўсяго жыцця”, а калі як прыметнік – “маці ўсяго жывога”. Сцверджанне, што яна маці ўсяго жывога пэўным чынам спраўдзіцца ў наступнай гісторыі – у аповедзе пра Каіна, які пачынаецца словамі “Чалавек зведаў Хаву, сваю жонку, і яна зачала і нарадзіла Каіна”. Тут пачнецца новы віток жыцця, не створаных людзей, а народжаных. Прычым людзей, якія здабылі веду і праз гэта сталіся смяротнымі. Для чалавека і жанчыны веда і жыцця-

дайная, і смертаносная. Боскае і чалавечае веданне рознае, аднак і той, і другія менавіта ведаю вылучаюцца з астатняга свету, і менавіта веда лучыць людзей і Бога. Дзякуючы моўным сугуччам біблейскі тэкст набывае як адметны каларыт, так і глыбейшае гучанне, яскравую вобразнасць і значна больш складаную канцэпцыю света, Бога і чалавека.

ЛІТАРАТУРА

1. Biblia Hebraica Stuttgartensia / ed. R. Kittel. – Stuttgart : Deutsche Bibelgesellschaft, 1990.
2. Brenner, Athalya (ed.), Genesis / The Feminist Companion to the Bible. Second Series 1. – Sheffield, 1998.
3. Brueggemann, Walter, Genesis / Interpretation : A Bible Commentary for Teaching and Preaching. – Atlanta, 1982.
4. Davies, Philip R. ; Clines, David J A. (eds), The World of Genesis : Persons, Places, Perspectives / Journal for the Study of the Old Testament Series 257. – Sheffield, 1998.
5. Fishbane, Michael, Text and Texture : Close Readings of Selected Biblical Texts. – N. Y., 1979.
6. Hess, Richard S. ; Tsumura, David Toshio (eds), I Studied Inscriptions from before the Flood : Ancient Near Eastern, Literary and Linguistic Approaches to Genesis 1–11 (Sources for Biblical and Theological Study 4). – Eisenbrauns, Winona Lake, 1994.
7. Kruger, Hennie A. J., Subscripts to Creation : A Few Exegetical Comments on the Literary Device of Repetition in Gen 1–11 // Wénin, André (ed.), Studies in the Book of Genesis. – Leuven, 2001, pp. 429–445.
8. *Дубянецкая, І. М.* Кніга Роду : Новая беларуская Біблія / І. М. Дубянецкая // Дзеяслоў. – № 1 (86). – Мінск, 2017. – С. 5─14.
9. *Дубянецкая, І. М.* Эдэнскі сад : стварэнне чалавека / І. М. Дубянецкая // Кніга Роду № 2:4б–25 // Дзеяслоў. – 2 (87). – Мінск, 2017. – С. 210─218.
10. *Дубянецкая, І. М.* Эдэнскі сад : веда дабра і зла. Кніга Роду 3 / І. М. Дубянецкая. – Дзеяслоў. – № 4 (89). – Мінск, 2017. – С. 184─191.
11. *Дубянецкая, І. М.* Філасофія і філалогія біблейскага тэксту : Некаторыя заўвагі да новага беларускага перакладу Бібліі / І. М. Дубянецкая // Беларуская мова, літаратура, культура і свет : Праблемы рэпрэзентацыі : зб. нав. арт. па выніках Міжнар. нав. канф., Мінск, 15–16 ліст. 2018 г. – Мінск : МДЛУ, 2020. – С. 34–41.

Дадатак

КНІГА РОДУ 2:4б–3:24.
Тэкст у перакладзе на беларускую мову

Пераклад: Новая беларуская Біблія

Каментар. Курсівам вылучаныя словы, адсутныя ў зыходным тэксце, але патрэбныя для лягчэйшага граматычнага ўспрымання беларускага тэксту.

2. [4б] У дзень, калі Госпад Бог зрабіў зямлю і неба, [5] ніякага куста польнага яшчэ не было на зямлі, і ніякая трава польная яшчэ не расла, бо ня слаў Госпад Бог дажджу на зямлю, і не было чалавека, *каб* урабляць глебу. [6] І вільгаць падымалася з зямлі і паіла ўсю паверхню глебы.

[7] Госпад Бог вылепіў чалавека з пылу глебы, і ўдзьмуў у ягоныя ноздры дыханьне жыцьця. І быў чалавек душою жывою.

[8] І пасадзіў Госпад Бог сад у Эдэне на ўсходзе, і зьмясьціў там чалавека, якога вылепіў. [9] І ўзрасьціў Госпад Бог з глебы ўсякае дрэва, прывабнае на выгляд і добрае на ежу, і дрэва жыцьця пасярод саду, і дрэва веды дабра і зла.

[10] І рака выцякала з Эдэну, каб паіць сад, і адтуль яна раздзялялася на чатыры галоўныя плыні. [11] Назва аднае – Пішон, яна атачае ўсю зямлю Хавіл**а**, у якой золата. [12] І золата тае краіны добрае; там пэрлы і камень онікс. [13] І назва другой ракі – Гіхон, яна атачае ўсю зямлю Куш. [14] І назва трэцяе ракі – Тыгра, яна цячэ на ўсход ад Асірыі. І чацьвертая рака – Эўфрата.

[15] Госпад Бог узяў чалавека і пусьціў яго ў сад Эдэнскі, урабляць і ахоўваць яго. [16] І загадаў Госпад Бог чалавеку, кажучы: “З кожнага дрэва ў садзе ўдосталь будзеш есьці, [17] Але з дрэва веды дабра і зла, ня еш зь яго, бо ў дзень, калі зьясі з яго, сьмерцю памрэш”.

[18] Госпад Бог сказаў: “Нядобра чалавеку быць самому. Зраблю яму падмогу, адпаведную яму”. [19] І вылепіў Госпад Бог з глебы ўсякага звера польнага і ўсякую птушку нябёсную і прывёў да чалавека, *каб* пабачыць, як той назаве іх; і як назаве чалавек душу жывую, такое ёй імя. [20] Чалавек назваў імёны кожнай жывёліны і птушкі нябёснай, і кожнага звера польнага. Але для чалавека не знайшлося падмогі, адпаведнай яму.

[21] Госпад Бог спусьціў забуць на чалавека, і той заснуў. І *Ён* узяў адзін з бакоў ягоных і закрыў цела на тым месцы. [22] І зрабіў Госпад Бог з боку, які Ён узяў з чалавека, жанчыну, і прывёў яе да чалавека.

[23] Чалавек сказаў:

“Вось яна, нарэшце,
костка ад маіх костак
і цела ад цела майго!
Яна будзе звацца жанчынаю,
бо з мужчыны была яна ўзятая.

[24] Таму пакіне мужчына
бацьку свайго і маці сваю,
і прылепіцца да жонкі сваёй,
І будуць адным целам”.

[25] Яны былі абое голыя, чалавек і жонка ягоная, але не саромеліся.

3. [1] Зьмей быў хітрэйшы за усіх польных зьвяроў, якіх зрабіў Госпад Бог. І ён сказаў жанчыне: “Вось жа сказаў Бог: “Ня ежце з кожнага дрэва ў садзе!””. [2] Жанчына адказала зьмею: “З пладоў дрэваў у садзе мы можам есьці, [3] А з пладоў дрэва, што пасярод саду, Бог сказаў: “Ня ежце зь яго і не кранайце яго, каб не памерлі””. [4] А зьмей сказаў жанчыне: “Сьмерцю не памрэце, [5] бо ведае Бог, што ў дзень, калі зьясьцё зь яго, расплюшчацца вашыя вочы, і будзеце як багі, што ведаюць дабро і зло”.

[6] Жанчына ўбачыла, што дрэва добрае ў ежу, і што яно прывабнае вачам, і жаданае дзеля разуменьня. І ўзяла з пладоў яго і ела, і дала таксама свайму мужу, які быў з ёю, і ён еў. [7] І вочы ў іх абаіх расплюшчыліся, і ўведалі, што яны голыя. І яны сшылі фігавае лісьце і зрабілі сабе падпаяскі.

[8] І пачулі яны голас Госпада Бога, які хадзіў па садзе дзённым ветрам, і схаваўся чалавек з сваёй жонкаю ад аблічча Госпада Бога сярод дрэў у садзе. [9] Госпад Бог гукнуў чалавека і спытаў у яго: “Дзе ты?” [10] А той адказаў: “Твой голас я пачуў у садзе і спалохаўся, што я голы, і схаваўся”. [11] *Бог* сказаў: “Хто распавёў табе, што ты голы? Ці ня еў ты з дрэва, з якога я наказаў табе ня есьці?” [12] Чалавек адказаў: “Жанчына, якую ты даў мне, каб была са мною, яна дала мне *плод* з дрэва, і я еў.” [13] І сказаў Госпад Бог жанчыне: “Што гэта ты зрабіла?” Жанчына адказала: “Зьмей зманіў мне, і я ела”.

[14] І Госпад Бог сказаў зьмею: “За тое, што ты зрабіў гэта, пракляты ты *больш* ад усякай жывёлы і ад усякага звера польнага. Будзеш хадзіць на сваім бруху і есьці пыл усе дні свайго жыцьця. [15] І пакладу варожасьць паміж табой і жанчынаю, і паміж тваім нашчадкам і ейным нашчадкам. Ён паразіць цябе ў галаву, а ты паразіш яго у пятку.”

[16] Жанчыне (ён) сказаў: “Моцна памножу твае высілкі і твае зачацьці, у цярпеннях будзеш нараджаць дзяцей, і тваё памкненьне да твайго мужа, і ён будзе кіраваць табой.

[17] А чалавеку сказаў: “За тое, што ты паслухаўся голасу жонкі сваёй і еў з дрэва, пра якое я наказаў табе, кажучы: ‘Ня еж зь яго!’, праклятая глеба праз цябе, у высілках будзеш есьці *з* яе ўсе дні жыцьця твайго. [18] Церне і асот яна праросьціць табе, і будзеш есьці польную траву. [19] У поце свайго твару будзеш есьці хлеб, пакуль ня вернешся да глебы, з якой ты быў узяты; бо ты пыл, і ў пыл вернешся.

[20] Чалавек назваў імя сваёй жонкі Ева, бо яна была маці ўсяго жывога.

[21] Госпад Бог зрабіў чалавеку і ягонай жонцы адзеньне са скуры і адзеў іх.

[22] І сказаў Госпад Бог: “Вось, чалавек стаўся як адзін з нас, хто ведае дабро і зло; і цяпер як бы ён не працягнуў сваю руку і не ўзяў таксама з дрэва жыцьця і ня зьеў, і не стаў жыць вечна”.

[23] І Госпад Бог выслаў яго з Эдэнскага саду урабляць глебу, з якой ён быў узяты.

[24] І выгнаў чалавека, і пасяліў з усходу ад Эдэнскага саду керубаў і палымяны меч калаўротны, ахоўваць дарогу *да* дрэва жыцьця.

УДК 821.161.3'25(=581)

Цюй Гуаньдун (Тяньцзинь, КНР)

ПЕРЕВОДЧИКИ ПРОИЗВЕДЕНИЙ СВЕТЛАНЫ АЛЕКСИЕВИЧ В КИТАЕ

Китайские читатели в принципе мало знают о белорусской литературе, им более известна русская литература. Однако в 2015 году белорусская писательница Светлана Алексиевич стала лауреатом Нобелевской премии по литературе, и эта новость произвела фурор, ее творчество стало широко распространяться по всему миру, в том числе в Китае. Группа китайских переводчиков построила своеобразный мост для распространения и изучения белорусской литературы через произведения С. Алексиевич.

Белорусская литература имеет уникальные закономерности и особенности развития. Новость о том, что 8 октября 2015 года белорусская писательница С. Алексиевич стала лауреатом Нобелевской премии по литературе вызвала сенсацию во всем мире, а белорусская литература предстала в глазах людей как новая сила. В Китае также огромное внимание было приковано к творчеству белорусской писательницы, и переводчики старались сделать переводы произведений С. Алексиевич на китайский язык, чтобы китайские читатели могли их прочитать и оценить.

При подготовке статьи были использованы следующие источники [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7; 8].

Китайский переводчик Гао Ман говорит о С. Алексиевич: «документы – это факты».

Самым известным переводчиком произведений С. Алексиевич является Гао Ман (1926–2017). Он перевел книгу «Цинковые мальчики». После того как Алексиевич получила Нобелевскую премию по литературе, переводчик, которому на тот момент было почти девяносто лет, оказался в центре внимания огромного количества репортеров.

Гао Ман, который работал под псевдонимом Улан Хан, родился в Харбине в 1926 году. Он долгое время работал в Ассоциации советско-китайской дружбы и Институте иностранной литературы на всех уровнях, занимаясь переводом,

редактированием, исследованием русско-советской литературы, а также китайской и зарубежной литературы. В то же время он сам занимался литературой и искусством. С 1996 г. – почетный член Союза писателей России. В ноябре 2013 года Гао Ман получил премию «Россия – новый век» за лучший китайский перевод современной русской литературы. 6 октября 2017 года переводчик Гао Ман скончался в Пекине в возрасте 91 года.

В конце 1999 года Гао Ман прочитал в советском журнале «Дружба народов» произведение С. Алексиевич «Цинковые мальчики». Документальное литературное произведение заставило его буквально «скитаться». Гао Ман говорил: «Она написала внутреннюю историю советских войск во время войны в Афганистане, менталитет офицеров и солдат разных классов и их отвратительное поведение в Афганистане». Глубоко пораженный этим, Гао Ман перевел это произведение на китайский язык. По мнению переводчика, произведения Алексиевич имеют документальную ценность. В ее книге нет ни центрального персонажа, ни субъективного психологического анализа, но записанные ею фрагменты речи, несвязанные события и частичные явления дают людям относительно полную концепцию и картину. Жизнь, которую она записала, призвана связать объективные сцены с микроскопической точки зрения. Она изо всех сил пытается проникнуть в сердце говорящего и раскрыть суть, скрытую в подсознании. Она знает мир через звук и открывает правду через свое сердце. В постскриптуме перевода книги «Цинковые мальчики» Гао Ман вспоминал о своей встрече со С. Алексиевич: «Ранней зимой 1989 года С. Алексиевич посетила Китай с делегацией советских писателей. Алексиевич была одета в неприхотливое платье, простая прическа, слегка взволнованные щеки и серые глаза. Она говорила скромно и спокойно, без кричащей риторики и смелых слов. Она думала об этом своим сердцем».

Что больше всего впечатлило в то время Гао Мана в С. Алексиевич, так это то, как она описала свое неустанное стремление к «описательной истине» и свои мысли о «документальной литературе». Она использовала именно этот термин, который, как почувствовал Гао Ман, был понят не всеми. Когда Гао Ман столкнулся с вопросом репортера, он ответил кратко и просто: «Ее документы – это факты. Фотографии людей настоящие. В них нет вымышленных персонажей или вещей. Я думаю, что они почти такие же, как документальная литература». После книги «Цинковые мальчики» стареющий Гао Ман уже не переводил более поздние книги С. Алексиевич, но искренне радовался присуждению ей Нобелевской премии. Его переводческая работа представляет ценные материалы для китайских читателей и ученых.

Переводчик Цинлан Ли Хань говорит о С. Алексиевич: «правда, шокирующая душу».

Цинлан Ли Хань – один из китайских переводчиков произведений С. Алексиевич, член Ассоциации китайских писателей, поэт. Ранее его звали Ли Шудун, он родился в городе Хэцзянь провинции Хэбэй в октябре 1970 г. Цинлан Ли Хань издал сборник стихов и множество переводов. В 2012 году основал «Солнечный книжный магазин литературы и искусства». Он считает, что награда С. Алексиевич в основном связана с неизменным описанием встреч простых людей с крупными событиями той эпохи: «Ее работы полны человечности, заботы о страданиях и заботы о мирной жизни».

Хотя Цинлан Ли Хань переводил произведения С. Алексиевич, он не имел с ней прямого контакта. Сначала прочитал произведения писательницы, переведенные господином Гао Маном, и был шокирован. Позже редактор издательства нашел Цинлана Ли Ханя и посчитал, что он больше подходит для перевода произве-дения С. Алексиевич.

Цинлан Ли Хань перевел книгу «Последние свидетели: книга недетских рассказов», в которой собраны воспоминания детей, которым было всего несколько лет во время Второй мировой войны. В процессе работы переводчика глубоко тронули рассказы ребят, заставили чувствовать себя очень необычно.

Важной особенностью произведений С. Алексиевич является то, что в них истинная история излагается с точки зрения гражданского населения в устной форме от первого лица, поэтому это очень шокирует. Переводчик считает, что подлинность и документальность С. Алексиевич – ее сила, и это именно то, чего не хватает китайским писателям.

Многие работы С. Алексиевич были опубликованы до распада Советского Союза, и тогда она находилась под большим давлением. Большинство ее первых работ было опубликовано за границей, в то время было сделано много сокращений. Можно обнаружить, что содержание работ С. Алексиевич, опубликованных в разные периоды, отличается. После распада Советского Союза ее работы смогли быть представлены более полно. Помимо строгой цензуры контента, С. Алексиевич зачастую находилась под давлением, когда писала о Второй мировой войне, Чернобыле и войне в Афганистане. Кроме того, Алексиевич всегда настаивала на истине, использовала свое уникальное и острое видение, чтобы вмешаться в реальность.

С литературной точки зрения во всех произведениях Алексиевич используется первый повествовательный метод, позволяющий свидетелям рассказать о собственном опыте. Например, в «Цинковых мальчиках» историю рассказывают группы детей, которые участвовали в войне в Афганистане. Они рассказали о своих взглядах на войну в Афганистане на основе того, что видели и слышали. Алексиевич все время оставалась нейтрально настроенной, позволяя рассказчику описывать факты, а затем передавала их читателю. Конечно, Алексеевич имеет четкое суждение в процессе сбора информации и написания материала, но она очень сдержанна.

Переводчик Люй Нинсы говорит о С. Алексиевич: «перевод должен соответствовать оригиналу».

Люй Нинсы родился в Шэньяне в 1955 году. Он является переводчиком на китайский язык произведений лауреата Нобелевской премии 2015 года С. Алексиевич и исполнительным редактором информационной станции Phoenix TV. Он служил на флоте и в армии, последовательно учился на бакалавра, магистра и доктора в Фуданьском университете, Восточно-Китайском педагогическом университете и Сиднейском университете в Австралии. Он специализировался на истории, русской литературе и азиатских науках.

Тридцать лет назад Люй Нинсы случайно прочитал литературный журнал Советского Союза «Октябрь». Когда он прочитал книгу «У войны не женское лицо», его сразу привлекли название и содержание этого произведения. «У войны не женское лицо» – первая работа С. Алексиевич. Переводчик посчитал, что эта книга имеет большой потенциал, поэтому в спешке перевел первое издание только что вышедшей книги.

Люй Нинсы после окончания университета десятилетиями работал в прессе, поэтому, читая произведения С. Алексиевич, которая также является журналистом и писателем, не мог не чувствовать того же: его вкус, образ мышления, жизненный опыт и даже трогательные моменты совпадали с работами С. Алексиевич.

Этот переводчик контактировал с писательницей, и она сказала ему, что с нетерпением ждала встречи с китайскими читателями. В день получения награды Люй Нинсы как можно быстрее отправил ей поздравительное послание. Переводчик считает, что Нобелевская премия по литературе всегда была ориентирована на инновации в литературных концепциях, и ее критерии оценки в основном имеют три аспекта: первый – творческая техника, второй – духовное ядро, а третий – критика реальности. Работы Алексиевич соответствуют этим трем критериям, и ее награда заслужена и уместна. Тем более что в эту эпоху война была недалеко от людей, и они не должны были перестать думать о ней. Нобелевская премия, присужденная писателю, глубоко описывающему войну, несомненно, имеет особое значение.

Люй Нинсы понимал, что писательница жила в эпоху бывшего Советского Союза. Ее поколение заплатило высокую цену за свою страну и за свой народ. Они очень любили свою родину. Эпоха власти была подвержена политическому и духовному контролю, что очень противоречиво. Обычно при противоречивом и мучительном мышлении может появляться творчество таких писателей, как С. Алексиевич. Люй Нинсы считает, что писатель иногда бывает не социальным человеком, а индивидуальностью. В бывшем Советском Союзе насчитывается более миллиона женщин-солдат и много репортеров. Не личность репортера и женщины-солдата заставляет ее писать эти произведения, а ее личная чувствительность к проблемам общества. Не все репортеры могут это делать и не все женщины-солдаты. С. Алексиевич писала такие произведения в собственной реальности.

Хотя Люй Нинсы хорошо знает русский язык, все же перевести эту книгу ему было очень сложно. «Я был очень взволнован, когда сначала прочитал эту книгу, но каждый раз, когда я печатал китайский перевод, я не знал, с чего начать. Это как если бы вы услышали предложение и хотели бы передать его другим, но как вы можете передать его, чтобы вызвать у них интерес?» Перевод должен полностью соответствовать оригиналу, и очень сложно передать точность оригинального текста и при этом его великолепие. Книга С. Алексиевич представляет собой фрагментарный текст, в ней нет сюжетной линии, которая проходит через всю историю. Плохой перевод заставит людей почувствовать себя слишком просто и старомодно. Значение слова в книге часто не имеет прямого соответствия в китайской лексике, но существует десять подобных настроений. В настоящее время это невозможно передать. Можно найти только одно из десяти объяснений, которое соответствует исходному значению. Столкнувшись с такой сложной литературной работой, Люй Нинсы сказал, что он сделал все возможное для того, чтобы перевод соответствовал оригиналу.

В настоящее время самой популярной белорусской писательницей в Китае является Светлана Алексиевич, лауреат Нобелевской премии по литературе 2015 г. Многие китайские переводчики дают нам много ценной информации для изучения белорусской литературы. Однако в целом современные исследования белорусской литературы в основном направлены на изучение произведений

С. Алексиевич. Очевидно, что в будущем Китай и Беларусь будут интенсифицировать культурный обмен на фоне стратегической инициативы «Один пояс, один путь», и белорусская литература получит более широкое распространеие в Китае.

ЛИТЕРАТУРА

1. 周立新, 王志耕. 白俄罗斯作家的文学身份认同. 中国社会科学学报[J], 2016(8).
2. 张严峻. 白俄罗斯民族文化认同的历史流变与现实境遇. 俄罗斯研究[J], 2018(4).
3. 朱迪思·赫尔曼.创伤与复原[M].施宏达,陈文琪，译. 北京：机械工业出版社，2015.
4. 舒婧娟. 纪实文学的创伤叙事探析–评S.A.阿列克谢耶维奇和张纯如. 湖北民族大学. 2015.
5. 刘石平. 论S.A.阿列克谢耶维奇作品的复调叙事特征. 《湖南涉外经济学院学报, 2019(03).
6. 李昶伟. 译者高莽忆阿列克谢耶维奇：她这条路子 和别人不太一样. 凤凰网江苏. 2015.10.
7. 孙惠英 何玉新. 吕宁思：我是媒体人，也是译者. 天津日报. 2015.11
8. 晴朗李寒. 我译阿列克谢耶维奇：震撼心灵的真实. 中国作家网. 2015.10.

811.133.1’25(045)

А. О. Перзашкевич (Минск)

СПОСОБЫ ПЕРЕВОДА С РУССКОГО ЯЗЫКА НА ФРАНЦУЗСКИЙ СЛОВ КАТЕГОРИИ СОСТОЯНИЯ СО ЗНАЧЕНИЕМ ЧУВСТВА, ЭМОЦИОНАЛЬНОГО СОСТОЯНИЯ, ПСИХОЛОГИЧЕСКОГО ПЕРЕЖИВАНИЯ

Объектом нашего исследования являются слова категории состояния (СКС) со значением чувства, эмоционального состояния, психологического переживания в романе Л. Н. Толстого «Анна Каренина», предметом – способы переводов данных СКС на французский язык. При определении и классификации СКС мы опираемся на теорию В. В. Виноградова, понимавшим под СКС «несклоняемоименные и наречные слова, которые имеют формы времени (для прошедшего и будущего времени аналитические, образованные посредством присоединения соответствующих форм связки *быть*) и употребляются только в функции сказуемого» [1].

В тексте романа Л. Н. Толстого нами было обнаружено 1222 предложения, содержащих 1519 слов категории состояния (СКС), которые, опираясь на теорию В. В. Виноградова, мы распределили по следующим семантическим группам:

1) модальности: 950 предложений, содержащих 126 СКС;

2) чувства, эмоционального состояния, психологического переживания: 160 предложений, содержащих 227 СКС;

3) оценки действия или ситуации: 52 предложения, содержащих 65 СКС;

4) пространства или времени: 42 предложения, содержащих 49 СКС;

5) состояния природы: 16 предложений, содержащих 18 СКС;

6) физического состояния иногда как результата внешних восприятий и ощущений: 11 предложений, содержащих 12 СКС;

7) достаточности, прекращения действия: 9 предложений, содержащих 13 СКС;

8) состояния окружающей среды: 9 предложений, содержащих 9 СКС.

В процентном соотношении СКС со значением чувства, эмоционального состояния, психологического переживания составляют 14,9 % от общего числа данной части речи в тексте.

Рассматриваемая семантическая группа представлена такими словами, как *хорошо / лучше, жалко, стыдно, неловко, больно, жутко, светло, обидно, легко, приятно, тяжело, скучно, все равно, смешно, глупо, неприятно, дурно, страшно,*

весело, досадно, просто, совестно, трудно, оскорбительно. Эта самая богатая с точки зрения лексического наполнения семантическая группа. Наиболее употребительными являются СКС *жалко* (54 употребления), *скучно* (37 употреблений), *больно* (28 употреблений), *стыдно* (24 употребления).

Поскольку такая часть речи, как СКС, во французском языке отсутствует, ее перевод предполагает использование различных грамматических средств. В ходе анализа рассматриваемой сематической группы СКС нами были выявлены следующие способы перевода:

1. Перевод через *имена прилагательные и причастия*. В данном случае состояние воспринимается как характеристика субъекта, то есть находясь в определенном состоянии, субъект становится обладателем определенной черты, носителем признака (*Вареньке было и больно, и стыдно, но вместе с тем она испытывала и чувство облегчения* [3, т. 9, с. 156]. / *Confuse et blessée, Varinka éprouvait pourtant un sentiment délivrance* [4, с. 782]. *На вас взглянешь – весело* [3, т. 8, с. 353]. *On se sent heureuse rien qu'en vous regardant* [4, с. 436]; *Ему стало, так же как и ей, светло и весело* [3, т. 9, с. 31]. / *... il se sentit comme elle, joyeux et rasséréné* [4, с. 645]*; Такое же неприятное чувство испытывал Михайлов при виде живописи Вронского; ему было и смешно, и досадно, и жалко, и оскорбительно* [3, т. 9, с. 55]. */ La peinture de Vronski produisait sur Mikhaïlov un effet analogue: il la trouvait ridicule, insuffisante, pitoyable* [4, с. 671]; *Чего же мне стыдно? – спросила она себя с оскорбленным удивлением* [3, т. 8, с. 122]. */ Et moi, de quoi serais-je honteuse? se demanda-t-elle avec une surprise indignée* [4, с. 161]).

2. Перевод через *личные глаголы*. Если имеет значение соотнесенность состояния с определенным временным периодом и актуализирована именно процессуальность пребывания субъекта в состоянии, то используется спрягаемая форма глагола (*То мне жалко ее оставить, то я вижу, что ей скучно* [3, т. 9, с. 63]. / *... tantôt j'ai du regret de la quitter, tantôt je crains qu'elle ne s'ennuie* [4, с. 679]; *Я о себе не говорю, хотя мне тяжело, очень тяжело, – сказал он с выражением угрозы кому-то за то, что ему было тяжело* [3, т. 9, с. 228]. / *Je ne parle pas de moi, bien que je souffre beaucoup, beaucoup... On percevait dans sa voix des notes menaçantes à l'intetion d'on ne savait trop qui* [4, с. 860]). Если главное значение имеет общее понятие состояния, не соотносимого со временем, но категория субъекта остается актуальной, то используются инфинитивы (*Вот, вот как вы делаете, что вам не скучно?* [3, т. 8, с. 353] / *Comment faites-vous pour ne pas vous ennuyer?* [4, с. 436]).

3. Перевод через *безличные конструкции*. В данном случае используется конструкция, которую можно представить в виде следующей формулы: *ce + être + Adj*. Наибольшей значимостью для переводчика обладает состояние, возникающее в определенной ситуации, а не связь состояния и субъекта (*Глаза Степана Аркадьича весело заблестели, и он задумался, улыбаясь. Да, хорошо было, очень хорошо…* [3, т. 8, с. 8] / *Un éclat de joie brilla dans les yeux de Stépane Arcadiévitch. Oui, se dit-il en souriant, c'était charmant, tout à fait charmant…* [4, с. 20]). Однако здесь можно наблюдать расширение рассматриваемой языковой единицы за счет включения в состав предложения прямого дополнения, обозначающего субъекта-носителя состояния (*Нет, мне все равно, – не в силах удерживать улыбки, говорил Левин* [3, т. 8, с. 46]. / *Non, cela m'est égal, répondit Levine, souriant malgré lui* [4, с. 68]). Также заметим, что подлежащее, в роли которого выступает указывающее на контекстную ситуацию местоимение *ce*,

может быть заменено на имеющее обобщающий характер местоимение *tout* (*Я тебя люблю, и мне все равно, – сказала она по-русски, с особенным, непонятным ему блеском глаз взглянув на него, – если ты не изменился* [3, т. 9, с. 130]. / *Je t'aime et tout m'est égal si tu n'as pas changé à mon égard, ajouta-t-elle en russe, en posant sur lui un de ces regards exaltés q'il n'arrivait point à comprendre* [4, с. 752]).

4. Перевод через *имена существительные*. Состояние воспринимается как объект, принадлежащий субъекту, при этом актуализируется значение предметности (*Герой романа уже начал достигать своего английского счастия, баронетства и имения, и Анна желала с ним вместе ехать в это имение, как вдруг она почувствовала, что ему должно быть стыдно и что ей стыдно этого самого* [3, т. 8, с. 122]. */ Le héros de son roman touchait à l'apogée de son bonheur anglais – un titre de baronnet et une terre, ou elle aurait bien voulu l'accompagner – quand soudain il lui sembla que ledit héros devait éprouver une certaine honte et que cette honte rejaillissait sur elle* [4, с. 161]).

5. Перевод через *expressions de sentiment* (выражения чувства) [2, с. 280]. В этом случае фундаментальный глагол *avoir* может присоединять как существительное, тогда состояние опредмечивается и воспринимается как нечто, принадлежащее субъекту (*То мне жалко ее оставить, то я вижу, что ей скучно* [3, т. 9, с. 63]. / *... tantôt j'ai du regret de la quitter, tantôt je crains qu'elle ne s'ennuie* [4, с. 679]), так и инфинитив, показывающий процесс пребывания в состоянии как таковой, безотносительно времени его протекания и определенной связи с субъектом (*Но чего же ему стыдно?* [3, т. 8, с. 122] / *Mais de quoi avait-il à rougir?* [4, с. 161]).

6. *Полная грамматическая трансформация*, при которой происходит замена предикативного центра (*Вронский не говорил с ним о своей любви, но знал, что он все знает, все понимает как должно, и ему приятно было видеть это по его глазам* [3, т. 8, с. 210]. / *Sans lui en avoir jamais soufflé mot, il lisait dans ses yeux que Iachvine savait tout et prenait la chose avec sérieux voulu* [4, с. 266]). Вместо СКС в приведенном примере использована метафора *lire dans les yeux* (рус. *читать в глазах*), так переводчик сохраняет эмоциональную составляющую, которую содержит СКС в русском тексте, то есть стремится к сохранению прагматического значения слова-состояния.

При переводе с русского языка на французский СКС со значением чувства, эмоционального состояния, психологического переживания наблюдаются следующие явления:

1. Подобного рода состояния воспринимаются носителем французского языка в большинстве случаев как характеристика или признак субъекта, который проявляется при нахождении субъекта в определенном состоянии, для передачи этого значения переводчик использует имена прилагательные и причастия.

2. Использование личных по семантике глаголов позволяет показать механизм связи субъекта и состояния. При необходимости отнести состояние к определенному временному периоду переводчик использует личные формы. Если состояние как таковое обладает большей важностью, чем процесс пребывания субъекта в состоянии, то используются инфинитивы.

3. Если наиболее значимой для переводчика оказывается ситуация, в которой протекает то или иное состояние, то используется безличная конструкция, строящаяся по модели *ce + être + Adj.*, при этом состояние воспринимается как признак рассматриваемой ситуации. При необходимости в структуру предложе-

ния, содержащего безличный оборот, может включаться субъектноситель состояния, но его значимость не является первостепенной, о чем свидетельствует занимаемая им позиция прямого дополнения. Так подчеркивается, что, прежде чем стать носителем состояния, субъект является его реципиентом.

4. Состояние может восприниматься носителем французского языка как опредмеченное явление, при широком понимании объект, оказывающий влияние на субъект. В таком случае переводчик использует абстрактные имена существительные, что позволяет ему сохранить общее значение состояния при отличном от русского его осознании как этимологически качественного явления.

5. В некоторых случаях переводчик считает главной задачей передачу прагматического, а не релевантного значения СКС. В таком случае значение состояния выделяется на уровне всего предложения в целом, а не отдельных его составляющих, что обусловлено грамматической трансформацией предложения, результатом которой может стать не только изменение предикативного центра, но и лексического состава в целом.

6. Состояние при переводе может представлять собой определенное чувство или ощущение субъекта. В таком случае оно передается через выражения чувства. Модель *avoir + N* / *avoir + Inf.* позволяет осознавать состояние как нечто принадлежащее субъекту, при широком понимании, нечто, являющееся его собственностью или некоторой особенностью.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Виноградов, В. В.* Русский язык : грамматическое учение о слове / В. В. Виноградов // Slovari.ru. Грамматика [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://slovari.ru/default.aspx?s=0&p=5310&0a0=14#s001. – Дата доступа : 28.10.2020.

2. *Попова, И. Н.* Грамматика французского языка. Практический курс : учебник для ин-тов и фак-тов иностр. яз. / И. Н. Попова, Ж. А. Казакова. – 12-е изд., стереотип. – М. : Изд-во «Нестор Академик», 2011. – 480 с.

3. *Толстой, Л. Н.* Анна Каренина / Л. Н. Толстой // Собр. соч. : в 20 т. – М. : Худож. Лит., 1963. – Т. 8–9.

4. Tolstoï Léon. Anna Karénine / Léon Tolstoï ; traduction et notes d'Henri Mongault. – Paris : Gallimard, 1992. – 2018. – 1168 p.

ЗМЕСТ

ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

Бельскі А. Пятро Васючэнка як даследчык беларускай драматургіі 3
Калета Р. Аб патрэбе польска-беларускіх параўнальных глотадыдактычных даследаванняў 8
Кісліцына Г. Жанр раманаў-казак для дзяцей і дарослых
у творчасці Пятра Васючэнкі 13
Лысова Н. Сімвалізм як метад літаратурнага і крытычнага досведу
ў спадчыне П. Васючэнкі 18
Паўлоўская Н. Выпрабаванне жыцця на літаратурнасць 23
Рагачэўская М. «Ад тэксту да хранатопа»: нацыянальная свядомасць
у эсэістыцы П. В. Васючэнкі 26

Секцыя 1. БЕЛАРУСКАЯ МОВА І СВЕТ

Аліферчык Т. Канцэпты беларускай анамастычнай тэрміналогіі і іх узаемадзеянне 31
Барковіч А., Астапкіна К. Інтэрнэт як асяроддзе развіцця маўленчай практыкі 34
Воінава А. Намінацыі радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Светлагорскага раёна 38
Гарановіч Т. Беларускія сінтаксічныя фразеалагізмы як адзінкі дваістай прыроды 43
Герасимович О. К проблеме интерпретации лат. *acedia* ‘уныние’ 48
Ельніцкая А. Культурные ценности Беларуси в городском ономастическом
пространстве 52
Ермакова А. Канцэптуалізацыя чалавечага лёсу ў моўнай свядомасці беларусаў 54
Казакевіч Т. Фанетычныя працэсы ў беларускім вусным маўленні 57
Кныш Л. Партрэт чалавека: некаторыя фрагменты ўрока (пры вывучэнні
беларускай мовы як замежнай) 59
Лапцёнак А. Асаблівасці падачы прыназоўнікаў у тлумачальным слоўніку 64
Латушка Г. Структурная і семантычная арганізацыя
сінтаксічна нячленных выказванняў згоды і нязгоды 68
Лещенко Н. Формы обращения в обиходно-разговорном дискурсе
на испанском, белорусском и русском языках 73
Макітрук С. Намінацыі пасесіўнага тыпу ў старабеларускай дзелавой пісьменнасці
(на матэрыяле “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы”) 77
Мусіенка В. Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальнай лексікі
(на матэрыяле густаторных ад’ектыўных намінацый) 79
Паплаўная Л. Фігуры дабаўлення ў паэтычнай мове Міхася Скоблы 83
Салавей А. Параўнальныя канструкцыі з семантыкай верагоднасці
ў беларускіх і англійскіх мастацкіх тэкстах 88
Семянькевіч А. Семантычная тыпалогія абстрактных множналікавых назоўнікаў
у беларускай мове 92
Скачкова В. Лексіка са значэннем ‘незлічонае мноства, вялікая колькасць’
у мове беларусаў 97
Скрамблевіч В. Тыпалогія амонімаў у беларускім і італьянскім мовазнаўстве 100
Смалянка Г., Занкавіч А. Мова як адна з галоўных формаў
існавання і выражэння нацыянальнай культуры 105
Цімашэнка Н. Функцыянальна-семантычнае поле аб’ектнасці ў тэкстах беларускіх
народных песень 107
Фурс В. Дэшыфрацыя французскіх абрэвіяцый сродкамі беларускай мовы:
з вопыту ўкладання слоўніка 113
Чжао Синь. Методические приемы формирования
навыка ритмической организации русского слова 116

Шубич Т. Значение этнонимов
в белорусских и немецких фразеологических единицах 120
Ярмоленка Э. Творны прыйменны ў старабеларускай мове 123

Секцыя 2. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА І СВЕТ

Бароўская І. «Мой чароўны беларускі край, бацькаўшчына светлая мая»:
Паэтычная творчасць Уладзіміра Караткевіча 127
Баханович А. Типы иронии в прозе П. В. Васюченко 130
Белая А. Ментальны партрэт беларуса ў эсэістыцы П. В. Васючэнкі 134
Бразгуноў А. Сатыра ў "Пасольстве і кароткім апісанні перамоваў з Масквою"
Г. Пельгрымоўскага 138
Бурдзялёва І. Экзістэнцыяльная праблематыка ў аповесці Б. Пятровіча «Стах» 142
Воінава-Страха М. Анталагічная праблематыка ў навелістыцы Алены Брава 147
Дзядова А. Лінгвакраіназнаўчая спецыфіка лексікі
ў мастацкіх творах Васіля Быкава 151
Калядка С. Эматыўнасць паэзіі Цёткі 155
Кошман П. Актуальнасць нацыянальнага светаадчування
ў кнізе «Радзіва "Прудок"» А. Горвата 160
Круглова В. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій
пры вывучэнні творчасці Янкі Лучыны 162
Ляўшун Л. Эматыўны складнік мастацкага канона хрысціянскай культуры 167
Мантур А. Гістарычнае развіццё беларускай драматургіі ў тэмах і вобразах 171
Морозова И. Проблема перцепции постмодернистской литературы 173
Новік Г. Аўтарская стратэгія як аснова тыпалогіі
беларускай літаратурнай крытыкі XXI стагоддзя 178
Первушина Л. Репрезентация исторических событий в творчестве В. Седуры 181
Сігаева С. Архетып дрэва і яго мастацкае асэнсаванне ў творчасці Якуба Коласа 186
Го Синьай. Творчество Светланы Алексиевич в Китае 190
Супранкова Т. Аксіялагічныя аспекты фаўсціяны эпохі Асветніцтва
ў нямецкай і беларускай культурных прасторах 193
Хаўстовіч М. "Hutarka biłaruska" Ф. Пчыцкага:
праблемы атрыбуцыі і тэксталогіі 198
Хмяльніцкі М. Матыў мяжы ў празаічных творах
Сяргея Пясецкага і Петруся Броўкі: кампаратыўны аспект 204
Чарота У. Рэцэпцыя італьянскай літаратуры ў Беларусі (XVI–XVIII ст.) 209
Чарота К. Сродкі мастацкай выразнасці
ў аповесцях І. Навуменкі "Снежань" і "Развітанне ў Кавальцах" 212
Шамякіна С. Казачныя аповесці П. Васючэнкі
"Жылі-былі паны Кубліцкі да Заблоцкі" і народныя казкі 216
Шевлякова-Борзенко И. Неомодерные практики
в азербайджанской и китайской литературах последней трети XX века:
точки схождения национальных феноменов 221
Шматкова І. "Загрузка – працэс – разгрузка – паўза":
мастацкі свет Галіны Булыка 225

Секцыя 3. АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ ФАЛЬКЛОРУ,
ЭТНАГРАФІІ, КРАЯЗНАЎСТВА, ЭТНАЛІНГВІСТЫКІ Ў XXI СТАГОДДЗІ

Вяргеенка С. Прыродна-ландшафтныя міфалагемы
ў паэтычнай прасторы беларускіх замоў 229
Зинина О. Ассоциативные связи как проявление
лингвокультурных характеристик 233

Івашка І. Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь: рэалізацыя ў раённым друку 236
Казлова А. Праблемы рэпрэзентацыі беларускай мовы і літаратуры ў свеце на культурным і адукацыйным узроўнях 242
Карэньгіна А., Філіч А., Лабан К. Беларуская міфалогія ў фальклорным запісе 243
Коваль В. О символике тыквы в славянской и китайской традиционных культурах 248
Марозава Т. Класіфікацыя і жанравая разнастайнасць сучаснага студэнцкага фальклору Беларусі 252
Морозов А. Белорусская культура в контексте мирового гуманитарного процесса: проблема репрезентации 257
Палукошка В. Чарнобыльскі фальклор: сутнасць паняцця і праблемы даследавання 262
Шамякіна Т. Мара як культурны канструкт (на матэрыяле паэмы Якуба Коласа “Новая зямля”) 264
Шарейко А. Красный цвет как символ советсткого времени (по материалам ассоциативных словарей русского, белорусского и украинского языков) 269

Секцыя 4. СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Барысенка В. Нацыянальна абумоўленыя асаблівасці падручніка па аўдыяванні для кітайскіх навучэнцаў 274
Валочка Г., Зелянко В. Культуралагічны аспект навучання беларускай мове як роднай і замежнай 278
Гуцева Т. Актуальность гуманитарных знаний в подготовке современного специалиста 282
Дапиро Т., Навроцкая И. Современные методы обучения научному стилю речи студентов неязыковых учреждений высшего образования 284
Куліковіч У. Структура і змест навукова-папулярнага выдання па арфаграфіі 288
Шахаб В. Выкарыстанне перакладных тэкстаў пры навучанні звязнай мове кітайскіх студэнтаў 293

Секцыя 5. МАСТАЦКІ ПЕРАКЛАД У МІЖКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ: ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў СВЕЦЕ

Бязлепкіна І. Прыём “пераапранання” ў англа-беларускім паэтычным перакладзе першай паловы XX ст. 298
Дубянецкая І. Новая беларуская Біблія. Лінгвістычныя сродкі трансляцыі філасофскіх (касмалагічных і антрапалагічных) ідэй у Гебрайскай Бібліі (Кніга Роду 2–3) і праблема іх перадачы ў перакладзе на беларускую мову 302
Цюй Гуаньдун. Переводчики произведений Светланы Алексиевич в Китае 309
Перзашкевич А. Способы перевода с русского языка на французский слов категории состояния со значением чувства, эмоционального состояния, психологического переживания 313

Навуковае выданне

БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ЛІТАРАТУРА, КУЛЬТУРА І СВЕТ: ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ

Зборнік навуковых артыкулаў
па выніках III Міжнароднай навуковай канферэнцыі,
прысвечанай памяці Пятра Васючэнкі

Мінск, 19 лістапада 2020 г.

Адказны за выпуск *М. М. Воінава-Страха*

Рэдактары: *В. М. Васілеўская, В. С. Забродская, К. І. Кавалёва*
Ст. карэктар *С. А. Іванова*

Камп'ютарная вёрстка *Т. С. Салаўёвай*

Падпісана ў друк 31.12.2021. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Рызаграфія, лічбавы друк. Ум. друк. арк. 18,60. Ул.-выд. арк. 25,76. Тыраж 100 экз. Заказ 64.

Выдавец і паліграфічнае выкананне : установа адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт». Пасведчанне пра дзяржаўную рэгістрацыю выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў ад 02.06.2017. г № 3/1499.
ЛП 02330/458 ад 10.07.2020 г.
Адрас: вул. Захарава, 21, 220034, г. Мінск.